# Аляксей Карпюк

# Выбраныя творы

*Серыя 1. Мастацкая літаратура*

www.kamunikat.org

Мінск «Кнігазбор» 2007

УДК 821.161.3-3
ББК 84 (4 Беи) К26

БЕЛАРУСКІ КНІГАЗБОР

Серыя распрацавана ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Заснавана ў 1996 годзе

Укладанне, прадмова, каментар Аляксандра Фядуты

Выдавецтва выказвае шчырую падзяку родным і блізкім Аляксея Карпюка за важкі ўклад у выданне тэтай кнігі.

© Карпюк А., 2007

# У ЗМАГАННІ ЗА ПРАЎДУ

За значнымі пісьменнікамі ў чытацкай свядомасці замацоўваецца слава «песняроў роднага краю». Кожны чытач пацвердзіць, што месца дзеяння раманаў Міхаіла Шолахава — родная станіца Вёшанская, што колькі б ні апісваў Іван Тургенеў рускую вёску — усё роўна выходзіў на Спаскае-Лутавінава і ваколіцы; нарэшце, зразумела, які яскравы матэрыял далі Палтаўшчына маладому Мікалаю Гогалю, а Стаўбцоўшчына — Якубу Коласу. Не варта гаварыць пра сусветна вядомых пісьменнікаў-«рэгіяналаў» — прыкладам, пра шатландцаў Роберта Бёрнса і Вальтара Скота ці пра жыхара Праванса Альфонса Дадэ.

Асаблівы выпадак — Уільям Фолкнэр. Ён прыдумаў свой рэгіён, падобны і непадобны адначасова на яго радзіму, але ў любым выпадку абсалютна пазнавальны. Ёкнапатофа Фолкнэра — гэта маленькі амерыканскі гарадок, які адсутнічае на геаграфічных картах, але існуе на старонках фолкнараўскіх кніг — са сваёй тапаграфіяй, са сваімі вуліцамі і дамамі ды іх насельнікамі.

Аляксею Карпюку не трэба было нічога выдумляць. Большую частку свайго жыцця ён пражыў у Гародні, сталіцы Заходняй Беларусі, і ператварыў гэты горад у сваю Ёкнапатофу — цэнтр сваёй літаратурнай карты. І калі чытаеш яго кнігі, адчуваеш сябе экскурсантам, якога вядзе па Гародні разумны і ўважлівы гаспадар гэтай зямлі, які ведае ўсё і ўсіх навакол.

Аднак Аляксей Карпюк нарадзіўся не ў Гародні. Яго «малой радзімай» была вёска Страшава Беластоцкага ваяводства ў Польшчы (паводле польскіх дакументаў — Ваўкавыскі павет). Беласточчына спрадвеку заселеная этнічнымі беларусамі, і бацька будучага пісьменніка, Нічыпар Аляксеевіч Карпюк, быў адным з іх. У хаце гаварылі на той характэрнай для Заходняй Беларусі сумесі пераважна беларускай і польскай моваў, на якой загавораць пазней героі аднаго з лепшых раманаў Карпюка — «Вершалінскага раю».

Сям'я была не вельмі заможная, працаваць даводзілася многа. Сам пісьменнік у аўтабіяграфічным нарысе «Мая Джамалунгма» прыгадваў: «Мы мелі 18 гектараў зямлі і 13 — балота. Зямля была пясчаная, камяністая, — каб невядома якая ліла навальніца, а лужаў не бывала нават у барознах. І балота — суцэльны тарфянік. Наколькі я памятаю, мы заўсёды трымалі аднаго каня, дзве-тры каровы, пяцьшэсць авечак і некалькі свіней. Зямлю абраблялі сваёй сям'ёй. Толькі часамі ў дажджлівую восень наймалі жанчын капаць бульбу.

Успамінаючы дзяцінства, я сябе амаль не бачу сярод равеснікаў за гульнямі. Толькі запомнілася, як у спякотнае лета ные спіна, салёны пот засцілае вочы, а ты з перавяслам у руках з сумам і надзеяй пазіраеш на неба: калі ж, урэшце, пойдзе той дождж, каб можна было залезці ў бабкі, паляжаць... А то, памятаю, хацелася захварэць, каб адпачыць, выспацца».

Паводле ўспамінаў брата пісьменніка, Уладзіміра Нічыпаравіча, з маленства Аляксей імкнуўся да друкаванага слова. Сем кіламетраў ішоў штораніцы ў школу, сем — назад. Па дарозе чытаў.

Вучыўся Аляксей яшчэ ў польскай сямігодцы (закончыў у 1934 годзе). Прычым разумеў, чаго гэта каштавала бацькам: «Ішлі ў школу толькі тады, калі напасвім кароў. І ішлі не з аднымі кніжкамі. Кожны дзень мы неслі ў горад па 6-7 літраў малака. А з бутэлькамі гэта — паўпуда! Насілі дзень у дзень, зімой і восенню, і гэтак да сёмага класа.

У маім класе з сялянскіх дзяцей вучыліся толькі я ды Сашка Кандрусік з Гарадка, а рэшта былі сынкі польскіх чыноўнікаў, габрэйскіх фабрыкантаў, крамнікаў і іншай дробнай буржуазіі. Зрэбная кашуля, розныя гузікі на ёй, босыя ногі ці не так вымаўленае польскае слова выклікалі ў маіх аднакласнікаў насмешку.

Мною ў класе ганьбавалі. Настаўнікі глядзелі на мяне з цікавай варожасцю, як на выхадца са славутай вёскі, якую паліцыя называла «чырвоным гняздом». Я ўзненавідзеў і школу, і настаўнікаў, і тое, чаму яны вучылі».

Карпюк не перабольшвае. Навука для беларуса ў міжваеннай Польшчы была справай цяжкай — прычым не толькі ў матэрыяльных адносінах. Адзінкі — такія, як вядомы ў будучым на Гарадзеншчыне педагог Уладзімір Іванавіч Баран, — змаглі дамагчыся адукацыі і прызнання сваіх здольнасцяў. Я памятаю распаведы сваёй маці, па словах якой «пані навучыцелька» даймала яе ў школе: «Як то беларускае быдла можа ведаць польскую мову?!» Гэта не азначае, што падобных настаўнікаў была большасць, але падлетку, часам, хапае і аднаго, каб адчуць дыскамфорт ад навучання.

Карпюк апісаў падобны выпадак у аўтабіяграфічным апавяданні «Першы дзень у школе».

Але ж дыскамфорт адчувалі не толькі дзеці. 1930-я — гады найвышэйшага ўзроўню нацыянальнай напружанасці ў польскай дзяржаве. Беларуская меншыня, прадстаўленая ў Сойме групай дэпутатаў з фракцыі Грамады, якія ўсведамлялі свой абавязак, рабілася ўсё больш актыўнай. Польшча, якая сама толькі нядаўна атрымала незалежнасць на хвалі нацыянальнага руху і з цяжкасцю абараніла сваю цэласць пад націскам савецкіх войск (памятны «цуд

на Вісле»), успрымала ідэалогію беларускага нацыяналізму як ідэалогію сепаратысцкую, якая магла прывесці да расколу польскай дзяржавы. Натуральна, што змірацца з гэтым ніхто не збіраўся.

Але нацыянальны рух — імкненне знішчыць кожны зародак «сепаратызму» — меў і свой адваротны бок — ён пераўтвараўся ў рух сацыяльны. Таму натуральна, што пры падтрымцы з усходу актывізаваўся і камуністычны рух — насамперш, Камуністычная партыя Заходняй Беларусі. Актывістам КПЗБ стаў і бацька будучага пісьменніка. «Вера людзей была святой да наіўнасці, упартай да смерці, часамі гранічыла з сектанцтвам. І мой бацька ў сваёй веры быў цвёрды да слепаты, — піша Карпюк. — Ён рэвалюцыйны дух прынёс яшчэ з арміі, у вёсцы арганізаваў ячэйку кампартыі, потым — камсамола».

«Мая Джамалунгма» напісана Аляксеем Карпюком у 1964 годзе. Але нават пасля ўсіх непрыемнасцяў, якія напаткалі яго пасля публікацыі гэтага нарыса, ён яшчэ доўга будзе заставацца і ў гэтых адносінах вартым сынам свайго бацькі і верыць у справядлівасць камуністычнай ідэі, перакручанай кар'ерыстамі і чынадраламі.

А тады, падчас вучобы, абвостранае пачуццё несправядлівасці і ўласнай годнасці выхоўвала ваярскія якасці характару, прымушала шукаць праўду. Невыпадкова ўлюбёнай кнігай, паводле ўспамінаў брата, яшчэ са школьных гадоў для Карпюка стаў раман Джэка Лондана «Марцін Ідэн». Герой Лондана, дужы, валявы, быў для яго ўзорам, з якога варта было «ляпіць» уласнае жыццё.

У 1934 годзе Аляксей закончыў сямігодку. Разам з ёю закончылася маленства. Пачалося юнацтва.

Будучы пісьменнік пасля агульнаадукацыйнай школы працягнуў навучанне — на падрыхтоўчых курсах для паступлення ў польскую гімназію ў Вільні (1938-1939). Вільня — адзін з цэнтраў польскай культуры і адначасова Мекка для беларусаў першай трэці XIX стагоддзя, была на той час месцам бясконцых палітычных баталій, месцам сутыкнення партый разнастайнай ідэалагічнай і нацыянальнай арыентацыі. Уінстан Чэрчыль у свой час сказаў: «Вільня — горад, за які спрачаюцца палякі і літоўцы, але ў якім жывуць беларусы і габрэі». Гэта быў кацёл, у якім выплаўлялася нацыянальная свядомасць і стваралася нацыянальная культура, насамперш беларуская.

Калі ідзеш па вуліцах сучаснай Вільні, погляд звыкла выхоплівае мемарыяльныя дошкі, прысвечаныя Францішку Скарыну, Рыгору Шырму, Браніславу Тарашкевічу, Янку Купалу, Наталлі Арсенневай.

Малады Карпюк апынуўся ў самай гушчыні віленскіх ідэйных спрэчак. Без сумневу, гэтую частку ўласнай біяграфіі ён

«перадаверыць» герою ці не галоўнай кнігі свайго жыцця — аповесці «Данута» — Янку Барташэвічу. Вандруючы ўслед за Барташэвічам па міжваеннай Вільні, мы можам узнавіць і тыя сцежкі — і рэальныя брукаванкі, і сцежкі духоўнага сталення, — па якіх даводзілася хадзіць пісьменніку. Тут, у Вільні, Карпюк наведваўся ў бібліятэку імя Тамаша Зана. Тут сістэматычным робіцца для яго знаёмства з новымі творамі беларускай літаратуры. У кожным выпадку, не выклікае сумневу, што падобна да таго, як Барташэвіч захоплена слухаў чытанне вершаў рэвалюцыйнага беларускага паэта Міхася Граніта, так і Карпюк слухаў вершы Максіма Танка. Паводле ўспамінаў Іны Анатольеўны Карпюк, удавы пісьменніка, ён любіў прыгадваць «вечарыны, на якіх Танк чытаў свае вершы». І «класавыя згрызоты» Янкі, які закахаўся ў генеральскую дачку Дануту, напэўна, маглі быць і адлюстраваннем пакутаў самога Карпюка альбо каго-небудзь з віленскіх знаёмцаў — нягледзячы на тое, што пісьменнік адмаўляў біяграфічны характар «любоўнай лініі» ў сваёй аповесці.

Заканчэнне вучобы ў гімназіі супала з радыкальнай перакройкай карты Еўропы. Савецкая і фашысцкая імперыі, дамовіўшыся пра падзел свету, падзялілі Польшчу. Уз'яднанне беларускага народа, як называўся гэты працэс пазней у савецкіх падручніках па гісторыі, адбылося. Працягваць адукацыю Аляксею давялося ўжо ў Наваградку — спачатку ў беларускай гімназіі, што пераехала з Вільні, а затым у Наваградскай педагагічнай навучальні.

У Наваградку Карпюк не толькі выбраў прафесію — стаў педагогам, але і адшукаў сябра на ўсё жыццё. Ім стаў вядомы ў будучым беларускі пісьменнік і літаратуразнаўца Уладзімір Калеснік. Вось як ён успамінаў пра сябра: «У Еўропе ішла вайна, маладыя галовы кружыліся ад палітыкі, а пары паддаваў старэйшы за астатніх на пару гадоў Аляксей. Ён устанавіў сабе спартанскі рэжым: схопліваўся з ложка на світанні, хутка апранаўся для спортзарадкі, пакуль астатнія «чухаліся», аббягаў газетныя кіёскі, купляў цікавейшыя газеты, прачытваў на бягу і прыносіў у пакой прыгаршчы сенсацый. Соваў газету ў рукі і раіў прачытаць, што цікавейшае, калі ж некаторыя з нас пасля начнога карпення над кнігамі ці над афармленнем сценгазеты або малявання святочных плакатаў спалі, прыкідваліся хворымі, Аляксей бег на кухню, выпрошваў колькі трэба порцый супу на вынас, прыносіў у пакой і, стукаючы лыжкай па вядры, прамаўляў да галодных страўнікаў, заклікаў умывацца, падмацавацца ды ісці на заняткі, веды нашы патрэбны краіне — гэта зброя! ...Аляксей набыў у нас правы рупара грамадскіх ідэй, інфарматара і напамінальніка. Імпанавала ў ім упартая

самастойнасць, незалежнасць меркаванняў, ацэнак і паводзін, пацяшала бяскрыўднае дзівацтва».

Да тых рысаў характару, якія адзначае ў сваім мемуарным нарысе Калеснік, дадамо яшчэ адну: адказнасць. Вельмі рана Аляксей Карпюк адчуў ступень сваей асабістай адказнасці — як і адказнасці кожнага — за ўсё, што адбывалася ў краіне і навакол.

Як правіла, такое ранняе пачуццё адказнасці з'яўляецца прыкметай сфармаванай асобы: юнак адчувае сябе сапраўдным мужчынам.

А сталенне патрабаваў час. Другая Сусветная ўжо ішла, і праз паўтара года яна стала для Карпюка — як і для бальшыні беларусаў — Вялікай Айчыннай вайной.

Паводле ўспамінаў Калесніка, Карпюк быў ці не адзіным з яго знаёмцаў, хто не толькі не разгубіўся, пабачыўшы масавае адступленне савецкіх жаўнераў з Гародні, але сам знайшоў ваенкама і запатрабаваў залічыць яго добраахвотнікам у Чырвоную Армію. Ваенкаму, верагодна, было не да добраахвотнікаў: на самым пачатку бальшыня камандзіраў, улучна з Вярхоўным Галоўнакамандуючым, перабывала ў поўнай прастрацыі. Не быў ажыццёўлены і першапачатковы сумесны план двух сяброў: пайсці на ўсход, атрымаць ваенную падрыхтоўку і далей змагацца ўжо ў якасці сапраўдных жаўнераў. Папросту нікога з Заходняй Беларусі, баючыся шпегаў, далей за былую мяжу не пускалі. І Аляксей Карпюк пайшоў адзін — дахаты, у роднае Страшава, на Беласточчыну.

Гэтага высокага каржакаватага дзецюка, якога ніхто не рыхтаваў да вайны, чакаў цяжкі шлях — шлях партызана, вязня канцлагера, жаўнера, які дайшоў да Берліну.

Карпюк пачынаў партызанскім сувязным. У 1942 годзе ён удзельнічаў у групе, якая павінна была арганізаваць дыверсію на чыгунцы непадалёк ад Ваўкавыску. Тут ён разам з братам Уладзімірам і трапіў у палон.

Да партызанаў фашысты спачатку ставіліся значна горш, чым да жаўнераў, — як да бандытаў. Як «бандыты-партызаны» Аляксей з братам былі адпраўленыя ў канцлагер.

Пра жахі канцлагера Штутгаф, у якім яму давялося правесці больш за паўтара года, стрымана распавёў брат будучага пісьменніка Уладзімір, які напоўніцу выпіў горкую чару лагерных пакутаў: «У 1943 годзе за ўцёкі з канцлагера было ўведзенае гэткае пакаранне. Калі ўцякаў (ці спрабаваў уцячы) вязень, а яго сваяк, таксама вязень, ведаў і не паведаміў пра гэта лагерным уладам, яго паказальна забівалі. У нас вешалі. Калі ж высвятлялася, што сваяк нічога не

ведаў пра запланаваныя ўцёкі, то атрымліваў фізічнае пакаранне— 100 кіёў і карцэр. Трэба было ўлічваць пры планаванні ўцёкаў гэтыя «правілы». Мы з Аляксеем унеслі карэктывы ў наша лагернае жыццё на выпадак паспяховых уцёкаў аднаго з нас. Перайшлі жыць у розныя «штубы» бараку. Стараліся на вочы адзін другому не трапляцца. Але ўцячы можна было толькі з «аўскаманды», гэта значыць, з каманды, якая працавала за межамі лагеру. Штонядзелі набіралася «аўскаманда» на чыгуначную станцыю для загрузкі вагонаў. Яна звычайна складалася з 17 вязняў. Ахоўвалі дзевяць эсэсаўцаў, у тым ліку афіцэр. Праца вялася дзвюма брыгадамі па 8 чалавек у кожнай. Адна працуе 30 хвілінаў, другая адпачывае. Мы з Аляксеем трапілі ў розныя брыгады. Праца зацягнулася дапазна. Уключылі пражэктары. Гэта было нам на карысць. Аляксей спусціўся з вагона паміж буферамі і коламі і папоўз у бок паравоза —за межы бачнасці ахоўнікаў, а там бегам навонкі і праз плот гароду.

Сабраліся разам дзве брыгады. Афіцэр аховы пералічыў вязняў. Не хапае аднаго. Адразу ўсіх зачынілі ў вагоне. Раптам адчыняюцца дзверы, і эсэсавец на нумар 22585 выклікае мяне. Хапаюць пад рукі і валакуць у залу чакання вакзала. Гляджу — начальнік лагера гаўпт-штурмфюрэр СС Маер, рапартфюрэр Хэмніц і яшчэ два афіцэры СС. Прыводзяць жанчыну, якая паведаміла, што праз яе гарод прабег нейкі вязень у паласатым адзенні. Начальнік лагера даў каманду дагнаць вязня. «Загіне Аляксей», — падумаў я.

Пачаўся допыт. Адзін з афіцэраў нацягвае пальчаткі, а Маер пытаецца, ці я брат уцекача? Адказваю: «Так». Патлумачыў, што быў з братам у кепскіх адносінах і жыў з ім паасобку. Але гэта не задавальняла іх. Афіцэр ударыў мяне па твары. Я не ўстояў на нагах. І тут на мяне градам пасыпаліся ўдары. Потым зноў допыт і збіццё. Апрытомнеў на падлозе ў вагоне. І тут мяне пачалі збіваць ужо вязні. Яны ведалі, што ў падобных выпадках паводле лагерных законаў атрымаюць па 10-15 кіёў кожны. Капо спыніў іх. Нарэшце вярнуліся ў канцлагер. Мяне адразу пацягнулі ў блок для допытаў.

Зноў сталі пытацца, ці ведаў я пра намер брата? Я стаяў на сваім: «Не ведаў». Чую каманду: «Вешай!» Мяне падцягнулі да шыбеніцы. «Апошні раз пытаюся!» — крычыць Маер. — Куды накіраваўся твой брат?» Я адказаць ужо нічога не мог. Да такога стану быў збіты. Раптам чую: «Здымай!», а потым каманду: «Усыпаць пяцьдзесят кіёў!»

Я налічыў адзінаццаць удараў, пасля страціў прытомнасць. Апрытомнеў ад вострага болю. Навобмацак вызначыў: вакол бетонныя сцены. Раптам чую крокі ў калідоры. Адчыняюцца дзверы,

мяне ўзнімаюць з падлогі і ставяць на ногі. «Ідзі наперад!» — крычыць Хэмніц і б'е ботам. Мы прыйшлі ў лагер, дзе адбываецца «апэль». Усе вязні пашыхтаваныя. Маёр па гучнагаварыльніку зачытвае: «Вязню № 22585 за ўцёкі з лагера ягонага брата вязня № 22584 ўсыпаць 100 кіёў і адправіць на штрафную працу на лагерную цагельню».

Прыкладна праз тры тыдні мяне наведаў знаёмы вязень — паляк, які добра ведаў Аляксея. Распытаўся пра стан здароўя, падсунуў пад коўдру аркушык паперы і сышоў. Гляджу, гэта ліст ад Аляксея. Ён ужо ў беларускіх лясах, у партызанах, паблізу ад роднай мясцовасці. Якая радасць!»

Так Аляксей Карпюк апынуўся на волі.

Зрэшты, «воляй» яго становішча можна было назваць толькі ў параўнанні са штутгафскім пеклам. Вайна і палітыка кіраўніцтва краіны, звыклага паўсюль шукаць ворагаў, паставілі былых палонных, якія змаглі вырвацца з рук фашыстаў, у становішча падазраваных. А быць падазраваным на той час — амаль тое самае, што загадзя атрымаць прысуд.

Іна Карпюк, жонка Аляксея Нічыпаравіча, згадваючы пра гэта, успамінае вобраз Сахно з памятнай аповесці Васіля Быкава «Мёртвым не баліць»: «Гатовыя былі ўсіх правяраць, не давяраць, знішчаць». Не абмінула гэтая чара і Карпюка — ён апынуўся ў ліку падазраваных.

Вось як апісвае становішча, у якім апынуўся ўцякач з лагера Аляксей Карпюк, каб працягваць змаганне, яго сябра — Васіль Быкаў. «Пасля ўцёкаў з канцлагера Штутгаф, разлеглага ў панізоўі Віслы, і доўгіх блуканняў па тэрыторыі Польшчы Карпюк позным восеньскім вечарам дабраўся нарэшце да роднага хутара каля чыгункі пад Беластокам. Але здарылася так, што, перш чым пабачыць маці (бацька з братам у гэты час таксама знаходзіліся ў канцлагеры), уцякач натыкнуўся на нямецкіх жаўнераў, раскватараваных у сядзібе. Як заўсёды ў падобнай сітуацыі, ратавалі ногі і лес, дзе паўгода таму базаваліся партызанскія групы, з якімі Карпюк супрацоўнічаў. Менавіта пасля адной сумеснай дыверсіі на чыгунцы ён, брат і бацька былі арыштаваныя гестапа і кінутыя ў канцлагер. Але за час ягонай адсутнасці ў лесе сёе-тое змянілася, знаёмых партызанаў там не аказалася, на іх месцы знаходзіліся прышлая партызанская брыгада, паблізу якой і быў затрыманы Карпюк. На першым жа допыце яго расповед пра Штутгаф выклікаў здзіўленне асабістаў («груба працуюць вашы шэфы» — было рэзюмэ «знаўцаў»), і Карпюка пасадзілі пад арышт у зямлянку. Штоночы яго вадзілі на допыты з патрабаваннем прызнацца, якое заданне атрымаў ад

гестапа. Так працягвалася немалы час, і аднойчы Карпюк зразумеў, што хутка ўсё закончыцца. І зноў уцёк.

Напэўна, зрабіць гэта было лягчэй, чым уцячы са Штутгафа, і пад раніцу тае начы ён апынуўся ў раёне дзеяння другой партызанскай брыгады, якою камандаваў малады камбрыг, былы ленінградскі інжынер Вайцяхоўскі. Хутчэй за ўсё, у яго былі іншыя ўяўленні пра пільнасць, чым у суседзяў. Выслухаўшы ўцекача, камбрыг без лішніх словаў накіраваў яго ў выведку — пад нагляд надзейных хлопцаў, якім належала выпрабаваць навенькага боем. Забягаючы наперад, адзначу, што гэтае выпрабаванне цягнулася нядоўга, Вайцяхоўскі зразумеў, з якім хлопцам мае справу, і ўжо праз паўгода прызначыў Карпюка камандзірам новастворанага атрада імя Каліноўскага. Гэтым атрадам Карпюк і пракамандаваў да вызвалення Беларусі ўлетку 1944 года».

Не здзіўляюся гэтай гісторыі не толькі таму, што безумоўна давяраю Быкаву, які не хавае сваіх крыніц: Васіль Уладзіміравіч, на яго словах, «ведаў аб падрабязнасцях карпюкоўскіх прыгод не толькі з яго асабістых расповедаў, але таксама з расповедаў і ўспамінаў самога камбрыга Вайцяхоўскага, які прыязджаў у Гародню, дзе мы сустракаліся ўтрох». Проста мая маці, якую дзяўчынкай вывозілі ў Нямеччыну на працу, таксама ўхітрылася вярнуцца дамоў, уцёкшы ад гаспадара. І яе, як і Карпюка, ледзь не штомесяц дапытвалі гарадзенскія «органы»; як яна, шаснаццацігадовы падлетак, засталася жывая і нават вярнулася дахаты, калі «ўсе сумленныя людзі загінулі ў палоне». Праўда, дапытвалі яе значна пазней — з 1949 года, калі яна падала заяву ў партыю, да 1956 года — да XX з'езда КПСС, які, як тады хацелася верыць, скончыў са сталіншчынай і з пошукам «ворагаў народа». Выпіць чару людскога недаверу да дна давядзецца яшчэ і Аляксею Карпюку.

Але тады, пад час вайны, будучы аўтар «Пушчанскай Адысеі» не мог прадбачыць, што праз дзесяцігоддзі яму давядзецца, адбіваючыся ад незычліўцаў, што накіроўваліся доўгай рукой «кампетэнтных органаў», даказваць сваё гераічнае мінулае. Карпюк змагаўся, як і належыць сапраўднаму мужчыну, сумленна, рызыкуючы жыццём. Яго вялікае дужае цела вынесла з той вайны мноства ран. Сваё апошняе раненне бясстрашны камандзір партызанскага атрада імя Каліноўскага, а затым наводчык артылерыйскага разліку Аляксей Карпюк атрымаў у красавіку 1945 года ўжо на вуліцах захопленага савецкімі войскамі Берліна — напярэдадні афіцыйнага заканчэння вайны. Немудрагелістыя радкі з ліста яго франтавых сяброў бацьку — Нічыпару Аляксеевічу— сведчаць: «Ваш сын Аляксей Нічыпаравіч біў

фашысцкіх гадаў бязлітасна, за што камандаванне нашай часці прадставіла яго да прысваення звання «Герой Савецкага Саюза». Але за гады вайны Карпюк быў узнагароджаны толькі медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені і ордэнам «Айчыннай вайны» II ступені. І адразу пасля вайны — хаця будуць потым, у сваю чаргу, і «юбілейныя» ўзнагароды — Ордэн Чырвонага Сцяга, за вызваленне Варшавы, за перамогу над Германіяй.

Праявіўшы ў баях мужнасць і вытрымку, Карпюк пазней невыпадкова стане адным з першых — і самых удзячных — чытачоў ранняй быкаўскай прозы: каму, як не Карпюку, які ведаў вайну ў самых страшных яе дэталях (канцлагер, будні партызанскага жыцця, трагедыя франтавой батарэі), было пад сілу даць сапраўдную ацэнку «акопнай праўдзе» Васіля Уладзіміравіча?

Пасля вайны Карпюку давялося лекавацца: раны напаміналі пра сябе ўсё астатняе жыццё. Але цяга да ведаў перамагла боль. І Аляксей Нічыпаравіч працягнуў навучанне — на факультэце замежных моваў Гарадзенскага педагагічнага інстытута.

І Карпюк вучыўся. Хоць у «Маёй Джамалунгме» шчыра прызнаўся: «Мабыць, больш за вучобу я палюбіў грамадскую работу. Спачатку я быў камсоргам, потым старшынёй прафкама. Тут мне ніхто ні разу не напомніў аб мінулым»

А напамінаць было пра што. І насамперш — пра даваеннае мінулае. Бацька Карпюка быў актывістам распушчанай Камінтэрнам пад націскам Сталіна Кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Сам Аляксей быў сябрам КСМЗБ. Лічылася, што гэта — таксама «пляма». Аляксей Нічыпаравіч ніколі не хаваў, у адрозненне ад многіх, свайго мінулага, і ўсе, «каму трэба», ведалі пра гэта. Але гэта не перашкодзіла Аляксею ў 1947 годзе паступіць у камсамол.

Тут, у інстытуце, камсамольскі актывіст Аляксей Карпюк сустрэў адзінае каханне ўсяго свайго жыцця — Іну Цыгельніцкую. «Бацька і маці яе былі віднымі кіраўнікамі кампартыі ў часы буржуазнай Польшчы. Бацьку яе, сакратара ЦК Польскай кампартыі (насамрэч — КПЗБ. —*А. Ф.)* Анатоля Адамавіча Альшэўскага ў 1937 годзе берыеўцы арыштавалі, і ён з лагера не вярнуўся. Іна ўсё жыццё правяла ў дзіцячых дамах. Шмат чаго перажыла і пабачыла».

Гэтатаксама патрабавала мужнасці — пакахаць, а потым ажаніцца з дачкою рэпрэсаванага палітыка, расстралянага на Бутаўскім палігоне ў Маскве. Але высокі, дужы, звыклы глядзець у вочы ўсім людзям Карпюк ніколі ў жыцці не адмовіўся б ад кахання толькі таму, што хтосьці мог скоса паглядзець. Ён увогуле не мог здраджваць — ён быў надзейным.

Пасля заканчэння інстытута Карпюк працаваў загадчыкам Сапоцкінскага рана. Тут, у Сапоцкіне, сустрэўся ён з вядомым Лаўрэнціем Цанавам — сустрэчу гэтую апіша пазней у сваіх успамінах.

Затым перайшоў працаваць дырэктарам вясковай школы-сямігодкі і адначасова парторгам калгаса, і, нарэшце, вярнуўся ў alma mater на кафедру педагогікі. Але за гэты час адбылася ці не самая галоўная сустрэча ў яго літаратурным жыцці: стары сябра Уладзімір Калеснік пазнаёміў яго з Янкам Брылём. Сам Карпюк так напіша пра гэтае знаёмства: «Янка Брыль, як некалі Вайцяхоўскі, даваў штуршок майму ўяўленню, стаў эталонам, на які трэба раўняцца, у каго вучыцца, і быў тым, хто ў мяне паверыў, шчыра і бескарысна памог. Успамінаючы цяпер непісьменныя рукапісы, якімі я завальваў Івана Антонавіча і ў якіх ён умудраўся нават знаходзіць яшчэ штосьці каштоўнае, я не перастаю захапляцца душэўнай шчодрасцю гэтага чалавека, яго педагагічным талентам».

Нягледзячы на вонкавае падабенства — абодва, Карпюк і Брыль — нараджэнцы Заходняй Беларусі, былі высокімі, статнымі, дужымі — яны, як справядліва зазначыў Калеснік, моцна адрозніваліся адзін ад аднаго — і характарамі, і літаратурнымі талентамі. Бліскучы стыліст, схільны да філасафічнасці, Брыль непазбежна кантраставаў у сваёй прозе з Карпюком, чыя творчасць была перанасычаная дыялектызмамі, у каго жыццёвая філасофія выяўлялася не так у аўтарскіх развагах, як у сюжэтах. Але Карпюк і не збіраўся стаць «другім Брылём» — ён шукаў уласны шлях у літаратуры, хацеў распавесці людзям пра тое, што набалела яму самому.

Пачынаў Карпюк з таго, што, здавалася, павінна было давацца яму лёгка, — з побытавых замалёвак, празаічных мініяцюр, змест якіх аўтару падказвала жыццё. Напісаў аповесць «У адным інстытуце» — звычайную аповесць, у духу іншых шасцідзесятнікаў. Выказаў у ёй свае ўражанні ад працы на кафедры педагогікі Гарадзенскага педінстытута. Аповесць прайшла не тое каб незаўважанай — але падзеяй не стала. І стаць не магла. Такіх аповесцяў у савецкую эпоху з'яўлялася безліч.

Трэба было, каб у кнізе прагучала іншае. Каб чытач пабачыў у ёй чужы жыццёвы досвед — але паверыў у яго, прыняў, як свой. Чаго хацелася чытачу 50-х гадоў? Чым ён жыў?

Так, нядаўна закончылася вайна. І людзі памяталі пра яе, смуткавалі па загінулых. Але яны і пад час вайны заставаліся людзьмі — кахалі, пакутавалі, губляючы каханых, кахалі нанова. Буры

гісторыі калечаць жыццё, але не адбіраюць маладосці. Каханне на асноведзі гісторыі — вечная тэма.

Так у 1959 годзе з'явілася «Данута».

Гэта не быў раман. Гэта была вялікая аповесць пра каханне. Але менавіта яна на доўгія гады стала для чытачоў візітоўкай пісьменніка Карпюка.

Фабула аповесці простая і знаёмая ўсім з часоў старадаўняга раманса пра тытулярнага саветніка і генеральскую дачку. Толькі ў «Данүце» распавядалася пра юнака-беларуса, навучэнца вячэрняй школы і дачку польскага генерала.

Дзеянне адбываецца ў Вільні. Карпюк добра памятаў гэты горад. З тэкстам «Дануты» ў руках можна прайсці гістарычнымі вуліцамі сучаснай Вільні, як з турыстычным даведнікам 30-х гадоў. Вось — Беларускі музей (імя Луцкевічаў аўтар назваць не можа — забаронена цэнзурай). Вось — універсітэт, дзе чытаў свае вершы паэт Міхась Граніт. А вось тут, падобна, тая самая жаночая гімназія, у якой магла вучыцца Данута і ля сцен якой чакаў яе закаханы Янка.

Карпюк уклаў у гэтую аповесць усяго сябе. Янку Барташэвіча, героя «Дануты», чытачы — паколькі расповед вёўся і ад яго імя — і прымалі за аўтара. Невыпадкова нават лісты яму пісалі — на выдуманае месца працы, у абласны аддзел адукацыі. У нарысе «Перыпетыі пошукаў» (1977) Аляксей Карпюк прывядзе фрагменты некалькіх такіх лістоў:

«Калі ласка, прышліце, дарагі Янка Барташэвіч (даруйце, не ведаю, як Вас па бацьку!), мне фота сваёй Дануты. Я павешу яго над ложкам і буду заўсёды глядзець на яе вобраз — устаючы і кладучыся...»

«Вырашылі мы зрабіць экскурсію ў Вільнюс ды пакласці на Данучыну магілку кветкі. Выязджаем сваім аўтобусам 5 ліпеня ў 6 гадзін раніцы. Просім Вас, дарагі таварыш Барташэвіч, к нам далучыцца. Калі ўжо не зможаце з намі паехаць, то тэрмінова напішыце нам, прынамсі, дзе яе магіла...»

«Кончив читать, я вслух кричала: Сволочь! Сволочь! Идиот! Хуже того Рыжего, что лупил тебя на сцене! Мало он тебя лупил! Ведь ты коварнее его! Любил ты Дануту, когда она тебе была недоступна, когда же она тебе стала доступной — ты стрелял ее! За что, фриц ты?! А Дануту, свою любовь, не удалось самому удушить, и ты оставнл ее на растерзание немцам, зверюга ты!»

Нічога дзіўнага: чытачам 60-х гадоў мінулага стагоддзя хацелася верыць у тое, што існавалі і гэтая дзяўчына, і гэты хлопец, і гэтае

каханне. Карпюку ўдалося стварыць тыповую біяграфію для свайго Янкі. Хлопец з Заходняй Беларусі прыходзіць у Вільню, каб атрымаць адукацыю. Ён з беднай сям'і — і цягнецца да радыкалаў з віленскага камуністычнага падполля. Генеральская дачка для яго — «класавы вораг», так што адзін уплывовы літаратар (імя Карпюк у «Перыпетыях пошуку» з ветлівасці не называе) папракае Аляксея Нічыпаравіча: «Што, дзяўчыны сваёй не мог яму падабраць, ці якая халера?!» Але каханне павінна ж перамагчы ўсе перашкоды? Вядома ж, павінна. Хочацца чытачу, каб яно перамагло. І калі аўтар наўслед за гістарычнай праўдай кідае сваіх герояў у пекла Другой Сусветнай вайны, заканчвае сваю аповесць смерцю Дануты, — гэта ўспрымалася ўжо як жорсткая несправядлівасць. Адны чытачы былі гатовыя аплакаць Дануту разам з Янкам, другія — выдрапаць яму вочы.

Карпюк апраўдваўся: «Каб ажаніў Леў Мікалаевіч свайго Вронскага з Ганнай Карэнінай, каб паслаў гэтую пару на цёплыя воды ў Неапаль, каб скончыў на гэтым раман, — твор людзі забылі б яшчэ ў мінулым стагоддзі. І каб Шолахаў выдаў Аксінню замуж за Грышку Мелехава, зрабіў яе старшынёй сельсавета, а яе казака — кіраўніком Вёшанскага валвыканкама і на гэтым скончыў твор, — не было б «Ціхага Дона»...»

Але Карпюк тут відавочна хітруе, не хлусіць, але і ўсю праўду сказаць не можа. Невыпадкова пісьменнік і паралелі праводзіць з такімі класічнымі творамі, якія не маглі закончыцца шчасліва. Ня той час у іх апісваецца, калі шчасце магчымае. З тэксту «Дануты» не вынікае, ці ведаў яе аўтар пра трагедыю Катыні — але пра трагедыю сям'і ўласнай жонкі, бацька якой быў абвешчаны ворагам народа і рэпрэсаваны, Карпюк ведаў добра. Бо і адно з выданняў аповесці падараваў ён — паводле сямейнай традыцыі надпісаўшы першы асобнік — «галоўнаму герою — жонцы Іне». І напішы ён пра шчасце інспектара абласнога аддзела адукацыі і дачкі генерала з буржуазнай Польшчы — гэта было б хлуснёй. А хлусіць Карпюк не мог і не хацеў ніколі. Прасцей было б завершыць аповесць трагічным фіналам — такім, у які паверылі б чытачы, што прайшлі вайну.

І яны паверылі.

«Дануту» Карпюк, паводле яго ўласнага прызнання, перапісаў трыццаць два разы. Аповесць была таго вартая. Нягледзячы на трагічны фінал, «Данута», магчыма, — лепшы празаічны твор пра каханне, напісаны па-беларуску. Хоць бы таму, што гэта сапраўды «аповесць пра каханне», а не пра рэвалюцыю, не пра вайну, не пра

калекгывізацыю. Хіба толькі «Альпійская балада» Васіля Быкава вартая стаць з ёю на адну паліцу.

Але «Альпійская балада» — усё ж не галоўная кніга Быкава. А «Данута» для Карпюка — галоўная. Такой яе прызналі чытачы. Вось, напрыклад, што напісаў аўтару Міхась Забэйда-Суміцкі, прачытаўшы падараваную яму аповесць: «Вялікую радасць зрабілі Вы мне сваім падарункам: «Данута», ды яшчэ з такім надпісам, якім чалавек можа ганарыцца. Кніжку чытаў, мала сказаць, з зацікаўленнем, — чытаў з захапленнем! У Вільні і сам бываў, і ўсё тое, аб чым Вы пішаце, мне вельмі блізка. І думак, і пачуццяў супольных там знайшоў столькі, што аж здзівіўся. Да Вашае кніжкі яшчэ не раз вярнуся!.. Шчыры Вам за яе дзякуй».

Потым, пасля «Дануты» было яшчэ многа напісана. Была «Пушчанская адысея» (1964). Уладзімір Калеснік,тонкі і сумленны крытык, ставіць яе ў агульны шэраг беларускай рэалістычнай прозы пра вайну, які ён пачынае творамі Кузьмы Чорнага, чыім пераемнікам, поруч з Карпюком, становяцца Васіль Быкаў, Янка Брыль і Алесь Адамовіч.

Гэта справядліва. «Пушчанская адысея» — сумленная кніга, як і ўсё, напісанае Карпюком, таму і робіць яна свой унёсак у «дэміфалагізацыю» вайны. Але трэба прызнаць: нягледзячы на дакладнасць назіранпяў, яскравасць вобразаў, у гэтай аповесці Карпюк не дасягае тае філасофскае глыбіні абагульнення, якая характэрная, прыкладам, для ваеннай прозы Быкава ці Брыля. У яго іншы талент. Гэта было відаць ужо ў «Дануце», дзе трагічны сэнс існаваў не таму, што яго выводзілі з прыпавесці (бо што ёсць «Сотнікаў» ці «Memento mori», як не прыпавесці?), а таму што абставіны ператваралі ў трагедыю тое, што спачатку здавалася сацыяльна-побытавай драмай. Маральны і фактычны подзвіг Дануты асабліва ўражваў на асноведзі таго пустога жыцця, якое вяло яе атачэнне ў мірнай буржуазнай Вільні.

Побыт — вось тое, што ўдавалася паказаць Карпюку, можа быць, як нікому з сучаснікаў. Цагляныя сцены гімназіі, нагрэтыя за дзень сонцам, край белай сукенкі гераіні, які быццам выслізгвае з тваіх рук, — гэтыя амаль фізічныя адчуванні няўлоўныя, іх амаль немагчыма перадаць.

І — мова герояў. Карпюк— бясспрэчны майстра моўнай індывідуалізацыі. Яго персанажаў пазнаеш па дыялекце. Паляк — нават у беларускай моўнай інтэрпрэтацыі — застаецца ў яго палякам, літовец — літоўцам, беларус — беларусам.

Грымучая сумесь «трасянкі» выбухнула ў ягоным рамане «Free Вершалінскі рай» (1970-1973).

Аляксей Карпюк з дакладнасцю прыгадаў усё, што чуў у маленстве і юнацтве, і прымусіў сваіх герояў размаўляць на той мове, на якой яны толькі і маглі думаць, спрачацца і нават прызнавацца ў каханні.

Хоць у «Вершалінскім раі» месца для кахання не застаецца. Гэтая суворая, недаацэненая крытыкамі кніга — гістарычны раман. Дзеянне яго адбываецца практычна ў той самы час, што і ў «Дануце» — магчыма, трохі раней.

У вёсцы Грыбоўшчына, што паблізу роднага карпюкоўскага Страшава, з'явіўся свой прарок — Ілля, ці, як яго называюць аднавяскоўцы, Гальяш Клімовіч (персанаж, дарэчы, рэальны — Карпюк вывучыў яго гісторыю задоўга да таго, як стаў працаваць дырэктарам Музея атэізму і гісторыі рэлігіі). Прарок абвясціў святароў дармаедамі, якія набіваюцца ў пасярэднікі паміж Богам і вернікамі, і так уразіў народ, што людзі пайшлі ў створаную ім секту «гальяшоўцаў». І верылі Гальяшу — ажно да той пары, пакуль ён не паведаміў дату незабаўнага канца свету.

І ў канец свету паверылі! Пачалі тэрмінова прадаваць хаты, нажыты скарб — з сабою ж на неба ўсё роўна нічога не возьмеш. Але канец свету так і не настаў. І вырашылі вернікі распяць свайго самазванага прарока, якога яшчэ нядаўна багомілі.

Агулам, як сказаў бы адзін сучасны філосаф, «старая праблема — правадыр і натоўп, які позна ці рана выступае супраць свайго правадыра».

Цікава, што першае выданне «Вершалінскага раю» пабачыла свет у 1974 годзе з паказальнай анатацыяй: «Новая аповесць А. Карпюка — мастацка-гістарычнае даследаванне эпідэміі сектанцтва, якая была захліснула Заходнюю Беларусь на пачатку 20-х гадоў». Нават сябра і крытык-добразычлівец Уладзімір Калеснік папракнуў Карпюка: «Патуранне «антыопіумнай» праграме супрацьпаказана мастаку, шкодзіць творчасці чужая стандартная ацэнка, бо замыкае яна творчую фантазію і звужае пісьменніцкую здольнасць ужывацца ў душы і лёсы розных людзей, ставіць сябе на іх месца». Хоць відавочна, што справа зусім не ў сектанцтве і не ў спробе будучага дырэктара Музея атэізму і гісторыі рэлігіі — гэтую пасаду ўрэшце зойме Карпюк і будзе захоплена збіраць экспанаты для свайго музея — развеяць «опіумны дым» рэлігійных перакананняў.

У «Вершалінскім раі» Карпюк па-майстэрску даследуе прыроду таталітарызму. Правадыр-харызматык (а Гальяшу не адмовіш у харызме) умела карыстаецца слабасцямі народа, яго неадукаванасцю, недалёкасцю. Яго асабісты дабрабыт магчымы толькі да тае пары,

пакуль людзі не задумваюцца над тым, наколькі горай стала жыць пад «мудрым кіраўніцтвам» правадыра, пакуль не губляюць апошняе. І толькі тады робяцца відушчымі.

Але і відушчыя, яны не прыходзяць да святла. Хутчэй, расчараваныя ва ўчорашнім правадыры, яны помсцяць яму як махляру. Хоць — і гэта Карпюк паказвае па-майстэрску — яны падманваюцца самі, таму што вераць Гальяшу толькі тыя, хто не гатовы паверыць ва ўласныя сілы, хто імкнецца апраўдаць сваю бездапаможнасць і бяздзеянне верай у моцнага і добрага заступніка, у шчасце, якое прыйдзе без працы — само, у якасці ўзнагароды за перажытыя пакуты.

Тэнгіз Абуладзэ яшчэ не зняў сваё славутае «Пакаянне». А ў Аляксея Карпюка старая Піліпіха здае ўчорашняга куміра немцам — маўляў, усыпце яму, антыхрысту. Тыя — чаму не зрабіць прыемнае пажылой фраў? — расстрэльваюць «антыхрыста», толькі россып куляў палохае вераб'ёў і вясковую дзятву.

Варлама ў фільме Абуладзэ выкідвае з магілы ўласны сын — з горыччу, расчараваны, даведаўшыся пра злачынствы бацькі. Гальяша аддае на пагібель тая, што яшчэ ўчора малілася на яго — аддае ў прыпадку раздражнення. Для героя Абуладзэ такое развітанне з мінулым (нават калі яно асацыюецца з яго ўласным бацькам) — крок наперад па дарозе да Храма. Злосць і бяссілле вернікаў становяцца прычынай смерці Гальяша — але яго нядаўнія паслядоўнікі ні на пакаянне, ні на ачышчэнне не здольныя. Цемра моцна трымае іх у сваіх жорсткіх лапах — ды і самі яны зусім не імкнуцца вырвацца з яе да святла, да храма.

Ды і да якога храма? Да таго, што будаваў Гальяш? Хіба ж гэта — Храм?! Хіба здольны чалавек з таталітарным светапоглядам прывесці люд — хай сабе і той, які яму безаглядна верыць, — да Храма?!

Цэнзура адчула сілу карпюкоўскай кнігі з большай дакладнасцю, чым крытыкі. Невыпадкова ніводзін тэатр не прыняў да пастаноўкі п'есу «Канец свету», напісаную аўтарам паводле «Вяршалінскага раю».

Хіба толькі ў Польшчы паставілі «Вяршалінскі рай» — з купюрамі і не паводле аўтарскай п'есы, а паводле сцэнічнай версіі драматурга Тадэвуша Слабадзянека. У нашым выданні п'еса «Канец свету» друкуецца ўпершыню.

Прачытаўшы «Вяршалінскі рай», пачынаеш разумець: збліжанасць з дысідэнцкім рухам для Карпюка была абсалютна натуральнай. Ён ненавідзеў любы духоўны гвалт, ненавідзеў шчыра.

Гэта не азначае, што пісьменнік жыў, як гаворыцца, «з дуляй у кішэні». Наадварот, да канца перабудовы, да яе ідэалагічнага краху, азначанага штурмам у студзені 1991 года тэлевежы ў Вільні, Аляксей Нічыпаравіч, наколькі можна меркаваць, шчыра верыў у магчымасць пабудовы новай грамадскай фармацыі, якая б грунтавалася на прынцыпе ўсеагульнай роўнасці. Але ён бачыў, як рэалізуецца гэтая ідэя ў Савецкім Саюзе, як не адпавядае савецкае грамадства дэклараваным высокім ідэалам. І не змагацца з гэтымі «скрыўленнямі», «адхіленнямі ад ідэалаў» Карпюк не мог — папросту таму, што звык абараняць справядлівасць.

Так ён стаў членам невялікага інтэлігенцкага гуртка. У які, апрача яго самога, уваходзілі яшчэ два вядомыя гарадзенцы — Васіль Быкаў і выдатны гісторык, доктар навук Барыс Клейн. Гэтая «гарадзенская тройка» зусім не займалася арганізацыяй антыўрадавых пікетаў і дэманстрацый. Як сведчыць Іна Карпюк, «хто б дазволіў у тыя часы нейкія гурткі? Проста тры мужчыны збіраліся і размаўлялі, без гэтага асоба немагчымая».

Але наўрад ці справа выглядала так проста. Гэтыя «тры мужчыны збіраліся і размаўлялі» ў памежнай Гародні, за трыццаць кіламетраў ад традыцыйна гатовай да бунту Польшчы. У «правільнасці» той мадэлі сацыялізму, якую будавалі тагачасныя «верныя ленінцы», на той час публічна ўсумніліся і ў Будапешце, і ў Празе. Ды і сам па сабе інтэлектуальны патэнцыял гэтых трох людзей, звыклых думаць і аналізаваць рэчаіснасць, быў надзвычай вялікі. Тым больш, што ўсе трое ўмелі пісаць (Барыс Клейн быў аўтарам некалькіх кніг па гісторыі Беларусі, таленавітым гістарычным публіцыстам), да іх хінулася моладзь.

Карпюк не звык прыхоўваць свае перакананні. Ягоны выступ на V з'ездзе Саюза пісьменнікаў БССР 13 траўня 1966 года быў рэзка крытычным у адносінах не толькі да літаратурных нораваў, але і да многіх рэалій савецкага жыцця, якія ён як сумленны чалавек не мог не крытыкаваць.

«Толькі раўнадушны чалавек, якому не дарагія нашы заваяванні, што дасталіся такім дарагім коштам, можа праходзіць міма адмоўных бакоў нашага жыцця, не ўздымаць іх у творах.

Ці ж у нашай краіне так усё ўжо гладка?»

Пэўна ж, не ўсё было гладка. І ў сваім выступе з высокай трыбуны з'езда пісьменнік крытыкаваў і кампартыю, і ўсемагутны КДБ, заступаўся за апальнага сябра Быкава, які нядаўна падпаў пад аглабельную партыйную крытыку за аповесць «Мёртвым не баліць»:

«Эх, каб усе артыкулы пра Быкава мелі адно тыя скуткі, што людзі па бібліятэках рынуліся чытаць яшчэ раз нашага і так шырокавядомага і таленавітага гарадзенца. Бяда ў тым, што сігналы зверху, покуль дойдуць да нізу, у нас часамі становяцца вульгаршчынай.

Па гарадзенскіх школах работнікі КДБ адразу пачалі чытаць лекцыі пра пільнасць, прыводзіць прыклады, што побач з Сіняўскім, Даніэлем і наш Быкаў, бачыце, пісаў творы, якія накіраваны на падрыў Савецкай улады і разлагаюць моладзь. Уявіце сабе, як было слухаць такую лекцыю дзецям-школьнікам і яго жонцы-настаўніцы!

На партактыве першы сакратар абкама таварыш Міцкевіч І. Ф. аб'явіў усім, што Быкава ўжо апрацоўваюць італьянскія фашысты, а нейкая фашысцкая газета ўзяла яго на ўзбраенне. Дзіва, і як той Быкаў, халера, пасля ўсяго таго зачасаўся ў прэзідыум V з'езда беларускіх пісьменнікаў і сядзіць побач вунь з першым сакратаром ЦК КПБ т. Машэравым? Глядзіце, ці не з якой мэтай!..»

Такія выступы вымагалі немалой мужнасці. Калі Быкаў, якога своечасова ацаніў лідэр беларускіх камуністаў Пятро Машэраў, меў, да таго ж, магутную падтрымку ў Маскве ў асобе рэдактара часопіса «Новый мир» Аляксандра Твардоўскага (аўтару «Василия Теркина» на той час дазвалялася многае), то Карпюк цалкам знаходзіўся ў руках мясцовай улады. Тым больш нечаканым быў ягоны публічны выступ у падтрымку сябра. У «Литературной газете» нашмат пазней Быкаў напіша: «Думаў, ніхто не заступіцца. Але заступіўся А. Карпюк».

Аднак не толькі мясцовыя ўлады цікавіліся «негатыўным» уплывам Карпюка. 16 кастрычніка 1992 года, а затым і 16 лютага 1993 года ў газеце «Комсомольская правда» журналіст Дзмітры Бабіч апублікаваў фрагменты дакладных запісак у ЦК КПСС самога Юрыя Андропава — усемагутнага шэфа саюзнага КДБ: «Карпюк нелегальна распаўсюджвае сярод сваіх знаёмых разнастайныя пасквілі ў выглядзе кнігі Аксёнавай-Гінзбург «Круты маршрут» ды іншыя. Адмоўна ўплывае на моладзь. Пад ягоным уплывам студэнт Гарадзенскага педінстытута Малашэнка піша вершы, прасякнутыя песімізмам і ўпадніцтвам, некаторыя з іх утрымлівалі шкодны палітычны сэнс».

Андропаў мог бы многае дадаць да гэтай характарыстыкі. Акурат ён павінен быў добра ведаць, што Карпюк ліставаўся з Аляксандрам Салжаніцыным, Ленартам Мэры, Віктарам Астаф'евым ды іншымі далёка не добранадзейнымі дзеячамі культуры. Ён актыўна падтрымліваў Ларысу Геніюш, якая пасля вызвалення з лагера жыла ў Зэльве, так і не прыняўшы савецкага грамадзянства.

Былі ў кіраўніка абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў і міжнародныя кантакты — з людзьмі, што таксама знаходзіліся пад падазрэннем, з эмігрантамі (прыкладам, са спеваком Міхасём Забэйдам-Суміцкім).

20 красавіка 1972 года бюро Гарадзенскага абкама КПБ выключыла Аляксея Карпюка з партыі. Яшчэ раней — у 1971 годзе — з партыі быў выключаны і Барыс Клейн.

У сваіх успамінах, фрагменты якіх мы публікуем у раздзеле «Дадатак», Барыс Самуілавіч Клейн пераканальна паказвае задушлівую атмасферу правінцыйнага горада, калі ты жывы — але не можаш уладкавацца на працу, і нават сябры твае радзей сустракаюцца з табой. Клейн перадае сваю размову з другім сакратаром абкама кампартыі Рыгорам Фамічовым, які гэтак патлумачыў, чаму абкам не дае апальнаму гісторыку выехаць з Гародні і ўладкавацца на працу ў другім горадзе:

— Не, вы нам патрэбныя тут. Нам трэба, каб, калі вы ідзяце па горадзе, людзі глядзелі на вас і разумелі, што мы можам зрабіць з імі, калі яны будуць паводзіць сябе так, як вы.

Карпюк не захацеў адмовіцца ад сябра, пазбаўленага навуковай ступені і другіх навуковых рэгалій. Прайшоўшы праз жахі канцлагера, ён не мог спалохацца пагрозаў камуністычнага чыноўніка, які з насалодай думаў пра маральныя экзекуцыі, наладжаныя сумленным людзям, уся віна якіх — у іншадумстве. Аляксей Карпюк працягваў сустракацца з апальным гісторыкам і публічна абараняць ягоную рацыю. Тым больш, што кампетэнтныя органы займаліся і ім самім.

Карпюка таксама пазбавілі працы. Вось як прыгадвае тыя часы яго жонка, Іна Анатолеўна:

— Як мы выжылі фізічна і матэрыяльна, цяжка зразумець. Білі па самых балючых вітальных «кропках».

Іна Карпюк мае на ўвазе элементарнае: пасля таго, як галава сям'і пазбавіўся працы, у сям'і з трыма дзяцьмі настала безграшоўе. Пяць чалавек жылі на яе настаўніцкі заробак:

— Я працавала ў школе, дзе мяне ўзнагародзілі 32 гадзінамі тыднёвай нагрузкі, што дапамагала неяк выжыць. І гэта быў сапраўдны подзвіг для тых, хто кіраваў школай. Нормай было іншае: «И кто-то камень положил в его протянутую руку...»

У дзвюх школах адначасова працавала і старэйшая дачка — Алена. Дзве жанчыны, жонка і дачка, неслі цяжар адказнасці за сям'ю, — і ад гэтага мужу і бацьку было яшчэ цяжэй. Менавіта тады

Аляксей Карпюк і напісаў свой «Вершалінскі рай» — пра утопію, што падманула надзеі даверлівых людзей. Як гаварыў гарадзенскі партыйны чыноўнік Ульяновіч, пісьменнік «ударился в религию». Хоць, як мы ўжо бачылі, чыноўнік памыляўся.

Што ж было нагодай для такой страшнай экзекуцыі над франтавіком і партызанам, вядомым пісьменнікам, ардэнаносцам? Фальсіфікацыя — звычайнае пакаранне, якое ўлада выкарыстоўвае ў барацьбе з іншадумцамі. Супраць Карпюка выкарыстоўвалася скрайне цынічная фальшыўка: яго звінавацілі ў тым, што ён супрацоўнічаў з немцамі ў канцлагеры Штутгаф.

У нарысе «Варашылаўскія стралкі», апублікаваным увосень 1989 года, Карпюк так апісаў калізію: «Падпалкоўнік КДБ Ф. заехаў у Штутгаф і прывёз адтуль фотакопію ведамасці, паводле якой я атрымаў тры разы па дваццаць марак. «Карпюк у лагеры быў на службе!» — зрабіў ён вывад ды пачаў супраць мяне заводзіць крымінальную справу. ...Даведаўшыся пра ўсё, мой даўні сябар, аўтар шматлікіх кніжак Аляксандр Амільяновіч тэрмінова з'ездзіў у той самы Штутгаф, з лагернага музея дабыў тлумачэнне, што грошы атрыманы мной ад бацькі, цераз іншых польскіх пісьменнікаў пераправіў мне яго праз граніцу, і Ф. застаўся з носам. Аднак з партыі мяне з трэскам папёрлі».

Звінавацілі не проста былога вязня канцлагера. Звінавацілі, нагадаем, чалавека, які змог уцячы з яго ў 1943 годзе, працягваў барацьбу ў ім самім арганізаваным партызанскім атрадзе, а потым добраахвотнікам пайшоў на фронт, дзе быў двойчы паранены — апошнім разам цяжка, ля сцен рэйхстага. Звінавацілі і ў тым, што ён прыхаваў ад партыі сваё сацыяльнае паходжанне: Карпюк нібыта паходзіў з кулацкай сям'і. Як адзначыў сам пісьменнік у лісце на імя Пятра Машэрава, «усё гэта пацвярджалася строгімі праверкамі ў тыя гады, калі правяралі па свежых слядах».

Горка і балюча чытаць гэты і другія лісты Карпюка, напісаныя пасля выключэння з партыі. Жонка пісьменніка, Іна Анатолеўна, характарызуе гэтыя паводзіны словам «замітусіўся». Справа была не ў мітусні, для якой не існавала падстаў: віны за сабою аўтар «Пушчанскай адысеі» не адчуваў ніякай. Але ў яго было трое дзяцей, і выключэнне з партыі — «воўчы білет» у тых умовах — асуджала іх на жабрацкае жыццё.

Больш дакладна ахарактарызаваў сітуацыю вядомы архівіст Віталь Скалабан, які па нашай просьбе вывучаў «справу Карпюка» і звязаныя з ёю дакументы, што зберагаюцца ў фондах былога архіва ЦК КПБ. Па словах Віталя Уладзіміравіча, з дакументаў відно, як

улада ламала моцнага і мужнага чалавека, змушаючы яго гуляць па сваіх правілах: партыя не магла «памыляцца», і нават дапамагчы чалавеку маглі толькі ў тым выпадку, калі ён «каяўся» і «прызнаваў свае памылкі». Мы адмовіліся ад ідэі публікацыі лістоў Карпюка ў партыйныя інстанцыі таму, што яны не адлюстроўваюць ягоных сапраўдных думак і перажыванняў, яны — вымушаныя, вымучаныя. Час для навуковай публікацыі такіх дакументаў пакуль не прыйшоў.

А «ненавуковая» публікацыя адбылася ўжо на зыходзе камуністычнага ўсёўладдзя, у сумна вядомым часопісе ЦК КПБ «Политнческий собеседник». Палкоўнік у адстаўцы Якаў Ледзянёў паставіў свой подпіс пад артыкулам, дзе Карпюк звінавачваўся ў двурушніцтве. Пры гэтым аўтар выкарыстаў у сваім «артыкуле» тэксты тых самых змушана пакаянных лістоў Аляксея Нічыпаравіча — як быццам меў копіі дакументаў з партархіваў проста ў сябе дома. Цені «органаў» стаялі за аўтарам гэтага «твора», змест якога пазней быў аспрэчаны судом.

А тады Карпюку ўдалося дастукацца да першага сакратара ЦК КПБ Пятра Машэрава. Ён прарваўся да Машэрава праз нешматлікую ў параўнанні з нашымі часамі ахову ў перапынку аднаго з урачыстых пасяджэнняў у Оперным тэатры. І дамогся, каб на наступны дзень яго прынялі і выслухалі.

Машэраў, сам партызан часоў Вялікай Айчыннай вайны, вельмі добра павінен быў уяўляць сабе, што ж адчувае пазбаўлены ўласнага гераічнага мінулага ўдзельнік вайны. Але і фармальны гаспадар Беларусі Машэраў заставаўся палоннікам уласнага статусу і мусіў выконваць пэўныя правілы партыйнага этыкету.

Партыя не магла памыляцца. А значыць, без «пакаяння» «вінаватага» не магло адбыцца і яго наступнае «дараванне».

Існуе прыгожая легенда. Пасля таго, як «справа Карпюка» была разгледжана на бюро ЦК КПБ, Машэраў, які на ім старшыняваў, паставіў пытанне на галасаванне: пацвердзіць выключэнне Карпюка з партыі, альбо абмежавацца строгай вымовай за «нявартыя камуніста» паводзіны. Галасы падзяліліся: трое за выключэнне, трое — за вымову.

Машэраў, які галасаваў апошнім, нібыта заявіў: першы сакратар ЦК, улічваючы складанасць пытання, не можа фактычна адзін пазбавіць камуніста партбілета, — і далучыўся да тых, хто прагаласаваў за вымову.

Гэта легенда, якой нам не ўдалося знайсці пацверджання. Але партбілет Карпюку вярнулі.

Верагодна, таму, што Машэраў сапраўды заступіўся.

Аналагічную сітуацыю апісаў у сваіх успамінах сябра Карпюка Барыс Клейн. Ён распавёў пра свой візіт да новапрызначанага першага сакратара Гарадзенскага абкама кампартыі Леаніда Кляцкова. Кляцкоў выслухаў Клейна, пазбаўленага навуковай ступені і магчымасці выкладаць, паабяцаў разабрацца і дапамагчы з працай. Пасля чаго дадаў: «Майце на ўвазе, я не з крыважэрных».

Такую фразу не прыдумаеш. Водападзел унутры партыйнай эліты СССР — і БССР у тым ліку — праходзіў менавіта так: крыважэрныя верныя ленінцы, і тыя, хто крыважэрнасцю не адрозніваўся і спадзяваўся, што сацыялізм можа быць гуманным нават у адносінах да сваіх апанентаў.

«Гуманны сацыялізм»! У 1993 годзе часопіс «Нёман» пасмяротна ўжо апублікаваў успаміны Карпюка «Развітанне з ілюзіямі» — горкую і сумленную кнігу, працяг той самай «Маёй Джамалунгмы», пасля якой пачалося цкаванне пісьменніка. Аляксей Нічыпаравіч распавёў ва ўспамінах, як цяжка даваўся яму перагляд уласных — шчырых — перакананняў, як прайшоў ён шлях ад веры ў камуністычныя ідэалы да расчаравання ў іх. Пісьменнік-партызан стаў адным з нямногіх прадстаўнікоў свайго пакалення, хто знайшоў у сабе сілы перагледзець уласнае мінулае і абраць — праўду.

Гэтага яму і не схацела даравАць камуністычная ўлада. Чым болей адчувала яна ў Карпюку разумнага і сумленнага апанента, тым болей цкавала і пераследавала. Як напіша ў лісце да складальніка гэтай кнігі Барыс Клейн, «ёсць дастаткова матэрыялаў для доказу таго, што ў Гародні ў 1971-1972 гадах была рэалізаваная схема дэзарыентацыі грамадства адносна нашай групы. Быкава ўзялі пад пільны кантроль як «ачарніцеля слаўнага мінулага», які паддаўся варожаму ўплыву, Карпюка «выкрылі» як агента гестапа, а мяне залічылі да сіяніцкай агентуры. Гэтая схема спрацавала і ў другі раз, напачатку 1990-х, калі нам давялося распачаць два судовыя працэсы: адзін перад смерцю Карпюк выйграў, другі ж — па нашым з Міхасём Ткачовым зыску — да суду не дапусцілі».

Усе гэтыя фальшывыя, надуманыя, неаднаразова абвергнутыя звінавачванні зноў спатрэбяцца ўжо ў часы перабудовы, калі партыйныя органы зноў захочуць скампраметаваць Карпюка — занадта відавочным быў ягоны аўтарытэт у вачах інтэлігенцыі

Але ж Карпюк шчыра прыняў перабудову і імкнуўся рэальнымі справамі даказаць, што час змяніўся, што «крыважэрныя» больш ніколі не будуць кіраваць ягонай краінай і дыктаваць ягонаму народу, што і як рабіць, думаць, на якой мове размаўляць.

Падчас перабудовы патэнцыял грамадскага дзеяча Карпюка праявіўся цалкам. Аляксей Нічыпаравіч стаяў ля вытокаў усіх значных грамадзянскіх ініцыятываў на Гарадзеншчыне. Ён выступаў за з'яўленне польскіх школаў, развіццё габрэйскай культуры, і натуральна, што галоўным клопатам для яго стала адраджэнне беларускай мовы і культуры.

Дом Карпюка заўсёды быў цэнтрам прыцягнення для інтэлігенцыі — прычым не толькі гарадзенскай. Тут гасцяваў, прыехаўшы на радзіму, Міхась Забэйда-Суміцкі. Праз утульны кабінет Аляксея Нічыпаравіча прайшлі многія значныя беларускія пісьменнікі — Вольга Іпатава, Данута Бічэль ды іншыя. Прызнаны лідэр гарадзенскіх літаратараў, шматгадовы кіраўнік Гарадзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, Карпюк па-бацькоўску апекаваўся пачаткоўцамі, стараўся дапамагчы ім. Шчыльна кантактавалі з Карпюком і менскія вучоныя-фізікі, якія пад кіраўніцтвам Юрыя Хадыкі стварылі пры Інстытуце фізікі Акадэміі Навук Беларусі Музей старажытнай беларускай культуры. Працягвалі абмяркоўваць з пісьменнікам самыя актуальныя пытанні старыя сябры-гісторыкі — Барыс Клейн і Міхась Ткачоў.

У які момант Карпюк пачаў пераглядаць свае перакананні — цяжка сказаць. Відавочна, што гэта давалася яму нялёгка. Ён шчыра верыў у магчымасць пабудовы грамадства сацыяльнай справядлівасці, а таму, як і Ткачоў з Клейнам, ішоў ад камуністычнай ідэі да ідэі сацыял-дэмакратычнай. Магчыма, меў месца ўплыў новага генеральнага сакратара ЦК КПСС — Міхаіла Гарбачова, які публічна загаварыў пра «сацыялізм з чалавечым тварам». І Карпюк цяпер абараняў — як яму здавалася, разам з новым кіраўніком краіны — менавіта чалавечнасць, права кожнага заставацца самім сабой.

Але ён апынуўся далёка наперадзе — і новай улады, і новай апазіцыі. Гэты стары чалавек, які шмат перажыў і перадумаў, застаўся верным самому сабе ў галоўным: ён змагаўся за справядлівасць! Прынцып справядлівасці здаваўся Карпюку галоўным — вышэйшым за ўсе астатпія.

Пісьменнік і свой гонар пайшоў абараняць у суд, дамагаючыся, каб закон дзейнічаў. Ён зноў і зноў хадзіў на паседжанні, адпрэчваючы ўжо не аднойчы адпрэчаныя сфальсіфікаваныя абвінавачванні на свой адрас, выстаўленыя то ветэранамі савецкіх спецслужбаў, то партыйнымі функцыянерамі. Карпюк ізноў супрацьстаяў уладзе.

І калі ў студзені 1991 года, калі Аляксей Нічыпаравіч выйшаў на мітынг, каб пратэставаць супраць захопу віленскай тэлевежы

АМАПам пад кіраўніцтвам будучага намесніка міністра абароны Беларусі Уладзіміра Усхопчыка, супраць гібелі ні ў чым невінаватых людзей, якія абаранялі сваю краіну і сваё права на свабоду слова, ён даказаў, што застаўся самім сабой — тым самым Карпюком, які звык адстойваць праўду.

Сёння аўтару гэтых радкоў сорамна: тады я знаходзіўся з ім па розныя бакі барыкадаў. Я быў карэспандэнтам гарадской партыйнай газеты і напісаў рэпартаж з таго мітынгу. І калі мы сустрэліся праз два тыдні на той самай плошчы, я адчуў на сабе цяжкі і тужлівы погляд Аляксея Нічыпаравіча: ён ведаў, што я — вучань ягонай жонкі. Больш за тое, ён рэкамендаваў мяне яшчэ ў студэнцкія гады на семінар маладых пісьменнікаў (праўда, даведаўся я пра гэта толькі ў 2006 годзе). Але тады, на плошчы, ён не сказаў мне ні слова...

Ён цяжка хварэў у апошнія гады жыцця. Працягваў працаваць, дапісваў успаміны, рабіў нататкі ў запісных кніжках, спадзяваўся, што паспее рэалізаваць свае задумы. У адрозненне ад героя свайго рамана «Карані», дзеда Лаўрэна, ён не быў адзінокі — пры ім была яго сям'я, якая любіла яго і імкнулася прыняць на сябе частку ягонага болю, дапамагчы яму. Але дапамагчы было ўжо немагчыма...

Новая ўлада суверэннай Беларусі — і цэнтральная, і мясцовая, гарадзенская — і пасля смерці не змяніла сваіх незычлівых адносінаў да пісьменніка-франтавіка. Пасмяротная кніга з «нёманскімі» ўспамінамі, што рыхтавалася да друку ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», пабачыла свет толькі ў некалькіх сігнальных асобніках. Адзін з іх быў перададзены ўдаве Карпюка, Іне Анатольеўне. На памяць?

Верагодна, як стрэмка, каб балела, прымушаючы памятаць пра нявыдадзеную кнігу, як пра нявыкананы абавязак.

Перасталі выдавацца кнігі. Не здымаюцца фільмы па ягоных творах — хоць і «Данута», і гістарычная аповесць «Белая Дама» так і просяцца ў серыялы. І вуліцу ў Гародні, дзе ён пражыў цэлае жыццё, не назвалі ягоным імем, і мемарыяльную дошку на доме, дзе жыў, не павесілі.

Ён заўсёды быў западта нязручным для любой улады. Магчыма, таму, што і па сёння кіруюць Гарадзеншчынай многія з тых, хто калісьці выключаў яго з кампартыі ці арганізоўваў супраць яго паклёпы, чамусьці лічачы сябе, а не Карпюка, сапраўднымі камуністамі. А магчыма, таму, што справядлівасць яны разумеюць не так, як разумеў яе бескампрамісны франтавік Аляксей Карпюк.

І — не толькі для ўлады. Хоць пісьменнік і не дажыў да эпохі «рынкавага сацыялізму», але нават гады перабудовы паказалі, што і

для апазіцыі ён заставаўся «не зусім сваім» — занадта «левым» паводле перакананняў, занадта «інтэрнацыяналістам». Магчыма, таму што не ўкладваўся ў схемы, быў недастаткова гнуткім для тых, хто перабягаў з лагера ў лагер у пошуках больш цёплага месца. А сапраўдныя змагары за справядлівасць — такія, як сам Аляксей Нічыпаравіч — зноў засталіся незапатрабаванымі.

Але старыя гарадзенскія брукаванкі да гэтай пары добра памятаюць яго цяжкія крокі — крокі стомленага чалавека, які прысвяціў жыццё пошуку справядлівасці і адышоў непераможаным — у Вечнасць.

*Аляксандр Фядута*

www.kamunikat.org

НЕ ХОЧУ Я ГНИТЬ КАК ИВА,
НА БОЛОТНЫХ КОЧКАХ ГДЕ-ТО,
А ХОЧУ СГОРЕТЬ ОТ МОЛНИЙ,
СЛОВНО ДУБ В РАЗГАРЕ ЛЕТА!..
*Шандар Пецёфі*

# Данута

## Аповесць

*Пра ўсё гэта расказаў мне ў санаторыі адзін чалавек. Ад яго я пачуў, бадай, не новае: як сустракаліся закаханыя, рвалі кветкі, пісалі лісты, спрачаліся... Адным словам, выслухаў яшчэ адну гісторыю на «вечную тэму». Але гісторыя гэта — пра каханне ў бурлівы час вялікіх падзей, і таму яна мне здалася значнай.*

*Перада мной была аповесць — пра каханне, барацьбу і геройства. І вось перадаю яе на суд чытача такой, як пачуў, нічога не дадаючы і не адымаючы.*

Аўтар

### ЧАСТКА ПЕРШАЯ

#### Раздзел першы

**1**

У пачатку восені 1938 года я прыехаў у Вільню і паступіў на вячэрнія курсы пры жаночым ліцэі.

На курсы ішоў той, хто не мог трапіць у гімназію або быў пераростак, як я.

Мы не бывалі ў памяшканні ў час заняткаў дзённай змены, і з гімназісткамі, як мы звалі вучаніц ліцэя, курсанты не бачыліся.

У ліцэі і на курсах канцылярыя была адна, ёй спатрэбіўся пасыльны. Узялі мяне. Так я займеў доступ да дзённай змены.

У першы дзень работы даручылі разносіць па Вільні пісьмы.

Выканаўшы заданне, я вярнуўся ў ліцэй. У зале ішоў канцэрт. Я наблізіўся да зашклёных дзвярэй і крадком паглядзеў. Такога бачыць яшчэ не даводзілася. Як зачараваны, я доўга ўзіраўся.

У зале выступаў хор. На сцэне выстраіліся, адна ў адну, прыгожыя паненкі ў новенькіх уніформах. Дастаткова было зірнуць, каб пераканацца, што жыццё гэтых паненак праходзіла ў такім дастатку і радасці, пра якія мне і не снілася.

Скончыўшы песню, пяюхі сціскалі вусны, крывілі іх, усё перажывалі: будуць ім апладзіраваць ці не; у вачах былі такі спалох і чаканне, што стала нават шкада харыстак.

Але я зараз жа адагнаў ад сябе добразычлівасць. Вось такім мая маці заносіла ў горад усё да каплі малако. Такія абыходзілі мяне ў пачатковай школе здалёк, не хацелі сядзець за адной партай, бытта я заразны! У маёй вёсцы ад цяжкай работы дваццацігадовая дзяўчына — старая дзеўка, у трыццаць пяць бабуля, аў горадзе ўсё - паненкі, каб вы паздыхалі!

Адну харыстку я пазнаў.

Гэта была мая суседка – дачка генерела. Паненка бянтэжылася больш за ўсіх. Яе разгубленасць была нявіннай і мілай. Калі паненка заспявала, вочы яе зрабіліся натхнёныя, яна пасмялела, поўны пачуцця голас, паліўся роўна і так кранаў за душу, нібы ішоў не з яе, а з маіх грудзей.

Яшчэ дзяўчына мела зграбную постаць. Каб не прадузятасць, я мог бы адразу сказаць, што яна — рэдкая прыгажуня. Але я пачаў выдумляць на суседку тое, чаго не было.

Мы, курсанты, адчувалі сябе пакрыўджанымі лесам і зайздросцілі дзённай змене — недасяжнай мары. Наглядзеўшыся на выпеставаных, гадаваных на масле і смятане паненак, я толькі ўздыхнуў, паціху вылаяўся — халера! — ды адправіўся ў канцылярыю рабіць справаздачу.

Сёння насіў я пісьмы ў мужчынскую гімназію і праз адчыненыя вокны бачыў гімназістаў. Гэта былі не нашыя курсанты — нжмелыя, стомленыя ад працы, апранутыя хто ў што.

Асабліва запомніліся іх разбэшчаныя твары, бессаромныя вочы. Гімназісцікі ў новенькіх мундзірчыках не маглі спакойна ўседзець і некалькі хвілін за партай. Хіхікалі, крывілі морды, перакідваліся паперкамі...

Ідучы з ліцэя, я ніяк не мог забыцца на харыстак. Тады пастараўся ўспомніць нахабныя вочы гімназістаў і, нібы перада мною стаяла дачка генерала, упікнуў яе:

— Спявай з імі, яны табе падпяюць!..

Толькі так падумаў і надышоў на саміх харыстак. Мая суседка была ў цэнтры ўвагі. Яна з натхненнем апавядала:

— О-ей, калежанкі! Вы сабе не ўяўляеце, як цяжка выйсці перад хорам і запяваць! Як падумала, што на мяне будуць глядзець, ногі так і прыраслі да падлогі! Глянула прафесару[1] ў вочы, а ён прыязна ўсміхаецца, і я адразу пасмялела. Потым ужо нічога не бачыла, толькі яго вочы!

Ад захаплення сваім апавяданнем яна аж свяцілася шчырасцю і даверам, і хоць вочы яе былі пакіраваныя ў мой бок, мяне яна, вядома, не бачыла. Паненкі глядзелі на яе аддана, з абажаннем і скрытай зайздрасцю.

Агорнутая новай хваляй успамінаў, суседка загаварыла яшчэ больш жыва:

— А вы не заўважылі, як я забылася на словы песні? Не?!. Шапчу вам: «Скажыце, як пачынаецца «Гураль»[2]. Вы думалі, я жартую, і маўчыце. Піяніст іграе апошні такт уступлення, а ў маёй галаве — пуста! І толькі ў апошнюю секунду аднекуль узяліся словы! Можа, ніколі ў жыцці яшчэ так не стамлялася!

Гімназісткі свабодна, на ўсю вуліцу засмяяліся.

Тое, пра што яны гаварылі, было даволі цікавым, але і такім недасяжным, што мне аж стала крыўдна.

Фу ты! Выразам свайго твару я падсвядома паўтараў выраз твару паненкі і толькі цяпер спахапіўся. Імгненна згасіў усмешку замілавання і азірнуўся.

Не, здаецца, ніхто не бачыў.

2

Вярнуўся я тады з ліцэя і, як ніколі, зноў адчуў несправядлівасць на гэтым свеце.

У Вільні мяне праследавалі адны няўдачы.

Ад нас тут вучыўся і Генрых Станеўскі. Маці мне наказвала, калі будзе пільная патрэба, звяртацца да яго за дапамогай. Генрых быў не з нашай, а з суседняй вёскі. Прадзед яго перабраўся ў наш край з Памераніі і прыстаў да мжцовай дзеўкі. Бацька Генрыха вёў гаспадарку па-навуковаму, і іхняя сям'я жыла лепш за другіх, хоць зямлі мела зусім мала. На адным лузе з Генрыхам пасвіў я каровы, а потым маці пасылала мяне кожнае лета купляць у яго падручнікі: Генрых ішоў на клас вышэй, быў выдатнікам, а падручнікі ў яго былі без ніводнай плямкі.

---

1 У Польшчы ўсіх настаўнікаў ліцэя называюць «прафесар»

2 «Г у р а л ь» — польская народная песня.

І вось у Вільні мы сустрэліся. У першы дзень. Я з клункам валокся з вакзала па адным баку вузенькай вулачкі, а ён насустрач — па другім. Станеўскі вёў паненку.

— Гэнек! — закрычаў надта ўзрадаваны я.

Зямляк адвярнуў галаву — бытта не чуў. Спачатку я нічога не зразумеў, пабег за ім. Цяпер ужо не крычаў, а — кашляў. Тады абагнаў і яшчэ раз пайшоў насустрач.

Дарма!

Уцяміўшы нарэшце, што здарылася, здзіўлены і пакрыўджаны, я доўга яшчэ стаяў на тратуары пустой вулачкі. Супакоіўшыся, пачаў чытаць на слупе аб'яву: «Сдам бісплатна фатеру студэнту, калі згодзіцца дапамагаць у гаспадарцы ўдаве...» Гэта мне якраз і трэба было!

Знайшоўшы жыллё, я пакінуў свае рэчы ў гаспадыні і накіраваўся ў сталовую. Мне яшчэ ніколі не даводзілася есці ў сталовых. Афіцыянтка прынесла абед. Паабедаўшы, я акуратна склаў талеркі ды панёс на кухню.

Дзяўчына мяне... аблаяла!

Але найбольш адхвастаў мяне ксёндз.

На Зарэчнай вуліцы змяшчаўся закрыты інтэрнат ордэна езуітаў. З вжковых сямігодак сюды набіралі хлопцаў, якія жадалі стаць духоўнымі пастарамі.

Ксяндзом стаць абы-хто не мог: юнака два гады вывучалі.

У інтэрнаце хлопцаў адзявалі, кармілі, пасылалі на працу ў друкарню касцельных выданняў, а вечарам — займацца на нашыя курсы. Большасць з іх езуіты потым прыладжвалі туды, дзе ім патрэбны былі свае людзі. І толькі самых здольных, вытрыманых і адданых пасылалі на тэалогію.

У езуіцкіх выхаванцаў, нашых курсантаў, былі не зусім у парадку дакументы, і сакратар праз мяне паслаў ім пісьмы.

— Прашу ў памяшканне! — спаткаў у праходнай будцы мяне ксёндз і забраў канверты.

Я падаўся за ім.

Адправіўшы хлопца за патрэбнымі вучнямі, ён сеў за стол, пасадзіў мяне насупраць.

Пакойчык быў чысценькі і строга абстаўлены: дубовы стол без накрыцця, дзве табурэткі, этажэрка з касцельнымі часопісамі, а над этажэркай — крыж з фігуркай Хрыста. На стале — сподак з чорнымі слівамі, французскія і лацінскія кніжкі, касцяны нож і мае фірменныя канверты.

Чакаючы вучняў, мы моўчкі вывучалі адзін аднаго.

Мне прыйшлі на памяць словы Луцэвіча, аднаго з работнікаў беларускага краязнаўчага музея. Апавядаючы мне пра гісторыю Вільні, ён чытаў статут езуіцкіх каледжаў XVII стагоддзя: «Вучань павінен быць паслушны, як труп, як воск або як кій старога...» Мяне тады аж скаланула — ну ж і настаўнічкі тады былі; не дай бог трапіць да тых канавалаў!

Гэты ксёндз не меў езуіцкай сухасці. Наадварот! У ім было штосьці свецкае, нават вялікапанскае.

Старанна дагледжаныя ружовыя пальцы езуіта жвава склалі канверты ў акуратны стосік, тады пачалі выбіваць на стале нейкі такт.

— Працуеце пасыльным? — добразычліва пацікавіўся.

— Ага.

— О-о!— падхапіў ён, бытта я сказаў вельмі значнае і прыемнае.

Дагэтуль бачыць так блізка ксяндзоў не даводзілася. У маім уяўленні гэта былі людзі, у якіх з твару і вачэй так і білі фальш і хітрасць — чым яны заблытваюць ды запалохваюць простых і наіўных людзей. Але перада мной сядзеў сімпатычны інтэлігент. Чорная сутана была на ім добра адпрасаваная і чысцюткая, а край белага і бліскучага ад крухмалу каўнерыка прыемна гарманіраваў з шыяй маладога і дужага мужчыны. Твар у ксяндза быў старанна паголены, прычоска ўкладзена волас у волас, загарэлы адкрыты лоб, а карыя вочы глядзелі на мяне смела і разумна, заклікаючы да шчырасці.

Мой позірк затрымаўся на кніжцы «Гінекалогія. Жаночыя хваробы. Праф. Гутэнберг» — было золатам выціснута на яе карашку. Я сарамліва ўзняў вочы на ксяндза.

Ён вытлумачыў:

— Наша прафесія такая, шаноўны пане, што мы павінны ведаць усё, нават пра жаночыя хваробы!

Са здзіўленнем я ўставіўся на яго.

— Пашлюць у вёску на работу, звернецца да цябе цётка за парадай, што ёй будзеш гаварыць?

«Прафесія», «работа»!..

— Адкуль вы прыехалі? — спытаўся ён мяккім прыемным барытонам, і яго карыя вочы абдалі мяне прыязным цяплом, а рух — пахам адэкалону.

Я адказаў. І, адчуваючы якоесьці хваляванне, у сваю чаргу спытаўся, кім ён працуе.

— Выхавальнікам. Маю пад апекай дваццаць юнакоў, такіх, як пан.

Асмялеўшы яшчэ больш, я вырашыў дзейнічаць.

Гэтае пытанне я падрыхтаваў даўно першаму папу, рабіну або ксяндзу, з якім завяду гутарку.

Ад нецярпення мяне аж разбіралі дрыготкі. Збіваючыся на даверліва-наіўны тон прастачка, я пачаў:

— Даруйце... Я хацеў даведацца ад каго-небудзь...

— Але ж, калі ласка, вельмі прашу! — заахвоціў ён прыязна.

— Скажыце, як гэта вы, адукаваны чалавек, у наш час можаце прысвяціць сваё жыццё справе, якая не мае будучыні?

Вухнуўшы гэта, я зірнуў яму ў твар і ўбачыў па ім прыкрае і неўразуменнае здзіўленне. Толькі цяпер падумаў, што такая размова небяспечная, бо ў горадзе да мяне — ні адной прыязнай душы. Я адразу страціў упэўненасць, і мне зрабілася страшнавата.

— Вы пра што?—у вачах ксяндза быў ужо ледзяны холад.

Ён жа занадта ведаў «пра што», аднак пытаўся, каб выйграць час.

Уся мая ідэалогія тады трымалася больш на веры, чым на лагічным мысленні. Кулакамі — справа іншая, але словамі вытлумачыць свае погляды я не ўмеў. Але ж славесны паядынак пачаў, і трэба было яго скончыць. Успамінаючы студэнта, які чытаў у нашай вёсцы даклад, я паўтарыў яго фразы:

— Навука пра эканоміку гаворыць, што выйсце не ў тым, да чаго вы заклікаеце людзей... Народ трэба зраўняць, людзей парабіць багатымі, а не...

І я бездапаможна змоўк.

— Наіўны! — паблажліва кінуў езуіт ды зрабіў такую грымасу, з якой бывалы настаўнік навучае школьніка, калі той памыляецца.— Пан усё спрошчвае. Прырода чалавека такая, што адно матэрыяльнае багацце не суцішае страсцей. Каб было так проста, усе багачы сталі б ідэальныя людзі і шчаслiўцы!

Ад лёгкасці, з якой ліліся яго словы, і ад глыбіні думкі ў іх, ад напружання, з якім я стараўся нешта прыдумаць, каб абараніцца, у мяне закружылася галава.

— Вы самі бачылі зблізку багатых людзей?

— Бачыў...

— Усе яны, думаеце, ідэальныя? — аж надта адчуваючы, што я сказаў няпраўду, і літасціва яе не заўважаючы, вёў ён допыт.— Думаеце, яны шчаслівыя ў асабістым жыцці?

— ?!.

— А-га! Значыць, выйсце не ў тым, каб усе былі роўныя ды багатыя, ці не так?

Я нешта прамычаў, а коёндз упёр у мяне вочы і наўмысна трымаў мяне некалькі хвілін у такім разгубленым стане. З роспаччу я адчуў, як пад яго ўладарным позіркам мая воля растапнела.

Вытрымаўшы паўзу, езуіт разбіваў мяне да рэшты:

— Пан недзе штосьці чуў, але гэта ў пана несур'ёзнае, не сваё. А ці ведаеце,— загаварыў ён ужо добразычліва,— на свеце ёсць яшчэ зайздрасць, рэўнасць, імкненне да ўлады? Мае яно ўплыў на чалавека ці не?

— Мае...— паддаўся я пераканаўчай сіле, з якой гаварыў субжэднік.

— А-га! — узрадаваўся ён.— І гэтага ў чалавека не пераменіць эканамічная дактрына! Гэта можна вытравіць, толькі падняўшы інтэлект... Дык вось, шаноўны пане, не праз нівеліроўку і бунтарства трэба нам ісці. Неабходна памагаць касцёлу ачысціць людзей ад прыроднага бруду, а тады будаваць ім шкляныя замкі!

Я не меў аргументаў адбівацца. І адчуваў, што якія б аргументы ні прывёў, ён — вопытны дыскусант — з такой жа лёгкасцю іх разаб'е. Аднак мая ўпартасць не дазваляла прызнаць сябе пераможаным. Я ў бжсільнай злосці маўчаў.

Езуіт ні словам не намякнуў, што я гавару крамольныя рэчы. Толькі адсцябаўшы мяне як след, паблажліва ўсміхнуўся, бытта выйшла па яго. Тады падсунуў сподак, гасцінна запрапанаваў:

— На, з'еш, пан, сліўку!

Здаецца, каб ён даў па твары, так мяне не ўнізіў бы.

«Пачакай, пачакай! — пасвятлела ў маёй галаве на вуліцы.— Калі я хадзіў у школу, мяне не кожны сусед, едучы нават паражняком, падвозіў?! Часамі курыца адной цёткі залезе ў агарод другой, і бабам сваркі ўжо хапае на ўсё жыццё!.. А багатыя, нябось, не дробязныя. Яны ўважлівыя і ветлівыя адзін да аднаго!..»

Успомніў іншыя выпадкі з жыцця сваёй вёскі, якія не здараюцца сярод людзей інтэлігентных, сытых, якіх не грызе нэндза. Але і багатыя не могуць быць узорам, яны — дармаеды! Фанабэрлівыя, раўнівыя... Зусім інакш сябе паводзілі б працоўныя, калі б мелі ўсяго ў дастатку. Яны-то былі б шчаслівыя!..

Ды і дзяржава, будзе час, адпадзе сама па сабе — гаварылі ж пра гэта студэнты! Тады і людзі з імкненнем да ўлады вымруць, як вымерла прафесія лучнікаў, калі людзі не сталі карыстацца лукамі...

Мне ўжо надта карцела зноў счапіцца з ксяндзом, захацелася нават вярнуцца.

«Не трэба нівеліроўкі, па-твойму? А што? Сказаць людзям: «Панове, будзьце добрымі, а вы, нявольнікі,— церпялівымі — і

выпраўляйце ў сабе інтэлект!.. Так, па-твойму? Ах, панскі паслугач, а дулю бачыў?»

«Эх, і заўсёды думкі ў маю тупую даўбешку прыходзяць, калі па ўсім ужо!»

«Нічога. Другі раз прынжу пісьмы і дам табе здачы, будзеш ведаць!.. От, езуіт праклялы! Набраў смірненькіх хлапчанят і адурманьвае опіумам, пра які гаварыў студэнт, яшчэ і тэорыю падводзіць пад свае ўчынкі!..»

Доўга не мог я супакоіцца. Цэлы той дзень адчуваў сябе пабітым.

3

У мяне было перакананне, што я ў Вільні — няпрошаны госць і каб паехаў дахаты, ніхто гэтага і не заўважыў бы. А яшчэ здалося, што я зусім нічога не варты.

Зайшоў я ў беларускі музей. Ён быў бедны. Экспанаты віселі на цвіках, ляжалі на сталах, а то і проста валяліся на падлозе. Грошай за ўваход у музей не бралі, таму я ўжо быў у ім некалькі разоў. Мяне сюды цягнула таямнічая маўклівасць старажытных рэчаў.

Ля горбы наздраватых мамантавых касцей нейкая вясковая цётка расчаравана казала:

— То такія самыя дзве косткі мой тата-нябожчык, калі былі яшчэ жывыя, прывалаклі з-пад Вільні! Вада іх аднекуль прыгнала...

— І што з косткамі вы зрабілі? — ажывіўся супрацоўнік музея.

— Клалі пад ложак, каб хлопцы радзіліся.

— Ну і як?

— Былі і хлопцы...

— Радзіліся і дзяўчаты?

— Вядома, былі і дзеўкі...

— А што потым з косткамі зрабілі?

— Крышылі ў кубак і пілі ад жывата, калі напрадвесні каго схопліваў...

— Памагала?

— Ад адной толькі,— зусім сур'ёзна адказала цётка. Калі навокал зарагаталі людзі, жанчына азірнулася, поўная асабістай годнасці і здзіўлення: чаго вы зубы скаліце?..

Чамусьці гэтая кабеціна нагадала мне мяне самога. Вось і я таксама не разумеў навакольных людзей, як не разумелі і яны мяне. І ў мяне поўна наіўнасці, вясковай цемры, няведання жыцця і няма чагосьці такога, што маюць культурныя людзі.

Найбольш гэта праявілася на канцэрце.

4

На курсах падышоў да мяне выкладчык фізікі і прыязна спытаў:

— Ну, як кавалер сябе адчувае ў нашым горадзе?

— Сумна часамі бывае, пане прафесар.

— То схадзіце куды-небудзь, развейцеся: на канцэрт, у кіно...

— Грошай няма, пане прафесар.

— Гэта ўжо горай... Ідэя! — цаппуў сябе ён за кішэню.— Вось вам білет у тэатр. Там будуць вяршкі горада, паглядзіце, паслухайце!

— Наво-ошта... Не трэ-эба...— замяўся я.

— Схадзіце, схадзіце, а то ў мяне не будзе часу і білет прападзе...

— Дзякуй, пане прафесар...— пачырванеў я, задаволены.

Нядаўна ў Варшаве праходзіў сусветны конкурс піяністаў імя Шапэна. Першыя месцы там занялі савецкія музыканты — Якаў Зак і іншыя. Іх славутыя выступленні мы слухалі па чарзе па дэтэктарнаму прыёмніку з навушнікамі. Але нашыя дзяўчаты ніяк не маглі станцаваць пад гэтую музыку.

— А-а, ужо ведаю, што ён іграе!.— закрычала дзяўчына.— Ён жа «На рэчаньку» рэжа, адно пад вальс-бастон!

Толькі падабрала такт і тупнула, каб пайсці кружыцца, як Якаў Зак выстукваў ужо незразумелае — без складу і ладу, дзяўчына асеклася.

Аднак лаяць музыку тады ў нашай вёсцы ніхто не пасмеў, бо калі нават ужо буржуі самі прысудзілі, што савецкі хлопец здорава іграе, значыць, ён іграў выдатна.

— Паны, сволачы, перадаюць ігру гэтак спецыяльна. Каб адбіць у людзей ахвоту слухаць савецкага музыканта,— вырашылі тады нашы мужыкі.

А разумнікі яшчэ дабавілі:

— Калі хочаш мець поўнае здавальненне, трэба на яго глядзець, калі музыкант іграе. Покуль у свет перадаць музыку, буржуі яе самнуць, як хочуць!

У Вільню прыехаў з-за граніцы відны піяніст. Дзякуючы добразычліваму фізіку цяпер і я буду глядзець і слухаць майстра.

Прыйшоў я ў тэатр, сеў паміж паноў.

Пачалося выступленне піяніста. Людзі замерлі. Музыкант спрытна забегаў пальцамі па клавішах. Наступіла такая цішыня, што здалося — у зале нікога няма, і зрабілася нават страшна. Я сабраў волю, напружыў увагу і ператварыўся ў слых.

Дзіва, што людзі так слухаюць?

Са сцэны несліся голыя пераборы, бытта піяніст забаўляўся на інструменце, бегаючы па ім жвавымі і гнуткімі пальцамі то ўлева, то ўправа. Дапусці і мяне да іеструмеета, зайграю не горш — у яго ігры няма сэнсу! От, падбяры-некалькі таноў і стань папераменна націскаць на клавішы!

Вось ён бярэ ноты: першую-пятую, першую-пятую і трэці раз першую-пятую. Тады іх мяняе: першую-трэцюю-шостую, першую-трэцюю-шостую, затым — другую-чацвёртую-сёмую. Тады некалькі разоў разразіцца тырадай нот уверх-уніз: паказвае на інструменце якісьці фокус. Яшчэ пачне ўрывак нейкай мелодыі, бытта дражніцца, перарве яе на самым цікавым месцы і зноў выстуквае тры разы першую-пятую ноты. Затым — першую-трэцюю-шостую...

І так без канца! Ніякай прыемнасці.

А назвы таго, што іграе: «Шуман. Рэ мажор», «Дзевятая саната», «Чатырнаццатая саната»... Нібы на выстаўцы абстракцыяністаў, дзе я таксама нічога не зразумеў, а карціны называліся «Нумар 118», «Блок нумар 112»... І чаго людзі ходзяць на такія канцэрты? Буржуі, свалата, няма іншай работы!

Я пазяхнуў і стаў азірацца па залу.

Фанары кідалі касыя снапы святла на сцэну. У адным такім снапе промняў хутка махала сярэбранымі крыльцамі жывая істотка. Ляцела моль, якую я таксама ўпершыню ўбачыў у Вільні. Гаспадыня мая казала, што моль харчуецца вопраткай. А што яна есць тут, у зале?.. Ага, бархат на крэслах. Во, паляцела да плюшавай заслоны! — здагадаўся я, калі матылёк знік у напрамку сцэны.

Перада мной тырчала лысіна. Валасы ў мужчыны раслі толькі каля вушэй. Каб прыкрыць галаву, ён адрасціў бакенбарды сантыметраў на дваццаць і зачэсваў іх уверх, рассцілаў веерам па голым чэрапе. А каб валасы не раскідаліся, мужчына іх змачваў вадой. Бедны, кожныя паўгадзіны, відаць, бегае пад кран мачыць іх. Жыццё лысаму!.. І чаму ў горадзе іх столькі?! У нашай вёсцы, здаецца, няма ніводнага лысага, а тут — амаль кожны настаўнік на курсах лысы, крамнікі за прылаўкамі лысыя...

Злева сядзеў пажылы чалавек з хлопчыкам. Чалавек ад музыкі рухаў смешна пальцамі, бытта штосьці хапаў у паветры, гучна дыхаў, нібы ехаў на веласіпедзе і яму цяжка круціць педалі. Ён, бедны, аж спатнеў, і на скронях павіслі бліскучыя кроплі! Мае паводзіны суседу не спадабаліся, ён памяняўся месцам з сынам, перасадзіў хлопчыка да мяне.

З правага боку ў мяне сядзела жанчына. Калі ў зале зааплядзіравалі, яна спыталася:

— Няўжо вам не падабаецца канцэрт?

Я пацісную плячыма:

— Што тут можа падабацца?

— Не разумею, як можаце так казаць! — У тоне яе я ўлавіў жаласлівую інтанацыю, з якой звяртаюцца да цяжкахворага.— Вы ж толькі ўслухайцеся! Гэта ж не музыка, а — гудзенне лесу ў час буры!.. Чуваць, як цурчыць крынічка...

— Вы бывалі ў буру ў лесе? І чулі, як ён гудзіць?.. Чулі, як цурчыць сапраўдпая крынічка? — абрэзаў я жанчыну.

Ішоў я з канцэрта сам не свой. Мяне не пакідаў выраз шчырага здзіўлення, спагады на твары жанчыны і інтанацыя яе голасу. У Варшаве, выходзіць, давалі ўзнагароду менавіта за такую ігру, дык няўжо там былі дурні? Мне далёка да слухачоў у зале: да мяне, нібы да глухога, не дайшоў ні адзін гук. Я нагадваў цётку з музея.

«Ці вырвуся калі з гэтага?» — пытаўся я ў сябе трывожна.

5

Праўда, няма чаго прыбядняцца. На працягу тыдня здарыліся ўжо два выпадкі, калі і я адчуў сваю сілу.

Аднойчы на першы ўрок не з'явіўся выкладчык, і курсанты высыпалі на двор. Ля валейбольнай сеткі якраз трэніравалася група гімназістаў з суседняй гімназіі.

Валейбалісты ўсе былі рослыя і стройныя юнакі ў цёмна-фіялетавых спартыўных касцюмах. Яны лёгка і прыгожа перакідвалі адзін другому мяч, а сваім выглядам нібыта крычалі: вось якія мы хваты, зірніце на нас! Але перажывалі, што іх адно шэсць чалавек і няма з кім гульнуць па-сапраўднаму. Мы іх абступілі цесным колам.

- Хоць бы яшчэ хто надышоў! — з сумам азваўся самы зграбны, нават не пазіраючы ў наш бок. Вядома, гаварыў гэта, бадзяга, знарок, каб мы чулі.

Як намі ні валодала гордасць, аднак мы не перамаглі спакусы. Пяць курсантаў, не згаворваючыся, апынуліся ўраз па супрацьлеглым баку сеткі. Мой зямляк, Генрых Станеўскі, загадаў мне:

— Ставай яшчэ і ты, доўгі, аднаго не хапае!

Я стаў, адчуваючы ўдзячнасць да сябра.

Відаць, рэдка на той пляцоўцы бывалі такія няроўныя партыі. З аднаго боку — натрэніраваныя і спрытныя валейбалісты, партрэты якіх памяшчаліся нават у віленскіх газетах, а з другога — сапраўдны «збор багародзіцы» — нжкладныя, апранутыя хто ў што. У аднаго шыя перавязана брудным бінтам, у другога тырчалі худыя плечы. Адзін

маленькі, другі вялізны — усё ў нас было бытта навыварат! Толькі Станеўскі не ўступаў гімназістам сваёй упэўненасцю і паставай.

Пачалася ігра.

Нашыя праціўнікі не гулялі, а пісалі мячом у паветры.

— Чок-чок-чок! — Ён толькі звінеў і пасля трэцяга ўдару ляцеў на нас і спакойна сабе падаў на зямлю.

— Ну, што вы! — шыпеў Станеўскі.

Дарма! Мы не маглі ўзяць нават простай падачы.

З нашай каманды я быў найгоршы ігрок. Праходзіла мінута за мінутай, а мне не ўдавалася забіць ніводнага мяча. Ён, пракляты, лётаў, як прывід, у мяне перад носам, а я бездапаможна махаў рукамі. Што ж, іграў я ў валейбол першы раз у жыцці.

Тым часам пачалі збягацца гімназісты-балельшчыкі. Праз хвіліну іх стала больш за курсантаў.

— Глядзіце, як доўгі мух ганяе!

— Яго толькі замест пудзіла ў агарод ставіць!

— Фі-іў!..

Я гэта чуў і сваё няўмельства пастараўся замаскіраваць. Прыкінуўся, што фокуснічаю.

З'явіліся суддзі. Падача ўжо ішла па свістку. Кожны раз, калі мы не маглі ўзяць простай падачы, гімназісты-балельшчыкі ўзнімалі віск. Толькі не радаваліся нашыя праціўнікі. З высакароднай ганарлівасцю яны ігралі сабе далей, упэўненыя, што так і павінна быць.

Але тут здарылася нечаканае.

Бог мяне не пакрыўдзіў ростам і сілай. Памяняліся мы месцамі, і я апынуўся ля сеткі. Раптам гляджу — проста на мяне апускаецца мяч. Я спачатку аж не паверыў сваім вачам, а за гэты міг мяч знізіўся ўжо на ўзровень выцягнутай рукі і мяне надта ж раззлаваў. З разгубленай паспешнасцю я рэзнуў па ім так, што кулак мой аж улез у яго.

Рэзнуў я мяч і здзівіўся: у чым справа? Мяча нідзе няма, а гімназіст супроць мяне ўстае з зямлі і трымаецца за шчаку.

— Го-о! — пераможна загулі нашыя курсанты.

— Грубіянства! — завішчалі гімназісты.

— Гэта — не лічыцца!

Трымаючыся за шчаку, гімназіст пайшоў з пляцоўкі, на яго месца далі замену.

Дасталі з кустоў мяч, і суддзі загадалі перайграць падачу.

Толькі ўзляцеў мяч угару,— бах! — з сілай зрэзаў яго ўжо Станеўскі. Падалі мяч яму другі раз, ён рэзнуў зноў — малайчына ўсё ж такі зямляк, спрыту ў ім хапала!

Наступіў раптоўны пералом. Праціўнікі разгубіліся.

Цяпер гімназісты-балельшчыкі рабілі нейкія таямнічыя знакі. Нават не давалі сваім ігракам піць вады. Піскам і гвалтам прабавалі вывесці нас з раўнавагі, але нічога не дапамагала. Мы раптам авалодалі «пачуццём локця». У кожнага з нас была сіла дарослага. Мячы, як снарады, ляцелі на другі бок — страшныя, небжпечныя. Гімназісцікі баязліва тоўпіліся ля месца падачы — далей ад сеткі.

Адведаўшы асалоду ад дакранання да тугіх бакоў мяча, я ў прыемным азарце яшчэ не раз перабіў яго праз сетку.

З пляцоўкі нас праводзілі абразлівыя выкрыкі, але яны не маглі заглушыць перамогі ў нашых сэрцах.

6

Другую перамогу ў чужым горадзе я меў над Віліяй.. Пакупаўся я ў рэчцы і вылез на бораг. Мяне адразу абступілі хлапчукі, пачалі захапляцца:

— А-яй-яй!

— Ух ты-ы!

— Падабаюся вам? — не без прыемнасці праказаў я.

— А-га-а!

— А што трэба рабіць, каб мець такія мускулы? — асмялелі малыя ад маёй рахманасці.

Пытанне было нечаканае. Гэта людзі мяне лічылі асілкам, але сам я не адчуваў сябе ім і ніколі не задумваўся, як яны атрымліваюцца.

Я пачаў наследаваць выкладчыка фізкультуры і раіць малым тое, чаго сам ніколі не рабіў:

— Трэба абціраццa халоднай вадой кожную раніцу. Вы абціраецеся?

— Не-а...

— Ну!.. А яшчэ трэба рабіць кожную раніцу гімнастыку. Есці цукар. Класціся спаць і ўставаць рэгулярна...

— А-а...

Хлопчыкаў я расчараваў. Слухаць гэтыя ісціны ім, відаць, апрыкрала ў школе, яны хацелі ад мяне пачуць нешта новае.

Падышлі два паўпанкі і таксама давай мяне разглядаць як дзіва. А потым, папрасіўшы прабачэння, давай яшчэ мераць ды мацаць. Я надта баюся шчыкоткі, дастаткова паказаць палец, каб я ўздрыгануў. Але мужчыны былі ветлівыя і культурныя, я цярпеў, сабраўшы ўсю сілу волі.

Незнаёмыя дзяліліся ўражаннямі:

— Даўно не бачыў такога магутнага цела!

— Не толькі магутнага, але і грацыёзнага!

— Выдатны экземпляр атлета.

— А колькі пану год? — спыталіся мяне.

— Васемнаццаць.

Спыталіся і пра рост.

— Сто восемдзесят восем сантыметраў.

— Усяго-о? — расчараваўся пан.— Я думаў, вышэйшы...

— У яго моцная будова цела,— растлумачыў другі.— Такія людзі заўсёды здаюцца вышэйшымі. Колькі пан важыць?

— Пяць пудоў і дзесяць хунтаў.

— ...хунтаў?— перадражніў мяне мужчына і ўсміхнуўся да сябра.

Я ведаў, чаго яны ўсміхаліся. У горадзе гавораць — фунты. А яшчэ ў іх мераюць усё на кілаграмы і цэнтнеры. Ну і што?

Мужчыны, выявілася, скульптары з мастацкай акадэміі. Яны спыталіся, ці не хачу зарабіць. Я, вядома, хацеў, але было боязна: якую работу прапануюць гэтыя панкі — у горадзе, кажуць, усе жулікі апранутыя прызваіта.

Незнаёмыя завялі мяне ў акадэмію і запрапанавалі пазіраваць студэнтам.

— Пастаіш перад імі гадзіну — залатоўка, а дзве гадзіны — дзве залатоўкі.

— Голы перад людзьмі стаяць не буду! — спалохаўся я.

— І за грошы?

— І за грошы! — цвёрда стаяў я на сваім.

— Дзівак! У нас нават паненкі пазіруюць, паглядзі!

Зрэшты, чаго маю ўпірацца? Мо там што і вартае? Як што не гэтак, павярнуўся і — будзьце здаровы! — Ну, пайшлі...

Калі мы апынуліся ў студыі, мяне аж скаланула. Пад сцяной, як дровы пад акапам у дрэннага гаспадара, бязладна валяліся гіпсавыя рукі, ногі, галовы з адбітымі насамі і вушамі.

Мяне падвялі да шырмы. За ёю стаяла зусім голая дзеўка, а нейкі стары, як смарчок, пан, бессаромна не зводзячы з яе вачэй, ляпіў з гліны жаночую фігуру. Я адскочыў як апараны і ўцёк дадому: каб давалі мільёны нават, на такую работу не згадзіўся б!

Але ўвага мастакоў падказала: дык і я нечага варты!

Некалькі дзён я быў у добрым гуморы. Вечарам, закінуўшы дамоў кніжкі, спяшаўся на вуліцу Міцкевіча. Яе залівала мора святла, а па тратуарах фланіравалі два сустрэчныя патокі моладзі. Я далучаўся да аднаго з іх. І без добрай вопраткі ды гарадскіх манераў я

звяртаў на сябе ўвагу гімназістак ростам. Упадабаўшы сабе каторую, я праходзіў міма ды раптоўна азіраўся. Так я і ведаў — гімназістка глядзела мне ў спіну! Злавіўшы разгублены позірк, я крочыў далей упэўнена і незалежна, адчуваючы на душы перамогу.

І толькі цяпер, наглядзеўшыся праз зашклёныя дзверы на харыстак, паслухаўшы паненак на вуліцы, зноў стаў незадаволены сабой, а перамога на вуліцы Міцкевіча здалася нічога не вартай.

## Раздзел другі

### 1

У той дзень, калі бачыў на сцэне паненак, прыйшоў я з ліцэя дадому і, чаго са мной ніколі не здаралася, прыпаў да люстэрка.

Хто я? Пастух!.. Лоб і сківіцы шырозныя, нос— бульбінай!.. А бровы!.. Недзе я чуў, што яны чалавеку служаць для аховы органаў зроку ад дажджу. Калі гэта так, то мае не дапусцілі б вільгаці да вачэй, каб нават ліло як з цэбкі. Але якая мне радасць? Зросшыся на пераноссі, махнатыя, парыжэлыя ад сонца, калючыя, як вусы ячменю, яны тапоршчыліся, нібы дзікі зараснік. У рысах майго твару не было той лагоднай сіметрыі, якая, мне здавалася, так падабаецца дзяўчатам: выпірала вуглаватасць, а шэрыя з жаўцізной вочы глядзелі непрыязна і пранікліва.

— Зірне на цябе — нібы цвіком да сцяпы прыб'е! — казалі пра мяне ў нашай вёсцы дзяўчаты.

Я агледзеў вопратку. Рукавы ў пінжаку кароткія, лацканы пакарабаціліся, на нагах — здаравенныя, дванаццацізлатовыя чаравікі на гумовай падэшве чэшскага Баці. З іх заўсёды вылазілі праклятыя анучы.

Некалькі апошніх месяцаў я не стрыгся, і ў мяне пачаў расці чуб. Дзеля яго я нават купіў грэбень. Але чуб, паршывец, не прычэсваўся, як прычэсваліся валасы ў нашых курсантаў. Мая чупрына расла ўніз і звісала над вачыма так, як звісае са страхі салома, калі яе вецер павырывае, таму на вуліцу без шапкі і не выходзіў.

Разглядаючы мяне над Віліяй, адзін скульптар сваім грэбенем улажыў чупрыну набок, сказаў сябру, што мне так лепш. Цяпер я гэта ўспомніў.

Я пайшоў на кухню, намачыў валасы, вярнуўся зноў да люстэрка і часануў некалькі разоў па галаве. Калі мой чуб паслухмяна лёг набок, я ледзь не ахнуў! Не верылася, што ў люстэрку — мой адбітак. Адтуль глядзеў на мяне хлопец, у якога пад высокім ілбом бялеў акуратны, не вядомы мне дагэтуль прабор. Ад прабора налева

пакорна лягла чупрына густых валасоў — пацямнелых ад вады, шаўкавістых. На мяне павеяла такой навізной, што я не мог на сябе надзівіцца.

На кухні гаспадыня звякнула пасудай, і я адскочыў ад люстэрка. Патаптаўся. Агортвала вялікае жаданне пахваліцца сваім выглядам. У пакоі было цесна, нібы засадзілі мяне ў клетку.

Без шанкі пайшоў я на вуліцу, крадком мацаючы чупрыну, ловячы яе незнаёмы адбітак у шыбах. Увесь свет стаў нібы прыгажэйшы. Нават здалося, што ўся Вільня таксама перажывае маё другое нараджэнне!

... Было гэта даўно. Паступіў я ў «паўшэхную»[1] школу і бачу: у аднаго вучня шрам на назе, другому выразалі сляпую кішку і зашывалі жывот, той меў шчарбіну ў зубе, іншы хадзіў у акулярах або мог па-сабачаму брахаць... Адзін я нічым не вылучаўся і не меў ніякага таленту. Я доўга ламаў галаву, прыдумваў фантастычныя сітуацыі, як выбіцца ў «людзі». Нарэшце надарыўся выпадак.

Школьны ганак быў абшаляваны дошкамі. Нехта прыдумаў забаву: хто мацней стукне патыліцай у дошкі! Я выбраў месца, дзе сцяна найбольш пружыніла, і так бухнуў, што ўсе разявілі раты, бо дошка заскочыла за дошку. У мяне намутнела ў вачах, але я стукнуў яшчэ раз, і дошка стала на месца.

Тады ўсе прысудзілі: у Барташэвіча наймацнейшая з усяе школы галава!

Кожны перапынак мяне вадзілі на ганак, прымушалі паказваць фокус. Так у школе і я стаў героем. Якую адчуў радасць? Быў найшчаслівейшым чалавекам у свеце!

Такую радасць і задавальненне сабой перажыў я зараз і ў Вільні. Яшчэ ажыло ўражанне перамогі над валейбалістамі. Успомнілася захапленне скульптараў над Віліяй маім целам...

2

Выйшаўшы на вуліцу з зачасанай набок чупрынай, я сустракаўся з хлопцамі нібы роўны з роўнымі і незалежна пазіраў на людзей.

Насустрач крочыў малады рослы афіцэр — ад'ютант генерала. Каб здавацца вышэйшым, вайсковец ненатуральна выцягваў шыю, бытта яму ціснуў каўнер, ды яшчэ глядзеў угору. Афіцэра спыніла маленькая пані, павіталася. Паднімаючы руку дамы да вуснаў,

1 «Паўшэхнай» школай называлі ў Польшчы да 1939 г. сямігодку.

фанабэрысты ад'ютант нават не нахіліў галавы, і беднай жанчыне давялося стаць на дыбачкі.

Я параўняўся з імі. Рагі канфедэраткі, расшытыя серабром, былі толькі на ўзроўні маіх вачэй.

Далей на ліпавай алеі сустрэў сапраўды высокага мужчыну. Нават большага за сябе. Я павінен вам адкрыць ракрэт. Кожны высокі чалавек добра заўважае такога ж высокага, крадком сочыць за ім, нават мераецца. Гэтага чалавека не толькі на нашай вуліцы, а ў Вільні я сустракаў упершыню. Ён, мабыць, быў прыезджы, а па шапцы, як у Тэльмана, відаць,— прыбалт-літовец.

Найчасцей высокія людзі бытта не маглі прызвычаіцца да свайго росту, не ведалі, што з ім рабіць. Яны горбіліся, валачылі ногі, нібы на іх віселі гіры, стомлена крывіліся, бытта ім цяжка насіць свой корпус — як бы яго саромеліся нават. Над такімі я заўсёды пацяшаўся.

Для майго цела прырода падабрала адпаведную колькасць сілы. Я сябе адчуваў так, як адчуваюць статныя спартсмены.

Прыбалт пацешна перастаўляў ногі, нібы спераду нехта ішоў ды не даваў яму ходу. Ад гэтага літовец здаваўся нехлямяжым. Маю душу напоўніла перамога.

Даўжыня плітак тратуара — пяцьдзесят сантыметраў. Абмінаючы недарэку, я пакрочыў праз дзве пліткі і з прыемнасцю адчуў, як напінаюцца ў нагах мускулы. Крочыў я далей, радаваўся сабой, а мне здавалася, што адчуваю нават хвалі паветра, якія выклікаю вакол сябе.

Вось тут я і спаткаў суседку.

Яна вярталася з ліцэя. Разам з ёю ішлі студэнт з вусікамі нітачкай і сяброўка. Абое пра нешта ёй гаварылі, але яна нікога не слухала. Ляніва перастаўляючы ногі, суседка на адным пальцы трымала партфель, каленьмі стукала па ім і нудна азіралася. Вядома, мяне яна нават і не заўважыла. Яе сумны позірк толькі абыякава каўзануў па маіх грудзях. Я прыгледзеўся. Гэта была ўжо не тая гімназістачка, якую я бачыў на сцэне, а — самаўпэўненая паненка, што ведала сабе цану.

— Паду-умаеш! — грэбліва кінуў я, мінуўшы кампанію.

Калі студэнт праходзіў пад ліпкай, расшытая сярэбранымі выкрутасамі форменная шапачка на цэлыя дзве пядзі не даставала да лісцяў. Падышоўшы да таго самага месца, я выцягнуў шыю і выразна адчуў, як галінкі джарганулі мяне па патыліцы.

— Во! — сказаў я сабе.

І забыўся пра гімназістаў.

Паказалася Віленка.

Ля Зарачанскага моста звярнуў маю ўвагу абеліск. Я не мог прайсці раўнадушна міма кожнага надпісу, пачаў чытаць і гэты.

«Помнік пастаўлены ўдзячнымі жыхарамі Вільні польскаму вучню Мечыславу Додзіку, які ўтануў тут у 1933 годзе, ратуючы ў час паводкі яўрэйскага хлопчыка Хацкеля Хармеца». Бедны. Відаць, не ўмеў плаваць. А мо бервяном аглушыла...

Глядзі, жылі тут мальцы што трэба!..

Хоць на граніце была яшчэ высечана багародзіца, аднак я — ваяўнічы бязбожнік — ужо адчуў да помніка пашану. Насцярожана паглядзеў на бурлівую, ядавіта-зялёную Віленку, прыкінуў, на колькі яна ўзнімаецца ў паводку і як тут усё кіпіць, ды ціха пакрочыў далей.

Мяне панесла ў старыя кварталы Вільні.

Што тут было тысячу гадоў назад? Якія хадзілі людзі? Якая на іх была вопратка? Якія мелі клопаты?..

Відаць, было тут поле. Няўжо і тады гэтаксама людзям свяціла сонца, яны пацелі, хацелі піць? І пжок перасыпаўся пад капытамі іхніх коней?.. А чаму не? Вядома! Не верыцца, бо мінулае мы ўяўляем сабе па малюнках мастакоў, а гэтыя малюнкі больш падобныя на казку.

Потым з'явіліся гэтыя муры і іншыя людзі. Потым і тых людзей не стала...

Цяпер з сівых муроў месцамі выкрышылася цэгла і застаўся толькі акамянелы раствор, таму на сценах чарнелі чатырохкутныя адтуліны — глядзі, так і шугануць адтуль з гнёздаў птушкі!

На адной вуліцы два здаравенныя атланты на плячах трымалі балкон. Балкон вялізны, а скульптар так здорава выразіў напружанасць мускулаў у атлантаў, што мне захацелася падперці балкон самому ды кінуць барадачам:

— Я за вас крыху патрымаю яго, а вы, хлопчыкі, пабегайце па скверыку, хай вам плечы адыдуць!

Ганкі, галерэі, вузенькія вулачкі.

Нібы для таго, каб адзін бок вулачкі не налез на другі, іх параспіралі ўверсе аркамі...

Гледзячы па гэтую старажытнасць, я забыўся на ўсё і адчуў, як у мяне пачынае займаць дух ад усведамлення, што хаджу мясцінамі, пра якія толькі пішуць у кніжках.

«Няўжо я ў Вільні? А мо толькі сню?

І ўсё ж такі я ў Вільні, эх!..»

Ад збытку пачуццяў і сілы мяне ўзяла ахвота брыкнуць, як таму цяляці на полі, калі яно наесца травы, а сонца прыпякае, і цяля раптам задзярэ хвост і пачынае дурэць.

Хадзіў я ў той дзень доўга. Калі апамятаўся, што позна ўжо, азірнуўся. Якажыці незнаёмая вулачка. За мной — дзве жаночыя постаці. Я паўслухаўся. Адзін голас дарослай, другі — дзяўчынкі гадоў шаснаццаці. Яны нечага ад мяне хацелі.

— Ты чаго ўпіраешся яшчэ, дурніца! — угаворвала старэйшая маладзейшую.— Ну, ідзі, не бойся!

— Хі-хі-хі-хі!

— Прэндзэй, ну! Бачыш, спыніўся і азіраецца!

— Хі-хі-хі-хі!

— Каму кажу? Чаго зяваеш зноў?.. Ідзі да яго, ідыётка!

У чым справа? Навошта я ім патрэбен?..

Я быў такі наіўны, што нічога не разумеў. Толькі ўгледзеўшы, што адна з постацей піхае ў мой бок другую, мяне апанаваў якісьці інстынктыўны страх, і я з усяе моцы пабег.

Вылецеўшы на цэнтральную вуліцу, я спыніўся каля латка. Патаптаўся ў нерашучасці, паазіраўся, бытта хацеў упэўніцца, ці не бачыць бацька, што збіраюся транжырыць грошы, і адно тады папрасіў порцыю марожанага.

Сорамна есці ў людзей на вачах. Я павярнуўся тварам да вітрыны і пачаў лізаць халодны капец у чарачцы з вафлі.

Не паспеў з'есці і паловы порцыі, як раптам насцярожыўся. Каля мяне хтосьці затрымаўся. Я скасіў вочы. Побач стаяла дзяўчына з шырокім тварам. Мутна-сіняга колеру вочы яе глядзелі на мяне з гатоўнасцю і нібы казалі: а вось і я! Дзяўчына ступіла ў мой бок. Марожанае засела ў маім горле.

Што за ліха?!.

Я з цяжкасцю праглынуў камяк і заморгаў вачыма. Паглядзеў у вітрыну: можа, мне здалося?

Не. У шкле акна выразна, як у люстэрку, маячыў той самы шырокі твар. Вочы дзяўчыны адтуль усё ўпарта стараліся спаткацца з маімі. Яна зноў зрабіла крок да мяне. Стала так страшна, як тады, калі снілася, што на мяне наязджае паравоз.

Я ўцягнуў марожанае ў рукаў і сігануў у паток людзей. Толькі адляцеўшы крокаў на трыццаць, я з палёгкай уздыхнуў і азірнуўся.

Дзяўчына ўсё яшчэ была на тым самым месцы. Цяпер яна стаяла да мяне спіной, а яе фігурка выглядала паніклай, апусцелай, бытта яе хтосьці моцна пакрыўдзіў. Ні то з жалю да яе, ні то з

цікавасці я пастаяў ды паўзіраўся. Дзяўчына прайшлася ў адзін бок, другі і змяшалася з патокам прахожых.

Вярнуўся я на кватэру, раздзеўся, а заснуць не магу.

Доўга я валяўся на ложку, і доўга ён пада мной рыпеў. Упершыню звярнуў увагу, што ў мяне цвёрдае і тугое цела, тонкая ды белая скура, і адчуў, як люблю сваё цела. Мяне раптам пачалі мучыць незразумелыя жаданні, агарнула дзіўнае хваляванне.

3

Вядома, чуб — дзіцячая фантазія, форс. Я да яго хутка прызвычаіўся, ён паслужыў толькі маленькай ступенькай на шляху да сталасці. Такіх ступенек я меў шмат.

У мяне людзі верылі. Вялікая гэта сіла — людская вера. Усё добрае, што ва мне тады было, ведаю, паходзіла з яе. Мяне хвалілі. Я заўсёды памятаў, што ад мяне нечага чакаюць. Гэта мяне падцягвала і, відаць, служыла галоўным стымулятарам у жыцці.

А яшчэ людзі мяне паважалі. Не толькі з-за таго, што я рэдка іх падводзіў, а з-за маўклівасці. Да маўклівых заўсёды праяўляюць цікавасць.

Паважалі мяне яшчэ і за рост. І наогул лічылі сур'ёзным, удумлівым, падбадзёрвалі добразычлівасцю. Як яны памыляліся, як яны не ведалі, колькі мне гэта каштуе!

Сапраўды, мне некалькі гадзін удавалася пабыць сур'ёзным, і я сабе казаў: к д'яблу ўсё, я прыехаў сюды не глупствамі займацца, буду рабіць вось так і так!.. Праходзіла гадзіна, я пачынаў захапляцца чым-небудзь пабочным і спяшаўся туды, куды цягнула.

Не, не вучоба была маім захапленнем.

Неяк маці прыслала мне ў Вільню вышытую кашулю. На ўроку польскай мовы і літаратуры ўбачыў яе наш прафесар Залескі і заявіў класу:

— У Афрыцы ёсць народы, якія любяць каляровыя шкельцы, каменьчыкі, ніткі. Дай ім мыла або соль, яны з'ядуць іх проста так, як мы — шакалад. У нас на «крэсах»[1] гэтае дзікунства захавалася ў тым, што мжцовыя сяляне расшываюць вопратку markdown-rознакаляровымі ніткамі.

І выхаленай рукой ён паказаў на мяне:

— Вось вам жывы прыклад!

---

1 Тэрыторыя Заходняй Беларусі ў Польшчы да 1939 г. пазывалася «крэсамі ўсходнімі».

Лёгка сабе ўявіць, як пасля такіх слоў я адносіўся да таго «прафесара» і яго навукі.

Яшчэ настаўнікі «паўшэхнай» школы былі мае заклятыя ворагі, і ўсё тое, чаму яны вучылі, было мне чужое. Такое перакананне я перанёс з хаты ў школу, і год ад году яно ў мяне паглыблялася. Таму выхадка Залескага не была нечаканасцю.

Мая адукацыя адбывалася недзе паміж урокамі — на вуліцы, дома. З сямігадовай школы я не вынес ні замілавання да вучобы, ні навыкаў. Наадварот! У маім уяўленні кожны той, хто атрымліваў пяцёркі за іхнія навукі, быў панскі падліза, халуй. Паехаў я ў Вільню, бо туды адпраўляліся многія пакаленні нашай моладзі, каб убачыць свет і вярнуцца дахаты мо і без дыплома, але прызнаным чалавекам.

У Вільні я рыхтаваў урокі без здавальнення і энтузіязму і толькі тады, калі ведаў, што мяне абавязкова выклікаюць да дошкі.

Уся мая душа была ўзрушапа падзеямі, якія разгортваліся ў горадзе і на свеце. Вось хоць бы сенсацыя аднаго дня.

— Чулі? У Лукішскай турме небывалы шлюб сёння адбудзецца! — пачалі перадаваць з вуснаў у вусны людзі.— Раман стагоддзя, такога яшчэ не было!

Студэнтка універсітэта імя Стэфана Баторыя выходзіла замуж. Яна таксама сядзела ў Лукішках і са сваім будучым жаніхом пазнаёмілася праз краты. Яе выпусцілі раней, дзяўчына пачала з ім перапісвацца, насіць перадачы, а праз год яны дамовіліся пажаніцца. Урад ім дазволіў браць шлюб у турэмнай камеры.

Газеты паведамілі, што сёння ў шлюбнай сукенцы і з капеланам яна накіроўваецца ў Лукішкі. Хіба мог і я не прыйсці пад турму? У натоўпе такіх, як сам, я хваляваўся, нешта выкрыкваў, а грудзі распірала гордасць.

«Людзі, паверце, і мы здольны на такое!» — быў падтэкст нашых выкрыкаў.

Тады было чым узрушацца.

Газеты стракацелі здымкамі новых замежных бамбардзіроўшчыкаў і бамбасховішчаў у Лондане і Парыжы.

На вуліцах Вільні з кіямі стаялі эндэцкія[1] пікеты. Яны пе пускалі кліентаў у яўрэйскія крамы.

Яўрэйскія хлопцы амаль на кожным скрыжаванні вуліц прадавалі карыкатуры на Гітлера, а паліцыя іх за гэта лавіла ды адпраўляла ў турмы ці канцлагер Картуз-Бярозу.

1 Эндэкі – нацыянал-дэмакраты, партыя польскіх шавіністаў.

У цырку я бачыў, як барцы выйшлі на манеж, узнялі да публікі правыя рукі і прывіталіся: — Гайль Гітлер!

Усім было вядома, што гэта агенты гітлераўскай пятай калоны, але яны свабодна ездзілі па Польшчы і рабілі сваю чорную справу. Папы нібы і лаялі Гітлера, але яўна яму сімпатызавалі, нават пераймалі.

Рыбентроп дамагаўся для Германіі калоній, гэтага патрабаваў у Лізе нацый і польскі міністр замежных спраў Бэк. У Германіі пабудавалі канцлагер, адразу паны зрабілі тое ж самае і ў сябе, ды яшчэ запрасілі Гімлера ў госці: паўзірайся, дружа, такі самы?!. Мо не ўлічылі што пры арганізацыі, то падкажы!..

Усе людзі былі ўзрушаны падзеямі, у тым ліку і я.

Невядомая сіла ўзнімала мяне з цвёрдага матраца і прымушала раніцай бегчы на Замкавую вуліцу. Там у вітрыне свайго будынка рэдакцыя вывешвала свежую газету. Хоць гэта было «Слова» віленскага манархіста Цата-Мацкевіча — усё ж такі газета, і бясплатная. Праз галовы такіх, як сам, прагна ўзіраўся я ў свежыя старонкі. І калі вычытваў, што албанцы зноў разбілі італьянскую дывізію або што восьмая кітайская армія паперла японцаў, я вяртаўся дадому шчаслівым чалавекам. Не, такой гордай радасці я не зазнаў бы, каб атрымаў адразу дзесяць пяцёрак або каб усе віленскія паненкі звярнулі на мяне ўвагу.

У вёсцы не паспелі прыняць мяне ў падпольны камсамол, але сярод камсамольцаў я лічыўся сваім чалавекам. Набліжалася бура. Яе рыхтавалі вярхі. Я цьмяна адчуваў, што ў падзеях рашучую ролю будуць адыгрываць і такія, як я. Нават я запасся наганам і часта браў яго з сабой у горад. Халоднае жалеза адцягвала мае штаны, але праз хвіліну наган награваўся і нібы зліваўся з целам: от дужым тады здаваўся я сам сабе!

Таямніца ўзнімала мяне ва ўласных вачах, усяляла ўпэўненасць і пачуццё перамогі над шэрымі мужчынамі, якія некуды беглі, заклапочана мітусіліся. Душа прагнула, каб нарэшце акунуцца ў віхор падзей. У такія хвіліны мой рост, прыгажосць і фанабэрыя дачкі генерала ўжо здаваліся дробяззю, глупствам.

І ўсё ж такі я не мог забыць яе спеву. Тады ў зале чамусьці здавалася, што яе разумею толькі адзін я і такое ўражанне робіць яна толькі на мяне аднаго. Нават здавалася, што ў памяшканні былі мы толькі ўдваіх.

4

Але мае паводзіны не будуць зразумелыя, калі я не прызнаюся яшчэ і ў некаторых грахах.

У нас на вёсцы адчувалася нацыянальная непрыязнасць. Узрадзілі яе езуіты і папы сотні гадоў таму назад ды падтрымлівалі да нашых дзён.

У маёй бабкі вісела іконка маленькага хлопчыка ў доўгай і белай кашульцы. Нам, малым, бабка апавядала, бытта некалі гэтага хлопчыка яўрэі, злавіўшы ў нашай вёсцы, завезлі ў горад, зарэзалі, а на яго крыві папяклі мацы. І бытта яўрэі робяць гэта штогод.

Многа разоў, бывала, узіраючыся на хлопчыка ў такой самай, як у мяне, кашульцы, я марыў хутчэй вырасці ды вызваліць свой народ ад крывавай дані яўрэям і люта ім помсціць.

І гэта яшчэ не ўсё.

Я жыў на граніцы Польшчы з Беларуссю. У маёй мясцовасці панавала нянавісць паміж двума суседнімі народамі, адурманенымі шавінізмам і забабонамі, гарэлкай і рэлігіяй. Нянавісць гэтая ў некаторых мясцінах даходзіла да дзікіх памераў. Здараліся нават выпадкі крывавых распраў пры змене ўлад, а яны за апошнія дваццаць пяць гадоў у нас мяняліся шэсць разоў!

Праводзячы ў Вільню, маці давала мне такі паказ: — Каго хочаш выбірай сабе там за жонку. Нават за жыдоўку нічога не скажу. Адно не бяры мне полькі. Яе нага не ступіць на мой парог, покуль жыціму! Так і ведай сабе!..

Камуністы, аб'яднаўшы часамі ў адну ячэйку беларусаў, яўрэяў і палякаў, вучылі людзей разбірацца, хто іх сапраўдны вораг. Але адна справа ўсвядоміць сабе з'яву, другая — пазбыцца схільнасці і звычак, якія ты ўвабраў з малаком маці. Для таго каб гэтай заразы пазбыўся народ, трэба шмат часу.

Таму трапляліся людзі, што хадзілі ў даматканым адзенні, лапцях, але глядзелі на такіх самых гаротнікаў-палякаў як на істоты ніжэйшыя. Праўда, моладзь жыла новымі ідэямі, аднак трапляліся хлопцы і дзяўчаты з «радзімымі плямамі».

І ў мяне былі такія «плямы». Я не мог пазбыцца адчужанасці да сімпатычнай суседкі не толькі таму, што яна дачка генерала, але і таму, што яна яшчэ і полька.

5

І ўсё ж такі з дня выступлення хору ліцэістак я стаў зашмат часу аддаваць суседцы.

Я зусім не намерваўся ў яе закахацца. Проста пачаў марыць, як прымушу паважаць сябе. Я пацяшаўся і смакаваў ужо прыемнасць перамогі. З вялікім здавальненнем прыдумваў розныя шляхі, якімі

дабіваюся мэты. Паступова гэта перайшло ў нейкую хваробу: суседні панадворак я не выпускаў з вачэй.

А ён быў агароджаны металічнай сеткай, праз якую віднеўся незвычайны, падобны на куб дом з вялікімі, у адну шыбіну, вокнамі. Вакол дома раслі піхта, лістоўніца, таполі, канадскі клён, а на клумбах — кветкі і пальмы. Сцены былі ўвітыя дзікім вінаградам. Сярод галінак дрэў з вечара да раніцы гарэлі лямпачкі. Шкло, бетон, чысціня і парадак, электрыка, паўднёвыя расліны — усё велікапанскае, недаступнае, незвычайнае і таямнічае. Нездарма цэлая вуліца ганарылася, што на ёй жыве сам генерал.

Я так сачыў за суседнім домам, што тыдні праз два ўжо крыху даведаўся пра яго жыхароў.

Сядзеў я аднойчы на ганачку з кніжкай, і на суседнім пападворку з'явіўся сам генерал з ад'ютантам.

— Юнак, чаму ты так горбішся? — раптам кінуў ён праз сетку.

Я са здзіўленнем азірнуўся.

— Да цябе гавару, да цябе! — пацвердзіў вусаты вайсковы ў расшытым сярэбранымі зігзагамі мундзіры.— Не нахіляйся гэтак, давай грудзям доступ кіслароду — табе яшчэ салдатам быць!

— Так точна, пане генерале! — схапіўся я, але он ужо знік на ганку, і толькі яго ад'ютант змераў мяне ні то зайздросным, ні то зацікаўленым позіркам, пакідаючы мяне ў недаўменні.

У генерала было некалькі чалавек прыслугі. Перш за ўсё кідалася ў вочы пажылая жанчына з пачцівым маршчыністым тварам. Яе, спаткаўшы ў горадзе, я пазнаваў ужо. Аднойчы нават сустрэў у галантарэйнай краме. Генеральская служанка разглядала дзіцячую кашульку і вырашала, купіць ці не.

— Свайму пляменніку на вёску! — даверліва прызналася яна прадаўцу.

Было відаць, што ў краме яе добра ведаюць.

— Дык бярыце! — падказаў прадавец.

— Не хапае грошай...

— А вы пазычце ў сваёй гаспадыні, пані Вацлавы, генераловай!

— Не люблю гэтага. Хто пазычае, потым просіць міласціну...— Яна паклала кашульку на прылавак, паглядзела на яе яшчэ здалёк ды сціпла пайшла да дзвярэй.

За лета ў генералавых дрэвах развялося шмат галак, і служанка прыйшла да маёй гаспадыні спытаць, ці не ведае тая хлопца, які б узяўся паскідваць гнёзды з таполяў. Праз адчыненае акно я пачуў, як яна аб'явіла:

— Па пяцьдзесят грошай[1] за гняздо дае пані генеральша!.. Акыш, акаянныя! Столькі іх развялося, што няма ратунку!.. Аднойчы генерал выйшаў пачытаць газету і адна ў паперу яму як плюхне!.. Ах, шкодніцы!.. Пані Вацла-ва хацела іх звесці вжной, але ён не дазволіў. Сказаў — няхай выведуцца, тады...

Я ў гэты час схапіў кніжку і прыкінуўся, што чытаю.

— А вы, суседка, чаму не мыеце сёння бялізну?

— Бялізна на пліце кіпіць, а я толькі выйшла на ганачак падыхаць свежым паветрам! — адказала гаспадыня.— Душна на кухні... Кухоннае паветра з сябе выдыхаю, выдыха-аю, а свежае поўным ротам удыха-аю!..

— А я думала, вы культурай вырашылі заняцца сёння.

— Займешся, як жа! Мой жылец прыносіць дадому часопісы з малюнкамі. У мінулую нядзелю ўзяла адзін паглядзець, дык не знайшла акуляраў, бо дзеці некуды завалаклі.

— І ўся культура скончылася?

— Ну, скончылася. Калісьці, як жыў мой мужык, то хоць ён не даваў мне ў свята мыць. Не любіў вельмі, калі я назношу бялізны на нядзелю. Бывала, п'яны як возьме, як кіно! Раскідае ўсё мне, парве, патопча...

У голасе гаспадыні чуліся захапленне і гордасць за мужа і сум па ім.

Я адчуў — служанка асцярожна заглянула ў акно. Потым з набожным шэптам спыталася:

— Ваш усё гэтак над кніжкай сядзіць?

— Але,— пацвердзіла гаспадыня.

— А я думала, мо ён захоча зарабіць.

— Не мае часу... Гароўны трапіў хлопец, працавіты! Наносіць мне вады і — за ксёнжку!..

— Наша паненка таксама мала куды ходзіць. Усё сядзіць, сохне над кніжкамі. Або іграе на партафяні... Божа, які час настаў, як мэнчацца маладыя! Хіба людзі ведалі такое раней?.. Недарма цяпер гэтак усе хварэюць на сухоты! Ой, трэба ісці прэндзэй да работы!

— Ці не прыгарэла там мая бялізна! — кінулася на кухню і гаспадыня.

Адыходзячы, генеральская служанка закрычала на птушак:

— Акыш! Зараза! Паморка на вас няма!.. Ох і дабяруся ж я да вас!..

---

1 Грош—мелкая манета, 1/100 злотага (польск.).

Я ж са злосцю шпурнуў кніжку на стол: таксама прыдумаў!.. Чакай цяпер, калі яна зноў завітае!..

Калі служанкі не стала, я выйшаў на двор. Доўга не думаючы, пералез цераз сетку і зашыўся ў густыя кусты бэзу ля генералавага дома. Да бетоннай сцяны — два метры. Насупраць — шырокае акно ў адну шыбіну. Яно адчыненае. Я стаіўся, замёр.

Цішыня была такая, што я адчуў, як білася ўласнае сэрца, як скрыпелі пазванкі шыі, а глыток у горле здаваўся грукатам. Цікавасць перамешвалася са страхам, ад якога мутнела ў галаве.

Нарэшце ў пакой увайшла вядомая мне жанчына і павесіла ліпучку, на яе адразу ўпала муха ды прарэзліва забзынчала. Цётка, праціраючы люстэрка, па-беларуску і дабрадушна прабурчала:

— А што, папалася? Ага? Чаго з двара сюды ляцела?.. Ці тут табе месца? Лётала б сабе па сонейку, колькі б хацела, цешылася б воляй, покуль цяпло, а так — во, маеш!..

Дабрата жанчыны перадалася і мне. Успомнілася добразычлівая заўвага самога генерала... Здалося, у гэты таямнічы дом для мяне перакінуты мост.

І пра паненку я хутка тое-сёе даведаўся.

6

У суботу вечарам сядзеў я зноў на ганку. Раптам у генералавым доме нячутна адчыніліся парадныя дзверы і на парозе з'явіліся тры постаці. Мабыць, ішла і тая, каго вартаваў. Я ўсхапіўся і паспяшыў за брамку.

Хутка я нагнаў паненак і пайшоў следам.

Перад Зарэчнай яны спыніліся.

— Дануся, куды пойдзем, да Віліі? — звярнулася адна з іх да маёй суседкі.

— Ай, не хочу! Там пан Браніслаў будзе! — раздражнёна кінула паненка.

— Тады куды?

— Ці я ведаю?..

Хвіліну дзяўчаты патапталіся.

— Во, ідэя! — ажывілася суседка.— Пойдзем у кафэ «Штраля» есці пірожнае!

— Хопіць у нас грошай?

— Паглядзім!

— Лічы і ты свае, Дана!..

Паненкі пачалі лічыць свас фінансы. Але ўбачыўшы мяне, змоўклі.

Каб не западозрылі, што за імі сачу, я мусіў прайсці міма. Ды з мяне на гэты вечар уражанняў хапіла і так.

Я даведаўся, як зваць маю суседку. Яна мела прыгожае ні то літоўскае, ні то польскае імя — Данута. Яшчэ можна было да яе казаць: Данка, Дана, Дануся...

Дануту я часта бачыў са стараватым студэнтам, а цяпер сваімі вушамі чуў, што для яе гэты студэнт, няйначай Браніслаў, нялюбы, яна не хоча яго бачыць, і ў мяне бытта зняў хто з грудзей цяжкі камень.

Я сабе ўяўляў, што генеральскім дочкам няма чаго клапаціцца пра грошы, бо ў іхніх пакоях стаяць мяшкі з банкнотамі. Запомнілася нахіленая галава паненкі, калі яна пры святле лямпачкі лічыла манеты.

І апошняе. Было надта дзіўна, што на свеце ёсць людзі, якія ходзяць у кафэ проста так, адно паесці піражнае!

— От, крывасмокі! — праказаў я ўголас. Але абурэння на гэты раз не адчуў.

Усё было для мяне незвычайна, і да глыбокай ночы я прахадзіў па горадзе. Не, не гутарыў сам з сабой, не разважаў, як старэйшыя,— для гэтага по хапала ні слоў, ні жыццёвых ведаў. Упершыню пазнаныя ісціны самі сабой укладваліся ў маёй галаве, і мяне, узрушанага і ўзбуджанага, насіла, нібы на крылах. Гэта быў таксама працэс мыслення: у маладых, мабыць, так адкладваецца вопыт.

7

Назаўтра была нядзеля. Зрання я ўзяўся за работу.

Жыў я ў прачкі. Водаправод па пашай вуліцы меў толькі генерал. Удава здала мне пакойчык з-за вады, якой жанчыне трэба было многа, а насілі яе здалёк.

Я напоўніў бочкі і балеі. Тады наварыў сабе есці. Паснедаўшы, захапіў свежы нумар «Мора і калоніі», які прынёс з ліцэя, і адправіўся ў горад. Вось ужо каторы дзень, як у польскім перакладзе з'явілася трэцяя кніжка «Ціхага Дона». Я накіраваўся ў гарадскую бібліятэку.

Перад бібліятэкай даўжэзны хвост людзей выходзіў аж на лесвіцу. Запісвалі ў чаргу. Тут стаяла звычайная гарадская публіка, але з пункту гледжання мужыка, у шыкоўнай вопратцы, яны для мяне ўсе былі паны, дармаеды і буржуі.

Людзі паводзілі сябе ўпэўнена, свабодна і, здавалася, на мяне зыркалі насцярожана і нядобразычліва. Зрабілася крыўдна: я ж першы маю права на Шолахава!.. Халера з вамі, яшчэ прачытаю, цяпер чытайце вы ды ведайце нашых!..

Выйшаў я зноў на вуліцу і павярнуў да касцёла святой Ганны. Сюды кожную нядзелю прыходзіла маліцца сям'я генерала.

Я ўжо некалькі хвілін пахаджваў па тратуары, разглядаючы стромкія гатычныя лініі зграбнага касцёліка з чырвонай цэглы. Тры лёгкія ажурныя вежкі так і стралялі ў неба. Між імі — выгнутыя лукі. Усё нібы зробленае з тонкіх карункаў, простае...

Раптам здалёк я ўбачыў студэнта з вусікамі ў нітачку і ўспомніў, як непрыхільна адзывалася аб ім Данута.

«Ліха цябе бяры, цяпер ты мне не страшны!»

Разам са студэнтам ішоў Генрых Станеўскі. На курсах ён выдаваў сябе за шчырага паляка, хоць я добра ведаў, што ў іхнім доме ніхто і слова польскага не прамовіў. Каб не сумняваліся ў яго нацыянальнасці, ён заўсёды падтрымліваў шавіністычныя размовы. За гэта я яго ўзненавідзеў.

Ён доўга не прызнаваўся, што знаёмы са мной, і загаварыў толькі тады, калі на мяне звярнулі ўвагу іншыя. На ўроку настаўнік латыні пачаў выклікаць нас па журналу, кожны ўставаў і крычаў:

— Прысутнічаю!

Чарга дайшла да мяне. Я пачырванеў, што так высока ўзняўся над таварышамі і што падняў на сабе парту. Гэта курсантаў развесяліла, а лацініст доўга мяне распытваў — хто я і адкуль. На перапынку ўсе дружалюбна з мяне смяяліся, спрабавалі гэтаксама падняць парту. Падышоў і Станеўскі, фамільярна ўдарыў па плячы. Шчасце яго, што я быў збянтэжаны, інакш турнуў бы яго, у мяне нядоўга.

Станеўскі цяпер быў у новым касцюме і ў фетравым капелюшы. О-го! Адкуль у цябе грошы?..

Студэнт таксама быў разадзеты, як лонданскі дэндзі,— элегантна, з чорным банцікам пад барадой. Ішлі яны паволі. Да мяне даляцелі словы майго аднакурсніка:

— Безумоўна, пане Браніславе!.. Калі не прыдушыць жыдакамуны — запануе над усёй Еўропай!.. Усходнія орды чалавечую культуру змятуць, як зрабілі ўжо гэта раз гунны!..

Слоў Браніслава я не разабраў, толькі ўлавіў іх тон. Гаварыў ён вяла, неахвотна, сумна і праз сілу, бытта словы прычынялі яму боль.

Генрых зноў хацеў нешта сказаць, але ўбачыў мяне і закрычаў:

— Сэрвус, пане Барташэвіч!

Я разгубіўся.

У другім выпадку зямляк мяне не заўважыў бы. Цяпер яму хацелася ўзняць сябе ў вачах багатага прыяцеля і паказаць, што ў яго ў Вільні на кожным кроку таварышы. Ды адзін з іх — во аж які

асілак! Мяне абражала, што служу нейкай прыманкай. Адначасова ўсяго агарнула і хваля бязвольнай нерашучасці, ногі прырасл да тратуара.

Генрых адрэкамендаваў мяне ўжо студэнту:

— Мой калега. Канчалі адну «паўшэхную» школу...

— Браніслаў! — неахвотна наставіў той мяккую руку і велікадушна адвярнуў галаву, каб не бачыць маёй разгубленасці.

Студэнт рабіў выгляд, што ён надта разумны і ўсё на свеце порабачыў, перапрабаваў. Гледзячы на яго, здавалася, што яму надакучыла жыць на белым свеце сярод такіх нікчэмнасцей і што ён робіць вялікую ласку, што яшчэ існуе.

«Падумаеш, які ты важны,— пакпіў я ў душы.— Нябось, за «Ціхім Донам» таксама стаяў у чарзе!»

— Прашу! — студэнт запрапанаваў папяросы з сярэбранага партсігара.

Я адмовіўся. Генрых глянуў на мяне як на дзівака і сквапна палез у партсігар. Брыдка было глядзець, як ладна збудаваны і з адкрытым сімпатычным тварам зямляк вытанцоўвае перад панам.

— Прашу, бярыце, бярыце яшчэ ў запас! — заахвоціў студэнт.

— Але ж, дзякуй! — з пашанай адказаў мой аднакурснік ды асцярожна, нібы немаведама якую каштоўнасць, схаваў другую папяросу ў кішэню.

Я калі ўжо неўзлюблю чалавека, то кажу яму пра гэта сваім выглядам. Я не мог глядзець студэнту ў вочы і ўтаропіўся ў грудзі. А яны былі вузкія, і каб саўгануць у іх кулаком, панок перакуліўся б сем разоў. Да слабых целам людзей у мяне тады была знявага, а да Браніслава я адчуў лютую нянавісць — сто разоў за яго мацнейшы, здольнейшы, а ўладаром тут ён, бо багаты!.. Генрых узяў у мяне часопіс:

— Дазвольце?

Урадавыя колы выйсце з эканамічнага застою бачылі ў калоніях. Урад быў упэўнены, што свайго даб'ецца, нават выпускаў спецыяльны месячнік «Мора і калоніі». Сынкі чыноўнікаў і памешчыкаў ужо збіраліся ехаць на Мадагаскар шукаць прыгод, калі толькі той востраў аддадуць Польшчы. Покуль Ліга нацый у Жэневе думала — даць Польшчы яго ці не, «залатая моладзь» ужо распявала песні пра спякотную Афрыку і бачыла сябе героямі сярод экватарыяльнай экзотыкі.

Генрых з Браніславам зацікавіліся фатаграфіямі, на якіх Мусаліні праводзіў італьянскія сем'і на жыхарства ў Абісінію. Яны смакавалі здымкі і выхвалялі талент дучэ, зайздросцілі макароннікам-

італьянцам, забыўшыся на мяне. Я памалу супакоіўся, і ў мяне пачало нараджацца пачуццё непрымірымай варожасці да іх.

8

Калі мы так сабе стаялі ўтрох, Браніслаў раптам змяніўся ў твары, забыўшыся пра сваю маску здаволенага чалавека. Ён папрасіў прабачэння і пабег. Але змяніўся не толькі студэнт; задрыжалі каленкі і ў мяне: набліжаліся генеральша, дачка і пажылая служанка.

Паненка крочыла сціпла, нібы школьніца, трымала чорны малітвеннік у залатой аправе і ўпотай зыркала на нас. Дануся паводзіла сябе так, як дзеці пры чужым нябожчыку,— з забаўнай вонкавай пакорай і ціхмянасцю.

Мне ўжо тады кінулася ў вочы розніца паміж маці і дачкой.

Фанабэрыстая шляхцянка з відочнымі рысамі каўказскай крыві была зусім не падобная на Данусю — жвавае, прывабнае дзіця. Варожасць, якую я перанёс з Браніслава і Генрыха на паненку, у мяне знікла.

Генеральша скупа ўсміхалася студэнту, бытта дарыла, падала руку, а Браніслаў, зняўшы шапку, нізка пакланіўся і паспешліва цмокнуў у разрэз цёмнай пальчаткі.

— Гэта князь Любецкі! — вінавата паведаміў Генрых.

— Князь?

— І вечны студэнт,—дабавіў ён, бытта пахвалу.— За мяжой скончыў інстытут, а ў Вільні абараняе польскі дыплом. Нарачоны генеральскай дачкі!

— Так...— Які з яго нарачоны, я чуў з вуснаў самой Данусі.— І чаго ты гэтак выпендрываешся перад панамі, Генек!

— Дарэмна на мяне ты так...— разгубіўся ён.

Падносячы да маіх вачэй папяросу, зямляк пахваліўся:

— Во-о, «Пласке», з манаграмай нават! Яму фабрыка выпускае па спецзаказу...

Я прыгледзеўся. На муштуку тоненькай папяросы былі надрукаваны залатой фарбай мудрагелістыя ініцыялы «Б Л»,. год выпуску і герб.

— Гы!..— не ўтрымаўся я ад здзіўленпя і адразу забыўся на свой гнеў.

Тым часам генеральша паплыла ў касцёл. За ёю падаліся паненка з кабетай і студэнт.

Ля дзвярэй сядзелі жабракі. Калі генеральша, холадна, не нагінаючыся нават, расторквала ім грошы, Дануся сціснулася ўся ад няёмкасці.

Я аж уздыхнуў, калі за імі зачыніліся масіўныя дзверы з адмыслова выкаванага жалеза.

Яшчэ нядаўна я прыдумваў сабе гісторыі, бытта станаўлюся славутым чалавекам, напрыклад барцом ці баксёрам, і генеральша сама, нібы з Марцінам Ідэнам, шукае са мной сустрэчы, каб аддаць сваю Руф. Але, прыгледзеўшыся цяпер да пані, я адчуў, што генеральша — не місіс Морз. Гэта чыстакроўная арыстакратка нізавошта мяне не прызнала б за чалавека, калі б я нават стаў мільянерам! Да Данусінай маці я адчуў нават пашану: адкрытых ворагаў я паважаў. Аднак ад усведамлення гэтага лягчэй не зрабілася. Са сваімі марамі я выглядаў смешным.

І ўсё роўна я не здаваўся.

У прысутнасці генеральскай сям'і Любецкі зрабіўся пакорны, як звязаная авечка. Мой зямляк з-за таго, што з ім сябруе і гутарыць сам «князь», не ведаў, як выдрыгваць і падхалімнічаць перад ім. А мне што?

Ну і ліха з вамі, калі вы такія паны і не лічыцеся са мной! Пляваў я на ўсіх вас і хаджу сабе па той самай, што вы, вуліцы, дыхаю тым самым паветрам, абагравае мяне тое самае сонца! Нават магу быць там, дзе бываеце і вы. Ляжыць у кішэні шэсцьдзесят грошай, вазьму і пайду ў вашы рэстараны! Вы сабе абед, нябось, не гатуеце?!.

А захачу, пайду нават у вашы касцёлы, следам за вамі! Што, мо выганіце?..

9

Я пацягнуў Станеўскага ў касцёл: з ім адчуваў сябе лепш. Станеўскаму было ўжо няёмка перада мной. Ён прачнуўся ад ап'янення і зрабіўся самім сабой — нармальным вжковым ды сваім хлопцам, толькі такім, які прыбыў у Вільню на год раней і больш ведае, што тут дзе робіцца. Ён нават дастаў з кішэні пачак халвы, разламаў яе і большую палову сунуў мне. Успомніў я маці і дараваў яму падхалімства.

Бывала, мы, пастухі, адгонім кароў далей ад людскіх вачэй і давай зводзіць быкоў. Не прымае ўдзелу ў гульнях толькі Генрых. Калі я перад маці смяяўся, яна яго бараніла:

«Добра табе, сынок, дурэць. Бык зломіць рог, і ты толькі атрымаеш ад бацькі рэменя, бо пасеш сваё стада. А Генрых, бедны, пасе чужое. Гаспадар даведаецца і прагоніць такога пастуха!..»

Мо і праўда, жыццё некаторых прымушае быць несамастойнымі, дагаджаць другім?!. Зрэшты, цяпер мне было важна тое, што Станеўскі слухаўся.

Ён пачаў шаптаць, што касцёл пабудаваны яшчэ ў 1395 годзе на месцы язычаскай багамольні жонкі князя Вітаўта. Бытта захапляўся ім у час паходу па Маскву Напалеон і шкадаваў, што не можа ўзяць касцёл на далонь і перанесці ў Парыж.

Я дзівіўся, глядзеў ды слухаў.

У строгай перспектыве памяншаліся два рады дубовых масіўных лавак. У пярэднім радзе, бытта за высокай школьнай партай, сядзела генеральша з дачкой. Побач, пабожна склаўшы рукі лодачкай, стаяў студэнт. Дзве светлыя касы Данусі спадалі на чорны бліскучы шоўк фартушка. Я так прыглядаўся, што нават разгледзеў у яе ніжэй патыліцы непакорныя кудзеркі, у студэнта — лысіну, у генеральшыным капелюшы — тры зялёныя пёркі, а ў сівых валасах служанкі — просты карычневы грэбень.

Вакол сядзелі кастлявыя старыя і высушанымі рукамі, надобнымі на курыныя лапы, перабіралі пацеркі ружанца. Магутныя гукі. аргана хапалі за душу і наводзілі сум. Нібы з таго свету даносіліся словы ксяндза:

— Pater noster, qui es In coelis, sancificetur nomen tuum!..[1]

Пахла сырасцю. У мяне было такое ўражанне, бытта знаходжуся ў магіле.

Першы раз я не адчуў да Данусі непрыязні. Мяне нават агарнулі незразумелая трывога, братэрская спагадлівасць. Стала шкада паненку.

І яшчэ, гледзячы, як Данута шчыра малілася, ні разу не азірнуўшыся і не павярнуўшы галавы, я адчуў цёплае спачуванне і нават захапленне яе нявіннай верай.

1О

«Во, пора, пора ў талерцы, бытта няма чаго рабіць, а ежа для яго — забава! — злаваў я на паноў за суседнімі столікамі.— І навошта людзі садзяцца есці, калі ім зусім не хочацца? Каб здзяліў па руках, павыбіваў у іх гэтыя нажы і відэльцы,— няхай не псуюць харчоў!

Здаецца, узяў бы за каўняры, тыцнуў аднаго-другога носам у талерку і сказаў:

«Ведаеце, паны чортавы, колькі вжковая цётка, мая маці, у гэтыя куры ўклала працы, душы, надзеі?..»

Пазаганяць бы вас, буржуяў, у гумны, наскідаць бы вам снапоў, сунуць цапы ў рукі:

1 Отча наш, іжа жі на небжі, да свяцішча імя твае!.. (лац.)

«Ану, бярыцеся малаціць!.. Лоск і фанабэрыя мігам бы злезлі, і апетыт бы мелі добры!..»

Такія былі ў мяне думкі ў рэстаране.

На сталах ляжалі бліскучыя нажы, відэльцы, лыжкі. Прыладаў тут было столькі, бытта недзе блізка стаялі іх поўныя скрыні і гэтыя выкладвалі для паказу. Я прыгадаў адзін зломак у маёй прачкі. Ім, відаць, з пакалення ў пакаленне карыстаўся яе род. Удаве даводзілася часамі зломак шукаць на двары, бо дзеці яго выносілі стругаць лодку ці кій і пакідалі ў пжку. Цётцы бы адзін такі нож, ото ж было б радасці ў хаце!

— Ваш заказ! — перарваў мае разважанні рослы афіцыянт з вусамі банцікам.

Ладны хлапец, а займаецца такой справай!..

На дне талеркі афіцыянт прынёс супу. Потым — другое, як кату...

Не спадабалася мне ў рэстаране абедаць. Я ўсё баяўся, каб не капнула на абрус, дзе стаялі тонкія і высокія чаркі. Не дай бог зачапіць ножку стала ботам — чаркі рассыплюцца ўшчэнт, а яны ж, халеры, дарагія.

Не пачуўшы смаку ад ежы, я накіраваўся даядаць дома.

У вестыбюлі рэстарана сустрэў я паненак у сукенках з вялікімі выразамі на плячах. Дзявочае цела было для мяне заманлівай, жудасна-прыгожай таямніцай. Цяпер я меў магчымасць разгледзець яго зблізку. Паненкі непрыемна ўразілі аголенай белізной. Худую скуру на плячах прыкрываў яшчэ нейкі рыжаваты пушок. Выразна вызначаліся ў іх худыя ключыцы.

Знікла таямнічасць. Балюча кранула расчараванне, нібы я назаўсёды згубіў тое, дзеля чаго дагэтуль жыў. Прыгнечаны, накіраваўся на вуліцу.

У цэнтры горада мяне нехта цапнуў за плячо:

— Пачакай!

Я азірнуўся. Ззаду цяжка дыхаў наш курсант — Альбінас Суткус. Я толькі цяпер заўважыў, што ў яго дакладна такі ж самы банцік вусоў, як у афіцыянта.

— Барташэвіч...— пачаў ён і замяўся.

— Ну?

— Барташэвіч...

— Што хацеў, каяжы!

— Я працую ў рэстаране, дзе ты абедаў...

— Пра-цу-еш?

— Ага...

— ?!.

Я адразу зразумеў, чаго ён ад мяне хоча, адчуў, што чырванею, і разгублена ўзяўся за кішэню. Некалькі хвілін мы маўчалі.

— Хадзем сюды, за вароты! — пацягнуў ён мяне ад людзей.

— Ты там працу-еш?..— лепятаў я, ідучы за сябрам у пусты двор.— Афіцыя-антам?

— Ну...— Суткусу было таксама няёмка.

— Я не ведаў...

— Нічо-ога...

— Каб ведаў, што ты там, то...

— Я цябе адразу пазнаў. Ты нават сеў за мой стол, але я не хацеў сустракацца і паслаў да цябе другога афіцыянта. А потым палічыў і бачу — о! р-ропужэ, вель-няй грыбіету!..[1] Хутчэй пераапрануўся ды за табой...

— Я не ведаў, што гэта твой...

— Нічога, толькі аддай. Бо ў нас вылічваюць, сволачы, з палучкі...

— ...

— Каб не вылічвалі, яшчэ сам раздаваў бы сваім хлопцам, а так...

Відаць, яшчэ ніколі я так моцна не чырванеў. Кроў хлынула мне ў галаву, вочы зацягнула імглой і зашчыпала ў кончыках вушэй. Нібы не сваімі рукамі я дастаў з кішэні пракляты нож:

— На...

Суткус загаварыў са спачуваннем:

— Каб гэта ў майго пана, то чорт яго бяры, я кажу. Яшчэ дапамог бы сваім хлопцам! Але, ведаеш, паны хітрыя. Наш нават за пабітую шклянку вылічвае, гад! Не так ён, як яго жонка. Прагледзіць усё, пералічыць пяць разоў... А хітры, гад! Учора ішла дэманстрацыя рабочых пад магістрат, то партрэты Пілсудскага і прэзідэнта зняў, каб вітрыны не пабілі каменнямі!..

— А ты дзе жывеш? — бачачы, што я ўвесь згараю ад сораму, не ведаў ужо пра што гаварыць Суткус.

— Там... .

— Колькі вас у пакоі?

— Адзін я.

— О-о, вельняй грыбіюту, адзін?! Па-каралеўску! То дай адрас. Зайду пераначаваць. Пусціш?

---

1 Д'ябал яго бяры!.. (літ.)

www.kamunikat.org

— Заходзь, калі хочаш...

— Толькі, цур, угавор. На курсах ніхто но ведае, што працую афіцыянтам. Халуйская пасада, смяяцца будуць хлопцы, а я там часова, покуль лешпае не знайду!

— Не скажу нікому...

— Сёння вечарам будзеш дома? Проста з курсаў і зайду!.. Іване, не крыўдуй на мяне... Ведаеш, я на рабоце... Ну, трэба ісці. Спаткаемся ў школе, салют!

Узяць што-небудзь у лесе або ў пана ў нас на вёсцы не лічылася кражай. Наадварот! Той быў дурань, хто гэтага не рабіў, калі надараўся выпадак. І ўсё роўна мне было так сорамна, што я ахвотна б праваліўся скрозь зямлю, каб яна расступілася. Навошта мне быў патрэбны той праклятьі панскі нож? Абышлася б прачка зломкам.

Як непрыемна!

— Цьфу! — Я са злосцю ўдарыў ботам пустую бляшанку ад кансерваў, якая трапілася пад ногі.

## Раздзел трэці

### 1

Над Віліяй мелася адбыцца гулянне. Магістрат горада заказаў фірме параходзік у гонар нейкага гістарычнага героя. У нядзелю параходзік збіраліся спускаць на ваду.

Некалькі дзён запар віленскія газеты рэкламавалі цікавую забаву. Яшчэ яны паведамлялі, што хроснай маці параходзіка будзе жонка генерала — пані Вацлава. Гэтага дня і я чакаў.

Урэшце надышла нядзеля. Прадзірацца скрозь натоўп да берага я не пасмеў: там стаяла Дануся, а мне здавалася, што і яна ведае пра выпадак у рэстаране. За цырымоніяй назіраў здалёк.

Генеральшы падалі бутэльку шампанскага. Дама ўдарыла ёй аб борт, бутэлька не разбілася і плюхнулася ў ваду. Каля мяне людзі закрычалі:

— Мегера!

— Не магла ўжо бутэлькі разбіць!

— Змарнавала дабро!

— А што ёй? Не сваё!

— Яна не вінаватая! У такіх выпадках шампанскае прывязваюць вяроўкай!

— Абаронца знайшоўся! Панскі падліза!

Пакуль бегалі ў магазін па другую бутэльку, бедная Данута ледзьве не заплакала. Зрабілася непрыемна і мне.

«Куды лезеш са сваімі пачуццямі, ты, што паквапіўся на нож?!» — абсек я сябе.

...Нібы ведаючы пра маё шчырае спачуванне ёй тады ля ракі, у наступны дзень сімпатычная суседка мяне ўзнагародзіла.

Ішоў я па ліцэі і твар у твар спаткаўся з Данутай. Задыханая і расчырванелая, яна падымалася на пяты паверх. Параўняўшыся са мной, Дануся даверліва і проста, бытта мы даўно знаёмыя, праказала:

— Уф-ф, як цяжка!

І пакуль я знайшоўся што адказаць, пырснула гуллівым смехам, пругка скочыла з апошняй ступенькі на паркет ды лёгка панеслася па калідоры.

Я спыніўся.

Не, я не сніў. Сапраўды, хвіліну таму назад яна да мяне загаварыла! І сама — я ж яе не цягнуў за язык! Яшчэ гучаў яе смех: меладычны, свавольны і дураслівы.

Я доўга стаяў як зачараваны. Ва мне ўзнялася цэлая бура. Я ўжо забыўся, што глядзеў на яе як на ворага, ад якога ўсе мае няшчасці. Я нібы шкадаваў наступаць на месца, дзе толькі што ступала яна.

Са светлай радасцю і незразумелай трывогай я ўбачыў, што раблюся нявольнікам гэтай чароўнай полечкі. Дзеля яе нават пачаў здраджваць сумленню.

Аднойчы мы са швейцарам, панам Войцехам, расстаўлялі ў зале крэслы. Іх не хапала, і мы даставалі мэблю з гары. Селі перадыхнуць. Пан Войцех хапіўся, што няма курыва, і папрасіў мяне спусціцца ўніз купіць папярос. Падумаўшы з жахам, што магу сустрэцца з ёй у запэцканай у вапну і павуцінне вопратцы, я не ведаў, што адказаць. Стары пакрыўдзіўся:

— Я не думаў, што ты такі дрэнны хлопец.

— Адкуль вы ўзялі!

— Калі будзеш багаты, а да цябе прыедзе ў лапцях бацька ды сустрэне на Міцкевіча вуліцы, ты ад яго адмовішся.

— Выдумалі...

— Кажу табе, адмовішся! Пабаішся, каб не ўбачылі цябе паненкі з вжковым дзядзькам!

— Будзьце ўпэўнены, не пабаю-уся...— казаў я больш сабе, чым швейцару, хаваючы вочы.

— Пабаішся, я ведаю. Не аднаго такога субчыка бачыў у сваім жыцці! Пачынаецца з гэтага!

Мяне ўразіла трапная заўвага старога. Успомніўся Станеўскі. Няўжо і я такі самы зрабіўся за адзін месяц у Вільні?

Стала сорамна. Аднак выйсці ў бруднай вопратцы да кіёска так і не змог. І за гэта сам сябе ўзненавідзеў.

2

Палякі з уласцівым ім уменнем наладжваць масавыя гульні праводзілі іх даволі часта.

Людзі яшчэ не забыліся на воднае свята, а ўжо рыхтавалася наступная ўрачыстасць — да дня ўшанавання памяці салдат, якія загінулі ў 1920 годзе ў вайне з бальшавікамі.

Меліся аддаць чэсць легіянерам, якія ваявалі за варожую мне справу і прычыніліся да няшчасця майго народа. Мо адзін з тых, каго памянуць на свяце, шомпалам паласаваў спіну майго бацькі або забіў чырвонаармейца, чыя безымянная магілка сіратліва ўзвышаецца пад грушай ля маёй вёскі.

Набліжалася чужое мне свята.

Мая душа раздвоілася. Я адчуваў пагарду і варожасць да новай забавы паноў. Але Дануся, я ведаў, недзе не магла дачакацца яе. І другая мая палова была верная Дануце, хвалявалася гэтаксама. То была новая здрада маім перакананням і майму сумленню, але справіцца з сабой я не мог.

Аднойчы спаткаў я на вуліцы пару ліцэістак. Адна з іх была суседка. Паненкі трымалі запламбаваныя урны, спынялі прахожых і прасілі грошай на зброю для войска.

«Калі хочаш, каб твая армія была зашпіленая на апошні гузік, не пашкадуй злот!» — крычаў надпіс на плакатах, якія паненкі наклеілі на сцены.

Дзіўна гучала самавыхваленне ваеннай клікі. Яна заяўляла, што польская армія разгроміць за адзін дзень і бальшавікоў і немцаў. Чым? Кавалерыя мела дапатопныя пікі. Баявых самалётаў было ўсяго 377, а знішчальнікі лёталі цішэй за нямецкія бамбардзіроўшчыкі, затое маршалак Рыдз Смiглы хваліўся, што польскі салдат на муштраванні праходзіць за дзень з поўнай выкладкай 70 кіламетраў... Дзяржаўная казна ледзь ліпела. Вінаваўцам ж усяму была сістэма, якая гамавала развіццё вытворчых сіл. Панскі ўрад уяўляў сабой спалучэнне клікі ваенных пілсудчыкаў — ордэна палкоўнікаў — з наглай дыктатурай паліцыі і норавамі шляхты XVIII стагоддзя. Каб ўратаваць становішча, патрэбны радыкальныя сродкі, а не збіранне грошай у прахожых. Але пры чым тут Данута?

Мне спадабалася, з якой верай і самаадданасцю яна звярталася да людзей:

— Грамадзянін, не пашкадуйце на кулямёт для войска!

— Пан ужо аддаў залатоўку на ўзбраенне?..

І кожны чалавек лез у кішэню.

Убачыўшы мяне, Дануся разгубілася. Яе сяброўка падышла з урнай:

— Ахвяруйце колькі можаце!

— Яніна, з гэтага пана не трэба!..— шапнула Данута як бы спалохана.

«Чаму не трэба? Бо ў мяне няма грошай? Адкуль ёй вядома? А калі так, чаго ты палохаешся мяне?!.

Выходзіць, я для цябе не такі, як усе?!.»

І я зноў узрадаваўся, як тады, калі сустрэў Данусю ў калідоры ліцэя.

3

Нарэшце ў нядзелю вечарам за могілкамі Роса выстраіліся вайсковыя часці. Асобна пастроіліся гімназісты і студэнты. Прывалілі дзесяткі тысяч вільнян. Прыйшоў туды і я.

Спачатку дэлегацыя моладзі мелася перадаць войску станкавыя кулямёты, купленыя за сабраныя гімназістамі грошы, Я вачыма пашукаў генеральскую дачку.

У кампаніі гімназістак яна стаяла ля тачанак.

Добра быць высокім. Данусю цяпер бачыў я з любога месца. Паненка неасцярожна круцілася каля вайсковага каня. У мяне ўзнікла нават надзея, што конь узбунтуецца і тады надарыцца магчымасць зрабіць ёй паслугу,— я праціснуўся бліжэй. Бедны князь мусіў стаяць далёка адгэтуль у калоне!

Пачалася цырымонія.

Гімназісткі, нацягнуўшы на правае вуха берэты (для вайсковага выгляду!), падышлі да камандзіра палка. Дануся стала рапартаваць. Вусаты палкоўнік выслухаў яе, дабрадушна ўсміхнуўся і паказаў рукой на салдат, якія меліся прыняць кулямёты. Дануся запнулася, усім стала няёмка, а найбольш — мне.

Нарэшце яна ўзяла сябе ў рукі, падышла да кулямётчыка, паднялася на пальчыкі і... пацалавала яго! У доўгім, як спадніца, шынялі салдат збянтэжыўся, мабыць, пачырванеў і стаў зусім нехлямяжым. Людзі засмяяліся.

— Якая адважная гімназістачка! — праказала нейкая дама.

— А зграбная — бы артыстка! — дадала другая.

Мне было прыемна слухаць.

Да гімназістак падышлі элегантныя афіцэры і з вытанчанай ветлівасцю загаварылі. Асабліва танцавалі перад генеральскай дачкой.

Убачыў я і яе бацьку.

Калі сцямнела, наперад калоны салдат выехала некалькі коннікаў з генералам. На генерале і яго кані так блішчалі сярэбраныя зігзагі, рамяні і металічныя часткі збруі, што конь з седаком аж пераліваліся ў электрычным святле. Данусю абкружылі сяброўкі, і ўсе разам яны глядзелі на маляўнічага конніка.

І тут прагучала каманда:

— Смір-на-а!

Запанавала цішыня. Пагасілі святло. Прагучала зноў:

— Па-чы-на-ай!

Трывожна загулі трубы. Дробна зачасцілі барабаны. Раптам яны змоўклі, і голас афіцэра ўрачыста выклікнуў:

— Паручнік першай роты трэцяй брыгады Доўбар-Мусніцкага легіёна — Станіслаў Ляшчынскі!

— Загінуў на полі славы! — у мёртвай цішы і густой цемры азваўся голас дзяжурнага.

— Чэсць яго памяці!

— Бум-м-м! — грымнулі гарматы, бліснуўшы, нібы маланкі ці зарніцы.

Зноў азваліся трубы і барабаны. І так некалькі разоў. Відовішча было сапраўды ўрачыстае.

Я пазіраў на салдат, падцягнутых афіцэраў, на іхнія мундзіры, зайздросціў ворагам і суцяшаў сябе: «Нічога, і мы будзем некалі такія. Нават яшчэ лепшыя!..»

Я сам сябе пачаў падбіваць да бунту.

Гады тры назад нас з сакратаром камсамольскай ячэйкі Сцяпанам Рамановічам выклікалі ў пастарунак Мяне, пятнаццацігадовага падлетка, паліцыянты крыху папалохалі і пусцілі. Адыходзячы з пастарунка[1], я на ўсё жыццё запамятаў такую карціну. За паліраваным масіўным сталом супроць каменданта сядзіць Сцяпап. Камендант, на якім усё блішчала: лак на рамянях, серабро на зігзагах і такой самай канфігурацыі боты з простымі заднікамі, як у афіцэраў на памінках,— паказвае Сцяпану жгут дроту, цынічна ўсміхаецца і, бытта яму ад гэтага падта радасна, весела кажа:

1 Пастарупак— паліцэйскі ўчастак.

— Не прызнаешся — гэты дрот будзе ў тваім жываце! Сцяпан маўчыць. Толькі рыпнула пад ім крэсла ды па краі стала, за якi браўся пальцамі хлапец, засталіся цёмныя плямкі: у адным месцы чатыры і чатыры ў другім.

Праз некалькі дзён труп таварыша паліцыянты выдалі маці з прыпіскай урача: «Сцяпан Рамановіч, сын Мікалая. пакончыў самагубствам: з'еў 48 сантыметраў дроту жалезнага: трохміліметровага...»

Перад вачыма паўстала няшчасная Сцяпанава маці, горотніца бегала па вёсцы і ў кожнага пыталася:

— Людзі, паслухайце, ці можа чалавек з'есці жалезны дрот, га? Гэтага ж ніколі не бывае!.. Ён жывы яшчэ, праўда?!

Бывала, у лесе спаборнічаем: хто з завязанымі вачыма, панюхаўшы, скажа, з якога дрэва дубец. Сцянап ніколі не памыляўся, нават калі выразаны дубец сухі. А то ўвойдзе ў лес і скажа:

— Тут нехта быў. Відаць, ляснік!

Пачынаем прыглядацца — ніякіх слядоў.

— Па чым ты пазнаеш, Сцяпан? — прыстаём.

— Птушкі не так сябе паводзяць, не чуеце хіба?

Сустракаем ягаднiц, а тыя нам:

— Маеце шчасце! Бегаў тут ляснік і вас з каровамі шукаў!..

Такога чалавека загубілі, гады, эх!

Зрабілася балюча да слёз. У самы разгар варожага мне свята я завярнуўся і пайшоў з Росы.

Рэвальвер, пра які я ўжо ўспамінаў, дастаўся мне ў спадчыну пасля Сцяпана. Гэта быў стары, крануты ржой сямізарадны наган, якім мы да роспуску Кампартыі[1] і камсамола палохалі штрэйкбрэхераў і здраднікаў.

На нашых палях тады валялася шмат вінтовачных патронаў — рускіх, польскіх і нямецкіх — з прыдатным порахам, калі яго высушыць. У мжтэчку з-пад палы прадаваліся для паляўнічых пістоны — паўтара гроша за штуку. Пістоны былі крыху завялікія, але іх нажніцамі можна было абрэзаць. Куляй служылі тры шрацiны, а каб яны тужэй праходзілі праз рулю, іх трэба было расплюшчыць.

Знайшоўшы ад лесніковага нагана гільзу, я, бывала, шылам вымаў з яе стары пістон, закладваў новы, насыпаў сухога пораху, зверху заганяў тры шраціны, і тады стрэл атрымліваўся моцны, нібы з гарматы.

1 У 1938 годзе Кампартыя Заходпяй Бсларусі рашэннем выканкома Камінтэрна была распушчана.

З наганам я не разлучаўся. Ад'язджаючы ў Вільню, паклаў яго ў чамадан. Спачатку ўсюды насіў яго з сабой, а цяпер ён у мяне ляжаў на гары, акуратна загорнуты ў анучку.

Вярнуўшыся з Росы, я палез на гару і дастаў наган. Сціскаючы яго халодную ручку, азірнуўся, паслухаў. Унізе, як толькі ахопліваў позірк, мільгалі тысячы агнёў. Адтуль даляталі прыглушаныя гукі, шапаценне, нібы ўздыхалі тысячы людзей або кішэлі мурашкі ў агромістым мурашніку. А над чвэрцьмільённым горадам стаяла цемра асенняй ночы.

Раптам мяне страшэнна пацягнула выкінуць нейкі фокус. Захацелася патрывожыць гэтае магутнае і варожае наваколле. Я падняў наган, узвёў яго і націснуў на спуск.

— Гах! — сіганула ў неба маланка.

— Гах! — паўтарыла стрэл суседняя гара.

— Гах-гах! — нібы коратка ўздыхаючы, пачалі перадаваць горы адна адной падвоеныя гукі.

Аглушаны, я не мог нічога пачуць, звінела ў вушах. Для мяне горад змоўк, нібы спалохаўся стрэлу, і стаіўся ад жаху. Агорнуты дзікай радасцю, я сунуў наган у кусты і паляцеў уніз.

4

Дома мяне чакаў Суткус.

Літовец быў сірата і дапамогі ніадкуль пе атрымліваў. Удзень працаваў у рэстаране, вечарам наведваў курсы, а начаваў па чарзе ў сяброў. Спаў ужо і ў мяне. Гаспадыня мая без прапіскі браць чалавека нанач баялася, таму мінулы раз мы пачакалі, пакуль яна заснула, а раніцой Альбінас пайшоў, калі жанчына яшчэ спала.

Гэтаксама мы дамовіліся і на сёння.

— Ты чуў? — сустрэў мяне сябар пытаннем.

— Што?

— Глядзі сюды! — падаў ён газету.— У аддзеле літаратуры, бачыш? Велпяй грыбіоту, ён яшчэ нічога не ве-дае!.. Пра вас тут, пра беларусаў!

Я разгарнуў газету. Там тлустымі літарамі было падрукавана:

**«На Беларусі вялікае ўзбуджэнне!**

**У беларускім садзе расквітнела агава, якая квітнее адзін раз у сто год!**

**У беларусаў з'явіўся свой паэт — Міхась Граніт!»**

І далей апісвалася, як паэта запрасіў да сябе на вечар ваявода — пан Бацянскі. Міхась Граніт усіх прысутных у ваяводы пакарыў сваімі творамі.

— Ага, бачылі яны нашых?! — пераможна ўзіраўся на мяне сябар.

Узрушаны не менш за Суткуса, я дастаў свае харчовыя запасы і пачаў частаваць госця.

— Калі Граніт будзе выступаць — сходзім!

— Абавязкова!

Я меў маленькі пакойчык без ложка. У кутку ляжаў скручаны сяннік. Раскладваючы яго, я заявіў:

— Гаспадыня ўжо спіць. Можам і мы на бакавую. Кладзіся, Альбінас!

Загасілі святло. Ляглі. Але не маглі заснуць. І не толькі таму, што сяды-тады хто-небудзь з нас скочваўся на падлогу: такой дробязі мы не заўважалі. Нас аж распірала радасная гордасць. Невядомы паэт умацаваў веру ў будучыню, узняў пачуццё ўласнай годнасці.

Калі Альбінас гасціў у мяне мінулы раз, ці я, ці ён, не памятаю, падаў ідэю — уцячы ў СССР. Мы адразу загарэліся: чаму б і не паспрабаваць? Многа ўцякала туды хлопцаў, дзяўчат, і пішуць нават адтуль!.. Цяпер ідэя паблякла. Выяўляецца, можна і тут свайго дабіцца і даказаць?!.

Перад вачыма паўставала кватэра ваяводы, поўная віленскага панства, якое сабралася слухаць не каго-небудзь, а нашага паэта. Выпусцілі райскую птушку з клеткі!.. Мусілі выпусціць і цяпер глядзіце на яе і слухайце!.. А называецца як — Граніт!.. Нам ужо здавалася, што не ён, а — мы выступаем перад панствам і сячом словамі ім у твар, прымушаем шанаваць нас!

Мы, беларусы, літоўцы, маленькія нацыі?! Данія яшчэ меншая, а з-за Андэрсена ведаюць яе нават дзеці! І Балгарыя маленькая, але вось з'явіўся Дзімітраў і адзін праславіў яе на цэлы свет! Тут не ў плошчы справа, не-е!..

— І Янкоўскі мусіў прыйсці паслухаць! — ускрыкнуў я, не заўважаючы нават, што думаю ўголас.

—То-та! Вымушаны, волняй грыбіету, таксама вітаць нашага брата! Цікава, якія ў паноў былі ў тую хвіліну фізіяноміі? От бы паглядзець! — цешыўся Альбінас, бытта паэт быў літовец.

— О, ведай нашых! Табе, бачыш, вяльможнаму пану, перашкаджаюць нават бедныя галкі? Прысылаеш служанку і думаеш, што так і палезу скідаць табе гнёзды за пяцьдзесят грошаў? А дулю не бачыў? Лезь сам!

Я павярнуўся ад абурэння, і Суткус гупнуўся каленам і локцем на падлогу.

— Слон! Не штурхайся! О, р-ропужэ, як тут цвёрда!

Я спужаўся, што пачуе гаспадыня:

— Цс-с, давай спаць!

5

Не памятаю, ці гаварыў я вам пра сваіх суседзяў — Залкіндаў.

Спарахнелы домік прачкі нібы ўціснулі паміж двума волатамі: домам генерала і мураванкай буйнога гандляра Залкінда.

Гандляр трымаў у Вільні багатую краму адзення і бялізны на вуліцы Міцкевіча. Памятаю, калі праходзіў я ля гэтага магазіна, то кожны раз мне было няёмка з-за бюстгальтараў, якімі бессаромны Залкінд расквяціў вітрыны. Праз вялізныя вокны вабілі мяне туды прыгожыя прадаўшчыцы.

— Дзень добры шаноўнаму пану! — як толькі пераступіў парог, віталася паненка-прыгажуня ў форменным халаціку, і я спыняўся, ачмурэлы ад яе ўвагі.

— Падаю да панскіх ножак!

— Я да панскіх паслуг! — сыпала яна.— Што шаноўны пан жадае? — шматзначна ўсміхалася яна, нібы штосьці абяцала.

Я ўжо даравaў выстаўленыя бюстгальтары і, здаецца, аддаў бы ўсё, абы толькі мець грошы і хоць што-небудзь купіць у гэтай красуні.

О, Залкінд гандляваць умеў.

Яшчэ ён ва ўсім стараўся не адставаць ад суседа Янкоўскага. Такой самай сеткай абгарадзіў свой панадворак. Перад домам нарабіў клумбаў. За домам развёў садок. Але ўсё гэта рабіў толькі з-за моды. Таму недагледжаныя яго яблыні адзічэлі і стаялі з непаабразанымі сухімі галінамі. Паміж пнёў раслі крапіва і дзікі малiннік, а кветкі на клумбах заглушыла пустазелле.

У Залкінда на панадворку часта гуляла дванаццацігадовая дачка, вучаніца прыватнай гімназіі[1].

У доме багача жыла і яго маці — сівая бабуля. Каб паказаць, што недарма есць сынаў хлеб, старая стварала ўражанне, нібы клапоціцца пра ўнучку. Часта яна з'яўлялася на верандзе са шклянкай смятаны і галасіла:

— Бэцы-ы, кум а гэр![2]

Было яшчэ горш, калі старой здавалася, што па дварэ холадна. Яна пачыпала гапяцца за дзяўчынкай з шалікам ці жакецікам, тады хоць затыкай вушы.

---

1 У буржуазнай Польшчы дзеці нават багатых яўрэяў амаль не прымаліся ў дзяржаўныя гімназіі і ліцэі.

2 — Бэцы-ы, хадзі сюды! (яўр.)

Капрызная і разбэшчаная была Бэта. Калісьці я пазі-раў, як яна тупатала нагамі, крычала па слуяшнку, калі тая разліла на сподак з кубка какаву!

І вось аднойчы віленскія эндэкі арганізавалі свой чарговы «дзень без яўрэяў». Пікеты маладых хуліганаў, узброеныя кіямі, блакіравалі з раніцы яўрэйскія крамы, прыватныя дамы, нават цэлыя вуліцы. На сцепах павыводзілі тлустымі літарамі: «Не купляй у жыда!», «Не наймай кватэры ў жыда!», «Не сядзі за адной партай з жыдамі!..».

У гэты дзень, як звычайна, Бэта Залкінд ішла ў гімназію. Эндэкі яе не прапускалі, а гімназістка з дзіцячай упартасцю настойліва стаяла на сваім. Сняшаючыся ў ліцэй, Дануся надышла на пікет якраз у той момант, калі мярзотнікі білі яе маленькую суседку. Дануся адважна кінулася на хуліганаў, вырвала ў іх акрываўленую дзяўчынку, завяла да сябе дамоў і выклікала доктара.

Гэта справа нарабіла многа шуму. У той самы дзень выйшлі экстраныя газеты, у якіх усё падавалася са смакаваннем, з неверагоднымі падрабязнасцямі.

Назаўтра газеты ўспомнілі аднаго камандзіра з часоў паўстання Касцюшкі — яўрэя Бэрку Ёселевіча. Прыводзіліся іншыя прыклады з гісторыі, калі яўрэі гінулі разам з палякамі ў змаганні за незалежнасць Польшчы. У сейме дэпутаты ўзнялі пытанне аб барацьбе з антысемітызмам.

Пару дзён пра Данусю пісалі газеты. Ёй дакучалі карэспандэнты, і таму яна не выходзіла нават з дому.

Тузаючыся з эндэкамі, паненка пабіла калена. Гэтую драпіну газеты размалявалі як небяспечную рану і падлічылі, колькі літраў крыві страціла адважная полька, абараняючы яўрэйскую дзяўчынку. Кожны дзень публікавалі бюлетэнь аб стане здароўя гераінь. Нават паведамлялі, колькі Дануся і Бэта за мінулыя суткі з'елі апельсінаў, якія чыталі кніжкі, па колькі гадзін спалі.

Дануся яшчэ больш вырасла ў маіх вачах. Я адразу забыўся на тое, што вырашыў на памінках легіянераў. Нават выразаў з газеты яе фатаграфію, купіў цэлулоідныя вокладачкі і пачаў насіць партрэт паненкі ды ўпотай любавацца на яго.

6

Паступова шуміха вакол Залкіндавай дачкі ўлеглася. Дэлегацыі яўрэяў з падарункамі перасталі наведваць генералаў дом. Гераіні пайшлі ў школу. Знялі і патруль паліцыі, які цэлы тыдзень вартаваў нашу вуліцу, бо ўлады баяліся, што эндэкі захочуць помсціць за арыштаваных.

Я пільна сачыў за суседзямі.

Некалькі дзён запар стаяла цудоўнае надвор'е. У празрыстым паветры запахла выкапанай бульбай, апалым лісцем. Лунала мноства нітачак бабінага лета, яны чапляліся за галінкі і плот. На Залкіндавым панадворку панавала запусценне, а за сеткай у генерала агароднік зграбаў сухое лісце, зрываў з клумбаў і паліў бадылі, пакрываў матамі паўднёвыя расліны. З некалі пышных крон вытыркаліся дубцы з купінамі галчыных гнёздаў; іх было сапраўды многа! Панадворак зрабіўся прасторны. Парыжэў дзікі вінаград. З-за кустоў за домам паказаліся яблыні і прывязаныя да ствалоў забытыя гамакі. Каторы з іх Данусін?..

Сочачы са свайго ганка за суседнім домам, я сабо ўяўляў, як у ім утульна і прыгожа. Мяне паланіла таямнічасць генеральскай сям'і. Захацелася пранікнуць у гэты казачны замак, разгледзець яго зблізку, дыхнуць яго паветрам. І я пачаў прыдумваць спосаб, як здзейсніць сваё жаданне.

## Раздзел чацвёрты

### 1

Аднаго разу, калі я так вартаваў на ганку, з бакавых дзвярэй генералавага дома служанка вынесла табурэтку, кошык з бялізнай і балейку.

Гэта была тая самая кабеціна. Рухалася яна павольніа, рабіла ўсё старанна. Відаць, і служыла аддана, як могуць служыць толькі працавітыя, сумленныя і адзінокія жанчыны, якія прыжыліся ў чужой сям'і.

Кабета ўставіла дошку з гафрыраванай бляхі ў балейку і пачала шоргаць па ёй бялізнай. А бялізна парыпвала, нібы ў руках жанчыны была мокрая гума.

Такую дошку я ўпершыню ўбачыў тут, у Вільні, у маёй гаспадыні. Успомніў сваю маці, падумаў, якая была б палёгка і для яе натруджаных рук, калі б яна мела такую прыладзітту. Трапілася прычына загаварыць з кабетай, служанкі — народ гаваркі.

Нядоўга думаючы, забраўся я зноў у бэз. Да балкі — крокаў з дзесяць. На жаль, бялізну цяпер мыла ўжо другая служанка — асоба з тупым і прышчавым тварам.

Расчараваны, я павярнуў назад.

Раптам з кухні выйшла з белай хусцінкай у руках генеральша. Цяпер у мяне была магчымасць яе разгледзець зблізку. Першае, што мяне ўразіла ў ёй — над верхняй губой чорныя валасінкі, ад чаго пані

здавалася вусатай. Упэўнены выгляд яе гаварыў, што генеральша навакольнае лічыць створаным толькі для сябе.

— Эрмітэй, гэта ты сапсавала мпе гарнітур? — нездаволена паказала яна хусцінку.

Перапалоханая служанка пачырванела і пачала пальцам адной рукі здымаць мыльную пену з другой, вінавата ўтаропіўшыся ў балейку.

— Ты прасавала яе? — са злосцю ўжо паўтарыла дама.

— Агы...

— «Агы»! — з агіднасцю перадражніла генеральша.— Так я і ведала, што гэта работа майго Эрмітэя! Божа, колькі разоў табе гаварыць — без майго дазволу нічога не чапаць!

Дама кінула хусціпку ў кошык з бруднай бялізнай і завярнула дамоў.

На ўроках лацінскай мовы мы праходзілі грэчаскую міфалогію. І я ўспомніў: Праметэй — чалавек, які імкнецца ўперад, а Эрмітэй — назад.

— Прашу, пані,— пралепятала служанка,— вы мяне не называйце так. Завіце проста Фросяй. А то Эмры... Армі... Я і не выгавару так!

На твары генеральшы не крануўся ніводзін мускул.

— Рабі, што загадана!— кінула дама і знікла.

Слушна яе называлі ля рэчкі мегерай. Беднай дзеўцы тут горш, чым у турме.

Чужым і варожым дыхнула на мяне з гэтага дома. Ну і што з таго, што Дануся ратавала яўрэйскую дзяўчынку? Усё роўна яна з сям'і міраедаў!..

Але, як заўсёды, запалу ад такога разважання мне хапіла ненадоўга.

2

Па пашай вуліцы пранеслі па могілкі нябожчыка. За жалобнай працэсіяй пабеглі дзеці прачкі: пяцігадовы Юра і старэйшая Валя.

Вярнуўшыся на свой панадворак, яны вельмі ж хацелі падзяліцца ўражаннямі. Дзеці падышлі да ганка, дзе я сядзеў, і пачалі нясмела таптацца.

— Дзядзя-а,— загаварыў хлопчык.— А от там неслі нежывую цёцю ў сіняй сукенцы і так яе ў сукенцы і закапалі!..

— Ну і што?— буркнуў я, нездаволены, што перарвалі мае назіранні.

— Нічога, я проста так...— адказаў малы і пачаў біць аб сцяну познюю антонаўку.

Толькі нядаўна я разабраўся, што прачка мая была застарая, каб мець такіх дзяцей. Яна гадавала малых памерлай дачкі. Гэтыя сіроты — заўсёды замурзаныя — усюды лезлі, крычалі, біліся, цягалі ў мяне алоўкі, часопісы, і таму я ад сябе іх праганяў. Але цяпер спахапіўся: ад іх шмат чаго можна даведацца пра жыхароў генеральскага дома.

— Слухай, Юрык, яблыкі ў цябе генералавы?

Малы заматляў галавой:

— Да яго не залезеш у сад. Гэта — Залкіндзіны. Там іх бяры колькі хочаш...

— Дзядзя-а, а Юрка есць яблык толькі калі наб'е. І пра такое кажа — не пабітае, а замучанае! — ні то паскардзілася, ні то пахвалілася сжтра.

— Ну і што? Вядома, замучанае, гэ!— непарушна адказаў малы, высмоктваючы сок.

— А вы ў генерала калі-небудзь былі?— вярнуў я іх зноў да тэмы, якая мяне цікавіла.

— На ёлку хадзілі туды зімой! — адказала дзяўчынка.

— На ёлку? — узрадаваўся я.

— Угу.

— І шмат дзяцей было на той ёлцы?

— Шма-ат!

— З цэлай ву-уліцы!

— Во такі-і дала нам: нані Вацлава пірог! — Хлопчык апісаў у паветры кола.

— Аж такі вялікі?

— А-га...

— А яшчэ ў іх ёсць кот Мурэк!

— Кот?

— Ну! Белы.

— Белы? — Я раптам пазайздросціў дзецям.

— Белы.

— Яго цёця Антося кожны тыдзень купае і прычэсвае грэбенем! — пажніла дзяўчыпка.

— Купа-ае?

— А-га! А наша мамка кажа: «От бы нашаму Юрэку такое жыццё, нічога больш но хацела б: і малако жлокча колькі хоча, і мжа кожны дзень жарэ!..»

Хлопчык толькі шмыгнуў носам.

Больш дзеці нічога не сказалі. Добра і гэта. Во колькі я даведаўся. Цяпер — дзейнічаць!

3

Пайшоў я ў бліжэйшую краму і завёў размову з яе гаспадаром — старым яўрэем. Каб толькі ён хацеў, то мог бы шмат расказаць мне пра парадкі ў доме, якім я цікавіўся.

У краме я стаў наўмысна нагаворваць гандляру на генерала, каб выклікаць старога на шчырую размову. Аднак стары глянуў на мяне вачыма, бытта ўвабраўшымі ўсю зямную мудрасць, і дыпламатычна абсек:

— Мы малыя людзі, бедныя гандляры, пане шаноўны! Хто нам плаціць, таму і прадаём. Усім. Генералу, жабраку, антысеміту — абы даваў грошы. Зрэшты, якія там грошы і якая плата — слёзы адны! Падаткі плаці, штрафы розныя плаці! Уй, а гэтыя эндэкі, каб на іх халера, кожны тыдзень яшчэ шыбы б'юць, не наўстаўляешся...

Пайшоў я з крамы ні з чым.

— А што, мусіць, у генерала электрычнасць не псуецца?— асцярожна павёў я гутарку з манцёрам, які ў нашым доме папраўляў праводку.

— Усюды яна псуецца. І ў простых людзей, і ў генералаў... Во, нават учора ў архірэя сапсавалася! — буркнуў неахвотна той.— Пазванілі з кансісторыі — мусіў ісці...

Я стаў яму прыслужваць. Спытаўся аб прафесіі, пра жонку, дзяцей... Сам не спадзяваўся, што магу быць такім падхалімам!

Потым я напусціў на сябе абыякавасць, прыкінуўся прастачком і асцярожна пацікавіўся:

— Мабыць, калі заходзіш да генерала, от там усяго цікавага! А генерал сустракае цябе ў дзвярах строгі, надзьмуты, як Пілсудскі, з крыжамі на грудзях...

Стаіўшы дыханне, стаў чакаць адказу.

Манцёр перастаў прыбіваць ізалятары, апусціў руку з малатком. Чалавек, не спяшаючыся, памахаў ёю, каб адышла, выняў з рота цвікі, уздыхнуў і прызнаўся:

— А я ні разу яго не бачыў!

— Не ба-ачылі?

— Чаго дзівішся? Нашага брата сустракаюць там слугі або ад'ютант, бо мы заходзім з парадных дзвярэй. Усіх, хто заходзіць з парадных, сустракаюць слугі...

Бытта ведаючы, чаго мне трэба, чалавек параіў:

— Каб пабачыць самога генерала або генеральшу, трэба зайсці да іх з чорнага ходу, ад кухні. Там хутчэй іх спаткаеш...

Манцёр хацеў сказаць яшчэ нешта, але раздумаў, махнуў рукой, маўляў — ну іх да д'ябла, няма часу! Узяў цвікі ў рот, загадаў вачыма

мацней трымаць мне лесвіцу і зноў пачаў прыбіваць да сцяны ізалятары.

Я быў бязмежна ўдзячны гэтаму чалавеку за інфармацыю.

Пры маёй пасадзе пасыльнага ліцэя і вячэрніх курсаў знайсці прычыну, каб заглянуць да каго дадому, было вельмі проста. Дастаткова прыкінуцца, што маеш выпісаны на гэты дом пакет або пісьмо. А пакуль усё высветліцца і табе будуць даводзіць памылку, ты добра разгледзіш усё, што захочаш.

А яшчэ можна пастукаць у дзверы, калі адчыняць, зайсці і спытацца, ці не жыве там чалавек з выдуманым табой прозвішчам. Галоўнае — прыдумай добры варыянт, як па нотах разыграй задуманае, і ніхто нічога не западозрыць.

Але мне было тады якраз столькі год, калі жаданні і мары крочаць не ў нагу з розумам, а ён часта не мае ўплыву на свавольную і дзёрзкую смеласць. Я выбраў варыянт найгоршы.

Каб хоць крыху паварушыў мазгамі, мог бы адразу прадбачыць, што з гэтага атрымаецца. Для мяне ўсё жыццё канчалася на моманце, як я заходзіў у Данусін дом.

4

З сэрцам у пятках падышоў я да генеральскай брамкі — з жалезных прэнтаў і з меднай клямкай. Узяўся за ручку. Брамка падалася нечакана лёгка і ціха. Я замёр і завагаўся. Але адступаць не стаў. Не чуючы ног, сам не свой, падаўся наперад.

Выкладзеная з бетонных плітак сцежка вяла да парадных дзвярэй — вялікіх і масіўных, як у касцёле. Я сышоў са сцежкі і накіраваўся да чорнага ходу.

Ужо даходзіў да гранітных прыступак з жалезнымі парэнчамі, як аднекуль з'явіўся здаравенны сабака, і я з жахам убачыў каля сябе ашчэраныя зубы і наярошаны хрыбет.

— Гыр-р-р! — зарычаў ён пaціху, нервова падрыгваючы губамі, бытта казаў: «Ага, галубок, папаўся? Мне цябе адно і трэба!..»

Ад нечаканасці і страху ў фантастычным скоку пераляцеў я прыступкі, ударыў плячом у дзверы і апынуўся на генеральскай кухні.

Там над тазам з вадой стаяла Дануся.

Яна была амаль голая — адно ў чорнай спадніцы. Я незнарок уткнуўся позіркам у невялікія белыя грудзі з цёмнымі саскамі, якія смешна тырчалі ўверх.

— О-ей! — віскнула Данута, ні то здзівіўшыся, ні то спалохаўшыся, і далонямі прыкрыла свой сорам.

Ачмурэлы, я стаяў і ва ўсе вочы ўзіраўся на паненку. Убачыў нават сінія жылкі ля ключыцы.

Гм, гэта тая самая гераіня, пра якую захлёбваліся газеты? Генералава дачка, да якой я так імкнуўся і ледзь не звярнуў сабе галавы, выглядаючы?

— На, дзіцятка, апраніся! — Знаёмая мне служанка падала ёй вопратку.

— Я ад сабакі ўцякаў...— пачуў я свой жаласлівы голас.

Па тварах жанчын я ўбачыў — яны і самі здагадваюцца, чаму я так уляцеў, як угарэлы, і за гэта не злуюцца, а спяшаюцца прывесці сябе ў парадак для сустрэчы госця, гэта значыць, мяне.

Дануся адвярнулася, выставіўшы мне смуглую гнуткую спіну ды завязаны на патыліцы вузел бліскучых ад вады валасоў, спрытна захіпулася ў халат. Паненка ведала, якая яна прыгожая, любавалася сабой і дазваляла гэта рабіць другім.

— Тут жывуць Янкоўскія?— нарэшце выдавіў я з сябе і спалохаўся.

— Тут,— разглядала яна ўжо мяне з дзіцячай цікавасцю.

— Хто там, цётка Антося?— данёсся з глыбіні пакояў строгі голас.

— Не ведаю, пані Вацлава. Нейкі чалавек!— паслухмяна адказала Антося, пагасіўшы мацярынскую ўсмешку, з якой глядзела на нас.

Два месяцы жывём побач, прыходзіла да прачкі нанімаць скідваць гнёзды, я ўжо збіраўся з ёю вітацца на вуліцы, а гаворыць пра мяне, нібы першы раз убачыла!

— Супакойся, мамуся! Гэта наш пасыльны з ліцэя! — пракрычала Данута.

І ў стракатым кімано з японскага шоўку яна бытта пахвалілася: вось якая я багіня! Ведаю, ты зайшоў па справе, але няўжо не палюбуешся?!.

— У чым справа?— з'явілася ў дзвярах насцярожаная генеральша.

Сумленне маё было нячыстае. Пад яе дапытлівым позіркам я адчуў, што раблюся меншым і меншым.

— Вам пісьмо з ліцэя,— пачырванеў я: хлусіць быў не мастак.

— Мне-е? — здзівілася дама і падазрона глянула на дачку.

Паненка спакойна вытрымала позірк.

Пакуль генеральша адкрывала канверт, я разглядаў кухню, выкладзеныя белай пліткай сцены, каструлі рознага калібру, посуд,

нейкія спружынкі на кіёчках, бляшаныя выкрутасы — усё бліскучае і выстаўленае нібы на паказ.

— Што яны пішуць? — узлавалася дама, кінуўшы вокам на паперу.

— Ведаюць што...

— Хіба ў вас там павар'яце-елі? — выбухнула яна.— Гэта мы не заплацілі за вучобу?

— Мусіць, не, калі пасылаюпь такос пісьмо...— упарта заўважыў я найдурнейшае з таго, што толькі можна было ў тую хвіліну сказаць.

І ў момант паверыў сам у тое, што сказаў, ды адчуў сябе дырэктарам ліцэя:

— Трэба аддаваць грошы ў час. А то не плоціце, а потым шукаеце вінаватых ды абражаецеся яшчэ, калі вам нанамінаюць! Ведаем такіх!

Дануся пырснула.

— Што за нахабства! — Гепеaccess пагардліва абвяла мяне вачыма з ног да галавы, фыхнула і пайшла з кухні.

— Ліцэй! Ліцэй! Прашу пеадкладна даць ліцэй! — пачулася, як генеральша крычыць у тэлефон.

Мяне апанаваў страх: а калі зараз выкрыюць ашуканства? Трэба было ўцякаць, а я нібы прырос да падлогі. Стаяў ды яшчэ дурнавата ўсміхаўся.

Абняўшыся, задраўшы галовы, Данусь з Антосяй чакалі. Мой візіт зацягнуўся, і ў вачах жанчын я ўбачыў нездаволенасць. Аднак я не кратаўся з месца, толькі пераступіў з нагі на нагу. Данусь глядзела прыжмуранымі вачыма, упарта, з усмешкай і выклікам. Я, дурань, у дзявочых хітрыках тады не разбіраўся і думаў, што паненка здзекуецца. У мяне было нават такое пачуццё, бытта стаю перад жанчынамі голы.

— Чулі, у зале Снядэцкіх наш паэт сёння выступае? — з жахам і нібы праз сон пачуў я зноў свой голас.

— Хто-о? — спыталася Данута з паблажлівым здзіўленнем.

— Той самы... Міхась Граніт...

Яна хвіліну намагалася нешта ўспомніць. Тады ў вачах яе з'явіліся недаўменне, спалох, і я выразна ў іх прачытаў: «Ага, ты ненармальны вар'ят!..»

Але спыніцца я ўжо не мог аніяк і канфузіўся яшчэ больш.

— То за чалавека яго не прымалі, то цяпер — нарасхват...

— Та-ак?..— працягнула Данусь.

— Выступае,— выдавіў з сябе, адчуваючы ўсю бессэнсоўнасць сваіх слоў.— У зале Снядэцкіх. Ва універсітэце зала так называецца. Пойдзеце?..

— Яе нікуды не пускаюць!..— умяшалася Антося.

У суседнім пакоі злавалася генеральша:

— Дзяжурны, капрал, колькі маю чакаць? Я вас прасіла падключыць мне ліцэй!

Не, больш такіх пакут вытрываць я не мог.

— Бывайце здаровы!— з палёгкай уздыхаючы, бы той карцёжнік, які пайшоў з карты, якая давяла яго да краху, і цяпер ужо не мае чаго траціць.

— З богам! — сказала Антося.

— О-ей, што гэта? — здзівілася Данута.

— Работа Гектара! — падказала жанчына.

Я азірнуўся.

Божа мілы! У мяне так была распаласавана калашына, што віднелася лытка. З чаравіка брыдка вытыркалася шэрая ануча.

— Халера! — спыніўся я заклапочаны.

Штаны ў мяне былі адны.

— Трэба зашыць, як ён пойдзе так?— добразычліва вырашыла цётка Антося.— Данка, прынжі чорных нітак з камоды, счаплю кавалеру!

— Зараз! — паненка ахвотна і, як мне здалося, вельмі добразычліва кінулася ў пакой.

— Што вы, я тут побач жыву! — пракрычаў я ёй услед.

Але паненка не вярнулася.

Мне зрабілася горача.

— Выпусціце мяне, калі ласка, там сабака! — узмаліўся я, яшчэ не могучы паверыць, што ўсё гэта здарылася наяве, што пацярпеў такі правал.

— Хадзем! — зжалілася цётка.

Я ўжо даўно быў не рады, што пачаў авантуру. Крочыў за служанкай прыніжаны, пакрыўджаны, нібы ў генералавым доме на мяне наплявалі.

«І куды ты лезеш? Каторы раз атрымліваеш па носе, навошта табе гэтыя фокусы?» — гаварыў ва мне нехта разважлівы.

Але зараз жа мяне апанавала злосць.

«Ну, пачакай жа ты, буржуйка!..» — сціснуў я кулакі.

5

Па тагачаснаму звычаю, калі салдаты неслі палкавы сцяг, мужчыны павінны былі здымаць галаўныя ўборы. Але я ніколі не здымаў. А каб не трапіць у каталажку, вайсковыя часці абмінаў здалёк або прапускаў іх, схаваўшыся ў краму ці за вароты.

І трэба ж было так здарыцца, каб, выходзячы з генеральскага дома, я наткнуўся на салдат. Наперадзе калоны неслі палкавы сцяг. На чале — афіцэры з шаблямі, вынятымі з ножнаў і прыстаўленымі да пляча. Мужчыны на тратуарах паздымалі капелюшы і кепкі. Уцячы куды-небудзь? Дудкі! Хавацца на гэты раз не буду, няхай валакуць на пастарунак.

На мяне ўжо шыкаў нейкі тып з капелюшом у руках, а я ўпарта крочыў наперад.

— Ой, пане, здыміце шапку!— папярэдзілі ўстрывожаныя жанчыны.

Я — хоць бы што. Калона пабліжалася.

— Здэйм чапкэ, галгане!— выскачыў да мяне з калоны маладзенькі паручнік. У яго руках бліснула шабля.

Раззлаваны афіцэр не жартаваў; але на мяне ўжо глядзелі ўсе: прысутнасць людзей акрыляла, і цяпер я, вядома, зняць шапкі аніяк не мог. Інстынкт самаабароны падказаў словы:

— А мне трэба туды...

— Хі-хі-хі-хі! — засмяяліся ў натоўпе.

— Я пасыльны з ліцэя, пусціце, мушу пакет тэрмінова занесці Маліноўскім!..— паўтарыў я з нейкай дзіцячай упартасцю і ажно сам паверыў, што сапраўды трэба ісці туды, а мяне вось не пускаюць.

Афіцэр палічыў мяне за прыдурка.

— Ідыёт! — паручнік з усяе моцы ўдарыў мяне тыльнём шаблі па плячы і збіў шапку.

Не паднімаючы яе з тратуара, я падаўся далей. Было няёмка, што прыкідваюся дурнем. Ад злосці захацелася плакаць. Як адпомсціць за здзек? І на памяць мне прыйшоў сабор Свята Духа.

Мітрапаліт варшаўскі Дзіяніс, выслугоўваючыся перад панскім урадам, загадаў папам чытаць пропаведзі і пець малітвы ў царквах па-польску. Праваслаўная Вільня заварушылася. Сёння раніцой да маёй гаспадыні прыходзілі багамолкі. Цёткі вандравалі па хатах і падбівалі людзей, каб перашкодзіць папам выканаць ганебны загад мітрапаліта. Убачыўшы ў мяне на сцяне партрэт Дастаеўскага, старыя падумалі, што гэта ікона, і памаліліся на Фёдара Міхайлавіча, толькі таму я і звярнуў на іх увагу. Цяпер жа ў іхнім пратэсце я ўба-

чыў тое, чаго якраз патрабавала мая душа. Я накіраваўся ў сабор на вячэрню.

А там ужо пахла бурай. Звычайна пустую залу біткам напоўніў народ. Людзі з пагрозай шушукаліся, нервова чакалі малебства. Ля алтара няўпэўнена тоўпіліся маладзенькія попікі.

Нарэшце з-за райскіх варот выйшаў у бліскучай рызе барадаты стары бацюшка, перажагнаў людзей сярэбраным крыжам і з вінаватай усмешкай зацягнуў нешта па-польску. Людзі анямелі, чакаючы божага гневу. Потым загулі зноў. Аднак не пераходзілі пэўных граніц — для выбуху патрэбна была іскра. Я адчуў наэлектрызаванасць залы, набраўся адвагі і крыкнуў на ўвесь сабор:

— Па-руску гавары!

Стары поп разгублена змоўк. У саборы на момант запанавала цішыня, і з вуліцы даляцеў грукат фурманкі.

Я крыху спалохаўся свайго ўчынку, але ўбачыў, што маладзенькія попікі з сімпатыяй падміргваюць мне, маўляў, малайчына, і мы за гэта, нас толькі прымушаюць. Цяпер я гукнуў ужо больш упэўнена:

— Гавары па-руску!

У зале нібы прарвалася нешта. Людзі пачалі наступаць на папа, крычаць, махаць рукамі.

— Па-рус-ку! Па-рус-ку! — праскандавалі гімназісты.

Натоўп злавіў такт, і сабор увесь аж загрымеў. Папу гаварыць не далі.

Выйшаў я з сабора пераможцам. Але і гэтага было яшчэ мала.

6

Вечар беларускай літаратуры ў той дзень меўся адбыцца ва універсітэце ў зале Снядэцкіх. Гаварылі, што там будзе выступаць Граніт. У любы час я быў гатовы прыкласці рукі да ўсяго, што накіравана супроць ненавіснай улады, а тут надарыўся гэткі выпадак над настрой! На курсы, канечне, тады я не пайшоў.

Ля універсітэта ўжо малойчыкі нікога не прапускалі, З усяго горада сюды збягаліся студэнты і гімназісты, каб паглядзець на бжплатнае відовішча: усім было жна, што скандалу не мінаваць. Сярод зявак тырчаў і Браніслаў.

На тэрыторыю універсітэта паліцыя не мела доступу, і эндэкі маглі сарваць вечар.

Энергічны студэнт, відаць, з тых, каторыя арганізавалі сустрэчу, пракрычаў да нас:

— Хлопцы, хто не баіцца, што фашысты набʼюць морду, збірайцеся ў калону!

Вядома, сярод добраахвотнікаў апынуўся і я.

— Таварышы! — камандаваў ужо другі студэнт, якога называлі Яцкевічам,— самі бачыце, трэба найсамперш разагнаць мамчыных сынкоў. Яны могуць сарваць сустрэчу з паэтам. Хадзем і дадзім ім як трэба!

— Пішлы! — закрычаў Яцкевічаў сябра — украінец Шыманскі.

— Вядзі нас! — падхапілі іншыя.

— О-го, які прыткі!— стрымлівалі асцярожныя.— Можа праліцца кроў!

Яны толькі моладзь падзадорылі:

— Ідэі спеюць і ажыццяўляюцца лепш, калі іх замацаваць яшчэ і крывёю!

— «И где, скажи, когда была без жертв искуплена свобода?»

— Нас менш...

— Затое ў нас рукі мацнейшыя!

— Хлопцы, да справы!

— У атаку!

— No passaran![1]

— No passaran! — наэлектрызаваная моладзь дру;уа падхапіла лозунг іспанскіх барацьбітоў.

Нашыя душы і целы даўно прагнулі абрушыць лютасць на ворага. Пастроіўшыся клінам, мы рыууліся на «залатую» моладзь, раскалолі яе, прыціснулі да муроў ды пачалі малаціць.

Я выбіраў сабе дастойнага партнёра, але гімназісцікі ад мяне разляталіся, як ад страшыдла. І тут я наткнуўся на Браніслава.

Князь ужо не стаяў нейтральна. Група малойчыкаў калаціла кіямі нейкае хлапчанё ў вышытай кашулі, а вечны студэнт выкрыкваў:

— Так ему! Та-ак! Ешчэ! Бардзо добжэ!

— Уцякай, бамбіза ідзе! — віскнуў нейкі эндэк, і кампанію бытта здзьмухнула ветрам.

Аднак я паспеў хапіць за каўнер князя і з незвычайным задавальненнем саўгануў яму кулаком знізу пад нос, а потым абмяклае цела бразнуў на брук.

Успомніліся сённяшні паход да генерала і перажытая абраза. Успомнілася шабля паручніка. І ад таго, што добра ўляпіў Браніславу, мне зрабілася адразу лягчэй.

— Каму яшчэ, ну?! — закрычаў не я, а ўся мая душа.

1 — Яны не gройдуць! (іспанск.)

Перада мной узнік маленькі ўвішны гімназісцік. Гэта быў мне не праціўнік. Яго проста можна збіць каленам. Я пачаў шукаць мацнейшага.

Пакуль я разглядаўся, малы нечакана падскочыў, пырнуў двума пальцамі мне ў вочы, асляпіў, а тады ўдарыў у пераносседзе. Пацямнела ў вачах, і я ўпаў. Я ўжо і не бачыў, як узбуджаныя радасцю перамогі хлопцы пранеслі на плячах праз пляцоўку да універсітэцкіх дзвярэй (якія яшчэ, магчыма, памяталі Францыска Скарыну!), паэта.

...Калі я падняўся, выкладзеная гранітнай брусчаткай старажытная пляцоўка была пустая. Блішчэла святло на брусочках граніту, адшліфаваных на глянц ботамі многіх студэнцкіх пакаленняў, а нейкая студэнтка літасціва прыкладвала мне да носа мокрую хустачку.

— Нічога,— суцяшала яна мяне, як малога,— гэта хутка праходзіць! Вас толькі аглушылі, пацярпіце!..

Падышоў вядомы ўжо мне ўкраінец, прыглядзеўся і кінуў:

— Доцягнецца сам додому, а мы підэм вартаваць ізноў!

Студэнт знік.

— Ну ж вы іх малаці-ілі!...— казала дзяўчына далей.— А Любецкага як размалявалі — «хуткая дапамога» забрала яго!.. Вам трэба будзе паляжаць крыху дома...

— Ладна, хопіць! Лепш на сябе паглядзі! — адпіхнуў я дзяўчыну, устаючы.

Я зазлаваў. Зазлаваў на сябе, на гэтую студэнтку, на цэлы свет.

— Куды пан? Пачакай! — спалохана і з перасцярогай прашаптала дзяўчына.

Я азірнуўся. Студэнтка нязграбна трымала мой рэвальвер. Ён вываліўся з кішэні на брук.

Ёлуп! Забыўся нават, што ў мяне было. Толькі б стрэліць адзін раз угору, і ўсю банду гэтых сысункоў як ветрам здзьмула б! Ды я — нібы той асёл, які ведаў сем спосабаў плавання, а ўпаўшы ў ваду, забыўся пра ўсе!..

— Схавайце!— падала мне дзяўчына наган.— А Граніт выступае!..

Ёй вельмі хацелася пагаварыць, але я з маўклівай і вінаватай удзячнасцю ўзяў праклятпы наган ды пакрочыў.

7

Прачнуўся я рана, глянуў у люстэрка і спалохаўся. Пераносседзе распухла і пасінела, а пад вачыма — страшэнныя фіялетавыя «ліхтары».

Стараючыся не трапляць людзям на вочы, я прабраўся да бліжэйшага аўтамата і пазваніў у ліцэй, што захварэў.

— Прашу неадкладна з'явіцца сюды! — грозна і непрыязна заявіў мне сакратар.

Нешта здарылася. Дагэтуль чыноўнік са мной абыходзіўся па-людску. Магчыма, квітанцыі на заказныя пісьмы мне ўчора няправільна выпісалі на пошце?.. Ды не магу ж я паказацца ў такім выглядзе!

— Пане Кунцэвіч, ледзь на нагах стаю!

— Не прыйдзеш, пазваню ў паліцыю! — паабяцаў голас на другім канцы провада.

Завулкамі, хаваючы твар, я прабраўся ў ліцэй.

— Што гэта такое?— адвёўшы вочы ўбок, наліваўся злосцю сакратар.

Чыноўнік трымаў у руках злашчасную паперку, якую я занёс генеральшы. Толькі цяпер я зразумеў бязглуздасць сваёй выдумкі. Пагарэў безнадзейна!

Мне зрабілася млосна.

— Што гэта значыць, я цябе пытаю? — распальваючыся ад сваіх слоў, пракрычаў сакратар, упершыню мяне называючы на «ты».

Убачыўшы мае «ліхтары», ён сумеўся.

У канцылярыю заглянуў настаўнік фізікі. На курсах ён мне сімпатызаваў і часта нават завышаў бал, калі я слаба ведаў урок. Гэта ён мне даў білет на канцэрт піяніста. Яшчэ мы збіраліся пайсці ў астранамічную абсерваторыю і праз тэлескоп паглядзець на зоркі і месяц.

— О-го, кавалер правініўся! — прамовіў ён са спачуваннем.

— Палюбуйцеся, пане Кастальскі, гэты...— тут сакратар, не падабраўшы слова, акінуў мяне зняважлівым позіркам.— Самавольна ўзяў чысты бланк, выпісаў генералу Янкоўскаму напамінак аб няўплаце за вучобу яго дачкі і занёс на кватэру. Генеральша зрабіла нам такую гэцу, што хоць уцякай са школы! Як вы расцэньваеце гэта, пане прафесар?

— Магчыма, кавалер памыліўся. Бывае і так...— пачаў бараніць мяне Кастальскі. Але раптам убачыў сінякі, адразу змоўк, адышоў ад мяне як мага далей і залепятаў:

— А ён заплаціў?

— Хто?

— Генерал!

Сакратар прамаўчаў. Толькі яшчэ раз змераў мяне позіркам, пастукаў сябе па лбе і паціснуў плячыма.

Фізік паціху выйшаў. «Прапала, не пагляджу ў тэлескоп!..»

Кунцэвіч то браўся за ручку, то кідаў яе, то абапіраўся аб крэсла і крытычна мяне аглядаў.

На гэтым сталым мужчыне хоць і былі добры касцюм, модны гальштук, а з рукавоў вытыркаліся накрухмаленыя манжэты з запанкамі, але твар ён меў вжковага дзядзькі, якога нядаўна пагалілі, памылі, апранулі і пасадзілі за стол з паперамі.

Каб я расказаў усю праўду гэтаму прыстойнаму і добрасумленнаму чыноўніку, ён, мабыць, справу ўладкаваў бы. Але ж ці мог я прызнацца?

— Ну, дык навошта ты гэта зрабіў, я цябе пытаюся апошні раз? А? Навошта табе спатрэбілася падрабляць мой подпіс і чытаць ёй натацыі? Ты забыў, што жывеш у горадзе? Што за дзіцячая забава цябе абуяла?

Я ўпарта маўчаў.

— Ух-х, розных даводзілася бачыць тыпаў,— уздыхнуў ён,— але такога экземпляра, павер, Вільня яшчэ не бачыла!

Кунцэвіч нейкі час вагаўся. У яго таілася яшчэ сімпатыя да мяне, і сакратар шукаў важкі доказ, які б схіліў яго рашэнне на той або іншы бок. Узняўшы заклапочаны твар і зірнуўшы на мае «ліхтары», ён нібы нешта ўспомніў, загаварыў больш упэўнена:

— Яшчэ і пабіўся з кімсьці! А заўтра што выкінеш?.. Бог цябе ведае! Даверылі нам сваіх дзяцей лепшыя сем'і ў горадзе, такіх чудзікаў падпускаць да іх небжпечна!.. Тут ліцэй, разбойнікі нам не патрэбны!

Я ўсё маўчаў.

— Ну што ж! — уздыхнуў ён з жалем.— За падробку дакументаў мы цябе звальняем!

— Ну і звальняйце! Надта мне патрэбна ваша сабачая пасада! — кінуў я настырна, а ў самога па скуры прабег мароз.

— Бачу, што не патрэбна. Э-эх! А яшчэ калісьці сам рэкамендаваў цябе дырэктару! Вось, заступіся за сваіх, а яны табе потым адплацяць!..

Я пераступіў з нагі на нагу. Было такое ўражанне, што з-пад мяне выбіралі грунт і, калі я нічога не прыдумаю,— звалюся ў яму.

— Не адп... Кхе!.. Не патр...— каб адгаварыць яго ад ракавога намеру, пачаў я дабываць з сябе нейкія гукі.

— Што, што-о? — пасцярожыўся Кунцэвіч.

— Нічо-ога...— праглынуў я камяк.

— Усё. Можаш ісці!

— Ну і ладна...

Валокся я з канцылярыі і ўжо не хаваў твару.

Па калідоры прама на мяне беглі дзве вучаніцы ў форменных фартушках з цёмнага бліскучага шоўку. Адна з іх была Данута. Прабягаючы блізка, смеючыся, яна мяне штурханула і нават не заўважыла гэтага.

— Яня-а, усё роўна даганю! — пачуў я крык ззаду.

— Ха-ха-ха-ха!

Бестурботныя галасы паненак здаліся такімі недарэчнымі, пустымі, як і іхняя гульня.

## Раздзел пяты

**1**

Генералаў дом стаў мне непрыемны. Пачало кідацца ў вочы тое, чаго раней не бачыў.

Толькі цяпер угледзеў, што вадасцёкавая рына на доме вісіць крыва. За домам стаяла будка, якую генерал змайстраваў сабе для летняга душа. Жалезная бочка, якая вытыркалася зверху, паржавела, стала рудой і агіднай.

Два месяцы я жыў па строгаму раскладу: разносіў пісьмы, вяртаўся дадому, гатаваў абед, рыхтаваў урокі, спяшаўся на вячэрнія заняткі, а кожную вольную хвіліну марыў аб Данусі. Цяпер увесь дзень я не ведаў, чым сябе заняць. І тая рэшта ахвоты да вучобы адпала. Пачаў шукаць работы.

Бацька мой быў не з малазямельных. За ім лічылася шмат гектараў голага тарфяніку і пяскоў. Нашу зямлю як ні апрацоўвай, як ні ўгнойвай, а болей чым для пракармлення сям'і ты з яе не возьмеш. Калі быў лішні пуд жыта, дзесятак яек або маці выкармлівала вепрука, дык трэба было купіць газы, вопратку, а галоўнае — заплаціць падаткі.

Бацькі стараліся. Кожны тыдзень прысылалі яны мне прадуктовую пасылку. Наварыць ежы было з чаго. Адзін месяц у рукаве з крупой я знайшоў пяць злотых, другі месяц у бохане хлеба ляжала дзесяць злотых. Але гэтага хапіла толькі на соль, цукар, лазню і паштовыя маркі.

Калі служыў пасыльным, вучыўся бясплатна. Цяпер трэба было недзе штомесяц дазарабіць пятнаццаць злотых. Але пакуль што нічога не траплялася.

Суткус абяцаў пагаварыць у рэстаране наконт работы. Я ўжо перамог у сабе агіду да аб'едкаў на сталах і забруджанай пасуды — рыхтаваўся стаць афіцыянтам. Суцяшаў сябе тым, што ў рэстаране

на сталах заўсёды шмат свежых газет, нават замежных, і хоць пачытаю іх уволю. Туды прыходзяць і багацейшыя за генералаву дачку. Я нагадаў амерыканскі фільм, у якім мільянерша закахалася ў свайго лакея, і мая фантазія стварала падобную гісторыю і са мной. Вось тады і адпомшчу гэтай паненачцы! Згарыць ад злосці, калі даведаецца!.. Стане бегаць за мной, спрабаваць завязаць са мной знаёмства — позна!..

2

Ды не было патрэбы ў маёй ахвяры. Вярнуўся з работы Альбінас і паскардзіўся:

— Падаў сёння адной сцерве чай і пайшоў сабе! Чую, яна мяне кліча. Выяўляецца, у шклянцы на дне — цукар. Хацела, каб з ёю паіграўся, а з самой ужо і пжок сыплецца. Я не вытрымаў. «Вазьмі лыжачку і размяшай, бяда невялікая!» — кажу, а сам пайшоў. Яна ўзняла на ўвесь рэстаран скандал. Разумееш, гаварыць пра цябе не было зручнага моманту, самога ледзь не прапёрлі!..

— Разумею...— уздыхнуў я.

— ...Яшчэ ты туды не падыдзеш з-за свайго росту. Мой гаспадар падбірае ў афіцыянты адно толькі брунетаў ста сямідзесяці пяці і не вышэй ста сямідзесяці сямі сантыметраў. Жонка яго вычытала, што так робіць нейкі модны рэстаран у Парыжы. Яна нас прымусіла і вусы адгадаваць... На лепш газету, тут ёсць аб'явы...

Катэгарычна ўжо адмовіўся Альбінас і ўцякаць у СССР. Наняць правадніка на граніцы мы не мелі за што, а пераходзіць яе на сваю рызыку небяспечна: абодва дапрызыўнікі, такіх судзіў трыбунал за дэзерцірства.

Альбінас меў рацыю. Але я яго тады не зразумеў і пакрыўдзіўся. Абазваў здраднікам ды вырашыў больш з ім не размаўляць.

Пачаў я дзейнічаць сам.

Навыразаў з газет аб'яў, у якіх патрабаваліся рабочыя, і пайшоў па адрасах. Цяпер марыць пра генеральскую дачку не дазваляў гонар.

Але, як на тое, Дануся не выходзіла з галавы.

Паненка нібы прывязала мяне невідочнай вяровачкай. Каб адагнаць ад сябе думкі пра яе, я накіроўваў іх так, каб паненка выглядала ў чорным святле.

Успамінаў, напрыклад, сваю хату — з аброслай мохам страхой, з крапівой пад плотам, з сякерай у калодцы сярод двара. Маці дажывала свой век, а так і не навучылася ўжываць слова «кіламетр». Калі незнаёмыя пыталіся пра адлегласць да якой-небудзь вёскі, яна адказвала «блізка» ці «далёка» і ў залежнасці ад адлегласці дадавала

«зусім», «вельмі». А. калі трэба было сказаць, напрыклад, у якім годзе што-небудзь здарылася, маці гаварыла: «Гэта было за тыдзень перад піліпаўкай, калі паморак свіней выдушыў, а Канцавая Верка выходзіла замуж...»

І, разжаліўшы сябе такім чынам, я ўспамінаў Данусін дом, дзе адной прыслугі было некалькі чалавек.

Эх, каб стала рэвалюцыя, праперлі б паноў, у генеральскім доме зрабілі б бібліятэку ці аддалі б, напрыклад, беларускаму музею. А то падсялілі б у яго нас з Суткусам... Генеральская сям'я і іхняя дачка загаварылі б са мной інакш!..

Толькі хтосьці ў душы мяне стрымліваў і заўважаў, што рэвалюцыя тут ні пры чым, што мая хата і маці ні пры чым таксама, ні пры чым і Дануся — бацькоў не выбіраюць...

Так мінула некалькі дзён.

3

Як на злосць, я пачаў часта сустракаць Данусю з Браніславам.

Вось і цяпер вяртаўся я з чарговых пошукаў работы і сустрэў гімназістак з князем.

Пасля бойкі ля універсітэта Любецкі, як і належыць шляхетнаму пану, мне не помсціў. Нават не падаваў выгляду, што між намі нешта адбылося.

У Любецкага была падвязана чорнай хусцінкай рука, забінтавана галава і заклеены пластырам твар. З вонкавай скромнасцю, ідучы насустрач паненкам, ён выстаўляў гэта напаказ. Паненкі абдарылі яго шумлівым захапленнем, нібы героя, які прынамсі вярнуўся з-пад Рацлавіц!

— Выбягаю я на пляцоўку, а іх — сотні!— з захапленнем апавядаў ліцэісткам.— Я першага кацапа з левай — раз! Тады правым гакам — накаўт! Пакуль ён падаў, я яму яшчэ — раз! раз! раз! Ускочыў у самую гушчу і — налева! направа!.. Наклаў жа іх я там! Папомняць мяне бальша-вікі-і!..

— О-ей! Пан Браніслаў граміў іх, як Валадыёўскі татар на Украіне!..— заўважыла Данута, і паненкі рассмяяліся.

Як звычайна, Дануся мяне не заўважала.

«Нябось, не прызнаецца ёй, хто яго так размаляваў!..»

Надта хацелася, каб паненка даведалася, што менавіта я аддубасіў так яе прынца.

«Вось табе твая Данута!.. І калі ўжо станеш самастойным чалавекам, неданосак?! — дакараў я сябе.— Нікчэмная, як і гэты бяздарны франт!.. Затое ж і даў яму, папомніць нашых!»

Але задаволенне ад такіх уцех было невялікае.

Я бачыў, што ўсе старанні забыць Дануту ляцелі да д'ябла. Лаяў сябе, прыдумваў зноў прычыну зайсці да генерала, у думках працягваў размову з Данусяй і маці. Колькі ў маёй галаве з'яўлялася варыянтаў таго, што магло здарыцца, каб я сябе інакш паводзіў тады! Што ж, заўсёды знаходзіў словы, калі ўжо было позна. Зусім відочна — Дануся не хацела са мной знаёміцца не таму, што яна дачка генерала. Не выдуманыя ж выпадкі ў кніжках, калі дочкі багатых бацькоў кахалі простых хлопцаў!..

Грызла самалюбства: мною ганьбуюць. Вядома! Раней я думаў, што Данусі не было выпадку прыгледзецца да мяне, таму яна не звяртала ўвагі. І вось я пабываў у яе дома, яна не толькі прыгледзелася — гаварыла са мной, а што толку? Успомніў, як прапанаваў ёй пайсці разам у залу Снядэцкіх, і зазлаваў на сябе.

Недарэка!

Прыгадалася дзяцінства. Неяк варона пакрала куранят. Маці пайшла ў лес, убачыла вароніна гняздо на сасне, паклікала нас. З хлопчыкамі пабег і я. Па гладкім, як заводскі комін, камлі я не мог падняцца і на метр, а бедны сірата, вясковы пастух Мішка, зняў паясок, прывязаў яго да босых ног і, як малпа, палез угору. Мяне ўпікнуў дакорлівы позірк маці...

Або цяпер. На вячэрніх курсах кожны хлопец мае сабе дзяўчыну, ходзіць з ёю ў кіно, вучыць урокі, толькі я адзін хаджу ля дзяўчат воўкам...

У маім узросце бацька ўжо цэлую сям'ю карміў, хату пабудаваў, іншыя людзі навуковыя адкрыцці паспелі зрабіць, а я? Сяджу ў бацькоў на шыі!..

Размінуўшыся з Любецкім і кампаніяй, я бяздумна спыніўся ля вітрыны найбольшай у Вільні кнігарні «Гебертнера і Вольфа». Памалу дайшоў да сэнсу слоў, якія красаваліся за вялізнай шыбай:

**«Увага, грамадзяне! Чытайце амерыканскага Шолахава — Роберта Кентса! Выйшла яго кніжка на польскай мове «Лясныя людзі»!»**

Але ні гэтая аб'ява, ні ўспамін пра бібліятэку з чаргой за «Ціхім Донам» не ўзрушылі мяне.

Заглянуў яшчэ раз у краязнаўчы музей. Гаспадар музея Луцэвіч якраз праціраў рыцарскія латы і кальчугі машынным маслам.

— Дазвольце памераць! — успомніў я, што ў мяне быў калісьці такі намер.

— Калі ласка!

Я скінуў пінжак, пачаў надзяваць на сябе жалеззе. Што за ліха, не налазіць!

— Дарма-а! — рассмяяўся Луцэвіч.— Вам ні адзін камплект не падыдзе!

І праўда. Перабраў я з дзесятак панцыраў і кальчуг, а ўсе малыя. Рыцары былі зусім не волаты,

— Яны былі нават меншыя за нашых людзей сярэдняга росту! — паясніў мне чалавек.

Але і гэтая навіна заняла мяне толькі на хвіліну. Выйшаў я на вуліцу, а на душы па-ранейшаму моташна, горад такі невыносны, што я не ведаў, куды дзецца.

4

Толькі я адышоў ад беларускага музея, як мяне аклікнулі:

— Дзень добры, волат!

Я ўздрыгнуў. Перада мной стаяў Яцкевіч — той студэнт, які камандаваў намі ля універсітэта ў час бойкі.

— Ну, як тваё пераноссе?

— Зажыло...— буркнуў я, нездаволены, што перашкодзілі пабыць аднаму са сваімі перажываннямі.

— Э-ге, ужо амаль нічога не пазнаць, «ліхтары» пажаўцелі! І астатняе да вяселля зажыве!

Студэнт размаўляў са мной манерай чалавека, перад якім хоць і добры вясковы хлопец, але вялікая недарэка ў параўнанні з ім, гарадскім воўкам.

— Што з таго...

— А чым ты нездаволены? — спачувальна спытаў ён. З памятнага вечара ля універсітэта гэты студэнт зрабіўся для мяне аўтарытэтам і, бадай, адзіным блізкім чалавекам у Вільні, не лічачы Суткуса. Таму я сабраўся адкрыць яму сваю таямніцу.

— За навуку трэ плаціць, а няма чым. Работы шукаю...

— А як ты жыў дагэтуль?

— От, неяк жыў...

— А цяпер ужо не можаш? То схадзі на Нямецкую вуліцу. Там існуе дабрачынная таварыства, паможа,— кінуў ён ні то жартам, ні то сур'ёзна.

Студэнт, відаць, хацеў мяне бачыць дужым, здаровым, і я яго расчараваў.

— Не бядуй, будзе і на нашай вуліцы свята, пабачыш!

— Сам ведаю. Але калі?

Раптам ён ажывіўся:

— А ты, хлопча, хват! Толькі прыкідваешся такой авечкай!

— ...

— Нават рэвальвер маеш! І хто б падумаў, а? Такі сабе ціхі і спакойны, ды з вёскі... Добра. Калі-небудзь спатрэбішся для нас з ім, Прыйдзеш?

— Магу.

— Буду мець на ўвазе. А рэвальвер трымай. Толькі асцерагайся, за яго — пяць гадоў турмы! І не падай духам... Ведаеш, хто сказаў пра рэвальвер? Студэнтка, якая цябе ратавала. Дарэчы, гэта пра яе газеты пісалі, што шлюб у турме брала, чытаў?

— Пра яе?.. Я нават у Лукішках быў!

— Во, бачыш!

— Дык гэта яна-а? — ажывіўся я.

— Салют!

Студэнт знік, а я нейкі час стаяў расчараваны. Тая самая гераіня? Такая звычайная, з крывымі зубамі нават?!. Гы!

Хутка, аднак, забыўся і пра яе.

«Расплакаўся як слізняк, знайшоў перад кім!.. І чаго ты перад кожным сябе трымаеш гэтак, бытта ён бог, а ты нішто?»

Я пакрочыў далей больш рашуча.

Успомніў, як гадзіну таму назад прахожы ля Залкіндавага магазіна наступіў мне на нагу і не ён у мяне, а я ў яго папрасіў прабачэння. Захацелася вярнуцца, знайсці таго чалавека і пасварыцца з ім.

Успомніў словы студэнта пра дабрачыннае таварыства. Сапраўды, чаму б не схадзіць па Нямецкую? Мне абавязаны дапамагчы! Не вяртацца ж цяпер дадому!

5

У сярэдневяковых мурах — сырых і аблупленых — на вузенькай вулачцы, дзе калісьці злавілі Кастуся Каліноўскага, я знайшоў шыльду з надпісам: «Дабрачыннае таварыства жанчын-каталічак». Адчыніў дзверы. Нейкая старая спытала, хто я і чаго хачу.

— Дзе-небудзь зарабіць пятнаццаць залатовак у месяц, каб заплаціць за курсы...— напусціўшы па сябе вінаваты выгляд, прызнаўся я.

— А ты каталік?

Я сарыентаваўся, што для фанатычнай клікушы пытанне гэтае — прынцыповае.

— Ну...— ні то адказаў, ні то спытаўся, бо сам быў з праваслаўных.

Я ёй яўна спадабаўся. Каб не расчаравацца, удакладняць яна не стала.

— Падумаем, дзіцятка, і што-небудзь зробім.— Пані запісала маё прозвішча і запрасіла на абед.

Мы апынуліся ў змрочнай зале з нізкім скляпеннем. Маленькія нішы-акенцы былі завешаны марлевымі фіранкамі, пафарбаванымі ў зялёны колер. Ад сырасці на фіранках павыступалі белыя плямы. У зале сядзелі стараватыя мужчыны ў неахайнай вопратцы. На стале стаялі драцяныя кошыкі з хлебам і вялікія белыя пасудзіны. Бедакі трымаліся чынна, з напускной пакорай, і не адводзілі вачэй ад пасудзін, з якіх біў у нос заманлівы пах разваранай фасолі з перцам і лаўровым лістам.

Пані, якая, відаць, была тут за старэйшую, паказала мне месца за сталом. Затым загадала ўсім устаць і зацягнула:

— Отчэ наш, іжа ясі на небясі, да свяціцца імя тваё, да прыйдзе царства тваё...

Людзі пачалі паўтараць за ёй:

— ... Хлеб наш насушны дай нам днесь...

Гэ, дакладна такая самая малітва і ў праваслаўных! Якой тады халеры яны не паладзяць між сабой?!. Здзіўлены гэтым адкрыццём, я цярпліва стаяў і думаў: «Дай ты толькі работу, а далей будзеш мяне бачыць як сваё вуха!..»

— Калі ласка, дзіцятка, адрас члена таварыства пані Курпёвай,— пасля абеду старая падала паперку.— Ёй патрэбна аднаразовая дапамога. За гэта ў нас плацяць злот...

Я пакіраваўся шукаць Курпёву. Што мне прыйдзецца рабіць? Пілаваць дровы, насіць з рынку бульбу?.. Падумаеш, можам прынесці, карона з галавы но спадзе!..

Але не ўгадаў...

Пані Курповай уздумалася перабірацца на іншуто кватэру. Я павінен быў на двухколцы перавезці яе рэчы — вядро пасуды, кардонныя карабкі ды рулон паперы. Паперы я знімаў са сцен — карту Польшчы 1793 года, плакат-рэкламу аб карысці стравы з булёну ў канцэнтраце, адбітак павялічанага чалавечага вуха ў разрэзе і малюнак: святы Ёсіф з каровамі. Усё бруднае, заседжанае мухамі!..

Калі я з агідай ладкаваў рэчы, пані Курпёва трымала на павадку маленькага слязлівага сабачку і часта перабівала мяне недарэчнымі парадамі. Аднак я цярпліва слухаўся. Ліха цябе бяры. Затое праз гадзіну ў мяне будзе залатоўка. Так, іграючы, за пятнаццаць дзён зараблю на вучобу, замест таго каб цэлы месяц, высалапіўшы язык, бегаць па Вільні пасыльным. А яшчэ панікаваў! І ёсць жа дзівачкі.

Рамізнік за прывоз яе з усім багаццем і сабакам узяў бы толькі шэсцьдзесят грошаў!

Прывязваючы карабкі да двухколкі, я пачуў, як старая хваліцца суседцы:

— Ладны кавалер, не?

— Нішто! — пацвердзіла тая.

— Над ім, пані Васілеўская, нашае таварыства ўзяло шэфства! Ужо некалькі дзён ён не меў кавалка хлеба ў роце! Прыйшоў да нас у сталовую, то так еў, так еў, што не маглі надзівіцца! Аж чатыры талеркі супу, бедачыска, спаражніў адразу!

— Езус Хрыстус!

— Як бога кохам!

— Колькі разоў я цвярдзіла ўсім пра ваша літасцівае сэрца!

— Запісуйся, пані, у наша таварыства!

— Трэба падумаць.

— Над чым думаць?

Халера, вы нават падлічылі, колькі я з'еў! І недакладна! Чацвёртую мне вельмі хацелася наліць, але сарамлівасць заела!..

Старыя гулялі ў дабрачыннасць, ім трэба было, каб усе пра гэта ведалі, і ад няма чаго рабіць — гатовы былі падапечным заглянуць у рот.

Дык вось чаму ў вашай сталовай не было моладзі!.. Не кожны можа патураць здзяцінелым бабам! Цьфу, ну ж і ўліп у гісторыю, што нікому не расказвай. Яцкевіч жартаваў, калі раіў сталовую!..

Увесь настрой ад заробленай залатоўкі развеяўся. Але цяпер я не страціў надзеі. Нейкі зарад, атрыманы пару дзён таму назад, дадаваў упэўненасці: быць таго не можа, знайду работу!

6

— Вы маеце крыху часу? — спыніў мяне на вуліцы Луцэвіч з краязнаўчага музея, калі я вяртаўся ад Курпёвай.

— Го, чаго-чаго, а часу хапае, магу ім гандляваць нават. А вам падарую так!

— Патрэбны вы мне. Вяду доследы, але не маю ўжо тое моцы, што вы, малады. Дапаможыце, буду вельмі ўдзячны!

У музеі я быў частым госцем, таму адмаўляцца не выпадала. Зрэшты, часу меў я і праўда шмат, а з Луцэвічам вадзіцца было цікава.

Беларускі краязнаўчы музей у Вільні быў бедны. Ад дзяржавы сродкаў не атрымліваў, існаваў фактычна на ўтрыманні гэтага дробнага памешчыка Луцэвіча, які пусціў на музей усю сваго

гаспадарку. Хоць сам ён жыў як папала, але яшчэ вёў доследы, і яны забіралі яго апошнія грошы.

У навуковым свеце тады панавала думка, што старажытныя людзі з эпохі каменнага веку прылады вытворчасці рабілі надта марудна. Былі меркаванні, бытта наш продак, напрыклад, сякеру з граніту адшліфоўваў цэлых паўгода, а касцяны нож — некалькі месяцаў. Луцэвіч хацеў давесці свету, што гэта не так. Але сам ён быў ужо стары, і яму патрэбны былі маладыя рукі.

Ідэя захапіла мяне. Я адразу пачаў ствараць фантастычныя праекты, як зраблю навуковае адкрыццё і стану славутасцю. Як-ніяк да камня я маю адносіны! Камень да жоран высякалі, бывала, мы з бацькам за паўдня; мала больш часу зойме гэтая работа. З усёй энергіяй узяўся я за справу.

Раніцой наступнага дня мы з Луцэвічам выбралі кавалак граніту і пустую, як трубачку, у сярэдзіне костку. Трубачку гэту я ўзяў паміж далоняў, паставіў адзін канец на камень і стаў вярцець, а Луцэвіч пачаў сыпаць на камень пясок і ліць ваду. Без асаблівага намагання, пакуль ісці на вячэрнія заняткі, навылет прасвідраваў у камені дзірку для чаранка сякеры!

— Ты сабе не ўяўляеш, што натварыў! — паціху, бытта баючыся, каб нас хто не падслухаў, казаў стары.— Не ўяўляеш, праўда?

— Усяго дзірку ў камені! — адказаў я, шчаслівы, залізваючы на далоні мазалі.

Праз пару дзён каменю з дзіркай я надаў выгляд сякеркі — абчасаў бакі. Тады ўзяўся за чаранок. На яго патраціў пару дзён. Чаранок ніяк не хацеў трымацца. Калі махну з усяе сілы, сякера злятала. Як нашыя продкі прымацоўвалі чаранок — таямніца. Дома я шмат пераплёў кошыкаў, і лазовыя дубцы ў маіх руках былі гнуткімі, як вяровачкі. Але нашыя продкі, відаць, умелі вязаць толькі ім вядомым вузлом.

Стары прынёс ад хірурга бычыныя жылы.

— Спрабуй, Іване, гэтым. Цалкам, магчыма, яны маглі такія жылы вырабляць...

Чаранок я заклініў костачкамі, заліў смалой, прывязаў сухімі жыламі.

— Залатыя ў цябе рукі, сынок! — ледзь не расцалаваў мяне Луцэвіч, параўноўваючы маю сякеру з той, якая ляжала ў экспазіцыі.— Ты і сам не разумееш, што зрабіў!

Сам-то я разумеў. Цяпер у кожным падручніку гісторыі трэба ўдакладняць, што зрабіць каменную прыладзіну — справа не лёгкая, але ўжо не такая і цяжкая, як лічылася дагэтуль.

— Цікава, ніхто з вучоных не здагадаўся праверыць на практыцы такую простую рэч?!.— Стараўся я ўявіць сабе твары людзей, калі яны даведаюцца пра маё адкрыццё.

— Вялікія адкрыцці заўсёды простыя! — паддаваў мне жару стары, праціраючы сваё старамоднае і вышчарбленае пенснэ.

Яшчэ Луцэвічу я зрабіў касцяны нож. Потым паехалі мы з ім у лес, там я выбраў сасну і пачаў яе сячы самаробным тапаром. Не раю нікому рабіць гэтага. То была дзятлава работа. З мяне выцекла сем патоў, пакуль я зваліў дрэва, а кожнай сваёй клетачкай адчуў, што азначае цывілізацыя.

Вынікі працы нас радавалі. Аднак Луцэвіч не мог надрукаваць артыкул у бліжайшы час, і са сваёй работы мы пакуль што карысці не мелі. Парадокс! Такое глупства, як развод артысткі Лясоцкай з адвакатам Руцелем надрукавала кожная з трынаццаці віленскіх газет — польскія і беларускія, яўрэйскія і літоўскія, руская і нямецкая, але ніводная не выказала цікавасці да Луцэвічавай інфармацыі.

Ну і парадкі на свеце гэтым!

Нацешыўшыся навізной факта, праз два тыдні я пакінуў музей і зноў пачаў шукаць работу, а пазіраючы на карабок цэментавага будынка за драцяной сеткай, усё нечага чакаў, чакаў і чакаў.

7

Блукаючы так па вуліцах, у сярэдзіне лістапада я ўбачыў аб'яву: «Віленская спартыўная школа запісвае ў секцыі футбола, тэніса, бокса...»

Далей ішоў яшчэ доўгі пералік розных відаў спорту, але мае вочы спыніліся па заманлівым і мужным слове «бокс».

А чаму б мне не стаць баксёрам?!

Я напружыў мускулы і адчуў у сабе вялікую сілу. Здаецца, каб развёў рукі і крутануў імі навокал, прахожыя ляцелі б ад мяне, як яблыкі, збітыя з галін. Нездарма Луцэвіч, вітаючыся, загадзя прысядаў і сыкаў, баючыся, што раздушу яму пальцы.

Аб'ява вісела на высокім і глухім плоце з тоўстых дошак. Я азірнуўся, ці няма каго блізка, тады садануў кулаком у сцяну — раз! другі! трэці!.. Дашчаная сцяна захісталася, за ёю трывожна загульдыкалі індыкі, а з даху ўспырхнулі галубы.

Сапраўды, як мне не прыходзіла ў галаву: я ж прыроджаны баксёр! Няма нічога больш простага, як прафесія баксёра!

Праз хвіліну я ўжо бачыў сябе героем рынга, якога ведае ўся Вільня. За пару мінут пакладзі праціўніка на брызент — і генералава

дачка загаворыць з табой інакш! Усім вядома, як дзяўчаты любяць спартсменаў! Толькі такім шляхам можна да яе дабрацца!..

Я і сам не заўважыў, як апынуўся ў спартыўнай школе, і ў мяне ўжо мералі аб'ём лёгкіх.

— О Езус каханы, пане Левандоўскі, глядзіце, аж сем літраў! — з непадробленым здзіўленнем закрычала лабарантка да трэнера, паказваючы на шкалу спірометра.— Такога ў нас яшчэ і не было!

Я вінавата аддаў паненцы шланг, праз які дзьмуў паветра.

— Нічога сабе!— ледзь стрымліваючы захапленне, прамовіў трэнер. Ён употай і прагна абмацаў вачыма мае ногі, грудзі, рукі і шыю.

— А ты сур'ёзна вырашыў стаць баксёрам?

За абыякавасцю ў голасе трэнера я адчуў ноткі сімпатыі, добразычлівасці і лікавання.

— Сур'ёзна...

— А ведаеш, што бокс — перш за ўсё цяжкая праца на трэніроўках?

— Да яе мне не прывыкаць!

— Гм,—падумаў ён хвіліну.— Веру. Тады прыходзь займацца!

— Калі?

— Сёння вечарам зможаш?

— Змагу!

І ў той самы вечар адбылося маё хрышчэнне. Яго варта апісаць падрабязна.

8

Тапачак і майкі я не меў. Выйсці на рынг давялося ў адных трусах і шкарпэтках.

— Болек, прымі новенькага! — паклікаў трэнер нейкага рыжага дзецюка ў баксёрскай форме.

Той толькі дурнавата ўсміхнуўся.

— Хутчэй, Барташэвіч, надзявай!— падаў мне трэнер пальчаткі.— Пабачым, што ў цябе атрымаецца. Галоўны наш дэвіз — не трусіць!

Я паслухмяна пачаў нацягваць нязграбныя скураныя гамоліны. Хацеў іх зубамі зашнураваць, але ад таго, што на мяне глядзелі, я забыў, што маю рабіць.

— Правільна, навошта завязваць? І так атрымаеш! — крыкнуў нехта.

— Ледзь панясеш! Чаго яны так?

Я разгубіўся да рэшты. Жадаючы дагадзіць публіцы, зноў узяўся зубамі за шнуркі, але зараз жа пакінуў.

Уздоўж канатаў выстраіліся хлопцы, якія чакалі трэніроўкі. Змоўніцкія позіркі, незвычайныя пальчаткі ды выстаўленае напаказ маё голае цела зусім збівалі мяне з панталыку. Чаго яны на мяне глядзяць гэтак? Я ж ім нічога дрэннага не зрабіў!.. Нібы я тут — галоўны герой здзекліва-ганебнай камедыі, якая вось-вось пачнецца.

Усё гэта рассейвала маю ўвагу, і я слаба разгледзеў працўніка, хоць і бачыў, што менавіта да мяне ідзе рыжая істота: нехлямяжая, з вузкім ілбом і вогненна-жоўтым вожыкам.

— Бокс! — чамусьці крыкнуў трэнер.

Здаецца, я не ступіў яшчэ і кроку, а ў маёй галаве ўжо памутнела, наплылі кругі, сцены і столь захісталіся, а нейкая магутная сіла абрынулася на мяне, і я апамятаўся на брызенце. Моцна балела сківаца. Толькі цяпер дайшло — гэта мне так садануў вузкалобы.

— Дык я яшчэ не...— вырвалася з мяне скарга, калі я, здзіўлены, уставаў з брызенту.

— Го, чулі?

— Ён «яшчэ не»! — перадражнілі навакольныя і зарагаталі.

У затуманенай галаве пачало расці крыўднае ўсведамленне, што я гэтым зубаскалам дастаўляю вялікую радасць. Але чаму? Што я ім дрэннага зрабіў?!.

Уражаны сваім адкрыццём, я аж азірнуўся. Сур'ёзны трэнер нібы не бачыў майго позірку, ён бязлітасна закрычаў:

— Ну, чаго пасталі? Пайшлі, бокс!

Вузкалобы вырас перада мной зноў. Я інстынктыўна засланіў кулакамі пабітае месца на твары, механічна прыпадняў локці, і баксёр садануў мне пад грудзі. Ад падзення на гэты раз уратавалі толькі канаты.

Пакуль я, ашаломлены, вісеў на вяроўках, вузкалобы са смакаваннем біў мяне і біў куды адно хацеў.

— Пачакайце!— зноў вырвалася ў мяне ні то просьба, ні то абурэнне.

Навокал зарагаталі яшчэ мацней. Гледачы ўвайшлі ў экстаз:

— Размалюй яго, Рыжы!

— Так яму, во!

— Давай, Рыжы, давай!

— Бокса захацеў? То атрымаеш!

— Няхай не вылазіць другі раз! — ляцелі выкрыкі з усіх бакоў.

На такі цынізм маглі быць здольныя толькі мяшчанскія абібокі.

— Ага, папаўся! — цешыліся.

Адно цяпер дайшло, што спектакль падрыхтаваны, а для публікі я — кролік, якога заманілі да льва ў клетку — бессардэчнага, цынічнага і крыважаднага.

За нейкі міг я адчуў усю наіўнасць стаць праз бокс героем. Мне нават зрабілася шкада, што мары не споўняцца і ўсё застанецца паранейшаму і ўжо нічога, нічога не дасць ім здзейсніцца. Але і гэтыя пачуцці вузкалобы зараз жа ва мне згасіў.

— Рыжы, не адпускай кацапа! — крычалі ў зале.

— Трымай яго, не давай уцячы,— даходзіла да мяне нібы праз сон.

Толькі я ўзнімаўся на ногі, зноў гучала каманда — бокс! І я бездапаможным кулём валіўся на брызент, ажно тупа грымела падлога ды выбухаў новы ўзрыў весялосці.

Я аслеп на адно вока. Пацёр яго і ўбачыў на руцэ кроў. Тады зірнуў сабе на грудзі. Яны былі ў чырвоных плямах: вузкалобы разнёс маю кроў па ўсім целе.

Салёны смак яе адчуваўся нават у роце.

«Заб'е!

Апісваліся ж выпадкі ў газетах, калі так, на рынгу, паміралі!»

Я раптам адчуў усю асалоду жыцця. Чакаць дапамогі не было адкуль. І мяне разабрала шалёная роспачлівая лютасць загнанага звера, які гатовы на ўсё. Я яшчэ ніколі ў жыцці не быў у такім стане. Ад злосці нават перастаў чуць боль.

Калі баксёр каторы раз кінуў мяне зноў на канаты, я адной нагой упёрся ў жалезную стойку, адпіхнуў нахабніка і з усяе моцы другой нагой ударыў яго ніжэй жывата.

— Ах! — толькі жахнуліся ў зале, і адразу запанавала мёртвая цішыня.

— М-м-м! — нема застагнаў мой вораг.

Шчасце яго, што на нагах былі адно шарсцяныя шкарпэткі, прысланыя з дому на зіму.

Калі ён хапіўся за пахвіну, я сарваў пальчаткі, адкінуў іх і павясковаму, з усяе сілы, жарнуў кулаком наводмаш у ненавісны рыжы вожык. Аглушаны баксёр павіс на вяроўках — аж скрыпнулі канаты, бытта з сілай хто кінуў на іх мяшок зерня. Тады я адважыў рыжаму аплявуху з левай, а пасля з правай рукі і стаў малаціць куды папала.

— Во табе, маеш! На! Заменак, халерны, на! — чуў я ў цішыні свой раз'юшаны голас і дзікую асалоду, што мае рукі і ногі месяць цёплае і тугое ненавіснае цела.

— Што гэта робіцца?— дзівіліся аслупянелыя юнакі навокал канатаў.

— Барташэвіч, адыдзі! Звар'яцеў? — крыкнуў трэнер ды нырнуў да нас пад вяроўкі.

## Раздзел шосты

**1**

У трэнера Левандоўскага быў свой прыём. Зялёнаму навічку ён надзяваў пальчаткі і выпускаў на рынг з баксёрам-першаразраднікам. Той бязлітасна збіваў новенькага. Калі хлопец і ў наступны раз прыходзіў на трэніроўку, Левандоўскі лічыў, што з такім варта займацца, і запісваў у секцыю.

Такую штуку трэнер думаў разыграць і са мной, але я экзамены яму пабунтаваў. Баксёру-граміле давялося адпраўляцца са спартыўнай школы ў машыне з чырвонымі крыжамі на кузаве ў бальніцу.

Пасля славутага паядынку я надта пакрыўдзіўся і ў спартыўную школу вырашыў не паказвацца. Паненка таго не варта, каб з-за яе цярпець столькі здзеку, а Рыжы мяне запомніць!.. Яшчэ і закажа іншым!..

Праз пару дзён у хірурга я спаткаў Левандоўскага.

— Барташэвіч, дарагі, што тут робіш?— шчыра, як брату, узрадаваўся трэнер.

Непадроблены тон яго мяне раззброіў, і я забыўся на абразы.

— Палец распух,— паказаў я нагу, абутую ў стары галёш ад прачкіных цёсанак.— Халера, чамусьці доўга не гоіцца!..

— Едзем да нас у школу! Там палечаць цябе бясплатна! Ану, пакажы!.. Фю-у-у, як разнесла!.. А што? Голымі фалангамі так жарнуць — яны ж для гэтага не сканструяваны прыродай!.. Магло быць горш. Але ж і даў ты рыжаму капралу! Шчасце, што босы, быў бы ты абуты, і яму — капут!.. Давай, давай да нас, адкуль у цябе столькі гордасці? Не з князёў жа!..

Выяўляецца, вузкалобы — вайсковец.

Нядобразычлівасць трэнера да баксёра мяне купіла.

Левандоўскі наняў вазніцу, дапамог мне залезці ў фаэтон, і мы адправіліся.

У спартыўнай школе медсястра наставіла на месца вывіхнуты палец, пацерла нечым, моцна яго забінтавала і адпусціла. Праз тыдзень я з'явіўся па першую трэніроўку.

2

Левандоўскага я заўважыў у горадзе даўно. Не раз, сустрэўшы на вуліцы, захапляўся яго фігурай, энергічнай хадой і незалежнымі манерамі.

Яму было пад пяцьдзесят. Але гэты чалавек не ведаў смаку гарэлкі, не нюхаў табакі, хвіліны не правёў без цікавага занятку і выдатна захаваў сваё сэрца, лёгкія і здольнасць цвярозага мыслення. Яго дэвізам заўсёды былі: паветра, вада, добрае харчаванне і дзейнасць. Ён быў увесь напоўнены цікавасцю да жыцця, імкненнем быць карысным людзям.

— Чалавек датуль малады, пакуль сам хоча ім быць! — навучаў ён нас.— Запомніце: маладосць чалавека ў яго руках!.. Не глушы ў сабе бадзёрасці, якая запраграмавана ў тваім арганізме, закладзена ў храмасомах; дапамагай сабе праяўляць свае здольнасці!.. Той не мужчына, хто баіцца скразняку. Адчыні, адчыні вокны шырэй!

Левандоўскі быў заўсёды чыста пагалены, падцягнуты, жыццярадасны, апранаўся ў светлыя клятчастыя і шырокія ў плячах пінжакі, насіў белую шапку. Гэта яго маладзіла, дадавала статнасці.

Прыемна было глядзець на такога чалавека. Ён і сам гэта адчуваў.

Такі ж акуратны трэнер быў і на сваёй рабоце.

Між іншым, польскія спартсмены тады славіліся. Палякі нават паклалі пачатак некаторым сусветным відам спорту, напрыклад, стральбе з лука. Польскія баксёры ўступалі толькі амерыканцам і немцам. І ўсё самае лепшае з айчыннага спорту ўвабраў у сябе наш трэнер. У горадзе яго прозвішча ведалі, як ведаюць прозвішча выдатнага ўрача, адваката або інжынера.

Нас у групе налічвалася чалавек дваццаць. У час трэніроўкі Левандоўскі трымаўся такога правіла: хочаш, каб цябе слухалі, многа не гавары і не крычы. Каманду падаваў скупа, коратка.

— Гетро! — кіне, бывала, толькі адно слова, і мы, як механізмы, пачынаем бегаць.

Практыкаванні стараліся выконваць з усяе сілы, бо ведалі — ніякія фіглі не пройдуць незаўважанымі, а тое, да чаго ён нас змушае, нам неабходнае.

— Давай! Давай! — яшчэ падганялі шэптам адзін аднаго.

— Час! — зноў гучыць каманда, і мы ўжо моўчкі пачынаем лезці на шведскую сценку, на канат ці рабіць што іншае згодна з праграмай, якую ведалі назубок.

Баксёрам трэба нарадзіцца, Левандоўскі гэта добра ведаў і першым чынам шукаў «геніяльныя загатоўкі», як ён выражаўся.

Трэніруючы іх, ён выхоўваў у будучых майстроў дысцыпліну, дапамагаў асвоіцца з рынгам — майстроў як бы выцесваў з грунтоўнай асновы. Каб даць нагрузку нашым мускулам, трэнер вывозіў нас за горад. Там прымушаў лазіць па дрэвах, саджаць на плечы таварыша і бегчы з ім па бездарожжы.

— У нас няма месца для тых, у каго думкі ў небе, а ногі — у ложку! — заяўляў сваім: выхаванцам ён на кожным кроку.

І гэта была праўда.

Кулачны спорт, выяўляецца, цяжкі, яго нават нельга параўнаць з якім-небудзь іншым, найбольш напружаная трэніроўка — у баксёраў. І мы кожны дзень працавалі як мае быць. Вольных ад заняткаў на курсах у мяне было толькі два вечары, калі не лічыць нядзелі, і таму чатыры разы на тыдзень я прыходзіў трэніравацца днём.

3

Баксёрства давалася мне нялёгка. Не хапала спрыту гарадскога юнака. У мяне, напрыклад, ніяк не ладзілася са скакалкай. Я доўга не мог навучыцца гэтай звычайнай дзіцячай гульні. Не было і хуткасці рэакцыі, пачуцця дыстанцыі...

Але я браў іншым.

Нярэдка ў гарадскім парку людзі апладзіруюць і захапляюцца тым, хто аберуч выцісне на манометры дзевяноста кілаграмаў. Часта апладысменты дастаюцца «парніковаму» рэкардсмену, які можа паўтарыць фокус толькі тры разы.

Мне даводзілася карчаваць лес, калоць тоўстыя бярвенні на дровы, спускаць на ваду і сплаўляць сосны, цягаць падоўжную пілу, у гэтых выпадках трэба было напінацца куды мацней, чым аматарам у парку, прычым з раніцы да вечара, кожны дзень.

У мяне была закалка, а гэта не тое самае, што ўмець гладка выпаўніць практыкаванне на турніку ці на брусах. Я быў вынослівы, і гэта цяпер мяне выручала.

На трэніроўцы маё сэрца набірала хутка адпаведны тэмп, і я адчуваў сябе свабодна якраз тады, калі спрытныя гарадскія юнакі ўжо выдыхаліся і выглядалі як мокрыя кураняты.

— Цяжкавата выстаяць на рынгу пятнаццаць раундаў! — скардзіліся такія.— І навошта столькі? На практыцы спатрэбіцца ўсяго — пяць-шэсць!

— Калі выжывеш пятнаццаць, то пяць выстаіш на адной назе! — непахісна вёў сваю тактыку Левандоўскі.

«Ага, ужо вам цяжка! А памятаеце, як з мяне смяяліся і здзекаваліся?..»

Праз два месяцы ў мяне ўжо з'явіліся прыкметы паставы, якой вылучаюцца штангісты, лыжнікі ды бакссёры. Тыя самыя людзі, што так цешыліся тады, калі Рыжы мяне лупцаваў, цяпер на трэніроўках глядзелі на мяне з надзеяй, нават са страхам і былі шчаслівыя, калі я з імі загавару.

— Ну і пары ў яго кулаках!— казалі яны з захапленнем, укладаючы ў слова «яго» ўсе свае надзеі. (У 1938 годзе ў Вільні панаваў яшчэ век паравых машын.)

Але, прызнацца, сам я гэты від спорту не любіў. І наогул яшчэ ў вёсцы цярпець не мог боек, скандалаў, а калі бачыў кроў, то мяне прашываў мароз і пранізвала нейкім токам. Маці, бывала, не магла дапрасіцца мяне зарэзаць курыцу.

Я пайшоў у бокс не па прызванню, і захапленне хлопцаў мяне зусім не кранала. А яшчэ я не цярпеў людзей, якія ад варожасці і пагарды хутка пераходзяць да любві: яны могуць стаць ранейшымі, няхай ты толькі спатыкнішся.

Левандоўскі «выціскаў» з мяне ўсё магчымае ды часта рабіў гэта бязлітасна. Яго мудрагелістыя практыкаванні я выконваў з дзікай упартасцю, абкружаны закаханымі позіркамі.

У палове студзеня я стаў выходзіць на рынг, і часамі маё сэрца замірала пры думцы, што набліжаецца ракавы дзень. Я прыдумваў спосаб, як на матч зацягнуць Данусю. Трэба кінуць генералу ў паштовую скрынку запрашальны білет. Або пакласці яго ў канверт, надпісаць адрас ліцэя, вывесці прозвішча «Янкоўскай Дануце» і паслаць. Так яшчэ лепш: падумае, што запрашэнне прыйшло ад настаўніка фізкультуры з ліцэя, і будзе на спаборніцтве баксёраў абавязкова.

Глыбокай зімой правялі адборачныя сустрэчы, і мяне дапусцілі змагацца за першынство горада.

4

— А, зямляк! Сэрвус!.. Выгляд у пана нядрэнны. Я ведаю, пан ходзіць у спартыўную школу! — звярнуўся да мяне па-польску Станеўскі ў гарадской бібліятэцы.

Чаго ты такім шчілем загаварыў? Хто цябе прымушае крыўляцца? Я нават азірнуўся — паблізу знаёмых не было.

— А мы таксама займаемся спортам! — пахваліўся ён.

— Та-ак?..— працягнуў я разгублена, не разумеючы, каго ён мае на ўвазе яшчэ.

— Толькі — шпагамі. Ходзім з князем у клуб карпарантаў «Баторыя»!

— А!..

Сустрэліся мы ў бібліятэцы імя Тамаша Зана. Я зайшоў туды, каб даведацца ў энцыклапедыі, што азначае па-латыні слова «Данута», бо каталіцкія імёны пераважна ўзятыя з антычнай міфалогіі.

— Што пан чытае? — пацікавіўся Станеўскі.

— От, глупства!..— Я паспешліва закрыў кніжку і пачырванеў.

— Што пішуць пану з дому?

— Усё пра тое самае... Гэта памалацілі, гэта яшчэ не, авёс мышы пасеклі...

— О! дакладна так пішуць і мне!..

Які табе, халера, я пан! Чаго ты выпендрываешся, чаму не можам гаварыць па-простаму!

Некалькі хвілін ён намагаўся яшчэ нешта спытацца. Аднак дарэмна. Размовы ў нас не атрымалася. Ужо мы на столькі адышлі адзін ад аднаго, што і натацыі чытаць яму было нязручна.

Любецкі і шпага! — запалі мне словы земляка.

Я адчуў зайздрасць і ўвось насцярожыўся, бытта баяўся, што Браніслаў мяне абгоніць. Захацелася некуды бегчы, нешта папярэдзіць.

А мо Генрых брэша, як не раз брахаў? Тытулы князёў у Польшчы ўжо даўно не ў модзе. Словам «князь» Станеўскі спекулюе, набівае сабе цану, і тут ён хлусіць.

Станеўскі і карпаранты? Яны фанабэрыстыя, гаварыць з ім не надта захочуць!

Памешчыцкія сынкі з-пад Вільні сядзелі ва універсітэце гадоў па дзесяць. У большасці сваёй яны паступалі на факультэт права, дзе паўгода можна было строіць дурня і на вучобу не хадзіць. У канцы семестра неслі прафесару свае «матрыкулы» — заліковыя кніжкі, і ён, не чытаючы прозвішча, ставіў адзнаку, што такі-та студэнт наведваў лекцыі.

«Залатой» моладзі экзаменаў здаваць не хацелася, і іх пераносілі з семестра на семестр. Ім не было куды дзяваць час, і такія студэнты аб'ядноўваліся ў карпарацыі.

Кожная карпарацыя мела свой клуб-шынок. Дні і ночы «залатая» моладзь праводзіла ў бестурботных п'янках і спрэчках — хто мае ў сабе больш блакітнай крыві. Часамі па прыкладу нямецкіх буршаў яны біліся на шпагах.

Ва ўрадавых колах лічылася, што карпаранты — носьбіты нацыянальных традыцый, і ім ствараліся ўсе ўмовы для вясёленькага жыцця. А гэтыя абібокі не ведалі, куды дзяваць татавы і дзяржаўныя

грошы, за нацыянальныя звычкі выдавалі самыя горшыя звычкі і манеры колішняй шляхты.

Любецкі належаў да карпарацыі батораўцаў, бо наведваў клуб «Баторыя».

5

Міналі дні, а я не мог забыць слоў Станеўскага. Нейкая сіла цягнула ў шынок карпарантаў. Некалькі дзён я хадзіў каля «Баторыя» і заглядаў у вокны.

Нічога не мог даведацца!

— Альбінас,— нарэшце не вытрымаў я і папрасіў Суткуса.— Дапамажы. Баюся, што мяне аднаго адлупцуюць там... Не пытайся ні пра што — таямніца. Твая справа будзе пастаяць па варце, а спатрэбіцца — выручаць.

— Магу! — адразу згадзіўся дружны літовец.

Вярнуўшыся з курсаў, я павячэраў, паклаў у кішэню наган і пайшоў. У скверы ля «Баторыя» мяне ўжо чакаў сябар.

— Ну, давай работу. Вось мае рукі, вось я сам — і рабі, што хочаш з намі!..

— Ясна. Так і сядзі. Спатрэбішся — буду крычаць! — накіраваўся я ў дзверы.

Але лёгка сказаць — накіраваўся.

У дзвярах мяне сустрэў барадаты волат з залатымі лампасамі. Ён паглядзеў з такой надменнай важнасцю, што ў мяне ёкнула сэрца. Бытта не сваей рукой я працягнуў старому манету — карпарантаў ён ведаў усіх з твару і мяне ўпускаць не меў права! Але швейцар са спрытам цыркавога фокусніка манетку перахапіў і, не збаўляючы важнасці, панёс на вешалку маё паўпальтка. Я пасмялеў і пакрочыў у залу.

У памяшканні стаяў страшэнны гармідар. Паветра так было напоўнена віннай парай, што не прадыхнуць. Карпаранты цягнулі «Gaudeamus igitur!». Усе былі незнаёмыя, і я адправіўся далей.

У суседняй зале карпаранты пілі, елі, а іншыя блукалі без мэты і задзіраліся як пеўні.

У адным месцы спойвалі хлапца. Яму падносілі піва. Хлапец перакульваў куфель, ставіў пустую пасудзіну на стол, пстрыкаў па ёй, і куфель са звонам ляцеў на падлогу.

— Го-го-го-го! — выбухаў дружны рогат.

— Давай яшчэ!

— Яшчэ нясі! — загадвалі афіцыянту.

— Каму сказана? Нясі, хлоп!..

Ля стала валялася горба бітага шкла.

Дарма я трымаўся ўвесь час бліжэй да дзвярэй і акон. Некаторыя былі п'яныя да такой ступені, што наўрад ці бачылі каго-небудзь у зале. А для тых, якія яшчэ трымаліся, я быў чалавекам, перад якім можна парысавацца. Ліха яго ведае, чаму ў п'яных такая прага парысавацца?.. Не падаючы і віду, што бачаць чужога, яны спецыяльна павышалі галасы, крыўляліся.

Непрыемна цвярозаму чалавеку глядзець на п'яных. І я паспешліва пачаў шукаць вачыма таго, хто мяне цікавіў. Нарэшце знайшоў.

У канцы вялізнай залы быў памост. На ім двое студэнтаў са шпагамі рыхтаваліся да бою. Любецкі стаяў са шпагай побач. Я прабраўся бліжэй.

Белая, як у паненкі, рука Браніслава трымала бліскучы дубец, на канцы якога быў надзеты гузік. Калі студэнт дакранаўся металічным прутам да другой шпагі, непрыемна звякала, бытта шпагі былі бляшаныя. Дакладней, гэта было крыху падобна на звяканне кос. Усё тут нагадвала ігру статыстаў у тэатры. Куды ім з выхаленымі рукамі да сапраўднага спорту. Ім патрэбны толькі драпіны на твары, каб потым хваліцца перад паненкамі.

Я выбраўся на вуліцу.

— Ведаеш,— пачаў я хлусіць Суткусу,— таго чалавека, як на злосць, няма. Адно Станеўскага спаткаў...

— О! рропужэ, дзе гэтага хлюста няма!

— І пускаюць жа да сябе такога паны, глядзі?

— Думаеш, за так? Ён там мае цвёрды абавязак: падаваць шпагі панічам і чапляць гузікі на вастрыё, каб сталь не калолася!

6

У другой палове студзеня пачаліся ўнутрышкольныя сустрэчы баксёраў. Я з такой лёгкасцю перамагаў сваіх праціўнікаў, што яны ў маёй памяці не пакінулі і следу.

І вось надышоў дзень, калі паміж нацягнутых канатаў я павінен быў зноў сустрэцца з вузкалобым — адзіным у Вільні праціўнікам, якога я баяўся.

— Сапраўдная гарыла! — казалі аб ім тыя, хто першы раз баксёра бачыў.

Капрал пры сваім невялікім росце — сто семдзесят чатыры сантыметры — меў шырачэзныя грудзі — аж сто трыццаць у акружнасці! У гэтай скрыні, а не грудной клетцы, памяшчалася сэрца, якое не ведала стомы, а цела і мускулы здаваліся жалезнымі. І калі іншым людзям такіх якасцей трэба было дабівацца трэніроўкай — яму гэта дала

прырода. Доўгія рукі вайскоўца білі аднолькава моцна — і левая, і правая.

Думаеце, выпадкова, што ні адзін вулічны задзіра не стаў чэмпіёнам па боксе? На рынгу чалавек як на далоні. На агароджанай канатамі арэне рысоўка не паможа, бо там няма куды ўвільнуць, няма кім засланіцца. На брызенце вас двое: ты і твой праціўнік, і, для таго каб яго перамагчы, мусіш спадзявацца толькі на сябе. Па тым, як у такую хвіліну баксёр дае сабе рады, як сябе паводзіць, можна беспамылкова вызначыць характар чалавека.

У вайскоўца было штосьці бяздушнае, подлае і, бадай, звярынае. Пры дапамозе замаруджаных кіназдымкаў сучасным вучоным удалося ўстанавіць, што жаба робіць сківіцамі амаль чатыры тысячы жавальных рухаў ні то ў мінуту, ні то ў секунду! Іншыя вучоныя падлічылі сілу жабіных ног. Гэтая, так груба створаная прыродай, істота можа скочыць на адлегласць у дваццаць разоў большую за даўжыню свайго цела! Але якія б лічбы гэтыя ні былі вялікія, яны халоднай і барадаўчатай жабе ані крыху не прыбаўляюць інтэлекту і не выклікаюць у нас да яе сімпатыі. Таксама сіла і мускулы капрала не паднімалі ў нашых вачах яго аўтарытэту. Рыжага мы нават не лічылі за чалавека.

Не любіў капрала і трэнер.

— І носіць жа такога зямля на сабе! — бывала, у вочы яму гаварыў Левандоўскі ды ківаў галавой: — Скажы, Болек, няўжо і ў цябе была маці?

Але вочы капрала нічога не выражалі.

Іронія лёсу! Ён, як і я, паходзіў з беларускай вёскі, толькі з глухой, забітай. Трапіў у Вільню, да войска, і тут у яго адкрылі талент баксёра. Але гэта яму не пайшло на карысць. Рыжы зрабіўся выскачкай, эгаістам і за хвіліну славы не палічыўся б нават з родным братам.

Былі ў яго і слабыя месцы. Некалі на рынгу капрала моцна стукнулі па галаве, і ў ято наступіла зрушэнне мазгоў. Вось чаму ён быў неахайны, тупаваты, заікаўся, ды яшчэ да таго ж — не надта паваротлівы.

Асабістую асалоду для капрала прыносіў здзек з навічкоў. Ён спачатку прыкідваўся няўмекам, гуляў з ахвярай, як кот з мышшу, а потым «выпісваў» узоры на тварах тых, хто трапляў яму на «апрацоўку».

Чамусьці я мала памятаю, пра што гаварыў са мной Рыжы, але ніколі не забуду яго тактыкі, Бывала, гора, калі ты зазяваешся, і не дай бог табе спатыкнуцца! У гэты момант ёй абавязкова не праміне ўдарыць цябе кувалдай-рукавіцай (баксёр-цяжкавагавік б'е з сілай

пяцьсот кілаграмаў!). А калі суддзя не бачыў, ён прымяняў фокусы і мудрэйшыя. То бытта ненарокам пырне табе пальцам у вока, то падставіць нагу, а схопіцця ўпрытык — націсне рукой на горла, каб заняло дыханне...

Памалу я навучыўся расшыфроўваць намеры Рыжага, прызвычаіўся да яго фокусаў і прымусіў лічыцца з сабой.

— Брава, Барташэвіч! — паціху, каб не чуў капрал, падбадзёрвалі мяне члены секцыі, жадаючы, каб я добра даў ненавіснаму рыжаму тыпу.

Я іх разумеў. Кожны чалавек з маёй групы прайшоў праз яго рукі. Але і я не забыўся, як яны пацяшаліся з мяне, а таму і не надта прыслухоўваўся, што яны гавораць.

Відаць, у кожнай вялікай справе патрэбны перш за ўсё сумленнасць і вера, што ўсё будзе па-твойму. Гэта і вызначыла мае паводзіны ў той час.

Мая ўпэўненасць і ўпартасць збівалі праціўніка з панталыку. Адчуваючы, што яго песня спета, вузкалобы знарок пазбягаў сустрэчы. Распускаў пра мяне плёткі, абзываў яўрэйскім парабкам — любімай мянушкай шавіністаў. Гэтым ён хацеў дыскрэдытаваць мяне і дабіцца, каб я не выйшаў у фінал. Але Левандоўскі не паддаваўся на правакацыі, і ад сустрэчы са мной капрал не мог ухіліцца — круці не круці!

7

У агромністую залу спартыўнай школы сышлася процьма народу. Памятаю чорную бездань залы, цікаўныя позіркі, накіраваныя на мяне знізу, асляпляльнае святло юпіцераў — нас здымалі для кінахронікі.

Пакуль мы на рынгу віталіся, адказвалі на пытанні і рыхтаваліся да сустрэчы, я паспеў некалькі разоў зірнуць у залу, туды, дзе сядзела найбольш паненак. Здалося, што я пазнаў пару расшыраных ад жахлівага чакання вачэй, яны мяне як бы акрылілі, і я ўпэўнена ступіў насустрач гарыле.

Капрал набліжаўся асцярожна і ўвось сабраны, нібы хацеў учапіцца мне ў горла зубамі. Золатам пераліваўся ў электрычным святле вожык вайскоўца, а яго рыжае цела блішчала, бытта абсыпапае жоўтым нафталінам. Я чакаў вузкалобага з ціхай радасцю.

«Бліжэй, бліжэй, дубіна, зараз ты ў мяне атрымаеш!..» Калі не лічыць нездаровыя дрыготкі і лёгкае галавакружэнне, я быў у добрай форме.

— О, гэта дык гэта!

— Ну і калосы два!

— Такі як упадзе, памост праваліцца! — несліся выкрыкі з задніх радоў: нашае спаборніцтва для іх усяго цікавае відовішча.

Эх, людзі, шкада, што вы бачыце баксёраў толькі звонку.

— Дзэн-н! — рэзка прагучала медзь гонга, і мы адразу перайшлі ў атаку.

Ад секундантаў я адмовіўся: у баі ў мяне былі свае меркаванні, свая мэта, і я сам буду перамагаць. Няпрошаным памочнікам вызваўся быць Левандоўскі.

— Асцярожна! — кінуў ён знізу.

Я адмахнуўся локцем.

— К-кам-муніст прак-кляты! — пракрычаў ля майго вуха капрал, калі мы счапіліся ўпрытык.— Я ц-цябе стаў-ку на г-горкі яблык, можаш быць п-пэўны!

Рыжы хацеў перацягнуць на свой бок публіку, не ўсё роўна, як да баксёра адносяцца ў зале. Але на задніх радах людзі яшчэ толькі ўсаджваліся, і капрала мала хто чуў.

— Паспрабуй, заіка! — прыняў я выклік, набіраючыся злосці.

І з лёгкасцю адбіў першую атаку, са здавальненнем адчуваючы, які я ўвесь спрытны і сабраны.

— Давай, давай! — нецярпліва гулі людзі.

— Бартэк!— крычалі мае балельшчыкі цывільныя.— Толькі адважны будзь, і ты пераможаш!

— Адразу з левай кацапа! — раўлі нядобразычліўцы-салдаты і капралы, ускакваючы з месц.

— У пашчэнку яго!

— Гукам! Гукам!..

У зале людзі раздзяліліся на два лагеры. Маіх балельшчыкаў-цывільных было больш.

Для гледача раунд праходзіць надзвычай хутка. Але ж — ой як доўга цягнуцца гэтыя тры мінуты для баксёра ў цеснай клетцы рынга! Колькі ён, небарака, перажывае за сто восемдзесят секунд, якім, здаецца, ніколі і канца не будзе!

А колькі за гэты час прамільгне ў яго перад вачыма вобразаў, успамінаў.

Мой праціўнік зноў наблізіўся ўпрытык. Карыстаючыся тым, што суддзі супакойвалі балельшчыкаў, ён цыркнуў мне слінай у вочы. Вузкалобы хацеў мяне асляпіць ці вывесці з раўнавагі, але я не аслеп і на зачэпку не паддаўся.

— Ужо ваду пускаеш! — пакпіў я толькі.

Тады ён прымяніў трук неспадзяваны. Калі мы сышліся трэці раз, Рыжы замахнуўся правым сярпом, знарок абмінуў цэль, а потым, нібы адводзячы назад руку, трэснуў мяне локцем у пераносіцу. Ну, з мяне было дастаткова!

Ва мне абудзілася страшэнная злосць. І я з усяе моцы ўдарыў вайскоўца ў дыяфрагму.

— Ух! — выдыхнуў ён і адступіў, выставіўшы доўгія ручышчы, як упоры, каб трымаць мяне на дыстанцыі. Але я быў дужэйшы і цяпер умеў карыстацца сваёй сілай.

— Гу-у-у!— зараўла аўдыторыя, калі Рыжы першы раз апынуўся на брызенце ў накдаўне.

— У куток!— пагнаў мяне суддзя, бачачы, што я ўжо раз'юшыўся.

Суддзя стаў адлічваць секунды, а я толькі стаяў і не верыў сваім вачам: няўжо гэта ў мяне пад нагамі валяецца ненавісны Рыжы?

Валяўся ён!

— Не падабаюцца мне твае фіялетавыя плямы,— кінуў знізу Левандоўскі.— Нібы ў саракагадовай бабы на вятру!..

— Глупства! — адмахнуўся я рукавіцай.

— Толькі спакойна! Толькі, прашу цябе, не пары гарачкі, не зазнавайся! — маліў трэнер.

— Ладна, як яно ўжо бу-удзе!..

— Сем, восем... Но, пайшоў, бокс! — загадаў суддзя капралу, калі той быў ужо на нагах.

Але тут прагучаў гонг, і мы пайшлі адпачываць. Аб'явілі пачатак другога раунда, і ў зале закрычалі:

— Куды Рыжы ідзе, глядзіце!

— Гарыла, пашлі каго прынесці падушкі, каб мякчэй было падаць табе!

— Волат, не шкадуй яго, бэнцні ў сківіцу яшчэ раз! Толькі адзіны раз!

— Болек, пся крэў, дзе твая форма?! — патрабавальна раўлі вайскоўцы.

— Морду набіць табе мала!..

Рыжы раззлаваўся, перастаў валодаць сабой і бяздумна палез на мяне, абдаючы хваляй церпкага поту. Ага, гатоў, галубок!..

Да канца другога раунда я адводзіў сваю душу. За кароткі час капрал падаў некалькі разоў. То на пяцёрцы паднімаўся, то на тройцы, то на двойцы, то стаяў нават на каленях — я гульню гэтую знарок цягнуў, каб нацешыцца.

— Дзэн-н! — нечакана прагучаў гонг.

Ладна, у трэцім раундзе цябе даканаю.

— Во, глядзі сюды! — сказаў я Рыжаму і ткнуў нагой у месца, дзе калісьці я першы раз упаў на брызент.— Ляжаш тут зараз як міленькі!

Але са мной пачало адбывацца нешта нядобрае.

Неспадзявана заімгліліся вочы. Спачатку я падумаў, што гэта ад поту, і падаўся ў куток на адпачынак. Ды раптам мяне апанавала дзіўная млявасць, зала з людзьмі загойдалася. На хвіліну здалося, што я лячу ў паветры і мне надзвычай хораша, а нешта салодкае ды цёплае разліваецца па жылах. Потым стала ціха, і я ўжо не чуў, як грымнуўся на памост.

8

Апрытомнеў я ў гардэробе. Нада мной схіліліся людзі.

— Гэта ў яго ад голаду. Аслаб. Нічога страшнага, зараз пройдзе, малады, здаровы! — па-мужчынску скупа гаварыў Левандоўскаму ўрач у белым халаце, трымаючы мяне за пульс.

— Але ж дзіўна! Ён так выдатна правёў два раунды!

— На нервах,— нездаволена буркнуў доктар.— На вайне людзі ў стане нервовага ўзбуджэння без ног нават ходзяць. Нічога тут няма дзіўнага — сіла эмоцый!

— Янэк, ну як! — убачыўшы, што я расплюшчыў вочы, з дакорлівым спачуваннем спытаўся трэнер.

Я вінавата нешта прамычаў ды паспрабаваў узняцца з канапы — але дзе там! Цела было нібы чужое, у галаве памутнела зноў.

— Ляжаць! — сурова загадаў урач, схапіў мяне за плечы ды прыціснуў да канапы.

— Хіба ж у цябе не было чаго есці? — шчыра дзівіўся трэнер.— Твае ж бацькі — гаспадары, маюць зямлю!.. Чаму ты мне не гаварыў ніколі, што галадаеш? Знайшлі б спосаб, каб не галадаў!

Я толькі пакруціў галавой.

— Ну, хопіць ляжаць. Уставай і скончы сустрэчу з капралам!

— Пра гэта не можа быць і гаворкі! — катэгарычна заявіў доктар і напаў на трэнера:— Вы сваіх спартсменаў хоць бы кармілі перад выступленнямі, інакш пазаганяеце ў сухоты. Гэта ўжо не першы выпадак!

— Божа свенты, такую сустрэчу змарнаваць і аддаць пяршынства гэтай смярдзючай гарыле! — не ўнімаўся Левандоўскі, у адчаі хапаючыся за галаву.— Пане Ліпец, можа, дасце ўкол, каб ён вытрымаў яшчэ адзін раунд? Адно адзін! На Захадзе допінгі — звычайная рэч!

— Як урач зрабіць гэтага не магу! — катэгарычна адказаў доктар, шукаючы ў мяне пульс.

— То што ж будзе? — спытаўся я ў трэнера шэптам.

— Нічога. Усё прапала. Да наступнага года, мой дарагі, разумееш?

Давялося зразумець.

За сцяной увесь час стаяў страшэнны свіст і грукат. Прыбег пажарнік і закрычаў:

— Пане трэнер, пане доктар, ідзіце хутчэй!

— Што там яшчэ?

— Цывільныя счапіліся з вайсковымі, Рынг разламваюць! Суддзяў б'юць! Ратуйце іх!

— У чым справа?

— Аб'явілі капрала пераможцам, вось яны ўсе і рынуліся на памост! Вяроўкі паразрывалі, прэнты выкручваюць! Капрала прыціснулі ў праходзе, здзерлі майку і піўной бутэлькай галаву расквасілі!

Доктар схапіўся ды паляцеў у залу.

— Нічога,— вяла праказаў Левандоўскі.— Паліцыя сама навядзе парадак, там жа ёсць іх група... Янэк, ты плачаш?

— Не...

Я адвярнуўся тварам да сцяны, а ў самога перад вачыма — вузкалобы, якому суддзя на рынгу паднімае руку ў знак перамогі.

Усе спадзяваліся, што пасля спаборніцтва ваявода прыме ў сябе пераможцаў. Мая фантазія ўжо малявала, што я, нібы той беларускі паэт мінулай восенню, сустракаюся ў ваяводы з Янкоўскім. А цяпер... На табе!

9

Хоць і няёмка прызнавацца ў такіх рэчах, але, як кажуць, з песні слоў не выкінеш. Пасля кожнай трэніроўкі ў мяне абуджаўся такі апетыт, што я адчуваў страшэнныя пакуты.

Грошы, якія прысылалі бацькі, цяпер ішлі на плату за курсы. Харчаваўся я тым, што прыходзіла ў пасылках з дому спачатку раз на тыдзень, а цяпер адзін раз у два тыдні. Я акуратна дзяліў усю ежу на чатырнаццаць частак, але ніколі не вытрымліваў. І сыты бываў адно першы тыдзень.

Часам на трэніроўцы, бачачы, як тыя, у каго шаўковыя майкі, трусы з кішэньчыкамі, модныя тапачкі, хрумстаюць з апетытам шакалад ці халву, я адчуваў, як у мяне сцягвала сківіцы, па целе прабягалі дрыготкі, а скура рабілася вялай. Але я не паддаваўся і цешыў сябе — дабʼюся свайго, адʼемся.

Пасля апошняга матча з капралам плёўся я па вуліцы Міцкевіча і ў кожнай паненцы ў гімназісцкім паліто з футравым каўняром бачыў генералаву дачку. Як на злосць, паненак такіх спатыкаў многа: была нядзеля. І зноў мае мары аб Дануце здаліся мне наіўнымі і беспадстаўнымі. Стала сорамна за фатаграфію ў кішэні. Я выняў яе з вокладачак, а цэлафан з бліскучай рамкай схаваў у кішэню назад.

«Вось і ўсё!» — сказаў пры гэтым, стараючыся ўздыхнуць з палёгкай.

«Ой, штосьці не верыцца. Каторы раз ты ўжо заракаешся!» — горка ўпікнуў мяне ўнутраны голас.

«Не-е, гэты раз — апошні!» — запэўніў я сваё сумленне.

Фатаграфію парваў на дробныя кавалачкі, і зімовы вецер пагнаў папяровую сечку па снезе.

## ЧАСТКА ДРУГАЯ

### Раздзел першы

**1**

Цэлую зіму з маёй галавы не выходзіла Дануся, і я не меў спакою з-за яе ні дня, ні гадзіны, ні мінуты. А потым усё перамянілася, як бывае толькі ў казках або ў сне. Цяпер і самому не верыцца, што магло ўсё так проста вырашыцца.

У маім жыцці атрымлівалася гэтак не адзін раз. Бывала, хачу чаго-небудзь дабіцца, складу план, пачну дзейнічаць, але ці таму, што гарачуся, ці план мой занадта утапічны, усё, мною створанае, паўстае супроць мяне, а вынік адзін — я аскандалюся. Потым тое, дзеля чаго лез на ражон, прыходзіла нечакана лёгка, само сабой, калі яго я ўжо і не чакаў.

Так здарылася і цяпер.

Але не буду забягаць наперад, раскажу ўсё па парадку.

2

Надышла вясна — ранняя, цёплая, з навальніцамі, нібы ведала, што апошні раз перад вайной цешыць людзей. Ужо ў сакавіку зазелянелі травы, у красавіку дрэвы пусцілі лісце, і генеральскі панадворак нагадваў пышны кветнік буйной і сакавітай зеляніны. Я не спускаў з яго вачэй.

У гэты дзень, нічога не падазраючы, сабраўся я ісці ў краму. Працу знайшоў яшчэ тры месяцы таму назад.

У тыя часы сельскагаспадарчыя прадукты збыту не мелі. Каб прадаць кілаграм масла або літр малака, чаго толькі людзі не прыдумвалі! І вось адзін афіцэр запасу, нехта пан Матыка, сябар Левандоўскага,— ён ля горада меў маёнтак,— ухітрыўся вырабляць малако з павышанай да дзесяці працэнтаў тлустасцю. Каштавала такое малако дорага, але на яго пакупнікоў хапала.

Адразу пасля няўдалага матча трэнер падказаў мне, што пану Матыку патрэбны разносчыкі, і даў мне яго адрас.

Я наняўся на работу. І цяпер кожную раніцу разносіў па багатых кварталах сотню поўных бутэлек, якія фурман пана Матыкі прывозіў з вёскі яшчэ да світання. За гэта я атрымліваў дваццаць злотых у месяц і кожны дзень бутэльку выдатнага малака. Цяпер я быў не галодны і багаты...

Такім чынам, я накіраваўся ў краму. Там купіў хлеба, бульбы, цукру і, прыціскаючы ўсё да грудзей, падаўся дадому. Каб не разарвалася папера і не высыпалася бульба, вымушаны быў крочыць памалу, асцярожна. Вузкая дарога між высокіх платоў ішла на гару. Мяне часта апярэджвалі людзі. Я заняў тратуар у адну плітку. І каб абагнаць мяне, людзі скакалі праз вадасцёкавы равок на брук, нездаволена бурчалі, а я вінавата маўчаў.

У адным месцы першакласніцы напісалі крэйдай на тратуары задачу і спрачаліся. Толькі я асцярожна абмінуў дзяўчынак, як раптам пачуў:

— Прабачце!

— Калі ласка! — адказаў я механічна, павярнуў галаву і сумеўся. Побач — прыціснутая мною да плота — Дануся!

Я адступіў, як мог, убок.

— Дзякуй! — кінула паненка і ўзняла вочы.

Не, гэтага моманту апісаць нельга, яго трэба бачыць.

Яна паглядзела на мяне так, як можа глянуць дзяўчына толькі адзін раз і ў пэўную пару. Я адчуў у паненцы маладую і здаровую кабету. У яе позірку было штосьці жаноча-прыхільнае, блізкае, заманліва-роднае і гуллівае. Адначасова ў глыбіні вачэй я заўважыў трывожны неспакой і выклік.

Ля брамкі Дануся паправіла ззаду борэт, абцягнула форменны фартушок і азірнулася яшчэ раз. Цяпер яна проста какетліва і крыху па-дзіцячы ўсміхнулася.

— Пхі! — чагосьці яшчэ пырснула нават і паляцела.

— Ты паглядзі!..— вырвалася ў мяне здзіўленне. Пастаяўшы крыху, я падаўся дадому, адчуваючы, як у мяне вырастаюць крылы,

як маю істоту залівае нейкая шчаслівая радасць і ўпэўненасць, а грудзям робіцца прастарней дыхаць.

Вось цяпер, у гэтую хвіліну, штосьці адбылося. Што — я яшчэ не ведаў і сам, толькі разумеў: адбылося напэўна і — надта важнае!

3

Нядаўна ў маёй гаспадыні курыца вывела ў кошыку куранят. Калі я з пакункамі вярнуўся з крамы і зайшоў на кухню, там стаяў неверагодны піск.

— Глядзі, глядзі! — пазваў сястру маленькі хлопчык, унук прачкі.— Глядзі, дзядзя Ваня!

Я зірнуў туды, куды паказваў малы. Адно кураня ўпарта дзяўбло на падлозе сонечны зайчык, які падаў ад шыбы.

— Во! — прамянеў хлопчык, шчаслівы ад свайго адкрыцця.

Першы раз за восем месяцаў мы з хлопчыкам зразумелі адзін другога і рассмяяліся.

«Яны добрыя дзеці! Завошта я іх так не любіў і праганяў ад сябе?!»

— Пане Барташэвіч, стаўце абед, я пакінула вам месца на пліце,— сказала прачка.

— Потым навару, калі наварыце сабе вы!

— Занадта раскошна будзе! А дровы, думаеце, мне дарма хто выдае?!

Аднак мне было не да ежы.

«Ідзі ты, жмінда, да д'ябла!» — кінуў я на стол пакупкі і пайшоў на двор.

Яшчэ некалькі хвілін таму назад я быў вялы і абыякавы, галаву меў цяжкую — хацелася спаць. Цяпер усё гэта бытта рукой зняло. Я па-сапраўднаму адчуў вясну з усімі яе пахамі, птушыным шчабятаннем. У вушах па-вясеннему звінелі куранята. Яны нагадалі мне вёску, сіняватую рунь яравых, а за агародамі — луг, пакрыты ўжо лотаццю такой далікатнай жаўцізны, што дзіва брала, як гэткая прыгажосць можа ўжывацца з бруднай цінай.

Колькі часу я тады вартаваў на сваім панадворку, не адводзіў ад суседзяў вачэй, не памятаю.

Нарэшце за сеткай з'явіўся генерал. Ён цяпер быў у піжаме. Чорныя, пад Пілсудскага, маржовыя вусы яго грозна апускаліся ўніз. Гектар лянiва цёрся аб генералавы ногі. Данусін бацька, не спяшаючыся, абышоў клумбу, падняў грудку зямлі і адкінуў убок. Тады пад кранам спаласнуў рукі. Грудка магла сабе ляжаць, дзе ляжала, аднак генерал адкінуў яе, бо прыемна было яму адчуваць пахучую зямлю,

халаднаватую ваду — іграць ролю гаспадара, наводзіць парадкі. Ён стварае ўражанне чалавека стомленага, занятага клопатамі, якому, дзякаваць богу, выпала вось хвілінка перадыхнуць. І генералам жывецца нялёгка?!.

— Кубусь! — пазваў ён як чалавек, які прызвычаіўся, што кожнае яго слова пачуюць тыя, да каго звяртаецца.

— Естэм, пане генерале,— з'явіўся на парозе прыгажун ад'ютант.

— Пошту прынясі!

— Слухам, пане генерале!

Ад'ютант вынес крэсла-раскладушку і рознага фармату канверты. Генерал пакасіўся на галчыны гнёзды, выбраў месца далей ад іх ды сеў на раскладушку. Тады ён разарваў вялізны канверт, разгарнуў, як прасціну, газету і замёр. Ля ног гаспадара прымасціўся Гектар. Па загалоўку я ўбачыў, што газета замежная. Генерал глядзеў у яе заклапочана, насцярожана, трывожна хмурыўся, як хмурыліся тады, гледзячы ў газеты, мой бацька і ўсе старэйшыя людзі.

Я доўга назіраў, а генерал усё чытаў. Дзіва. Я праглытваў старонкі газет з бесклапотнай асалодай, а для генерала чытанне іх — складаны рэбус, цяжкая работа. Часамі ён нешта крэсліў алоўкам на паперы, неспакойна варушыўся, соп, бурчаў, ківаў галавой і час ад часу лаяўся ўслых:

— Ах, пся крэў, хо-ле-ера я-асна!.. То неможлівэ!..

— До пе-ру-уна!..

— А-яй-яй, но, про-ошэ!..

Нарэшце Гектару надакучыла з гаспадаром. Сабака ўстаў і пайшоў за дом. Мне здалося, што там ёсць абавязкова нешта цікавае і для мяне. Я асцярожна пачаў прабірацца ў канец драцяной сеткі.

За ўвітай дзікім вінаградам агароджай пачуліся дзявочыя галасы. Я стаў на пянёк і зазірнуў цераз вінаград. Там загаралі Дануся з Бэтай.

Яшчэ ў спартыўнай школе я доўга не мог прызвычаіцца да хлопцаў у майках і трусах. У нас на вёсцы паказаць голае цела можна было адно ля ракі. Нават стары дзед, косячы на балоце, накідаў на сябе зашпіленую на ўсе гузікі кашулю і белыя порткі. А тут у цэнтры горада ў адных купальных касцюмах бессаромна валяліся жыватамі ўніз паненкі, надзеўшы на галовы папяровыя каўпакі і наклеіўшы на насы лісты бэзу. Дануся нешта ўголас чытала, а Бэта слухала. Яшчэ яны бестурботна памахвалі ў паветры ружовымі пяткамі. На мяне гыркнуў Гектар, і я ўцёк.

— Ідзіце, я вам нагатавала супу! — паклікала гаспадыня.

— Дзякуй...

— Унь, я наліла ўжо.

— Ладна. Мне не хочацца яшчэ есці!..

— Ой, што з вамі, Янку, вы не захварэлі часам? Штосьці вы з раніцы сам не свой!..

Але я кабету не надта слухаў. Мне не верылася, што сёння сустракаўся перад брамкай з Данусяй. Але ж гэта быў не міраж!.. Падрабязнасці сустрэчы так і стаялі перада мной. Толькі не прападаць жа страве, і жанчына прывязалася як смала!.. Вельмі неахвотна я накіраваўся дадому.

4

Назаўтра вярнуўся я з работы а дзевятай гадзіне раніцы і пайшоў па ваду. Яе бралі ў глыбокім яры. Там, дзе была студня, горы ўтваралі маляўнічую цясніну, панавалі цішыня і спакой, бытта цясніна была ў глухім полі.

Яшчэ здалёк я ўбачыў, што побач з цэментавым кругам стаіць навенькая эмаліраваная пасудзіна з ручкай: высокая, унізе шырэйшая, а ўверсе вузенькая, з раструбам. Але я не звярнуў на яе ўвагі. Мала хто мог паставіць. Горад. Навокал тысячы людзей. Паставіў і возьме, калі будзе трэба.

Нічога не падазраючы, падышоў я да студні і пачаў прывязваць да вядра вяроўку.

— Дзень добры! — раптам пачуўся крыху як бы знаёмы голас.

Я аж уздрыгануў ад нечаканасці. На адхоне стаяла Дануся і трымалася за ствол клёна.

Я марыў сустрэцца з ёю ў фае тэатра, у краме, на параходзе, нават на самалёце, калі зраблюся славутасцю. Марыў спаткаць яе ў доме ваяводы пасля таго, як перамагу рыжага капрала. Падрыхтаваў нават словы, з якімі звярнуся да яе. Але спаткацца гэтак?..

— Гэта вы-ы? — вырвалася ў мяне.— Сэрвус...

Я разгубіўся да рэшты, не ведаў, што рабіць і што гаварыць, падрыхтаваныя словы ніяк не падыходзілі. Мяне апанаваў нейкі жах. Хацелася даць драла, але ногі бытта анямелі, нібы прыраслі да зямлі.

— Пан дазволіць сваёй вяроўкі, калі дастане сабе вады? — папрасіла яна і пажалілася:— Я не ўзяла!

— Вазьміце...

— Думала, хто-небудзь будзе тут абавязкова... Прыйшла, чакаю, чакаю, і ніхто, як па злосць, не з'яўляецца. Таму, мусіць, што нядзеля. Першым прыйшоў пан...

— Бярыце...— паўтарыў я няўпэўнена, стрымліваючы ў сабе радасць, што Дануся звяртаецца да мяне за дапамогай.— Вы носіце адгэтуль ваду таксама? У вас жа свой водаправод! — ускрыкнуў я з папрокам і адразу ж спалохаўся.

— Мы бяром тут ваду для таты.

— Доктар прыпісаў яму піць яе, тут солей багата...

— А-а...

Дануся, падтрымліваючы рукамі падол просценькай сукенкі, зляцела да мяне з гары.

Белую кашулю раніцой я вымыў і развесіў на плоце сохнуць, а апрануў вышываную — з-за ідыёта-«прафесара» толькі і заставалася насіць у ёй ваду.

— Гы!..— паненка нібы спатыкнулася, убачыўшы зблізку маю вышыўку.— О-ей, якая прыгажо-осць, як цудо-оўна!..

Я разгубіўся, і яна адвяла вочы. З цікавасцю заглянула ў студню, закрычала:

— Глядзіце, яшчэ лёд!

— Бо паміж гор. У гэтую цясніну сонца мала заглядае,— пачувальна растлумачыў я.

— Та-ак?

Я ўжо спахапіўся. Калі надарылася магчымасць спаткацца са сваёй багіняй, то трэба гаварыць інакш. Але пра што?

Мы крыху памаўчалі. Можа, я сплю?..

Я ўважліва паглядзеў. Дануся стаяла бокам. Яе маленькае вуха і шаўкавістыя валасы, асветленыя сонцам, былі блізка ад маіх вачэй. Над верхняй губой у паненкі залаціўся ледзь прыкметны пушок. Твар яе быў крыху смуглы ад лёгкага загару...

Не, я не сніў і ўсё адбывалася наяве.

Недалёка ляжаў ляшчынавы кій. Паненка яго падняла і нязграбна пасунула ў студню:

— Моцна ён яшчэ трымаецца?..

З глузду з'ехала? Гэтага яшчэ не хапала!..

— Насыплецца ў ваду! — перахапіў я кій.

— О-ей, прабачце! — вінавата праказала яна, назіраючы з пашанай, як я вымаю з кішэні газету, абціраю ляшчыну.— Дакладна зрабіў бы так мой тата...

— Цяпер можна,— аддаў я кій.

— Дзякуй...

Дануся пачала адколваць край ледзянога шэрага ды залізанага вадой, наздраватага абруча, што нейкім цудам трымаўся па абымшэлых цэментавых сценах калодзежа.

— О-ей, нібы з жалеза! Як камень!

— Так нічога не будзе!— адабраў я ляшчыну зноў, засадзіў яе паміж зялёнай сценкай калодзежа і лёдам ды лёгка абрушыў яго ў ваду.

— Ух-х! — ускрыкнула яна, калі ў калодзежы плюхнула. Яе вочы заблішчалі шчырым захапленнем.

Зблізу паненка была прыгажэйшай, чым я сабе ўяўляў. Яе твар нібы прамянеў нейкім сзятлом, ад чаго я не мог на яе доўга ўзірацца. Гэта мяне падта бянтэжыла. Скоўвала ўсведамленне, што перада мною — чалавек з іншага свету.

Данусядo, мабыць, адчувала, што робіцца ў маёй душы, і. Гаварыла як з роўным, не заўважаючы маёй збянтэжанасці і памылак у польскай мове.

— Ну, даставайце! — заахвоціла паненка, бытта я меўся рабіць нешта незвычайнае.

Я закінуў на гару кій, прывязаў вяроўку да свайго вядра, выцягнуў адно, потым другое. Дапуся ўсё глядзела. Ліха на яго, такое глупства можа выклікаць у чалавека шчырую цікавасць?!.

Я адвязаў вяроўку. Падаючы яе, запрапанаваў:

— Ну!

Дануся разгубілася і не магла даць рады вяроўцы.

— Зараз! Я хутка!..— цвярдзіла яна.

Тонкія і жывыя пальцы паненкі доўгі час бездапаможна перабіралі тоўстую вяроўку, канец якой намок і стаў тугі ды непадатлівы, нібы карабельны канат. А калі нарэшце яна зрабіла нязграбны вузел, эмаліраваная пасудзіна не хацела ў студні тануць.

Толькі цяпер я падумаў, што трэба дапамагчы, і запрапанаваў:

— Ану, я!

— Сама ўмею!

— Так я і паверу!

— Але ж — даставала!..

— Э-э!..

— Праўда, праўда! — ледзь не плакала яна з крыўды.— Як бога кохам, даставала!

— Ла-адна, паве-ерым! — кінуў я паблажліва, бесцырымонна адабраў канец вяроўкі і перадражніў яшчэ нават:— «Уме-ею», «Сама-а», «Як бога ко-охам!..»

Выцягнуў пасудзіну, выкінуў з яе трэсачку, наліў вады са свайго вядра.

— Дзякуй пану! — сказала Дануся, чакаючы, пакуль я даставаў сабе ваду, і пачала апраўдвацца:— Кожны раз сюды ходзіць наша цётка Антося, але ўчора мамуся пусціла яе дадому!

— На вёску? — удакладніў я, бытта мне важна было гэта ведаць.

— Не-е! Цётка Антося на акраіне мае сваю хатку!

— А-а...— не знайшоўся я што сказаць.

— Пойдзем! — запрапанавала яна зусім проста.

І мы пайшлі.

**5**

Мяне апапаваў страх: калі на працягу бліжэйшай хвіліны не здарыцца што-небудзь незвычайнае, калі чаго-небудзь не прыдумаю, Данута так і пойдзе дадому. Тады ўсё прапала! Наўрад ці здарыцца яшчэ такая сітуацыя. Як на тое ліха, думкі бытта хто выключыў: я нічога не мог скеміць, хоць ты трэсні! Я толькі глядзеў.

А яна ішла наперадзе, несла пасудзінку і часта мяняла рукі. Кінуліся ў вочы мяккія абрысы яе падбародка, кранутая загарам шыя...

Трэба гаварыць, але пра што? Ліха па цябе, як парушыць маўчанне?..

Дануся, відаць, перажывала тое самае. Як бы з гатоўнасцю яна часта паварочвала да мяне галаву, і я бачыў насцярожана вінаватыя вочы дзяўчыны, якая хоча зрабіць нешта добрае, але таксама не ведае як.

Так мы і рухаліся.

У цясніне панавала застылая цішыня, і выразна чуліся нашыя крокі; стукалі льдзінкі аб сценкі вёдзер, ды плюхала вада, выплёскваючыся на жвір. Час з кожным крокам убываў, а я ўсё дарэмна намагаўся нешта прыдумаць. Знячэўку выліць вядро вады пад ногі, ці што? Гэта было б ашуканствам, а я не мог абыходзіцца з паненкай несумленна — у яе было столькі добразычлівасці...

— Уф-ф! — выдыхнула яна, паставіла пасудзінку і памахала рукамі, бытта яны замерзлі.

— Цяжка?

— Цяжка! — пажалілася яна.

— Што вы! — шчыра здзівіўся я, ставячы і свае вёдры.— У гэтай банцы літры чатыры, не болей!

— Ну, вядома, для вас — такога Галіафа — гэта нішто! — прытворна пакрыўдзілася яна, азіраючы маю постаць з галавы да ног.

Мне гэта вельмі палесціла. Я бытта паспрабаваў адарваць пасудзінку ад зямлі.

— У-ух, чорт, не зрушыць нават!.. А хочаце?.. Мне зусім нічога не значыць вас з цэлай гэтай банкай...

І я той самай рукой, што трымаў за вушка пасудзінку, дзёрзка абхапіў дзяўчыну ніжэй пояса ды, адчуваючы пасільны жывы цяжар, паненку крутануў пару разоў у паветры і зноў паставіў на зямлю.

— Во!

— О-ей, як было цудоўна! — ані крыхі не пакрыўдзілася яна, ловячы раўнавагу.— Як жудасна! Як галава закружылася! Го, нават вада не расплюскалася!..

На чорным саціне ў мяне былі вышытыя макі — свежымі ніткамі, чыста, з густам. Нібы здаровае дзіця, што прачнецца і адразу гатова чаму-небудзь дзівіцца, так і Данусярасыжо не адводзіла вачэй ад кветак.

— Такую прыгажосць у вас і зараз на вёсцы робяць? — пацікавілася.

— Кожная цётка! А гэта — мама вышыла...

— Прыгожа!

Яе ўвага мяне расчуліла і абудзіла крыўду, якую я насіў вось ужо паўгода.

— «У Афрыцы ёсць народы, якія прападаюць за каляровымі шкельцамі, ніткамі...— праказаў я з горыччу.— У нас па «крэсах усходніх» гэтае дзікунства захавалася ў тым, што мясцовыя сяляне расшываюць сваю вопратку. Глядзіце, перад вамі прыклад!..»

Дануся жахнулася:

— Хто такое глупства пасмеў сказаць?

Я назваў.

— Наш полёні-іста пан Залескі?— працягнула яна з абурэннем.

— На курсы больш яе не надзяваю.

На паненчыным твары я прачытаў, выразна ўбачыў, што яна сябе лічыць вінаватай за дурную выхадку прафесара, але не ведае, як выказаць спачуванне, і аж чырванее ад бяссілля. Раптам мне зрабілася лёгка-лёгка на душы, як бывала толькі ў дзяцінстве, калі выкладзеш сваю крыўду маці.

— Ат, ліха яго бяры, перажывём!— ужо весела і легкадумна прамовіў я, падняў адшліфаваны каменьчык і запусціў яго высока ўверх.

Паненка з трывожным захапленнем сачыла за яго траекторыяй, пакуль камень не плюхнуў у кусты.

Мы пастаялі, паперажывалі кожны сваё, паазіраліся.

— Глядзіце, кветкі! — раптам узрадавалася Данута і палезла на гару, усмешкай заахвочваючы мяне.

На адхоне расла чаромха. Я з прыемнасцю начаў ламаць галінкі з белым квеццем.

Збіраючы букеты, мы паднімаліся вышэй і вышэй. Дануся паабдзіралася аб кусты, але нічога не заўважала.

Нарэшце яна ўзабралася на самую гару.

— Я кожны раз дзіўлюся, якая маляўнічая адгэтуль Вілія! — праказала яна і адразу змоўкла, зачараваная.

Валасы яе былі ўсе абсыпаны белымі пялёсткамі. Ад напружанай хадзьбы дыханьне паступова рабілася роўным. Мне месца было добра знаёмае.

— Ну,— згадзіўся я.

— Нечым напамінае Альпы...

— Гэта яшчэ нічога. Во, я ведаю гару! З яе горад — як на далоні! Можна палічыць усе цэрквы і касцёлы. Нават Замкавая гара і Тры Крыжы адтуль відаць...

— Давайце сходзім! — не задумваючыся запрапанавала яна.

— Можна...

Але ісці ў гэтую хвіліну мне ніяк не выпадала. Па-першае, дома чакалі вады. Па-другое, пада мной гарэла зямля, я баяўся за вёдры: пакінулі ж мы іх на дарозе; ёй, генеральскай дачцэ, вядро — глупства, а мне?.. Да ўсяго, мой ідэал пачаў блякнуць. У той час, калі сталы чалавек шукае прадмет свайго абажання, каб зліцца з ім, юнаку патрэбен сам працэс скрытнага і маўклівага абажання. Уся прыгажосць для яго тоіцца ў безнадзейнасці яго кахання. Надзвычай лёгкае збліжэнне мяне раптам расхаладзіла. Адначасова гэтая шчуплая, з тонкім профілем паненачка ў просценькай сукеначцы ў сінюю клетачку выклікала ў мяне пашану і прыцягвала ўжо неяк па-новаму. Я ўжо і не ведаў, што гаварыць.

— Не-е, не цяпер. Калі іншым разам! — супакоіла яна, убачыўшы на маім твары нерашучасць.

Дануся нешта перажывала, а я выбіраў яшчэ лепшае месца недалёка ад таго, дзе мы былі.

— Прабачце, калі пан Залескі вам гэтак сказаў,— раптам прамовіла яна.

Дзіва — думае ўсё пра тое?

— То было восенню... Ну яго да д'ябла з Залескім — шавініст тупы!.. Вам кусты перашкаджаюць, хадзіце сюды, во!

— О-ей, колькі вежаў! Адна, дзве, тры, чатыры...— лічыла Дануся, паказваючы пальцам удаль.— Аж трыццаць два касцёлы і цэрквы ў пашай Вільні. Божа!

— Я налічыў сорак. Адсюль усіх не відаць, бо гэтая гара занізкая. Во, з той!..

Але паненка болей не цікавілася маёй гарой.

Я пашкадаваў ужо, што адразу не злавіў Данусю на слове і не прапанаваў, напрыклад, сёння яшчэ схадзіць на гару. Чорт іх бяры з вёдрамі, калі і прапалі б! І з прачкай бы нічога не страслося б без вады...

Але прыдатны момант вярнуць было ўжо немагчыма.

— Трэба ісці, дома будуць хвалявацца! — спаважнела Дануся.— Надта доўга затрымалася. Хадзем!

Лёгка і адважна збегла яна з гары, зняла тапачкі і дакладна так, як робяць дзяўчаты ў нашай вёсцы, стукнула адна аб адну, зноў надзела і падалася да вёдзер.

Нездаволены сабой, следам паваокся і я.

На вуліцы акуратна на палавіну раздзялілі мы чаромху, ветліва кіўнулі на развітанне галовамі і разышліся.

6

Вярнуўся я з пустымі вёдрамі ў яр і задумаўся пад студняй. Гэтае месца стала для мяне цяпер незвычайным. Як добра, што няма калаўрота, як на вёсцы, бо тады вісеў бы тут ланцуг і я з Данусяй не сустрэўся б.

Палез на гару, знайшоў ляшчыну. Гэта быў не проста кій. Яго карычневая кара з ружовенькімі вочкамі пабыла таямнічую значнасць. Вось за гэтае месца Дануся трымалася, калі я ўзяў ад яе кій, ён яшчэ быў цёплы.

Я нават пагладзіў ляшчыну і чамусьці захаваў яе ў кусты.

Нанасіўшы вады, пайшоў на вуліцу.

Усё пачалося вось адсюль. Каб тратуар быў крыху шырэйшы, а вадасцёкавы равок не такі глыбокі, яна магла б мяне і не заўважыць, гэтак не паглядзець,— проста абышла б брукам. Зрабілася страшна, што ўсё адбылося дзякуючы звычайнай выпадковасці, якой магло і не быць. Магчыма, Данусю да студні прыцягнула падсвядомае пачуццё, абуджанае нашым спатканнем на тратуары?

Я ад прыроды такі: калі мяне нешта ўсхвалюе, збіраюся і кудынебудзь іду.

У гэтую нядзелю я хадзіў па Вільні больш за ўсе дні. Хадзіў як бы падросшы, цяжэйшы, дужэйшы, разумнейшы ад таго, што нёс у сабе новыя ўяўленні, пачуцці і радасць. Дзе там хадзіў! Узрушаны ўвагай Данусі, я насіўся па горадзе як на крылах, а ва мне ўсё калабродзіла.

Адначасна было так прыемна, бытта Дануся ішла побач. Усюды бачыў яе прысутнасць.

Вось — кіёск. Па дарозе ў ліцэй яна кожны дзень глядзіць на яго. Быць таго не можа, каб чалавек не пакідаў на прадмеце штосьці ад свайго позірку. На сініх фанерных сценках абавязкова ёсць сляды і Данусіных вачэй. Вось і я гляджу на кіёск...

Цікава, калі глядзець на яго Данусінымі вачыма, ён дакладна такі сіні, якім здаецца мне? Магчыма, у яе ўяўленні сіні колер выглядае зусім інакшым?..

Мне, нібы пасля першай вясенняй навальніцы, зрабілася лягчэй дыхаць, весялей жыць. Я прамянеў здароўем і шчасцем, з пачуццём перавагі сустракаў залётныя позіркі дзяўчат. Каб яны, бедныя, ведалі, якімі вартымі жалю, смешнымі і наіўнымі мне здаваліся!..

Я быў упэўнены, што абавязкова зноў сустрэнуся з Данусяй. Яна ж такая простая, зусім не падобная на фанабэрлівых паненак віленскай знаці, якія не лічаць цябе нават за чалавека.

Ад радасці, што ўсё наперадзе, захацелася бегчы дахаты, легчы на ложак і праспаць увесь гэты час, абы толькі не пакутаваць ад чакання. Эх, каб які чараўнік зрабіў мяне на гэтыя дні нячулай скалой, як бывае ў казках!..

Позна ноччу, вяртаючыся дадому, я стаіўся каля генеральскай брамкі і зноў пачаў вартаваць.

Выйшлі дзве дамы, спыніліся на тратуары. Адна з іх была генеральша. Яна, мусіць, праводзіла сяброўку.

Дамы некалькі хвілін меркавалі, ці трапна апрануліся. Дзіўна. Пра гэта яны гаварылі сур'ёзна, нібы ў тым, якое адзета паліто, увесь сэнс чалавечага жыцця на зямлі.

— Пані Вацлава,— спыталася незнаёмая,— колькі зарабляе цяпер ваш муж?

Геяеральша нешта прабумболіла.

— І пані не мае даўгоў?

— Не.

— О Езус Коханы! Мой муж атрымлівае ў два разы больш, і я вечна ў даўгах!

— Эканомлю, ласкава пані, і трымаю добрых служанак.

Толькі цяпер я здагадаўся, што незнаёмая — жонка ваяводы, пані Бацянская.

— О, та-ак, добрая служанка — вялікае шчасце ў доме! — з перакананнем пацвердзіла яна, цяжка ўздыхаючы.— Але адкуль такіх узяць у наш час? Каралі і служанкі цяпер не ў модзе, кажа мой муж. Ваша Антося заўсёды дома, калі б я да пані ні зайшла! А сёння, на-

прыклад, я сваіх служанак адпусціла з вечара да раніцы. І хоць ведала, што яны правалочацца з салдатамі, але падумала: няхай сабе выйдуць на волю...

— Таму я і трымаю адну старую, другую ідыётку і нікуды кроку лішняга ступіць не дазваляю,— дзялілася вопытам генеральша.— Нявольнікі няўдзячныя. Няўдзячныя нават за волю!

— Праўда, праўда, ласкава пані! — жыва падхапіла яе Бацянская.— Гэта і мой муж кажа! А яшчэ гаворыць, што праз некаторы час іх абавязкова трэба мяняць, бо надта хутка псуюцца. Ды я такая добрая — анёлам мне б толькі быць! Адгэтуль і грошай заўсёды не маю, даводзіцца пазычаць у вас...

Генеральша яе супакоіла:

— Не трэба сябе так касціць, дарагая пані, вы тут ні пры чым! Варшаўскія вяльможы выязджаюць на нас!.. Пан Бэк, Славой-Складкоўскі за кошт дзяржавы трымаюць слуг, па тры лімузіны!.. Маюць вілы ў Закапанэ, яшчэ будуюць сабе і ў Жэневе, а ты заедзеш у Цурых і тулішся ў пансіянаце, бы жабрачка!..

Генеральша кранула ў Бацянскай набалелы мазоль.

— Ой, пані Вацлава! — з жарам загаварыла яна.— Іхнія жанкі якіх толькі падарункаў не прывозяць з заграпічных камандзіровак!.. Бэк узяў сваю кікімару ў Берлін, і Рыбентроп саболевае футра ёй падараваў!.. Мой гаворыць: «За што мы кроў пралівалі ў легіёнах?! А хто такі Славой? Такая самая выскачка!»

— Бо жывуць ля залатога карыта,— растлумачыла генеральша. — Пахапалі сабе смачнейшыя кавалкі, а нашых мужыкоў, сапраўдных герояў «Цуду над Віслай», у глушыню спіхнулі слухаць злавеснае карканне гэтых варон!.. Здаецца, з торбай пайшла б па свеце, ды ніхто не заўважыць!..

— Глушыня-а, пані Вацлава, страшэнная! Нікуды не вылезеш — пясок, камарыльня, хваробы, а з-за дзікунскага дыялекту ні з кім не абмяняешся на вёсцы і словам!.. Ужо лепш чалавек знаходзіўся б у якой-небудзь Афрыцы!.. Мой гаворыць, калі выдзяляць там Польшчы калоніі, напросіцца ў прэзідэнта губернатарам у Мадагаскар!.. Хопіць з-за камуністаў псаваць тут нервы! У Афрыцы брыльянтаў, кажуць, многа ў пясках!.. І дзеці прагнуць так экзотыкі!.. Сланы... Пальмы... Свежыя фрукты... Негры...

Ваяводзіха ўспомніла і ажывілася яшчэ больш:

— На Капры адзін амерыканец запрасіў нас у госці, і яны нам прыслугоўвалі! Такія паслухмяныя!.. Пачуеш ад іх толькі і ўсяго: «Так, мадам!», «Так, монсер!» Дарагая пані, а што за цудоўная гармонія!.. Сіняе-сіняе неба, галубое мора, белая віла, чорныя слугі і гувернанткі!.. І

я, пані, скажу, іхняе цела зусім не пэцкаецца, я добра прыгледзелася!.. Іхняя чарната нейкая ўнутраная, нават на белым каўнерыку не пакідае следу!.. Калі ім павязаць яшчэ аранжавыя фартушкі—цуд шэдэўральны!.. Негры зусім мала ядуць, не тое што мае русінкі — адной бульбы ім не напасешся: як сядуць усе трое, як навернуцць!.. Ад таго ім потым і да салдат хочацца!..

Генеральша яе мала слухала, у яе быў свой клопат:

— «Сабаліную накідку!..» Праўду пані гаворыць!.. А хто такі Бэк? Усяго палкоўнік кавалерыі! Так мой жа генерал!.. Не-е, шаноўная пані Бацянская, я адгэтуль нікуды не паеду. Я свае права ведаю, ад варшаўскіх магнатаў выдзяру, што нам належыць, хоць і будзе ўсё гэта мне каштаваць новых маршчын!

Нячутна пад'ехаў магутны кадзілак з адкрытым верхам, спыніўся. З яго вылез ад'ютант і, прытрымліваючы дзверцы, узяў пад казырок:

— Машына падана!

— Дзякуй, Куба! — кіўнула генеральна.

Дамы накіраваліся да лімузіна. Было чуваць, як генеральша абураецца:

— Цяпер тут ціха. Днём на нашай вуліцы столькі мужыцкіх фурманак, што не праехаць!.. І чаму гэтыя мужыкі не працуюць, а толькі раз'язджаюць па гарадах, што ў іх за справы ў Вільні могуць быць?

— Я пагавару з мужам, пані Вацлава, каб ён забараніў ездзіць фурманкамі па вашай вуліцы. Павесіць знак!.. Пані Вацлаве на маршчыны няма чаго скардзіцца. Пані гэтак молада выглядае! А ўсё таму, мабыць, што масажыстку прымае. А я кожны раз яе ад сябе адсылаю — не хапае часу з ёю вазіцца. Муж злуе, што дарма плацім шалёныя грошы...

Дамы развіталіся. Машына з Бацянскай паехала сабе, а генеральша вярнулася дадому. На верандзе адразу напала на служанку:

— Эрмітэй, ты ў мяне сцягнула халат з карункамі?

Пачуўся голас маладой дзеўкі:

— Агы!.. Бо вы яго выкінулі...

— «Агы!..» — з нянавісцю перадражніла яе генеральша.— Бачыш ты, ужо запіхнула сабе ў торбу?!. Пяць злотых штрафу вылічу з палучкі!

З хітраватай наіўнасцю служанка праказала:

— Пані Вацлава, а я ўжо казала, што мяне ў дзярэўні звалі Просія!.. І яшчэ Фруза!.. А то — Эмі... Эмры... Я і не вымаўлю так!..

— Пакінь цябе, зладзейку, без нагляду на хвіліну!.. Марш да працы!

«Міраеды!» — з жахам падумаў я пра яе і Бацянскую.

Сцэнка мне яшчэ раз напомніла, з кім я звязваюся. Прыйшоўшы на кватэру, я ніяк не мог заснуць. Мусіў устаць, запаліць святло. Пачаў прыводзіць да парадку абцёпканыя нагавіцы.

Заняты справай, каторы раз пытаўся ў сябе, ці правільна раблю? Паддаўся на вудачку якойсьці паненачцы з варожага лагера! Але штосьці ўжо грунтоўна перамянілася ў маіх поглядах. Я адкрыта глядзеў у твар таму, хто сарамаціў. Ну і што? Яна ж не вінавата, што нарадзілася дачкой польскага генерала! Я мог бы з такім жа поспехам нарадзіцца сынам султана Саудаўскай Аравіі!..

Дануся не генеральша і не жонка ваяводы. Ці мала было выпадкаў у грамадзянскую вайну, калі адзін брат у белых, а другі — у чырвоных? Дачка — камуніст-камісарка, а бацька — палкоўнік у Дзянікіна?!. Урэшце, Данута мне падабаецца — і годзе.

Як яна абурылася на Залескага!.. І цяпер недзе перажывае за мяне!.. У генеральскай, буржуйскай кватэры ляжыць, мабыць, варочаецца ў ложку і перажывае!..

Стала адразу лягчэй.

Цяпер я клаўся спаць і думаў, што заўтра мяне зноў чакае нешта прыемнае. А ў наступны дзень яшчэ не прачнуўся, як успомніў — учора ў маім жыцці здарылася нешта надзвычай важнае. Я ўсхапіўся з ложка з цікавасцю да ўсяго свету, бадзёры і свежы.

7

Прайшоў цэлы тыдзень, але так нічога і не здарылася.

Настала зноў нядзеля. Як і ў мінулы раз, я пайшоў да студні, прасядзеў там з дзесяці гадзін раніцы да палудня, а Дануся па ваду так і не прыйшла. Настрой у мяне адразу сапсаваўся.

Генеральскі панадворак быў пусты, я пайшоў у горад. Надвор'е стаяла выдатнае: у небе — ні хмурынкі, моцна пякло сонца, пахла нагрэтымі мурамі. Паветра было сухое, крыху насычанае азонам ад быстрай рэчачкі Віленкі, таму дыхалася лёгка, і мяне настроіла на бадзёры лад зноў.

Выбіраючы пустыя вуліцы, дайшоў я да квартала з казармамі. Там стаялі прывязаныя кавалерыйскія коні і тапталі свежыя ды тугія яблыкі залацістага калу, якія пахлі моцна, як спірт. Мяне, сялянскага сына, так і пацягнула да коней. Я падышоў, ляпнуў крайняга па лапатцы, конь адразу стаў на дыбы, ажно зазвякалі на ім жалязякі. От бы на такім пранесціся па полі! Агонь!

З брамы выйшаў элегантны афіцэр і стаў нацягваць скураныя пальтачкі.

— Ну, Фацэт, паедзем? — спытаўся ён, і той самы конь радасна пачаў грэбці капытам, паціху ржаць.

— Ах ты, мой хлопчыку, засумаваў так! — паспачуваў гаспадар і пагладзіў Фацэта па храпе.

Я з зайздрасцю паўзіраўся, як афіцэр адвязаў повад і скакун паслухмяна пайшоў за ім, змейкай выгінаючы тонкую шыю. Вайсковец, бадзяга, лёгка, іграючы, ускочыў у сядло, пагнаў рыссю, але ў каня моцна заквактала солязёнка, і коннік перавёў яго на спакойную хаду.

Я падаўся далей.

У вокнах шэрай і доўгай будыніны сядзелі з люстэркамі ў руках салдаты і пускалі сонечныя зайчыкі ў вочы паненкам, якія праходзілі міма; тыя жмурыліся, пішчалі, аднак адыходзіць не спяшаліся.

— Пане капрал, закурыць дасі? — шматзначна і залётна пыталіся падазрона нафарбаваныя жанчыны ў вайсковых, якія выйшлі з адпускнымі білетамі і тоўпіліся ля варот.

— Можам даць!

— Яшчэ як!..— гагочучы, адказвалі салдаты з ліха насунутымі набакір пілоткамі.

Я павярнуў назад.

А вось і лазня літоўскай арганізацыі, яе паказаў мне Суткус. Цяпер я яе часта наведваў. Праз усю даўжыню агромністага памяшкання — трубы, з іх льецца гарачая вада. Заходзь адразу хоць тысячу чалавек і бясплатна сабе мыйся — рана, у абед, вечарам... «Літоўцы народ арганізаваны, дружны, клапоцяцца адзін аб другім, не тое што мы!» — з зайздрасцю падумалася мне.

Разважаючы гэтак, я непрыкметна апынуўся ля дома, з чыйго панадворка сёння выносіў малако.

Раніцай, калі я заносіў на кухню пустыя бутэлькі, прыйшла мыцца дачка пана Матыкі і, сонная яшчэ, ледзь не налезла на мяне. Прыгледзелася, спалохана ўскрыкнула і пабегла назад, абдаючы мяне цяплом пасцелі і паказваючы з-пад стракатага халаціка белыя ногі. Я аж пачырванеў. З-за дзвярэй паненка з какецтвам і цікаўнасцю азірнулася, бліснуўшы зубкамі, і захінула халат.

Ля дома памешчыка я ўсё гэта ўспомніў з выразнай дакладнасцю. Зрабілася невыносна сорамна — хоць лезь пад зямлю!

Я зноў павярнуў да Віліі.

8

Па тратуары набярэжнай цяклі патокі людзей.

Раптам мяне насцярожыў нечы позірк і развеяў вобраз дачкі Матыкі. Я ўважліва прыгледзеўся ды падумаў, што вось гэтую смуглявую і чарнавокую студэнтку ўжо недзе спатыкаў. Напэўна спатыкаў. Толькі дзе?

Я не адводзіў ад яе вачэй, і студэнтка пасмялела, накіравалася да мяне.

— Дзень добры! — узрадавалася яна.— Нарэшце праз паўгода я вас спаткала!

— Дзень добры...

— Няўжо забылі? — з дакорам і расчараваннем паківала яна галавой.

— Памята-аю...— схлусіў я, жмурачы вочы ад бліскучага казырка студэнткі.

— Давайце пазнаёмімся. Тады не было часу. Вольга,— надала яна руку і сарамліва ўсміхнулася.

Толькі цяпер я пазнаў, хто гэта.

Ля універсітэта мінулай восенню яна памагла мне апрытомнець і прыхавала наган, калі ён выпаў з кішэні. Успомніў я дзяўчыну па адной прыкмеце. Кідаўся ў вочы яе крывы пярэдні зуб. Таму, усміхаючыся, Вольга старалася не надта адкрываць рот, але я бессаромна ў яго заглядаў — мае вочы цягнула туды як магнітам.

— Ну, як жывяце? — пацікавілася яна, чырванеючы.

— От, сяк-так жыву...

Міжвольна я заўважыў трэшчынку на казырку, зацыраваны каўнерык кофты, якая ўжо добра такі выцвіла, старэнькія аблезлыя туфлі. Параўнаў з вопраткай Данусі — лёгкай, свежай, з тонкім араматам...

Калі сустрэнуцца два чалавекі, дастаткова аднаму пра нешта спытацца і адразу завяжацца гутарка. Але я да размовы ў кампаніі, ды яшчэ з дзяўчатамі, быў няздатны.

— Вы не прысутнічалі на канцэрце ў нас, калі спяваў Забэйда Суміцкі? Не? Шкада!.. Я была ўпэўнена, што будзеце, і ўсюды вас шукала!..

Мы хвіліну памаўчалі.

— А на мітынгу антыфашыстаў? — успомніла студэнтка.— Таксама — не?.. Хутка ў нас адбудзецца сход беларусаў і ўкраінцаў, прыйдзеце?

Я ўсё цярпліва адказваў «ага», «не», «не ведаю», хоць і адчуваў да студэнткі ўдзячнасць за тое, што яна для мяне зрабіла, але думаў толькі, як адчапіцца.

Дзяўчына ўсё не адыходзіла.

— Я была тады і ў спартыўнай школе, калі вы сустракаліся з вайсковым па рынгу.

— Былі-і?!.

— Вам пяршынства спрабавала адваяваць з іншымі, але дзе там!..

— Даўно то было...

— І на вуліцы вас часта бачыла. Вы прыкметны. Аднойчы сустрэла ў гарадскім парку. Ліў дождж — халодны, пранізлівы, а вы нічога не прыкмячалі і памалу пахаджвалі, думалі аб сваім. На вашым твары было такое багатае выражэнне, што стала шкада вас непакоіць, таму не павіталася...

— Дарма.

— Потым сустракала вас на Замкавай зімой,— спавядалася яна нібы з папрокам, бытта чакала ўзнагароды.— Вы былі з непакрытай галавой. Здаецца, вы прахадзілі ўсю зіму так...

— Ага...

Кепка, якую збіў паручнік шабляй, засталася на вуліцы, а другой я не купіў — не толькі таму, што грошай шкадаваў. У Вільні нават у вялікія маразы хлопцы фарсілі з непакрытымі галовамі, фарсіў і я. Але навошта ёй пра гэта ведаць?..

І тут я раптам успомніў, як восенню хваляваўся ў натоўпе моладзі на Лукішках, пакуль у турме ішоў шлюб.

— Праўда, што гэта вы тады вянчаліся ў турме?

— А-а, вы пра тое!..—пасмутнела дзяўчына і ўздыхнула:— На жаль, я тады зрабіла глупства.

— Глупства?..

— Не было чалавека, які б мяне тады схапіў за руку, адзёрнуў.

— Але ж чаму? — распальваўся я ад цікавасці.

— Складаная справа...— уздыхнула яна зноў.— Давайце сядзем з тратуара пад ліпу, раскажу...

Я падаўся за студэнткай.

— З жаніхом да гэтага я нават добра і не бачылася,— пачала апавядаць яна на новым месцы.— От, перастукваліся ў турме праз сцены марзянкай, рабілі адзін другому знакі праз акно, калі каго з нас выводзілі на шпацыр. Мяне выпусцілі з Лукішак раней, і мы пачалі перапісвацца. Мне здалося, што я закахалася. Першы раз, горача, назаўсёды! Ён мне пісаў доўгія лісты, яшчэ даўжэйшыя пісала я.

Дамовіліся мы пажаніцца. З фотакарэспандэнтамі і сведкамі ўвайшла я ў камеру і першы раз паціснула яму руку. Капелан нас павянчаў. Усе выйшлі, далі нам дзве гадзіны пабыць разам. Селі мы на лаву, узяліся за рукі. Сорамна. Наглядчык адвярнуўся, і муж мяне ўпершыню пацалаваў. Стала надта непрыемна. Я збаялася, каб ён не пацалаваў мяне другі раз, выняла з сумачкі шакаладку, піхаю яму ў рукі, але ён шакаладку адклаў ды пацалаваў усё ж такі зноў. І тут я зразумела, што яго не кахаю... Вось так! — уздыхнула яна і паглядзела, якое ўражанне зрабіла на мяне.

— А-яй-яй!— не ўтрымаўся я і паківаў галавой.— Ну і... А цяпер?

— Нашу рэгулярна ў Лукішкі перадачу, пішу акуратна ў турму пісьмы, падпісваю іх: «Твая Вольга!..», лічуся законнай жонкай, а яго не кахаю...

Гісторыя!

Я не ведаў, што гаварыць, як суцешыць дзяўчыну, адно спачувальна пазіраў і пераступаў з нагі на нагу. Гэтак мы стаялі даволі доўга. Нарэшце студэнтка ўздыхнула і стала пацяшаць ні то мяне, ні то сябе:

— Не дзівіцеся! Мне сказаў наш віленскі пісьменнік: ёсць праўда жыцця і — праўда мараў, лозунга. У мяне праўда мараў і лозунга, якому мы ўсе служым, сутыкнулася з праўдай жыцця і атрымалася вялікая драма!

— Гм!.. — нічога не зразумеў я з яе філасофіі.

Пакуль мы так гаварылі, да прыстані падышоў параходзік. З яго хлынула па бераг моладзь. Мы апынуліся сярод юнакоў і паненак. І тут я ўбачыў Данусю.

Яна была ў белай тэнісцы, якая прыгожа адцяняла смуглае, загарэлае цела. Побач ішоў Браніслаў і нёс кніжкі, тэнісныя ракеткі, партфель. У абаіх былі цёмныя акуляры, якія тады толькі ўваходзілі ў моду.

Убачыўшы яе з Браніславам, я ў момант забыўся пра тое, што расказала студэнтка, занепакоіўся і адразу ўпаў духам. Калі Дануся наблізілася, я адвярнуў галаву.

— Добры дзень! — пачуўся яе голас.

Студэнтка здзіўлена зірнула на мяне, потым на Данусю, Браніслава.

Пакуль я што-небудзь скеміў, Дануся нас абмінула. Я пачаў ужо сумнявацца: сказала яна «дзень добры» мне ці каму іншаму. Мужыцкая асцярожнасць не дазваляла паверыць. І тут я заўважыў, як Вольга

перамянілася. Яна змерала нядобрымі вачыма генеральскую дачку, а тая таксама азірнулася і гэтак жа агледзела студэнтку.

Цяпер сумненняў, з кім Дануся віталася, не было.

— Што ж, бывайце, калі так!..— холадна кінула Вольга.

Тое, што адбылося, яшчэ не паспела як належыць дайсці да маёй свядомасці. Разгублены да рэшты, я нічога не адказаў, хоць і ўлавіў у словах дзяўчыны папрок. Пра Вольгу адразу забыўся, увага была занята другім.

Тады ля студні мы з Данусяй, бытта баючыся дакрануцца, не падалі адно аднаму рукі і не называлі сваіх прозвішчаў. Я не зрабіў гэтага нершы, бо такая галантнасць была не ў маёй натуры, але Дануся?.. Потым я баяўся нават успамінаць, каб не расчаравацца, калі гэта была простая выпадковасць.

Цяпер жа, пасля таго, што адбылося ля ракі, я ўжо смела ўспомніў той выпадак і паверыў у сваю зорку.

9

Многа яшчэ прахадзіў я па горадзе, спадзеючыся спаткацца з Данусяй. Хадзіў заўсёды адзін, каб зручней было загаварыць. Зачапіць яе цяпер было, здаецца, лёгка: Я ж маю права, як з кожным знаёмым, вітацца з ёю.

Цэлыя гадзіны прастойваў я ў яры над калодзежам. Не мог сабе дараваць, што яна мяне бачыла са студэнткай.

«Вось табе за тое, што такая булдавешка! Так табе і трэба!» — губляючы веру, што калі-небудзь зноў выпадзе такая сустрэча, дакараў я сябе.

Але вёдры стараўся трымаць лёгка, на выпадак, калі б Дануся сачыла за мной з кустоў.

— Пане Янку, насячыце мне, калі ласка, дроў! — папрасіла прачка.

— Магу! — абрадаваўся я: нашы дровы былі добра відочны з генералавых акон.

«На якую халеру ты ўзяў сабе тадьг частку той чаромхі? Ведаеш жа, што паненкі даражаць кветкамі! Не мог аддаць ёй усе? Пашкадаваў такога дабра? Усё роўна гаспадыня потым выкінула на сметнік, бо ёй галава ад паху баліць!»

— Дзядзя Ваня! — перабіў мяне сын прачкі,— А чаму гэты дроў такі зілё-оны?

— Гэта мох на палене, дурань!

— А што такое мох?

— Ну, заладзіў свае пытанні! Ведаю, ім канца не будзе!..

Прысутнасць «памагатара» перашкаджала выкананню майго плану. Я зазлаваў і папёр беднае дзіця:

— Кідай дровы, панашу сам! Марш дадому!

«І навошта было гаварыць тады, што яе пасудзінка лёгкая? Паненкі ж любяць, каб іх падхвальвалі, яны — нібы дзеці!..»

Я браў палена і, як цыркач, падкінуўшы яго, спрытна лавіў за другі канец — на выпадак, калі б Дануся сачыла за мной праз адное з акон.

## Раздзел другі

### 1

Усе мае пакуты хутка скончыліся. Нечакана мне дапамог наш швейцар, пан Войцех.

Аднойчы пад канец заняткаў я пранік у ліцэй і стаіўся ў калідоры. Больш паспешліва, чым звычайна, снавалі выкладчыкі, таропка прабягалі з класа ў клас ліцэісткі. Усе яны бытта і праўда былі заняты, а на самой справе прагаладаліся і паспяшалі дадому.

Мой план быў просты: Дануся будзе ісці, мы павітаемся, пачнём гутарыць, і я запрапаную схадзіць на гару. Там ёй аб гэтым і скажу — проста і без абінякаў. Ва мне ўжо настолькі паспела рашэнне, што яшчэ ўчора ніякай сілай я сябе не прымусіў бы гэта зрабіць, а цяпер мне здалося зусім простым і звычайным. Толькі выбраў нязручны момант, трэба было ісці вартаваць яе на вуліцу.

Калі я ўжо выходзіў, мяне перапыніў пан Войцех:

— Янэк, ты што тут робіш?

— Проста сабе зайшоў...

— Ага, ішоў, ішоў і зайштоў! Проста!..

— Ну...

— Кунцэвіч вызываў чагосьці...

— Зноў маніш!

— Праўда, праўда, Кунцэвіч...

— А чаму мне ў вочы не глядзіш?

— Я вас, ухажораў, усіх па вачах пазнаю!.. Ладна. Хадзі са мной!— адзваніўшы на ўрок, пазваў мяне стары ўніз да дзяжурнага стала.

Я ведаў, чым магла скончыцца для швейцара мая прысутнасць у ліцэі, таму адчуў да старога ўдзячнасць.

— Ну, кажы як на споведзі перад ксяндзом, каторая табе тут папала ў вока! Прызнавайся! — ні то жартам, ні то сур'ёзна спытаўся ён, заглядваючы мне ў вочы.

Ад хітрых, дабрадушных вачэй старога я паступова пачаў размякаць, але маўчаў.

— Чаго раскіс? Паглядзі на сябе ў люстэрка! Ты ж увесь скрыўлены, як серада на пятніцу, як пабітая баба! Яшчэ і не спіш недзе, уздыхаеш, а з-за чаго? Каб потым, калі даб'ешся, сказаць сабе: «Ну і дурань жа быў!»

— Не даб'юся...— выдаў я сябе, і штосьці мяне сціснула за горла.

— Не сумнявайся! — суцешыў стары як малога.— Я дапамагу!

— Вы?

— Го, колькі вашага брата па свеце, каму памог!..

У калідоры з'явіўся настаўнік, і стары змоўк. Калі пагроза мінавала, ён загадаў:

— Пішы запіску, перадам!

— Запіску?

— Пішы, пішы! Няма чаго з імі асабліва цырымоніцца, будзь мужчынам!

— Запіску, гы?!.

— А што, непісьменны?.. Глядзі, колькі мне іх перадаваць! — дзядзька адкрыў шуфляду і паказаў з дзесятак заклееных канвертаў без марак.

Я тады ўспомніў, як яшчэ мінулай восенню каля Война заўсёды круціліся старэйшыя вучні ўсіх амаль віленскіх гімназіяў, а ліцэісткі часта да яго падбягалі і таямніча шапталі:

— Для мяне нічога няма?..

— Пане Войцех, ніхто мяне не пытаўся?..

І да чаго ж проста гэтую праблему вырашыць праз запіску!..

Закаханымі вачыма паглядзеў ужо я на шчупленькі тварык старога, які, каб дадаць сабе важнасці, фарбаваў вусы. Але і фарбаванне яго не ратавала. Вусы былі рэдкія, тапырыліся, адно смяшылі. На акне ляжаў яго старэнькі капялюш. Шаўковая падкладка ў ім была такая зашмальцаваная, што нагадвала патэфонную пласцінку, пакладзеную на дно капелюша.

— На табе аловак, паперу! — загадаў швейцар.

— Што вы! — спалохаўся я, уяўляючы сабе, як я зараз дзе-небудзь закрыюся і з якой прыемнасцю і трапятаннем душы буду выконваць яго прапанову.— Пісаць пайду дадому!

— Валяй!

Праз гадзіну я даручыў яму канверт. Прачытаўшы на ім прозвішча, пан Войцех перапалохаўся:

— Генералавай дачцэ?.. Э-гэ, як ты высока, братка, меціш!

— Бо і сам не з нізкіх! — асцярожным жартам прыкрыў я трывогу: возьме дзядзька ці пабаіцца?

— Ты ж з-за яе, здаецца, прошлай восенню пагарэў, мала табе аднаго скандалу?

Я ўсё таптаўся.

— Што ж, трэба выручаць свайго брата, сам да дзевак быў яры...— Стары адной рукой задуменна чухаў пад пахай, а другой — хаваў маё пісьмо ў шуфляду.

**2**

Ішоў я да студні, а пара біла ў нос з-пад пінжака. Не было часу сушыць верхнюю кашулю, давялося апрануць мокрую.

Ля студні нікога не было. Я схаваўся за дрэва, пачаў вартаваць. Праходзілі хвіліны, а на сцежцы ніхто не з'яўляўся.

«Няўжо стары не перадаў?» — толькі паспеў я падумаць і ўбачыў Данусю.

Яна была ў лёгкім плашчы і ў шапачцы. Напускная вясёлая абыякавасць не маглі схаваць скаванасці і страху на яе твары. Мне трэба было выходзіць, ды ногі бытта прыраслі да зямлі ад няўпэўненасці.

Дануся тым часам мінула студню і завярнула назад. Усё выглядала так, бытта яна тут не па маёй запісцы. От, ішла сабе дарогай, ды раптам успомніла, што нешта важнае забылася дома.

«Пойдзе, трэба хутчэй затрымаць, больш хавацца нельга! І чаго мне баяцца? Па запісцы прыйшла, не святая!..»

Калі я вылез з кустоў, у мяне так замірала сэрца, бытта я ныраў з гары ў бездань.

— Сэрвус! — з напускной зухаватасцю павітаўся я па-лацінску, як віталіся віленскія гімназісты.

— Дзень добры...

— Даўно чакаеце? — прамямліў я непаслухмянымі вуснамі, падыходзячы да студні.

— Не-е...— Збялелая паненка часта дыхала, і голас яе дрыжаў. Ёй было сорамна.

— Бо мяне затрымалі...

— Ці не студэнтка? — узялася яна за цэментовы круг.

— Студэнтка? — здзівіўся я, беручыся за бетон з другога боку.

— Вядома, у пана ёсць цяпер цікавейшыя сябры!.. З універсітэта імя Стэфана Баторыя!..

У тоне яе голасу я са здзіўленнем адчуў дакор і нешта набалелае. Ну дакладна так сказала б вясковая дзяўчына, абразіўшыся, што яе хлапец пайшоў з другой!

Што было далей, памятаю дрэнна. Чамусьці памяць у нас адваротна прапарцыянальна напружанню нашых пачуццяў. Моцна ўсхваляваны чалавек заўсёды памятае падзеі горш. Вось і я тады знаходзіўся не на гэтым свеце. У памяці цьмяна захаваліся толькі некаторыя эпізоды з той сустрэчы.

Помніцца, мы лезлі на гару. Перада мною — стройныя ногі, на якіх галінкі пакінулі белыя крэскі.

Добра запомнілася, як Дануся стаіць наверсе і з жаночай нязграбнасцю — аднолькава левай і правай рукой — кідае ўніз каменьчыкі ды просіць:

— Ану, цяпер пан!

Мяне ў гэты час апанавала жаданне парысавацца. Я скакаў з абрыву, кідаў вялікія камені, пераскокваў яры. Як тады не скруціў сабе шыі, не зламаў нагі, не ведаю! Кажуць, п'яным і закаханым заўсёды шанцуе. Не ручаюся за п'яніц, бо п'яным ніколі не быў, а закаханым, відаць, праўда шанцуе, і яшчэ як.

— Я нават не бачыла, каб мужчына так скакаў! — шчыра дзівілася Дануся, калі я, знайшоўшы кавалак тэлефоннага кабеля, паказваў сваё майстэрства.

З-за адной гэтай пахвалы варта было перацярпець кулакі рыжага капрала і нудныя практыкаванні педанта Левандоўскага.

Трымаліся мы зводдаль, стараючыся не сустракацца вачыма. Нібы займаліся кожны сваім, але гэта было няпраўда. І хоць Дануся часта вохкала, любуючыся краявідамі, я выразна чуў у яе голасе і нейкі страх, і заахвочванне, і дрыжанне, а мае паводзіны былі як бы часткай паводзін і яе.

Часамі яна нагадвала дзіця, якое вырвалася на волю і старалася нацешыцца, пакуль не пакліча маці.

Яшчэ перад спатканнем я добра абдумаў, куды і як пойдзем. Мы ўзабраліся на аблюбаваную гару, нікога не спаткаўшы. І на вяршыні нас ніхто бачыць не мог, затое мы бачылі ўсё.

Няёмкасць, якая была пры спатканні ля студні, прайшла. Абое мы нібы ап'янелі, нават пустая гаворка нам здавалася значнай. Я пра нешта выхваляўся, гаварыў рукамі, плячыма, выхадкамі. Дануся слухала, глядзела, смяялася.

У дзяцінстве я верыў у казкі пра рай. І цяпер у мяне было адчуванне, бытта знаходжуся ў гэтым самым раі. І не было курсаў.

Не было сотні праклятых паўлітровак, якія мне, соннаму, заўтра на світанні трэба разносіць па кватэрах.

Не было маёй вёскі, бацькоў і надзённых клопатаў.

Вакол ззяла вясна, існавалі Дануся і я. Гучалі цудоўныя мелодыі, зіхацела сонца, а час спыніўся, застыў.

Я некалі марыў, як прытулю яе да грудзей, сваімі вуснамі самну яе вусны, а на гары баяўся да яе нават дакрануцца. Як зачараваны таропіў на паненку вочы, маўчаў.

Ёсць нейкія амаль няўлоўныя рысы, па якіх можна адгадаць нацыянальнасць чалавека. Многім полькам была ўласціва некаторая сухасць, што ішла ад набожнасці. Але ў Данусі гэтага не было і следу.

У паненкі былі блакітныя вочы і гладкі лоб з выразнымі тонкімі бровамі, прывабныя вусны.

У яе яшчэ згадвалася парода, якую, відаць, выводзіла не адно пакаленне старажытнага роду. У пругкім целе аж кіпела здароўе. А зубы і валасы паненкі вылучалі лёгкі бляск.

Калі яна смяялася або гаварыла, смяялася і гаварыла ў ёй усё: пастава, твар, бровы, лоб, а найбольш — вочы. Яны мяняліся тысячу разоў і мелі неабмежаваны ўплыў на мяне. Узіраючыся ў іх, я бытта нешта піў, піў, піў і не мог ні напіцца, ні адарвацца.

— А мы паляністу на ўроку зрабілі кацячую музыку!..— пахвалілася яна.— Такі наладзілі прыма апрыліс, што бегаў скардзіцца дырэктару!

Першага красавіка і нашы курсанты выкарысталі для звядзення рахункаў з нелюбімымі настаўнікамі.

— Залескаму?!— узрадаваўся я вельмі, што яна ў згаворы са мной.

— Адзін апрыліс ужо прайноў, але я ўспомніла пра стары стыль. Ну, думаю, пачакай!.. А ўчора на гісторыі пан прафесар нам зачытваў дакументы Ягелы з Вавеля. На беларускай мове кароль пісаў...

— Ведаю...

Я адчуў, што праз гэты факт вырастаю ў яе вачах яшчэ больш.

— Беларуская — тады была прыдворнай мовай, побач з французскай і лацінскай!— выкладваў я ёй звесткі, атрыманыя ад Луцэвіча з музея...

Мы прабылі так разам мо гадзіны дзве, раптам Дануся спахапілася:

— О-ей, трэба ісці...

— Ужо-а? — прачнуўся я.

— Мне час...

Гордасць ёй, відаць, не дазваляла прызнацца, як даводзіцца хітрыць, казаць дома няпраўду, калі трэба куды-небудзь схадзіць, вось як цяпер.

Мае стаpанні затрымаць яе былі дарэмныя. Аднак цяпер я быў смялейшы. Гледзячы ў зямлю, нязграбна, нібы герой рыцарскага рамана, я аб'явіў:

— Каля студні пакладу камень. Пад ім будзе запіска...

Дануся нічога не адказала. Толькі ёй нібы раптам спатрэбілася сарваць травінку, і паненка нагнулася. Але па рухах яе я зразумеў, што ўсё будзе добра.

— Вы яшчэ крыху пабудзеце тут, праўда? — Просьба Данусі прагучала як загад.

Я зразумеў, што павінен тут пачакаць, пакуль яна дойдзе дадому, і падумаў, якая яна далікатная і разумная!..

— А-а, пабуду!.. Трэба дубцоў наламаць на венік гаспадыні!

Мы развіталіся.

Вярнуўся я на панадворак і не ведаў, што рабіць. На гару былі адчынены дзверы, прыстаўлена драбіна, прачка якраз туды насіла вешаць бялізну. Я ў момант апынуўся на гары. Асцярожна прыпадняў адну дахоўку і паглядзеў у генералава акно.

Я выразна ўбачыў, як у пакой уляцела Дануся і прыпала да люстэрка. Яна шчасліва ўсміхалася і паўтарала выражэнні твару, якія ў яе былі са мной. Гэта ёй лёгка ўдавалася, яна была яшчэ ўзбуджаная і распрамянёная.

Наглядзеўшыся на сябе, яна адчыніла шафу, павесіла туды плашчык. Тады зноў падышла да люстэрка і пачала вытвараць нейкія камбінацыі з шапачкай і смяяцца. Пачуўся скрып драбіны: прачка несла развешваць бялізну. Нічога не зробіш, давялося пакласці дахоўку на месца.

4

Пасля сустрэчы ля калодзежа я адразу перамяніўся. Я стаў багатым, валодаў таямніцай, якую не памяняў бы ні на якія мільёны! Я зрабіўся ўпэўнены, здаволены, шчаслівы — у мяне нават прачнулася пачуццё гумару, якога я ў сабе дагэтуль, бадай, і не заўважаў.

...Да парадных дзвярэй ліцэя прывалаклася з таварам гандлярка. Баязліва азіраючыся, каб не наляцела паліцыя, жанчына развязала кошык, выставіла тавар напаказ.

— Мандарынкі ўнізе па пятнаццаць грошаў за штуку! — у час перапынку прагучала ў калідорах усіх пяці паверхаў.

У гэты дзень раніцой я паклаў пад камень ля студні пісьмо, і праз пару гадзін яго ўжо там не стала. Ці не дзеці выцягнулі часамі адтуль?.. Я пастараўся прыйсці ў ліцэй да канца заняткаў, каб спытаць Данусю, ці брала яна пісьмо.

Калі я заглянуў у будынак, паненкі атакоўвалі гандлярку з мандарынкамі. Толькі Дануся з сяброўкай стаялі ўбаку.

Убачыўшы мяне, дзяўчына ўзрадавалася:

— Пане Янку, вольмі прашу, пазычце нам, калі ласка, трыццаць грошаў!

У мяне ад шчасця перахапіла дух. Дрыжачай рукой я дастаў тры апошнія манеткі па дзесяць грошаў і, як гэта рабіў ад'ютант Куба, стукнуў абцасамі:

— Калі ласка, панна Янкоўская!

— Дзякуем! — кінулася Дануся і ў момант апынулася ў гушчы сяброўак.

Ліха яго бяры з пісьмом! — Я не стаў пытацца.

Вярнуўшыся дадому, пачаў прыдумваць, як адмовіцца ад грошай, калі Дануся будзе вяртаць доўг. Але ўсе мае выдумкі былі непрыдатныя.

Пасля абеду, калі я ішоў на курсы, да генералавай сеткі раптам падбегла паненка і працягнула на далоні дзве манеткі — дзесяці- і дваццаціграшовую:

— Я пану вельмі ўдзячная...

Вінаваты і збянтэжаны выгляд паненкі дадаваў мне ўпэўненасці.

— Гм!..— насупіў я бровы.— Што паненка з мяне дурня строіць?

— Чаму? — спалохалася яна.

— Хіба я вам даваў такія грошы?

— Але ж, прашу вазьміце!— закрычала яна, смеючыся з майго жарту.

— О-о,не-е, мяне не ашукаеце. Гэта не мае грошы! Падумайце самі, хіба я магу ўзяць іх? Бралі-то вы іншыя? — Катэгарычна накіраваўся я на вуліцу.

Для мяне трыццаць грошаў — цэлае багацце, а я радаваўся.

«Купіў! І дадумаўся ж, глядзі, вось табе і тупіца!.. Вось так і. далей будзем!..»

Я быў гэтак задаволены сабой, што нават забыўся, пра што хацеў спытацца ў яе.

## 5

Цяпер Дануся прыходзіла па маіх запісках. Калі ж яна не магла выйсці з дому, цётка Антося клала пад камень пісьмо.

Аднойчы паненка прынесла загорнутыя ў сярэбраную паперу пліткі шакаладу.

— А колькі гэта каштуе? — вырвалася ў мяне.

— Здаецца — злот,— адказала яна бяспечна.

— Цэлы зло-от?

— Ага!

— ?..

— Няхай пан Янэк есць! Я для яго спецыяльна прынесла! — заахвочвала яна, паводле польскага звычаю ветлівасці звяртаючыся ў трэцяй асобе.

Побач ляжалі яе сшыткі, кніжкі і аўтаручка амерыканскай фірмы «Ватэрман» з залатым пяром. Я пацікавіўся:

— А. колькі яна каштуе?

— Дванаццаць злотых!

— Не можа быць!..

— Чаму?.. Магчыма, і болей, не памятаю. Але здаецца, што плаціла столькі...

На хвіліну я анямеў ад здзіўлення. За дванаццаць злотых мне трэба было дваццаць дзён насіць малако! За гэтую суму на вёсцы дзядзька прадасць цяля, ён гэтага дня чакае цэлы год і загадзя вылічвае з усёй сям'ёй, што за такую горбу грошай купіць.

— Але ж, прашу! — з капрызнай нецярплівасцю загадала паненка і бесцырымонна пачала разрываць бліскучыя паперкі.

Дануся заўсёды прыносіла з сабой прадметы свайго свету: тонкія пахі духоў, цукеркі, ілюстраваныя часопісы — польскія, нямецкія, французскія, англійскія — яна выдатна валодала гэтымі мовамі. На маіх курсах таксама шмат увагі ўдзялялі замежнай мове, і ў нямецкім часопісе я мог тое-сёе зразумець. Вядома, такія часопісы праглядаў я з прагнай цікавасцю.

Памятаю, нечакана зрабіў адкрыццё, што ў польскім правапісе часамі не ставяць коскі там, дзе ставяць у нямецкім. У сказе «Яна запрапанавала мне пайсці на экскурсію» была коска: «Się ochlug mir vor, einen Ausflug zu mechen».

— Ты не ведаў? — здзівілася Дануся.— Англічане ставяць коску яшчэ іначай!

— Няўжо?

— І ў французскай мове бывае так! І ў рускай, глядзі!

Дануся пачала выводзіць прыклады ў сшытку.

— «Дом, у якім я жыву, вялікі». Бачыш? Мы тут паставілі дзве коскі. А па-французску «La mason qui j'habit est grande». Коскі няма?

— Ну, няма...

— Тое самае па-англійску: «The house where J live ist large». Таксама няма?

— Тады навошта наогул існуе яна, калі. можна яе гэтак свабодна перастаўляць? — абурыўся я.

— Як гэта «навошта»?

— А — так! У мяне даўно была падазронасць, што яна зусім непатрэбная, яе прыдумалі, каб задаць вучням работы. Я яе вучыў на ўсялякі выпадак. Цяпер няхай зубрыць той, хто яе прыдумаў!

Данусю гэта забавіла.

6

У нас была свая гульня. Я крыўляў якога-небудзь галівудскага кінаакцёра. Дануся прыкідвалася абражанай і біла мяне кніжкай па галаве, я лямантаваў.

Або гулялі ў іспанскі цырк. Гектар быў быком, я — тарэадорам, а Дануся — суддзёй.

Бывала, Дануся са смехам давала мне замест законных трафеяў тарэадора — вушэй, капытоў і хваста — што-небудзь смачнае, у гэты час Гектар хітра лашчыўся да мяне.

Аднаго разу на гары застаў нас цёплы дождж. Яшчэ ён зусім не сціх, а ўжо заззяла сонца, заблішчалі мільёны сярэбраных кропель. Перад намі мо на дваццаць колераў заіграла дзіўная дуга вясёлкі — выразная, свежая і вялізная, на ўсё неба.

— Ведаеш, што гэта? — схапіла мяне за руку Дануся.— Глядзі, для нас вароты неба зрабіла, бачыш? Хадзем пад іх!..

Мы ішлі, а вясёлка дражнілася, адступала, пакуль не растварылася зусім.

Часамі Дануся перакладала змест артыкула з якога-небудзь замежнага часопіса, і мы разам захапляліся рознымі дробязямі.

Дзівіліся, напрыклад, што ў Англію прыехаў індыйскі магараджа і загадаў сабе ўставіць зубы з ... брыльянтамі!

Дзівіліся, што чалавечы арганізм створан з такім запасам трываласці, што, напрыклад, косць галёнкі можа вытрымаць дваццаціпяціразовую вагу ўсяго цела.

Дзівіліся, што каб днём убачыць зоркі, дастаткова залезці ў калодзеж!..

Часамі прачытанае выклікала ў нас гарачую дыскусію і мы спрачаліся, забыўшыся пра ўсё на свеце.

У польскім часопісе «На шырокім свеце» пад фатаграфіяй няголенага пажылога тыпа стаяў сенсацыйны подпіс, надрукаваны тлустымі літарамі:

«Глядзіце, добра прыглядзіцеся, вось гэты немалады чалавек, інжынер Збігнеў Дунікоўскі з Варшавы, вынайшаў спосаб, як са звычайнага рачнога пяску рабіць золата!..»

Не ведаю, ці верыў хоць адзін чалавек з рэдакцыі часопіса ў тое, што там было папісана, але мы паверылі адразу і пачалі фантазіраваць, што б рабілі, калі б авалодалі такім вынаходніцтвам.

— Я паклала б золата ў машыны, сздзіла б па Польшчы і раздавала б яго бодным,— з упэўненасцю заявіла Дануся.

— А калі да машыны надыдзе пераапрануты багацей, тады што? Ім жа заўсёды мала свайго, яны папруцца да цябе ў першую чаргу, адно пакажыся з такой машынай!..

Не, гэты аргумент не надта страляў, я пашукаў іншы.

— Чаму ты тады ўся скурчылася, калі маці ля касцёла раздавала жабракам грошы?.. Адчувала, што не вельмі прыемна браць падачкі. Ты сама ўзяла б?

— Відаць, не,— прызналася яна.

— Бачыш! Ну, а яшчэ?

— Наладавала б у машыну цукерак, істужак, ездзіла б па вёсках і раздавала б дзецям цукеркі, а дзяўчынкам банты павязвала б...

— Ага, банты. А яшчэ?

— Во, я ведаю, што яшчэ зрабіла б! Каб мела шмат грошай, дала б іх у першую чаргу віленскаму «Дабрачыннаму таварыству жанчын-каталічак»!

— Тава-арыству?

— Гэта мая мара! Таварыству трэба шмат грошай, каб карміць бедных, выдаваць ім дапамогу. Мамуся кажа, у варшаўскіх сталовых гэтай арганізацыі вісяць нават шаўковыя фіранкі, а ў нас — толькі з марлі. І то іх парабілі мы з Яняй, дачкой пана старосты, ведаеш яе?.. Цяпер эканомлю кожны дзень на грошах, што выдае мамуся, і заношу іх у таварыства. Хутка мне споўніцца роўна васемнаццаць, тады мяне прымуць у члены таварыства і, як і мамусі, білет з пячаткай выдадуць!

Я ўспомніў, як мінулай восенню зарабляў залатоўку. Успомніў старых, якія выжывалі з розуму. Успомніў нават тыя фіранкі з белымі плямамі ад сырасці,

— Ха-ха-ха-ха! — зарагатаў я.— Ну ж і прыду-умала!..

— Чаго ты? Праўда, праўда!— горача ўзялася яна мяне пераконваць.

Тады свае пражэкты абвясціў я. Былі яны шырокія, не падобныя на Данусіны.

Першым чынам я над Віліяй набудаваў бы шыкоўных муравака і туды перасяліў бы з усяе Вільні такіх цётак з дзецьмі, як мая прачка, ды бяздомных студэнтаў, як Суткус.

Тады накупіў бы бамбардзіроўшчыкаў, лінкораў і навейшых танкаў ды паслаў бы іх у Іспанію на генерала Франко — помсціць за Рэспубліку.

А яшчэ, каб меў шмат грошай, пабудаваў бы плаціну на рацэ Конга і абваднiў бы Сахару (у часопісе пісалі, што французскія інжынеры прыдумалі план, як гэта зрабіць, толькі не маюць сродкаў на яго ажыццяўленне).

Затым у сваёй вёсцы праклаў бы водаправод, правёў бы электрычнасць, пабудаваў бы лазню, а кожнаму дзядзьку — новую хату! У новыя дамы мужыкам машынамі навёз бы солі, мыла — дзядзькі, нябось, ведаюць, што мыла не ядуць!..

Дануся слухала мяне з захапленнем. Яна была ўжо згодная адмовіцца ад свайго плану і з гатоўнасцю аб'явіла:

— А я паехала б з табой у Конга! Праўда, праўда. І табе было б няцяжка ўзяць мяне, бо я маю загранічны пашпарт. Кожнае лета мы з мамусяй ездзім у Швейцарыю. У Афрыцы я табе памагала б...

— Эк, памагатарша!

— Праўда, праўда! Я дома часта памагаю Антосі, тата нават хваліць за гэта!

— Эт, дзіця горкае! — кінуў я, успамінаючы, як яна даставала са студні ваду.— Адная ты ў яго, то ён і не ведае, як цябе песціць!..

**7**

Аднойчы Дануся прынесла французскую кніжку — правілы добрага тону.

— Янку, табе варта з ёю пазнаёміцца!

— Што ж, давай вучы мяне добраму тону! — Зрабілася надта смешна, як падыдзе гэта да мяне.

Дануся пачала тут жа перакладаць:

— «За сталом ніколі не падчышчай талеркі, не хапай апошні кавалак хлеба, няхай ён лепш застанецца...»

— Брахня!— перабіў я.— Бываў у вашых рэстаранах і бачыў, як вы там ясцё! У нашай мясцовасці правілы добрага тону такія: калі ты ясі, даядай да канца, не псуй харчоў, памятай, іх дабываюць потам!

Дануся не ведала, што адказаць.

— Чаго так узіраешся, мо няпраўда?! Бачу, колькі ваша Антося кожны дзень вывальвае недаедкаў у скрыню,— хапіла б яшчэ на цэлую сям'ю! Ваш Гектар нават каўбасу не заўсёды і не адразу з'есць: сем разоў панюхае, тады зробіць ласку і праглыне!.. Вас бы, буржуяў, патрымаць з тыдзень на адной вадзе, каб вы пазналі цану хлеба!.. Адным словам, ясна. Чытай далей!

— «Чаму так мала людзей, прыемных у размове? Бо кожны думае больш аб тым, што хоча сам сказаць, чым аб тым, што гаворыць яго субяседнік... Замест таго каб яму пярэчыць, перабіваць яго, трэба ўваходзіць у спосаб яго мыслення, у яго густ...»

— А-га, і яшчэ падтакваць яму?

— Янку, але ж нельга і крыўдзіць, абражаць чалавека толькі таму, што ты з ім не згодзен!

— Ну, такая філасофія мне не падыходзіць!

— Але ж чаму?

— Хто-небудзь будзе малоць глупства, а мне трэба не толькі цярпець, а яшчэ і «ўваходзіць у спосаб мыслення...»? Дык ён можа дагаварыцца да таго, што пасля яго слюў яму трэба будзе набіць морду!

— О-ей, Янку, чаму ты такі рэзкі, бескампрамісны, грубы! Я не збіраюся рабіць з цябе графа, але хачу навучыць, каб не быў такім дзікуном. Так вучыся! Ёсць жа цэлая навука, як сябе паводзіць сярод людзей!

— Табе здаецца, што я грубы. Бо цябе выхоўвалі на такіх пустых буржуйскіх кніжачках. Вучылі ўсюды быць добрай. А мяне бацька вучыў, што для ўсіх добрым быць немагчыма, бо тады трэба аднолькава кланяцца і разумным і ідыётам! Маці вучыла гаварыць усюды праўду і адно праўды трымацца. Я не грубы, я трымаюся бацькавай і матчынай філасофіі!

Дануся не ведала, што казаць.

— Гм, па-твойму, калі перада мной дурань гаворыць глупства, то ў імя твайго правіла, якое нехта там выдумаў у разбэшчанай Францыі, я не маю права яму сказаць: ты дурань, змоўкні, не мялі глупства, а паслухай лепш, што скажуць разумныя. Яшчэ павінен падстройвацца пад яго тон, так?

— Ён жа таксама чалавек, Янку, яго таксама шкада!

— То няхай не будзе дурань, калі чалавек. А калі ідыёт, то які ж ён чалавек?

— Навошта ж яго абражаць, Янэк? Лепш знайдзі аргументы і пераканай яго імі!

— Да дурня аргументы, думаеш, даходзяць?.. Як бы не так!.. Я не абражаю, я дыягназ яму стаўлю, і ён павінен быць мне яшчэ ўдзячным за гэта!

— Трэба ж быць ветлівым!

— Ветлівасць — форма прытворства. У нас цярпець не могуць прытвор!

— У цябе гэта ад сялянскай праматы! Але ты павінен яшчэ набрацца і мудрасці, цярпімасці да людзей, пабрацца інтэлігенцыі... Каб мы селі есці, няўжо ты ўзяў бы апошні кавалак хлеба?!

— А калі б ты ўжо наелася і яго не хацела? Ён жа — прапаў бы!

— Мне магло б быць сорамна прызнацца, што я яшчэ галодная?

— Гэтага хіба саромеюцца?

— А — не? Падумай сам!.. Ты толькі так гаворыш, бо і сам апошнюю скібачку пры мне не ўзяў бы, бо ў цябе ж шчодрае сэрца, Янку!

— Гм... Во як перакруціла!..

— Нічога, паступова зраблю з цябе чалавека!

— Валяй, дазваляю!..

Так мы спрачаліся без канца.

Нагаварыліся, што аж языкі забалелі. Пасля моўчкі ляжалі ды разглядалі зямлю.

Праз хвіліну нас ужо дзівіла, што кожная пясчынка не падобная на суседнюю. На гары іх мільярды, і ўсё розныя!

Прыглядзіся добра да травінак: дзвюх зусім аднолькавых таксама не знойдзеш! А лісце? А кветкі? А дрэвы?..

— Зімой, ідучы з ліцэя, люблю разглядаць квяцістыя ўзоры на вітрынах,— прызналася Дануся.— На кожнай шыбе інакшы, а мароз аднолькавы...

— Во, гэта прыкмеціў і я!.. Таксама і людзі, заўважыла?.. Мы гаворым: ён падобны да нашага знаёмага. На самай справе падабенства далёкае. На свеце жыве нас два мільярды, і кожны іншы! Ух, аж страшна: адкуль у прыроды такое багацце форм?

— Не ведаю! — прашаптала ўражаная Дануся.

Мы так захапляліся нашымі гутаркамі, бытта чыталі вельмі цікавую кніжку...

8

Няўдалыя паўстанні, турмы, шыбеніцы і ссылкі лепшых людзей Польшчы ў мінулым прывялі да таго, што народ польскі пачаў сабе ствараць уяўных герояў мінулага. Што ж, паўтараста гадоў трымалі ў сваіх кіпцюрах магутныя дзяржавы багаты гістарычным мінулым край: людзі міжвольна шукалі ўцехі ў марах, і ў палякаў нарадзілася

ўяўленне аб ідэальнасці, надзвычайнай гераічнасці і вялікай дабраце іхніх каралёў, князёў.

Таксама ўяўляла сабе мінулае і Данута.

На гары, калі мы пералічвалі сваіх любімых герояў, яна нечакана прызналася:

— А мой ідэал мужчыны — ксёндз Кардэцкі![1]

Я так здзівіўся, што не знайшоў што і адказаць. Спадзяваўся — назаве Касцюшку, нават — Пілсудскага, які меў поспех у польскай ваеншчыны і буржуазіі, але каб поп?..

Гэта ў яе ад рэлігійнага дурману. Нічога, пройдзе!..

Развітаўшыся з Данусяй, я пачаў марыць, як дапамагу генеральскай дачцэ стаць рэвалюцыянеркай.

Што так будзе, амаль не сумняваўся.

Толькі ўчора скончыўся судовы працэс у Гдыні, які нашумеў на ўсю Польнчу. Дачка аднаго віленскага фабрыканта трапіла наліцыянтам у лапы, калі раздавала курортнікам на пляжы марксісцкую літаратуру.

А гады два таму назад у нашу вёску прыязджаў студэнт. Ён нібы чытаў сялянам лекцыю пра зоркі, а на самай справе прывозіў падпольшчыкам новыя інструкцыі. Тады хлапец расказаў, што ў горадзе ў яго ёсць сябар — генералаў сын — камуніст.

— Дома ў іх на стале,— казаў ён,— стаіць бронзавы бюст маршала Пілсудскага. Генерал і не ведае, што сын трымае ў бюсце камуністычную літаратуру!

Чаму ж тады не зрабіць падпольшчыцай і паненку? У яе такое чулае і добрае сэрца!

Дануся не мела якога-небудзь асаблівага таленту. У ліцэі яна была не найлепшай вучаніцай, атрымлівала пераважна чацвёркі і рэдка — пяцёркі. Гэтаксама ў яе было з музыкай, ігрой у тэніс — і там заўсёды былі лепшыя за яе. Але паненка расла ўсебакова развітым чалавекам. Ці не з такіх менавіта выходзяць сапраўдныя людзі?

Няўжо яна мяне не зразумее? Трэба выбраць зручны момант і ўзяцца за справу.

---

1 Ксёндз Кардэцкі — герой рамана Генрыка Сянкевіча «Патоп». Паводле аўтара, у 1665 г. Кардэцкі арганізаваў абарону касцёла на Яснай Гуры ў Чанстахове ад шведаў. З той пары касцёл стаў месцам пакланення набожных палякаў, а Кардэцкі для некаторых палякаў — нацыянальным героем.

9

На Вялікай вуліцы быў кінатэатр паўторнага фільма. Калі меў грошы, я хадзіў толькі туды. За невялікую плату ў сеанс там паказвалі аж два прыгодніцкія фільмы — на паднішчанай кіналенце, але за чатыры гадзіны наглядзішся і напеважываеш уволю.

Тады мне падабаліся кніжкі пра Ната Пінкертона і фільмы пра каўбояў. Я захапляўся спрытнымі людзьмі, якія баранілі слабых, мужнасцю і сумленнасцю дзяцей прэрый. У фае і ў зале ніколі не ўключалі святла, і можна было не асцерагацца, што трапіш на вочы знаёмым.

Мне ўдалося ўгаварыць Данусю, і мы пайшлі туды разам.

Калі пачалася карціна, Дануся стала падобна на хлапчукоў у зале, якіх можна было ўшчыпнуць, і яны нават не пачулі б.

Вяртаючыся з кіно, паненка спыталася, чаму я цяпер не працую пасыльным. Я расказаў, як мяне злавілі з пісьмом і прагналі з работы, як цяпер устаю ў чатыры гадзіны і да васьмі разношу па кварталах бутэлькі з малаком.

— А ты ў гэты час толькі паварочваешся на другі бок у сваім мякенькім ложку!

— Божа, чаму ж адразу пра гэта не сказаў? — ускрыкнула яна з дакорам.

— Ну, во, будзеш ведаць цяпер!..

— Матка боска, што рабіць?!. У мяне ёсць дзесяць тысяч злотых на ашчаднай кніжцы, але мне не споўнілася яшчэ васемнаццаці гадоў, не выдадуць у касе... Мо сукенкі мае старыя прадаць?.. Цяпер разумею, чаму цябе так дзівіла, колькі што каштуе!..

— Ага, разумееш!..

Вярнуліся мы вечарам. Ісці дадому праз брамку Дануся не адважылася, я перасадзіў яе цераз зарослы дзікім вінаградам плот, і яна мякка скочыла на зямлю.

— Янэк, нахілі галаву, штосьці скажу! — усхвалявана шапнула паненка.

Я нагнуўся да агароджы. Дануся прыткнулася губамі да маёй шчакі. Я адчуў пацалунак, лёгкі, нібы да твару дакранулася вуснамі дзіця.

— Гэта — мая ўзнагарода, мілы, за ўсё, за ўсё!..— выдыхнула яна і панеслася дадому.

Нейкі час я стаяў нерухома, чуючы шэпт, які выйшаў з глыбіні Данусінай душы. Адчуваў дотык яе губ — халаднаватых, як рукі, да якіх незнарок дакрануўся шчакой, перасаджваючы дзяўчыну цераз плот. Гэта быў холад здаровага дзявочага цела, які валодаў уласцівасцю кружыць галаву і прыспяшаць біццё сэрца.

**10**

Яна мяне пацалавала!

У наступны дзень я вырашыў праявіць ініцыятыву. Да самага вечара дрыжаў ад хвалявання. Спаткаліся мы, калі зайшло сонца.

— Янэк, перастань!..— Нібы праз сон пачуў я спалоханы голас Данусі.

Разгадаўшы мой намер, яна ўперлася далонямі мне ў грудзі.

Я лёгка перасіліў супраціўленне паненкі, абняў і стаў вуснамі шукаць яе вусны. Дануся вырывалася, і я пацалаваў яе паспешліва і так нязграбна, што сваімі зубамі стукнуўся аб яе зубы.

— Як ты смееш! — кінула яна з абурэннем і вырвалася.

У параўпанні са мной у яе было сілы якраз столькі, як у кураняці. Але гэтая слабасць мяне і раззброіла. Я стаяў вінаваты, часта дыхаў і дурнавата ўсміхаўся.

— Што, адно табе можна цалавацца? — пераводзіў я ўсё ў жарт, адчуваючы, што гавару не тое, што трэба.

У здзіўленых і пакрыўджаных вачах Данусі было нямое пытанне.

Дурань! Давёў сябе да таго, што пацалунак зрабіўся самамэтай. І цалавацца ў тую хвіліну мне зусім не хацелася, рабіў усё з упартасці.

Ад дотыку да яе вільготпых вуснаў я не толькі не адчуў прыемнасці, але быў нават расчараваны — і гэта ўвесь смак ад таго самага таінства, пра якое столькі гавораць і пішуць у кніжках?

Усё гэта мяне адразу апрытомніла.

Пакрыўджаная Дануся з абурэннем папраўляла валасы і вопратку.

— Грубіян! — кінула яна зноў, і яе голас задрыжаў ад плачу.

— Ну! Бо з вёскі!..— разжалабіў я сябе, добра разумеючы, што гавару не тое.

Каб супакоіцца, я назбіраў каменьчыкаў і са злосцю пачаў шпурляць іх з гары. Калі адвярнуўся, ля мяне ўжо нікога не было.

«Пайшла? То ідзі сабе! Патрэбна мне такая генеральша, падумаеш!..»

Раззлаваны і ўстрывожаны, пазаглядаў я сюды-туды і пачаў спускацца з гары.

**11**

Аднак Дануся мне ўсё даравала. У наступны дзень нават прызналася, што яе ўжо цалаваў адзін чалавек. У прызнанні было столькі шчырай даверлівасці, што вестка зрабіла паненку яшчэ больш прывабнай.

Вось прыкладна тады і наступіў момант, ад якога пачаліся нашыя непаразуменні.

Паміма маёй выхадкі Данусі імпанавалі мой рост і сіла, таму я стараўся іх падкрэсліць. Каб здавацца яшчэ вышэйшым, станавіўся на высокія месцы, хваліўся сваім наганам... Паспешліва выстаўляў напаказ усе якасці, бытта баяўся, што потым будзе позна.

— Лёнгінус! — пяшчотна пазвала мяне Данка імем героя рамана Сянкевіча «Агнём і мячом».— О-ей, які ж у цябе дужы карак! Я недзе чытала, што гэта — прыкмета ўпартасці!

— Упартасці ў мяне хапае, магу табе пазычыць!

Дануся хвіліну памаўчала і ні з таго ні з сяго спыталася:

— Янэк, Адам Міцкевіч меў рост сто семдзесят восем саптыметраў. Гэта мала ці многа? Хто з вас большы?

Я паказаў далонню: паэт быў мне якраз па вусны. Пытанне было не выпадковае.

У кожнай яе кніжцы ляжалі рэпрадукцыі нейкай белакурай паненкі, імі Дануся закладвала старонкі. Часамі ад няма чаго рабіць яна разглядала іх і ўздыхала.

— Хто гэта? — пацікавіўся я.

— Мой ідэал жанчыны — Марыля Верашчака.— І Дануся зрабілася сумная і задуменная.

Нічога не падазраючы, я пытаўся далей:

— Чым жа яна так праславілася, што прадаюць яе фота?

— Марыля кахала Міцкевіча, але пайшла на самаахвярны ўчынак. Каб зрабіць бацькам прыемнасць, выйшла замуж за нялюбага магната Путкамера...

Па тым, як вінавата Дануся апусціла вочы, я раптам зразумеў, для чаго яна гэта гаворыць, і пахаладзеў.

Няўжо яна гэтаксама хоча выйсці за нялюбага Любецкага? Няйначай!.. Данусі цяжка, і, каб супакоіцца, яна прымушае сябе часта ўспамінаць Марылю. Але ж гэтага не можа быць!..

— Няўжо і ты?..— жахнуўся я.

Дануся не адказала. Выходзіць, пытанне дарэмнае. Мы доўга маўчалі. Мяне агарнуў якісьці холад, я зноў адчуў самотнасць, пачуў сябе страшэнна адзінокім. Нарэшце я адважыўся паўтарыць пытанне:

— Гэта праўда, Данка?

— Праўда, Янэк...— прашаптала яна, бездапаможна і вінавата апусціўшы галаву.

Чаго я тут сяджу?!. Я ўсхапіўся на ногі. Дык вось хто яе першы пацалаваў — гэты нікчэмны Браніслаў!

Вось чаму яна распытвала пра рост Міцкевіча!

А я, дурань, так радаваўся апошнія дні. Жаніха іграў!.. А чаго ад яе хацець? Яна — прадукт свайго асяроддзя!..

Я стаў глядзець на Данусю нібы на асуджаную. Але паказаць усю бязглуздасць яе намеру не ўмеў. Да таго ж ва ўсёй гэтай гісторыі быў зацікаўленай асобай, і гордасць не дазваляла яе адгаворваць. У яе было столькі самаадданасці, што ў мяне паступова праявіліся да паненкі спачуванне і жаласць.

Аднак усё гэта ўзнікла потым. Пасля апошніх Данусіных слоў мяне ўкалола страшэнная рэўнасць, агарнула абурэнне:

«Колькі дзён я нічога не ведаў! За каго яна мяне тады лічыць, за хлопчыка для забавы?.. Якая мая роля ў гэтай гісторыі?!. Блазна прыдворнага хацелі з мяне зрабіць?!.»

І Дапуся зрабілася такой недасяжнай, як і восенню.

12

Прайшло некалькі дзён.

Нягледзячы па прызнанне, паступова я супакоіўся, а Дануся стала мне яшчэ даражэйшай. Кажуць, мы болей любім чалавека, калі ведаем, што ён не для нас. А яшчэ кажуць, каб мацней паверыць, трэба пачынаць з сумнення, а каб мацней палюбіць — з нянавісці. Я амаль гэтак пачынаў.

Некаторыя хлопцы мяне дзівілі сваімі адносінамі да дзяўчат. Мне ж дзяўчаты заўсёды здаваліся недасяжнымі і казачнымі багінямі і анёламі. Я па натуры быў няўлюбчывы і сваімі пачуццямі не раскідваўся. Я іх збіраў, капіў, і цяпер яны выбухнулі.

Каб пакахаць чалавека, адных позіркаў мала. Трэба счапіцца характарамі, імкненнямі. Дануся мяне прывабіла не толькі абаяльнасцю і крамлівасцю цела пісанай прыгажуні полькі.

Учынкамі людзей таго свету, з якога я паходзіў, кіравалі штодзённыя клопаты пра кавалак хлеба, ім была вядома адна работа — мускульная.

У нашых сем'ях ласкі і чуласці саромеліся.

Казкі апавядалі дзецям толькі для таго, каб малыя засыпалі або не плакалі: інакш які сэнс траціць час па глупствы?

На кветкі звярталі ўвагу толькі маладыя, і то паміж работай.

Вырасце ля хаты дрэва, яго маглі ссекчы, бытта цень прыносіць у хату сырасць: яшчэ грыб паесць сцены!..

Цётка магла пражыць свой век і не пабываць у суседняй вёсцы.

Паедуць, бывала, два дзядзькі на цэлыя суткі да млына. Аднаму жонка дасць торбачку з ежай. Ён есць пры сябру, з якім праходзіла

яго жыццё, і ў дзядзькі не з'явіцца нават думкі падзяліцца кавалкам хлеба, а сябар за гэта і не пакрыўдзіцца.

І жаніліся ў нас па-свойму. Хлопцу нявесту падбіралі ў залежнасці ад колькасці кароў, якасці воза — пасагу маладой!

Канечне, было і каханне, а як жа!

Недалёка ад маёй вёскі ля дарогі ляжыць і да сённяшняга дня крушня каменняў. Яшчэ нядаўна, бывала, калі ішлі жанчыны ў лес па ягады, старыя з прыполу вымалі камені і шпурлялі ў горбу. Некалі адна дзяўчына з нашай вёскі не вытрымала, што яе хлапца ажанілі з другой, і ўтапілася.

— Звар'яцела! — сказалі адны.

— Гэта яе д'ябал збіў з тропу! — казалі другія.

Бедную поп нават не дазволіў пахаваць на вясковых могілках. Закапалі яе ў чыстым полі ля дарогі, і аж да 1939 года нашы жанчыны ў яе магілку з пагардай і праклёнам шпурлялі каменнямі!

Толькі ў апошні час людзі маёй вёскі пачалі адчуваць, што недзе ёсць яшчэ іншы свет, ім невядомы. Мне здалося, што Данута якраз з таго свету. І мяне туды пацягнула, як расліну да сонца!

Я быў тады малады і, як кожны малады, шукаў вакол сябе штосьці лепшае: людзей, сацыяльны ўклад...

Яшчэ трэба сказаць і пра іншае.

Мы спаткаліся ў такім узросце і ў такую пару, калі гатовы былі закахацца ў чалавека, які адпавядаў нашым патрабаванням: я — ёй, яна — мне. Як толькі зарадзілася глыбокае пачуццё ў аднаго, у сілу сваіх таямнічых законаў яно выклікала такое ж самае пачуццё і ў другога. Няважна, што мы паходзілі з розных асяроддзяў і гэта рабіла нашае збліжэнне нелагічным. Хіба ў каханні заўсёды пануе логіка?

## Раздзел трэці

**1**

Пасля Данусінага прызнання я хадзіў прыбіты, сам не свой.

— Янэк! — пазвала аднойчы мяне паненка з гары, калі я браў у калодзежы ваду.— Ідзі да нас.

Я праглынуў камок крыўды.

— Хадзем, ну, не злуйся!— збегшы ўніз, пацягнула яна за рукаў...

Гордасць мая некуды знікла, і я пакорна пайшоў за ёй.

— Мая калежанка Бэта! — адрэкамендавала яна мне Залкіндаву дачку.

Ад нечаканасці я не ведаў, як сябе паводзіць. А паненка не давала апамятацца. Яна зняла з пляча лейку і загадала:

— Ану, стань побач з Бэтай, я вас здыму!

— Бэтачка, на, здымі мяне з панам Янкам! Я яго навяла, толькі націсні спуск.

Дануся стала побач са мной. Дзяўчына нас шчоўкнула і вярнула апарат. Усё адбылося на працягу лічаных секунд.

— А цяпер на, раздушы!— працягнула мне жменю валоскіх арэхаў.

Дануся хацела пахваліцца, які я дужы. Мне было няёмка, я ўпіраўся.

— Сцісні, сцісні! — дамагалася яна настойліва, паклаўшы мне на далонь арэхі і загінаючы пальцы ў кулак.

Я паслухаўся, і арэхі луснулі з сухім трэскам.

— Бачыш? — пераможна зірнула яна на Бэту. Дзяўчына працягвала вывучаць мяне разумнымі карымі вачанятамі — такімі прыгожымі і выразнымі, якія бываюць толькі ў яўрэек.

— Пане Браніславе, сюды! — закрычала Дануся. Я зірнуў уніз. Там ішоў Любецкі.

Стаяла такая цяплынь, што хацелася разуцца, скінуць з сябе кашулю, а князь быў у новым цёмным касцюме, накрухмаленай кашулі і пад гальштукам. Крочыў ён павольна, як чалавек, які ў святочны дзень выйшаў прайсціся.

— А, сэрвус! — убачыў ён нас.

Яго яшчэ не хапала.

На ўзроўні маіх ног паказаліся бліскучыя залысіны, шыя і плечы.

— Дзень добры, панно Дануто! Дзень добры, панно Бэто!— часта дыхаючы, праказаў Любецкі.— Го, панно Данка з фотаапаратам? Выдатна!

— А ў мяне плёнка скончылася! — пераможна, нібы з радасцю паведаміла яна.

— Шкада...— апёкся Браніслаў.

Толькі цяпер ён убачыў мяне і разгубіўся.

— Пан Янэк, знаёмцеся!

— Знаёмы...— прамямліў вечны студэнт з дурнаватай усмешкай.

— Вы ўжо знаёмы? — зрабіла вялікія вочы Дануся.

Ніхто ёй не адказаў.

Я за ім сачыў незалежнымі вачыма. Любецкі зрабіўся вартым жалю. Усё выглядала так, бытта тут стаяў настаўнік, якога вучань Браніслаў вельмі баіцца. Ён перайшоў амаль на шэпт:

— Панно Данко, вас можна на хвілінку?

— Калі ласка!— пераглянулася яна з Бэтай.— Прабачце, пане Янэк!

Я не паспеў адказаць: рэакцыя ў маёй галаве праходзіла замаруджана, усё адбывалася нібы ў сне.

Браніслаў павёў паненку ўбок, але Данися весці сябе далёка не дазволіла.

— У тэатр, як дамовіліся?

— Вядома!— капрызна пацiснула яна плечыкамі і вярнулася да нас.

— Бывайце! Мяне на Антаколі чакаюць нашы карпаранты!

— Калі ласка, клічце і іх сюды!

— Яны нешта арганізуюць!.. Прыемнай забавы! — кінуў ён, стараючыся не сустрэцца з маімі вачыма, і пайшоў.

Брэшаш, ніхто цябе не чакае. Заела самалюбства. З ахвотай ты пабыў бы тут, каб не я.

Мы трое глядзелі яму ўслед. Браніслаў нехлямяжа крочыў у чорных лакірках, прыпаднімаючы калашыны і выбіраючы месца, куды паставіць нагу, каб не надта запыліць абутак. Данися з Бэтай не вытрымалі і пырснулі. А ў мяне бытта зняў хто з сэрца вялізны цяжар.

Не вельмі мяне кранула, калі пад вечар я ўбачыў, як Браніслаў выходзіў з генеральскага дома і вёў Данусю.

2

Міналі лепшыя нашы дні.

Данися пасля абеду з падручнікамі спяшалася да мяне, а дома гаварыла, што ідзе да сяброўкі.

Мы вельмі адно аднаго дапаўнялі і ў той жа час не разумелі адно другога.

Аднойчы, напрыклад, яна шчыра рассмяялася з мяне, што я па смаку не адрозніваю гатункаў цукерак і яны для мяне ўсе аднолькава салодкія. Якраз у гэтую хвіліну, асцярожна абыходзячы дубцы, наставіўшы клінам свіную мысачку, праклыпаў ля нас вожык. Калі ж я сказаў, што вожык зімой спіць у трухлявым пні, сівее ад старасці, любіць лізаць расу і вельмі храпе ў сне, Данися паглядзела на мяне ўжо з павагай.

— Чаму ў цябе ў адным чаравіку падэшва дзіравая, а ў другім — цэлая? — выбухнула яна смехам зноў.

— Бо на левай абутак заўсёды хутчэй рвецца, нават — у цябе.

— На правай!

— Якраз наадварот.

— Та-ак?..

Усё гэта ёй было так цікава, што яна не знаходзіла слоў, каб выказаць здзіўленне.

У адзін пагожы дзень выбраліся мы за горад. Па дарозе Дануся пачала расказваць аб сваёй паездцы за граніцу. Яна бачыла там такое, пра што я чытаў толькі ў кніжках.

— Паехалі мы першы раз у Германію з паняй ваяводавай. У Дрэздэне зайшлі ў карцінную галерэю. Пані Бацянская падышла да адной карціны і расчаравана закрычала: «Дык такая ж вісіць у мяне на кватэры ў Вільні!» — «Тут арыгінал!» — тлумачу ёй. «Варта было толькі з-за гэтага ехаць тысячу кіламетраў?!» Адтуль адправіліся на мора...

— Раскажы пра яго!

— Ты яшчэ ніколі не бачыў?! — здзівілася паненка, калі мы крочылі палявой дарогай.

— Дзе ж я мог бачыць?!

— Слухай тады. Пад'язджаем да Трыеста, і мамуся кажа: «Глядзі, мора!» Зірнула я праз акно — ніякага мора! Толькі чамусьці па небе плавае бервяно, а над небам высяцца спічастыя хмары. Калі добра прыгледзелася, ажно гэта не хмары, а — горы са снегам і ніякае не неба, а вада, і па ёй плавае не бервяно, а — лодка з чалавекам!

Яшчэ мінулай восенню, калі не знаходзіў сабе месца ў Вільні, я аблюбаваў за горадам азярко. Цяпер прывёў да яго Данусю.

У апошнія дні моцна прыпякала сонца, азярко высахла і нагадвала вялікую лужыну, якая густа зарасла травамі, трысцём і аерам. Дануся падбегла да берага і анямела.

Дзіва! Чым тут захапляцца? Усё звычайнае, як ля маёй вёскі.

Пахнуў разапрэлы сітнік, і над ім трашчалі крыльцамі з сухога цэлафану конікі. На супрацьлеглым баку азярка пад кустом спаў пастух. Яго каровы пазалазілі па самыя жываты ў ваду і ляніва шлёпалі сябе мокрымі хвастамі па баках. Здавалася, прырода — нібы гэтыя каровы — растлусцела, абляніл ася, млее ад раскошы і ні аб чым не хоча ведаць. Успомніліся доўгія нудныя дні, калі я з торбачкай цераз плячо гэтак цэлыя дні, тыдні, месяцы праводзіў са статкам, кожны раз не могучы дачакацца, калі настане той вечар.

— А чаго яны забраліся ў ваду, Янэк? — спыталася Дануся.

— Каб малако не скісла ў вымі.

— А-а...— прыняла мой жарт за праўду. Божа, да чаго ж яшчэ дзіця.

— А хвастамі чаму махаюць, сказаць?

— ?..

— Хвасты ў іх для таго, для чаго пані Бацянскай служыць веер на балу. А смятана адкуль бярэцца, ведаеш? У каровы з вымені звісаюць унь, бачыш, чатыры такія штучкі з кранікамі. Адзін адкруціш — сырадой пацячэ, другі — смятана, трэці — масла стане капаць...

Толькі цяпер яна зразумела, што я жартую, і мы абодва зарагатаді. Гэтым часам яе настрой перадаўся ўжо і мне. Я ўжо паглядзеў на прыроду ігрыва, рамантычна, як у дзяцінстве.

— Кум! Кум! — тужліва паскардзілася жаба.

— Кум-кума, дай палатна! Нашто табе? Дзяцей хрысціць! — падхапіў я.

Каля нас у аеры нешта пакешкалася, пакешкалася, а потым плюхнула ў ваду, а плынь нібы ціха ўздыхнула і аж зморшчылася коламі.

— О-ей! — уздрыганула паненка.

— Не бойся, усяго толькі жаба! Думае, што нас ашукала і мы ўжо яе не бачым. Во, глядзі, ляжыць, хітруня, на дне з вылупленымі вачыскамі...

— Ага, бачу!

— Няхай ёй здаецца, што мы дурні! Пакінем яе ў спакоі... Лепш паслухай, што робіцца ў кустах!

А ў прыдарожным алешніку, зашыўшыся ад спякоты ў лісце, заліваўся салавей.

— Цёх, цёх, цёх! Пабёг, пабёг, пабёг! Па пятах, па пятах, па пятах! Кі-ям, кі-ям, кі-ям! Ф-іі-і! — пачаў я птушку дражніць.

Дануся рассмяялася.

— Я ведаю ўсе іхнія дванаццаць кален!.. Во курскага пачуць бы, тыя спяваюць на пятнаццаць!..

Абудзіўся пастух, павыганяў з вады жывёлу, і яна стала пасвіцца. Паміж кароў важна пахаджвалі буслы.

— А чаго яны разам?..

— Каровы выганяюць з травы жаб, а буслы іх ловяць, прыглядзіся!

— Узаемная дапамога?!. Якая гармонія, якая прыгажосць, якое неба!..

— А ты яшчэ ездзіш за граніцу шукаць хараства! Што тваё мора, што чужая Швейцарыя, паглядзі на свой край як след!

— О божа мілы!

— Пры чым тут твой бог?

— Янку, нельга блюзніць! — спалохана азірнулася яна, бытта нас маглі падслухаць на небе.

Во калі вазьмуся за цябе!

Я адвёў паненку ад возера і пасадзіў у жыта.

— Дануся,— прыступіў я да справы,— ты ж такая вучоная, культурная і разумная паненка! Як ты можаш сур'ёзна верыць у папоўскія казкі?.. Вучыла, нябось, біялогію, ведаеш, што свет узнік не за шэсць дзён, а развіваўся мільёны гадоў!

— Які ты, Янку, наіўны. Біблейская легенда аб стварэнні свету дайшла да нас ад старажытных яўрэяў. А слова «дзень» па-стараяўрэйскаму азначае і суткі, і год, і эпоху. Шэсць сутак трэба разумець у пераносным сэнсе, кожны дзень — цэлая эпоха! Гэта ж так проста!..

Дрэнны з мяне быў настаўнік. Убачыўшы, што адразу не магу пераканаць, я заззлаваў:

— Няма чым ім крыць, падтасоўваюць факты! А ты слухай! Ты вер ім!.. Вер французскім кніжачкам... Ну і балда ж ты, хоць і надта вучоная ды з такой сям'і! Аб чым з табой гаварыць пасля гэтага?

— Янэчку, супакойся!.. Я пастараюся ўсё-ўсё зразумець!

І тады ля возера я прачытаў Данусі палітычную лекцыю.

Я сам у той час больш адчуваў, чым разумеў, і што мог расказаць, мне цяжка цяпер і ўявіць. Памятаю, Дануся слухала пакорна і згаджалася, што рэлігія — мінулае, а ідэі сацыялізма — будучыня народаў. Я палічыў, што дабіўся поспеху. Гэта мяне ўзняло ў сваіх вачах. Пачакай жа ты, князь Любецкі, падсуну табе дулю пад самы нос!

Я не вытрымаў, прыгарнуў яе і пацалаваў.

Дануся дазваляла дакрануцца толькі на адну хвілінку, бытта цалавацца коратка — злачынства меншае.

— Ужо хопіць, Янку! — за кожным разам палахліва ўскрыквала яна задыханая і вырывалася.

Гэта мяне толькі дражніла. Я ганяўся за ёю па жытах, падаў у густую шчотку з пругкіх, як дрот, ядроных сцяблінак і цалаваў, цалаваў зноў.

3

Пад вечар, шчаслівыя і здаволеныя, мы вярталіся з возера.

Па дарозе абагналі п'янага дзядзьку. У абшарпанай саматканай вопратцы ён чагосьці на ноч валокся ў горад.

П'яны раптам стаў рысавацца. Абняў тэлеграфны слуп і зацягнуў маналог:

— Ах, сасёначка!.. Расла ты сабе прыгож;ая ў лесе і гора не ведала! А што з табой паны зрабілі: спілавалі, абадралі, акавалі жалезам, начаплялі нейкіх чарак, дратоў, і век табе тут, беднай, гараваць! І ў дождж, і ў мароз, і ў спякоту ніхто цябе, бедную, не пашкадуе, нікому да цябе няма справы!.. Ты аж патрэскалася ад

натугі, высахла ўся, цябе ўсю стачылі караеды!.. Ах мая ты сястрычка, што з табой злыдні зрабілі!..

Мы засмяяліся і пайшлі далей.

На ўскраіне Вільні паказаўся прыгожанькі домік. Ля яго акон тоўпіліся людзі.

— Давай пабачым, што там здарылася! — зацікавілася Дануся.

— Можам...

Мы збочылі з дарогі.

Ля дзвярэй доміка з апушчанымі пад бараду пасачкамі дзяжурылі салдаты. Духавы аркестр зайграў жалобны марш.

Уціснуўшыся між людзей, мы даведаліся: у гэтым доме памёр палкоўнік.

Людзі навокал нас голасна гаманілі. Ніхто па нябожчыку не бедаваў. Гэта ўразіла Данусю, і яна ўзняла на мяне поўныя слёз вочы. А натоўпу і далей не было ніякай справы да настрою нейкай там паненачкі, у якой бацька таксама вайсковы чын.

— Ты не памятаеш — у католікаў ці праваслаўных перад тым, як забіць труну, накрываюць твар нябожчыку? — абыякава пыталася нейкая жанчына.

— Я адно ведаю, што ў яўрэяў пакойніка кладуць у саван. Найлепш з суровага палатна...

— Ат, яму ўсё роўна!

— А наро-оду сабралася!

— То дзіва! Як багаты памрэ, то і апошні з хаты прэ, а як бедны-худачок — толькі попік і дзячок!

— Калі ж цяпер будуць плаціць удаве?

— Эт, бяда не вялікая!

— Чорт яе не возьме, не бойся, заплацяць больш, чым нам з табой...

Данусі гутарка здалася дзікай, і яна пацягнула мяне за рукаў:

— О-ей, які цынізм!

Прывалокся той самы п'яны дзядзька і пачаў дапытваць:

— Чаму граюць, га? Чаму граюць, а не танцуюць?

— Пане, цішэй, тут чалавек памёр! — узмалілася Дануся.

— Хто памёр!

— Пан палкоўнік!

— Будзе другі, падумаеш!

Людзі зарагаталі.

— Вы п'яны! — Дануся прамовіла гэта так, бытта ад яе слоў чалавек меўся зараз жа згарэць ад сораму.

— Хто п'яны? Я-а?.. Та-ак... Я, канечне, п'яны. Ну і няхай сабе!

— Пане пастарунковы, тут хуліган!— паклікаў нехта паліцыянта.

Тым часам дзядзька, дастаючы з-за пазухі бутэльку самагонкі і тыцкаючы папяровым коркам Данусі ў нос, урачыста прадэкламаваў:

Я п-п'ю не панскія ш-шанпаны —
Зямелькі роднай горкі сок,
От!

З'явіўся нарэшце паліцыянт і пад дружны рогат натоўпу дзядзьку павалок.

— Хадзем адсюль, не магу я тут больш! — расплакалася Дануся.

Я суцяшаў, а яна цвярдзіла сваё:

— Я яго ведаю. Яго ўвесь горад ведае! Пан Мечыслаў Станкевіч. Адзінокі стары. Яго дзеда Мураўёў павесіў за паўстанне. Бацька за Польшчу памёр у царскай турме. Жонка памерла ў вайну ад тыфусу. Сам ён — апошні з роду Станкевічаў, у нас бываў не раз, мне гісторыі даваенныя расказваў... Увесь яго род загінуў за Польшчу, за іх, а яны такія няўдзячныя, подлыя, чаму, чаму?.. Ён ляжыць мёртвы, а яны...

— Супакойся!..— Але я адчуваў, што яна па-свойму мае рацыю.— Перастань!.. Выходзіць, і ім трэба класціся ды паміраць?

— Не люблю цябе, і ты такі самы цынік!

— Называй мяне цынік, бляшанік — як хочаш, але ж супакойся, вазьмі сябе ў рукі!..

Нарэшце мы пайшлі.

У Вільні ўжо ювеліры паздымалі з вітрын свае бліскучкі і пахавалі іх у сейфы. Бразгалі жалюзі — крамнікі зачынялі на ноч вокны і дзверы. Служанкі выводзілі на прагулку пакаёвых сабачак. У касцёлах званілі на вячэрню.

Праходзячы па Антаколі, насупраць касцёла Пятра і Паўла, калі прагучаў першы звон, Дануся застыла і памалілася. Убачыўшы, як яна набожна, на каталіцкі манер — цэлай далонню — хрысціцца, я вылаяўся:

— Вось табе і сагітаваў!

4

Над Вільняй у цэнтры горада стаяў вялізны палац Урублеўскіх. Некаторыя выхадцы з гэтага палаца праславіліся ў народзе.

У 1906 годзе на судовым працэсе адвакат Урублеўскі выступаў з палымянай прамовай у абарону лейтэнанта Шміта.

Іншыя Урублеўскія збіралі грошы для рэвалюцыі... Цяпер жа ў агромністых залах гэтага будынка паны наладзілі выстаўку, прысве-

чаную гадавіне вайны з Савецкай Расіяй. Сярод нямногіх наведвальнікаў выстаўкі быў і я.

У палацы на сценах віселі карты з чорнымі стрэлкамі наступлення легіянераў Пілсудскага. На таблічках значыліся лічбы забітых і ўзятых у палон чырвонаармейцаў. Пад шклом іржавела некалькі трафеяў: руская граната «бутэлька з кальцом», тульская вінтоўка, кулямёт «максім»... Віселі фатаграфіі.

Кідаўся ў вочы адзін здымак. Французскі карэспандэнт зняў генерала ў цынічна-фанабэрлівай позе над трупам чырвонаармейца. Генерал, падкруціўшы вусы, узяўшыся ў бокі, зухавата глядзеў у аб'ектыў, а бліскучы яго бот стаяў на грудзях маладога будзёнаўца. У хлапца са штаноў вылезла ніжняя кашуля і плавала ў лужыне.

Генерал не быў Данусін бацька, але я ў ім убачыў Янкоўскага. Ноччу мне нават прыснілася вайна. Страчылі кулямёты, салдаты Янкоўскага ў мяне стралялі, а я ўцякаў скрозь нейкія кусты. Прачнуўся ўвесь спацелы.

З таго дня перад вачыма часта паўставала карціна — фанабэрлівы генерал з закручанымі вусамі над забітым будзёнаўцам. Мне рабілася страшна, што я закахаўся ў такога далёкага чалавека. Што я скажу сябрам у вёсцы, як пагляджу ім у вочы?.. І мне ўжо здавалася — каханне прайшло, бо, седзячы побач з ёю, думаў адно пра генерала.

Іншы раз, калі мы бывалі разам, мяне агортвала такая лянота, што, здаецца, і пазяхнуць не хапіла б сілы. Хіба ж гэтак сябе адчуваюць у прысутнасці каханай?

«Так яно і мусіць быць, гэта ж дачка польскага генерала!» — пераконваў я сябе і ўспамінаў, як Дануся хрысцілася ля касцёла, як спачувала нябожчыку легіянеру. На душы рабілася лёгка і свабодна, і я думаў ужо пра тое, як неўзабаве пакіну гэты смярдзючы горад і паеду дадому.

Мяне напоўніла ўпэўненасць — бытта пасля ўдала завершанай справы. На Дануту я пазіраў цяпер паблажліва, як бы рабіў ласку, што хадзіў на спатканне.

Адбывалася такое, што я пераставаў разумець.

Часамі варта было Данусі пусціць слязу або выказаць якуюнебудзь просьбу, і ўвесь мой холад да яе адразу знікаў. Калі ж я бываў найбольш няўважлівы, яна яшчэ мацней імкнулася да мяне.

5

Аднойчы, калі мы гулялі за горадам, на Віліі, Дануся ўважліва паглядзела на мяне і загадала:

— Павярні твар!

Я не зразумеў, для чаго яна дастае хустачку — маленькую, пахучую — і разгортвае яе, нібы пялёсткі кветкі.

— Нагніся, Лёнгінус! Штосьці ў цябе тут...

Старанна выцершы мой твар, яна загадала зноў:

— Здымі кашулю, я прапалашчу!

— Ты?..

— Думаеш, не здолею? Здымай, здымай!

— Калі ласка, на!

Праз хвіліну я назіраў, з якім захапленнем і любоўю паненка церла ў рэчцы маю кашулю, і падтрунькваў:

— Умееш, умееш...

— Мне так хочацца зрабіць што-небудзь добрае табе!.. О-ей, каўнерык ужо трэба зашыць!.. Заўтра прынясу іголку і ніткі! — Заклапочаная, яна ўжо развешвала кашулю на куст.

— Го, выдатна! Такой работы я табе падкіну, будзеш яшчэ не рада! — прамармытаў я вяла.

— І праўда, прынось!

Мяне зусім разmарыла на сонцы і апанавала дрымота. Я выцягнуўся пад кустом і прыкінуўся, што сплю. Дануся падсела побач і заптаптала:

— Паспі, Янэчку, паспі. Ты сёння рана ўстаў, бедны, напрацаваўся, табе трэба адпачыць. Паспі, любы, я цябе павартую...

Хоць я ўжо амаль і не валодаў сваім целам, але ўсё чуў і бачыў. Скрозь прыадчыненыя павекі я назіраў, як яна ўважліва разглядае мой твар, вопратку. Потым асцярожна, каб не разбудзіць, пакратала далонню мой падбародак, шчаку, лоб, нос — чула і ласкава, нібы хацела ўкласці ўсю сябе ў гэты дотык. Да мяне прычапілася муха. Дануся датуль махала рукамі, пакуль муха не паляцела. Тады пачала кранаць мае плечы, затым прыклала шчаку да маёй рукі і замерла.

А то аднаго разу было так: сядзеў я на гары вельмі маркотны. Дануся, убачыўшы ў мяне пісьмо, папрасіла:

— Дазволь...

Я падаў канверт.

З вёскі пісалі, што маці Сцяпана Рамановіча лягла на аперацыю і старой спатрэбіліся сродкі. Нават самая нескладаная аперацыя ў Польшчы тады каштавала столькі, што можна было купіць на гэтыя грошы карову. Каб памагчы жанчыне, мае сябры хадзілі ўжо касіць да памешчыка, але зарабілі яшчэ недастаткова.

Сцяпанаў наган — таксама грошы, і цяпер я не меў права яго трымаць.

— Давядзецца развітацца з ім! — паскардзіўся я.

— Разумею цябе,— з павагай вярнула яна пісьмо і задумалася: — Пачакай, Янку, нешта прыдумала!..

Пад вечар пайшоў я на ўрокі і паведаміў аб сваім клопаце Суткусу. Альбінас узяўся дапамагчы.

І праўда. Не прайшла і гадзіна, як ён прадаў рэвальвер Генрыху Станеўскаму за пятнаццаць злотых. Я не дасядзеў да канца заняткаў: пабег на пошту адсылаць грошы.

Вяртаўся я назад нібы пасля развітання з дарагім чалавекам. Дома ляжала запіска: мяне выклікалі.

На гары чакала Дануся. Са змоўніцкім тварам яна разгарнула газету, падала мнк блiскучы прадмет і шапнула:

— Ад мяне падарунак!

Я ўтаропіўся на тое, што ляжала на маёй далоні, і адчуў, як задрыжалі мае рукі.

— Уй, малайчына, Данка!

— Ты толькі цяпер пра гэта даведаўся?

— Але ж адкуль гэта ў цябе, Дана? — спытаўся я, шчаслівы, аглядаючы рэвальвер.

Яшчэ зусім новенькі. Са свежымі фабрычнымі знакамі на рукаятцы — двума жарэбчыкамі.

— Не бойся, мілы, бяры!— Мая разгубленасць была ёй, відаць, прыемнай.— Гэта толькі адзін з калекцыі таты! Фірмы «Кольт»: па-англійску «кольт» — жарабя. Бяры, бяры, не сумнявайся, я апраўдаюся перад татам, не бойся!.. І цяпер ён не хутка вернецца ў горад...

Але ўдзячнасці ў мяне хапіла ненадоўга.

**6**

Сядзелі мы на сваёй гары, схаваўшыся за кусты. Нізам па сцежачцы ўвесь час хадзілі людзі, мы за імі назіралі.

Дануся, як усе жывыя натуры, не патрабавала для вучобы спецыяльнай цішыні, умоў. Яна адначасова вучыла, гаварыла са мной, сачыла за тым, што адбывалася навокал. Раптам Дануся закрыла падручнік і паказала мне на паненку на сцежачцы:

— Падабаецца?

Я прыгледзеўся. Паненка як паненка. Толькі з чорнай радзімкай ля носа.

— Цікавае ў ёй адно гэта! — паказаў я сабе на шчаку, незадаволены тым, што перапынілі мае думкі.

— Сядзіць са мной, а душа недзе лунае...

— З кім, па-твойму?

— Са студэнткай!

Убіла сабе ў галаву, столькі разоў ужо дапікала Вольгай, што мяне нарэшце гэта раззлавала:

— Што ты заладзіла — адно і адно! Ідзі да д'ябла са сваёй студэнткай!

— Не буду, Янэчку! — пачала яна лашчыцца.— Толькі не сярдуй. Ты — адзіны чалавек, з якім мне так хораша!

Мне зрабілася яе шкада, я размяк і зноў забыў пра сваю тугу, пра ўсё на свеце.

Назаўтра Дануся з'явілася з кавалачкам аптэкарскага пластыру на шчацэ.

— Вязальнай спіцай укалолася,— паясніла яна.

Лапінка адстала, і я заўважыў кропку, выпечаную ляпісам.

— Не глядзі!— пачырванела яна і прыціснула пальцам пластыр.

Мяне гэта кранула. Зноў зрабілася яе шкада. Агарнула такое жаданне схапіць паненку на рукі і пацалаваць, што гэта нават яна адчула. Хутка закрыла падручнік і насцярожылася. Ад чыстых і спалоханых яе вачэй я сумеўся. Толькі нязграбна ўзяў яе касу і, як у нас на вёсцы хлопцы з-за самалюбства прыкрываюць сваю чуллівасць грубасцю, праказаў:

— Эк, хвост... Бабскія фокусы...

Дануся пакрыўдзілася, адабрала касу і закінула на плячо.

Наогул я часта заўважаў, што грубыя і часамі дурныя мае выхадкі надта яе абражаюць, але дзяўчыну цягнула да мяне нейкая сіла, якой паненка, відаць, не магла даць рады. І Дануся з яшчэ большым імкненнем спяшалася на спатканне ды старалася дагадзіць мне.

Так здарылася і на гэты раз. У паступны дзень яна прыйшла ў хусцінцы і спыталася:

— Нічога не заўважаеш?!. Не?!.

— Абсалютна! — здзівіўся я.— А што?

— Тады пачакай тут, а я зайду на гару першая.

У гэты дзень я наогул мала бачыў з таго, што рабілася навокал. Калі я ўзабраўся на гару, Дануся была ўжо без хусцінкі.

— Ну, а цяпер? — спыталася яна зноў.

Нібы іншай канфігурацыі твар?.. Не, мабыць, мне так здаецца.

— А ў чым справа, вытлумач!..

— Па-твойму, сёння я такая самая, якая была ўчора? Толькі цяпер я спахапіўся, што ў яе не было кос. Валасы Данусі былі падстрыжаны так, як стрыгуцца кітайскія ці карэйскія дзяўчаты.

— Я іх спецыяльна... Яны табе не падабаліся...

— Выдумала нешта!..— адвярнуўся я, нездаволены. Яна пакрыўдзілася зноў. Крыўда была ціхая, бяссільная. Дануся пайшла на край гары, села, апусціла галаву і заплакала.

— Слёзка мая...— вырвалася ў мяне, калі я яе прытуліў да грудзей.

Дануся захлябнулася ад шчасця:

— Як ты сказаў? Скажы яшчэ раз!

Я паўтарыў.

— О-ох, як мне добра! — выдыхнула яна з набалелай асалодай.— Толькі цяпер бачу, які ты да мяне нераўнадушны!.. Ты сваёй грубасцю прыкрываеш пачуцці, праўда? Чым ты грубей са мной, тым больш...

— Так у нас на вёсцы...

— А ты кінь дзеравеншчыну!.. Выкінь яе, добра?.. Я нічога кепскага не думаю пра вёску, але ты не будзь такім!..

— Я і сам бачу, часамі раблю ці гавару не тое, што трэ... А ты разумная, Дана!.. І дзіўна падобная на маю маму! — упершыню я гэта заўважыў і далонню адгарнуў навісшыя ў яе валасы.

— Праўда? — узрадавалася яна.

— Лоб — дакладна як у маёй мамы, сур'ёзна!..

— А ты, Янку, як глыба!.. О-ей, як я цябе такога люблю!.. Скажы, мая прычоска табе падабаецца?

— Ужо адно таму, што яна твая!

— Гэткую насілі ўсе рэваліоцыянеркі! І Эмілія Плятэр. І Марыя Канапніцкая. І пані Пілсудская, калі яе муж быў у Сібіры... Нават твая Вольга носіць такую!

— Ну-у?!.— здзівіўся я.

— А ты, дурненькі, і не заўважыў?!.

— Калі ўсе рэвалюцыянеркі пачнуць аднолькава падстрыгацца, лёгка будзе дэфензіве працаваць!

— Вядома, і тут ты свой практыцызм прымяніў!.. Што з табой сёння?.. Ты ўсё нешта ўтойваеш ад мяне, нібы не давяраеш!..

— Дапуся,— пачаў я апраўдвацца,— зразумей, ёсць такія справы, пра якія я не маю права гаварыць!

— Не верыш мне? Так? Не верыш?.. Няўдзячны! — расплакалася яна па-сапраўднаму.

Я пачаў паненку суцяшаць. Дарэмна! Скрозь слёзы яна цвярдзіла:

— Я хачу пра цябе ўсё-ўсё ведаць! Клянуся памяццю мамусі, нікому не скажу!

— Не мялі глупстваў, перастань, я ж табе веру, адкуль ты ўзяла!..

Што яна нікому не скажа, я быў упэўнены. Калі так, чаму ж не адкрыць ёй таямніцу? Хіба канспірацыя існуе для канспірацыі? Яна ж нават рэвальвер дала, не пабаялася!

«Вялікае геройства — узяць з дому і падарыць татаву цацку! — гаварыла ва мне развага.— За рэвальвер дачку генерала не пасадзяць!..»

## 7

Аднак таямніцу ёй усё ж такі адкрыў.

У той час урад меў шмат клопату са студэнцкай дэмакратычнай арганізацыяй. Кіраваў ёю аўтарытэтны Юзэф Шус. Не прыдумаўшы нічога лепшага, дэфензіва нанесла арганізацыі ўдар метадам царскай ахранкі. Сышчыкі падпільнавалі Шуса на вуліцы, упіхнулі ў машыну, завезлі за горад і падстроілі так, бытта студэнт сам павесіўся. Да мяне на кватэру прыходзілі раніцой Яцкевіч з нейкім чалавекам: і прапанавалі з'явіцца ноччу ў гарадскі парк, там мелася нешта адбыцца.

— Перайшлі яны да адзінічных забойстваў, будуць справу мець з масай, папомняць нас!..— пагразіўся я.

— О-ей, як цікава!..— выслухаўшы мяне, ускрыкнула Дануся.— А можна з табой?

Выпадак ускалыхнуў усю Вільню, а яна нічога не чула?!. Для яе гэта ўсяго сенсацыя, цікавая і рамантычная экскурсія?!.

— І чаго ты зноў надзьмуўся! — прыстала яна ледзь не з плачам.

— Калі ты нейкая...

Яна закрыла мне далонню вусны:

— Янку, я хачу быць такой, якой ты мяне хочаш бачыць! Ну, як найлепшай! І буду, паглядзіш!..

Сіла пераканання ў яе голасе і позірку зноў мяне абяззброілі, і мы памірыліся.

Тады яна даверыла мне свае таямніцы.

Бацька яе — камандзір дывізіі — з зімы стаяў на нямецкай граніцы ля Пазнані.

Маці яе была чэшка і памерла, калі дачка мела ўсяго два гады. Генерал узяў за жонку старую дзеўку, пані Вацлаву. Другая жонка дала зарок не мець сваіх дзяцей, каб яны не перашкаджалі выхаванню малой падчарыцы.

Даведаўшыся пра зарок пані Вацлавы, Дануся, каб аддзячыць, дала слова выйсці замуж толькі за таго, каго выбера мачаха. І тая выбрала.

— Многа разоў яна гаварыла пра Любецкага,— расказвала Дануся,— але я ўсё прапускала міма вушэй, пакуль не паехалі ў

Закапанэ на міжнароднае спаборніцтва на лыжах. Туды з'ехалася знаць з цэлага свету. Пасля спаборніцтву быў баль. Памяшканне напоўнілі славутасці. Дзеці Радзівілаў, Сапегі, Ротшыльдаў, Крупа... Мужчыны — у чорных фраках, дамы — у дэкальтэ, з брыльянтамі ў прычосках і на шыях... Любецкі стаў да мяне заляцацца, а я саромелася ісці з ім танцаваць. Князь пакрыўдзіўся і выйшаў на двор. Там стаялі фурманы з фаэтонамі. Браніслаў сунуў вазніцы жмут грошай і загадаў распрагаць каня. Тады сеў вярхом і накіраваўся ў залу. Музыка змоўкла, узняўся гвалт, пары сталі ціснуцца да сцен... Браніслаў хапіў мяне за талію, падняў на каня і паехаў па зале, дзе танцавалі... Яшчэ і там, дзе былі накрытыя сталы... Нават не выклікалі паліцыю. Любецкі заплаціў за папсуты паркет, пабіты посуд, паламаную мэблю... Мне тады сталі ўсе зайздросціць, называць князёўнай, і гэта мне вельмі падабалася.

8

Апоўначы Дануся вышмыгнула праз акно, і мы накіраваліся ў горад.

Ля парку я пакінуў яе на тратуары, а сам пайшоў да кампаніі.

Студэнты ў прыватнай друкарні нарыхтавалі некалькі тысяч пракламацый, якія пагражалі забойцам і заклікалі жыхароў Вільні выходзіць заўтра на пахаванне. Гэтыя лістоўкі трэба было параскідаць па горадзе.

У парку знаходзіўся і Суткус. Было сорамна глядзець яму ў вочы: Альбінас нічога не ведаў пра нашы адносіны з Данутай. Цяпер ён адразу здагадаецца, чаго некалі я цягнуў яго да шынка «Баторыя»...

— Рэвальвер з табой? — сустрэў мяне пытаннем Яцковіч, які і тут кіраваў усёй справай.

Я расказаў пра Данусю.

— Знайшоў час на амуры!.. А ручаешся за яе?

— Вядома...— разгубіўся я да рэшты.

І тут я ўлавіў дакорлівы позірк Вольгі. Яна стаяла збоку і прыслухоўвалася. Мяне разабрала злосць. А ў чым я вінаваты? Сама апавядала мне турэмную гісторыю!..

Спалоханая Дануся спаткала мяне пытаннем:

— О-ей, Янку, я за цябе так баюся! За такія штучкі не трапіш у турму?

Трывожна-насцярожаны настрой студэнтаў перадаўся ўжо і мне, пытанне паненкі раззлавала да рэшты. Я схапіў Данусю за руку, пацягнуў:

— Хадзем!

О зменлівы жыццёвы шлях чалавека! Ці мог я спадзявацца паўгода назад, што тая самая генеральская дачка, з-за якой я абліваўся потам на рынгу і дзёўб каменні ў музеі, стане для мяне цяжарам?!

— Ну, баксёр, не забывай, мы — у тваіх руках! — аб'явіў Яцкевіч, калі я падышоў зноў.— На твае кулакі і на тваю гармату ўся наша надзея!

Я нічога не адказаў: мой настрой сапсаваўся. Баючыся спаткацца вачыма з Суткусам, я пабег наперад, подла пакінуўшы Данусю. На шчасце, яе адразу падхапіла Вольга.

9

З парку мы накіраваліся ўверх па галоўнай магістралі — вуліцы Міцкевіча. Некалькі чалавек з Суткусам на чале падаліся ў бок Віліі, дзе жылі сем'і афіцэраў. Я пасмялеў ды пачаў шукаць вачыма Данусю. Паненка з Вольгай, абняўшыся, крочылі дружна і пра нешта гутарылі. «Аб чым яны гавораць?» — зацікавіла мяне.

Памалу група меншала. Парэшце засталіся толькі паненкі, за імі я і Яцкевіч. Мы трымалі пад пахамі пакецікі. Была гадзіна ночы. На залітай яркім святлом вуліцы — ні душы.

— Тут,—шапнуў студэнт, пераводзячы дых, калі мы дайшлі да сквера, і сыкнуў на дзяўчат, каб спыніліся.— Высыпай ты свае, каб рукі былі свабодныя, а на Лукішскім пляцы я выкіну свае!

— Ты ачмурэў? — абурыўся я, адгадаўшы задуму студэнта.

Такія «героі» і ў нашай вёсцы выкідвалі лістоўкі проста на вуліцу і лічылі, што заданне выканана. А раніцай лістоўкі ўбачыць які-небудзь здраднік, заявіць у паліцыю, і яны, нікім не прачытаныя, павандруюць у печ. А тут іх знойдуць яшчэ хутчэй, бо кожную хвіліну снуюць паліцыянты.

— Глядзі за вуліцай! — загадаў цяпер я і накіраваўся ў пад'езд з цясанага граніту.

Сюды я насіў малако.

У гэтым раёне жыло адно панства. Са здавальненнем пачаў я запіхваць лістоўкі ў паштовыя скрынкі, пад дзверы, у выстаўленыя для булачнікаў кошыкі, вешаў на цвікі...

— Гэтак мы будзем да самай раніцы тут калупацца...— цяжка дыхаючы, нездаволена сустрэў мяне Яцкевіч: яму было сорамна перад паненкамі.

— Ну і будзем, калі трэба, а ты думаў — ляп-цяп? — абрэзаў я студэнціка.

Толькі цяпер кінуліся ў вочы яго запалыя шчокі, якія бываюць звычайна ў мужчын каля трыццаці год, ды пад студэнцкай кепкай — адтапыраныя вялізныя вушы. І ростам ён нібы паменшаў: што за мужчына, мне па плячо?!. У такога яшчэ шукаў падтрымкі... Шляхцюк гарадскі, прайшоўся пару кіламетраў і ўжо задыхаўся.

— Годзе стаяць, давай далей! — пагнаў я Яцкевіча, беручы ініцыятыву ў свае рукі.

Калі на Лукішскім пляцы канчалі мы сваю справу, дзяўчаты пачалі чыхаць — сігналіць трывогу. Набліжаліся два паліцыянты і шпік у цывільным.

— Панна Янкоўская, і вы тут? Так позна?— пачуў я знаёмы голас.

— Не, мы так...— запнулася Дануся.

— Можа, вас правесці дадому?

— Дзякуй, зайду з паннай Оляй... Вы не знаёмыя?

— Не меў гонару!

— Знаёмцеся. Мая калежанка!

— Вельмі прыемна. Генрых. Я маю гонар пазнаёміцца са студэнткай, праўда?

— І я шчаслiва — пазнаёмілася з такім ладным панам. І на самай справе, правядзіце нас! Далібог, цікава з такім сімпатычным спадарожнікам прайсціся ў такую цудоўную ноч! — загаварвала зубы Вольга.

— Правядзіце, правядзіце нас, пане Генэк! — спахапілася ўжо і Дануся.

— Прабачце, прапанаваў, а не падумаў, што не маю часу.— Цяпер я пазнаў: гаварыў Станеўскі. Толькі голас у яго быў дзелавы, упэўнены, узбуджаны.— У горадзе трывога. Заварушыліся камуністы. Ловім іх. Мы і вас палічылі за чырвоных!

— А як жа, адгадаў пан! Мы чырвоныя, нібы радыска: разрэж, а ўсярэдзіне — белая! — жартавала бойка Вольга.

— Го-го-го-го, але ж брава!

— Вы не ведаеце тых тыпаў? — перабіў іх сур'ёзны голас паліцыянта, якому ўжо не цярпелася прыступаць да выканання службовых абавязкаў.

— Не! — катэгарычна заявіла Вольга.

— Тых двух?!. Нашы бурсакі з гімназіі Касцюшкі,— падхапіла Дануся.— Няўжо пан Генрых такі службіст: не правядзе нас, калі нават я загадаю?

— Панна Данута на гэты раз павінна прабачыць, я не адзін...

Пакуль адбываўся гэты дыялог, мы стараліся адысці як мага далей.

«Ах ты, гадзіна! — падумаў я пра Станеўскага. Што ён працуе ў дэфензіве[1] было для мяне громам з яснага неба.— Дык вось чаму ты так пазбягаў мяне! — прамільгнулі ў памяці ўсе неасцярожныя словы, якія я пры ім сказаў.— Вось чаму ты апранаешся, як кароль, маеш на халву і шакалад, звяртаешся да ўсіх з развязнай фамільярнасцю!.. А я, дурань, яшчэ збіраўся пагаварыць з табой як са сваім хлопцам, каб не блытаўся з эндэкамі!.. Дзе была мая галава?.. Тады дзіўна, навошта ты куніў Сцяпанаў наган? Няўжо табе, халую, дэфензіва не давярае казённы?»

Наша спешка выклікала падазронасць. Патрулі пакінулі паненак і затупалі ў наш бок. Ноччу на пустой вуліцы — нібы зімой на лёдзе — цяжка вызначыць, блізка хто крочыць ці далёка. Часамі здавалася, што яны далёка, то зноў па спіне прабягалі мурашкі вось-вось цапнуць за каўнер!.. Каб не выдаць сябе канчаткова, азірацца не адважваліся.

Усе брамы былі пазамыканыя, а ззаду паліцыя. Мы несліся з усіх ног!

— Колькі патронаў? — спытаўся студэнт.

— Барабан. Але страляць нельга. Паліцыянты з карабінамі, у шпіка — наган, адкрыюць пальбу — мы прапалі. І Станеўскаму толькі выдам сябе. Чорт, чаму я такі доўгі!

— А можа, і не пазнае! — няўпэўнена пераконваў сябар: бяда нас ужо з'яднала.— Вось што мне рабіць? Засталося некалькі лістовак... Уздумаў ты раздаваць іх па кватэрах, нібы візітныя картачкі!

Сапраўды ж была сітуацыя. Мы нібы ў мяшку. Толькі далёка ўперадзе, ля калон кафедральнага касцёла, віднелася агароджа парку, за ёю — дрэвы.

— Памчым туды, парамахнём агароджу, скочым у кусты, і мы — уратаваныя!

— Які ты разумны! — абрэзаў я сябра.— У парку абавязкова хто-небудзь вартуе з паліцыянтаў. Гэтыя засвішчуць, і ў кустах будуць нас чакаць, як зайцаў. Там цёмна. З аветленага месца мы іх і не ўбачым!

---

1 Дэфензіва — тайная паліцыя ў буржуазнай Польшчы.

— А што нам застаецца?.. Стоп!.. Ціха, ціха...— У голасе таварыша прагучала надзея: — Барташэвіч, хто не рызыкаваў, той не перамагаў, хадзем да яе!

Пад лямпачкай тырчала самотная постаць жанчыны. Адзенне і пастава яе не выклікалі сумнення — прастытутка закінула вуду. Калі ноччу даводзілася ісці па горадзе, то я выбіраў у пяць разоў даўжэйшы шлях, абы толькі менш сустракацца з такімі.

— Алё, кветачка, мы цябе столькі шукаем! — крыкнуў ёй студэнт.

— А я вас даўно чакаю! — у тон адказала шыракатварая дзяўчына і роблена ўсміхнулася. Голас яна мела трубны, ад грымасы твар і моцна пафарбаваныя вусны зрабіліся агідным.

Дзяўчына падалася насустрач.

Я аж жахнуўся. Гэта яна восенню прыставала, калі я еў марожанае! Вядома! Той самы шырокі твар, яна!.. Многа разоў выглядаў ж на вуліцы, адчуваючы жудасную, нездаровую, хвалюючую цікаўнасць. І на табе!..

Студэнт узяў дзяўчыну пад руку, мне трэба было браць пад другую, але я не мог адважыцца. Утраіх падаліся мы да парку.

Патруль увесь час ішоў на дыстанцыі, не рызыкуючы нас затрымаць і праверыць. Калі мы не тыя, трэба прасіць прабачэння. Паліцыянты трапіліся, відаць, з гонарам. Прызнацца, што яны памыліліся?.. Яны сачылі за намі зводдаль. Убачыўшы, як мы падчапілі жанчыну, паліцыянты вырашылі, што мы звычайныя распуснікі, і адразу адсталі.

Не такі ўжо і дурань Яцкевіч.

— Ну, стакротачка, дзякуй табе, дарагая, за ўсё і шчыра жадаем поспеху — багатых кліентаў, а нам твой тавар не патрэбны! — аб'явіў пасмялелы студэнт жанчыне ў парку.

— А-а, та вы та-ак? Хамы, свінні!.. У паліцыю заяўлю на вас!..

Пакінуўшы яе адну, раззлаваную, мы з усіх ног пабеглі.

— Ты не ведаеш, кожнаму шпіку даюць рэвальвер? — спытаўся я ў сябра, калі мы апынуліся на гары Гедыміна. Пытанне не вылазіла з галавы.

— Кожнаму.

— Дык чаму Станеўскі купіў сам наган?

— Ён толькі практыкант у іх.— Яцкевіч добра разбіраўся ў гэтых справах і віленскіх сышчыкаў пазнаваў нават на вуліцы.

Генрых не можа дачакацца і купіў зброю за свае грошы. Ведаў жа я, каму прадаць! Устаў бы з магілы Сцяпан, што б ён мне сказаў?!.

10

Па дарозе дадому я хваляваўся за Данусю: была ўжо трэцяя гадзіна ночы. Паненка і не ведала, што ўратавала нас: патруль затрымаўся толькі з-за яе.

Я знайшоў Данусю ў альтанцы садка. Дадому яе правяла студэнтка.

— Янэчку, мілы, ты жывы?.. Я за цябе так баялася! — кінулася дзяўчына мне на грудзі,— Вярнулася і прачакала тут да світання! Чамусьці здалося, што цябе больш ніколі не пабачу! Зрабілася страшна-страшна... Я ўжо і малілася: «Езу, коханы, вярні мне яго хоць бы жывым!..»

Удзячны і ўзрадаваны, я прыпаў да яе вуснаў.

Калісьці Дануся пацалавала мяне праз сетку: нясмела і лёгка, нібы ластаўка на ляту кранула грудзьмі паверхню вады. Цяпер яе падатлівыя вусны затуманілі маю галаву. Цалуючы дзяўчыну, я адчуваў, як яна ўся горнецца да мяне, а па шчоках яе цякуць слёзы. Няўжо я змагу яшчэ калі яе пакрыўдзіць?

— Ты так за мяне хвалявалася?

— Ах... Ах...— давілася яна шчаслівым плачам і раз-пораз уздыхала.

— Я адразу ж і паляцеў сюды, як толькі вырваўся!

— Колькі з-за цябе перацярпела, перадрыжала! — скардзілася яна ціха ў мяне на грудзях.

— А я цэлы і здаровы, бачыш? Станеўскі якраз бы налез на мяне, каб не вы з Вольгай, і сядзець бы мне цяпер у халоднай!

— А ты яшчэ і браць мяне не хацеў!

— Быў грэх, каюся!.. Ну і хітры Яцкевіч!.. Падчапіў гэтую жанчыну!..

— Паліцыянт убачыў вас з ёю і кажа сябрам: «Мы, здаецца, памыліліся!..» І адразу перасталі вамі цікавіцца!.. Прызнайся, аднак, гэтая жанчына табе не была знаёмая?..

— Адкуль?!.

— А чаму ў цябе вочы сарамлівыя?!. Ты такі адважны, я цябе за гэта так кахаю...

Узышло сонца.

У Данусі твар быў бледны. Выпадак з лістоўкамі забраў у яе многа сілы. Напружанне цяпер у паненкі змянілася вяласцю і бяссіллем.

— Ну, на сёння хопіць. Ідзі адпачывай! — зжаліўся я.— Пайду на работу!

— Але ж я спаць не хачу! Праўда, праўда, не хачу! Вазьмі мяне з сабой разносіць малако! Раніцай мяне ніхто не пазнае, нашыя спяць, а з цёткай Антосяй я дагаваруся...

— Яшчэ што: дачка генерала разносіць малако. Усе газеты напішуць пра гэта!

— Вазьмі-і!

— Пабачым!.. Ах як я прашляпіў Станеўскага!.. І не падумаў — адкуль у яго капелюшы, касцюмы... Я лічыў, Генрых — няшкодны, падхалім...

— Ён цябе не выдасць. Беларус таксама!

— З тых, што прыйшлі б сёння туркі, ён ужо служыў бы ім!

— Дык бярэш мяне з сабой!

— Выдумала! Слухай, што табе гавораць старэйшыя! Праваліш з-за мяне экзамены!

— Не правалю, любы! — Твар і вочы яе запрамянелі ласкай.— Адно скажы, што мяне кахаеш!.. О-ей, які ты ў мяне цудоўны!.. Спачатку ты мяне проста зацікавіў. Цяпер — жыць без цябе не змагла б!.. Кажы!

— Ну!

— Не «ну», а «ка-хаю»!

Я саромеўся гэтага слова, яно аніяк не праходзіла скрозь горла.

— Сама сказала за мяне.

— Ай! Хачу пачуць ад цябе! Кажы, хутчэй, чакаю!

— Ну, на табе. Кахаю...

— О! «Ка-хаю»! —перадражніла паненка.— Не так, а з пачуццём!

— Ведаю цябе, гэтаму і канца не будзе! Марш спаць!

— Ш-ш-ш! — закрыла яна мне вусны.

На панадворку з'явілася Антося з талеркай аб'едкаў. Служанка наблізілася да сеткі, за якой лазілі куры маёй прачкі, і паклікала:

— Ціп-ціп-ціп!..

З усіх канцоў панадворка кінуліся куры.

— Бяжыце прэндзэй, куркі, прэндзэй!.. Згаладаліся? Наце, даражэнькія, паснедайце!..— Антося пачала крышыць булку і кідаць праз сетку.

Куры дружна застукалі па вытаптаным і вільготным ад расы панадворку.

— Во, во, курачкі, будзіце зямельку, будзіце,— прыгаварвала над імі цётка.— Тук-тук-тук, зямелька, уставай прэндзэй, хопіць табе спаць! Тук-тук-тук!..

Жанчына паводзіла сябе так, бытта, акрамя гэтых курэй і яе, на вуліцы нікога не было. Мы пераглянуліся і шчасліва ўсміхнуліся.

Калі Антося пайшла дадому, паненка папрасіла:

— А цяпер вазьмі мяне на рукі і пакалышы!

Я выканаў яе просьбу. Данися ціха ўздыхнула:

— Як мне добра!.. Кажы за мной: сонца, не свяці ў пакой маёй прыгажуні, каб шум тваіх промняў не разбудзіў яе!.. Ну, кажы!.. Кошка, не хадзі па падлозе, каб твае крокі не абудзілі яе! Кажы!.. Кветка, пачакай, не распускай свой бутон, абудзіш маю каханую!.. Паўтарай!..

11

Раней, бывала, ад ранішняй сырасці асіпну, як п'яніца, у галаве — гудзе ад недасыпання, увесь свет ненавісны. Ідуць па мармуровых сходках булачніцы, разносчыкі газет, і ў іх такі самы настрой, ім таксама хочацца спаць. Адзін аднаго мы бачым нібы праз сон або павуцінне, размінаемся, як прывіды, сапучы насамі. Няма настрою нават гаварыць да сяброў, а спытае што ў цябе ў гэты момант нехта, і ты гыркнеш штосьці злое, невыразнае.

А сёння, ідучы з Данусінага садка разносіць малако, упершыню адчуў я прыгажосць ранку. Дыхалася лёгка, думкі былі жывя, а сам я — бадзёры. Эх, з якім задавальненнем на вуліцы Міцкевіча падміргваў я служанкам і шматзначна гаварыў:

— Штосьці ў вашым доме сёння ва ўсе кватэры — пісьмы аднолькавага зместу?!

На жаль, служанкі — забітыя і непісьменныя вясковыя дзеўкі,— акрамя танцаў і салдат, нічога не ведалі. У адказ яны адно дурнавата ўсміхаліся.

Толькі адна, да якой я быў нераўнадушны, мяне зразумела. Калі я падышоў, дзяўчына стаяла ў калідоры на табурэтцы і здымала з цвікоў мае паперкі.

— Сёння свята такое! — адказала яна мне ў тон.

...Пакуль Ісці ў школу, я ўсё ж такі выспаўся, бо пахавання не адбылося. Паліцыянты яшчэ ноччу забралі з морга цела Шуса і вывезлі невядома куды. Каб у гэты дзень студэнты не маглі чаго-небудзь выкінуць супроць улады, Яцкевіча і яшчэ сорак завадатараў заладавалі раніцой у машыны, вывезлі за горад кіламетраў за пяць — дзесяць і выпусцілі ў поле. Пакуль хлопцы прывалакліся ў Вільню, ужо было позна што-небудзь рыхтаваць зноў.

## Раздзел чацверты

**1**

Стаяў гарачы летні дзень. Я чагосьці шукаў на панадворку. За металічнай сеткай, ля клумбы, пад вялізным парасонам генеральша чытала кніжку. Ля яе ног драмалі белы кот і Гектар.

З дома выйшла Дануся, расклала брызентавую табурэтку, прымасцілася побач з мачахай і пачала гартаць падручнік. Але паглыбляцца ў навуку ёй не хацелася. Яна крадком азірнулася, прыжмурыла вочы, зрабіла мне грымасу і паказала язык. Я сеў на ганку, засланіўся ад генеральшы рукой і стаў адказваць.

І пачалася ў нас бясслоўная гутарка. Абаім было прыемна, нібы сядзелі побач.

Але гэты дыялог працягваўся нядоўга — з'явіўся Любецкі. Я, злосны, сабраўся дадому, ды ля нашай брамкі ўбачыў сваіх хлопцаў. Да мяне валілі — Яцкевіч, Суткус, Вольга і студэнт Шыманскі. З апошнім мы пазнаёміліся ў той вечар, калі раскідалі лістоўкі. Хоць яго прозвішча і мела польскую канцоўку, аднак гэта быў заядлы ўкраінец.

— А-а, так він вось дэ спратався! Мы — аддувацца, а він — загорае, як на курорце! — пракрычаў украінец.

Я адразу забыўся на суседку. Стаў выносіць табурэткі:

— Сядайце хто дзе!

Хлопцы прывіталіся. Я не мог нацешыцца. Эх, каб бачылі маці, бацька, вясковыя хлопцы, якія ў мяне сябры!..

— Захацелі надта піць,— паясніў Яцкевіч,— а на Зарэчную, у ларок з напіткамі далёка. Ты хваліўся, што ў цябе лячэбная вада. Давай, паі!

Вялізны і рыхлы Шыманскі са светлымі, бытта заспанымі вачыма нагадваў лянівага падлетка.

— Хімікаты з газіроўкай атруцілі нутро! — паскардзіўся разапрэлы ўкраінец.— От бы хто здагадаўся даць кіслага малака са склепа! Або калодзежнай вады — каб аж зубы ламала і дух займала!

— Пачакайце, збегаю ў яр, прынясу свежай! — кінуўся я на кухню па вядро.— Альбінас, будзь тут за гаспадара! Ну ж і дасталася вам, бедным! І куды яны вас заперлі?

— Пад Эйшышкі!.. Усё з-за таго, што Камінтэрн распусціў партыю![1] — заўважыў Яцкевіч.— Была б партыя, мы гуртам панам фокус паказалі б!

---

1 Рашэннем Камінтэрна ад 1938 г. Кампартыя Заходняй Беларусі была распушчана.

— Распусцілі, яшчэ і абвінавацілі нашых хлопцаў у прадажніцтве! — дадаў Суткус.

— Трэба было і — абвінавацілі! — запярэчыла Вольга.

Ух ты, якая яна!

— Лес сякуць — трэскі ляцяць! — дадала яшчэ студэнтка.

— А каб мы з табой трапілі ў гэтыя трэскі? — падскочыў да дзяўчыны літовец ледзь не з кулакамі.

— І вокам не міргнула б, прыняла б свой лёс! — закрычала яна ў такой запальчывасці, у якой я яшчэ яе і не бачыў.— Я — шрубка, салдат рэвалюцыі і, калі партыя загадае, гатова зараз памерці!

— О рропужэ, але ж яе няма, распусцілі!

— Партыя ў мяне тут, у сэрцы!

— Рэзанёрства там у цябе адно! Калі прыпіраеш цябе фактам, ты адразу выкідваеш чырвоны сцяг і хаваешся за яго! Знамёны нам даюцца для таго, каб іх абараняць, а не прыкрывацца імі!

У іхнюю спрэчку ўмяшаўся Яцкевіч:

— А навошта лес сячы?!.

Але я далей не слухаў, панёсся з вёдрамі. Бегучы да калодзежа, я падумаў, што хлопцы прыйшлі не так сабе. Іх жа паліцыя вывозіла з-за Шуса за горад. Вярнуліся ў Вільню, адаспаліся і нешта задумалі зноў. І ўсе яны былі, выяўляецца, некалі ў партыі!..

Калі я вярнуўся, хлопцы сядзелі на ганку і перагаварваліся ўжо з Данусяй.

— Пане Барташэвіч, запрашаю ўсіх да нас! — закрычала яна.— Пазнаёмлю з мамусяй, з панам Браніслававам!

— Мы паненцы нічога не маглі адказаць, бо самі ў гасцях,— растлумачыў Суткус.— Чакалі гаспадара. Цяпер ты і вырашай!

Разгублены, я стаў па чарзе падносіць ім кубак. Данусі ўсё чакала.

Суткус над ёй зжаліўся:

— Зараз. Толькі нап'ёмся!

— Пойдзем пагутарым! — падтрымаў Яцкевіч, выціраючыся.

Шыманскі піў проста з вядра.

Нарэшце ён адарваўся ад вады, перавёў, нібы паравоз, дых, прыляпіў сабе на макаўку аксамітную кепку і аб'явіў:

— Цяпер можам і пайсці!

Я занёс вядро і кінуўся даганяць сяброў. Вольга накіравалася ў горад.

— Куды ты? — спытаўся я.

— Галантнічаць перад класавым ворагам не стану! — кінула яна мне раззлаваная.— Хопіць, вечар цэлы правазілася з той паненкай!..

2

Дануся падводзіла нас па чарзе да мачахі пад квяцістым парасонам і знаёміла. Не кранаючыся з месца, дама кожнаму падала руку, затым зноў паглыбілася ў кніжку. Настаў чарод вітацца з князем.

— Але і хлопы! — кінуў ён.

— І ўсё беларусы! — з гордасцю пахвалілася Дануся.

— О, выдатна! — ускрыкнуў Браніслаў.— У нас з беларусамі ніколі не было канфліктаў!

— Так? — разгубіўся я.

— Пан упэўнены? — кінуў Шыманскі з двухметровай вышыні.

— Сядайце, панове!— замітусілася Дануся, адчуўшы няладнае.— Сюды можна і сюды...

— Паненка вельмі клапатлівая.— Шыманскі апусціўся на лаву, ляпнуў далонню па афарбаваных у зялёны колер планках.— І на самай справе, сядайце, калегі!

— Ты не злуеш? — шапнула мне Дануся.—Янку, глядзі, у мяне тут левыя і правыя — нібы ў салоне Марылі Верашчакі ў Туганавічах: філарэты і філаматы...

Аднак не ўсе былі такія стрыманыя, як украінец. Князь закрануў нас за жывое. Хацелася спрачацца, біцца, а чалавек дужэйшы, калі стаіць на нагах.

Тым часам Браніслаў працягваў:

— Я ўпэўнены — у нас тры закаранелыя ворагі: украінец, яўрэй і літовец. З беларусамі ў нас мір.

Чатыры пары нашых вачэй спаткаліся. Першым пайшоў у паступленне Шыманскі:

—А чым, напрыклад, украінцы праштрафіліся?

— Але,— падхапіў Яцкевіч.— Чым ты, хахол, дапёк ім гэтак, што яны цябе лічаць ворагам нумар адзін?

— То пан украінец? — жахнулася Дануся.

— Самы сапраўдны.— Шыманскі зухавата расклаў на спінку лавы мясістыя рукі.

Любецкі не ведаў, што казаць.

У генеральшы выпала кніжка. Дама павярнулася і кінула зводдаль:

— Вы забралі ў пас Кіеў і хочаце яшчэ Львоў!

— Пані Вацлава мае рацыю! — апамятаўся Браніслаў.— Гэтыя землі — кавалак нашай гісторыі!

— Так ужо і вашай!

Дануся стаяла побач. Я адчуў, як і яе ўсю падмывае. Яна не вытрымала, дапамагла мачасе:

— А Збараж? А Вішнявецкі?

— Што ваш Збараж? Што Вішнявецкі?!— выбухнуў Шымански. — Кіеў — наша сталіца! А Львоў — пабудаваны нашым князем Данілам у гонар сына Льва!

Я прыстаў да паненкі:

— Цікава, каб хто ў вас забраў Кракаў і хацеў захапіць яшчэ Варшаву, як бы вы да яго аднесліся?

Дануся прыціхла. Генеральша мелася кінуць нешта вострае, але чамусьці не адважылася і аж пачырванела.

— Не ўсім палякам мы ворагі,— аб'явіў Суткус.— Юзэф Шус паваt сябраваў з намі!

— Думаеш, яны ведаюць, хто такі — Шус? — заўважыў Шымански і разваліўся на лаўцы яшчэ больш задзірліва. Тады ён змераў вачыма князя і паказаў на Суткуса:

— Ён — літовец. Цікава, што яму скажаце?

— Літва ў нас Вільню хоча забраць!

— Вільнюс — наша сталіца! — абурыўся Альбінас.— Вы яго трымаеце сілай, бо нас у дзесяць разоў менш, чым палякаў! Настане час, і мы вернем сталіцу!

— І беларусы маўчаць не так сабе! — падступіў я да князя.— Не было выпадку нам гаварыць. Настане і наш дзень, скажам і мы сваё!

Абодва бакі яшчэ мелі аргументы, але раздуваць спрэчку пры жанчынах было няёмка. І ўсе прыціхлі.

— Панове, давайце гаварыць пра што-небудзь іншае! — папрасіла Дануся.

Весці свецкую гутарку было ўжо немагчыма. Заставалася адно — разысціся. Але нас сюды запрасілі. Сабрацца проста і пайсці — не выпадала. Я нерашуча азірнуўся.

Як і раней, драмаў кот, а Гектар клацаў зубамі на мух. Гэтак-сама пякло сонца. Толькі мы пе былі тыя самыя. Хлопцаў аж разрывала ад узбуджэння.

Надзьмутая, як сава, генеральша паспешліва гартала кніжку і ніяк не магла знайсці патрэбную старонку. Дануся роспачліва зыркала на мяне, шукала ратунку. Гэтыя пытанні з ёю мы ўжо даўно абгаварылі. Было яе шкада. Трэба было падаць прыклад і пачаць развітвацца. Ды ўкраінец справакаваў новы выбух.

— Пагутарылі, называецца. А ўсё з-за гэтага яўрэя,— штурхануў ён Яцкевіча.— Зацягнуў нас сюды...

— То пан яўрэй? — здзівілася зноў Дануся.

— Жыд! — гледзячы ёй у вочы, заявіў Яцкевіч.

— ?!

— І вось стаю побач, не кідаюся на вас. Нават адзін вечар выконваў з вамі небяспечную работу на вуліцы Міцкевіча. Памятае паненка?

Генеральша насцярожылася.

— Але ж я не раблю ніякай розніцы паміж нацыямі!..

— Толькі пан Браніслаў і пані Вацлава?

— Уся польская эканоміка — у іхніх руках. Мы павінны змагацца з яўрэямі насмерць! — кінуў князь.— Інакш яны нас задушаць ва ўласнай краіне!

— Пан католік? — спытаўся Яцкевіч.

— Католік.

— І верыць пан у бога? Ваша рэлігія вучыць вас цкаваць адных на другіх?

— Дэмагогія!

Генеральша адвярнулася зноў:

— Жыды замучылі на Галгофе Хрыста!

— Іуда быў яўрэй! — выйшаў з сябе князь.

— Прабачце, а хіба сам Езус Хрыстус не быў жыдам? — спакойна заўважыў Яцкевіч.

— Не па методзе Іуды заманілі вашыя хлапца ў пастку і павесілі? — напаў на генеральшу ўжо я.— Вы ж столькі гадоў былі ў няволі, вас ссылалі, вешалі, чаму ж вешаеце і трымаеце ў няволі вы? Няўжо нічому вас не навучыла гісторыя?

— Счапі-іліся! — з хваляваннем працягнуў князь, які ўжо шукаў прымірэння.— Эх, хлопцы капітальныя — я вам скажу! Шкада, не карпаранты!.. Дарагія, вы не на правільным шляху, пся крэў!.. Ну, даб'ецеся, што адзін горад будзе лічыцца ўжо вашым, а ці пастанеце шчаслівымі?!. Ці будуць шчаслівыя людзі, якім вы гэтага дабіваецеся?.. Адумайцеся!.. Вы — нявольнікі ўмоўнасцей і сваіх сектанцкіх ідэй, якія самі сабе стварылі вы — баптысты, суботнікі!.. Даб'ецеся свайго — і зноў будзе столькі ж нездаволеных!.. Глупства ўсё гэта!.. У майго старога было семнаццаць жонак, сярод іх — сусветныя артысткі!.. Ён мог запрэгчы летам чацвёрку коней у сані і ехаць па дарозе, высыпанай соллю!.. І я шчаслівы, бо магу рабіць што хачу!.. Пся крэў, я ўехаў на кані ў банкетную залу, вы ўехалі б?!.

Нейкая сіла кінула мною на яго з кулакамі:

— Чыім гарбом ты шчаслівы, ты?!. Якой цаной твой бацька быў шчаслівы?!

— Я не згодзен весці гэтак дыспут! — адступіў ён, перапалоханы.

— А я пляваць хацеў на тое, з чым ты згодзен, з чым не!

— Пані Вацлава, я пратэстую! Мая нявеста тут цэлы Камінтэрн сабрала, не хапае толькі негра і кітайца!

— Данка, пана Браніслава абражаюць!..

— Янку! — з папрокам накінулася на мяне Дануся.

Але я яе не паслухаў:

— Ты ўехаў на баль дзеля паненкі?!. А я адбяру ў цябе тваю нявесту, і што ты зробіш?! А ты — што, зноў будзеш вучыць мяне правілам добрага тону і добрых паводзін?!.— прыстаў я ўжо да Данусі.

Больш ужо ніхто і не думаў пра ветлівасць.

— Пагуто-орылі, называецца! — кінуў Шымански, калі мы пакідалі панадворак генерала нібы поле бою.

3

Набліжаўся канец навучальнага года. У мяне на курсах ніякіх экзаменаў у гэтым годзе пе было. З кожным днём я меў усё больш вольнага часу.

Аднаго разу на гары я назбіраў розных чарапкоў і разглядаў іх. Абудзіў ва мне гэтую схільнасць Луцэвіч з музея. Цяпер куды б я ні ішоў, заўсёды ўважліва глядзеў сабе пад ногі і ў кожным кавалачку крэменю бачыў наканечнік стралы, скрэбла, а ў чарапку — рэшткі пасуды продкаў.

Дануся не здала толькі антычную літаратуру і якраз зубрыла Юлія Цэзара. Але вучоба ў той дзень штосьці не лезла ёй у галаву. Гартаючы старонкі, яна нясмела праказала:

— Янку, мамуся ўчора паехала ў Познань да таты...

— Ну?

— На чатыры дні...

— А што мне за бяда?

Увесь час я прыкідваўся, што мне няма ніякай справы ні да яе бацькі, ні да мачахі. І сапраўды, яны мяне не цікавілі. Цяпер жа я выпусціў з рук чарапкі. Калісьці Дануся казала, што на лета збіраецца з маці за граніцу. Праходзілі апошнія нашыя дні, мяне кранула трывога.

— Пан Фелікс — у Новай Вілейцы. Фрося таксама паехала на вёску. Мы засталіся з Гектарам і цёткай Антосяй. Цётка цябе любіць... Ты ёй пагадваеш аднаго хлопца, які загінуў у вайну...— Грудзі яе часта ўздымаліся, нібы ім не хапала чым дыхаць.

Я здагадаўся — хоча запрасіць мяне ў госці. Раптам не хапіла паветра і ў мяне.

— А яшчэ застаўся Браніслаў, чаму яго не лічыш? — упікнуў я, сам не ведаючы навошта — проста мне сказаць так захацелася. Да гэтага часу, бытта згаварыўшыся, мы князя ніколі не ўспаміналі.

— Ты ўсё, Янэк, жартуеш, а я — сур'ёзна...— у Данусі смешна ўздрыганула ніжняя губа.

Я размяк.

Было страшнавата. Але падбадзёрвала ўсведамленне, што хутка паеду дамоў. Атмасфера роднага кута, якой я ўжо дыхаў, дадавала адвагі і незалежнасці. Чаму і не схадзіць? Чаго я ўсяго баюся?.. Што трачу? Добра-то добра, а не, ліха з вамі, паны, завярнуўся і — назад.

4

Ва ўмоўлены час я накіраваўся ў генеральскі дом. Дануся з сяброўкай ужо чакала на парозе, вочы яе казалі: ага, бачыла, які ён у мяне зух?

— Сюды ці не сюды? — замяўся я ля парога.

— Просім! Мы ўгледзелі пана яшчэ на вашым панадворку...

Дзіўна, Дануся яшчэ ніколі так не бянтэжылася, як цяпер, у сваім доме. Я ад гэтага асмялеў.

— Калі ласка, заходзьце! Асцярожна, Лёнгінус, не пабіце галавы!..

Я быў хоць і высокі, але да вушака парадных дзвярэй ледзь даставаў бы і рукой. І ад перасцярогі Данусі стала няёмка, бытта расказаў анекдот чалавек, у вуснах якога ён не гучыць.

— Яніна! — прадставілася гімназістка і какетліва ўскінула на мяне карыя вачаняты.

Мне здалося, што ў дапытлівых яе зрэнках мільганула насмешка. Я нагадаў свой першы выхад на рынг, калі на мяне глядзелі гэтаксама з абразлівай цікаўнасцю. Я быў нездаволены: мы не дамаўляліся, што будзе яшчэ нехта,— на якое ліха тут гэтая фіфачка?!.

Але Дануся не адчувала майго настрою. Яна наогул страціла галаву, таропка кідалася то сюды, то туды. Пакуль я нехлямяжа крочыў па генеральскім калідоры, баючыся, каб не пакаўзнуцца, ад мяне не адставала Яніна Яна залётна ўсміхалася.

— О-ей, прабач, пан! — вінавата ўскрыкнула Дануся, калі я спатыкнуўся аб раскладзены ложак з пакамечанай коўдрай і прасцінай.— Тут начаваў пан Фелікс, і Антося не паспела яшчэ прыбраць. А там спіць Гектар! — яна паказала на сяннік, кінуты на падлогу ў цёмны куток.

Мы зайшлі ў пакой.

У багатай зале кінулася мне ў вочы пакрытая чорным лакам аграмадзіна фартэпіяна. Дануся прапанавала сесці. Я апусціўся на мяккае крэсла і праваліўся аж да зямлі.

— Гу, нібы на купіну моху!— вырвалася ў мяне.

Яніна рассмяялася.

З дзвярэй выйшаў сабака, падышоў да мяне і прыязна паклаў на мае калені пысу.

— Здароў, Гектар! — паляпаў я яго па галаве: мы ўжо даўно былі сябрамі. Цяпер, калі ноччу я перабіраўся цераз сетку ў генералаў садок, сабака з радасці толькі вішчаў.

— О, трэба было бачыць, як наш Гектар сёння чорнага ката загнаў на яблыню! — успомніла Дануся.

— Не чорнага, а — шэрага! — паправіла яе гімназістка сур'ёзна.

Часамі ўбачыш першы раз чалавека, ён табе спадабаецца, і ты ўжо гатовы ў яго нават закахацца. Але вось ён зрабіў толькі адзіны рух або прамовіў адну фразу, і ты яго адразу ж перастаеш заўважаць. Пасля гэтых слоў так я расчараваўся ў Яніне.

— Давайце сыграю вам Шапэна, калегі! — запрапанавала Дануся.

Далей у мяне атрымалася зусім не так, як паказваюць у фільмах або пішуць у раманах, калі дзяўчына пакарае хлопца сваей музыкай.

Спачатку мне было цікава глядзець, як яна перабірае клавішы і націскае на педалі. Дануся ўся аддалася ігры. Я заўважыў нават, як у суладнасці з рухамі ног і рук у яе хадзіў падбародак, затрымлівалася дыханне. Нібы шафёр за рулём!.. Ды мне, як кажуць, ад роду мядзведзь наступіў на вуха. Як і тады, на канцэрце ў тэатры, я ўжо, здаецца, злавіў мелодыю, пачаў за ёю сачыць, але яна нечакана распалася, і я засумаваў.

Раптам пачаў успамінаць, што ж такое мне снілася сёння? Ага! Бытта я дома. Вечарам жану з лесу кароў. Рагулі важныя, тоўстыя, за лета набралі цела, і мяне з імі звязвае інтымтая цяплыня, ад узаемнага здавальнення — гэта я ім знайшоў і даў пасыціцца ўволю пахучымі травамі, кветкамі, і гэта яны далі мне адчуць прыемнасць ад карысці, прынесенай мной няўклюдным рагатым істотам, бацькам, людзям. Маці пачала кароў даіць. Пахне свежым малаком ды цёплым і родным дыханнем жывёлы. Падаіўшы, яна мяне кліча: «Яначка, ідзі пазрывай у Красулі кляшчоў з жывата!..» Я падыходжу, а ля каровы ўжо сядзіць Станеўскі з падручнікамі — як звычайна, яны свежанькія, новыя!.. І трэба ж так — цэлы дзень намагаўся ўспомніць сон, ды толькі цяпер удалося...

Нагадаў зноў, што хутка паеду дамоў. На душы зрабілася весела і свабодна. Паглядзеў на кватэру генерала з пункту гледжання вяскоўца.

Садоўнік спіць разам з сабакам, а Данудя лічыць гэта зусім натуральным. Барства? Наіўнасць?.. І ў бога верыць...

Якая мне справа да гэтых паненачак? Што ў мяне агульнага з імі?!.

Я выпрастаўся і пашукаў вачыма Яніну.

Яна ўзлезла каленьмі на крэсла, усперлася локцямі на стол, а на кулакі паклала галаву. Сукенка яе мела вялікі выраз на грудзях. Паненка са здавальненнем зіркнула сабе на грудзі і сустрэлася са мной позіркам. Мне стала сорамна, як тады, калі ўгледзеў дачку пана Матыкі ў расхлыстаным халаце. Мяне заліла чырвань, а Яніна так усміхнулася, што я не ведаў, як разумець яе, і адвярнуў галаву.

Навокал было многа прадметаў, якія бачыў я ўпершыню.

Вось бліскучае і сакавітае лісце фікуса. Нібы ракіта. Толькі ліст большы. Ды ракіта гнуткая, жывая, а гэтая расліна сонная, рыхлая, адным словам — панская.

Тады мяне зацікавіла падлога. Яна блішчала, што люстра. Я дакрануўся пальцамі — вашчаная!

Яніна пырснула смехам.

Я перанёс позірк на шафу. Няўжо можа быць такая шырозная і сучкастая бярозавая дошка? Расце ж дзесьці гэткая бярэзіна, глядзі ж ты!..

Я ўстаў, падышоў да шафы, скрыпнуў пальцам па лакіраванай сценцы, паспрабаваў яе пазногцем. Цвёрдая, зараза, як з пластмасы!..

Яніна засмяялася зноў.

«Фінціклюшкі шляхоцкія!— пачало мяне разбіраць.— Як адгэтуль пайсці: пасварыцца з імі ці так?..»

— Я магу зразумець мастака, магу зразумець пісьменніка, як ён піша кніжкі,— раптам сказала Данудя, скончыўшы ігру.— Але як кампазітары ствараюць такую цудоўную музыку?.. Відаць, для гэтага трэба быць чарадзеем... О-ей, а чаго вы злуецеся?

У вачах яе было столькі просьбы, што я абмяк.

Данудя ўжо авалодала сабой і працягвала ролю гаспадыні.

— Ведаеце, калегі, а цётка Антося жыве ў нас пятнаццаць год, ды так і не навучылася вымаўляць слова «фартэпіяна». Кажа яго пасвойму — «партафяна»!

Але я не засмяяўся.

— Гэта мая скрыначка! — убачыла яна, што я бяру з тумбачкі карабок са слановай косці.— Тата прывёз з Японіі, калі працаваў там

у аташэ. Праўда, прыгожая? Сюды яшчэ клала каляровыя паперкі ад цукерак... Янэчак, будзем зараз абедаць! Займіся чым-небудзь сам, а мы тым часам пойдзем на кухню гаспадарыць!

5

Застаўся я адзін і падумаў, што вось тут часта бывае пані Бацянская — жонка таго ваяводы, імя якога ведае кожны мужык маёй вёскі!.. Расхаджваюць тут генералы!.. Куды мяне занесла? Год таму назад хіба я сніў аб такім?..

Тут недзе выседжвае час і Браніслаў ды пазірае ласымі вачыма, як перад ім ходзіць генералава дачка!

Дануся ні разу не прапусціла сустрэчы са мной. Аднак у той жа час яна па-ранейшаму лічылася нявестай Любецкага, пра гэта ведала нават мая гаспадыня. Тады ж хто я такі? Хлапец для забавы?.. І Любецкі не можа не ведаць пра нашыя спатканні з Данусяй!.. На вёсцы, калі нявеста пойдзе з другім хлопцам, жаніх дасць ёй па мордзе і больш з ёй гаварыць нават не захоча!.. Іншая жонка няхай толькі гляне на чужога мужчыну!.. А сярод гэтага панства, кажуць, лічыцца шыкам мець палюбоўніка, і пра іх ведаюць мужыкі, жаніхі, ды робяць выгляд, што нічога не адбываецца, цьфу!..

Мяне апанавала злосць.

Каб супакоіцца, я зазірнуў у суседні пакой. За шклом — кніжкі ў скураных пераплётах. Ля масіўнага стала — крэсла, абабітае цёмнай скурай. На сцяне — «круцыфікс»[1].

Генералаў кабінет!

Я ўвайшоў у пакой і спыніўся ля шафы з масіўнымі тамамі. Чамусьці старэнькія томікі з бібліятэкі беларускага музея прыцягвалі да сябе больш, так і хацелася гартаць іхнія пажоўклыя старонкі, упівацца вачыма ў старажытныя шрыфты, адчуваць сябе Калумбам. Гэтыя — у пышных пераплётах — выклікалі толькі павагу, нібы генеральша, калі крочыць у касцёл!

Адчыніў я шафу і пачаў перабіраць кніжкі.

У чырвоным каленкоры — дзесяць тамоў Юзэфа Пілсудскага. Пра што ён мог аж столькі напісаць?.. Пагартаў першы том. Копія заявы ў Харкаўскі універсітэт з просьбай прыняць на факультэт медыцыны. Гм... Пілсудскі — медык?.. Далей — стэнаграма пецярбургскага суда ад 29/IУ 1887 года. О-го! Юзэфа з яго братам Браніславам судзілі за спробу забіць цара!..

1 Крыж (лац.).

Вось як я ведаў сваіх ворагаў! — Уражаны, паставіў я кніжкі.

У суседнім пакойчыку кінуліся ў вочы іконы. На адной з іх маці божая з адкрытым сэрцам на грудзях. Сінія і ружовыя фігуркі маткі боскай стаялі на падстаўках, Тут, відаць, моліцца генеральша. Ад пакоя павеяла касцёлам.

Агледзеўшы ўсё, я пачаў сумаваць.

На дварэ загрымела, збіралася на дождж. Успомнілася вуліца маёй вёскі пасля навальніцы. Цёпла і парна. Хмары яшчэ не разышліся, і таму змрочна. Прыемна хіліць да сну. За платамі заблытаныя дажджом і набрынялыя гронкі бэзавых кветак. На панадворках — хвалістыя лініі з трэсачак і кары — межы, дзе зусім нядаўна стаялі лужы. Уся прырода, напіўшыся дажджу, нібы ап'янела. Цішыня. Толькі жаласліва мэкае мокрае цяля, якое людзі забыліся адвязаць і ўпусціць у хлеў... А тут — смярдзючы горад, халодная кватэра генерала!..

Уцячы?..

Я ўсадзіў рукі ў кішэні і шалёна засвістаў, падрыгваючы нагой у калене. Мне і свістаць не хацелася, але рабіў гэта таму, што здавалася, бытта гэтак рабіў бы той, з каго я браў цяпер прыклад.

— Янэчку, каханы! — выскачыўшы з кухні, палымяна зашаптала Дануся і павісла ў мяне на шыі.

Зноў я размяк. Нацалаваўшыся да ап'янення, паставіў яе на падлогу.

— Будзь разумны,— узмалілася,— я цябе вельмі прашу, не крыўдзь Янусі...

— Ого, так і пакрыўдзіш гэтую цытру!

— Пацярпі! — горача зашаптала яна.— Тата выбраў мне яе ў сяброўкі яшчэ з першага класа гімназіі. Яна ведала ўсе мае сакрэты. Калі ішла да цябе на спатканне, дома казала, іду да Яніны, а яна потым пацвярджала... Мы ёй абавязаны... Будзеш разумны, праўда? Не задзірайся!

— Што з вамі зробіш!.. А ты добранькая таксама! Пакінула тут аднаго з іконамі і Пілсудскім...

— То ходзь да нас, мілы, будзеш дапамагаць! — пераконвала яна прыгожай інтанацыяй польскай мовы, якой, на жаль, нельга перадаць.— І цётку Антосю знарок адпусціла дадому, і пана Фелікса паслала ў Новую Вілейку — усё для цябе, дарагі!

— Толькі яшчэ раз засмяецца — і тады няхай злуе на сябе!

— Ну, ну, супакойся, вазьмі сябе ў рукі!..

6

На кухні ўсё выглядала так, бытта дзве дзяўчынкі, абвязаўшыся фартухамі, гулялі ў гаспадынь, маючы багатыя харчы. Няўмела адкрывалі яны банкі, ставілі на стол талеркі, запэцканыя ў муку, хадзілі ля пліты, перакульвалі каструлі...

— Мужчына, рэзаць хлеб! — з робленай весялосцю загадала Дануся. Яна была паміж двух агнёў, але і ў яе пачаў прабівацца на сяброўку гнеў.

Я ўзяўся за нож. У мяне атрымаліся тоўстыя лусты. Убачыўшы іх, Яніна, вядома, не стрымалася, зноў пырснула смехам. Наогул яна тут прысутнічала нібы для таго толькі, каб заўважаць мае памылкі. Ад яе вачэй я не ведаў, куды падзець рукі, як паставіць нагу. З-за яе і маўчаў, бо баяўся нарабіць памылак у польскай мове і паказацца смешным.

Абрэзаў бы я паненку даўно, ды яна не прапускала моманту ўсміхацца да мяне, бліскаць зубкамі. А найлепш было б наогул не звяртаць на яе ўвагі: сапраўды, хацеў я таго ці не, але я так сябе паводзіў, што было з-за чаго смяяцца. Аднак тады я сам шукаў зачэпкі.

Селі мы за стол.

У нас дома ежу клалі ў місы як папала. Паненкі ж расклалі на талеркі сыр, каўбасу, селядзец мудрагелістымі ўзорамі, ды такімі прыгожымі, нібы іх мералі цыркулем і лінейкай. Шкада было нават разбураць гэтую прыгажосць.

— На гэта толькі трэба глядзець, а не есці! — дзівіўся я.

Яніна пырснула.

— Усё тут для цябе, не сумнявайся! — Дануся першы раз сказала мне перад Янінай «ты».

— Адкрывай! — падала яна штопар і бутэльку віна.

Я нязграбна дастаў корак, разліў ружовую вадкасць.

— Ну, на здароўе... За цябе! — узняла яна чарку.

Яе вочы засвяціліся ласкай і адданасцю. Каб не паказаць Яніне, як мяне гэта кранула, я свае вочы апусціў.

— Янэк, ты першы!

— Я не п'ю.

— Не п'е-еш?

— Не!

— Зусім?

— Ні кроплі.

Яніна пырснула.

У той час падпольшчыкі давалі сабе клятву ні ў якім выпадку не піць гарэлкі і не курыць. Клятву ўзялі і з мяне.

— Хоць крыху! — не адставала Дануся.

Па яе інтанацыі я адчуў, што такая якасць яшчэ больш узняла мяне ў вачах паненкі.

— Віно, кажуць, мазгі выбівае!.. Нават кроплі ў рот не вазьму гэтай атруты, не прасі!

Дануся не ведала, што рабіць.

— Не звяртайце на мяне ўвагі, піце самі. Няхай вам будзе на здароўе!

Яніна паднесла чарку да вуснаў, але на яе строга глянула Дануся, і паненка папярхнулася. Паставілі чаркі.

— То еш!

— О, гэту работу люблю, і жывот у мяне ўмяшчальны, будзь спакойная! — пачаў я выграбаць з талерак.

Яніна зноў пырснула.

З кніжак я ведаў, што багачы ў абед карыстаюцца сурвэткамі. Калі ж над руку трапіла накрухмаленая палатніна, я яе паклаў на буфет.

— Няхай ляжыць, будзеш выціраццa, Ясю!— заўважыла Дануся.

— Хіба я грудное дзіця і пачну тут бурбалкі пускаць?!. А, правіла добрага тону, прабач!..

Яніна на гэты раз ад смеху аж зайшлася. Ну, з мяне хопіць!.. Я ўскочыў з-за стала. Узнялася і Дануся.

— Не падабаецца табе? Не затрымліваю, можаш ісці! — заявіла яна, абураная, і паказала сяброўцы на дзверы; вочы яе блішчалі гневам.

— Дурніца! — захлынаючыся, здолела толькі выціснуць з сябе і пакацілася да выхада Яніна.

— Я табе гэтага ніколі не дарую! — кінула Дануся наўздагон сяброўцы і папрасіла мяне: — Еш, Янусь, калі ласка, не звяртай увагі, прашу!..

7

Але я ўжо больш не сеў. Раздражнёныя, выйшлі мы ў залу.

— Ну вось, нарэшце мы і адны!..— паспрабавала мяне развесяліць Дануся.— Я яе прагнала, ты здаволены?.. Панасі мяне на руках, Янэк... І сцісні моцна-моцна, як на гары, каб аж косці затрашчалі і дыхаць не было чым! О, як я люблю гэтыя ўладарныя рукі! Якія яны мне родныя!.. Яны ў цябе як з жалеза... Скажы, ты мяне кахаеш? Ну, гавары: слёзка мая...

На фартэпіяпа ў рамцы стаяла яго фатаграфія з Любецкім.

— Прасі князя, няхай носіць, рукі яго дарагім мылам пахнуць! — буркнуў я, успамінаючы спачувальную інтанацыю, з якой яна гаварыла «еш, Янусь!».— І няхай ён прызнаецца табе ў каханні! — кінуў я на фота.— Любецкі ўмее гэта рабіць куды лепш за мужыка!

— Ага, нездаволены, што прагнала яе? — успыхнула Данута.— Бачыла, як на яе пазіраў, як рысаваўся!

— Я рысаваўся?

— А то не? Нават какетнічаў!

— Я какетнічаў?

— А тады са студэнткай над Віліяй? Думаеш, дурная, нічога не бачу?

Расчырванелая і злосная, Данися цяпер чамусьці нагадвала раз'юшаную кошку. Нешта прыгожае было ў яе гневе. Але пра гэта я ўспомніў потым.

— Ты што, ачумела? — не знаходзіў я слоў.

— Янэк, я, мажліва, і праўда ачумела, сказала глупства. Але ж гэтак далей нельга! Ты заўсёды такі грубы, няўважлівы... Узяў мяне лістоўкі разносіць, а пры сябрах сваіх не адважыўся падысці нават... Добра — іншыя зжаліліся, падабралі мяне!.. З-за цябе я столькі цярплю кожны дзень, кожную гадзіну, а ты гэтага нават не хочаш заўважаць...

— З-за мяне?

— З-за цябе!

— Гэта ты з-за мяне церпіш?

— Спецыяльна выправадзіла ўсіх з дому, каб ты лепш сябе адчуваў...

— Выправадзіла? Бо баялася, што цябе хто ўбачыць са мной. А вечарам, пры людзях, пойдзеш у тэатр з Любецкім!

— Ты несправядлівы! Я з ім нават...

— Ну?

— Я для цябе...

— Што ты для мяне? Ага, няма чаго і сказаць? У кіно днём і то баішся ісці!

Відаць, рэдка не памыляецца той, хто зробіць важны крок у сваім жыцці ў парыве злосці. І ў мяне тады злосць затуманіла мазгі. Я раптам убачыў і адчуў яшчэ раз усю ганьбу, якую перанёс у Вільні, і звязаў гэта з генералам і яго сям'ёй.

— Вы нават за чалавека мяне не лічыце! — закрычаў я.— Хто я для вас? Скажы, хто?!.

— Няпраўда...— У голасе Данусі пачуліся слёзы.— Ты не маеш права на мяне так гаварыць!

www.kamunikat.org

— Мо не, скажаш?

— Не!

— Не?

З кухні выйшаў белы і пушысты кот. Ён, як нічога но было, пытальным знакам выгнуў хрыбет, ляніва пацягнуўся, грэбнуў кіпцюрамі паркет, пазяхнуў ружовенькім роцікам, паставіў хвост трубой і накіраваўся да мяне.

— Мурэк! — пазвала яго Дануся і нагнулася, каб схаваць слёзы.

Кот прамурлыкаў.

— Бедны Мурэк, змок увесь на дажджы...

Мяне апанаваў новы прыступ злосці.

— А-га? Няма чаго больш сказаць? Хто я для цябе? Я скажу, калі маўчыш! Я для цябе — забава! Бы гэты кот!

І я з усяе сілы ўдарыў яго нагой.

— Вя-аў! — прарэзліва віскнуў ён у паветры, грымнуўся аб сцяну, а пасля куляй сігануў пад шафу.

— Грубіян! — пачырванела ад абурэння Дануся і кінулася да шафы.— Што ты нарабіў, дзікун?!

Мяне гэта раззлавала яшчэ больш. Я зноў гнеўна загаварыў. Гаварыў на вясковы манер, не думаючы, што могуць пачуць суседзі, махаў кулакамі:

— Ды ідзі ты, урэшце, к чортавай мацеры са сваімі Янінамі, Любецкімі, Станеўскімі, буржуйка ты няшчасная! Гуляй тут са сваімі сабакамі, катамі, лялькамі! Або едзь у сваю Швейцарыю, там цябе чакаюць такія ж самыя!

І выбег на двор.

8

У наступны дзень, калі я вярнуўся з горада, гаспадыня з таямнічым выразам твару паведаміла:

— А ў вас былі госці і штосьці пакінулі!.. Я агледзеў пакой, але нічога не знайшоў.

— Пад падушкай! — падказала яна.

Я прыпадняў падушку. Там ляжаў доўгі карабок з шакаладам. На шаўковай істужцы блішчала сярэбраная лічба «19» і мае ініцыялы. Тады толькі я ўспомніў, што сёння дзень майго нараджэння. У той час у маёй вёсцы дзень нараджэння ніхто не адзначаў. Нават не было такой звычкі памятаць, калі ты нарадзіўся.

Здзіўлены, я пастаяў, падумаў. Потым узяў падарунак пад паху і пайшоў на двор.

Якраз у гэты момант да генералавых дзвярэй набліжаліся Браніслаў і ксёндз, які некалі частаваў мяне слівай. Дануся трымала Гектара за аброжу і какетліва казала:

— Прашу, праходзьце, ён не ўкусіць!

— Калі ласка, айцец Валенты! — ветліва прапускаў Браніслаў госця ў чорнай сутане, нібы быў тут гаспадаром.

Дануся, упэўніўшыся, што я на яе гляджу, адпусціла сабаку, пабегла да Брэніслава і, як мне здалося, радасна праказала:

— Дзень добры, пане Бронэк!

Я вярнуўся на кватэру.

— Вось і ўсё!— вымавіў я, цяжка ўздыхаючы. Азірнуўся навокал і ўпершыню ўбачыў, што мутна-зялёныя абоі на сценах з нейкімі тлустымі плямамі. Бр-р-р, якія агідныя!.. І як я тут жыў амаль цэлы год! Паўслухаўся. На кухні абедалі. Дзяўчынка карміла брата і павучала:

— Чаму ты бульбу не абіраеш? З лушпайкамі толькі некалі дзікуны елі!

— Ы-ы-ых!— са здзіўленнем уцягнуў у сябе паветра малы, робячы для сябе адкрыццё.— Тады хлеб людзі будуць есці калісь без скарынкі, так?!.

— Не выдумвай, дурань!..

Малы з захапленнем ужо казаў:

— А малако хало-однае, хало-однае, ну, проста нібы з-пад каровы! На, ты адно паспрабуй, Валя!

— Ну і няхай, а ты еш!

Тут нешта стукнула, палілося, і дзяўчынка закрычала зноў:

— О, разліў ужо! Выліжы, а то маме скажу!

— Выліжу, Валечка! — вінавата і пакорна паабяцаў хлопчык.

Пачулася сапенне, потым старраннае сёрбанне. Праз хвіліну сястра накінулася на брата зноў:

— Ты што бульбу раскідаеш?

— Яна не ўпала, Валечка. Я затрымаў яе нагамі. Во, глядзі, калі не верыш...

Бедныя, нават не ведаюць, што малако з-пад каровы якраз цёплае, а старую жанчыну прызвычаіліся называць мамай!..

Калі, бывала, яны садзіліся сям'ёй абедаць, прачка ніколі не брала ў рот цэлага кавалка хлеба. Ела толькі недаедкі. Распускала тлушч на страву, вылівала яго да кроплі дзецям у талеркі, а сабе налівала супу ў пустую патэльню — ёй даставаўся толькі пах ад тлушчу!..

Я ўстаў, пайшоў на кухню і аддаў дзецям каробку з шакаладам.

Назаўтра цётка Антося прынесла мне пісьмо.

— Бярыце...

— Не вазьму!

— А то чаму? — спалохалася жанчына.— Вы ж не можаце жыць адно без аднаго!

— Хто гэта вы?

Антося глядзела на мяне з жахам.

— Яначка, чаго ж ты так?

— Было, ды сплыло!

— Чаму?

— Індык свінні не таварыш!.. Адным словам, нясеце, цётко, назад!

Праз хвіліну я ўжо адумаўся: Дануся ні ў чым не вінавата. Гэта я ў апоншi час стаў нястрыманым эгаістам. Але самалюбства не дазволіла паклікаць цётку назад.

Ролю абражанага цяпер трэба было іграць да канца.

Заставаўся яшчэ генеральскі кольт. Чамусьці да яго я не мог прызвычаіцца, як да падзёўбанага ржой Сцяпанавага нагана. Я загарнуў яго ў паперу і выйшаў на двор. Дзесьці ў душы таілася надзея, што рэвальвер — апошняя магчымасць пагаварыць і памірыцца з Данусяй. Але генералаў панадворак быў пусты.

Ля Залкіндавага дома старая ганялася за дзяўчынкай і прымушала ўнучку скінуць школьную форму. Калі Бэта засталася адна, я паклікаў яе да сеткі.

— Аднясі Янкоўскай Дануце! Зараз жа!

— А што тут?

— Не твая справа!

Папера разгарнулася, і ў вялікіх вішнёвых вачах дзяўчынкі з'явіўся жах.

— Нясі! — загадаў я.

— А ён не выстраліць?..

— Не бойся!

9

Надышоў дзень майго ад'езду.

Я доўга хадзіў па горадзе сам не свой і ўжо шкадаваў, што з-за празмернай крыўдлівасці і нейкай упартасці пасправачаўся з такім блізкім мне і дарагім чалавекам у Вільні. Навошта, хамут, ж пакрыўдзіў? Недзе, бедная, месца сабе не знаходзіць!..

Я выйшаў з дому з падзеяй на шчаслівы выпадак.

Прайшоўся ля Данусінага дома. Як на тое на панадворку — ні душы. Толькі ў зацененых дзікім вінаградам вокнах лёгка варушыліся

гардзіны ды ля брамкі сядзеў пушысты кот. Убачыўшы мяне, ён раптам устрапянуўся і так хутка скочыў у кусты, нібы ў паветры хто правёў белую рысачку. Ва мне абудзіліся ўчарашнія крыўды.

«Няма чаго шкадаваць і мучыць сябе, трэба раз і назаўсёды адрэзаць і выкінуць усё з галавы ды збірацца дадому!»

Я рашуча накіраваўся ў краму. За апошнія грошы купіў падарунак маці — дошку для мыцця бялізны з гафрыраванай бляхі ў драўлянай рамцы.

Вяртаючыся з пакупкай дадому, я спаткаў Данусю з Любецкім. Калі ўбачыў яе з князем, ахвота закрануць паненку адпала адразу. Дануся зусім не нагадвала чалавека, які перажывае. Яна ўся аж квітнела, а я, дурань, бедаваў, што памірае з-за мяне...

Вось табе і на!

Зрабілася няёмка за сваю вопратку і за дошку пад пахай...- Мільганула зноў перад вачыма крапіва пад плотам, сярод панадворка — разбітая калодка з сякерай, заткнёнае анучай акенца хлеўчука... Ва мне ўжо загаварыла гордасць. Мінаючы пару, я нават не глянуў на Данусю. Мы параўняліся, і паненка голасна і паспешліва загаварыла, засмяялася.

Смейся, ліха цябе бяры, калі так табе весела!..

На вузенькай вулачцы я яшчэ раз сустрэў гэтую пару — нечакана апынуўся ў іх ззаду. У Браніслава з-пад маленькай кепкі звісаў лісіны хвост — адзнака, што Любецкі правінаваціўся ў нечым. Мо вызваўся выпіць літр гарэлкі, ды ад другой шклянкі зваліўся пад стол, а мо збрахаў не дастаткова гладка!.. Я падкраўся да пары і пачаў прыслухоўвацца.

— Ой, і забіяка я быў у школе, панно Данутo! — хваліўся князь.— Пабачыла б мяне тады паненка! Нядаўна я наведаў прафесарку, пані Перагут...

— З гімназіі Элізы Ажэшковай? Яшчэ майго тату гэтая пані вучыла!

— О, цікава!.. Яна была ласкавая паказаць свае запіскі з таго часу. На кожнага з нас у спецыяльным сшытку пані Перагут заводзіла па старонцы. Пра мяне там напісана так: «І клас гімназіі. Кінуў яблык у прахожага і разбіў яму акуляры. IV клас гімназіі. Сеў у фаэтон, праехаў і не заплаціў фурману. VIII клас. Учора на Гандлёвай вуліцы спаткала Любецкага з маноклем у воку і ён са мной не павітаўся...» Эвалюцыя, не? Ха-ха-ха-ха!

Дануся таксама рассмяялася, але няшчыра, нервова. Я зразумеў яшчэ раней, што дзяўчына адчувае на сабе мой позірк. Інтымная размова з князем — дэманстрацыя.

Ліха вас бяры, радуйцеся сабой! — сказаў я сам сабе і ад іх адстаў.

Каб скараціць сабе час да раніцы, калі ішоў мой поезд, я крыху пахадзіў па горадзе. Засмечаныя тратуары без зялёных прысадаў наводзілі сум. Лета. На вёсцы зараз мужчыны не маюць часу лоб выцерці, жанчыны — накарміць дзіця. А тут усе млеюць ад ляноты. Эх, паперці бы іх на касьбу або на торф... Зрэшты, і я колькі часу блытаюся як гультай!..

Горад ужо так прыеўся, што я нават у твар пазнаваў некаторых гараджан. Я сябе ўгаварыў, што тут усё мне абрыдла, хочацца вельмі на чыстае паветра, да сваіх людзей, да працы, каб не адчуваць ні рук, ні ног. Аднак усё гэта было ва мне павярхоўнае.

10

Набліжаючыся да дома, убачыў я ля варот Янкоўскіх машыну з ад'ютантам і адразу пра ўсё забыў. «Значыць, вярнуўся яе бацька?!» — з жахам падумаў я, перамахнуў металічную сетку, забраўся ў бэз ды стаіўся пад акном.

— ...Дзе Данка, чаму ты не цікавішся дачкой, чаму ты такі раўнадушны да дзіцяці?— чуваць было выразна, як гаворыць генеральша.

— Дарагая, пакінь яе ў спакоі, за ёю паглядзіць Антося! — супакойваў яе муж.— Раніцой вернемся, і ўсё будзе ў парадку!

Я ўвесь ператварыўся ў слых,

— Пані Вацлава, гэта было ў бялізне! — пачуўся ўжо голас маладой служанкі.— Афішка!

— Учора ў паштовай скрынцы ляжалі!..

— Ну і што?

— Хуліганы! — выбухнула генеральша.— Страляць іх трэба! Божа, калі ў Польшчы забароняць гэтую свабоду?!.

— Нічога, нічога, Вацця, тут пішуць пра Гітлера!.. І маюць рацыю!

— То няхай сабе пішуць!

— Ён падцягвае войскі к «калідору» з танкамі, а мы супроць іх трымаем там кавалерыю з пікамі, усё тут напісана правільна!.. Замест таго каб прадухіліць катастрофу, чым мы занімаемся? Раутамі!..

— Не задзірайся з імі, чуеш? Гэта к дабру не прывядзе! Хоча Гітлер нашае Балтыйскае ўзбярэжжа і няхай бярэ! Якую карысць ад Балтыкі мае польскі народ?

— Вя-лі-ікую!..

— Больш двух тыдняў на ёй не высѐдзіш, такая халадзіна! Забярыце лепш у бальшавікоў доступ к Чорнаму мору, там цяпло, кіпарысы, дыні!..

— Ха-ха-ха!

— Езус Хрыстус, гэтыя хваляванні разрываюць мне сэрца на кавалкі, яшчэ і палітыкай занімайся!..

— Дарагая, мы на грані вайны!

— Ну і што? Генералаў пад кулі хіба пасылаюць? І мяне не палохай, я перажыла ўжо адну вайну! Увойдуць у моду зноў высокія боты са шнуравадламі ды — во такія! — вайсковыя шапачкі! Яны мне да твару, а ног сваіх не маю чаго саромецца, хай перажывае жонка ваяводы — яны ў яе як у сланіхі!.. Бачыце, я памаладзела, бо прымаю масажыстку, а без яе бытта я — старая!.. Паручнік Казакевіч кіне — пабяжыш яшчэ і ты да масажысткі!..

Чуваць было, як у пакой эпергічна ўваходзіць ад'ютант і гаворыць:

— Пане гэнэрале, машына падана!

— Дзякуй, Куба, зараз мы з'явімся!

— Слухам!..

Зноў азвалася гонеральша:

— Антося, вернецца дзіця, накармі!

— Добра, ласкавая пані!

— Эрмітэй няхай адпрасуе ўсё, што ў Швейцарыю бярэм!

— Адпрасуе, ласкавая пані!

— Прасачы за ёй, Эрмітэй нічога не ўмее рабіць!

— Прасачу, ласкавая пані!

— Ды закрывай на ноч вокны, а дзверы — на засаўку!

— Закрыю, ласкавая пані!

— Гектара прывяжы на верандзе!..

— Прывяжу, ласкавая пані!

— Не трэба так на яе крычаць, гэтая дзеўка — бяскрыўдная істота! — заўважыў муж.

— Мяне бы так пашкадаваў! — выбухнула жонка зноў.— Што ў цябе за выгляд?! Забыўся, што ідзём на баль да ваяводы, дзе будзе румынскі прынц? На, шаблю пачапі!..

— Яшчэ і гэтае свінства? — бараніўся генерал.— До яснай холеры!.. Адслужылі свае шаблі і эпалеты!

— Рэспублік усюды нарабілі!.. Пры манархіях прынамсі цырымоніі былі! Не разумееце, як самі сябе абкрадваеце!

— Во-во. Некаторыя прэзідэнты і зараз уводзяць прыдворны этыкет!..

Вярнуўся я на кватэру і ў сенях пачаў разбіраць скрынкі ад пасылак, каб фанеру завезці дамоў. Фанерныя квадраты былі падзіраўленыя цвікамі, спісаныя хімічным алоўкам і больш для пасылак не падыходзілі. Але пакінуць іх тут са слядамі бацькавых каракуль я не мог. Заняты справай, я ўспамінаў кожную, падслуханую ў генералавым доме, фразу ды ўсё ківаў галавой, а час цягнуўся вельмі памалу. Вестка пра тое, што хтосьці разносіць лістоўкі, прыглушыла раптам ва мне жаданне ад'язджаць.

Мяне ўжо падмывала пабегчы ў горад і пашукаць хлопцаў...

Міжволі давялося падслухаць яшчэ адзін дыялог.

Выйшла на ганак ды прысела на прыступкі мая гаспадыня. Да сеткі з другога боку падышла Антося з тазікам, пачала развешваць бялізну. З сяней мне выразна было чуваць іхнюю размову.

— Дзень добры, суседачка! — павіталася мая гаспадыня.— Чулі? У горадзе людзі ў запас купляюць соль, газу, цукар!.. Кажуць, вайна хутка пачнецца!..

— Езус Марыя!..— з глыбіні падворка адказала ёй служанка.— Што ж, грашылі людзі, грашылі і даграшыліся! Нельга без канца паспытваць цярпенне боскае!

— Пачнецца катавасія, чым я дзяцей карміць буду, куды я іх дзену?!

— Хоць жывым у яму лезь!

— Яшчэ, кажуць, немец пускае бомбы проста на дамы!..

— Ад іхінх цыпілінаў і ў тую вайну не было ратунку!

— Памятаю!..

— ...То на гэтую невядома што яны нарыхтавалі...

— А бомбы, кажуць, ён пускае найсамперш туды, дзе генералы жывуць!

— Ну,— згадзілася Антося і з гэтым.— Генерал для іх — чалавек не просты!..

— То ўся вуліца ганарылася, што на ёй стаіць генеральскі дом, то цяпер лаяць усе яго будуць!..

— Людзям не дагодзіш, пані.

— Людзі такія!

— Усё, суседачка, у волі боскай! Нам трэба ўсім маліць багародзіцу!

— Праўда, пані Антося!.. Хай нас крые найсвяцейшая мацер божая з Вострай Брамы!

— Амін.

11

Пачало цямнець, і ў генералаву альтанку накіраваліся гепераль-ша, Дануся, панічы і паненкі. У цішы чэрвеньскага вечара доўга былі чуваць бестурботны смех, песні, нават — апладысменты, як у тэатры. Я стаіўся на ганку і слухаў.

Галасней за ўсіх гаварыла Дануся, і я ўпіваўся яе голасам, інтанацыяй.

Зрабілася шкада, што нельга нічога вярнуць, прынамсі да наступнага навучальнага года.

Генеральша, мабыць, прыехала забіраць дачку за граніцу...

Усе прасілі Браніслава пра нешта расказаць. Ён крыху паламаўся і пачаў:

— У нашай сямейнай хроніцы запісана, што ў 1768 годзе, калі да майго прапрадзеда ў замак пад Лодзь прыехаў на вялікдзень князь Сапега са світай, на балі было з'едзена сорак валоў, дзвесце пяцьдзесят цялят, сорак бараноў, дзвесце свіней, васемнаццаць тысяч курэй, дваццаць тысяч рыб, пятнаццаць корцаў ракаў. А венгрына выпілі столькі бочак, колькі дзён у годзе, а кварт мёду — колькі гадзін у годзе...

— О Езус Марыя, куды гэта дзявалася ў іх!

— Нашыя продкі мелі па тры страўнікі!

— Абжорамі былі!

— Хіба што!

«Нягоднікі.

Рамантыку бачыце ў колькасці прыслугі, у этыкетах, цырымоніях, балях... Дзеля яе можаце кідаць тысячы на карты, гонар... Забываеце, што за гэтымі злотымі, корцамі, баранамі — людзі, якія хварэлі, іх здабываючы, паміралі нават...

Ведаем такіх рамантыкаў!»

Бестурботная весялосць панства пачала мяне раздражняць. Захацелася выкінуць які-небудзь фокус. Я нават падняў кій, каб запусціць ім у жалезную бочку ад генералавага душа, але перадумаў — кій можа адскочыць ад бочкі і трапіць каму ў галаву, яшчэ давядзецца справу мець з паліцыяй!

Ля ганка рос ясень. З'явілася жаданне залезці на дрэва. І я палез.

Магчыма, гэта было звычайнае блазенства, і калі я цяпер успамінаю, мне робіцца сорамна. А мо я зрабіў гэта, каб толькі звярнуць на сябе ўвагу Данусі?..

Я залез аж да тонкіх галінак і стаіўся. У альтанцы гаманілі і на мяне, дзівака, не звярталі ніякай увагі. Тады, гойдаючыся ў такт песні, пачаў я спяваць першае, што ўзбрыло ў галаву:

Стуку, груку, дзверцы,
Едуць кавалерцы!
А сучачка — цях-цях-цях!
А сардэчка — тах-тах-тах!

Ніякага эфекту. Я прадоўжыў:

Гуляй, дзеўка,
Красуйся!
Рана замуж —
Не сунься!
Бо замужам
Трэба знаць,—
Позна легчы,
Рана ўстаць!
А свякрусе —
Дагадзіць,
Як па брытвачцы
Хадзіць!

Спыніўся і паслухаў. Нарэшце ў альтанцы мяне пачулі і змоўклі.

— Глядзіце, глядзіце туды, на прасвет! Вунь, на светлым фоне, на кроне дрэва — чалавек сядзіць! — пасля маўчання закрычаў незнаёмы голас.

У альтанцы зашморгалі хмелем, відаць, яго раздзіралі, каб лепш бачыць.

— О, і я бачу!

— А-га!..

— Дзе, дзе?

Некалькі хвілін у садку панавала цішыня. А калі здзіўленне прайшло, панства раптам пачало смяяцца. Смяяліся доўга, абразліва, як з дурня.

Нарэшце смех перакрыў Данусін голас:

— Нічога тут няма смешнага! От залезце вы, рыцары, аж туды!

У альтанцы загрукатала.

— О-ей, куды вы? Не разыходзьцеся, прашу! Пане Браніславе, не ідзіце, прашу!

— А каторая гадзіна?

— Ужо позні час!

— У-у, як засядзеліся!

— І мне пара!

— Прабачце!

— Дзякуем за прыемную кампанію!

— Пара і нам!..

Адчуваючы зларадная здавальненне, што сапсаваў панству вечар, зноў пачаў я гойдацца і спяваць:

Сме-ла, та-ава-ры-шы, ў но-огу!..

Спяваў датуль, пакуль не зразумеў, што ў садзе — ні душы. І мне зрабілася так сорамна раптам, як бывае толькі ў сне, калі прысніцца, што ідзеш па вуліцы без нагавіц і на цябе ўзіраецца народ.

Я хутчэй злез на зямлю.

Ад'язджаючы з Вільні яшчэ ў тую ж ноч, я адчуў, як нешта назаўсёды тут пакідаю. Тады я яшчэ не ведаў, што ў гэты дзень скончылася маё юнацтва.

## ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

## РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

**1**

Прыехаў я дахаты, а праз два месяцы пачаліся падзеі.

Першага верасня 1939 года выбухнула вайна Германіі з Польшчай. Семнаццатага — у Заходнюю Беларусь увайшла Чырвоная Армія. І тут завярцелася. Парушылася вартасць грошай, паламаліся звычкі, погляды, паняцці; за адзін дзень іншы чалавек цяпер назіраў столькі, што дагэтуль не бачыў і за ўсё жыццё!

Доўга яшчэ я адчуваў сябе як пасажыр, які едзе поездам з хуткасцю сто кіламетраў у гадзіну: мільгалі вобразы, але не было магчымасці да іх прыгледзецца. Адчыніліся школы сярэднія і вышэйшыя, бясплатныя. Пачалося нябачанае будаўніцтва...

Вучыўся я ўжо ў другім горадзе. Але па-ранейшаму цягнула мяне да Данусі, хаця гордасць і не дазваляла паказацца ёй на вочы. Хацелася паглядзець на яе крадком — якая яна цяпер? Мо перажывае нястачу?..

У час летніх канікулаў 1940 года адправіўся я ў Вільню. Горад быў падобны на разварушаны мурашнік. Усё было там яшчэ не ўладжана, людзі ўзбуджаныя і жылі нібы на вакзале.

У генералавым доме незнаёмыя кватаранты сказалі, што цётка Антося перабралася ў сваю хату. Я падаўся да яе.

– Як паехала генеральша з дачкой да вайны, так і не вярнулася! Можа дзе загінулі там: Гітлер, кажуць, лютуе цяпер надта

на свеце! — паведаміла мне яна і параіла схадзіць да Левандоўскага, які нядаўна вярнуўся з эміграцыі: — Левандоўскі павінен ведаць нешта пра іх! Я і сама збіраюся да яго, толькі агарод прапалю...

— А Левандоўскі вярнуўся?

– Залкінды мне гаварылі. Стары Залкінд хадзіў да яго распытваць. Усё яму тут не падабаецца. То ў сталовых чай падаюць без сподкаў, то за магазін прыдзіраюцца... Дастаў ужо нават заграмічны пачпарт для сям'і. Але пагаварыў з Левандоўскім і абсеў. Той быццам сказаў, што і там не соладка. Учора спаткала яго ў кнігарні: рускія падручнікі шукаў для сваёй Бэты...

Калі год таму назад часці польскай арміі ўпарта супраціўляліся нямецкай навале, вышэйшыя чыноўнікі ўцяклі ў Румынію. Я падумаў, што туды мог уцячы і генерал. У такім выпадку ён за граніцай знайшоў сваю сям'ю, чаго тады Дануце вяртацца ў СССР. А я, дурань, яшчэ дапамагаць ёй ехаў...

Ад Антосі я падаўся да былога трэнера.

2

На кватэры ў Левандоўскага было многа народу. Усе прагнулі даведацца пра лёс родных і знаёмых, паслухаць нешта цікавае.

Для многіх палякаў — асколкаў былога ладу — Англія тады была дзяржавай, якая, на іхнюю думку, мелася выратаваць Польшчу. Кожная вестка адтуль прагна ўспрымалася гэтымі людзьмі.

Тады, калі збіралася некалькі чалавек, то абавязкова яны гаварылі на палітычныя тэмы і з-за гэтага маглі не есці, не спаць. А ў Левандоўскага адбывалася ўжо цэлая прэс-канферэнцыя. У яго кватэру набілася столькі людзей, што мяне нават ніхто і не заўважыў.

— ...Сто пяцьдзесят гадоў з нас здзекаваліся, нас стралялі, гнаілі ў турмах. За намі шпіёнілі, забаранялі размаўляць на роднай мове, — з набалелай горыччу скардзіўся былы трэнер.— Незалежнасць мы выпакутавалі, як вандроўнікі пасля доўгай спякотнай дарогі ваду ў пустыні. Атрымаўшы яе ў 1918 годзе, мы ап'янелі ад радасці, не разабралі, дзе нашы ворагі, дзе сябры. Расія? А, тая, дзе Сібір, дзе звінелі кандаламі пакаленні нашых продкаў!.. Кажуць, у ёй штосьці новае? Гэта яшчэ паглядзім, а пакуль што мы не зрабілі з імі разлікаў!.. У Саветаў ёсць добрыя танкі? Няпраўда! Дык вось фатаграфіі!.. Хлусы, гэта пацёмкінскія вёскі, яны з фанеры!.. І мы сталі заігрываць з далёкай Францыяй, Англіяй. «Магутная, непераможная!» — фанабэрыліся мы, хвалячы сваю армію. А дайшло да справы, і давялося кідаць кавалерыйскія эскадроны на нямецкія танкавыя калоны!..

У гэтым стомленым і маральна зламаным чалавеку ледзь можна было пазнаць былога віленскага атлета і зухаватага мужчынупрыгажуна.

— А потым?.. Прыехалі ў Румынію голыя, брудныя, абшарпаныя, прыбітыя — зноў, як дваццаць тры гады таму назад, бязродныя. Пашкадавалі нас суседзі, далі хлеба, мы навеліся і пачалі ўжо хадзіць гаспадарамі, пазіраць на румын звысоку, як каланізатары на тубыльцаў, абзываць іх «мамалыжнікамі»!..

У нас, палякаў, многа шляхецкага зазнайства... Пыха, самы сапраўдны эгаізм, прыкрыты таннымі патрыятычнымі лозунгамі, перамешваліся ў кожным з нас з уяўнай рамантыкай мінулага, сталі нашым характарам! — працягваў ён з болем.

Далей было яшчэ горш. З Румыніі паехалі ў Аўстралію. У Сіднеі, у гарадскім парку, гадуюць кенгуру. Да іх прыходзяць забаўляцца гарадскія лодыры. Хто на вайне ад смагі паміраў у пустынях Афрыкі, а хто не ведаў, куды падзець час... Кенгуру любяць баксіраваць. Для пацехі публікі я, трэнер першай катэгорыі, быў наняты за грошы ў партнёры смярдзючаму зверу!.. Надзеўшы баксёрскія рукавіцы, з раніцы да вечара я выходзіў на «рынг». Кенгуру намерваецца ўдарыць задняй нагой, а я не даюся. Аднойчы пана Кавальскага з Варшавы — ужэндніка пошты — звер на маіх вачах распаласаваў з галавы да ног, і кішкі вываліліся на пясок. Тады я адмовіўся ад такой работы...

— У войска пасылаць мяне не захацелі: стары. Прыставілі да коал. Гэта такія маленькія мядзведзі, харчуюцца лісцямі эўкаліпта, а ў іх шмат алкаголю, таму яны ўсё жыццё п'яныя. Цэлы дзень у парку з коал рагаталі людзі, а мне здавалася — з мяне!.. Абрыдла смяшыць народ, абрыдла чужына, захацелася дадому. Прыбыў савецкі гандлёвы карабель, і я на ім уцёк. Патрымалі крыху ў Лукішках, і вось — выпусцілі, жыві, сказалі...

Левандоўскі калісьці ведаў мае палітычныя перакананні. І мне вельмі ж не хацелася сустракацца з ім пры Савецкай уладзе нязначным чалавекам, ды яшчэ і ў беднай вопратцы. Таму я доўга вагаўся, пакуль нарэшце спытаўся пра генерала.

У стомленых вачах Левандоўскага адбіліся здзіўленне і радасць. Я прыкінуўся, што бачу яго першы раз, і жывыя іскрынкі ў трэнера згаслі.

— Не, Янкоўскага там не бачыў,— адвёў ён ад мяне вочы.— І не чуў пра яго. Ён са старых кадраў польскіх патрыётаў, такія з бацькаўшчыны не вельмі ўцякалі. Найхутчэй — у палоне або галаву зглажыў...

Пайшоў я ні з чым.

**3**

Ніхто нічога не мог сказаць мне і пра князя. Толькі потым я даведаўся, што Браніславам Любецкім яшчэ мінулай восенню цікавіліся нашы органы, пасля гэтага ён некуды знік.

**4**

Канчаткова сапсаваў мне настрой пан Войцех.

Былы швейцар ліцэя паведаміў, што Альбінас Суткус да апошніх дзён лета 1939 года працаваў у рэстаране, тады яго мабілізавалі ў польскую армію, і ён загінуў у баі з фашыстамі ў канцы верасня пры абароне польскай сталіцы.

— Мой зяць быў разам з ім у Варшаве,— уздыхнуў стары.— Зяць яго і пахаваў там на Макатове...

Бедны Альбінас!

Увесь час ён клапаціўся аб тым, каб забяспечыць сябе кавалкам хлеба. Мы не маглі нават замацаваць нашу дружбу. І вось назаўсёды сышоў з майго жыццёвага шляху яшчэ адзін блізкі мне чалавек.

Пан Войцех даў мне адрас дачкі старасты, Яніны. Беднай гімназістцы выбухам першай нямецкай бомбы ў пачатку вайны адарвала ногі.

5

Мяне ўразіла запусценне і бязладнасць, якія панавалі ў кватэры былога важнага чыноўніка.

У пакоі ляжала дачка-інвалід, якой пашкодзіла яшчэ асколкамі і пазваночнік, а яе маці лесціла мне і ўніжалася. Ад няёмкасці я не ведаў, куды падзець вочы. Гэтыя людзі, выхаваныя на легендах часоў Ягелы і Баторыя, на ідэі Польшчы «ад можа да можа», парабіліся бездапаможнымі авечкамі, калі гісторыя тыцнула іх насамі ў рэчаіснасць. Бацькі Яніны нават ва мне бачылі таго чалавека, у чыіх руках іхні лёс.

Нарэшце мне ўдалося пабыць адзін на адзін з Янінай. Яна ляжала на ложку з мноствам падушак. Дзяўчыну нельга было пазнаць. На худзенькім і бледным тварыку павыступалі вяснушкі. Такія самыя кропінкі былі на руках — худых і страшных, якія прасвечваліся як халадзец. Замест нястрымнай рагатухі і каравокай какетачкі я ўбачыў расчараваную няшчасную істоту.

— Сядайце! — паказала яна на матрац.

Я ўсё тырчаў, аслупянелы, сярод пакоя.

— Што, не пазнаеце?

— Мала...

— Аднак гэта я! Некаторыя пазнаюць мяне толькі па зубах, калі засмяюся... Сядайце, ну!

Крэслы былі завалены вопраткай і рэчамі. Куды тут прыткнуцца?

— На ложак давайце, я не заразная!

Каб не пакрыўдзіць паненку, я сеў. Сеў якраз там, дзе павінны знаходзіцца яе ногі. Толькі цяпер па-сапраўднаму да мяне дайшла трагедыя гэтага чалавека.

Агорнуты жаласцю, я маўчаў, разглядаючы пакой. Гэта было няветліва, але я меў такую звычку. На крэсле ляжаў альбом.

— Калі ласка! — Яніна працягнула руку і падала яго.

Стаў я гартаць старонкі. На іх было шмат фатаграфій генеральскай сям'і. Яніна выняла адзін здымак і прачытала на адвароце Данусіны словы:

Gdy w życiu Cię kto zrani,
A w sercu pozostawi bliznę,
Pamiętaj, że więcej cierpiała
Polska – Twoja Ojczyzna.[1]

Прайшла мінута няёмкай цішыні.

— Спаткаеце, перадайце, што перад смерцю пра яе думала і жадала вам абаім шчасця,— вымавіла Яніна скрозь слёзы.— О, як вас Данка кахала, як кахалі яе вы!.. Мяне ніхто ніколі не кахаў... Я вам так зайздрошчу...

— Яніна, мы яшчэ разам з вамі...

— Мяне вы бачыце апошні раз! — цяжка ўздыхнула яна.

У вачах дзяўчыны з'явілася нешта сталае, і я зноў перастаў яе пазнаваць.

— Спаткаемся, няхай толькі ўсё ўляжацца...

— Не. Я вырашыла не мучыць сябе і бацькоў. Толькі мама хавае ад мяне ўсё вострае...

Суцяшаў я паненку і адчуваў, што словы мае гучаць непераканаўча.

6

Бачыў я тады і Станеўскага.

Былога шпіка дэфензівы я спаткаў у кампаніі выфранчаных гультаёў. Яны хадзілі па горадзе і пасмейваліся над салдатамі з

1 Калі цябе хтосьці ў жыцці параніць, на сэрцы пакіне рану, то памятай, што яшчэ больш цярпела Польшча, твая радзіма ( польск.).

мангольскімі тварамі. Верхаводзіў імі Генрых. Зусім мажліва, што ён меў і цяпер у кішэні Сцяпанаў наган. От гісторыя!..

Я доўга ішоў за піжонамі, адыходзіў убок і ўсё хацеў сустрэцца са Станеўскім вачамі, але ён адварочваў галаву. Нарэшце, мне гэта абрыдла! «Ліха яго бяры, пабачым, што далей будзе!» — павярнуў я назад.

– Камісар з абцёпканымі порткамі! — пачуў я за сабой.

Мяне апанавала бяссільная злосць. Ды не біцца ж з гэтымі тыпамі на вуліцы!.. Здаць яго ў рукі міліцыі! Ён загубіў не аднаго добрага хлопца!..

Я нерашуча патаптаўся і, бяссільны, пакрочыў да Зялёнага моста. Пры вызваленні горада паміж савецкімі войскамі і эндэкамі тут былі стычкі. Ад перастрэлкі засталіся прабоіны ў фермах моста. Тады гэта было яшчэ настолькі новае, што людзі ішлі глядзець на прастрэленае жалеза як на дзіва.

7

Дзень, пражыты ў Вільні, быў для мяне суцэльнай пакутай.

Прачка ўспомніла, што восенню ля студні ў яры знайшлі цела дзяўчыны:

— Той студэнткі, якая прыходзіла да вас! Уражаны навіной, я накіраваўся ў аддзяленне міліцыі. Давялося нямала пахадзіць з кабінета ў кабінет, пакуль паказалі здымкі. Сумненне адпала — Вольга! Забойца стрэліў ёй у скроню.

– Пакуль што злачынца не выкрылі,— заявіў мне следчы, паказваючы тры шрацінь.— Былі ў галаве...

Зірнуўшы на тры кавалачкі волава, я падумаў, што імі можна было стрэліць і са Сцяпанавага нагана. Шраціны трапілі ў скроню з вялікай кучнасцю. Значыць, забойца страляў зблізку. Работа Станеўскага!

Цяпер шукаць яго не было сэнсу — не такі дурань, каб другі раз спатыкацца са мной. А пра злачынства яго я толькі здагадваўся.

І каму гаварыць? Усюды панавалі сметанаўскія чыноўнікі, я па Зарэчнай нават баяўся хадзіць. У былым інтэрнаце езуітаў цяпер жылі не семінарысты. Туды пахаваліся літоўскія і польскія вайскоўцы чынам не ніжэй капітана. Інтэрнат для маладых ксяндзоў быў шырмай. Там памяшчаўся цэнтр польска-беларуска-літоўска-яўрэйскага нацыяналізму, якому Сметана даў магчымасць аб'яднацца і чакаць падыходзячага моманту. «Выхаванцы» інтэрната гатовы былі на любое злачынства, абы толькі знішчыць сведкаў.

Некалькі гадзін я патаптаўся ля міліцыі, уздыхнуў і пайшоў прэч.

## РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

1

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны мяне не паспелі мабілізаваць у армію. І я не агледзеўся, калі апынуўся пад немцамі.

Абарваны, галодны і стомлены, даваЛокся я з тэхнікума дахаты: родны дом здаваўся адзінай крэпасцю, дзе нічога не пагражала.

Для маёй вёскі наступілі змрочныя дні нямецкай акупацыі.

Праз некалькі дзён ад матчыных харчоў у мяне з'явілася пругкасць у целе. Пад загоенымі ступнямі, як калісьці, зарыпелі дошкі падлогі. Прайшло атупенне.

Трэба было нешта рабіць.

Яшчэ перад вайной хлопцы раз'ехаліся па свеце, вёска апусцела. Старэйшыя людзі чакалі ад мяне якогасьці рашэння. А што ты можаш сказаць ім, калі ў цябе самога ў галаве ўсё ўверх дном. Якім жа наіўным і малазначным здалося цяпер тое, чым жыў я нядаўна: курсы, бокс, Дануся... Не хацелася нават выходзіць на двор, каб не сустракацца з суседзямі.

— Ах, Яначка, ах, сыночак, што ж цяпер будзе? — падвартавала мяне на вуліцы маці Сцяпана Рамановіча.

— Нічога, цётка Настуся. Толькі тут немцы прарваліся, а ў іншых месцах нашы ўжо да Берліна даходзяць! — праказаў я фальшыва-бадзёрым тонам легенду, якая тады бытавала.

Аднак доўга не мог забыцца папроку ў вачах старой... Чаму так здарылася? Няўжо давядзецца пачынаць усё спачатку, з гурткоў, як семдзесят год таму назад?.. Што рабіць у даным выпадку мне? Што на маім месцы рабіў бы Рамановіч? І ён бы тут разгубіўся.

А жыццё цякло.

У мястэчку стаяў гарнізон. З яго зачасцілі салдаты. Звярталіся да нашых жанчын — «матка», а да маладзіц — «паненка», атрымлівалі яйкі або масла, клалі сабе ў сумкі з зялёнага брызенту, усміхаліся, паказваючы залатыя зубы... Не салдаты, а — дачнікі!

Выйдзеш у поле, дзе чыгунка,— на ўсход паўзуць і паўзуць цягнікі з авіябомбамі, танкамі і самалётамі!

Схаваешся ў лес. Вакол стаяць раўнадушныя сосны, елкі. У арэшніку самотна і тужліва цягне сваю бяду сінічка:

— Пі-іць! Пі-іць!

— Гур-р-р, гур-р-р! — буркуюць дзікія галубы. Усё як калісьці.

Толькі збярэшся з думкамі, пачынаюць раўці маторы самалётаў. Іхняе выццё падхоплівае стогалосае рэха. Над кронамі плывуць і плывуць шэрыя аграмадзіны транспартных «юнкерсаў» — спакойна, нізка, хоць лічы рубцы на гафрыраванай бляхе абшыўкі з тонкімі лацінскімі літарамі, з ненавісным чорным крыжам.

Ляж на зямлю, прыкладзі да яе вуха, і ты пачуеш, як яна часта ўздрыгвае.

Ля вакзала ўсе платформы ўстаўлены савецкімі гарматамі са свежай зялёнай фарбай. Іх немцы дзелавіта ладуюць у вагоны, адпраўляюць на пераплаў.

Ля шашы аўтагенам рэжуць нашы танкі. Тоўстыя пліты сталёвай брані паддаюцца лёгка, як бручка, пакорна кладуцца ў кузавы крупаўскіх грузавікоў.

Каля мястэчка — агарожа з калючага дроту. За ёй — сотні палонных у шэрых шынялях: свае хлопцы — прыніжаныя, худыя,— адно скура ды косці!..

Родны лес палёгкі не дае — не можна загамаваць у чалавека думак і ўспамінаў. Усюды — немцы, упэўненыя, спакойныя, ад іх няма нідзе ратунку!

2

Раней, калі я прыязджаў дадому на канікулы, маці была проста шчаслівая, што мела магчымасць глядзець на мяне цэлымі днямі. Затое бацька чакаў, калі пачну апавядаць штосьці асаблівае. Цяпер жа маці праяўляла такую чуласць, якой я не памятаў з дзяцінства. Інакш паводзіў сябе і бацька:

— Чуеш, маці? Учора прыехаў з мястэчка Васілёў Васіль і кажа мне: «Бачыў твайго сына ў горадзе. Перад жандарамі шапкі не здыме і не паклоніцца ім, не-е! А так ідзе перад немцамі, што хоць шклянку вады стаў на галаву!..»

— Стары дурань, чым ты хвалішся?!. Ах, сынок, ці ж так можна? Асцерагайся, не лезь на ражон! — маліла маці.

— А ты хацела, каб ён перад імі вытанцоўваў? Недачаканне іхняе!

Маці не згаджалася. Яна несла то вішань, то свежага малака, то ягад. Ноччу падыходзіла да ложка і ўкрывала, нібы маленькага.

Я разумеў, чуллівасць у яе — ад блізкай небяспекі. Было сорамна, што нічога не магу зрабіць, а шыю быццам сціскаў абруч, не даваў дыхаць на поўныя грудзі.

Аднаго разу спаткала маці старую Станеўскую, тая пахвалілася:

— Нас пасцігла такое шчасце, такое шчасце, што не магу надзякавацца богу!

— Якое ж можа быць цяпер шчасце?

— То ж мой мужык, выяўляецца, з немцаў!

Маці здзівілася.

— Далібог! Яго дзед быў чыстакроўны германец. Мы цяпер фольксдойчы. Да нас пазаўчора прыязджаў сам амтскамісар са сваімі пісарамі, спісаў гэтую, як яе... геаграфію... Картачкі выдаў і аб'явіў, што цяпер мы не такія, як усе!

— Няўжо ж...

— Мы і вам дапаможам, бо нашы дзеці дружаць, разам вучыліся...

— Цяпер усё такое няпэўнае, што не ведаеш, на якім свеце і жывеш...— асцярожна ўставіла маці.

— То вы баіцеся? — падхапіла добразычліва Станеўская.— Вам жа няма чаго баяцца, у вас зямля, немцы такіх любяць! Пры паляках ваш хлопец займаўся крыху палітыкай — немцы даруюць, мы вам дапаможам...

Маці скончыла апавядаць пра гэтую размову і лісліва ўсміхнулася.

— Мам, пакіньце іх! — накрычаў я на яе.— Каб вы болей ні слова не гаварылі з гэтымі хрыстапрадаўцамі!

— Дык я нічога і не сказала! — пакрыўдзілася яна.— Нават мяне заела: а сканане табе, не дачакаешся, каб у цябе прасіла дапамогі! І пайшла. А болей ёй нічога... Гэта ты ў мяне зрабіўся якісьці, што ўсюды лоб падстаўляеш...

— Самі вучылі быць праўдзівым!

— То і будзь сабе. Цяпер трэба быць яшчэ і асцярожным. Каму карысць, калі за няма што зложыш галаву? Як тады мы з бацькам...

— Зноў пачалі сваё!

3

Аднойчы спаткаў я і самога Генрыха.

Ішоў я з мястэчка. Ля дарогі быў аэрадром. У першую ваенную раніцу немцы тут разбамбілі ўсе нашы самалёты. Цяпер фашысты збіраліся аднавіць аэрадром, ды баяліся, што ён замініраваны. І вось прыгналі палонных, загадалі ім прайсціся па ўзлётным полі, нібы для таго, каб сабраць паперкі, павырываць бадылі. Сотні згорбленых

байцоў у шэрых шынялях брылі пад дуламі аўтаматаў па полі з пакарабачаным жалеззем і раз-пораз нагіналіся да зямлі.

Каля аэрадрома я і сустрэўся з ім.

Генрых ішоў у мястэчка — загарэлы, у адпрасаваным касцюме, каўнерык свежай кашулі вылажыў на пінжак і ў пальцах вярцеў разлапісты ліст клёну.

— А, калега Барташэвіч, сэрвус!

— Добры дзень...

Я спыніўся, пацiснуў паданую руку і адчуў: ён аж кіпіць ад упэўненасці, здароўя і задавальнення жыццём.

— Ну, як праводзім лета?— быццам не было ў нас з ім апошняга спаткання ў Вільні, загаварыў ён з падкрэсленай ветлівасцю.

— ...?!

— А я вось адпачну крыху і паеду ў Вільню. Вы не збіраецеся?

Людзі абліваюцца крывёю, а ты канікулы сабе знайшоў?!

— Не...

— Калега быў у мястэчку?

— Быў...

— Яўрэяў там ужо аддзялілі ў гета?

Калі і аддзялілі, табе ад гэтага лягчэй?.. Яшчэ пару тыдняў таму назад ты нябось баяўся нават у родную вёску паказацца, а цяпер выпаўз, гад!

— Не ведаю...

Я гатоў быў узарвацца ад крыўды і злосці.

Чаму так пабудаваны свет, што не магу даць яму ў морду, адказваю на ідыёцкія пытанні і вось наском бота, як малы, гладжу пясок?!.

Чаму я такі бяссільны?!.

З роспаччу я ўзняў вочы і зноў убачыў ланцуг смяротнікаў на мінным полі. Якім трэба быць зламаным фізічна і маральна, каб гэтак вось пакорна ісці, нібы збіраць паперкі і бадылі, ведаючы, што фашысты цябе прыгналі, каб сваім целам паўзрываў міны?!. Не адзін я такі.

Стала нібы лягчэй. Але я ўжо спахапіўся: з кім раўняюся? Яны ўсе параненыя, пакалечаныя, згаладалыя, у няволі, я ж — на свабодзе!

— Ну і арганізатары немцы! — Генрых з захапленнем паказаў лістом на поле.— Хто б дадумаўся гэтак міны шукаць?!.

— Арганізатары, па-твойму?— узарвала мяне.— Мы з табой маглі б быць сярод іх, каб трапілі да вайны ў армію, як бы ты тады гаварыў?

Генрых пачаў лепятаць, што немцы бяздушныя, але не адымеш ад іх дзелавітасці і арганізатарскага спрыту. Я не ўслухаўся. Не развітаўшыся, пайшоў.

*4*

Памалу мяне падбівала да дзеяння. А тут яшчэ і падганялі.

Аднаго разу, калі я стараўся скласці абрыўкі газеты, у хату ўвайшоў бацька. Стары сеў за стол насупраць, крэкнуў, адвёў вочы ўбок, памаўчаў. У яго быў такі выраз твару, што па маім целе прабеглі мурашкі. Я чакаў, што будзе далей, і механічна перабіраў старонкі нямецкага слоўніка.

Бацька нарэшце з'едліва спытаўся:

— Чытаеш?

— Чытаю...— адказаў я вінавата і няўпэўнена, не ведаючы, куды ён вядзе.

— Та-ак, чытаеш! Абрыўкі?

— «Фолькішэр беобахтар» знайшоў ля чыгункі... Гэта ў іх цэнтральная газета, партыйны орган...

— Нямецкая! — Стары не хацеў і слухаць, з якой газеты паперкі.

— Ну і што калі нямецкая...— слаба бараніўся я.— Хоць нейкую вестку можна пачуць, а то сядзім тут як у мяшку, нічога не ведаем...

— Як гэта што? — аж падскочыў ён на лаве.— Там дзесьці іхніх абрыўкаў нашы не збіраюць, а лупяць фашыстаў пачым зра! — Аднекуль перанятае бацькам выражэнне «пачым зра» азначала ў яго вышэйшую ступень накалу.

Стары ўсхапіўся з лавы і, згорблены ад няшчасця, пайшоў. Каля дзвярэй яшчэ спыніўся, паглядзеў на мяне так, што захацелася залезці пад стол, тады махнуў безнадзейна рукой:

— Значыць, не дарос! Э-эх!.. А я яшчэ траціўся, начэй недасыпаў, у самую Вільню сына вучыць пасылаў!.. Вывучыў, нічога не скажаш!..— уздрыгануў яго голас— Дзякуй табе, сынок, узрадаваў, нямецкія абрыўкі падбіраеш!..

З сілай ляснулі дзверы.

Слоўнікываліўся ў мяне з рук.

Нешта падобнае адбывалася і ў іншых хатах.

І ўжо да першай восені ў нашых лясах арганізаваліся партызанскія групы. У іх, вядома, апынуўся і я. Першая партызанская зіма была цяжкай, тады мне было не да Данусі.

**5**

Мінула шмат часу пасля вайны.

Аднойчы ехаў я загарадным аўтобусам і звярнуў увагу на аднаго пасажыра. Ён сядзеў уперадзе.

У пасажыра кідалася ў вочы штосьці бутафорскае. На дварэ стаяла снежаньская сцюжа, а ён быў у канфедэратцы, пашытай са звычайнай цыраты, якой накрываюць сталы.

Яшчэ на ім было прыкметнае паліто — пераліцаванае, пашытае рэгланам з некалі дарагога сукна, а галіфэ — з салдацкай коўдры.

Насупраць яго вызвалілася месца, І я перасеў туды.

Старэчая зморшчаная шыя незнаёмага з упадзінамі за вушамі не пасавала да ружовенькага маладжавага тварыка з кароценькімі вусікамі і жвавымі карымі вочкамі. Твар гэтага чалавека напомніў штосьці знаёмае, крануў нейкую балючую струнку, і я пачаў уважліва да яго прыглядацца.

Каб на чалавеку не было ўсё такое чысценькае, акуратна зацыраванае, каб суседка не выказвала яму такой пашаны, яго можна было б палічыць за вар'ята. Навокал нас — стомленыя камандзіраваныя, сялянкі з пустымі кошыкамі, бітонамі ад малака, вузламі і жоўтымі спружынамі абаранкаў.

Незнаёмы вельмі цікавіўся, што робіцца за акном, нібы яму доўга нельга было гэтага рабіць, а цяпер ён можа надзівіцца светам.

Недалёка сядзеў чужаземец з тых, якія да нас зачасцілі ў госці, калі стала з гэтым лягчэй. Што ён паляк, можна было зразумець па шапцы, як у пілота, па светлым паліто, туфлях на тоўстай каўчукавай падэшве, па апельсінавым партфелі-чамадане ды па элегантнасці, якую палякі так старанна ўмеюць захаваць у любых умовах.

Незнаёмы ў цыратовай канфедэратцы нахіліўся і спытаў чалавека ў пілотцы:

— Адкуль пан?

— З Варшавы!

— О, выдатна!

Чалавек перайшоў на польскую мову:

— А якія зараз папяросы кураць у Варшаве?

— «Гевант», «Бельвэдэр», «Грунвальд»...

— А «Пласке»?

— Не!

— Шкада!.. Мае любімыя, даваенныя... Я таксама паляк. І еду туды!

— Ага!

— Ну, як там жыццё?

— Каб толькі было так да смерці!

—О-о, то выдатна!— Карыя вочкі згаслі. Побач з дзіўным пасажырам сядзела жанчына.

Твар яе, пакрыты прыемным загарам, быў свежы, губы тонкія, а носік — з гарбінкай, але па аскетычнай сухасці вачэй, паводзін я адразу ўгадаў у ёй фанатычную каталічку.

Жанчына нешта сказала ці спыталася, і яе сусед гучна і маладжава загаварыў:

— О-о, пані Гэлена! Многія мне там чапляліся на шыю, пані паглядзела б! І адукаваныя, і прыгожыя. Але я — польскі афіцэр з добрай сям'і. Што б сказалі таварышы, калі б такую ўзяў? І я ўзяў польку. Выбіраць з чаго не было... Яна зусім непісьменная. Неінтэлігентная. Без сям'і... Завязу да Польскі, і няхай сабе жыве. У мяне сумленне чыстае, і я спакойны. Трэба дастаць ёй у Гродні пропуск за граніцу...

І толькі цяпер мне ўспомнілася Вільня. Я раптам здагадаўся: перада мной — былы сапернік, «князь» Браніслаў Любецкі! Няўжо ты, браце?!

Быццам памагаючы мне ўпэўніцца, ён дадаў:

— Перад вайной, пані, у Вільні была ў мяне нявеста. Пекная. Маладая. І з добрай сям'і. Заручыны мы зрабілі. Немцы, холера, яе расстралялі...

«Расстралялі? Няўжо з-за майго візіту ў генералаў дом зімой 1943 года?» Мне зрабілася нядобра.

— ...Што пан будзе рабіць у Варшаве?

— Го, пані Гэлена! Толькі зайду на Маршалкоўскую ў адну рэстарацыю, у другую, і знайду ўсё, што трэба — і кампанію, і занятак!

— Колькі пану год?

— Сорак сем. З іх чатырнаццаць пражыў у Казахстане сярод азіятаў. Цяпер буду даганяць. Будзьце ўпэўнены, пані, яшчэ ў Польшчы зраблю кар'еру. У Англіі ў гэтым веку мужчына адно пачынае рабіць кар'еру... Глядзі, пані, пабелены касцёл! — Браніслаў прыпаў да шыбы, але канфедэраткі не зняў, хоць, я ведаў, абавязкова зняў бы пятнаццаць гадоў таму назад.

— Але ж вы яе муж!— упарта думаючы аб сваім, дзівілася жанчына.

— Які я му-уж? Шлюбу ў касцёле не браў! У мяне сумленне чыстае, я спакойны.

Браніслаў закурыў. Грацыёзна трымаючы папяросу пальчыкамі, якія вылазілі з дзіравых замшавых пальчатак, ён казаў далей:

— Інакш я не мог. Павінен быў ажаніцца. Я афіцэр, на мяне глядзелі жанчыны...

Яго чулі пасажыры. Мясцовы народ разумее польскую мову. Звычайна пасажыры дружна нападаюць на курцоў у аўтобусе, але Браніславу не казалі нічога. Цярпелі, як церпяць п'янага, вар'ята або вартага жалю чалавека.

Раптам шасцідзесяцімясцовы прыгажун «ЗІЛ» пшыхнуў паветранымі тармазамі і пасажыраў кінула ўперад. Адчыніліся дзверы.

— А шафё-орчыку, ах сыно-очачку, вазьмі! Мне толькі паўтара кіламетра! Вазьмі, шафёрчыку! — чуваць было, як просіць бабка ля кабіны вадзіцеля.

У аўтобусе зарагаталі. Засмяяўся і «князь». Мне было не да смеху.

Няўжо з-за мяне загінула Дануся? Бо-ожа, што я натварыў! Патрэбна было чапаць гэтага Станеўскага, нікуды ён не дзеўся б ад расплаты!..

А мо Любецкі няпраўду кажа? Напомніць аб сабе?

Ад апошняга спаткання нас раздзяляе цэлая эпоха. Зараз мы нібы памяняліся р'олямі... Кім быў бы ён у часы акупацыі? Відным кіраўніком, ідэолагам руху за незалежнасць Польшчы? Рэдка ж траплялiся князі, як Яраслаў Дамброўскі...

Не! Стаць такім Браніславу перашкаджалі б упэўненасць у сваю выключнасць і клопаты аб сабе. Для кіраўніка Браніслаў не меў характару... Прадажнікам? Прадажнікаў немцы куплялі, як Станеўскага, а чым маглі купіць яго? Ен меў цэлы маёнтак, перад ім і так танцавалі людзі. У часы акупацыі блытаўся б дзесьці пасяродку. Піў бы, распуснічаў, праклінаў бы вайну, што не дае пажыць у яго разуменні. Такімі ганьбавалі і немцы, і мы...

Зіна Кварцёнак, Пеця Трухан, Альбінас, трэнер Левандоўскі... Столькі сапраўдных людзей загінула за тыя гады, а гэты захаваўся, і навошта? Адно марочыць людзям галаву!..

Во, яшчэ загінула Данута!..

Злосная іронія лёсу!..

— А пан мае спецыяльнасць? — распытвала яго суседка.

— Вядома, пані! Я — інжынер з заграннічным дыпломам. Да вайны ў нас панаваў парадак: хто скончыць вышэйшую школу за мяжой, мусіў яшчэ здаваць экзамен і абараняць дыплом у Польшчы. Для гэтага я паступіў у Віленскі універсітэт. На жаль, абараніць дыплом не паспеў, пачалася вайна. Бальшавікі вывезлі ў Казахстан.

Там мой начальнік смяяўся: «Ну, які з цябе інжынер, калі ты нават электрычнага чайніка ці пробкі, калі перагарыць, не паправіш!..» А наогул, пані Гэлена, у Расіі працаваць навучаць! Цяпер ніякая цяжкая работа мне не страшная.

Сяляне пераглянуліся.

— Вы ля Вільні ў сваіх маёнтках былі?

— Няма чаго туды ездзіць, у вас усюды адно і тое ж. Але ж, пані, у мяне яшчэ ёсць тры маёнткі пад Лоддзю. Вялікія. Пані пыталася, што буду там рабіць? О-о, ручаюся галавой, як прыбуду да сваіх хлопаў і папрашу ў аднаго курыцу, то кожны прынясе па адной, і ў мяне адразу стане тры тысячы курэй!

Паляк з апельсінавым чамаданам шматзначна падміргнуў мне, быццам сказаў: «Хутчэй едзь, цябе там толькі і чакаюць, як жа!..»

— А дзе будзе пан жыць?

— Не прападу. Пад Лоддзю ў нашым доме толькі для гасцей з дзесяць пакояў... Адно Марысю трэба недзе ўладкаваць... Тады звярнуся да Гамулкі...

— Напішаце?

— Яму пішуць многія. Я паеду асабіста. Бо я — капітан і з вядомай польскай сям'і. Мне належыць добрая пенсія. Гамулка правільна робіць, што збірае палякаў да купы... Абы толькі дастаць у Гродні пропуск для Марысі. Але пані паможа, праўда? О, касцёл! — тыцнуў ён зноў нос у шыбу, але канфедэраткі не зняў і на гэты раз.

Любецкі гаварыў на ўвесь аўтобус, быццам у ім больш нікога не было. У аўтобусе запанавала нацягнутая атмасфера. У машыне ехалі амаль усе сяляне, якіх калісьці розныя Любецкія прымушалі нізка кланяцца і цярпець. Але наш селянін чалавек асцярожны і нетаропкі. Ён табе абыдзе не пагарачыцца і дарма на ражон не палезе. Яны разумелі, што няма патрэбы пярэчыць і спрачацца з гэтай гнідай, таму маўчалі. Аднак балбатня яго хутка і ім надакучыла.

Мой сусед — вясковы дзядзька ў кажуху,— быццам нічога не чуў і быццам у аўтобусе і не было ніякага Любецкага, пачаў голасна расказваць гісторыю, як некалі ехаў чыгункай і разам з ім ехала нейкая цётка ў Пячэеўскую лаўру.

— «Грэх табе, цётка,— кажу я,— ехаць у лаўру поездам. Туды адно пешшу дабіраюцца, інакш бог намаганняў не залічвае... І што вы думаеце? Прачы-наюся ноччу — дзіва! Цётка з клункам за плячамі ходзіць узад-уперад па вагоне. «Зубы баляць»? — пы-таюся. «Не-е, у лаўру іду...»

У аўтобусе дружна зарагаталі. Дзядзька пачаў плясці іншае, а людзі панастаўлялі вушы зноў. Пра Любецкага ўжо забыліся. Не забыўся адзін я. Зрэшты, не ён займаў маю галаву.

У мяне расла і расла трывога. Ажылі здарэнні трынаццацігадовай даўнасці. Я пачаў даводзіць сумленню, што не вінаваты, але нехта суровы мяне ўпікаў:

«Усё гэта так, а вось яе ўжо няма. І ніколі не будзе! А ты аддаў яе фашыстам і сабе жывеш, раз'язджаеш з нікчэмнасцю, смяешся...»

## РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ

### 1

Вось што адбылося са мной потым, калі я пайшоў у партызаны.

Пасля Дануты я доўга не мог зблізіцца ні з адной дзяўчынай.

«Не тое... Не тое!» — кожны раз гаварыў я сам сабе.

Не мог загадаць свайму сэрцу, каб яно пакахала і Зіну Кварцёнак. Гэты чалавек шмат нацярпеўся і наплакаўся з-за мяне і генеральскай дачкі.

Пазнаёміліся мы з ёю выпадкова.

Аднаго разу з лесу я назіраў за гарнізонам у Крупках. Ужо зусім развіднела. Я пабаяўся, што мяне заўважаць, апусціў бінокль і накіраваў свайго каня ў гушчар.

Выбіраючыся з кустоў на бальшак, я раптам убачыў на дарозе ашалелага чорнага жарабца, які імчаў у бок Крупак. У санях цудам трымалася дзяўчына з перакошаным ад жаху тварам.

— Каця-а!— чуўся бездапаможны крык, якім жанчыны выказваюць бяссільную скаргу, каб выклікаць спачуванне.

І чорны каніска з дзікім храпам пранёсся міма як дэман, толькі абкідаў мяне грудкамі снегу з-пад капытоў.

Жарабец мог з маху ўдарыць сані аб сасну, і тады дзяўчыне канец. Або мог завезці яе ў Крупкі немцам у лапы...

Я прышпорыў свайго каня і памчаў за зверам. Супакоіць жарабца і вызваліць з лейцаў незнаёмую ўдалося аж на полі, на віду ў гарнізона.

— Бзіх! Бзіх! — зазвінелі над намі кулі.

Аднак хутка мы былі ўжо ў лесе. Выплакаўшыся ад перапуду пасля шчаслівага ўратавання, дзяўчына паведаміла пра свае прыгоды.

Мінулай ноччу яны, дзве сяброўкі — Зіна і Каця — ішлі з групай на заданне. Нечаспадзявана наткнуліся на засаду. Партызаны разбегліся хто куды. Дзяўчаты апынуліся ў полі. Стаяла ноч, а раніцай па

следу немцы маглі іх знайсці. Трэба было спяшацца ў лес. І партызанская зухаватасць падказала ім спосаб.

— Да світання туды не дабяжым,— разважыла Зіна.— Хадзем у бліжэйшую вёску і возьмем каня!

Нічога не падазраючы, зайшлі яны ў самыя Крупкі. Вёска была вялікая, гарнізон стаяў з аднаго канца, а дзяўчаты трапілі ў другі.

Калі яны забраліся ў нечую стайню, з хаты выйшаў гаспадар. Партызанкам зноў пашанцавала, бо селянін не пабег у гарнізон з даносам. Але яму было шкада каня. Дзядзька пайшоў на хітрыкі:

— Дарэмна, дзяўчаткі, яго бераце! Ён у мяне, халера, такі, што абы-каго і не павязе!

— Як гэта не павязе?

— А так — не павязе і годзе! Стане на дарозе і ні з месца, хоць ты яму ў лоб страляй!

— І што тады робіце? — спыталася наіўна Каця.

— Гм, што!.. Летам увязваю ў хвост камень... Але ж цяпер зіма, дзе вы знойдзеце тых каменняў? Пакіньце яго, дзеці, а то і самі загінеце, і каня мне змарнуеце. Мне яго не шкада, не думайце, я вам па-праўдзе... Ці мала ў вёсцы коней?..

— Не загаварвай нам зубы! — абарвала дзядзьку Зіна.

— Нічога, не прападзем. І камень знойдзем, не бойся! — запэўніла яго Каця.

— Но-о! — ударыўшы лейчыной па баку, пагналі яны каня.

Адкормлены і застаялы ў хляве жарабец куляй вынес дзяўчат з Крупак.

Партызанкі праехалі кіламетры са тры, і, сапраўды, ужо ў лесе жарабец занаравіўся. Але дзяўчатам вельмі хацелася пахваліцца ў лагеры канём. Замест таго каб кінуць яго і дабірацца да зямлянак пешшу, Зіна пачала сцябаць яго лейчыной, а Каця — лупіць кіем. Конь ні з месца. Тады Зіна зрабіла з новых раменных лейцаў пятлю, надзела сабе на нагу, узялася за лейцы рукамі і пацягнула іх з усяе моцы. Зноў конь ні з месца!

— Раіў дзядзька ўзяць лепшага каня! — упікнула сяброўку Каця.— А цяпер во гуляй з ім тут!

— Маўчы! — адмахнулася Зіна.— Шукай лепш камень!

Каця прыкладам разгрэбла снег, выкапала каменьчык і ўвязала яго каню ў хвост. Жарабец махнуў ім, пачуў нешта чужое ў хвасце і як ашалелы паляцеў у Крупкі. Бедная дзяўчына не магла выскачыць з саней, бо пятля з лейцаў заблытала ногі. Выблытваючы Зіну, я мусіў перарэзаць лейцы.

Каб не рабіць з дзяўчыны пасмешышча, я пра выпадак з жарабцом нікому не сказаў.

З саней выпала вінтоўка, трапіла пад полаз, і прыклад трэснуў. Я збіў яго Зіне бляшкамі. З той пары мы і сталі сябрамі.

2

Бліжэй з Зінай пазнаёміліся мы на заданні.

У пачатку красавіка 1942 года нам было загадана выбіць немцаў і паліцаяў з Крупак. Гарнізон гэты нам даўно ўеўся ў пячонку — немцы з яго рабілі засады, абстрэльвалі з гарматкі партызанскія сцежкі, ставілі міны.

На заданне накіраваліся групамі. Мой узвод выйшаў на суткі раней, нам трэба было абысці вёску.

У лесе яшчэ ляжаў пласт набрынялага вадой снегу, і вялікія кроплі з дрэваў папрабівалі яго да моху. Палі ўжо чарнелі. Стылі лужыны мутнай сцюдзёнай вады, адусюль цягнула такой сырасцю, што здавалася, нават твае косці прамоклі.

На зямлю апусціўся не то туман, не то хмара. Было такое ўражанне, быццам на небе зіма з вясной счапіліся загрудкі ў смяротным змаганні і часова пакінулі зямлю самой сабе, адчаго надвор'е не ведала, што рабіць, і чакала выніку гэтай барацьбы.

— Хоць бы вецер, а то — як у мяшку! — уздыхалі старэйшыя партызаны.

— Нічога, хутка вясна сваё возьме,— абяцалі іншыя.

— Дажыць бы...

А пакуль што даводзілася цярпець.

Лямкі з рэчавых мяшкоў паўпіваліся ў размоклыя кажухі і мулялі плечы. Боты раскіслі, зняць іх было цэлае мучэнне, прапускалі ваду, яна струменілася скрозь пальцы ўверх і ўніз — у такт кроку. А ночы насталі цёмныя, так і глядзі, каб не напароцца на яловы сучок, не праваліцца па пахі ў ваду, а галаву ўвесь час трымай утуленай у плечы, каб не пасыпаліся за каўнер ледзяныя кроплі з дрэў.

Натруджанае цела пякло і ныла, а час цягнуўся нібы вечнасць.

Зіна таксама валакла цяжар, і яе боты хлюпалі рытмічна, але трымалася яна не горш за хлопцаў.

Да Зіны ўсё падлабуньваўся прыгажун нашага атрада кучаравы Колька, якога мы празвалі за ліхую язду на кані Казаком. А яна, ускінуўшы на плячо вінтоўку прыкладам угору і падсадзіўшы руку пад лямкі мяшка, каб не так муляла, залётна страляла ў мяне вачамі, не заўважаючы Казака. Я нават западозрыў, што і ў групу Зіна напрасілася з-за мяне.

Ноччу, калі прадзіраліся праз гушчар, я ёй сказаў:

— У мяне, Зінка, дрэннае прадчуванне. Не напароцца б нам на міны!

— Я не хацела табе гаварыць,— прызналася і яна,— але і ў мяне цяжка на сэрцы. Як тады, калі налезлі ў Воўчым балоце на засаду...

— Загад ёсць загад, эх!— уздыхнуў я і зараз жа вылаяўся, бо галінка, якую адпусціў злосны Казак, балюча сцебанула мяне па твары.

— Кепска, пане Іване! — рассмяялася дзяўчына.

— Далі ў морду, і не ведаеш, з кім нават пасварыцца! — перавёў я ўсё ў жарт.

— А ты паплач, будзе лягчэй!

— Толькі што...

Мы адсталі ад групы. Партызаны ў цемры пагубляліся і ззывалі адзін другога.

— Вяроўкай нам звязацца, як альпіністам, ці што?!

— Парай хлопцам компасы панастаўляць! — запрапанавала Зіна.

— Гм, ідэя...

Мы сабраліся, і я загадаў выканаць параду. Усе паклалі рукі сабе за спіну, і той, хто ішоў ззаду, цяпер бачыў фасфарычны агеньчык ад компаса таварыша.

— І я на нешта прыдалася, бачыш!

— Нічога не скажаш...— Мне было няёмка, што да такой простай рэчы не дадумаўся сам.

Без асаблівых прыгод прыбылі мы на месца.

Наступленне на Крупкі мелася адбыцца а дванаццатай гадзіне дня. Да гэтага часу людзям трэба было адпачыць. На світанні ля вёскі мы зашыліся ў кусты дзікіх вішань у яры, паслалі плашч-палаткі, леглі цесна адзін ля другога, я ўсіх прыкрыў, а сам стаў на варту.

Заданне небяспечнае, бо гарнізон быў добра ўмацаваны. І мала нам вядомы. Бадай, няма большай небяспекі, як тая, якую ты чакаеш, але памераў яе яшчэ не ведаеш. Якія толькі страхі не лезлі ў галаву.

Вось нешта зашлёпала па полі. Я ледзь не выпусціў чаргу з аўтамата па чорным сілуэце.

— Гам! — брахнуў перапалоханы сабака, клацнуў зубамі і сігануў у цемру.

Каб не наклікаў ён сюды каго!..

Развіднела. Цішыня. Толькі ў вёсцы спявалі пеўні, скрыпелі жоравы. У яры, дзе ляжалі сябры, нейкі час чулася стрыманая мітусня, прыглушаны шэпт. Я азірнуўся. З-пад плашч-палаткі вылецеў Колька Казак з ускудлачанымі валасамі і чырвонай шчакой. А хлопцы прыкідваліся, што спяць.

— Апёкся? — паспачуваў я.

— А ну яе!.. Святошу з сябе выстаўляе, чалавечых жартаў не разумее!.. Дай закурыць, братка!

— Справы дрэнь, калі ты ўжо нават забыўся, што я не куру!

«Аднак — баявая!» — першы раз звярнуў я ўвагу на характар дзяўчыны і адчуў да яе пашану.

3

Напад на Крупкі мы не прадумалі. Каб разграміць такі гарнізон, неабходны добрая сувязь, зладжанасць груп і гарматы. А гэтага ў 1942 годзе мы не мелі і за ўсё плацілі крывёй.

Ужо з гадзіну вялі мы рэдкі агонь па доце-бункеры, як яго ў нас называлі. Гэта быў высокі вал, за ім — жылы барак. Над валам віднеўся дах, а ў насыпе чарнелі амбразуры, з якіх пырскалі злосныя агеньчыкі. Ад куль вакол нас ажно разляталася зямля — мы ціснуліся ў мокрыя барозны.

Мая група павінна была адцягваць на сябе агонь праціўніка, пакуль асноўныя часці, хаваючыся за будынкамі, наблізяцца з супрацьлеглага боку і пойдуць на штурм. Адным словам, мы выконвалі ролю жывых мішэняў, загадзя ахвяраваных, абы толькі ўдалася аперацыя.

Ляжалі мы ў барознах сярод аслізлых колікаў, што засталіся ад агарожы, і леташніх бадылёў. Каб не даць праціўніку прыцэліцца, барозны мы часта мянялі. Не краталася са свайго месца толькі Зіна. Мо ранена?.. Мы з Казаком падпаўзлі бліжэй.

— Чаго не пераходзіш у іншае месца?! — закрычаў я, убачыўшы, што дзяўчына заядла лупіць з вінтоўкі ў паліцаяў.

— Лужыну нагрэла! — заўважыў Колька.

— Ну і нагрэла, шкадую пакідаць! Не перашкаджайце!..

Паміж бункерам і намі стаяў мураваны дом. У ім заселі паліцаі з ручным кулямётам. Потым на такую службу немцы бралі і крывых і сляпых. У крупкінскі гарнізон яны паступілі па першаму набору. Усе мелі не ніжэй ста сямідзесяці шасці сантыметраў вышыні, былі дужыя, добра абучаныя — небяспечныя і смяротныя ворагі, з якімі справіцца было нялёгка.

Раптам з мураванкі перасталі страляць, відаць, скончыліся патроны. З бункера туды папаўзлі дзве жонкі паліцаяў. Яны валаклі торбы з дыскамі.

— Куды прэце, сцервы! — раззлавалася дзяўчына і, пакуль мы агледзеліся, папаўзла наперад.

— Зіна, пачакай! — закрычаў я.

Яна не паслухалася.

— От баба дурная! — вылаяўся Колька і падаўся за ёю.

Ад бункера іх прыкрывалі сцены мураванкі, а паліцаі ўсё не стралялі. Колька з Зінай паўзлі па адкрытым месцы. Каб падтрымаць іх хоць як-небудзь, я не даваў магчымасці падняць галавы жонкам паліцаяў, выпускаючы раз-пораз кароткія чэргі.

Перад домам Колька прыпадняўся і адвёў назад руку, каб шпурнуць гранату ў пустое акно, але з глыбіні будынка раптам секанула чарга. Я выразна ўбачыў, як адначасова з гэтай чаргой на шырокіх плячах партызана выскачыў радочак з кавалачкаў кажуха: апошнімі патронамі паліцаі прашылі Казака навылет. Хлапец мякка асунуўся на мокры чарназём паміж леташніх пнёў капусты.

— Коля! Казак! — ускрыкнула Зіна і пацягнула партызана за бот, але хлапец ужо не варушыўся.

Яна схапіла яго гранату, праверыла ўзрывальнік, кінула яе праз акно і стаілася за сцяной. Пасля выбуху адважна палезла на падаконнік.

Я паклікаў хлопцаў і таксама пабег да будынка. Там была добрая пазіцыя: моцныя сцены, а з даху можна было заглянуць за вал.

Калі мы забеглі ў будынак, Зіна праз задняе акно ўжо пастраляла паліцыянтавых жонак.

**4**

Аднак цешыцца «мясцовай перамогай» давялося нядоўга.

Партызаны, якія меліся перад атакай перарэзаць тэлефонную лінію з Крупак, не выканалі ў час задання. І гарнізон паведаміў суседзям пра небяспеку.

— Калона бронемашын! — у самы разгар бою далажылі нашы разведчыкі, і камандзір выпусціў зялёную ракету — сігнал да агульнага адступлення.

Трэба было хутчэй дабрацца да лесу, пакуль браневікі не адрэзалі нам дарогу. Мы зняліся з пазіцыі і пабеглі, хаваючыся за ўзгоркамі.

Але і гарнізон не драмаў. Пад прыкрыццём станкавых кулямётаў і дробнакаліберна гарматкі высыпалі з бункера немцы з паліцаямі. Браневікі пачалі разварочвацца на гасцінцы і заходзіць нам напе-рарэз.

І, як заўсёды ў такіх выпадках, бяда не прыходзіць адна.

У нас быў з сабой мінамёт з чатырма мінамі. Тры мы выпусцілі па гаршзоне ў час наступлення, чацвёртай нямецкая разрыўная куля трапіла ў стабілізатар.

Камандаваў намі капітан Фамін. У нашых лясах ён быў з першых дзён вайны: трапіў у акружэнне са сваім эскадронам. Гэты велізарнага росту адважны сібірак гаварыў нізкім густым басам такой сілы, што мы часта смяяліся:

— З яго голасам толькі на плошчы стаяць замест радыёрупара!

Убачыўшы, як фашысты высыпалі з бункера, Фамін грымнуў:

— Сто-ой, хлопцы! Я адгэтуль секану па іх з кулямёта, а вы ў самую гушчу кіньце апошнюю!

— Яна ж з пасечаным стабілізатарам, таварыш камандзір, - узмаліліся мінаметчыкі.

— Даляціць, кідай!

Перакруціўшыся некалькі разоў у паветры, міна шлёпнулася якраз ля Фаміна і яго ад'ютанта і разарвала абодвух на кавалкі.

Вестка аб смерці камандзіра дайшла да нас у той час, калі мы ўбачылі браневікі. Узнялася паніка.

Партызаны пабеглі ўжо не азіраючыся. Уцякалі бяздумна, як цячэ вада з вышыні, і спыніць іх было ўжо немагчыма. Дарэмна камандзіры стараліся навесці парадак у сваіх узводах. Дарма і я крычаў на сваіх.

Толькі калі дабеглі да збавеннага алешніку на балоце, я здолеў авалодаць сваім узводам і загадаў хлопцам заняць кругавую абарону.

Задыханы і ўзбуджаны, я доўга не мог скеміць, каго ж такі ў мяне не хапае, чаму шаснаццаць чалавек, а не васемнаццаць?!. Нарэшце дайшоў да ладу. Не было Казака і Зіны.

5

Калі дзяўчына адстала, мы і не заўважылі. Немцы загналі яе ў балота, а яно месцамі пусціла ўжо, і чалавек правальваўся з галавой.

— Вось яна, красу-уня! — зларадна закрычаў паліцай.

— Не страляць, бяры жывой! — пераможна загадаў камендант і, нагінаючы пад ногі сабе кусты і сухое трысцё, першы палез у дрыгву.

I паліцаі, і камендант былі мясцовыя людзі. Для мяне заўсёды была вялікай загадкай псіхалогія здрадніка. Ліха яго ведае, як можа чалавек дайсці да такой нізасці, каб вось так старанна і з упаеннем праследаваць сваіх, выслужвацца перад тым, хто не ставіў яго ні ў грош.

— Заходзь ёй з тылу!— узбуджана, з азартам крычаў другі паліцай.

Замест кажуха з плеч у Зіны звісалі рваныя шматкі — так яго пасекла кулямі і асколкамі. З усіх бакоў трашчалі кусты. Чвакала балота, цяжка дыхалі ворагі. Заставаўся апошні патрон, што рабіць?

Дзяўчына паставіла на купіну вінтоўку, прыклалася віском да канца ствала і наском паспрабавала наступіць на спускавы кручок. У гэтую хвіліну яна, канешне, не думала аб геройстве, яна ведала — зловяць жывой, будзе горш.

— Хутчэй, а то застрэліцца партызанская шкура! — падганяў паліцаяў камендант.

— А от і не возьмеш! Паспрабуйце, бобікі чортавыя, паслужнікі Гітлеравы! — упарта цвярдзіла Зіна, паспешліва шукаючы нагой спускавы кручок.

Узрушаная, яна трапіла нагой на скабу. Прыклад залез аж па магазінную каробку ў твань, і вінтоўка не стрэліла.

Зіна вырвала прыклад і пашукала больш цвёрдае месца.

Якраз у гэты момант падаспеў я. Дыскі мае былі пустыя. Спыняючы на полі партызан, я да таго ахрып, што зусім страціў голас. Але маё з'яўленне было для паліцаяў вялікай нечаканасцю. Яны на хвіліну разгубіліся, гэта і вырашыла справу.

З маіх грудзей вырвалася дзікае рычанне. Я з усяе сілы замахнуўся на крайняга паліцая і са здавальненнем адчуў, як пад маім дыскам хруснуў яго чэрап. Больш замахвацца не было часу. І тут ва мне прачнуўся баксёр. Наступнага я збіў магутным хукам з левай у сківіцу, трэцяга здзяліў пад грудзі, і яны абодва папаўзлі ў гушчар. Я нагнуўся, каб забраць у забітага вінтоўку і наган.

Зіна ўпала на купіну і заплакала.

— Ты што, ачумела, нашла месца? — накрычаў я.— А ну, уставай і марш да сваіх хлопцаў!

— І нікуды я не пайду-у,— выбухнула яна горкімі слязьмі.— Ідзі сабе, а я тут застану-уся... Я не магу, не хачу ўставаць...— Плечы яе ўздрыгвалі ад спазмаў.

Прыйшлося ўзваліць яе, расслабленую, сабе на плечы і валачы.

Памалу яна супакоілася. А потым я адчуў, што Зіна ўздрыгвае ад стрыманага смеху:

— Ты чаго?

— Ну і паўзлі яны па дрыгве ад цябе, як уюны! — рассмяялася яна ўголас— Ваня, а ты мяне зноў вырataваў. Каб не ты, мне — капут! Ну, пусці, пайду сама!

— Падзякуй Янкоўскай, што навучыла боксу.

— Каму-каму?

— Жартую... Бачыла, які наган сабе здабыў?.. Марш уперад, а то згубішся яшчэ ў гушчары!

Не раз і Зіна ратавала мяне.

**6**

Летам пабылі ў нас дэсантнікі і пакінулі свайго разведчыка — Юзіка Савоську. Гэты чалавек папаў да дэсантнікаў выпадкова. Яны яго раскусілі і вырашылі часова камандзіраваць да нас, каб потым заняцца яго лёсам. Мы гэтага тады не ведалі і думалі, што ў яго важнае заданне.

Юзікава новенькая дэсантная вопратка і аўтамат, які аж пераліваўся сінявой варанёнай сталі, выклікаў у нас захапленне і зайздрасць. Савоська быў лавелас. Заміралі сэрцы нашых партызанак, калі ён, акампаніруючы сабе на гітары і млява закаціўшы вочы, спяваў:

Тё-ёмная но-очь!
Только пули свистят по степи,
Только ветер гудит в проводах,
Тускло звезды-ы ме-рца-ают...

Аж крыўда бярэ, калі ўспомніш, як гэты баязлівец і нікчэмнік у дзявочых сэрцах слыў героем.

Зіна выпрасіла для мяне ў Юзіка толу. З небяспекай для жыцця ўзрыўчатку мы дабывалі са снарадаў. Адшрубаваўшы ў іх узрывальнікі, выплаўлялі яго на вогнішчы. Пры васьмідзесяці градусах Цэльсія тол тапнеў, пры вышэйшай тэмпературы — выбухаў: зносіў бліжэйшыя сосны і елкі, ад вогнішча не пакідаў і следу!.. Паспрабуй, выплаві яго без тэрмометра!..

І вось у маіх руках — жоўценькія, спрасаваныя як мыла кавалачкі фабрычнага толу, атрыманага за так. Я адразу ж змайстраваў міну і сабраўся яе выкарыстаць.

— Камандзір, вазьмі і мяне на «жалезку»! — папрасіўся Юзік: яму захацелася пахваліцца перад дэсантнікамі, калі тыя вернуцца.

— Давай!

Паязды тады ўзрывалі яшчэ рэдка, немцы былі не напалоханыя і чыгунку ахоўвалі днём слаба.

Быў поўдзень, калі мы ўтраіх дабраліся да чыгункі. Недалёка пралягала шаша. Зіну я пакінуў вартаваць ля шашы, каб немцы не паявіліся з тылу, а Савоську на ўсякі выпадак аставіў на краі лесу прыкрываць мяне, калі з'явіцца хто на пуці. Сам папоўз да палатна.

Мне ў гэты раз не пашанцавала. Паўгадзіны таму назад трое салдат з чыгуначнай аховы пайшлі на хутар піць малако. Трэба ж было ім вяртацца да чыгункі якраз у той момант!

Я ўжо замацаваў пад рэйку торбачку з толам, заклінаваў яе каменнямі, калі за чатырыста крокаў ад мяне на пуць вылезлі гэтыя немцы. Салдаты здагадаліся, чаго я тут, і з калена пальнулі ў мяне з вінтовак.

Усё прапала!

Стала шкада Зінінага толу, і я пачаў хутчэй выдзіраць міну! Надта хацелася азірнуцца, але я падумаў: убачу, як немцы цэляцца, не вытрымаю, кіну тол і пабягу...

— Ціў-у! Ціў-у! — прапелі ля мяне кулі. Было страшна. Грэбаючыся ў зямлі, я сябе пад-бадзёрваў: «Абы выцерпець, абы выцерпець!.. Ну, яшчэ хвілінку, зараз Юзік цябе падтрымае з новенькага аўтамата!..»

Я паспеў вырваць з-пад рэйкі тол і толькі тады пачуў стрэлы ззаду. Але страляла Зіна. Немцы пабеглі ў кусты, і я быў ўратаваны.

— Дзе Савоська? — здзівіўся я, убачыўшы Зіну на яго месцы.

— Застрэлю гэтую сволач! Няхай толькі з'явіцца ў лагеры! — выбухнула дзяўчына.

Потым, калі мы беглі па лесе, расказала:

— Як немцы па табе стрэльнулі, ён і ўцёк. Я — «Юзік! Юзік!» — а ён нават і не азірнуўся! Мусіла пакінуць шашу і бегчы выручаць цябе. Ты ж немцам быў відзён як на далоні, падбілі б што зайца!

7

У палове мая фашысты блакіравалі пушчу. На гэтую аперацыю адцягнулі з фронту тры дывізіі.

Я ўжо гаварыў, што добрай зладжанасці паміж групамі мы тады яшчэ не мелі. Амаль увесь запас патронаў і гранат выкарысталі ў пачатку вясны, калі прабавалі ўзяць праклятыя Крупкі. Супраць загартаваных у баях фашыстаў, супраць іхніх танкаў, бронемашын,

гармат і авіяцыі мы са сваімі ржавымі вінтоўкамі і кулямётамі, якія часта давалі асечку, былі бяссільныя.

Штаб склікаў нас, камандзіраў груп, на нараду:

— Што будзем, хлопцы, рабіць?

— Сабярэмся ў кулак, ударым з усяе моцы і — або галава ў кустах, або грудзі ў крыжах! — закрычалі мы.

Але тут узнялі голас старыя, яшчэ з часоў буржуазнай Польшчы, камуністы:

— Толькі збярыцеся — немец даўно чакае! Абкружыць, на крупу пакрышыць, з балотам змяшае!

— Для гэтага ў яго — рацыі, самалёты, матарызаваныя часці!

— «...Або галава ў кустах, або грудзі ў крыжах!» Усім вядома, што паміраць вы ўмееце па-геройску.

Наша задача — застацца жывымі, выйсці з блакады з найменшымі стратамі, захаваць сябе для будучых баёў. Няхай кожная група ратуецца як можа!

І сталі мы «ратавацца хто як можа!»

Адзін камандзір выкапаў вялізную зямлянку ў гушчары, добра яе замаскіраваў, схаваў туды цэлае аддзяленне ў надзеі, што немцы пройдуць і зямлянкі не заўважаць.

Другія ноччу паспрабавалі прасачыцца на стыку нямецкіх батальёнаў і ўцячы ў суседнія лясы. З такой групай пайшла і Зіна. А я з хлопцамі залез у балота і крытычны момант вырашыў перачакаць там.

Ежы ў нас было мала. Камплекцыя майго цела патрабавала больш калорый, чым іх трэба было сябрам, а пасада камандзіра прымушала часта адмаўляцца і ад сваёй порцыі. У цяжкія дні блакады мяне, аслабленага, больш за іншых мучыў голад.

Бывала, збяруцца ноччу партызаны ў круг, і пачынаецца:

— Эх, закурыць бы!

— А-га! Глытнуць бы папяроснага дымку, а там хай сабе хоць цэлы полк танкаў!

— За дробку табакі не шкада і жыцця!

І раптам хто-небудзь са старэйшых, які пабываў днём у разведцы, дастае капшук і, не спяшаючыся, пачынае яго развязваць.

— Ах!— толькі вырвецца з прагных вуснаў прыемнае здзіўленне.

— Цур, адну зацяжку!

— Цур, я другі!

— Трэці!

А гаспадар капшука пры месячным святле асцярожна, быццам крупінкі смярдзючай махоркі з чыстага золата, робіць самакрутку. І пойдзе цыгарка па кругу — па адной зацяжцы на брата. Настрой у таварышаў адразу ўзнімаецца, аднекуль з'яўляюцца і сілы.

Не прымаю ўдзелу ў курэнні толькі я.

– Жалезны ты чалавек, Ваня,— хваляць мяне хлопцы і зацягваюцца дымам.— Мы хоць курым, нам лягчэй. А ты не курыш і не ясі...

– Нічога. Хутка немцам абрыдне бадзяцца па лесе, здымуць блакаду. Як-небудзь вытрымаю...— суцяшаю больш сябе, чым таварышаў.

Ніхто, вядома, не ведаў, што было ў той момант у мяне на душы. Кружылася галава ад голаду. Па целе прабягалі вядомыя яшчэ з віленскага жыцця дрыготкі, разлівалася слабасць, засцілала вочы імглой. Прыходзіла абыякавасць. Расслаблялася воля. Першы раз у жыцці я шкадаваў, што не навучыўся курыць.

– Братцы, вядро вады замяняе сто грамаў хлеба: даказана партызанскай навукай! — накурыўшыся да ап'янення, жартаваў хто-небудзь з хлопцаў і прыгаршчамі зачэрпваў тлустую балотную ваду.

– Глядзі ты, пасля вайны яшчэ дысертацыю абароніш на гэтую тэму! — гучалі павесялелыя галасы.

Толькі ў мяне аднаго няма настрою.

Яшчэ са школьнай парты я ведаў, колькі ў такой вадзе плавае мікраарганізмаў. Агідна глытаць казявак і слімакоў, але калі стаіш перад галоднай смерцю і няма выбару...

– А вы не смейцеся! Піце, хлопцы, гэтую ваду, яна пажыўная! — заахвочваю я таварышаў і пераконваю сябе, што мяне таксама мучыць смага, і я цаджу праз зубы рудую вадкасць.

Удзень сонца пячэ бязлітасна, пот коціцца градам, і я п'ю зноў — якраз раблю тое, чаго рабіць нельга. Празмернае пацённе прывяло да абяднення клетак солямі, парушыла іх здольнасць трымаць вадкасць, разладзіла ўзаемасувязь працэсаў у арганізме. Праз тыдзень я зрабіўся такі бязвольны і слабы, што не мог сагнаць з носа камара. А пусцяць немцы ракету, дык не здужваў нават прасачыць за яе палётам. Але ў роце адчуваў смагу і піў яшчэ і яшчэ. Даходзіла да таго, што сціснеш пальцамі цела на грудзях — на скуры выступаюць кроплі вады, быццам я сціснуў мокрую губку.

– Трэба ж было залазіць да ведзьмы ў дрыгву, каб загінуць тут за нішто ад камароў і голаду! — нібы праз сон чуў я дакорлівыя словы.

— Што мелеш? Ён табе свой хлеб аддаваў, прыкідваўся, што не галодны, а цяпер, бачыш, як дайшоў? — баранілі мяне некаторыя.

— Мо няпраўда? Загінуць, дык у баі! А то запёр сюды ў магілу! Вялікая радасць, што і ён разам тут здохне!..

Але папраўць што-небудзь было позна — усе паслабелі так, што не маглі нават трымаць вінтовак. Калі б у той час надышоў на групу адзін немец, ён, мабыць, пабраў бы нас голымі рукамі.

І ўсё ж я знайшоў у сабе сілы арганізаваць вылазку. Ноччу ўзяў двух сяброў, і папаўзлі мы да немцаў.

Белая палатка. Калі мы ўскочылі ў яе, тры чалавекі на сене не паспелі нават прачнуцца. Патэфон. Стол з газетамі, кацялкамі. Вядро... Мы шукалі ежу. У кутку нейкі мяшок. Намацалі — сухары! Схапілі яго і прэч з палаткі!

Адпаўзлі ў дрыгву, развязалі мяшок, а там — скура на падэшвы! Здаецца, гэта і быў той адзіны выпадак за вайну, калі я заплакаў.

На дзевяты дзень я пачаў траціць прытомнасць, мяне ўсё часцей апаноўвала дрымота. Але і скрозь затуманеныя вочы бачыў, як блішчыць вада, а губы самі цягнуліся да яе.

...Апрытомнеў я на сухім месцы. Нада мной схілілася Зіна і ліла ў рот з бутэлькі малако.

– Ты-ы? — хацеў я спытацца і захлынуўся.

– Ванечка, золатца, не разлівай, пі!

– Дзе хлопцы? — спытаўся я слаба.

– Яшчэ спяць!

– Спяць?

– Давай я цябе падніму. Божа, які ты ў мяне лёгкі стаў!.. А цяпер паглядзі туды!

Я сеў, абапёрся спіной аб сасну і азірнуўся.

І праўда. Мае партызаны, разваліўшыся на паляне, храплі на розныя галасы. Паразвешваная на кустах вопратка сушылася на сонцы. Ад яе, нібы дымок, ляніва ўздымалася пара.

За палянай на балоце мірна пахаджваў бусел, пакідаючы цёмны след на траве. Там, дзе ляжаў я, быў прыемны халадок, дзе-нідзе сарамліва чырванелі першыя ў гэтым годзе бусінкі суніц, гойдалася ўсыпанае расінкамі павуцінне — па ім бегаў павук. А над усім гэтым стаяў такі птушыны шчэбет, што, здавалася, лісце і галіны дрэў аж варушыліся ад птушак. Я ўдыхнуў п'яны пах ляснога паветра і так пацягнуўся, што аж затрашчалі мае косці, а па целе разлілася асалода.

– Усе жывыя, не бойся! — суцешыла дзяўчына.

– А астатнія групы?

— У кожнай засталося па некалькі чалавек. Нават у зямлянцы немцы атруцілі ўсіх газамі. І з нашай палова не вярнулася. А твае — усе. Малайчына, камандзір! Хлопцы цябе хваляць... Толькі сам паддаўся, ледзь адратавала. А каб я вас не знайшла, то і памёр бы?.. Пі, спецыяльна з хутара свежага прынесла...

— А блакада? — успомнілася раптам мінулае, нібы цяжкі сон.

— Ужо два дні, як немцы адышлі!

8

Апрача ўсяго мы з Зінай мелі адну таямніцу.

Раздабылі з ёю толу і ўзрывальнік. Механіка ўзрывальніка была даволі простая. Ад батарэйкі кішэннага ліхтарыка ішлі два ізаляваныя дроцікі, адзін плюс, другі — мінус. З гэтых дроцікаў трэба было скруціць спіральку і пакласці на рэйку. Колы цягніка націснуць на дроцікі, зробяць замыканне, і міна здэтаніруе.

Пайшлі мы ўдваіх на пуць. Я заклаў міну, уставіў батарэйку, і мы схаваліся ў кусты.

Поезд праехаў, а міна не ўзарвалася.

Па інструкцыі міны ў такім выпадку кранаць нельга: замыканне можа наступіць нечакана. Але мы з Зінай пашкадавалі толу і вырашылі яго забраць.

Мы яшчэ порКаліся ля рэйкі, як здалёк пачуўся гудок цягніка. Я ўспомніў: у гэтую пару праходзіць пасажырскі.

— Давай паспрабуем зноў! — шапнуў я дрыжачым ад хвалявання голасам.

— Толькі хутчэй! — падхапіла Зіна.

Частку дроцікаў колы аддавілі, яны зрабіліся надта кароценькія і не хацелі ляжаць на рэйцы. Я знайшоў кіёк, лёг на насып і пачаў ім падтрымліваць дроцікі. Выцягнутая мая рука хутка самлела.

— Цяпер я! — шапнула Зіна.— Будзем на змену!

Так мы і мяняліся, пакуль пад'язджаў поезд.

Калі цяпер колы зробяць замыканне, ад мяне і Зіны не застанецца і следу. Але нас ахапіў азарт. Мы думалі толькі аб адным: едзе поезд, у ім поўныя пульманы гітлераўцаў — упэўненых, здаволеных, з туга набітымі нарабаваным дабром чамаданамі... Мы гатовы былі яшчэ дапамагчы міне і падштурхнуць вагоны, каб яны лепш ляцелі пад ахон!

Па рэйках пакаціўся грукат, потым паказаліся фары. Яны раслі на вачах, пакуль не пранесліся над намі, і тады мы зноў апынуліся ў цемры. Поезд толькі выбіў з маіх рук кіёк, абдаў мяне ветрам,

ашпарыў кроплямі гарачай пары, а пясчынкі балюча секанулі па твары.

Забралі мы з Зінай тол і моўчкі папляліся ў лес.

Каб зрабіў гэта іншы партызан, я аддаў бы яго пад суд: бяздумная ліхасць нікому не была патрэбнай, і ў нас існавалі строгія на гэта законы.

9

Восенню 1939 года пасля ўз'яднання ў Заходняй Беларусі адчувалася няхватка кадраў. І на Міншчыне абвясцілі камсамольскі прызыў. Па гэтаму прызыву прыехала ў Заходнюю Беларусь і Зіна Кварцёнак.

Зіма ў тым годзе стаяла лютая. Зіна прыехала ў тоўстых, падшытых шмат разоў і зноў растаптаных валёнках, у зімовым паліто без таліі, бо вясковы кравец кіраваўся толькі адным прынцыпам: як найбольш усадзіць у яго ваты — так прасіла Зініна маці.

Гарады Заходняй Беларусі мелі бедную прамысловасць, іх засялялі пераважна былыя чыноўнікі, гандляры і ўладальнікі крам. Не па душы была многім з іх Савецкая ўлада, не даспадобы былі і людзі, якія з ёй прыехалі.

— Глядзіце, яшчэ адна ўсходніца-калода! — смяяліся з Зіны ў Гродне модніцы ў фетравых боціках, у расшытых адмысловымі ўзорамі кракаўскіх кажушках.

Саромеючыся сваёй вопраткі, Зіна з кватэры прабіралася завулкамі ў «Загатзерне», дзе працавала лабаранткай-прыёмшчыцай.

Разам з ёю працавалі і заўзятыя прыхільнікі былога рэжыму. Сыходзіліся яны раніцай, садзіліся і пачыналі шаптацца. Той такую плётку прынёс, гэты іншую.

– Яшчэ напрацуемся, дзень вялікі! — абяцалі яны, калі Зіна глядзела на іх з дакорам.

А пасля полудня склаўшы рукі чакалі вечара.

– Хіба мы коні, каб цэлы дзень рабіць? — заяўлялі яны з цынічным спакоем і адводзілі душу на беднай дзяўчыне: — Камсамолка, што ў вас за ўлада! Вось ты стараешся цэлы дзень, а на табе і сукенкі добрай няма!

– Нічога, яе за гэта на сходзе ў прэзідыум пасадзяць!

– Яшчэ ў загадзе адзначаць перад святам і вывесяць на сцяну!

– Як жа можна не працаваць? — дзяўчына аж кіпела ад іхняй нагласці.

— А я, бышць можа, сёння якраз хачу спаць! Затое заўтра задумаю выйсці на работу і зраблю ўсё адразу. А мне гэтага твае парадкі не дазваляюць! Дзе ж тут асабістая свабода, калі я сам сабе не гаспадар? — прыставалі да Зіны пакрыўджаныя былыя ўладальнікі крамаў, майстэрняў, дробныя дзялкі. Прыставалі часамі так, быццам усяму віной — яна.

Дзяўчына не ведала, што і адказваць, толькі глядзела шырока адкрытымі вачамі: вось тыя людзі, пра якіх яна дагэтуль толькі чытала. Нездарма ў іх стралялі ў рэвалюцыю! І Зіна мацней сціскала зубы.

Неспадзявана выбухнула вайна.

Фашысты Зіне ў Гродне нічым не пагражалі — яна была ўсяго звычайнай лабаранткай. Яны не забілі нікога і з яе радні. Адным словам, у яе не было прычын для асабістых разрахункаў з ворагам.

Дзяўчына не паспела атрымаць ні інструкцыі ў райкоме, ні парады ад таварышаў, бо іх раптам пагубляла. Аднак з самага пачатку вайны шлях сабе абрала правільны. Калі чалавек у душы сумленны, мае сваю мэту, ён па наказу сэрца зробіць тое, што трэба. Па закліку сумлення Зіна і пайшла ў партызаны.

**10**

Пасля блакады мінуў месяц. Я ўжо ад'еўся і паправіўся.

Зіна цэлы тыдзень была з групай у паходзе, а цяпер вярнулася.

— Бо-ожа, якая ў цябе кашуля! — першае, што яна сказала, калі мяне ўбачыла.

— Што ты, яшчэ зусім нармальная!..

— Скідай, скідай хутчэй! На, апрані чыстую. Несла спецыяльна дзвесце кіламетраў, з-пад самага Беластока!

— Пасля вайны будзем у крухмаленых хадзіць...

— Не лянуйся, апранай!

— Жывецца чалавеку як у мамкі за пазухай... Э-эх! — уздыхнуў малады партызан.

— Соль табе ў вочы! — агрызнулася задаволеная дзяўчына.

— Заслужы, будуць насіць і табе!

— Барташэвіч, навучы, браток!

Мы спаткаліся на вачах у людзей. Побач на возе ляжаў паранены і чакаў аперацыі. Хлараформу не было і медсястра дала яму спірту. За возам доктар тачыў нажоўку. Ля яго двое партызанскіх дзетак прабавалі, у каго мацнейшы лоб. Дзве дзеўкі круцілі жорны, малолі на хлеб муку і не спускалі з нас вачэй.

— Хадзем адсюль! — шапнула Зіна, калі я нацягнуў чыстую кашулю.

Агорнутыя ўзбуджаным хваляваннем, мы, хаваючыся за фурманкі і буданы, падаліся ад зямлянак у лес.

Сама адцвітаў ландыш. Паветра п'яніла пахамі разапрэлай на сонцы зеляніны. Шасталі па халявах сухія былінкі, пахрустваў пад падэшвамі мох, усланы сетачкай ігліцы, утыканы шышкамі. Ад балота цягнула прахалодай. Але мы нічога гэтага не бачылі, адно адчувалі, што адышлі яшчэ мала. Нешта дрыжачымі галасамі гаварылі. Абаім хацелася бегчы, і толькі стрымлівала сарамлівасць.

З дрэва капнула Зіне на твар расінка.

– Дождж! — схлусіла яна.

Гэтае прытворства якраз было патрэбна і мне. Я пабег за ёю.

Мы апынуліся ля густога сасонніку. Зіна стала плячамі да дрэўца, нібы схавалася ад дажджу, выдыхнула:

– Стань побач!

Яе кароткія пальцы з мужчынскімі пазногцямі пачалі нервова і бязладна рваць зялёныя іголкі, быццам іголкі гэтыя — мяккія лісточкі мяты. Сама яна аж задыхалася.

– Ваня, ну! — папрасіла з тугой пабялелымі вуснамі.

Але я ўжо паспеў астынуць і нібы прачнуўся. Раптам адчуў, што ў адносінах з Зінай даўно перайшоў граніцу і што трэба з гэтым канчаць, пакуль не позна. Паглядзеў на ўсё цвярозымі вачамі.

Ніякая сіла не магла цяпер прымусіць мяне зноў дакрануцца да Зіны. Вось ужо і забыўся, што на мне яе кашуля. А тую кашулю, што калісьці мне памыла над Віліяй Дануся, дык і цяпер памятаю, нават ведаю, дзе яна дома ляжыць. Калі бываю дома, абавязкова на яе пагляджу...

Я паспрабаваў успомніць, колькі дабра зрабіла мне Зіна, пераламаць сябе, каб не крыўдзіць дзяўчыны, хоць пацалаваць яе: не адсыхалі ж мае вусны раней?!.

Не. Гэта было б падвоенае ашуканства. Трэба з гэтым канчаць раз і назаўсёды. Зіна для мяне была як сястра і маці, ці можна без канца яе ашукваць, абнадзейваць, выкарыстоўваць яе пачуцці?

І яшчэ. Адзін крок — і, мне здаецца, я страчу сваю незалежнасць. Ва мне абудзіўся інстынкт самаабароны.

– Ну, што ты?! — шаптала яна.

– Не трэба, Зіначка! — папрасіў я і далікатна адпіхнуў яе.

– Чаму? — выдыхнула яна горача.

– Я табе даўно збіраюся прызнацца...

— У чым?

— Ведаеш... Некалькі год я закаханы ў аднаго чалавека... Толькі не крыўдуй на мяне,— узмаліўся я, не ведаючы, як мякчэй зрабіць прызнанне, каб не было ёй так балюча.

Здалося, што на момант усё на свеце замерла, такая наступіла цішыня.

Раптам у гэтай цішыні пачуўся зычны трэск, а ў мяне перад вачамі ўсё захісталася — Зіна з усяе моцы пляснула мяне па твары.

Хвіліну я стаяў як ачмурэлы.

Так. Першы раз у жыцці атрымаў я па фізіяноміі. І дзіўна. Не раззлаваўся, не пакрыўдзіўся. А гатоў быў падставіць шчаку яшчэ і сказаць: бі, Зіначка, калі табе ад гэтага лягчэй, на, бі, бі!

Зіна закрыла твар рукамі і захісталася ад роспачы.

— Ох, якая я дурная!.. А я ду-умала!..— застагнала яна цяжка.

— Я ж ні ў чым не вінаваты, усё гэта адбылося міжволі...

Гэтым я яшчэ больш распаліў дзяўчыну.

— Змоўкні, ты... не чалавек!.. Бо-ожа... Я ўся аддавалася яму і не ведала, што ў гэты час ён думае аб другой! Бо-ожа, завошта на мяне такая кара!.. Каб ты... Каб цябе...

Я зазлаваў. А ў чым я вінаваты? Выходзіць, каб прамаўчаў, было б лепш?!.

Каб супакоіцца, адышоў крыху ў лес.

Калі я вярнуўся, Зіна ляжала на траве і плакала, як толькі можа плакаць чалавек у вялікім горы. Яна ўся аж уздрыгвала ад болю і бяссілля:

— І навошта я такая нешчаслівая нарадзілася на свет?..

Я бездапаможна таптаўся на месцы.

— Хто яна? — насцярожана прыпаднялася Зіна.

— Ах, ты не ведаеш!

— Не, скажы!

— Што табе за карысць з гэтага?

— Не, ты скажы!

— Яшчэ невядома, ці засталася яна жывая пасля ўсяго, што здарылася за тры гады...

— Хто?

— Разумееш, яшчэ да вайны я вучыўся ў Вільні і закахаўся там у адну...

— Ну?

— І з той пары не магу нікога пакахаць. Хачу, а не магу. Не дам сабе рады...— паскардзіўся я, як заўсёды шукаючы ў яе спачування і падтрымкі.

Яна мяне не слухала.

— Прыгожая? — у яе голасе пачулася варожая зайздрасць да незнаёмай саперніцы.

— Вядома, не такая брыдота, як я! — Зіна прамовіла гэта з нейкай нянавісцю да сябе.

Толькі цяпер я зразумеў, што вельмі вялікае гора ў дзяўчыны, каб яшчэ спачуваць мне.

У лагер вярталіся мы не разам. Я быў злосны і нездаволены сабой. Наўрад ці ўдасца яшчэ калі мне спаткацца з Данусяй. Дык што, так і бадзяцца да старасці аднаму?

## РАЗДЗЕЛ ЧАЦВЁРТЫ

1

У наступную зіму стаялі мы кіламетраў за семдзесят на поўнач ад Гродна, у Друскенікскім лесе. Узрыўчаткай нас ужо забяспечвалі з Вялікай зямлі. Партызанскі аэрадром быў тады далёка, аж у Літве, на возеры.

Яшчэ мінулай восенню ў нас пабывалі прадстаўнікі Штаба партызанскага руху. Яны арганізавалі падпольныя райкомы, абкомы, рэдакцыі газет. З асобных груп стварылі стройную сістэму партызанскіх атрадаў, брыгад, злучэнняў. Цяпер мы сталі грознай арганізаванай сілай.

Я тады быў камандзірам узвода разведчыкаў.

У пачатку лютага паслалі мяне на аэрадром за грузам, што прыслалі нам з Масквы. Са сваімі хлопцамі накіраваўся я на возера.

За лагерам нас дагналі некалькі саней — гэта адпраўляўся на заданне атрад. Хлопцы ехалі па-партызанску, са свістам і гіканнем, трымаючыся за дручкі, за кажухі сяброў, стоячы на адным калене, на полазе...

— Раз-вед-чы-кі-і, даро-огу-у!

Мае хлопцы не разгубіліся і на хаду пачалі ўскакваць у сані.

Я таксама схапіўся за сані і ўпаў некаму на галаву, балюча ўдарыўшыся аб чужы дыск брывом.

З крыкам і жартамі партызаны пацясніліся, і я сяк-так прымасціўся і стаў церці пабітае месца. Тут я толькі ўбачыў, што сяджу разам з Зінай. Заражаная агульнай весялосцю, яна мяне

таксама спачатку не заўважыла. Пасля лета мы яшчэ ні разу з ёй не размаўлялі.

— Гэта ты-ы? — міжволі вырвалася ў мяне.

Зіна прамаўчала. Толькі твар яе пасур'ёзнеў.

Ехалі мы на нізкіх драўляных развалках. На іх і ад звычайнай язды кружыцца галава. А цяпер сані проста ляцелі, і ад гэтага ўсе былі як п'яныя і на нас з Зінай не звярталі ўвагі. Я дакрануўся да яе рукі, якая трымалася за дручок. Зіна не адказала. Тады я асцярожна адарваў яе руку, пераплёў яе пальцы сваімі і ціха сказаў на вуха:

– На тым скрыжаванні буду злазіць... Зіна, давай памірымся! Няўжо не даруеш? Прабач...

Яна крадком азірнулася, тады паднесла маю руку да грудзей і мякка, далікатна пацісьнула мае пальцы.

– Дзякуй, Зінка!

– Шчасліва...

Узрадаваны, вылецеў я з саней да сваіх хлопцаў, якія ўжо абтрасаліся ад снегу.

– А намяло-о, браткі ж вы мае-е! — закрычаў адзін партызан. — Пратупай па такіх гурбах сто кіламетраў — ногі адваляцца.

– Дзе ты бачыш гурбы! Гэта ж паркет — першай клясы! — заразіў я хлопцаў добрым настроем.

– Даёш паркет!

**2**

Дзён праз пяць прыбылі мы на месца. З «дугласа» ўжо выгрузілі запакаванае ў брызент партызанскае дабро. Да прадстаўніка злучэння — вялізнага літоўца Шымкаса — падыходзілі па чарзе камандзіры груп, і ён надзяляў іх брызентавымі цюкамі.

Я таксама прымасціўся ў чаргу і ад няма чаго рабіць пачаў разглядаць дзяўчыну.

Яна стаяла збоку і зграбным носікам выдыхала ў настылае паветра струменьчыкі пары. Ад марозу і балотнай сырасці барты яе новага кажушка, вушанка заінелі, а белыя валёнкі і вопратка былі без ніводнай плямкі, як з іголачкі. Яны нагадвалі тылавы дастатак і спакой. У дзіцячым тварыку прабіваліся пашана і наіўнае захапленне ўвішнымі партызанамі. А хлопцы падхоплівалі брызентавыя цюкі і неслі іх да саней.

Адзін цюк партызаны разрэзалі і заглянулі ў яго:

– Э-э, зноў «сюрпрызныя» міны!

Такія міны ў нас карысталіся дрэннай славай, на іх узарваўся не адзін партызан.

— Казімір Вітольдавіч! — узмаліліся хлопцы да Шымкаса. — Лепш будзем паравозы за колы сцягваць з рэек, толькі не давайце гэтай дрэні!

— Геро-оі!.. Не ўмееце карыстацца ўзрывальнікамі. Глядзіце сюды, пакажу вам без толу... Во, гэтую чаку трэба выцягнуць, гэтыя вусікі загнуць...

— Ага, без толу яна не ўзарвецца! Дзяўчына на ўсё гэта глядзела з уміленнем. Новенькі аўтамат яе — заінелы, хоць пішы на ім пальцам,— быў сістэмы ППШ апошняга выпуску. Дзяўчына, мабыць, з Вялікай зямлі. Відаць, са службы аховы самалёта.

У той дзень я дрэнна сябе адчуваў.

Хвароба яшчэ толькі пачыналася: мяне ўсё раздражняла, я сам не ведаў, чаго хацеў. Раздражняла гутарка людзей, смех, нават іхняя вопратка. І чамусьці зусім злавала мяне прысутнасць гэтай дзяўчыны.

«Партызанскай рамантыкі шукаеш, начыталася кніжачак! — падумаў я непрыязна.— Добра, што хутка вернешся ў цёплую кватэру з водаправодам і цэнтральным ацяпленнем!..»

Яшчэ падумаў, што такой, мабыць, выглядала б і Данута, каб пераапрануць яе ў вайсковае і даць аўтамат.

Я ўздыхнуў.

Ад чэрвеньскага вечара, калі лазіў на ясень, мінула амаль чатыры гады. Столькі падзей адбылося! Але каханне — дрэўца, якое расце, калі на яго мы і не глядзім. Я часамі не знаходзіў сабе месца.

— Вам — радыстка! — перарваў мае думкі прадстаўнік злучэння і паказаў на аўтаматчыцу: — За-бірайце!

— Адну-у?

— А колькі б ты хацеў, дзесяць?

— Было з-за чаго валачыся!

Я ўжо вельмі шкадаваў, чаму замест бездапаможнай дзяўчынкі не далі мяшок толу або патронаў ці нават «сюрпрызных» мінаў, у іх хоць узрыўчатка добрая. З гэтай адно клопатаў набярэшся. Яна — не Зіна Кварцёнак.

Маё расчараванне заўважыў прадстаўнік. Ён вылаяўся на мароз, парыпаў нагамі, быццам у яго пад валёнкамі быў не снег, а сухі крухмал, нязграбна пагартаў паперы чырвонай набрынялай рукой і яшчэ раз зірнуў у спісы.

– Атрад Чапаева?.. Зараз, дзе ён тут у мяне... Э-ээ...— пацягнуў ён угару...

Шымкас прыціснуў рукой адну ноздру, чхнуў з сілай праз другую і паскардзіўся:

– Прастудзіўся дзесьці, мацъ яго за нагу!.. Ага, вось атрад Чапаева. Ну, чаго ты хочаш? Вам тут выпісана: радыстка — адна! Рацыя — таксама адна. Вунь яны стаяць!

– Бачу сам...

– Дацъ яму яшчэ што-небудзь!

– Не крыўдзіце маленькага!

– Падкі-інуць! — крычалі адвакаты за маёй спіной.

– Барташэвіч, збірай сваіх хлопцаў і марш адсюль! Трэба адпраўляць самалёт ды разыходзіцца ўсім, пакуль нас не засеклі і не накрылі тут фрыцы!..

Я ўлавіў пакрыўджаны позірк дзяўчыны, але мне было не да сантыментаў.

– Ну, айда, бярыце рацыю! — злосны на скупога літоўца, загадаў я сваім хлопцам.

– Я сама! — неспадзявана цвёрда запярэчыла радыстка і закінула бляшаную скрынку ў зялёным футляры за плечы.

– О-го! — здзівіліся партызаны.

На яе глядзелі дзесяткі пар мужчынскіх вачэй. Дзяўчына паспешна зашпільвала на грудзях рамяні. Далоні яе былі маленькія, а пальцы — тонкія, з чыстымі і старанна паабразанымі пазногцямі — дакладна як у Данусі!

Я адчуў сябе вінаватым і падышоў да радысткі:

– Давайце, дзяўчынка, пазнаёмімся насамперш!

– Не дзяўчынка, а дзяўчына! — падала яна кончыкі пальцаў.

– Ух ты-ы!

– Прытым у мяне ёсць імя — Станіслава Эдвардаўна Дварэцкая. Запамятайце сабе: Ста-ніс-ла-ва Эд-вар-даў-на Два-рэцкая! — паўтарыла яна. Узнімаючы шэрыя з заінелымі вейкамі вачаняты, з'едліва дадала: — А можна і таварыш Дварэцкая!

– Ну і нарваўся наш Барташэвіч! — паспачувалі мне хлопцы.

– Пагарэ-эў!..

Але ніхто не засмяяўся, Усім зрабілася няёмка перад гэтай сімпатычнай госцяй. Хлопцы ўжо з дакорам глядзелі на мяне.

3

Незвычайная была дарога ў лагер.

Нібы маім хлопцам хто ўвёў цудоўнае ўзбуджальнае лякарства, яно памаладзіла і дадало ім сілы.

Ніколі яшчэ так па-заліхвацку не сядзелі на галовах аблезлыя кубанкі з чырвонымі стужкамі. І ніколі ў партызан так не былі расхрыстаны грудзі. Кожны нібы казаў гэтым: а ну, каторы з нас найбольш не баіцца холаду, выбірай!

Усе вярцеліся перад Стасінымі вачамі. Нават перасталі лаяцца. А калі прыходзілі ў вёску, адзін перад другім галантна прапаноўвалі ёй немаведама як і дзе дабытае малако, масла, сыр.

Я сваіх хлопцаў добра ведаў. Раней калелі да смерці, а буданоў сабе не рабілі. То не было з чаго, то не было чым — проста валіліся ў снег, падцягвалі калені пад бараду і дрыжалі ў дрымоце. Затое для радысткі на кожную днёўку ў момант сплячалі буданчык — люба глянуць.

Толькі што скончылася Сталінградская бітва, і з Масквы перадавалі прыемныя весткі. На ўзбярэжжы Міжземнага мора саюзнікі таксама грамілі немцаў. Гэта яшчэ больш заражала хлопцаў энергіяй. Калі дзяўчына выказвала жаданне ставіць рацыю, кожны з партызан лічыў за шчасце круціць дынамку. Адзін перад адным лазілі яны па дрэвах, развешвалі антэну.

– Не туды цягнеш! — спрачаліся.— Бачыш, якая тут густая елка!

– Ну і што?

– Што, што-о!.. Ведаеш, колькі ў яе іголках жалеза — магнітныя хвалі не будуць даходзіць у антэну! Стася не зможа прыняць радыёграмы!

– Выдумвай!

– Дубіна, слухай! Яна сама ўчора нам апавядала. Ты быў на варце якраз!

– Ну-у?

– Не нукай, не запрог!

– То ў які бок цягнуць?

– Так бы і спытаўся адразу! Бярэцца яшчэ за такую справу, ні шыша не разумеючы!

– Даўно ты пачаў шмат ведаць!

– Больш за цябе!..

Іншым разам радыстка, прачнуўшыся, расчырванелая ад цеплыні ва ўхутаным плашч-палаткамі буданчыку, нападала на партызана:

— Таварыш Трухан, чаму мяне не пабудзілі на пост, калі падышла змена!

— Стасенька, родная, далібог, забыўся! — захлынаючыся ад шчасця, што ўдалося ашукаць дзяўчыну, па партызанскай звычцы хлопец ужо называў яе на «ты».

— Заўтра дзяжуру і за сябе і за вас!

— Вядома, аддзяжурыш! Назаўтра паўтаралася тое ж самае.

Аднаго дня Стася яшчэ спала. А хлопцы ад холаду ўсхапіліся са снегу і стараліся сагрэцца: штурхаліся, тупалі, скакалі... Раптам Трухан закрычаў:

— Глядзіце, што я ў кустах знайшоў! Партызаны абступілі яго, разглядаючы скураную рукавічку.

— Чыя, ніхто не прызнаецца!

Добра ведалі, чыя рэч, і хлопцы, але не спяшаліся адказваць. Нібы гэта была не звычайная рукавіца з труса, толькі да смешнага малая, пашытая поўсцю ўсярэдзіну, а - сонца, якое ўсіх абагрэла.

— Гляджу, штосьці ляжыць. Падымаю, ажно...— Шчаслівы Трухан трымаў рукавічку так асцярожна, быццам яна была з павуціння.

Кожны хацеў бы патрымаць яе таксама. А Трухан, бадзяга, на зайздрасць усім, яшчэ ўсадзіў свае брудныя і струпастыя пальцы ў шаўкавістую воўну:

— А цё-оплая, кхэ!

— Ну, ты! — закрычалі на яго адразу.— Гэта Стасіна!

— Стасіна?

— Не ведаеш!.. Пакладзі ў будан!

Хлопцы адразу неяк падабрэлі, парабіліся ціхія, паслухмяныя. Яшчэ доўга я заўважаў, як стараліся яны пабыць адзін на адзін з сабой, як свяціліся іхнія вочы.

У групе былі бывалыя сэрцаеды, і кожны з іх меў яшчэ свайго балельшчыка. І як балельшчыкі ні стараліся падгледзець які-небудзь поспех свайго аўтарытэту, Стася была з усімі аднолькава ветлівая. А гэта вельмі інтрыгавала.

Яшчэ інакш радыстка ставілася да мяне. Яна ўмудралася гадзінамі быць са мной і маўчаць, гледзячы на мяне нібы на пустое месца.

Стася была прыгожая, перад ёй так і хацелася парысавацца, паказаць сябе з найлепшага боку. Хлопцы і не падазравалі, што радыстка і мяне заінтрыгавала. Толькі я быў у горшых умовах.

Гордасць не дазваляла набівацца са сваімі паслугамі, бо гэта выглядала б так, нібы выкарыстоўваю службовае становішча. І пасля

сцэны на аэрадроме было брыдка. А прасіць прабачэння не прывучылі мяне змалку. І са Стасяй я не гаварыў. Толькі зайздросціў сябрам, што могуць адкрыта ёй зрабіць паслугу, і крадком пазіраў, як радыстка з жаночай нязграбнасцю ў ватных штанах месіць снег. Моўчкі ішоў я следам і лаяў сябе за нетактоўнасць.

Так мы і брылі чатыры дні.

**4**

Падыходзілі мы да крыніц. Праклятыя, іх нават не адзначылі на картах-кіламетроўках, а ў прыродзе яны існавалі.

Крыніцы гэтыя перасякалі балота ў некалькіх мясцінах. Іх зімой не скоўваў лёд. У вялікі мароз з іх толькі валіла пара, і народнае павер'е сцвярджала, што там зімуюць лебедзі.

У наш лагер вялі тры дарогі. Адна — каля стаянкі атрада Арміі Краёвай[1], яна адпадала зусім. Заставалася другая, далёкая, або трэцяя — праз гэтыя балоты.

Калі б крыніцы замерзлі, у лагер мы прыйшлі б на суткі раней. Так апрыкраў холад, што мы згадзіліся б ісці і скрозь агонь, абы хутчэй дабрацца да цёплых зямлянак. Чамусьці апошнія метры здаюцца найцяжэйшымі.

Я адправіў на балота разведчыкаў, а групу павёў на знаёмы хутар. Праз нейкі час мы апынуліся ў хаце.

І тут мае хлопцы рысаваліся перад Стасяй. Удыхнуўшы цёплага паветра, партызаны напоўнілі памяшканне маладымі бадзёрымі галасамі: глядзі, якія мы тут свае, як мы хутка дамаўляемся.

— Цётачка, нам бы крыху вады, а то есці ахвота і пераначаваць няма дзе!..

— Ах, божа, то што ж я вам дам, саколікі мае!..

— Кіслая капуста е?

— То е-е-е...

— А хлеб?

— Чаму ж і яму не быць!

— Нясіце місу, толькі поўную!

— І кола хлеба самае большае!

— Сала кавалачак...

І пачаліся бразганне, смачнае хрумстанне і жарты, пасля якіх ад рогату аж уздрыгваў кволы агеньчык лямпы.

---

1 Польскія партызаны дзяліліся на некалькі палітычных груп. Групай Арміі Краёвай камандавалі пераважна былыя пілсудчыкі, да савецкіх партызан яны адносіліся непрыхільна.

Добра наеўшыся мёрзлага сала з квашанай капустай, апаражніўшы цётцы ўсе збаны з кіслым і салодкім малаком, хлопцы як сядзелі, так і пазасыналі. Толькі ў куце капашыліся яшчэ двое.

– А братка ты мой, ну і брудная ж у мяне кашуля! — паскардзіўся адзін партызан.

– Глядзі толькі, каб сумленне было чыстае! — параіў другі.

– Будзь спакойны за маё сумленне!

У гаворку ўмяшаўся дзед — гаспадар хаты. Ён расказаў, як у 1863 годзе адзін польскі паўстанец уцякаў ад царскіх войск і залез у дупло. Там казакі яго і застрэлілі.

– ...Я быў яшчэ хлопцам,— правіў стары. — Спілавалі мы з бацькам дуб, а ў дупле — заржавелая стрэльба, чалавечыя косці, гузікі, спражка. Селі мы і думаем: што з гэтым рабіць? Закапалі ля трубы, на капец крыж паставілі...

Радыстка перад печчу пераабувала валёнак і строга па інструкцыі трымала аўтамат між каленяў. Цяпер можна было добра прыгледзецца да дзяўчыны: яна глыбока задумалася, не слухала ні хлопцаў, ні дзеда, не адчувала і майго позірку.

У яе і Данусі я знайшоў штосьці агульнае: аднолькавую манеру гаварыць намёкамі і трымаць сябе незалежна, з годнасцю... Стася нават прычоску і вопратку пры нашых умовах умела захаваць у такім парадку, на які, мабыць, здольны адно палькі.

Даўно я чакаў моманту для размовы. У мароз яшчэ не паспею прачнуцца, а падумаю, што з намі — Стася, устаю і з вечара да раніцы асцярожна і цярпліва вартую. Нарэшце хвіліна надышла... Трэба развеяць дзяўчыну.

Стася скончыла пераабувацца, устрасянула галавой, рассыпала цёмна-русыя кудзеркі і прыгаршчай правяла па валасах ад ілба да патыліцы з аднаго боку галавы, потым з другога — дакладна як некалі рабіла гэта Дануся над Віліяй. Яе аўтамат быў надта запацелы.

– Вытрыце яго, бо адразу заржавее! — падаў я анучку.— Праўда, праўда, заржавее! — І спахапіўся, што выражэнне «праўда-праўда» — Данусіна.

– Дзякуй,— узяла яна анучку і абыякава стала церці ёй аўтамат.

Я ўспомніў, што яе імя — Стася. Замест «малако» і «званіць» гаворыць «моко» і «дзваніць». Дайшоў і да сэнсу дзедавага апавядання. Падумаў, што палякі ў часы небяспекі куды больш салідарныя, чым мы; яны майстры рабіць паўстанні, і наўрад ці хто лепш за іх умее канспіравацца. У падпольнай рабоце нам не хапае

іхняй тонкасці. Нядаўна ў Варшаве фашысты знялі польскі надпіс з помніка Каперніку і замянілі яго нямецкім: «Дэм гросэн дойчэн астрономэн». Ноччу падпольшчыкі знялі шыльду і на цокалі зноў па-польску напісалі: «За тое, што вы хацелі мяне зрабіць фольксдойчам, я прадоўжваю зіму на шэсць тыдняў. Мікалай Капернік».

Палякі гордыя. Люблю гордых людзей. А яшчэ яны маюць цікавы звычай: жанчын называюць паняй, незамужніх дзяўчат — паненкамі, а мужчын усіх — і міністра, і столяра — пан; у ветлівай форме да чалавека звяртаюцца ў трэцяй асобе...

Кажуць, што з усіх жанчын полькі вылучаюцца вытанчанымі густамі, пачуццём прыгажосці, як немкі — акуратнасцю.

Калісьці мы, беларусы, непрыязна адносіліся да іх. Каб часамі павучыцца ў палякаў, колькі мы сказалі ў іх адрас абразлівых слоў? Я нават на Данусю глядзеў спачатку варожа з-за яе нацыянальнасці!

— Вы полька? — спытаўся я з пашанай.

Але час для знаёмства выбраў няўдалы. Чацвёра сутак пераходу на такім холадзе для яе было занадта, і яна зрабілася запальчывай:

— А вы ведаеце, што два генералы Парыжскай камуны і Фелікс Дзяржынскі былі таксама палякі?! Мой тата — член ЦК Польскай кампартыі і загінуў у Інтэрнацыянальнай брыгадзе ў Іспаніі. Гэта вас таксама здзівіць?

І Стася ад стомы і ад таго, відаць, што партызанскае жыццё не такое, якім сабе ўяўляла, расплакалася. Плакала, не хаваючы твару, з крыўдай, нібы я ўсяму віной.

5

У хату ўваліліся разведчыкі:

— Камандзір, крыніцы не замерзлі!

Хтосьці адпусціў вострае слова ў адрас Арміі Краёвай, але партызана зараз жа абрэзалі.

Трэба было вырашаць, як ісці. Я ўявіў сабе радыстку ў вадзе, убачыў нават, як яна вылазіць з ледзяной тоні ў прыліплай і пацямнелай гімнасцёрцы, як затым панцырам змярзаецца яе вопратка... Яна калі і пройдзе брод, дык потым наўрад ці вытрымае! Колькі яе? Кілаграмаў шэсцьдзесят з вопраткай!.. — Усё роўна пойдзем бродам! Пад'ём!

Пакуль прачыналіся партызаны, бразгалі зброяй і пазяхалі, Стася непрыкметна выцерла слёзы.

Ужо развіднела, але немцаў мы не баяліся: блізка партызанскі лагер. На балоце з крыніц узнімалася пара, нібы пад снег нехта закапаў катлы з варам.

— Ну, хлопчыкі, рыхтуйцеся прымаць ванны!

— Ад раматусу!

— Ого, па-лаціне ўжо загаварыў!

— Гэтае слова ведала нават мая маці!

— Чаму валёнак не здымаеш?

— Яны воданепранікальныя! — паддавалі сабе бадзёрасці партызаны і ішлі да вады.

Затрашчала альшына: хлопцы выламвалі сабе тычкі. Яны паздымалі кажухі, пінжакі, разам з аўтаматамі паднялі іх над галовамі і адчайна закрычалі:

— Э-эх!.. Мама родная!

— Да чаго вада халодная!

— Караўул!

— Ух-х!

І апынуліся па пахі ў ледзяной жыжцы. Адна Стася нерашуча тапталася на беразе, але і яна пачала расшпільваць кажух.

— Я вас перанясу! — аб'явіў я радыстцы.

У вачах дзяўчыны з'явіўся жах.

— А я не хачу... Пайду, як усе...

— Мяне не цікавіць, што ты хочаш, чаго не хочаш! — зазлаваў я.— Тут камандую я, а ты будзеш мяне слухаць! І не думай, што насіць цябе на руках вялікае шчасце!..

Стася паўзіралася на мяне з разгубленай паслухмянасцю.

Я аддаў рацыю партызану, узяў дзяўчыну на рукі і пайшоў.

Пякучая як агонь вада даходзіла да грудзей, але цяжар дадаваў мне ўстойлівасці. Толькі часамі я правальваўся глыбей, і тады Стася інстынктыўна хапалася за маю шыю, але зараз жа аднімала рукі і вінавата ўскрыквала:

— О-ей, даруйце, я незнарок!

Гэтым яна толькі перашкаджала і адцягвала ўвагу.

— Сядзі і маўчы! А то кіну ў ваду і будзеш ведаць

Стася змоўкла.

Далей яна нават старалася мне дапамагчы. Сядзела нерухома, калі не дыхаў я, пераставала дыхаць і яна. Паміж намі ўстанавілася блізкасць. Стала яе шкада.

— А ведаеш, я памыліўся. Цяпер бачу, што з-за цябе можна і памокнуць...

— Та-ак? — разгублена працягнула яна.

Але зараз жа дайшоў да яе жарт, у вачах з'явілася ігрывасць, і яна стала яшчэ сімпатычней.

І тут, на марозе, брыдучы па пахі ў вадзе, якая пякла агнём, забівала дых, я ўспомніў, што і Дана ўскрыквала «О-ей!». Пырскі рэзалі твар і вочы, застывалі на каўняры, а мне хацелася верыць, што валасы, якія вылазілі з-пад яе вушанкі мне на лоб,— Данусіны.

Нарэшце мы выбраліся з ледзяной тоні.

— Тут ужо суха, пусціце! — ускрыкнула дзяўчына і скочыла на зямлю.

Хлопцы нас ужо чакалі. Яны ляскалі зубамі і скакалі, што вар'яты. З мяне ў снег сцякала вада і валіла пара, быццам вопратку абліў хто варам. Стася глядзела на ўсё гэта з вінаватым спачуваннем. Я яе разумеў. Яна хацела падзякаваць, але ёй, відаць, здавалася — вельмі мала аднаго слова.

Нарэшце я праламаў лёд між намі.

— Не бойся, нічога са мной не здарыцца. Праз гадзіну высахну! — супакоіў я дзяўчыну.

— Камандзір-р-р, ведаеш, што я пр-р-рыдумаў? — ляскаючы зубамі, ледзь вымавіў Трухан. Яго язык нібы спатыкаўся на «р».

— Што?

— Калі зловім Гітлер-р-ра, халер-р-ру, пакуль адсылаць у Маскву на р-р-расстр-р-рэл, давай пр-р-ратр-рымаем зіму фюр-р-рэ-р-ра ў кр-р-рыніцах!

— Толькі злаві! — дазволіў я пад рогат сяброў.

Першы раз шчыра і непасрэдна ўсміхнулася радыстка.

— Ну, пайшлі! — прыязна паказаў я дзяўчыне ісці першай.

І мы падаліся далей ужо сябрамі. Стася часта і заклапочана азіралася на мяне, быццам хацела ўпэўніцца, ці жывы яшчэ, а мне зноў здавалася, што гэта Дануся.

Заныла сэрца.

6

Вярнуліся мы ў лагер апоўначы. Сябры разышліся па сваіх зямлянках адсыпацца. Я далажыў камандзіру, здаў радыстку і таксама пайшоў да сябе.

У зямлянцы — здаровы партызанскі храп. Вобмацкам знайшоў я свабоднае месца і ўціснуўся на нары. Прыемная цяплынь агарнула мяне ўсяго, і я адразу заснуў каменным сном змардаванага чалавека.

Прачнуўшыся, пачаў даходзіць да ладу, дзе я і што са мной. Панаваў паўзмрок. Падала толькі святло ад печкі, у ёй весела патрэсквалі сухія дровы. Побач на саломе — таварышы. Партызан — хадзячая энцыклапедыя — кагосьці павучаў:

— ...Назва «рэвальвер» паходзіць ад англійскага слова «ту рэвольв», што па-нашаму азначае — «круціцца». Рэвальвер адпавядае нашаму нагану, бо ў ім круціцца барабан...

Я здагадаўся, што ўжо вечар, а я праспаў канец ночы і цэлы дзень. Цела маё абнавілася, стала свежае і моцнае. Толькі на душы была нейкая цяжкасць. Калі хлопцы ўбачаць, што не сплю, засыплюць пытаннямі: як садзіўся самалёт на возера, ці быў лётчык з пагонамі (якраз іх тады ўвялі), як прайшлі крыніцы, дзе стаяць немцы... А мне цяпер зусім не хацелася дзяліцца ўражаннямі, я прагнуў пабыць адзін. Таму я і не варушыўся. Пачаў успамінаць: што такое здарылася? Ага, Стася! І зараз жа — Данусяі!

— ...А пісталеты маюць плоскую рукаятку і ў ёй — магазін. Могуць быць і браўнінгі, вальтары, парабелумы — усе маркі заводаў, бы наш ТТ...

От жа знайшоў тэму!

Гутарылі маладыя, неабстраляныя партызаны. Зброя для іх была яшчэ рамантыкай, як для мяне некалі ў Вільні. Цяпер мне яна здавалася ненавісным і цяжкім кавалкам жалеззя, я з велізарнай прыемнасцю закінуў бы і свой пісталет, і аўтамат у кусты, калі б не трэба было ваяваць з немцамі.

Асцярожна, каб не шастаць саломай, я падняўся і вышмыгнуў з зямлянкі.

Мяне апанаваў нейкі неспакой... «Нават кольт украла ў бацькі. Узняла з-за мяне ліцэй супроць Залескага. Прызналася сама ў каханні. На якія толькі не ішла ахвяры!.. А я? Адно цалаваў».

Раптам я ўспомніў цёплы пах яе цела. Дануся выразна паўстала перад вачамі і выклікала тужлівы боль. Чамусьці я быў упэўнены, што яна цяпер у Вільні. Мне, мужчыне, як цяжка ў вайну, а ёй?.. Захацелася яе, слабую, абараніць, заступіцца, дапамагчы.

— А-у-у-у! — апрытомніла мяне далёкае выццё ваўкоў.

Я прыслухаўся.

Адзін драпежнік выў нізка, гнусава, да жудасці паныла і тужліва. Потым да яго далучылася скавытанне, поўнае пакут і болю. Азваліся і іншыя. Лясное рэха падхапіла гэтыя гукі, памножыла іх, і праз хвіліну не стала чуваць асобных галасоў, гучала толькі адна жудасная сімфонія. У партызанскіх буданах з перапуду захраплі коні і жаласліва, у смяротнай і бездапаможнай трывозе забляяла авечка.

Я зусім апамятаўся і паглядзеў наўкола.

Стаяла месячная ноч без ветру. Перад маім носам пралунала алмазная сняжынка, збітая рэхам з галіны, і згубілася сярод мільярдаў іншых на іскрыстым снезе. Я быў ля вялізнага будана — партызан-

скай кухні. Скрозь дубцы яго працэджвалася ніклае святло ад вогнішча.

Ваўкоў, мабыць, патрывожыў наш патруль, бо выццё раптоўна сціхла. На кухні нехта моцна дзьмуў, а заіклівы дзіцячы галасок пытаўся:

— Т-т-татка, а ч-ч-чаму, каб агонь гарэў, на яго дзьмухаюць, і к-к-каб загасіць запалку, т-т-таксама т-трэба дзьмухаць?

Гэта наш кухар Васіль са сваім сынам. Васіль яшчэ толькі браўся за вячэру. Жонку яго гітлераўцы расстралялі. Фашыст, які забіў жанчыну, загадаў пяцігадоваму Лёніку пашукаць сякеру, каб раскалоць палена. Хлопчык падумаў, што фашыст хоча яго засекчы, і з той пары стаў заікам. Ужо некалькі месяцаў кухар быў у лесе з Лёнікам, і сын не адыходзіў ад бацькі ні на крок.

Расклаўшы пад катлом агонь, яны грэлі рукі. Скрозь шчыліны будана я іх бачыў нібы праз рэшата. Бацька сядзеў на калодцы, між каленяў трымаў малога і быў заняты сваімі думамі. Вушаначка хлопчыка вісела на грудзях, зачапіўшыся матузкамі за гузік паліто.

Кухар пачухаў запэцканы ў сажу нос аб хлопчыкаў вожык, чыхнуў і смачна пацмокаў ротам. Не адказаўшы сыну, надзеў малому вушаначку, засадзіў за халяву нож, узяў Лёніка за руку:

— Няхай сабе вада грэецца, а мы хадзем:

— К-куды?

— Завяду цябе ў зямлянку да дзядзькі Мікодыма.

— А т-ты што б-будзеш рабіць?

— Пайду рэзаць авечачку хлопцам на вячэру!

— І я з табой!

— Не трэба, сынок, каб ты на гэта глядзеў!

— Ч-чаму?

— Так...

Я схаваўся за густую елку.

— Т-т-татка, а ч-чаму мы ідзём і м-месяц ідзе? І ч-чаму ён такі парэзаны?

Падгледжаная сцэнка мяне растрывожыла. Я адчуў пякучую зайздрасць да Васіля і цягу да малых, захацелася патрымацца за дзіцячыя рукі, падыхаць іхнім пахам...

7

Калі я вярнуўся ў зямлянку, адзін наш хлопец апавядаў, як летам трапіў у лапы немцам і як яго ўратавала невядомая дзяўчына. Расказ гэты я чуў мо дзесяць разоў, але не звяртаў на яго ўвагі. А

цяпер з'явілася надзея і нават упэўненасць: Дануся недзе гэтаксама ратуе людзей, і мне трэба абавязкова ёй дапамагчы.

Я ўпаў на нары, лёг на спіну, падклаў рукі пад галаву і сціснуў губамі саломінку.

У Трухана засвярбела раненая спіна. Ён прачнуўся, падлажыў пад сябе аўтамат, паспрабаваў пацерціся аб дыск, ды было нязручна. Хлопец вылаяўся, устаў, падышоў да слупа, які падпіраў столь, і пачаў церціся аб сучок.

— Здурэў?! — выбухнуў я.

— А табе што? — агрызнуўся ён сонны.— Ляжы, калі ляжыш!

— Пясок у вочы сыплецца, дубіна!

— Ад яловага пня чую! — Ён спакойна працягваў занятак.

Гэта мяне яшчэ больш раззлавала.

— Што вы, хлопцы! — мірылі нас партызаны.— Пецця, не чапай слупа, і праўда, сыплецца!..

— Халерная рана зажывае, ведаеш, як свярбіць? Каб табе гэтак, ты на сцяну палез бы!

— Ідзі на двор, патрыся аб сасну!

— Паны, маць вашу... пяску збаяліся, чорт вас бяры!..

Трухан упаў на салому і адразу захроп.

— Што з табой, Ваня? Чаму ты такі стаў раздражнёны, змрочны? — звярнулі ўсе ўвагу на мяне.

— Хіба няпраўда?!. Чухаецца як слон, а яшчэ агрызаецца! Во, нават на зубах трашчыць!..

— Я ведаю, чаму ён такі,— у яго баліць сэрца! — пажартаваў нехта, нават і не падазраючы, як блізка да праўды.

— Гэта іх усіх радыстка параніла, пакуль прывялі з возера!

— А нічога не скажаш, спрытная полечка! -- Адна фігурка чаго варта!

— Штосьці нездаровіцца...— прамовіў я.

— Хлопцы, даць любоўных капель Барташэвічу!

— Кладзіся ля печы! У маёй біклажцы малако ад шалёнай каровы — пяршак! Глынеш — да раніцы нібы рукой здыме!

— Добра, толькі схаджу да начальства...

Усё раптам здалося мне малазначным, агарнула дзікае нецярпенне пабачыць Данусю: вось зараз, у гэтую хвіліну — я не мог чакаць ні мінуты!

Я накіраваўся ў зямлянку камандзіра брыгады. Не палена, зразумее і адпусціць з брыгады на два тыдні. Больш мне і не трэба... Эх, каб пусціў, панёсся б у Вільню як на крыллях!

У камандзірскай зямлянцы над рацыяй сядзела Стася. У яе пышных валасах бліпічала нікеляваная палоска навушнікаў. Дзяўчына ўся ператварылася ў слых.

— У вас работа сама...— замяўся я.

— А, заходзь, Ваня, заходзь, чаго стаў на парозе?

— Я думаў, што вы...

— Ды заходзь і зачыняй дзверы, холаду напусціш! — зашаптаў камбрыг і паказаў вачамі на радыстку: — Не перашкаджай адно!..

— Мо по-отым...— не выпускаў я дзвярэй.

— Як ведаеш, упрошваць не буду. Хутчэй — туды або сюды!

— Лепш у наступны раз, таварыш камандзір! — злосны на сябе за такое бязволле, вылецеў я з зямлянкі.

Цяпер толькі я зразумеў, што па асабістай справе ніхто ў такі час не пусціць мяне ў Вільню. Смешным выглядаў бы я, каб пачаў апавядаць камбрыгу, што калісьці там меў знаёмую генералаву дачку, што з-за яе яшчэ і цяпер сохну... Ці ж не дурань я?

Здзейсніць маё жаданне дапамог выпадак. Але цяпер раскажу, што здарылася, калі я вярнуўся ў зямлянку.

8

Калі я вярнуўся ад камбрыга, хлопцы сядзелі на нарах і моўчкі глядзелі на прамерзлага да касцей партызана, які ля печы здымаў боты.

— Ваня, Зіны ўжо няма! — шапнуў нехта з цемры.

— Як няма? — не зразумеў я.

— А так, як бывае: сёння ты ёсць, заўтра цябе няма...— паясніў Трухан.

Здарылася якоесьці няшчасце, і ўсе хавалі вочы, нібы я ў ім вінаваты.

І раптам мяне прашыла здагадка. Чорт вазьмі, які я нікчэмнік — апошнія дні нават не ўспомніў пра Зіну!.. Дык гэта яе ўжо няма?!. Па спіне прабег холад, дайшоў да галавы, аж замарочыла мазгі.

— Ты прынёс гэтую навіну? — сурова спытаўся я ў незнаёмага партызана.

Ён нічога не адказаў. Толькі раскруціў памалу сырыя анучы і падсунуў ногі да агню. Калі з іх паваліла пара, ён з асалодай крэкнуў:

— Любата!

Ясна, ён. І Зіны сапраўды няма. І ніколі больш не будзе.

Вось як яна загінула.

Выканаўшы заданне, група вярталася ў лагер і заблудзілася. Партызаны вырашылі дачакацца світання, каб разгледзецца; ляглі яны і заснулі. Калі, нарэшце, развіднела, усе аслупянелі: перад імі былі амбразуры нямецкага бункера, а вакол — чысцюткае поле, толькі кіламетры за два цямнеў грэбень лесу. Што рабіць?

– Не ўпусціце момант! — кінула Зіна.

Яна схапілася і пабегла па адкрытым месцы, адцягваючы на сябе ўвагу немцаў.

Іхні кулямётчык спачатку разгубіўся і доўга не мог пацэліць. Тады обер-яфрэйтар адпіхнуў нагой кулямётчыка і прыпаў да станкача сам. Обера гэтага мы ведалі. Прыбыў ён сюды пасля ранення на ўсходнім фронце. Першай жа чаргой скасіў ён фігурку, і яна нерухома застыла на загоне.

З бункера ў поле сыпанулі немцы. Перавярнуўшы кованым ботам Зініна цела, обер-яфрэйтар доўга ўглядаўся ў твар дзяўчыны. Тады нагнуўся і падняў тульскую вінтоўку. Павадзіўшы пальцам па бляшках, якімі быў абіты прыклад, здзіўлена паглядзеў на салдат. Тыя толькі пацiснулі плячамі. Сапраўды, было незразумела, што дзяўчына з такой зброяй збіралася тут рабіць.

– Guck mal![1] — закрычаў нехта.

І толькі тады немцы ўбачылі маленькія фігуркі партызан, якія ўжо дабягалі да лесу.

Чаму так сябе паводзіла партызанка, першы здагадаўся обер. Ён толькі кінуў:

– Heldin![2]

Пра гэта расказаў нам сувязны з хутара, на вачах у якога адбылаcа апісаная сцэна.

Потым паліцаі здзекаваліся над яе целам.

Калі я даведаўся, дзе Зіна засталася на полі, прымацаваў у наступны дзень да сядла лейцы і, калі сцямнела, ускочыў на каня. Мы былі навучаныя горкім вопытам: забітых партызанаў ворагі часта мініравалі.

Знайшоўшы цела, я асцярожна прывязаў канец лейцаў да яе рукі, сам лёг у баразну, тузануў повад і пацягнуў каня на сябе.

– Бу-ум! — раздаўся страшэнны выбух, і каня з сілай кінула на зямлю.

---

1 — Паглядзі! (ням.).
2 — Гераіня! (ням.).

## РАЗДЗЕЛ ПЯТЫ

1

З віленскага гета ўцякло да нас некалькі хлопцаў.

— Ратуйце народ! — узмаліліся яны.— Чаго вы тут выграваецеся? Ведаеце, што там робіцца?!

Кожны з іх на свае вочы бачыў жудасную трагедыю дзесяткаў тысяч няшчасных людзей. Там заставаліся іхнія сем'і, а фашысты ўжо збіраліся прыступаць да ліквідацыі гета. З вялікай масы яўрэяў там не знайшлося сілы, каб па прыкладу беластоцкага ці варшаўскага гета арганізаваць супраціўленне.

Паступова немцы перастралялі маладых мужчын, а тысячы старых, жанчын і дзяцей загналі за мураваныя сцены ў старажытныя кварталы горада.

Віленская юдэнрада[1] складалася з прадстаўнікоў набожнай буржуазіі. Замест таго каб выводзіць людзей у лясы да партызанаў, яны прапаведавалі пасіўнасць.

Адна частка рады даводзіла: чым больш даваць гітлераўцам падарункаў, тым большая магчымасць перажыць вайну. І цяклі ад іх фашыстам каштоўнасці. Нават у выглядзе імянных свастык, зробленых выдатнымі майстрамі ювелірнай справы з чыстага золата.

Штурмбанфюрэры, оберротэнфюрэры і розныя ляйтары ахвотна бралі гэтыя каштоўнасці, прыязна ўсміхаліся і ў той жа час рыхтавалі эшалоны з пустымі вагонамі. Фашысты наносілі нават візіты членам юдэнрады, дзякавалі за дапамогу, а потым бралі і вывозілі іх на расстрэл, толькі не ў Трэблінку, разам з усімі, а за горад, у Панары.

Другая частка самаўрада была бедная і дарыць не мела чаго. Каб суцешыць людзей, гэтыя члены аднавілі запылены біблейскі лозунг. «Што ж,— гаварылі яны,— калі нам выпаў такі лёс, давайце замкнёмся духоўна, пакарымся, загінем як адзін, ляжам немцам на сумленне — нас жа яшчэ чакае загробнае жыццё!.. А тых, хто паддаўся немцам і дапамагае расстрэльваць сваіх, праклянём!..»

І пры ўпамінанні якога-небудзь здрадніка юдэнрада ўвяла звычай пляваць і дабаўляць: «Няхай імя яго будзе праклятае навекі!»

А рабіны ўнушалі пастве, што Гітлера паслаў бог для выпрабавання яўрэяў, таму трэба цярпець, не гневаць Іяговы супраціўленнем і скаргамі.

Вось што адбывалася ў віленскім гета ў пачатку 1943 года.

1 Юдэнрада — самаўрад з іўрэяў, які немцы ўвялі ў гета.

Трэба было папярэдзіць людзей. І нашае камандаванне вырашыла дапамагчы ім уцякаць у лес.

Ва ўсіх штабах абменьваліся разведданымі пра горад: удакладнялі адрасы сувязных, адзначалі на картах небяспечныя месцы. У атрадах рыхтавалі хлопцаў для паходу ў Вільню. Такое заданне выпала і мне.

Некалькі дзён я патраціў на падрыхтоўку: завучваў напамяць адрасы, знаёміўся з дакументамі са штаба злучэння: яны датычылі нямецкага гарнізона. З гэтых дакументаў я і даведаўся, што Данута Янкоўская цяпер там працуе ў камендатуры перакладчыцай.

У палове лютага я адправіўся ў дарогу.

...Яшчэ летам неяк выпаўзлі мы на аўтастраду Беласток — Ваўкавыск ставіць міны. Зірнуў я тады на асфальт і сваім вачам не паверыў. Цвёрды як граніт панцыр аўтастрады, што не паддаваўся і лому, прабіў звычайны баравічок: беленькі, далікатны... Дзяўбці асфальт, дзе ён прабіўся, было б лягчэй, але мы яго пашкадавалі і тол заклалі ў іншае месца.

Цяпер, нагадваючы паход у Вільню, успамінаю той грыб: яшчэ невядома, каму з нас было цяжэй.

Горад фашысты прызналі літоўскім, але, каб адных людзей нацкаваць на другіх, адміністратыўную ўладу аддалі былым злодзеям, шпікам і правакатарам з палякаў. Гэтыя падонкі выслугоўваліся перад акупантамі, і ашукаць іх было цяжэй, бо яны ведалі ўсе хады і выхады.

Выйшаў я з групай, якую штаб паслаў пад Новую Вілейку. Ішлі мы толькі ноччу, варылі сабе ежу, жартавалі, смяяліся; удзень зашываліся ў гушчар і заміралі.

## 2

На пятыя суткі перадднявалі мы ў лесе і завідна ўвайшлі ў незнаёмую вёску. Тут група мелася збочыць на ўсход да Новай Вілейкі, а я — на поўнач.

Трэба было распытаць дарогу. У незнаёмым месцы найлепш размаўляць з селянінам без сведкаў. Я аддзяліўся і падаўся да аблюбаванай хаты.

Пад сцяной капаўся ў снезе стары, з-за пояса ў яго тырчала сякера.

— Дзень добры, бацька! Што робіце?

— Дзень добры... Хаваю топаль ад марозу. Сабака, няма на яго скanання, выграб зноў!

— Топаль?

— Але. Яшчэ перад калядамі ездзіў у лес па дровы, то вырваў з мохам пару штук. Прывёз, кінуў у снег, падумаў: вясной пасаджу, а хто будзе жыць — дачакаецца дрэва. Дык сабака...

Яго агрубелыя рукі былі без рукавіц. На скуры паміж указальным і вялікім пальцам правай рукі была вялікая трэшчына, счэпленая суровай ніткай. Вусы дзеда парыжэлі ад цыгарак. Вайна, бяда, а ён яшчэ дрэвы садзіць збіраецца!..

Ад яго выгляду, мілай і роднай гаворкі павеяла такім мірным жыццём...

— А гэта добрае дрэва? — уздыхнуў я, мяркуючы, з якога боку прыступіцца да чалавека.

—О-го, топаль, — цвярдзей за дуб! «Адкуль цвярдзей — не з той пароды!» Дзядзьку бачыў я наскрозь. Стары мяне непрыкметна разглядаў, слухаў, відаць, уяўляючы, як будзе апавядаць суседзям пра дзіўнага асілка з аўтаматам: партызана не партызана, паліцая не паліцая, бандыта не бандыта.

Мы хвіліну памаўчалі. З такой пароды вясковыя людзі ніколі не пакажуцца табе адразу. Трэба было неяк асвоіць яго з сабой. Але як гэта зрабіць за некалькі хвілін?

— Фабрычная? — выцягнуў я ў старога сякеру і паспрабаваў вастрыё.

— Кавальская!.. Фабрычную нават у рукі не вазьму. Гэта — агонь, а не сякера!

Цярплівасць мая скончылася. І я адкрыта спытаўся пра дарогу да вёскі, ад якой недалёка Вільня.

— Вёрст трыццаць з гакам,— паказаў дзядзька рукой.— Туды, на Сыраежкі, Гліняны...

Даведаўся...

Вярста ў кожнай вёсцы розная, а «гак» — панятак шырокае. Ад старога больш, відаць, нічога не вывуджу. Дзе па дарозе стаяць немцы, наўрад ці скажа. Прызнацца, што я партызан, не паверыць. Паліцаі пераапранаюцца пад нас, правакуюць людзей, а потым на месцы іх і расстрэльваюць. Ды невядома — «чырвоны» ты, дзеду, ці «белы»...

Я развітаўся з ім і пайшоў да хаты, ля якой на плоце круціўся ветрачок.

Бедна жылі ў той хаце. Гнілая падлога. Нізкая столь. Паўзмрок. Сырасць. Холад. У куце на саломе — цяля з засохлым кончыкам пупавіны. Ля печы насцярожаная кабеціна.

— Дзень добры, цётка! — пераступіў я парог, нагінаючы галаву.

— О, зноў нанесла! — буркнула кабета.

Дзяўчына, якая падмятала хату, аж села ад страху на табурэтку.

Вось дык прыём.

Я закінуў рамень аўтамата на шыю, сеў ля стала на лаве, дастаў хлеб і каўбасу, пачаў есці: не бурчы, цётка, мне нічога ад цябе не трэба! Супакоішся — пагаворым.

Раззлаваная жанчына мітусілася ўжо па хаце. З-за печы паказалася ўскудлачаная галоўка з цікаўнымі вачаняткамі, пачуўся шэпт:

— Мам, гэта партызан?

— А ну іх!.. Немец бацьку твайго забіў праз іх і нас яшчэ падушыць, што рудых мышэй! — Цётка ўдарыла цяля апоркам.— Выцягнулася сярод хаты, каб ты акалела!.. Данута, чаго расселася як пані! Бяры вядро, ідзі конскага калу назбірай свінням!

— Паспею яшчэ...

Мне адразу расхацелася есці.

Але злавацца на жанчыну не было прычыны. Забітая і цёмная кабеціна была далёка ад таго, што адбывалася вакол, і па-свойму мела рацыю. Ды і мужык мог злажыць галаву за нашага брата выпадкова... Дарэмна сюды ішоў. Кепска, калі трапіш у вёску, дзе няма ні адной знаёмай душы.

Я паглядзеў на дзяўчынку на табурэтцы. Світэр на ёй вісеў нібы на пудзіле. Бледна-сіні твар. Гнойныя павекі і тлустыя валасы, быццам абсыпаныя попелам, а называецца, як у насмешку... Данутай. Бедная, нават ад роднай маці не чуе ветлівага слова. У хаце, мабыць, ад пачатку вайны не было і кавалка мыла, ва ўсім адчувалася запусценне і адзічэнне, якое прынесла вайна. Няёмка — гаротную і няшчасную сям'ю стаўлю пад небяспеку.

Побач на лаве ляжаў брусок. Я схаваў ежу, паклаў брусок на падаконнік і пачаў вастрыць фінку. Па замураваных марозам шыбах мільганулі цені — за акном прайшлі людзі. Відаць, нашы хлопцы...

Раптам знадворку нехта рвануў дзверы, і ў хату бухнуў клуб пары. На парозе вырас паліцай!

— Ці я не казала?!. — з варожым і роспачлівым абурэннем віскнула цётка.

Па яго паставе я зразумеў, што паліцаяў тут многа, і адчуў, як ад страху агортвае і мяне хваля холаду і здранцвення. Спачатку паралізавала ногі, потым зайшлося сэрца, запякло ў скронях і зрабілася млосна.

Але ў такім стане быў я з секунду.

«Спакойна, толькі без панікі!» — цвярдзіў я, беручы сябе ў рукі, і заставаўся сядзець спіной да дзвярэй.

— А-а, папалася птушачка, рукі ўверх! — пераможна і зларадна закрычаў паліцай, убачыўшы мяне ў паўзмроку.

— Мама! — кінулася дзяўчына да маці.

— Магіла нам, дзеці!..

— Гм, навошта ўверх? Папаўся — бяры, нічога не зробіш, здаюся,— знарок расцягваў я словы.

— О-о, хоць адзін разумны трапіў, хо-оле-ера! — паліцай прыспусціў аўтамат і ступіў да мяне.

Я ўстаў.

Паліцай не чакаў, што я такі высокі. Толькі цяпер ён убачыў маю фінку і на долю секунды сумеўся. Я маланкава садануў яму правым хукам у сківіцу, і ён асунуўся ў накдаўне, моцна стукнуўшыся галавой аб падлогу. Для ўпэўненасці я яшчэ прашыў яго чаргой з аўтамата і кінуўся на вуліцу.

— А каб ты свету не бачыў, каб ты сканаў на месцы, як ты маіх дзяцей загубіў, мала з вас было іхняга бацькі?! — бегучы за мной, кляла няшчасная жанчына.

Але было не да яе.

Вёска аж кішэла жоўтымі шынялямі жандараў і чорнай вопраткай паліцаяў. Траскацелі аўтаматы, нібы хто сыпаў на патэльню гарох, ірваліся гранаты.

— Дзе была наша варта? — прыстаў да мяне ўзбуджаны партызан, быццам гэта яшчэ мела нейкае значэнне.

Я кінуўся выручаць хлопцаў.

Сабралася нас у лесе менш. Трое назаўсёды засталіся ў вёсцы. Стаялі мы і маўчалі. Вецер даносіў пах гарэлай саломы. Месцамі снег аж пачарнеў ад сажы. На ноч бралася завіруха. Праз завейку пажар быў відзён ледзь-ледзь.

— Паляць,— з бяссіллем, якое ішло ад адчування непапраўнай бяды, цвярдзіў партызан, трымаючыся за раненую руку.

Другі ад узрушанасці ляскаў зубамі, але спрабаваў жартаваць:

— Эх і холадна! Каб не дрыжаў — замёрз бы...

— Ідзі ў вёску, настаў плечы да вогнішча, пагрэйся!

— Калі я бег сюды, крайняя хата згарэла ўжо зусім, а ветрачок на плоце сабе круціцца!.. Ля плота ляжаў дзед з сякерай за поясам, відаць, мёртвы...

— Ты глядзі, дзірка! — паказваў здзіўлены хлопец полы прастрэленага кажуха.— Зблізку, гад, секануў, нібы прасмалена калёным жалезам!..

Усе гаварылі паспешліва і бязладна, як у стане трызнення. Паступова ўзбуджэнне прайшло, мы аддыхаліся і пачалі прыходзіць да памяці.

Фашысты сурова расправіліся з жыхарамі дома, дзе загінуў іхні чалавек. Узнік перад вачамі хлопчык на печы і ветрачок. Успомніў і дзеда з сякерай...

Паход у Новую Вілейку адмяняўся: трэба было завезці ў лагер параненых.

Адзін партызан прыбег У лес без аўтамата, я аддаў яму свой і пайшоў далей адзін з клункам нямецкай вопраткі. Мне часта вдаводзілася пераапранацца ў немца: яўрэі з гродзенскага гета пашылі дакладна на мой рост мундзір нямецкага лентэнанта.

3

Задняваў я на балоце У стозе сена.

Сена трапілася сухое. Я хутка сагрэўся і моцна заснуў. Рука з компасам падвярнулася пад кабуру, і ад пісталета стрэлка размагніцілася. Я з жалем зняў компас і шпурнуў яго ў снег.

Далей мусіў арыентавацца па зорках і ветры. Нават успомніў вычытанае з кніжак правіла для падарожнікаў пустыняў Казахстана - не забывай, што ў цябе правая нага робіць даўжэйшы крок за левую. Але што рабіць у такіх выпадках, каб не кружыць на адным месцы, не ведаў. І я пачаў блукаць. Хаця і стараўся не апускацца, абы-чаго не есці, мыцца снегам, але аброс, як дзікун, схуднеў і страшэнна прамёрз.

Нарэшце, на чацвёртыя суткі, перад раніцай падышоў я да Парубанка - былога віленскага аэрадрома. Калісьці не раз прыходзіў сюды я глядзець на самалёты, лазіў з Данусяй па маляўшчых узгорках... Цяпер я нават не стараўся ўспомніць пра той час, холад і голад адцягвалі маю ўвагу.

Да горада адсюль кіламетраў восем. За вайну на гэтай тэрыторыі немцы маглі што-небудзь пабудаваць. Рэшткамі волі змусіў я сябе не бегчы адразу ў горад да сувязных, а дачакацца дня, разгледзецца і дабірацца вечарам. Узлез я на гару, зашыўся ў кусты, развязаў клунак і накрыўся нямецкай вопраткай.

Моцна хіліла спаць. Але засынаць нельга, зімовыя кусты — не летнія, скрозь іх чалавека відаць здалёк. Выразаў кароценькі патык,

падставіў пад бараду. Калі засынаў, далоні расслабдяліся, кіёк калоў у бараду, і я прачынаўся. Гэтак і дачакаўся дня.

Ужо зусім развіднела. Унізе праехалі машыны: адна, другая, трэцяя. Пачуліся нямецкая лаянка, плач, брэх сабак. Праз хвіліну застукалі ламы аб мёрзлую зямлю. Я падпоўз на край гары.

Унізе стаялі тры машыны з брызентавымі будамі. Да іх былі прывязаны аўчаркі. На снезе чарнела свежая зямля. Некалькі чалавек капалі яму. Засланіўшыся каўнярамі ад ветру, іх вартавалі паліцаі. За машынамі ў зацішку вясёлая кампанія немцаў нешта распівала з бутэлек. Вецер даносіў да мяне ўрыўкі гартаннай размовы, нібы там некалькі чалавек адразу паласкалі горлы. Я забыўся на холад.

Доўгі і нехлямяжы немец адлучыўся ад кампаніі і захмялелым голасам прывітаў паліцаяў:

— Na, Tolen, heil Ridz Schmigly! [1]

I зарагатаў. Тады заглянуў у яму, ударыў аднаго, другога арыштаванага ботам і вісклівым істэрычным голасам залямантаваў:

— Los, los! Abev schnell, verfluchte![2]

Калі цыбаты адышоў, паліцаі замітусіліся і пачалі гэтаксама пінаць людзей. Найбольш вылучаўся адзін. У бінокль быў добра відзён яго твар. Я доўга думаў, каго ён нагадвае, і ўспомніў: рыжага капрала, з якім я сустракаўся на рынгу! Такія самыя запалыя вочы, каржакаватая фігура гарылы...

Мой знаёмы крыкнуў немцам:

— Ferfig! [3]

Усё было відаць як на далоні. Рэдка траплялася такая выгадная пазіцыя. Можна было адной аўтаматнай чаргой разагнаць немцаў і паліцаяў. А каб быў аўтамат і я іх напраўду разагнаў?.. Адыдуць ад страху і зловяць!.. Мне стала душна, на лбе выступіў пот.

Немцы вывалаклі з будаў чалавек з дваццаць арыштаваных і загадалі ім раздзявацца. Жанчыны лямантавалі, крычалі нешта і мужчыны, але раздзяваліся ўсе. Цыбаты заглянуў у кузаў і за адзежыну вывалак яшчэ адтуль дзяўчынку, кінуў яе на снег як ку-лёк:

— Mitnehmen diese Schei Be! [4]

Людзі паспешна пачалі раздзяваць і яе.

Нейкі голы дзядзька, сціскаючы ад холаду ногі, акуратна склаў на снезе вопратку і, паказваючы на яе рукой, папрасіў нешта ў

---

1 — Ну, палякі, няхай жыве Рыдз Смігды! (ням.).

2 — Давай, давай, хутчэй, чорт вазьмі! (ням.).

3 — Гатова! (ням.).

4 Забірайце і гэтую дрэнь! (ням.)

паліцая. Рыжы яго здзяліў ботам. Тады бядак звярнуўся да бліжэйшага немца. Фашыст кіўнуў галавой. Чалавек нагнуўся, узяў шапку, надзеў. Мне быў добра відаць кожны пазванок на худой спіне, калі чалавек, згорблены, стаў тварам да ямы.

Ляскаючы ад узбуджэння зубамі, я палічыў: немцаў і паліцаяў толькі восем. Сабакі прывязаныя. Ссунься з гары, падкрадзіся, дастань пісталеты... Следна, глыбокі снег. Пойдзе аблава, нікуды не дзенешся: тут ля аэрадрома іх цэлая зграя. Не маю права зрываць задання...

Пакуль я вагаўся і раздумваў, затрашчалі аўтаматы, і ўсё было скончана.

...Прыцемкамі падаўся я на ўскраіну да цёткі Антосі. Пераапрануты ў немца, я меўся нібы канваіраваць групу яўрэяў з Данусяй у поле, адтуль — у лес. Аднак апрануць мундзір яшчэ мала. Нашы хлопцы пападаліся фельджандармерыі толькі па тым, што ішлі ў горад няголенымі, са змучанымі тварамі і ў брудным абутку. Трэба было прывесці сябе ў парадак. Цётка Антося здавалася для гэтага больш надзейнай за сувязнога. Да яе цягнула як да роднай.

4

— Данута ў Вільні! — сказала мне цётка Антося тое, чаго я чакаў. Жыве адно з маці... Вы тут пасядзіце, я ўраз злётаю па яе!

Не, не з гэтага трэба пачынаць: неабходна набрацца сілы.

Значыць, ужо не Данусяй, а — Данута. Як яна жыве тут?.. Каб не пачуць штосьці страшнае, пытанне адклаў на пасля.

— Не трэба! — вярнуў я жанчыну з парога. — Заўтра вечарам схаджу сам.

— У горадзе многа немцаў, паз'язджаліся яўрэяў вывозіць!

— Нічога, што многа. Як-небудзь знайду выйсце. Пагутарым лепш, у нас ёсць пра што, праўда?

— Аб чым вам, маладому, з такой старой гаварыць?..

— Перастаньце ўрэшце баяцца! Я падобны на пераапранутага прадажніка? Няўжо я такі кепскі чалавек быў, што нельга верыць?!

— Такі час, кожнаму ў душу не заглянеш...

— Зірніце на маю бараду, прыклеена? А рукі якія, бачыце? Паказаць кашулю?

— Сама бачу...

— Тады чаго вы?

Памалу яна супакоілася. Я ўдакладніў:

— Вы ўпэўнены, што немцы паз'язджаліся з-за яўрэяў?

— Вядома! Тыдні два таму назад немцы пазабіралі ў іх заказы: хто даваў адрамантаваць гадзіннік ці боты, так і забраў неадрамантаваныя. «Усім вам хутка капут!» — заявілі ім немцы. Людзі ў нас толькі і гавораць цяпер пра гэта...

Праз нейкі час Антося нагрэла вады. Пакуль я галіўся, яна з маімі грашамі схадзіла да спекулянта па харчы.

У чыстым, мяккім ложку я праваляўся цэлыя суткі.

Увесь наступны дзень слухаў я цётку і чакаў вечара. Яна ўспамінала маладосць, службу ў генерала. Дзяцей сваіх яна не мела і ўсё сваё душэўнае цяпло аддала Данусі.

Старая апавядала, як Данусі-падлетку аднойчы пашылі зімовае паліто і яна кожны ранак выбягала на двор выглядаць, ці не выпаў снег.

— Дакладна як мая сястра! — здзівіўся я.— А мне здавалася, у генералаў інакш...

— Вядома, у звычайных людзей не гэтак,— задумалася жанчына.— Бацькоўскага сэрца не заменіш сукенкамі і настаўнікамі, добра ведаю, хоць сваіх дзяцей і не мела... Бацька бываў дома наездамі. Вялікі чын! Для паўнаты чалавеку яшчэ патрэбна і бацькоўскае шчасце. Калі ты з крамы не нёс малому першай булачкі, не ведаў паху пратаптаных падэшваў яго туфелькаў — бацькоўокага шчасця ты не бачыў, хоць і маеш дзіця.

А яна мудрая!

Я пацікавіўся пра знаёмых. Левандоўскага і нават ксяндза, айца Валентага з інтэрната езуітаў на Зарэчнай, немцы расстралялі як заложнікаў.

— А жыла ля вас там яўрэйская сям'я. Яшчэ ў іх была Бэта, насіла пісьмы Данусі...

— З Залкіндаў нікога няма ў жывых. Бэта, беднае дзіцятка, расквітнела не ў час прыгажуняй. Летась у гета камандаваў нейкі фашыст Візэ. Не дай бог, што за чалавек! Чаго ён толькі не вытвараў з людзьмі!.. У яўрэяў ёсць звычай: калі сустрэнеш нябожчыка, якога нясуць на могілкі, мусіш яго правесці. Бывае, нясуць каго і сустрэнуць Візэ. Паганец загадвае ўсім узяцца за рукі, скакаць вакол нябожчыка і спяваць «Ідл міт а фідл»[1] Сам стаіць, падганяе, а яны пяюць і скачуць. Хто адказваецца або не можа, забівае на месцы!

Гэты Візэ і прыкмеціў Залкіндаву дачку. Ён загадаў прывесці дзяўчыну да сябе. Усе багатыя яўрэі мелі атруту. Але сабраліся старыя і давай, бедную, пераконваць:

---

1 “Яўрэй са скрыпачкай” — яўрэйская народная песня

«Бэцы, калісьці наша Эстэра стала палюбоўніцай Казіміра Вялікага, то мы і праз чатырыста гадоў памятаем і дзякуем ёй за дабро, што кароль зрабіў!»

«Бэцы, мы ўсе ў тваіх руках! Не дай нам загінуць, ахвяруй сябе для нас!.. Выратуй нас, Бэцы!..»

Яна паплакала, паплакала і згадзілася. Не змагла адгаварыць яе і Данута. Бедная, тры месяцы пражыла з фашыстам, але нічога ад яго так і не дабілася.

Аднойчы Візэ наладзіў баль. Сабраліся афіцэры з жандармерыі, гестапаўцы, перакладчык-белагвардзеец... Жандары жылі з гестапаўцамі што каты з сабакамі. Падпілі і давай адны адных пад'юджваць:

«Ага, ты намі камандуеш, прапаведуеш чысціню расы, а сам з жыдоўкай жывеш!» «Купілі цябе яны!»

Бачыць Візэ, што бяруць над ім верх, паклікаў ён Бэту і загадаў раздзявацца. Тады разматаў шнур і закамандаваў прывязаць яе да крэсла. Перакладчык прывязаў голую Бэту і адцягнуў крэсла пад сцяну. Павымалі яны пісталеты і пачалі страляць. Хто ў левае вока цэліць, хто ў правае, хто ў грудзі, калена...

За дзвярамі ў той час стаялі на варце два яўрэі з «Орднунг-дынст» Калі, бедную, пастралялі на рэшата, Візэ паклікаў вартавых і загадаў завалачы яе разам з крэслам за баракі ў яр!.. Так і загубілі.

Назаўтра мы з Данутай выкупілі яе цела за гарэлку ў паліцая, абмылі як маглі і пахавалі ў гарах.

Цётка ўздыхнула і рагамі хусткі выцерла слёзы.

Раптам нясмела пастукалі ў акно, я скочыў за камоду.

З сенцаў на кухню Антося ўвяла яўрэйскага хлопчыка, наліла яму ў банку стравы.

— Каб вашы дзеці і ўнукі, дарагая пані, ніколі не ведалі, што такое голад! — падзякаваў хлопчык на адным дыханні, як гавораць малітву.

Вывеўшы госця, жанчына вярнулася са слязьмі на вачах:

— Тут камені заплачуць, гледзячы на гэта, не толькі чалавек!

8

Я паступова так разнежыўся, што не хацелася пакідаць цёплую хату. Ні хуткая сустрэча з Данутай, ні пачуццё абавязку мяне ўжо не кранал. Што я адзін значу ў гэтым моры падзей?!.

Я мусіў напружыць усю сілу волі, каб сабрацца ў дарогу.

Пачало цямнець. Я засунуў пісталеты ў кішэню, паклаў туды ж запасныя магазіны, развітаўся з цёткай і пакрочыў у адпрасаваным і вычышчаным адзенні на ўмоўленыя кватэры.

Дзесьці ў лясах мерзлі партызаны. На франтах лілася кроў. З голаду, холаду і ад хвароб гінулі тысячы людзей у нямецкіх турмах. Як прысмак грызлі сырую бульбу і варылі суп з рамянёў нашы ваеннапалонныя за калючымі дратамі канцлагераў. У смяртэльнай трывозе чакалі свайго канца давედзеныя да вар'яцтва дзесяткі тысяч яўрэяў гета. Недзе не зляжалася яшчэ зямля, не прамерзла на свежай магіле ў Парубанку. А тут, на віленскай вуліцы, спакойна цякло сабе мірнае жыццё.

Усюды гарэлі электрычныя лямпачкі. Здаецца, нават гарэла цяпер іх больш, чым да вайны, на вуліцах відна — як днём.

Працокаў кованымі капытамі конь вазніцы, правёз у даваенным фаэтоне пышную немку ў футры.

Пранёсся нямецкі матацыкліст з акулярамі на ўвесь лоб, ён нагадаў стварэнне не з гэтага свету — драпежнае, злое.

Праехала грузавая машына з крытым верхам і эмблемай бубновага туза на кабіне. Звычайна ў немцаў ваенныя машыны мелі на кабінах галовы зубраў, аленяў, куніц, зайцаў. Такі знак бачыў я ўпершыню. Ці ўпершыню?.. З Данусяй глядзелі амерыканскі фільм, дзе паказвалі разгром мечаносцаў пад Грунвальдам. Тады рыцары фон Ульбрыхта мелі такія ж знакі на сваіх шчытах...

Нібы з зялёнымі тэрмасамі, з прымацаванымі да боку процівагазамі прайшоў узвод салдат. Разгадаваныя і здаволеныя фашысты ў дапасаваных шынялях і начышчаных да бляску ботах маршыравалі зладжана, раўненне трымалі лёгка. Ад іх павеяла чужой і ненавіснай сілай.

Я адчуў у сабе насцярожаную ўзбуджанасць і трывогу — стан, калі ў табе напружана кожная клетка і нерв. Каб не выдаў мяне бязладны крок партызана — прымусіў сябе ногі ставіць цвёрда і ўпэўнена.

Прайшла група літоўскіх «нацыянальных» войск, прывіталася са мной.

— Вялікая перамога фюрэра! — раптам пракрычаў па-польску хлопчык гадоў адзінаццаці, прабягаючы ля мяне з сумкай газет.— Купляйце «Пройсішэ нахрыхтэн»! Нямецкія войскі планава пакінулі Вялікія Лукі! Новая перамога фюрэра!

Малы рассмяшыў мяне і падбадзёрыў. Я намерыўся купіць газету, ды спахапіўся: я ж не павінен разумець польскай мовы!..

На скразняку стаяла чарга. Сцюдзёны вецер сек жанчын дробным снегам. Апошняй у чарзе была дзяўчына гадоў трынаццаці. Яна наставіла тонкі каўнерык кароценькага асенняга паліто, мяшок звіла муфтай, засадзіла туды рукі і падскаквала то на адной, то на другой назе.

Жанчыны нечага спрачаліся ўсё на той жа помесі польска-беларуска-рускай моваў. Убачылі мяне і раптам сціхлі.

— Ладны нямчыска! — пачуў я выразна.

— Афіцэр!

— А што яму?

— У калейцы стаяць не трэба, як нам з табой за мёрзлай бульбай, чаму не быць ладным!

— Аграбіў паўсвету... На людской крыві і ладны!

— Ты што балбочаш, хочаш у Панары?! Пасля гэтых слоў я пасмялеў яшчэ больш і ўвайшоў у ролю. Пасля добрага адпачынку я адчуў, што прамянею здароўем і бадзёрасцю.

Спаткаўшыся з патрулём, я зрабіў напышлівы выраз твару, надаў сваёй хадзе непаспешлівую важнасць і незалежнасць. Патрулі падцягнулі на плячах аўтаматы, папраўлілі рамяні і з прускай выпраўкай ды з тылавым шыкам павіталіся. Я адказаў нядбайна, нават не глянуўшы на іх: пакуль пайшоў у партызаны, на немцаў наглядзеўся.

На цэнтральнай вуліцы натрапіў на натоўп зявак.

Па бруку брылі сотні чалавечых істот з жоўтымі шасцікутнымі зоркамі на плячах. Мне, высокаму, было ўсё відаць праз галовы натоўпу, што адбываецца на слізкай брусчатцы.

Людзі з апошніх сіл валаклі свае пажыткі — пярыны, падушкі, клункі. Нейкая жанчына перавярнула стол, прывязала да ножкі вяроўку і цягнула яго нібы сані. Сярод трантаў і каструль, ушчаперыўшыся за ножку стала і напалохана азіраючыся, сядзеў ухутаны хусткай з застылымі слязінкамі на вачах хлопчык. Жанчына спатыкнулася і ўпала. У натоўпе зарагаталі. Яна наўмысна нязграбна ўзнімалася, каб пасмяяліся яшчэ: бедная маці хацела гэтак злагодзіць ворагаў.

— Ю-ды, да бу-ды! Ю-ды, да бу-ды! — скандавалі гарадскія хуліганы, а іхнія твары аж расплываліся ад задавальнення.

І жылі ж такія паміж намі!..

Пачыналася ўсё з «нявінных» надпісаў на платах: «Не купляй нічога ў жыда!» З бунтаў ва універсітэце под лозунгам: «Не будзем

сядзець за аднымі партамі з жыдамі!» А скончылася вось чым... Ну, перастраляеце гэтых дахадзяг, Гітлер возьмецца за вас!

Раптам некалькі тыпаў кінуліся між радоў. Яны распаролі нажамі пярыны, і ў адзін момант вецер падхапіў хмару пуху і пагнаў на народ. Разявакі пачалі выплёўваць пер'е і лаяць яўрэяў, быццам вінаваты яны.

Побач са мной стаяў фельдфебель з чырвона-бела-чорнай істужкай жалезнага крыжа ў пятліцы шыняля. Ён смяяўся, што яўрэі яшчэ не здагадваюцца, куды іх вядуць. На станцыі іх прымусяць пакідаць рэчы, а саміх пазапіхваюць у вагон і — у Трэблінку, і капут! Ён павярнуўся, са здавальненнем пацёр рукі, нібы скончыў справу, якая даставіла яму вялікую радасць, і, быццам мы з ім даўно знаёмыя, з пераканан-нем дадаў:

– Na, ist Wilna jetzt Judenfrei, nich wahr? [1]

Выходзячы з завулка ля колішніх атлантаў, я наткнуўся на вароты з калючага дроту. Там два немцы абмацвалі яўрэяў. У аднаго вартаўнік знайшоў бутэльку алею. Разгневаны фашыст біў бедака куды папала і загадаў:

— Trinie zugleich![2]

За гэтымі варотамі — гета.

...Вільня ў параўнанні з даваенным часам не змянілася, і я лёгка знайшоў на Антаколі патрэбную кватэру. Там жыў беларускі мастак, наш сувязны.

Мастак мяне чакаў ужо некалькі дзён. Ён адразу вызначыў мне спатканне з яўрэйскімі хлопцамі і дзяўчатамі. Яны меліся выбрацца па каналізацыйных трубах, схавацца ў кустах на татарскіх могілках і чакаць да поўначы, калі па іх прыйдуць. У мяне заставалася гадзіны чатыры, каб зайсці да Дануты.

## 6

Да генералавага дома я падышоў а гадзіне восьмай, што ў ваенны час лічылася даволі позна. Страху я ніякага не адчуваў: цёмна, дастаткова стаць за дрэва, і ніхто цябе не ўбачыць. Я толькі ўвесь калаціўся ад узбуджэння...

Вось і панадворак Янкоўскіх. Знаёмыя сілуэты. Нават вецер гэтак жа сама, як і раней, гудзіць у голых кронах яблынь.

Званок у парадных дзвярах не дзейнічаў. Дзверы не паддаваліся. Я звярнуў увагу, што снег пад нагамі не крануты: сюдой

---

1 — Такім чынам, Вільня цяпер без яўрэяў, няпраўда? (ням.).

2 — Зараз жа выпі! (ням.).

ніхто не ходзіць. Панадворкам, поўным ламачча, я абышоў дом ад вуліцы і накіраваўся на кухню.

Дзверы адчыніла стрыманая і акуратная, як і некалі, генеральша. Яна зусім не змянілася. Хіба стала толькі менш важная ды на губе, зморшчанай складкамі, больш, чым раней, кідаліся ў вочы рэдкія, сівыя і жорсткія вусікі.

Такія госці ў гэтым доме частыя — яна не здзівілася і адразу па-нямецку запрасіла:

— Калі ласка, заходзьце! Вы да Данкі?

Збіваючыся ад недарэчнай разгубленасці, я стаў тлумачыць адразу па-польску і па-нямецку.

– З якіх курсаў? — Дама старалася мяне ўспомніць.— Мы з заграніцы вярнуліся паўтара года таму назад,— нічога так і не прыпомніўшы, паведаміла яна.— Але ж праходзьце, прашу, туды да яе. Там як-раз і таварыш сядзіць!.. Праходзьце, гэр лейтэнант, будзе кампанія!.. Калі ласка, здыміце шынель, я павешу!

– Распрануся там...— нерашуча таптаўся я на месцы: мяне агарнула трывога і страх.

Як не сваімі нагамі прайшоў я праз калідор у залу і спыніўся як укапаны.

11

Першым кінуўся ў вочы Станеўскі. Узмужнелы, падстрыжаны, як стрыгліся нямецкія вайсковыя — пад высокую польку, з бліскучымі ад брыльянцінуваласамі, з ваяўніча скрыжаванымі на грудзях рамянямі. На рукаве зялёнага фрэнча бялела павязка з чорным штампам і ненавіснымі гатычнымі літарамі: «Hilfopolizei».

З ім была Данута — чужая і незнаёмая.

Яна ўся аж квітнела ад прыгожасці. Цёмная сукенка з вялікім дэкальтэ ўвыдатняла акругласць грудзей, шыі і плеч, вочы яе пазіралі з гуллівым какецтвам і ўсведамленнем сваёй чароўнасці. Перада мной была раскошная красуня з прычоскай французскай кінаактрысы.

Яны сядзелі за столікам з веерамі новенькіх карт. Данута трымала іх з грацыяй і думала, з якой пахадзіць: на яе вуснах застыла какетлівая ўсмешка. Генрых другой рукой узяўся пад бок і спадылба дапытліва глядзеў на партнёршу. Калі я адчыніў дзверы, яны нават не павярнулі галоў.

У крытычных выпадках чалавек часта думае не словамі, а вобразамі. Ох, і шмат чаго можна ўспомніць у такую мінуту!

Хутка авалодаўшы сабой, я паглядзеў на гэтых людзей як на чужых. Асталася толькі крыўда за няшчасных, расстраляных на

Парубанку, за жанчыну з дзецьмі ў незнаёмай вёсцы, за хлопцаў, якім з-за генералавай дачкі не дапамог вярнуцца ў лагер... Стася, даведаўшыся, што іду ў Вільню, прымусіла мяне ўзяць і яе пісталет. А Зіна Кварцёнак... Мне так захацелася да сваіх, як часамі малому ў чужой хаце раптам захочацца дадому. Трэба выблытвацца з гісторыі.

Нарэшце зрабілі ласку мяне заўважыць. Наступіла цішыня, на кухні пачуўся стук вядра.

— Я-анэк, ты-ы?— шэптам спыталася Данута пасля разгубленага здзіўлення.

Яна выпусціла з рук карты і прыўзнялася. У вачах Данусі з'явілася светлая, трывожная і няўпэўненая радасць. Але не гэта мяне кранула. Штосьці назаўсёды адышло ад яе, і мне стала тужліва шкада.

— А, гэр Барташэвіч! — здзівіўся і Станеўскі.

У яго голасе таксама пачулася трывога.

Ведаеш, што я ў партызанах? Калі не, мне лёгка цябе разыграць, нібы я на службе ў немцаў: мой бацька меў зямлі больш за твайго, фашысты з такімі цырымоніліся... Здагадваешся — справіцца з табой здолею заўсёды, твой пісталет яшчэ зашпілены ў кабуры, а я трымаю палец на спускавым кручку...

— Янэк, але ж заходзь, прашу!

Данута авалодала сабой і памкнулася насустрач, але ці з-за Станеўскага, ці таму, што правай рукі я не вымаў з кішэні і быў злы, яна разгублена спынілася на паўдарозе.

— Сядай, прашу, сюды...— прыставіла няўпэўнена крэсла.—- Ты змерз?.. Можа, распранешся? Здымі шынель...

Я моўчкі сеў.

Дануся не ведала, што рабіць. Я не вымавіў ні слова, не выявіў ахвоты вітацца, быў насцярожаны і баяўся, каб мяне хто не цапнуў ззаду. Яна пра нешта здагадвалася і гублялася зусім.

— Вось мы і спаткаліся... А я так чак...

Я сеў так, каб можна было адразу ўзняцца.

— Го, але ж ты цяпер лейтэнант!.. Віншую! — У яе голасе і вачах з'яўляліся то бязмерная радасць, то бездапаможнасць і страх. Яна крадком зыркнула на Станеўскага. — Цябе пусцілі ў адпачынак? Надоўга? На якім фронце служыш?

«Ага, ведаеш, што афіцэры прыязджаюць з розных франтоў! З якой ты лёгкасцю мірышся, быццам я — у нямецкай арміі!..» Стала чагосьці шкада, і адначасова зрабілася лёгка, быццам раптам пазбыўся клопатаў і вырашыў пытанне, якое мучыла і даўно не давала спакою. Штосьці падобнае я перажыў чатыры гады таму

назад, а цяпер яно паўтарылася зноў. Няўжо я ўвесь час займаўся самаашуканствам?

У пакоі ўжо не было колішняга лоску і пазалоты, якая мяне, дурня, калісьці вабіла. Генеральскія прадметы былі ўжо шэрыя, павыціраныя і непрыемныя.

– Якія вы ўжываеце? Гэта «Экстра». Калі ласка, закурыце! — працягнуў мне Станеўскі сярэбраны партсігар і пстрыкнуў запальнічкай.

Нічога не здагадваецца. У яго на твары з'явілася ўпэўненая ўсмешка. Ці не Сцяпанаў наган у тваёй кабуры?.. Не, там пісталет. Была ўжо магчымасць замяніць яго на парабелум. Ты ж цяпер «фольксдойч», амаль што немец, валадар...

– Дзякуй...— узяў я левай рукой папяросу і меркаваў, што рабіць далей.

– Прыма сорт, не? — зусім супакоены, з франтоўскай элегантнасцю скрыпнуў ён новенькімі рамянямі і зацягнуўся.

Мы размаўлялі па-польску. «Не» паліцай вымаўляў на нямецкі лад, як «нэ».

У некаторых людзей ёсць пэўная мяжа, далей якой, нягледзячы на вопыт і перажытае, яны не могуць узняцца. Не перайшоў гэтай мяжы і Станеўскі. Такі самы, як чатыры гады таму назад. Адно змяніў гаспадароў. Такіх не пераканаеш, іх можна толькі пакараць.

– Калі ласка, вось папяльнічка. І наогул, маглі б папрасіць дазволу на курэнне ў дамы, рыцары! — заўважыла Данута, кепска прыкрываючы трывогу какецтвам.

У яе голасе і выражэнні твару адчуваўся жаль аб мінулым.

Я — ад роду купаны ў гарачай вадзе — і быў вельмі хуткі на рашэнне. Мне здалося, што ў Дануты інтымныя адносіны з паліцаем. На тумбачцы каля люстэрка стаялі фатаграфіі. На ёй твары Дануты і Генрыха аж расплываліся ад шчасця. Рэўнасць паслужліва выдала здагадку за праўду, я сядзеў і аж закіпаў ад злосці.

– Салдаты фюрэра не маюць звычкі прасіць дазволу нават у прыгожых жанчын,— адказаў Станеўскі Дануце і звярнуўся да мяне: — Я ў сваёй вёсцы не быў з ліпеня сорак першага... А вы былі ў сваёй?

Толькі цяпер ён заўважыў, што мы з Данусяй гаворым аб адным, а думаем пра другое. Ён, відаць, пра ўсё здагадаўся і пачаў бялець. Каўкнуў перасохлым горлам, а на лбе выступілі бліскучыя кропелькі. Трэба было канчаць.

Жадаючы штосьці папярэдзіць, не даць нам апамятацца, Данута часта загаварыла:

– Ну, Янэк, расказвай нам, дзе ты цяпер? Чаго маўчыш!.. Ох, які ты ладны ў мундзіры!.. Ты прыродны вайсковы! Праўда, Генусь, яму вельмі да твару мундзір! Нават Генку так не ідзе яго адзенне, праўда, праўда...

Бачачы, што я ўстаю сам не свой і вымаю пісталет, яна кінулася да мяне:

— Янэчку, супакойся!

Я за руку адцягнуў яе ўбок, каб не перашкаджала: яе чамусьці аставіў на пасля. Вокны былі зачынены. на аканіцы, я адступіў да дзвярэй: паліцай трапіў у пастку, вынянь з кабуры парабелум не меў калі.

Але Станеўскі не разгубіўся. Ён знізу штурхануў столік і з сілай кінуў яго на мяне. Я адбіў столік каленам, стрэліў, але не трапіў.

– Барташэвіч, што ты! — узмаліўся ён з жахам і скочыў за вазон, перакуліўшы кадку ў мой бок.

Я лічыўся добрым стралком. Але тут прыйшлося левай рукой трымаць Дануту, якая тулілася да мяне і збівала прыцэл. З аднаго, з другога пісталета выпускаў я кулю за куляй — і ўсё дарэмна: толькі пырскалі кавалачкі адшчапанага паркету, тынку і каціліся па падлозе пустыя гільзы.

– Herr Leutenant, was ist denn? [1] — заенчыў ён і мітусіўся па гасцінай.

– Я табе не гер, а — партызан!..

Генрых ступіў на пустую гільзу, пакаўзнуўся і выцягнуўся на падлозе. Зразумеўшы, што ўсё скончана, ён закрыў галаву рукамі і ўзмаліўся:

– Лёнгі-інус, тады я цябе не выдаў з пракламацыямі на Міцкевіча, памятаеш?.. Ты павінен...

Але я яго дабіў.

Нельга пакідаць і сведку. Бацькі жывуць на вёсцы, немцы ім адпомсцяць. Ап'янелы ад стралянiны, я выпіхнуў на сярэдзіну пакоя Дануту і прахрыпеў:

– А цяпер — ты!

Яна глядзела на мяне спалохана, пакорліва, на нейкі момант стала дакладна такой, якой я ведаў яе да вайны. І ў мяне пачала абуджацца літасць. Ці не прыгразіць, каб прыдумала немцам гісторыю смерці Станеўскага?

---

1 — Пан лейтэнант, у чым справа? (ням.).

— Янэчак, завошта? — часта дыхаючы, спыталася паціху яна.— Вось мы і спаткаліся...

Мяне агарнула новая хваля азвярэння.

— Ах ты-ы, паліцыянтавая падсцілка, яшчэ будзеш папракаць?!

Калі я падымаў пісталет, яна ціха ўскрыкнула, быццам ёй заняло дыханне ад таго, што нехта піхаў у халодную ваду. Я націснуў спускавую скабу. На момант адчуў у правай руцэ добра знаёмую няважкасць пісталета і металічны стук гільзы аб сцяну, падлогу. На шчасце, Дануся адскочыла.

Не лічачы стрэлы, пачуццём, якое ішло ад вопыту, я з аблягчэннем адзначыў, што ў пісталеце выйшлі патроны. Але я працягваў іграць разгневанага: зноў прыцэліўся і націснуў спуск.

Цык! — шчоўкнуў баёк ухаластую...

Клацнуў затворам — пусты магазін! Другі пісталет я разрадзіў раней.

Пакуль мяняў магазіны, за плячамі пачуўся голас генеральшы — яшчэ адзін сведка, трэба і яе?.. Але страляць у жанчын я ўжо не мог.

Станеўскі ляжаў сярод пакоя. Яго вочы мутна глядзелі ў столь, а з-пад кіцеля цякла на паркет кроў і збіралася ў густую лужыну. Я зняў з паліцая рамень з парабелумам, павязаў яго сабе паверх шыняля і кінуў:

— Мяне тут не было, разумееш?.. Хто яго забіў, прыдумай сама. Выдасі — тады…

Апошнія словы я намерваўся вымавіць унушальна і строга, але нечакана для мяне самога прагучала просьба, шэпт.

— Добра, Янэчку...— прашаптала Дануся пакорна. — Прыдумаю...

Я накіраваўся да дзвярэй.

— А я-а?.. Не ідзі, Янку...— узмалілася яна гэтаксама шэптам.— Куды ты?!.

Ледзь я не вярнуўся.

8

Праз тыдзень з групай віленцаў набліжаўся я да лагера. Варту мінулі яшчэ ўдзень, а калі падыходзілі да зямлянак, пачало ўжо цямнець.

Вось і родны дом партызана.

Ноздры зашчыкатаў дым. Пахла сушаным мясам, скурай. Пад нагамі блыталіся галінкі елак, што пападалі з нацягнутых дратоў — камуфляжа ад самалётаў. Тут можна спакойна сесці, сцягнуць боты з

натруджаных ног, панежыцца ў цяпле, пад'есці гарачай стравы... Але цяпер мяне гэта не радавала. У лагер я вяртаўся неахвотна і нездаволены сабой.

Хтосьці прайшоў з мокрым венікам. Я ўздыхнуў і падумаў — першым чынам трэба будзе схадзіць у лазню. Стала на душы лягчэй.

Кухар вёз дровы, і конь на ўзгорак ніяк пе мог усцягнуць сані. Васіль упёрся плячом у бярвенні і натужліва закрычаў:

— Но, мілы, яшчэ крыху!

Конь паспешліва перабіраў пярэднімі нагамі, але падковы былі сцёртыя, ён пакаўзнуўся — гоп! — і сеў на зад.

— Здароў, Васіль! — павітаўся я.— Ты ўсе возіш і варыш?

— А-а, вярнуўся на маю галаву! Жывы? Здароў, братка. Не здаецца Гітлер, каб на яго халера, трэба вазіць, нічога не зробіш,— разважыў кухар без злосці і пачаў цягаць каня за грыву:

— Ну, Гняды, уставай, чаго рассеўся!

Я паказаў сваім людзям на сані, і мы ўраз выпхнулі іх на ўзгорак.

— Дзякуй, Ваня!

— Думаеш, гэтым адбудзеш? Прыйдзем да катла!

— Знайду што-небудзь!

Ля зямлянак я ледзь не сутыкнуўся лоб у лоб з партызанам, які бег па вузенькай і глыбокай сцежачцы. Я саступіў у снег, і чалавек саступіў: мы зірнулі адзін на аднаго.

— Ванечка, вярнуўся? — пачуўся шчыры і радасны голас Стасі.

— Як бачыш...

Яна ўзняла рукі, памкнулася схапіць мяне ў абдымкі, але стрымалася і, выгаварваючы на польскі манер «ло», закрычала:

— Хуопцы, Барташэвіч вярнуўся!

— І не адзін, як бачыш! — паказаў я на групу аброслых і стомленых людзей, якія збегліся ў купу і з нейкай вінаватай цікавасцю пазіралі на нас.

— Я толькі што напаліла печ, цяплынь — нібы ў лазні! — адводзячы ад мяне шчаслівыя вочы, паспешліва гаварыла дзяўчына.

Толькі цяпер мы ўбачылі, што віленцы плачуць ад шчасця.

Мы са Стасяй разгубіліся.

— Для вас усё цяжкае ўжо мінула! — супакоіла яна.— Тут вам будзе добра! Вашы ўжо лагер сямейны будуюць!.. Вядзі людзей у зямлянку, грэй! Там і камбрыг! А я збегаю да суавраўцаў па акумулятары, будзем зводку з Масквы слухаць! Чуў, як нашыя на Дану ціснуць фашыстаў?

— Вартаўнікі крыху расказвалі...

— Ціснуць!.. Толькі аддай мой пісталет. Я ўвесь час рабіла выгляд, што ён у мяне, панапіхвала ў кабуру індывідуальных пакетаў...

— Трэба яго пачысціць.

— Ты з яго страляў?!. Ага, спатрэбіўся! — паскардзілася яна яўрэям: — А ён усё «не вазьму-у», «наво-ошта»! — дражніла яна мяне з лагодным папрокам.

Пакідаючы Дануту з мёртвым Станеўскім, я выбег на двор з пачуццём нейкай няўпэўненасці. Быць можа, Станеўскі зайшоў выпадкова?.. Пытаннё вісела нада мной як змора. І толькі шчаслівы бляск вачэй радысткі яго развеяў. Правільна я паступіў — так ёй і трэба, паліцаевай падсцілцы.

## РАЗДЗЕЛ ШОСТЫ

1

Летам нечаканы выпадак зноў напомніў мне пра генералаву дачку.

Немцы павыскрэбвалі ўсе тылавыя рэзервы, нават скарацілі гарнізоны ў партызанскіх зонах да мінімуму і кінулі ўсё на Курскую дугу. Мы ўздыхнулі на поўныя грудзі. Вестка аб разгроме нямецкіх армій патроіла нашы сілы, і мы пачалі дзейнічаць яшчэ больш дзёрзка.

Жнівеньскім днём выйшлі мы ўзводам на Беласток-Ваўкавыскую аўтастраду і стаіліся ў засадзе. Першым паказаўся вайсковы немец на веласіпедзе.

— Прапусціць! — загадаў я хлопцам.— З-за салдаціка не будзем пэцкацца!

І немец праехаў.

Праз мінут пяць выскачыла легкавая машына. Яе мы захапілі і разам з пасажырамі — двума афіцэрамі і салдатам-шафёрам — прыгналі ў лагер. Пры допыце палонных выявілася, што прапусцілі генерала, якому прыйшла ў галаву фантазія праехацца па чыстым паветры на веласіпедзе. Нічога не зробіш, давялося мірыцца. Легкавая машына з афіцэрамі таксама не абы-што.

Вечарам партызаны ўцяклі ад машкары да вогнішча, там чысцілі сваю зброю, зашывалі вопратку. Кухар памешваў у катлах, а яго Лёнік забаўляўся з нямецкімі медалямі.

— Салам! — зухавата прывітаў я кампанію, з'явіўшыся з цемры.

— А, герой? Салют!

— Выспаўся? — азваліся галасы з прыкметнай сімпатыяй.

— Набраў мінут шэсцьсот, хлопцы яшчэ дабіраюць... На, Лёнік, табе яшчэ цацак! — падсыпаў я хлопчыку жменю нямецкіх медалёў.— Васіль, вячэру пакінуў?

Кухар наліў у кацялок гарохавага супу.

— Чаму мяса так мала паклаў, скнара!

Я быў у тым узбуджаным стане самаўлюбёнага ап'янення, якое бывае пасля ўдала выкананага задання, калі ўсё табе дазволена і ты разам з сябрамі цешышся сваімі новымі якасцямі. Сёння мяне разбірала ненатуральная весялосць.

— Каму беражэш яго, жмінда! — палез я з лыжкай у кацёл.

— Куды! — замахнуўся кухар апалонікам.

— А ну вас! — залямантаваў партызан: яму вар з апалоніка капнуў на шыю.— Не люблю мужчын-какетак! Ты яшчэ генерала не злавіў, а шуму — на цэлы лес!

Я ўлавіў у сабе трывогу.

На самай справе, чаго так разбрыкаўся? Гэта не к дабру, нешта здарыцца. Я нібы прачнуўся, пастараўся перавесці ўсё ў жарт:

— А гарох у цябе, Васіль, зусім сыры! З'ясі такога, і ў жываце будзе бразгаць: немцы за кіламетр пачуюць!

Жарты да мяне не ішлі, і ніхто не рассмяяўся. Выручыла Стася. Яна пазвала з цемры:

— Янка, калі ласка, пакруціце дынамку!

— Мо я пакруціў бы?

— А нельга мне?

— О-ей-я, колькі ахвотнікаў! Хутчэй, Барташэвіч, якраз буду дакладваць пра вашае геройства, няўжо дазволіце, каб круціў хто іншы...

— Я-асна!

— Ясна, што справа цёмная!

— А вы чаго плачаце, героі? — збівала ўвагу радыстка.

— Вядома, не ад радасці за твайго Барташэвіча!

— І не ад зайздрасці. Усяго ад камароў і дыму!

— О-ей, бедненькія!..— пашкадавала дзяўчына і знікла.

Разгневаны на яе, што мяне скампраметавала перад сябрамі, я не ведаў, што рабіць. Пайсці адразу? Скажуць — во, пабег, адно паманіла!..

Маю разгубленасць выкарыстаў Трухан і перахапіў увагу слухачоў:

— Дарэчы аб камарах. Нядаўна ў групу Сокалава прыходзіла паненка з Вільні. Камары яе пакусалі, дык апухла так, быццам на яе напалі пчолы! Слова гонару. Дзе толькі такая гадавалася!

— З Вільні? — перапытаў я.

— А-а, тая! — ускрыкнуў партызан ля вогнішча.— Шыкарная! Бачыў, як дэсантнікі яе вялі!

— Між іншым, слухай, Барташэвіч, мне іхні ездавы, Волесь Сляпуха, гаварыў, што яна пра цябе пыталася.

Мне раптам захацелася прысесці. У Трухана твар быў шчыры.

— Спытай Волеся, калі не верыш! Хацеў табе адразу сказаць, але не выпадала спаткацца, цябе ўсё носіць...

— Куды ж ён падзене цяпер радыстку?

Было не да жартаў. Я ўстрывожыўся. Выглядала так, быццам я нашкодзіў, гэта хаваў нават ад сябе і вось — прыходзіць расплата.

Сляпуху месяцы два таму назад з нашай брыгады перавялі да дэсантнікаў. Ён у іх стаў за фурмана, але па старой памяці часта заходзіў у нашу брыгаду і апавядаў, што ў іх рабілася.

Няўжо тут была Данута?

Сябры не заўважылі маёй разгубленасці,— можа, таму, што ў гэты момант далёка пачуліся выбухі.

— Ён і дзвюм дасць рады...

— Ціха!..

Усе насцярожыліся. У напрамку, адкуль даносіліся выбухі, замільгала цьмянае зарыва ракет. Фронт быў ад нас яшчэ за сотні кіламетраў, але насуперак логіцы ўсім хацелася пачуць у гэтых выбухах грукат нашай артылерыі.

— Чапаеўцы, відаць, поезд узарвалі ля Галынкі! Раніцай ішлі на чыгунку, калі мы вярталіся з задання.

— Мусіць...— з расчараваннем праказаў другі партызан.

— Выбухі былі. Ракеты пускаюць. Мабыць — пашанцавала: поезд пусцілі! От недзе пад абломкамі вагонаў фашысцікі ўспамінаюць свайго фюрэра добрым словам!..

І зараз жа хлопцы пераключыліся на бадзёры тон.

Тым часам мне першы раз не захацелася ісці да Стасі ў зямлянку. «Што за ліха, якая паненка была ў сокалаўцаў?

А чаму б не быць і Дануце? У немцаў разведка наладжана выдатна, яны добра ведаюць нашы атрады і камандзіраў, месца размяшчэння — толькі не маюць сілы нас знішчыць. Даведацца пра партызан у немцаў і потым уцячы сюды для яе не так ужо і складана...

Яна ў партызанах?»

Мне зрабілася страшна ад думкі пра сустрэчу.

2

Разам з намі жыло некалькі груп дэсантнікаў. Кожная выконвала толькі ёй вядомае заданне і сваю работу трымала ў строгім сакрэце.

Дэсантнікі вылучаліся сваёй стрыманасцю, дысцыплінай і большай развагай у параўнанні з расхлябанымі, бесшабашнымі і ліхімі партызанамі. Называліся групы па псеўданімах камандзіраў.

Ад вогнішча я кустамі прабраўся да месца, дзе размясціліся дэсантнікі капітана Сокалава.

Між сосен — тры зямлянкі і будан-кухня. Другі будан — для коней, вазоў, фуражу. Усё спланавана кампактна, зручна — нічога лішняга, дарожкі пасыпаны жоўценькім пясочкам, і ноччу яны здаваліся белыя. Тут адчуваліся ахайнасць і казарменны парадак.

На бярвеннях — два сілуэты: мужчынскі і жаночы. Адзіная жанчына ў групе — радыстка — на мінулым тыдні загінула ў баі. Я насцярожыўся: няўжо Данута?!

– Ваня, ты? — аклікнуў мяне голас лейтэнанта Трашкова.

– Я, Пятро. Прывітанне...— Голас мой уздрыгануў, а ногі адмовіліся ісці.

Я адчуў, што твар яго звернуты да мяне.

– Сляпуха твой дзе?

– Паехаў яшчэ ўдзень па Мішу!

– А... І капітана вашага няма? — Іхні камандзір мне быў не патрэбен, але нічога лепшага я не прыдумаў.

— Пакуль няма!.. Садзіся на лаўку, пачакай! Я сеў.

Трашкоў адразу ж забыўся пра мяне і загаварыў з дзяўчынай. Я ператварыўся ў слых. Голас лейтэнанта быў надтрэснуты і сіплаваты, але не ад перапою, а проста — ад расы, прастуды і недасыпання. Малады голас яго суседкі звінеў меладычна, міла, але быў незнаёмы, а ў слове «няхай» дзяўчына вымаўляла «я» глыбока, гэтак можа сказаць толькі беларус з-пад Мінска.

На сэрцы адлягло.

На самай справе, чаму не дачакацца Сокалава і не спытацца ў капітана проста і адкрыта?

Я рассеўся на лаўцы надоўга.

Гм, няйнакш іхні чалавек з Вільні. Зусім магчыма, што яна ведае і Дануту. Магчыма, яны сябруюць?.. Не надта стане яна ўдавацца з табой у падрабязнасці сваёй біяграфіі — разведчыца.

Сокалаўцы лічылі мяне сваім чалавекам, таму Пеця гаварыў у поўны голас. Па абрыўках фраз і тону я зразумеў, што абое чакаюць важнай весткі, а яе ўсё няма.

— А вы, Пятро Змітравіч, навучылі мяне так як трэба? — пыталася дзяўчына.

— Падумай жа сама. Пад галаву класці міну нельга, выбухам толькі падкіне падушку — і ўсё. Ты так не клала?

— Не!

— У ложак пад траверс пакласці — сяннік уратуе!

— А я пад пярыну яму сунула...

— Правільна! А перад гэтым дэтанатар засадзіла ў міну?

— Засадзіла. Яшчэ не ўлазіў, то шчоткай пастукала...

— От гэта дарэмна! Дзякуй богу, што не ўзарвалася ў руках. Няважна, калі да канца не ўлазіў. Усё роўна здэтаніраваў бы!.. Такім чынам, дэтанатар шчоткай загнала і дзірачкі сышліся?

— Што-о?

— Калі загнала, дзірачкі ў дэтанатары і міне сышліся?

— Ой, дайце атруты!

Сілуэт дзяўчыны захістаўся ў бакі ад роспачы.

— Марусь!

— Вы мне пра дзірачкі нічога не гаварылі, ой!

— Маруся, пачакай!

— Ой, атруты мне!.. Забіце мяне, задушыце!..

— Дай слова сказаць!

— Столькі падрыхтоўкі, столькі ахвяр з-за гэтага праклятага ляйтэра, і ўсё прапала з-за дурных дзірачак! Ой, не выжыву!

— Дурніца, пачакай, не лямантуй! Пры чым тут дзіркі? Міна ўсё роўна здэтаніруе, абы толькі...

— Ма-аманька-а!

— ...Абы толькі ўзрывальнік прыткнуўся да толу!

— І слухаць не хачу нічога! Вы мне пра іх не ўспаміналі. Ніякіх там дзірачак не было! І пра іх я нічога не ведала! Я ж вам гаварыла, да гэтай справы не па-ды-хо-джу! Ой, я такая дурная, навошта я згадзілася!

— Ну супакойся. Вось табе другі ўзрывальнік. На, і ўзвядзі таксама.

— Я на яго і глядзець не хачу!

— Яшчэ. Яшчэ цягні, не бойся. Так. Цяпер мы пакладзём яго пад сасну. Праз паўгадзіны — пабачыш сама, узарвецца!

3

Охкаючы і трымаючыся за галаву, дзяўчына паплялася ў зямлянку. Пятро падышоў да мяне. У дэсантнікаў хлопцы як на падбор, а Трашкоў — ростам з мяне. Ён хвіліну прагна курыў. Вочы яго нічога не бачылі. Тады ціхім, падабрэлым ад узрушэння, вінаватым голасам праказаў:

— Адважная дзяўчына! Самому чорту галаву зверне!

— Што ў вас з ёй?

— Служыла ў немцаў афіцыянткай, папрасіла заданне, мы і далі. Учора заклала аднаму тыпу міну ў ложак. Не было як зматацца, дык на кухні цяпнула цесаком сябе па пальцы і выбегла на двор нібы да доктара. Адтуль -- да нас, у лес. Ехала на нямецкіх спадарожных машынах... Але штосьці вестак няма: узарвалася ці не? Міна англійская, чорт яе ведае, мо... Вось і чакаем звестак цэлыя суткі. Сокалаў пайшоў да суседзяў, каб спытацца па рацыі ў Масквы, магчыма там што вядома. Дрэнна без свайго радыста...

— На якую халеру вы займаецеся гэтым? Ну, лупанеце, выляціць у паветра яшчэ адзін генерал — і што? Гітлер заменіць яго новым! А колькі потым немцы нявінных за яго пастраляюць?.. Так добра наладзілася сувязь з горадам, а пасля выбуху ўсё паляціць дагары нагамі, тады пачынай усё спачатку...

— Эх, Барташэвіч, камандзір разведкі брыгады!

— Бо нам, разведчыкам, з-за вас потым найбольш дастаецца!

— Затое калі лупанём такога ляйтэра, кожны салдат падумае: э-ге, швах нашы справы, калі да такіх дабіраюцца! І будзе зямля ў іх гарэць пад нагамі! Ведаеш, як гэта Маральна на армію дзейнічае, як разлагае яе?!

Гэтаксама тлумачыў сваім хлопцам і я. Але сам спрачаўся з Трашковым таму, што няёмка было сядзець у дэсантнікаў проста так.

— Добра! Што яшчэ ў вас новага?

— Ат, не шанцуе! То радыстка напаролася на паліцаяў, то Варонін на чыгунцы трапіў пад абстрэл... Ліха яго ведае, што за бяда на нас навалілася!..— засмучана прамовіў Трашкоў і ўспомніў:— Чуў? Мы, нарэшце, наладзілі адносіны з Арміяй Краёвай!

— О-го, гэта штосьці новае! — насцярожыўся я.

— Тр-р-р, халера, воўчая шкура, стой, кажу! — перабіў нас голас Сляпухі.

Дзядзька з фурманкай пад'ехаў да будана. Хоць цёмна, але я смутна распазнаў на возе на фоне саломы дзве нерухомыя чалавечыя нагі. Вось па якога Мішку ездзіў дзядзька Сляпуха!..

Трашкоў адразу забыўся на мяне і падаўся да воза. Было чуваць, як ён шоргае брызентам, адхіляе палотнішча, як кажа ездавому:

— Пакінем, Волесь, яго на ноч на двары?

— Ну! — з-за каня кінуў дзядзька.

— Яму тут будзе лепш на паветры!..— апраўдваўся лейтэнант.— Заўтра ўдзень Вароніна пахаваем...

Сляпуха панёс у зямлянку хамут і лейцы. Праходзячы блізка, як і належыць у жалобную хвіліну пры мёртвым, ён не павітаўся, толькі паківаў галавой і ўздыхнуў:

—І калі, Ваня, усё гэта скончыцца, скажы мне? З'явіўся капітан і пазваў бадзёрым голасам:

— Трашкоў, Маруся, на выхад!.. А, вось вы дзе! Чулі? Разарвала вашага хросніка на кавалкі!.. Жалобныя сцягі ва ўсім горадзе... Чорны з горада перадаў!

— Вось табе і дзірачкі! — Трашкоў ударыў дзяўчыну па плячы.— Ведаеш, як ты сапсавала імі настрой? Ледзь сабе кулю ў лоб не пусціў!

— А ў мяне, думаеце, было на сэрцы лепш?

— Хопіць, дзеці, зводзіць разлікі, радуйцеся!.. Сляпуха, шукай паўлітра, памянём фашыста, царства яму нямецкае! І Барташэвіч да кампаніі прыстане!

— Таварыш камандзір...—вінавата перабіў ездавы. — Я Мішу прывёз...

— Прывё-оз?

— Вунь, на фурманцы.

Мы накіраваліся да воза. Сокалаў засвяціў ліхтарыкам, і мы паглядзелі на дэсантніка.

— І трэба ж было яму якраз налезці! — са спагадай праказаў Сляпуха.— Эх, Міша, Міша...

— Разрыўной, сволач, у самы вісок трапіў! — Капітан разглядваў рану.— Што цяпер бацьку напісаць на Урал? Прафесару даваў слова глядзець за ім як за сваім сынам...

— Занізка ляжыць! — не слухаў капітана Трашкоў і падсунуў пад галаву брызент.

Раптам побач з намі як бы выбухнула граната — бліснула магніевая ўспышка, і засмярдзела серай. Мы ўздрыгануліся і схапіліся за пісталеты.

— Адбой! — апрытомнеў я першы.— Пятро, ты клаў пад сасну ўзрывацель на праверку!

— У чым справа? — пацікавіўся капітан.

— Усё ў парадку, камандзір. Узрывальнікі не нашы, загранічныя. Думаў — папсутыя ў іх хімікаты. Ажно не, малайцы саюзнічкі, узарваўся дакладна праз трыццаць мінут. Што я табе казаў, Маня?!

— Будзе вам ужо прыдзірацца!

І зноў ніхто не звяртаў на мяне ўвагі.

Я пранікся пашанай да невялічкага калектыву герояў-прафесіяналаў. Сваёй маленькай групкай яны рабілі больш за нашу брыгаду.

— Барташэвіч, калі ідзеш у разведку? — спытаўся капітан.

— Трэба ісці. Па чыгунцы ў бок фронту немцы пачалі вазіць нейкія бутлі. Неабходна праверыць, ці не рыхтуюцца да хімічнай вайны.

— Маня з табой пойдзе. Табе на віленскую чыгунку? І ёй у той бок. Возьмеш яе з сабой!

Я ўзрадаваўся, што будзе магчымасць пагаварыць з ёю пра Вільню:

— Да пабачэння!

4

Ішлі мы з Марусяй першымі, а за намі — хлопцы. Яна крочыла бойка, як дзяўчынка, але ўвесь час заставалася сур'ёзнай.

Ля дарогі стаяў дзікі казёл і аглядаў нас цікаўнымі вачамі. Раптам штосьці яму не спадабалася, ён гнеўна тупнуў нагой і брахнуў:

— Таф!

— Не пазнаеш? — закрычаў я.— Прывітанне!

Казёл брыкнуў цераз елачку і знік так, што не зварухнулася ніводная галінка.

Дзяўчыну не развесяліла і гэта.

Тады я заглянуў у карзінку суседкі. Тыповая карзінка спекулянткі: ніткі, іголкі, сахарын, нямецкае мыла з гліны, кавалачак худога сала. А пад усім пабліскваў чорны лак на магнітных мінах. З-за Дануты я быў уважлівы да разведчыцы.

Паказаліся дзяўчаты з абвязанымі дзеразой кошыкамі. Губы і пальцы ў іх — нібы ў сінім чарніле.

— Прыгажуні, дайце ягад! — спыніў я іх. Дзяўчаты часта дыхалі ад перапуду.

— Дародныя, а скупыя, каб вас памор пакараў!

— Ой, дзядзечку, настаўляйце шапку, толькі здыміце праклён!

— З цябе здымаю, а з іх не!

Усе зарагаталі і пачалі вытрасаць свае кошыкі. Дзяўчаты пайшлі, а я спыніў Марусю і прысыпаў яшчэ міны ягадамі.

— Так лепш? -- спытаўся.

— Ага...

Дзяўчына ніяк не давала ўцягнуць сябе ў размову.

Перад вачамі паўстала пакрыўджаная, з дакорлівым позіркам Стася. Праз хвіліну я зноў падумаў аб Дануце і стараўся дагадзіць разведчыцы.

Маруся была невысокая, шчуплая, на бледным яе твары выдзяляліся тонкія вусны, чорныя вочы глядзелі спадылба. Але на свежым паветры, разгарачаная хадзьбой, яна паружавела. Коратка падстрыжаныя валасы яе вецер бязладна збіў на адзін бок, і яна Іх не папраўляла, бо ведала, што так ёй да твару. Каўнер шэрага плашча прыпаднялa і цесна зашпіліла пад барадой. Калі трэба было звярнуцца да мяне, яка схіляла галаву на плячо і паднімала вочы. Не ведаю, бачыла так яна мяне ці не, але выходзіла гэта ў яе міла. Безабаронная і слабая, яна ішла ў самую зяпу ворага, ёй было не да мяне. Лезці да яе з малазначнымі пытаннямі не выпадала. Разведчыцы нічога не каштавала абрэзаць мяне, малазнаёмага: «Ці не залішне ты цікавы, з кім я знаёмая ў Вільні?»

Потым я асвоіўся з разведчыцай і мог ужо пачаць свае роспыты, але заела самалюбства. Успомніў фатаграфію Дануты са Станеўскім. Успомніў самаўпэўненага Генрыха на кватэры Янкоўскіх... І ва мне загаварыла гордасць. Ні адзін чалавек мяне так не пакрыўдзіў...

У Марусі я нічога не спытаў. Аднак ва мне таілася кволая надзея, што яна вернецца ў Вільню і Данута распытае яе сама.

5

Мая маці, каб сабрацца з думкамі, звычайна садзілася вязаць панчоху. Бацька ў такіх выпадках браў сякеру і да цямна ўпарта сек дровы. А чым заняцца партызану ў такім стане?

Пайшоў я ў лес, адкалоў фінкай вялізны кавалак кары ад сасны, сеў на пень і пачаў нешта майстраваць. Думкі паплылі без сістэмы і сувязі. Паступова галоўнае, што ляжала на сэрцы, выцесніла часовае.

Ганяюся за Данутай, як Дон Кіхот за Дульцынеяй, і не бачу, што адбываецца пад самым носам. Які я няўважлівы да радысткі — з

першага знаёмства і да сённяшняга дня. Для хлопцаў жа яна была чараўніцай, якая валодае рацыяй і гаворыць з Масквой.

Стрыманая і валявая, Стася, згледзеўшы мяне, тушавалася і пачынала гаварыць з людзьмі амаль шэптам. Яна гатова была рабіць усім вымову за няўвагу да мяне. Я ж паводжу сябе з ёю як некалі з Данусяй. Колькі можа гэта цягнуцца? Што я за прынц? Хіба мала ў нас добрых хлопцаў? Чым горшы, напрыклад, Віктар Кучэрын?..

Група партызан прывяла з-пад Вільні аднарукага лётчыка. Яго вылечылі польскія сяляне. Відаць, не было ў свеце чалавека, які б не адчуваў да лётчыка сімпатыі. Віктар адразу стаў агульным любімцам.

Мяне пякла рэўнасць, што ён лётчык, што ў яго сіні камбінезон і планшэт авіятара са стракатай картай за цэлулоідам. Кучэрын не спускаў са Стасі вачэй...

Узвінчаны, я ўстаў і падаўся ў лагер.

Па дарозе глянуў на тое, што трымаў у руцэ. Выструганы з кары караблік з мачтамі і якарам на баку — нібы ў параходзікаў, якія плавалі некалі па Віліі.

— Чорт! — шчыра здзівіўся.

Агляну́ўся, куды кінуць цацку, і пашкадаваў. Вырашыў падарыць яе Лёніку.

Ля ядлоўца раслі фіялетавыя званочкі, я збочыў з дарогі.

...Каля зямлянкі радысткі ні душы. Замест дзвярэй ад камароў вісела сетка з марлі. Яна нечым напаміналa родную, мілую Стасю. Я адчуў сардэчную ўдзячнасць за яе ўпартую дабрату, і мне захацелася зрабіць для яе штосьці добрае.

Асцярожна расхіліўшы марлю, я нырнуў у зямлянку, паставіў на рацыю караблік і паклаў званочкі.

**6**

Ад зямлянкі я накіраваўся на кухню. У шалашы — вясёлая кампанія. Я ведаў, хлопцы з паходу прынеслі чайнік самагонкі і цяпер, відаць, «запраўляліся» перад абедам. Кучэрын, чуваць, быў у цэнтры ўвагі.

— Стася, за тваё здароўе, дзетачка! — крычаў Віктар.

— Усё роўна атрымаеце толькі адну місу! — смяялася яна, падаючы праз галовы ежу.

— Згодзен, толькі з тваіх рук! І налівай ужо такую, з якой пояць коней!

— Пашукаю!

— Палундра, начальства з'явілася!

— Што мне яно? Мы заданне выканалі і зараз самі сабе начальства!

— Янка, падсаджвайся, нацэдзім і табе!

— Паспрабуй чайку!

— Лепш грашамі маю порцыю выдайце!

— Рублямі, маркамі?

— Усё роўна, Стася. Прывітанне!

Ажыўленая, яна толькі бліснула ў адказ шчасліва вачамі і лёгка панеслася да катла, ані крыху не саромеючыся свайго не зусім складнага выгляду: на ёй была шаўковая сукенка і кірзавыя боты. Сёння яе быццам падмянілі. Смелая і ўпэўненая, дзяўчына аж ззяла. Я насцярожыўся і з зайздрасцю зыркнуў на залатыя пагоны капітана пад новенькім камбінезонам.

Кубак быў адзін, і хадзіў ён па кругу, напаўняў яго Кучэрын:

— Хочацца і яму, але начальству трэба захоўваць фасон, паказваць прыклад. Эх, доля камандзірская!.. Не хацеў бы я тае славы, абы толькі... Стася, тваё, дзетачка!..

Здалося, што яго нападкі на мяне дзяўчыне не спадабаліся.

— Штосьці вы надта часта п'еце за маё здароўе,— упікнула яна ад катла.— Так і сваё можна прапіць!

Яе вочы свяціліся ціхай радасцю, і яна была пад уражаннем толькі ёй вядомага прыемнага сакрэту. Значыць, гэта не з-за Кучэрына! — адлягло ў мяне на душы.

— От дае!..— захапіўся лётчык. Хлопцы няўпэўнена засмяяліся.

Ох, як я ненавіджу гэтае выражэнне!..

— Мяне ты, урэшце, накорміш? — спытаўся я.

Перахапіўшы мой позірк, Стася быццам заглянула ў душу. І мне здалося, што ўсё навакольнае знікла, у шалашы мы толькі двое. Знікла мая самотнасць.

Падаючы міску, яна ўбачыла ў ёй сасновую шышачку і вінавата ўскрыкнула:

— Ой, я налью другую!

— Нічога, будзе смачней! — хапіў я за край посуд.

Стася рассмяялася.

— Праўда, праўда, смачней,— не ведаеш? А сама ўжо абедала?

— Не...

— То давай разам. Бяры лыжку!

— Я зараз!

Радыстка вярнулася, падсела і ціха прашаптала:

— А я ведаю адну таямніцу!

– Ну-у? — Я адчуў, як ад яе шчаслівага позірку і мяне агортвае хваля радасці.

– Пайшла сёння паласкаць гімнасцёрку на возера, а мяне ўсё цягне вярнуцца дамоў. Уляцела я ў зямлянку і са свету нічога не бачу ў паўзмроку. Толькі па інтуіцыі зразумела, што тут былі вы.

– Дакуль будзеш выкаць?!

– Быў ты... Гляджу — на рацыі...

– Здаволеная?

– Вельмі!

– І добра!

— А мне ў апошні час так цяжка было на сэрцы, што вырашыла прасіць штаб перавесці ў другое злучэнне...

Я ўявіў сабе жыццё без Стасі і аж страпянуўся.

– У другое?

– Аг...— Горла яе перахапіла спазма, а вочы напоўніліся слязьмі.

– Даруй, Стась...

Я адчуў, як мяне распірае ад шчасця, і так мне стала хораша, як бывала толькі некалі ў Вільні.

7

Па нейкім часе я адправіўся да дэсантнікаў з намерам распытаць у Сокалава пра Дануту. Але знайшоў толькі пустыя зямлянкі: група накіравалася ў Прусію.

– Засталася толькі Іхняя кухарка. У сямейным лагеры цяпер! — падказалі суседзі.

Я знайшоў гэтую цётку.

Сапраўды, дэсантнікі прыводзілі з Вільні нейкую паненку. Яна размаўляла на мяшанай рускай і польскай мове, а ў лагеры пабыла толькі з раніцы да вечара.

Жанчына добра запамятала незнаёмую, бо яе так пакусалі камары, што ў дзяўчыны паднялася тэмпература і медсястра мусіла даць ёй уколы.

– Колькі жыву, не бачыла, каб чалавек гэтак баяўся камароў! — дзівілася кухарка.

– Гутарыць не даводзілася?

– Ой, не! Колькі людзей да дэсантнікаў прыходзіла, я ні разу ні з кім не гаварыла. Не мела права. Нельга мне і вам пра гэта расказваць, але ўжо ладна, свайму чалавеку...

– Значыць, не гутарылі з ёй,— уздыхнуў я.

— У яе з Сокалавым былі ўсё нейкія сакрэты, абмяркоўвалі нешта доўга, дзяўчына амаль не паказвалася з зямлянкі...

Больш я нічога не даведаўся. Адыходзячы ад старой, цешыў сябе: Сокалаў сказаў бы, каб мной хто цікавіўся...

## РАЗДЗЕЛ СЁМЫ

1

Я ўжо даўно жанаты на былой радыстцы Станіславе Эдвардаўне Дварэцкай. Жывём мы ў Гродне.

Настаў зусім іншы час. Я — чалавек, пра якога людзі гавораць, што ён шчаслівы. Мяне цэняць на рабоце. Зарабляю нямала грошай. Маю выгодную кватэру. Наладзіў добрую сям'ю. У мяне два сыны. Але не толькі таму я спакойны. Я не з тых людзей, для якіх добрая зарплата, выгодная кватэра і ўдалая жаніцьба — мэта ўсяго жыцця. Гэта прыйшло неяк само сабой!

Галоўнае — мая ідэя дасягнула мэты.

Я заўважаю, што пасталеў. Ужо не так хутка скачу да неба ад радасці і не выходжу з раўнавагі з-за кожнага глупства.

Цяпер мне не ўсё роўна, спаць на правым баку ці на левым, ісці па лесвіцы ўверх ці ўніз, не бегаю ўжо я цераз тры ступенькі, і калі ў полі напаткаю плот, то не стану яго пералазіць, а лепш абыду. Але ўвогуле, мабыць, я застаўся такі самы.

Я ўпэўнены — выдарыся якое-небудзь няшчасце, скажам, вайна, хоць і з болем у сэрцы, але без разважанняў пакіну і свой дастатак, і сям'ю, каб зноў пайсці змагацца за справу, якая з дзяцінства стала маім сумленнем, законам жыцця, нормай паводзін.

Адным словам, я — адзін з мільёнаў таго пакалення, якому давялося гартавацца ў гарніле гістарычных падзей.

Ёсць у мяне і асабістыя слабасці. Адна з іх — генералава дачка.

Прайшло столькі часу, а Дануту я не забыў. Ці можа забыць інвалід адрэзаную нагу? Яна яму сніцца, «свярбіць» і «баліць». Што ж, праўду кажуць, першае каханне — разьба па камені.

Я жартаваў сам з сабой не раз: не адкрый Паўлаў тэорыі ўмоўных рэфлексаў, адкрыў бы яе я. Трэба толькі каму-небудзь прамовіць «Данута», як я ўвесь і ўстрапянуся. А на нашай Гродзеншчыне гэтае імя вельмі распаўсюджанае.

Да апошняга часу я стараўся сябе не выдаць. Сяджу, напрыклад, з жонкай у пакоі, і раптам у мяне вырываецца гэтае імя, тады я хуценька выпальваю сказ на нямецкай мове, каб гэтае слова патанула ў патоку замежных, і прыкідваюся:

— Глядзі ты, ужо забыўся, як правільна вымаўляецца простая фраза!

— Але,— спачувае мая Станіслава Эдвардаўна.— Замежная мова, калі не практыкавацца, забываецца хутка!

— Трэ было б узяцца за яе, успомніць, мо яшчэ прыдасца!

— Не лянуйся, хто табе перашкаджае?

Асабліва ўспамінаю Данусю, калі пасваруся з жонкай.

Насуперак фактам і логіцы вобраз Данкі вырас у маім уяўленні ў ідэал дасканаласці і прыгажосці. Гэта стала ў мяне нават нейкай хранічнай хваробай. Я ўжо не раз думаў, ці не схадзіць да псіхіятра, ды баяўся, каб людзі не даведаліся пра таямніцу.

Праўда, усё гэта не перашкаджае мне па-свойму любіць жонку. З ёю жывём мы душа ў душу. Калі не лічыць генералавай дачкі, я не маю сакрэтаў ад яе. Ці гэта сапраўднае каханне, ці мая любоў прыстасавалася, як можа прыстасавацца чалавек хадзіць на адной назе, не ведаю.

Сустрэча з князем у аўтобусе мяне растрывожыла. «Няўжо Дануту расстралялі з-за мяне?» — пытаўся я ў сябе тысячу разоў і не знаходзіў месца.

2

Днямі — я забыўся сказаць, што працую інспектарам абласнога аддзела народнай асветы,— паехаў я ў раён правяраць, як рыхтуюцца школы да новага навучальнага года. Набліжаўся час летніх экзаменаў, і бедным дырэктарам было не да мяне. За некалькі дзён я аб'ездзіў усе школы, менш-больш усё высветліў і мог вяртацца ў Гродна.

Пабыў я ў раённага начальства, паабедаў у сталовай перад дарогай і накіраваўся на вакзал.

Стаяў канец мая, навокал была такая прыгажосць, што, здавалася, не нагледзішся і не надыхаешся ўволю. Пабыўшы некалькі дзён на свежым паветры, я адчуў сябе дужым і бадзёрым, а ў сэрцы было столькі дабраты, што хоць ты раздавай яе ўсім прыгаршчамі. Я быў увесь нібы добра настроены раяль, здаецца — кране мяне толькі — і зайграю!

— Эй, начальнік, пачакай! - раптам паклікаў мяне хтосьці ззаду.

Здзіўлены, я азірнуўся. Мяне даганяў Віктар Кучэрын.

Не той Кучэрын — з залатымі пагонамі, у бляску славы. Гэты здаваўся меншы ростам, а па яго выгляду можна было зразумець — ён толькі што прачнуўся пасля п'янкі. Валасы ўзлахмачаныя, твар — стомлены і шэры, зашмальцаваны пінжак з пустым рукавом вісіць нібы на чучале.

— Віця, ты-ы? — шчыра ўзрадаваўся я таварышу.

— Як бачыш. Здароў! — падаў ён мне левую руку.

— Прывітанне, Віцька! — усё яшчэ не мог я прыйсці ў сябе ад прыемнай нечаканасці і нязграбна пацісну́ў яго руку сваёй левай.

Падбадзёраны, ён ужо з папрокам і скептычна аглядаў мяне з ног да галавы:

— Прывітанне, прывітанне, абласны начальнік! Зрабілася няёмка адтаго, што я паголены, падцягнуты і жыццярадасны. Але толькі на хвіліну. Я зараз жа зазлаваў: а хто табе перашкаджае быць такім жа? Колькі за пасляваенныя гады я ўніжаўся, замальваў твае грахі ў начальства, паручаўся, што возьмешся за розум, перастанеш піць!

— У капелюшы, з новенькім партфелем — мі-ні-істр! — дабавіў ён і плюнуў.

Адкуль у алкаголікаў такая дзіўная філасофія: іх чамусьці заўсёды раздражняе прыстойны выгляд чалавека. Яны быццам выхваляюцца сваім «пралетарскім» выглядам і ўвесь свет, відаць, хацелі б бачыць вялізным смеццікам!

— Ну, як жывеш? — адчуваючы жаласць, спытаў гэтым: моў, сядзіце там сабе на цёплых месцах, а пра таварыша забылі!

Віця, Віця, слаўны сокал, як ты адхіліўся ад свайго курсу!

Было яго так шкада, што я не ведаў, што і гаварыць.

Гэтым часам Кучэрын адной рукой спрытна прыкурыў, шпурнуў пусты пачак на тратуар і з выклікам спытаўся:

— Ну што, будзем так стаяць і маўчаць?..

— Грамадзянін! — з дакорам упікнуў Віктара нейкі стары.— Вось жа урна побач, ай-ай-яй, нядобра!

— Скажыце, калі ласка, а я і не ведаў, што вы тут лакеем служыце!

— Віця! — узмаліўся я і позіркам папрасіў у старога прабачэння. Затым падняў пачак і апусціў яго ў урну.

— Кампраметую?.. Што ж, мы людзі цёмныя, жывём у правінцыі...

Па горкаму вопыту я добра ведаў, што ў такіх выпадках ніякія разумныя довады не дапамогуць.

— Перастань крыўляцца! — Пачаў ён мяне злаваць.

Віктар адразу панік. З алкаголікамі, на жаль, размаўляць можна толькі так.

— Абедаў?— спытаўся я мякчэй.— Давай лепш пойдзем і паабедаем!

— Чорт з табой, ты начальнік, грошай маеш багата,- ажывіуся ен.

— Жывём, хлеб жуём...— дастаў ён пачак папярос і кісла ўсміхнуўся.

— Расказвай, дзе ты цяпер, што робіш? — цягнуў я, хоць ведаў пра яго ўсё. Спачатку ён працаваў намеснікам старшыні райвыканкома, потым пачаў запіваць, каціўся ўсё ніжэй і ніжэй. За гэтыя гады паспеў некалькі разоў ажаніцца.

— Дзе? Вось ужо трэці месяц качагарам у бальніцы! — кінуў ён з раздражненнем, быццам кажучы: сядзіце там сабе на цёпленькіх месцах, а пра таварыша забылі!

3

Мы сядзелі ў рэстаране, і Віктар усё пасмейваўся з мяне, што я нічога не ем, бо не выпіў. А хто не п'е, на яго думку,— непаўнацэнны чалавек, ён не ведае сапраўднага жыцця.

Цуд! Гэта ён яго ведае?..

Цяжка было слухаць яго разважанні і адначасова было шкада чалавека, які па дурасці так нявечыць сваё жыццё.

— Ну, а твая палячка як пажывае? — не надта выбіраў ён словы.— Адхапіў кавалак, лаўкач!

— Нічога, жыве,— прапусціў я міма вушэй грубаватасць.

— Тады вып'ем за яе!

— Прабач, ужо выпіў сёння сваю порцыю, больш не магу...

— Усё хітрыш, выслужваешся перад начальствам, баішся, каб плямкі на біяграфіі не было, каб не данеслі на цябе што-небудзь!

Я і гэта сцярпеў.

— Ну як хочаш, мне будзе больш... Дык хоць еш!.. Ах, праўда, у вас інтэлігентныя страўнікі, розныя дыэты, рэжымы, пячонкі...

«Дзе ён жыве? Хто яму мые бялізну?.. Аднак хтосьці ж цярпіць яго!.. А можа, ён вечарамі нават гуляе з дзецьмі — сваімі ці чужымі?!.»

Захацелася даведацца пра сябра больш падрабязна, але я не стаў мучыць Віктара. Толькі паказаў на пусты рукаў:

— Віця, ты ніколі не расказваў мне. Дзе цябе стукнула. У самалёце? Раскажы, калі ласка!

— Вось і крыўдна, што на зямлі! — неахвотна кінуў ён.

— Ну-у? — здзівіўся я больш чым трэба, выклікаючы яго тым самым на шчырасць.

— У лесе натрапіў на леснікоў-гадаў, — уздыхнуў ён.—Выратавала адна полька — нямецкая перакладчыца з Вільні...— Вочы яго зацяпліліся, і ён здаўся мне ўжо добрым хлопцам.

— Курносая! — крыкнуў ён афіцыянтцы.— Падай, дзетачка, папярос!

— Перакладчыца?

— Ага...

«Ці мала было тады ў Вільні перакладчыц-полек, якія ратавалі нашых людзей?» — супакоіў я сябе.

— Збілі мяне пад Беластокам,— закурыўшы і прагна наглытаўшыся дыму, пачаў ён апавядаць.— Прызямліўся я на агародзе, адчапіў парашут і — ходу. З сабой меў толькі пісталет. Зайшоў на нейкі хутар. Дзядзька даў на дарогу сала, торбу квашанай капусты, салдацкую коўдру, запалак, табакі, і я падаўся на ўсход. Прабіраўся ноччу. Днём вылежваўся ў гушчары і дрыжаў: макрэнь, холад, доўгія дні — мае ворагі. Ежа хутка скончылася. Вопратка каторы дзень не прасыхала. Вылеціць птушка — уздрыгваю, з-за кожнага куста так і чакаю ворага. Адным словам, становішча — хоць ты плач!

На другі тыдзень схапіла мяне яшчэ і ліхаманка. Аслабеў зусім: думаў — капут! Хоць бы на партызан патрапіць!.. І вось нехта мяне штурхае руляй вінтоўкі пад бок. Прачнуўся і доўга не магу дайсці да ладу. Ляжу зусім блізка ля шашы, між свежых сажняў дроў. Як сюды забраўся, не магу ўспомніць. Бачу над сабой двух з вінтоўкамі. Партызаны!.. Прашу: «Вады!» — «А ну, хопіць вылежвацца! — злуюцца і зноў поруць вінтоўкамі:— Уставай!» І тут бачу — леснікі!

Аднаго з іх я палажыў адразу. Другі стрэліў у мяне, перабіў косць правай рукі і скочыў, падлюга, за дрэва. Пачалася дуэль. Ён — з вінтоўкі, я — з пісталета. Абодва гарачымся. Я з левай не магу пацэліць. Ён, гад, прастрэліў яшчэ мне грудзі.

Нарэшце выйшлі ў мяне патроны. Але скончыліся яны і ў лесніка. Ён схапіў вінтоўку і пабег. Я не знайшоў сілы перазарадзіць пісталет, самлеў.

Калі вярнулася прытомнасць, гляджу — я ў вясковай хаце. Нада мной схіліўся доктар і робіць уліванне крыві. Я ж трасуся, спатнеў увесь. Правай рукі — няма! Пальцы, далонь, локаць адчуваю, а самой рукі няма, от фокус!.. Ну... А праз месяц праходзіла ваша група, і мяне падабралі хлопцы. Віктар зноў прагна зацягнуўся.

— Ну, а далей? — падагнаў я лётчыка.

Віктар тыцнуў акурак у талерку:

— Ачуняўшы, пацікавіўся, як жа я апынуўся ў дзядзькі. І людзі мне расказалі. На шашы ляснік спыніў нямецкую машыну і пачаў тлумачыць, што ў лесе ляжыць савецкі дэсантнік. З немцам ехала перакладчыца. Яна пераклала, быццам у лесе сасной прыдушыла рабочага і патрэбна медыцынская дапамога.

Лясьнік, вядома, нічога не зразумеў. Немец пасадзіў яго ў машыну, і яны паехалі. А праз гадзіну дзяўчына вярнулася ў лес з доктарам-палякам. Дзе падзеўся ляснік — таямніца. Мяне прывезлі ў вёску, адрэзалі руку, перавязалі грудзі...

— А перакладчыца якая з сябе? — замёр я.

— Не бачыў. Быў непрытомны, калі прыязджала. Доктар некалькі разоў наведваўся. Ён сказаў, што дзяўчына — дачка польскага афіцэра і што я павінен усё жыццё за яе маліцца. Я спытаўся, як зваць. «Канспірацыя!» — засмяяўся ён. Дзядзька гаварыў, прыгожая...

— Не дачка генерала?

— Магчыма.

— А калі гэта здарылася?

— У красавіку сорак трэцяга.

— Ты добра памятаеш? — не пытаўся я, а прасіў з іскрай надзеі, хоць добра ведаў і сам, што Кучэрын прыйшоў да нас праз паўгода пасля таго, як я страляў у Дануту.

— Такія рэчы не забываюцца, будзь спакойны!

— У якой вёсцы жыве дзядзька, дзе ты хаваўся?

— Пад Вільняй. Ездзіў я да яго пасля вайны, але ўжо не застаў. У Польшчу выехаў з сям'ёй.

— Не можа быць!

— Чаму цябе ўсё гэта так цікавіць? Ты што-небудзь ведаеш?

4

Вярнуўся я з камандзіроўкі.

Падала жонка абед, сеў я есці, і нічога не лезе ў горла. Уключыў тэлевізар. Ішоў новы фільм з Таццянай Самойлавай, а ў мяне перад вачамі другое. Выключыў тэлевізар. Прычапіліся з нейкім пытаннем дзеці, і іх прагнаў. Жонка купіла новую пласцінку «Авэ Марыя» Баха (калісьці не любіў класічнай музыкі, не любіў з-за ўзросту), паклаў пласцінку, запусціў, але і класічная музыка не супакоіла, апарат выключыў.

— Што з табой, Янка, нездаровы ты? — устрывожылася Стася.— Мо на рабоце што здарылася?

www.kamunikat.org

— Выдумай!

— Дык чаму ж ты такі?!

Я пераказаў ёй усё, што чуў ад Кучэрына. Стася прамаўчала. Толькі потым неяк занадта падазрона паведаміла:

— Цяпер у мяне тры ўрокі ў восьмым і дзевятым класах. Іду ў школу. А сёмай спаткаеш мяне перад магазінам «Колас» і дапаможаш несці сёе-тое...

— Добра, спаткаю...

Вечарам са Стасяй выходзілі мы з магазіна. Я нёс пакункі, кулёчкі і чакаў буры за сваё прызнанне.

— Калі ласка, праходзьце! — у дзвярах прапусціў я нейкую жанчыну, высцерагаючыся, каб яна чаго-небудзь не выбіла ў мяне.

Я не памыліўся ў прадчуванні, бура хутка пачалася. На вуліцы жонка пацягнула мяне за пінжак:

— Ты куды гэтак спяшаешся?

— За мной не так будуць цябе штурхаць, Стась!

— Вельмі ты ўжо стаў аба мне клапаціцца, што і казаць! — з хваравітым раздражненнем заўважыла яна.— Чакай, чакай яго пад магазінам, тырчы ва ўсіх на віду...

— Дык не ты ж мяне, а я цябе чакаў, Стася! Ты ж прыйшла ў палове восьмай, спазнілася на цэлыя паўгадзіны!

— А-га, ты мяне чакаў таму, што я цябе мелася чакаць, якая розніца!

— Ну і логіка ў цябе, не дай бог! — пацісну ў я плячамі.

— Папрацаваў бы ў школе, тады пабачыў бы, якая ў цябе была б логіка. Падумаеш, пачакаў крыху... ногі яму адпалі!..

Я прамаўчаў.

У апошні час Стася стала занадта нервовай. Найменшае глупства можа вывесці яе з раўнавагі. Што ж, на гэта былі прычыны. Пасля вайны нам з ёю шмат давялося перажыць. Амаль на адной стыпендыі канчалі інстытут. Пажаніліся — ні кватэры, ні вопраткі, ні лыжкі. А тут пайшлі дзеці. Фактычна мы сталі на ногі за апошпія гады. На мне мінулае амаль не пакінула следу, а ёй, беднай, дасталося! Адны дзеці колькі забралі сілы і здароўя.

Я разумеў жонку і стараўся не даваць прычын хваляваца. Як на бяду, трэба было мне кучэрынскім расказам разварушыць старую рану!..

Замкнёныя дома сыны-дашкольнікі абрадаваліся нашаму прыходу і кінуліся насустрач:

— Што купілі? Семкі, ура-а!

— Не лезце! — абрэзала маці і іх.

Справы дрэнь.

Я ўдзень слаба паабедаў, і мне захацелася есці. Паклікаў на кухню сыноў, разагрэў на пліце суп, заслаў стол чыстай паперай, паставіў на яго міску.

— А ну, хлопцы, давайце падрубаем. З адной пасудзіны, па-партызанску, добра? Стась, хадзі перакусім да вячэры!

Садзімся за стол.

— Што ты мне ўсё тыцкаеш кулаком у твар? Не мог разліць кожнаму ў талеркі? Да чужых ты клапатлівы, што і казаць...

— Я хацеў, каб табе было менш пасуды мыць! І да каго чужога я клапатлівы больш, як да цябе?!

— Бачыла, з якой галантнасцю ты расшарквaўся перад прыгажуняй ля магазіна: «Калі ласка, праходзьце!»

— Ну, ведаеш!..

Гэта было ўжо занадта. Я кінуў лыжку, лёг на канапу, падлажыў пад галаву рукі і ўтаропіў вочы ў столь.

Кажуць, мужык і жонка — самыя блізкія людзі. Гэта так. Але чамусьці ніхто не скажа, што яны могуць быць і самымі далёкімі. Пра некаторыя рэчы, напрыклад, скажаш чужому чалавеку, але ніколі не скажаш жонцы. Цьфу!..

Падышоў старэйшы сын, працягнуў мне жменьку семак і спачувальна запрапанаваў:

— На, татка...

Я залускаў.

— Ты чаму на падлогу кідаеш? — убачыла Стася.

— Добра, буду на столь!

Я паклаў семкі і павярнуўся да сцяны. Не, хопіць з мяне!.. Чым я вінаваты, што на свеце была такая Данута Янкоўская, што я закахаўся?

5

Праз некалькі мінут жонка апамяталася:

— Янка, і не сорамна табе так валяцца без работы?

— Вельмі. Вазьмуся за сон.

— Хлопцы, сцягніце з таты туфлі!

Ляжу і не звяртаю ўвагі на тое, што хлопцы робяць з маімі нагамі.

— Сцягнулі? Малайцы! Цяпер бяжыце на двор, пагуляйце сабе крыху!

Дзеці выбеглі, і яна паведаміла:

— Сёння выхавацелька расказала, што старэйшы прыходзіць у дзіцячы сад з засаджанай за пазуху рукой. Быццам яна ў яго зламаная...

Я ўсхапіўся з канапы і зарагатаў.

— О, ён яшчэ смяецца!

— А чаго ж не смяяцца? Фантазіі багата! Сам быў такі! Калісьці ў школе, каб стаць героем, выбіваў патыліцай дошкі ў ганку!

Жонка цяжка ўздыхнула. Затым без ніякага пераходу, з падазроным спакоем заявіла:

— Пасля вайны, Янка, ты яшчэ ні разу не быў у Вільні. З'ездзіў бы...

— Чаго там не бачыў?! — разгубіўся я.

— Не-е, ты з'ездзіш! Трэба, Ваня, каб тваё сумленне супакоілася. Ты павінен дакладна даведацца, што з Данусяй. Мо яна жыве яшчэ...

— Знайшла важнасць...

— Важна!.. Ды... хопіць, наслухалася я тваіх практыкаванняў у нямецкай мове — думаеш, дурная і глухая, нічога не бачу і не чую?!

Я нібы ў рот вады набраў.

— Добра! Ідзі да загадчыка аблана, папрасі водпуск на пару дзён, з'ездзі і высветлі ўсё. Горад жа ад нас недалёка.

— Пустое гаворыш...

— Я добра ведаю, ты хочаш гэтага, толькі хаваешся. Магчыма, Данута яшчэ жыве там! Няўжо, думаеш, я бусурманка?

— Тады чаго ж ты пілавала мяне цэлы дзень?

— Мужчына, вытрываеш! А перад кім яшчэ я магла выказаць свой настрой, перад вучнямі? Сынамі?.. На тое ты мне і муж!

Я прамаўчаў.

— Не мучай сябе, Ваня, едзь. Не ведаю, як цябе раней не выпхнула ў Вільнюс. Але і цяпер не позна. Між іншым, дзецям што-небудзь купіш, хутка ж у школу старэйшаму...

Жонку апанавалі старыя крыўды. Але супроць таго, што цягнула мяне ў Вільнюс, мы абое былі бяссільныя.

## РАЗДЗЕЛ ВОСЬМЫ

1

Быў пачатак чэрвеня.

Поезд спыніўся, я вылез з вагона.

— Паднесці? — спытаўся насільшчык.

Не люблю, каб мне прыслужвалі. Го, цяпер і я тут нібы пан!..

Спускаючыся з перона ў тунель, я аж пакратаў рукой белыя кафлі на сцяне — знаёмыя, родныя. І ўцалелі ж у вайну!..

Наверсе я анямеў: замест цеснага і змрочнага будынка вакзала — гмах! — У агромністай зале з манументальнымі калонамі я адчуў сябе маленькім, кволым, старамодным.

З прывакзальнай плошчы адкрылася мне незнаёмая панарама дамоў з прыязным бляскам новенькіх шыбаў. Над жылымі блокамі дзесьці ў раёне Пагулянкі неба падпіралі тонкія ажурныя мачты, і ўжо яны, а не цэрквы і касцёлы, стваралі сілуэт горада. Кінуліся ў вочы густое перапляценне правадоў і незвычайныя для Вільнюса тралейбусы. Але мне хацелася прайсціся па горадзе пешшу. Для цікавасці я спытаўся ў нейкага хлопчыка:

— Слухай, братка, і на Антаколь яны таксама ходзяць?

Малы ад здзіўлення паціснуў плячамі, як зрабіў бы некалі я, калі б у мяне спыталі, ці кожны дзень цячэ Вілія.

Я ніяк не мог прызвычаіцца да новага горада.

Проста з вакзала накіраваўся на старую кватэру, да прачкі. У двары пад плотам — той самы лопух. Той самы дом. Тая самая бардовая шалёўка прыкрывала спарахнелыя сцены. Толькі цяпер жылі тут ужо незнаёмыя людзі. І я накіраваўся да генералавага дома.

Па развешанай на вяроўках бялізне на панадворку зразумеў, што ў доме цяпер жывуць некалькі сем'яў і прытым не надта багатых.

Брамкі не было.

Я мінуў перакошаныя і парысаваныя бартамі грузавых машын бетонныя слупы і пастукаў у парадныя дзверы. Выйшла маладая жанчына, на хаду захінаючы квяцісты халат,— відаць, толькі што карміла дзіця. Яна квітнела маладосцю і здароўем.

— Янкоўскіх? — здзівілася.— Такіх тут няма.

— Яны тут жылі!

— Не-е, не жылі ніколі!

Убачыўшы маё расчараванне, жанчына захацела дапамагчы:

— Быць можа, не тут? А які нумар дома вы шукаеце?

— Нумар гэты. І дом напэўна гэты. Я-то ведаю!..

— Усе трынаццаць год мы жывём тут, я тут і вырасла, замуж выйшла, а такога прозвішча не чула...

Я хвіліну пастаяў. Добразычлівасць у вачах маладзіцы паступова змянілася разгубленасцю:

— То, можа, у дом зойдзеце...

Жанчына, відаць, думала, што на яе ветлівасць я адкажу таксама ветлівасцю і пайду сабе туды, адкуль прыйшоў. Але я злавіў яе на слове і пераступіў парог.

Разгубленая да рэшты, маладзіца павяла мяне, не ведаючы куды і нашто.

У калідоры, які некалі быў прасторны і блішчаў лакам, цяпер тырчалі звычайныя скрыні, клункі, веласіпеды, жалезныя карыты: гэта быў калідор рабочых людзей.

Каб крыху супакоіць жанчыну, я вымавіў:

— Калісьці тут я...

— Ах, дык вы тут, няйначай, самі жылі!

— Амаль...

— Так бы і сказалі адразу! — падхапіла яна з палёгкай.— Калі ласка, праходзьце сюды... Толькі ў мяне яшчэ не прыбрана...

— Нічога, я трошкі...

Увайшоў у былую генеральскую гасцінную, дзе я страляў у Станеўскага і Данусю. Малое дзіця з соскай спала ў калысцы пад адчыненым акном.

— О-го, чалавек, нічога не скажаш! — палесціў я жанчыне.

— Тры месяцы ўжо!

Маладзіца была шчаслівая і добрая, як усе маладыя маці. Я адчуў яе прыхільнасць, і мне зрабілася так па-свойску хораша, нібы зайшоў я ў хату да родных або даўно знаёмых людзей.

На дубовым паркеце ў ёлачку яшчэ віднеліся чорныя ямкі, выбітыя кулямі. Маладзіца, убачыўшы, што я нагнуўся і ўважліва прыглядаюся да іх, асуджальна заявіла:

— У вайну тут, кажуць, нямецкія салдаты жылі, дровы калолі ў пакоі, ленаваліся вынесці на двор нават...

— От бадзягі!..

Навошта засмучаць яе светлую, нібы сонца, душу цяжкімі ўспамінамі? Я развітаўся і пайшоў.

2

Ідучы па Вільнюсе ад генералавага дома, падумаў сабе: і да чаго ж усё на свеце не вечнае! Здаецца, толькі ўчора тут лазіў, нечага хацеў, кудысьці імкнуўся, змагаўся, а як гэта было ўжо даўно?!

На вежы Гедыміна ветрык гуляў вялізным чырвоным палотнішчам. Сцяг гэты нібы лунаў над горадам.

На Зарэчн, ля моста – помнік. Той самы, польскаму хлопчыку Мечыславу Додзіку, які ўтануў, ратуючы яўрэйскага – Хацкеля

Харцмеца. Зімой 1943 года каля яго праходзіў і не заўважыў. Мабыць, мне засланілі ўсё падзеі, а помнік і тады сабе стаяў, як сімвал неўміручай Чалавечнасці ды пераможна глядзеў на выхадкі фашыстаў.

Як цяпер выглядае ўсё ясней, выразней!..

Вуліцы запоўнены моладдзю — рослымі хлопцамі і дзяўчатамі. Калісьці законныя гаспадары — літоўцы — былі тут яшчэ ў большым загоне, чым беларусы. Затое цяпер гучыць усюды літоўская мова.

І ва ўсіх гэтых пераменах прымаў удзел і я.

Памятаю, некалі зайздросціў я балгарам за іхняга Дзімітрава, а датчанам за Андэрсена і перажываў за беларускую беднасць. А цяпер і я магу ганарыцца.

У вайну фашысты з беларусаў не маглі стварыць ні адной вайсковай часці, затое ў нашых лясах было чатырыста тысяч партызан! Нідзе іх столькі не было!.

Што і як зрабіць, каб тое, што адбылося, не абразіла памяці загінуўшых?!

Вось набліжаецца ваенны патруль. Вайсковыя — свае, блізкія. Толькі ў салдат незвычайныя аўтаматы-карабіны — новенькія і пераліваюць матавай сінявой варанёнай сталі. У капітана на рамяні — пісталет незнаёмай мне сістэмы ў драўлянай кабуры, падобнай да той, у якой нашы партызанскія камандзіры насілі маўзеры. Патрулі так ходзяць, нібы хадзілі па гэтых вуліцах век. На грудзях — камсамольскія і гвардзейскія значкі, хлопцы імі фарсяць, як мы некалі медалямі і ордэнамі...

Пройдуць гады. Ва ўсім свеце запануе мір і лад. Будуць лятаць на другія планеты. Тады людзі нашы ордэны, аўтаматы і пісталеты будуць разглядаць у музеях з цікаўнасцю і спачуваннем да нас, як мы, разглядаючы лукі і пращчы...

Перад кінатэатрам стаяла неспакойная чарга вучняў за білетамі на партызанскі фільм. Гэтыя хлопчыкі і дзяўчынкі праз хвіліну будуць у крэслах ціхутка лізаць марожанае ды з павагай і страхам сачыць за кадрамі. Яны пра вайну ведаюць столькі, колькі мае сыны. «Тата, а што гэта такое ў яго руцэ, нібы эскімо на палачцы?» — «Нямецкая граната, дурненькі...» Тое, што на экране,—для іх поўная заманлівай рамантыкі гісторыя. Скажы ім, што па тратуары ідзе ўдзельнік тых падзей, яны вельмі здзівяцца: вось гэты? Такі звычайны?..

Шмат чаго змянілася. Няважна, што вунь, у скверыку, сядзіць стары інтэлігент і чытае газету так, як мелі звычай чытаць яе людзі старэйшага ўзросту дваццаць год таму назад: склаўшы паперу ўдоўж.

З таго часу прайшла цэлая эпоха. А я прыехаў сюды шукаць учарашні дзень.

— Грамадзянін, прабачце! — перарвала мае думкі прадаўшчыца, выглянуўшы з-пад брызентавага тэнда.— Дапамажыце!

— Што ў вас?

— Зашрубуйце, калі ласка, помпу на бочцы. Забылася, у які бок трэба круціць, і не магу прадаваць піва!

— Зашрубоўваюць заўсёды ўправа, а адшрубоўваюць — улева. Як можна забыць такія простыя рэчы?..— падумаў я ўголас, устаўляючы помпу.

— Гы?! — здзівілася прадаўшчыца той лёгкасці, з якой я выканаў яе просьбу.— Дзякуй!

— Калі ласка...

Пакінуў я яе са смешным пачуццём: нарэшце, зрабіў нешта карыснае ў Вільнюсе, значыць, недарма прыехаў!..

Ну, а што рабіць далей?

**3**

Не памятаю, як я апынуўся над Віліяй.

У гэтым месцы павінен ляжаць вялізны камень. Вось ён. Такі самы. Магутныя яго бакі вылізалі хвалі, а той самы пушок моху надаваў яму зялёнкавы колер.

Аднойчы мы з Данусяй паспрачаліся: я хацеў на гэтым камені пасядзець, яна адмаўлялася. Цяпер яго абляпілі дзяўчаты, якія паводзілі сябе так, быццам толькі яны адкрылі гэтае месца і наогул далі пачатак жыццю. Відаць, яны толькі што здалі экзамены: настрой у іх быў святочны, канспекты валяліся на беразе бязладна, як непатрэбныя паперы.

— Ой, дзяўчаткі, караву-ул! — паскардзілася адна з іх звонка і меладычна.— Ногі набраклі, туфлі не магу абуць! Што рабіць?

— А навошта іх так размачыла? Цяпер босая ідзі па горадзе!

Да кампаніі падыходзіў хлопец. Ён суцешыў:

— Ото ж будзеш мець поспех! Кожны на цябе азірнецца!.. Эй, курскія салаўі, чаму ўжо не спяваеце?

— Спазніўся, наспяваліся!

— Давайце зноў, я ішоў падцягваць!

— Нічога не атрымаецца, семак панаядаліся, і пяршыць у горле!

— От бяда! — паспачуваў жартаўнік, падлабуньваючыся да крайняй дзяўчыны.

— А няўжо ж, бяда! Не падлазь, а то ў ваду піхну!.. Уй, чаму ты не паголішся!

— Бо няма грошай. От не зачапі, яшчэ і брыкаецца!.. Эх, несвядомы ты, Люська, элемент, хоць і вельмі вучоная, атрымліваеш павышаную стыпендыю і носіш акуляры!

— Вучоная!

— От, каб была яшчэ і добранькая-а!

— То што?

— То дала б трыццаць капеек!

— І што?

— І я пайшоў бы, пагаліўся б!

— І што?

— І пацалаваў бы цябе!

Узняўся смех, шум. Замільгалі загарэлыя рукі, узляцелі фантаны пырскаў і заблішчалі на сонцы жывым серабром.

— У мяне ёсць пяць капеек,— азвалася дзяўчына, калі ўсе супакоіліся.

— А ў мяне сем!..

Сабраўшы патрэбную суму, адправілі жартаўніка ў цырульню. Потым засумавалі.

— Бр-р-р, мне холадна! — азвалася адна ўстаючы.— Мая, ты ўжо можаш абуцца?

— Паспрабую...

— Хутчэй!

— А куды цяпер пойдзеш, яшчэ рана! — уздыхнуўшы, разважыла другая.

— Во, дзяўчаткі, ідэя! — закрычала трэцяя, таксама ўзнімаючыся.— Давайце паходзім па кандытарскіх магазінах!

— Няма грошай.

— Проста так паходзім, для цікавасці. Паглядзім, якія ёсць новыя цукеркі!

— Эўрыка!

— Я і старых не бачыла, цэлы год не вылазіла з інтэрната!

— Хадзем! Ён вернецца, а наш і след прастыў!

— Піхайце сшыткі мне ў чамадан і айда!

Нібы чародка шпакоў, дзяўчаты ўзняліся з каменя, і ўраз іх не стала.

У гэтай бяздумнай бадзёрасці сучаснай моладзі і светлым аптымізме было нешта новае, народжанае эпохай. Калісьці хлопцы і дзяўчаты былі больш замкнутыя, насцярожаныя.

І ў той жа час у іхніх паводзінах я знайшоў нешта такое, што радніла іх са мной і Данутай.

Я падумаў аб дзяўчатах: «І маеце да каго заляцацца! Гэта ж яшчэ мамін сынок...» Як на злосць, ніводная з іх на мяне і вокам не павяла, нібы мяне тут і не было!..

Я ўздыхнуў. Зрабілася сумна. Нічога не зробіш, маё юнацтва прайшло. А ўсё ж такі цікава пабудавана жыццё! Яго, нібы бясконцую эстафету, перадаюць з пакалення ў пакаленне. Што ж, мы сваю эстафету не так ужо і дрэнна неслі...

Калі на камені нікога не стала, я накіраваўся ў горад. Адчуваў цяпер сябе няёмка — будні дзень, а я блукаю тут, як валацуга, падглядваю за маладымі, быццам сам не быў такі.

Вельмі не люблю хадзіць па магазінах. Стася наказвала нешта купіць. Заглянуў у адзін, другі: ля прылаўкаў тоўпіліся людзі. Не штурхацца ж і мне тут?!. Быццам у нашым Гродне не тое самае?.. А чаго маім хлопцам не хапае? Жанчын толькі слухай!..

І я накіраваўся на ўскраіну, дзе некалі жыла цётка Антося.

**4**

Па дарозе да былой служанкі я ўбачыў бабульку. Яна пасвіла коз. Бабулька сядзела на сонечным баку гары і высушанымі, як курыныя лапы, рукамі перабірала чорныя гарошыны ружанца. Старая каза з падвязаным вымем спакойна пасвілася ля тратуара, а маладая — паставіла пярэднія ногі на дрэўца ды зграбна, як гэта могуць рабіць толькі козы, аб'ядала лісточкі.

– А ну, артыстка, пайшла! — шпурнуў я ў яе каменьчыкам.

Бабулька вінавата падхапілася і з залішне клапатлівай старэчай паспешнасцю пагналася за шкодніцай, нібы рабіць расправу.

Божа мілы!

Толькі цяпер я пазнаў у гэтай дачасна пастарэлай кабеціне цётку Антосю!

– Ідзіце да майго дома, зараз туды прыйду і я! — калі мы павіталіся, сказала старая, трымаючыся як мага далей, каб я не разгледзеў яе трантаў.

Нельга было паверыць, што гэтая сухая бабуля ў падраным і нейкім іржавым, нібы кальчуга з музея Луцэвіча, світэры — разважлівая і некалі цвёрдая характарам цётка Антося. Сэрца маё сціснулася ад жалю.

Давялося вярнуцца ў магазін за падарункамі.

Праз гадзіну я знайшоў панадворак цёткі. Крапіва, старая салома, іржавае жалеззе — ногі можна паламаць!

Старая ўжо мітусілася дома. У хаце поўна катоў. Чорныя і шэрыя, малыя і вялікія, чыстыя і брудныя, гладкія і струпастыя — яны ўсюды лазілі, горда задраўшы хвасты, пацягваліся, выпускаючы кіпцюры, пазяхалі ружовеынкімі роцікамі або ў незалежных позах афрыканскіх львоў ляжалі на зашмальцаваных падушках, на падлозе, табурэтках, нават на стале і ложку. Паветра было цяжкае.

— Што гэта ў вас, цётка Антося?! — асцярожна, каб не наступіць на каторага звера, здзівіўся я, прабіраючыся ў пакой.

— Мае дзеткі...— сарамліва і вінавата адказала старая, не паднімаючы вачэй.

— Навошта ж яны вам?

— Падабрала, бедных, на вуліцы... Калі ж адной так жыць вельмі сумна!

— Дык лепш узялі б сабе дзіця з дзетдома на выхаванне, а не гэтую дрэнь!

— Чалавек сам дасць сабе рады, а беднаму зверу і пан Езус загадаў дапамагаць...

Старая здзяцінела.

— Ну, раскажыце, як жывяце!

— Вось так і жыву,— адказала жанчына на той мешанай, але мілай майму вуху польскай і беларускай мове, на якой размаўлялі да вайны віленскія служанкі, гандляркі рынкаў, вазніцы.— Нікому, дзенькі богу, не вінавата, і сама сабе гаспадыня!

5

Узяўшы ад мяне пакункі, цётка Антося ўпусціла іх на стол і ўспляснула рукамі:

— Матко боско! Езус Хрыстус!.. Я ж вам галоўнага — перадачы ад нашай Данусські — не дала! Чаго ж я, старая, маўчу!.. Псік, не лезьце пад ногі, пачакайце! — старая кінулася да шуфляды ў чорнай і паточанай шашалем шафе.

Мяне працяло балючае прадчуванне нечага новага і надзвычай важнага.

— Езус Хрыстус! Пан Ян не быў аж пятнаццаць гадоў у нас. Божа свенты!

Прыціскаючы да грудзей добра вядомую мне скрыначку са слановай косці, у якой Дануся трымала свае стужкі і шпількі, жанчына не ведала, што рабіць. Яна баялася, каб вестка мяне не забіла.

— Ну, не цягніце, цётка Антося! — узмаліўся я. У часы нямецкай акупацыі ў Вільні сярод палякаў развіўся падпольны рух. Кіравала ім

нацыяналістычная арганізацыя Арміі Краёвай. Дануся служыла ў камендатуры і была звязана з гэтай арганізацыяй.

Пасля забойства Станеўскага Данута яшчэ служыла амаль паўтара года ў камендатуры і ратавала людзей, якія пападалі немцам у лапы. Затым яна наладзіла сувязь з савецкімі дэсантнікамі і нават пабывала ў іх.

— Я яе збірала тады ў лес,— расказвала цётка.— Яна выходзіла ўпэўненая, што вас убачыць, а вярнулася сумная — слова нельга было выдабыць.

Вясной 1944 года фашысты западозрылі Дануту. Пачалі сачыць за ёй, потым арыштавалі. Пасадзілі і мачаху.

Па дзіўнаму непаразуменню фашысты перш за ўсё расстралялі чалавека, менш вінаватага,— пані Вацлаву! А Дануту доўга пратрымалі ў Лукішках.

Тым часам польская адміністрацыя, якая была на службе ў немцаў, пачала за яе, дачку генерала, клапатаць. Немцы пайшлі на ўступкі: Дануту судзілі па ўсіх законах, нават дазволілі наняць адваката.

На працэсе суддзі і пракурор заявілі: «Яна — сапраўдная польская патрыётка, небяспечная для Трэцяга Рэйху, і яе перавыхаваць, на жаль, немагчыма, а таму яна падлягае знішчэнню!»

Перад смерцю ёй удалося напісаць пісьмо для мяне. Яго і падала Антося ў скрыначцы.

Я пайшоў на двор і сеў на нейкую бочку.

«Веру, ты маё пісьмо атрымаеш,— чытаў я на пажоўклым ад часу і вільгаці лісточку паперы, спісанай звычайным алоўкам.— Янэчак, я не толькі не злую на цябе, але тваім учынкам ганаруся. Тысячу разоў думала, што так і павінна было стацца. За гэта цябе і люблю. Ты мяне нібы ўстрасянуў, і я прачнулася. Пасля таго вечара я зразумела, што калі расстрэльваюць чалавека, мала яму толькі спачуваць і крадком перад смерцю падаць кубак вады. Успомніла, што мяне вучылі быць ахвярнай, сумленнай і адважнай, ад мяне нечага асаблівага чакаў тата...

Я прыйшла да сваіх і пачала дзейнічаць. Пастаралася ўгаварыць наша панства лічыцца з вамі, пераканала шукаць сувязі з беларускімі партызанамі. Нават сама вызвалася пайсці на сустрэчу...

І вось я ў лагеры Сокалава. Пра ўсё дамовілася з ім і толькі ў адным спазнілася: капітан мне паказаў цябе з іншай, і я вырашыла, што лішняя. Пра гэта, думаю, расказаў табе сам Сокалаў.

Якая ж потым была мука адчуваць твой локаць і адначасова разумець, што ты ўжо не для мяне!.. Ты, мабыць, і не падазраеш — я

табе разведала, што пад цюкамі прасаванага сена немцы вазілі танкі, а ў бутлях не газы, а — кісларод для запраўкі самалётаў?!.

Жыць засталося лічаныя гадзіны. Я слабая. Паміраць страшна. Пан Адам, які вынесе пісьмо, сёння шапнуў: фронт ля Мінска! Я ведаю розумам, што жыву ў гістарычныя дні, а гісторыя чалавецтва пішацца слязьмі і крывёю, я — толькі адна з мільёнаў ахвяр, але бунтуюся: чаму менавіта я павінна быць гэтай ахвярай?

Часамі ўгаварваю сябе, што не можа быць, каб я зусім знікла з гэтага свету, каб нічога не чула і не бачыла. Мне лёгка сябе ўгаварыць, што нічога не зменіцца, хоць мяне і заб'юць. Ведаю, Янку, ты або мой тата смерць сустрэлі б горда і спакойна, як сапраўдныя мужчыны. За гэтую сілу я цябе і кахала... Адно пэўна — каб цяпер хто вярнуў жыццё, рабіла б зноў тое самае!

Якая я была калісьці наіўная! Дзеля бацькоў вырашыла стаць Марыляй Верашчакай, і мне здавалася: у гэтым мае найбольшае геройства! Я марыла, што аб маім учынку даведаецца пісьменнік, напіша раман, і тады я стану несмяротнай.

А магло стацца, што, скончыўшы школу, выйшла б замуж за самаўлюбёнага маньяка і прыдурка Любецкага і існавала б, як тое дрэва без верхавіны. Самай большай падзеяй за дзень для мяне было б тое, што муж зламаў ногаць, а ўжо трагедыяй — калі б у час не атрымала моднай сукенкі з Парыжа або на аперэту з артысткай Янінай Кульчыцкай дастала б білет не ў першы рад, а ў пяты!..

Звіняць ключы! Гэта па мяне!..

...Не ведаю, ці доўга была без свядомасці. Апрытомнела разбітая і мокрая на ложку ў сваёй камеры. О праклятыя нарманы! Вы толькі спачатку маглі мець поспех, пакуль культурны свет апамятаўся! Вы не можаце перамагчы, бо вяртаеце гісторыю да гунскага перыяду!.. Будзе, Янэк, час, паспрабую апісаць табе ўсё, што было са мной на допыце. А цяпер прадоўжу пісьмо.

Цётка Антося дасць табе фатаграфіі. Ёсць адна, дзе стаю над Віліяй. Калісьці ты прасіў мяне пасядзець на камені, а я капрызнічала. Перад арыштам зрабіла гэты здымак. Пазнаеш камень?

Зняла і нашу студню. Туды ўпала бомба. Убачыш кавалачак бетоннага круга на здымку — гэта!

Я табе, Янку, удзячная. Калі пазнала цябе, мне стала душна... Захацелася большага. Толькі пачала пазнаваць яго і...

У мяне сумленне чыстае. Ад крывавай банды арыйскіх нарманаў я ўратавала не адзін дзесятак герояў. Кідалася ратаваць іх не толькі таму, што ў кожным арыштаваным уяўляла цябе. Потым гэта зрабілася маім сумленнем.

Даруй, што пішу бессістэмна, няма часу перапісваць. Але хоць не магу дыхаць на поўныя грудзі ад страху, думкі мае чыстыя і вострыя. Кажуць, у людзей перад смерцю заўсёды так...

Аб'явілі, што споўняць апошнія мае жаданні: магу заказаць абед, напісаць пісьмо (о тэўтонская гуманнасць!..).

Яшчэ аб'явілі, што робяць ласку, не будуць вешаць, а — гільяцінаваць. Нібы французскую каралеву. Прыйшоў турэмны цырульнік, падрэзаў валасы на шыі, каб не перашкаджалі. Пацешыў, што гэта працягваецца ўсяго пяць — сем секунд і адбываецца на світанні, але гільяціна цяпер загружана і могуць выклікаць у другі час.

Падумала, што б табе яшчэ паслаць на памяць. Локан! Успомніла, як пасылалі яго ў такіх выпадках сваім каханым гераіні раманаў. Падняла з падлогі пасму, але валасы трапіліся зусім сівыя, і я не адважылася іх табе паслаць — не хачу ў тваёй памяці заставацца бабуляй...

Абавязкова пагавары з капітанам Сокалавым.

*Бывай. Цалую. Твая Дануся. Апошні раз бьсвай!»* На гэтым пісьмо канчалася. «...Пагавары з капітанам Сокалавым...» «Эх, каб ён застаўся жывы!..»

**6**

Акрамя пісьма ў скрыначцы было зробленае рукой Данусі апісанне допыту. На паперках польскія сказы перамешваліся з нямецкімі, а побач з падрабязным пералікам *усіх* дэталей часамі сустракаліся няясныя абрыўкі думак. Чалавеку, які не ведае нямецкай мовы і гітлераўцаў, паперкі гэтыя былі б незразумелыя. Усё гэта будзе лепш пераказаць сваімі словамі.

Ледзь яна паспела сунуць пад сяннік незакончанае да мяне пісьмо, як у камеры з'явіўся эсэсавец і загадаў збірацца.

«Вось і смерць мая прыйшла!» — падумала Дануся. Яна ўся амярцвела, ногі сталі нібы чужыя. Агледзела ў апошні раз сцены, нары — дзіва, цяпер ёй стала нават шкада развітвацца з гэтым усім!

Выйшлі яны на двор. Убачыўшы, што гітлеравец вядзе яе не да брамы, а ў канцылярыю, Дануся пачала на нешта спадзявацца.

Увайшлі ў калідор. Злева і справа — дзве шарэнгі арыштаваных з узнятымі над галавой рукамі чакалі сваёй чаргі. Як добра ёй вядома гэтая поза! Цяпер людзі стаяць тварамі да сцяны — здаровыя, чыстыя, нармальныя, а хутка будуць акрываўленымі шматкамі целаў з пераламанымі касцямі... У ёй зноў усё амярцвела: лепш бы скончылі адразу!

Увайшлі ў кабінет.

За сталом знаёмы эсэсавец Меклембург, а насупраць яго — незнаёмы штурмбанфюрэр. Ля іхніх ног — вялікі аўчар. На стале пад белай палатнінай контуры нейкай пасудзіны.

Перакладчык стаяў збоку і трымаў доўгі карычневы бізун з рэменя. Акінуўшы Данусю дзелавым позіркам, ён пачаў біць сябе бізуном па далоні, быццам набіраючы разгон.

Меклембург заўважыў, што Дануся баіцца. Гітлеравец любіў, каб пры яго паяўленні ў людзей ад жаху лезлі на лоб вочы. У такіх выпадках ён нават станавіўся ў позу літасцівага. І цяпер ён з пачуццём бязмежнай улады дазволіў сабе прыязна ўсміхнуцца да ахвяры, а перакладчыку загадаў:

- Weg![1]

Калі за перакладчыкам зачыніліся дзверы, Меклембург паказаў на пусты стул. Дануся села.

Эсэсаўцы завялі размову, быццам і не было ў пакоі арыштаванай. Дануся аддыхалася. Крадком падцягнула панчохі, пастаралася расправіць сукенку — дарма. Тры тыдні яна ўжо не бачыла жалязка. «Ат, ці не ўсё роўна?! Што ім вядома? Як адказваць на пытанні, як сябе паводзіць?» Вось яны сядзяць перад ёю. Старанна паголеныя твары. Надушаныя. Акуратна падстрыжаныя патыліцы. Прычасаныя валасы свежа блішчалі брыльянцінам. З новенькага сукна мундзіры ладна сядзелі на фігурах. Маляўнічыя позы. Самаўпэўненыя рухі. Заваяваце лі!

Яе заела. Толькі б расстрэльвалі на віду ў людзей, а не душылі ў камеры!..

У яе зарадзілася гордасць і жаданне настырыцца гэтым тыпам. Не, нічога яны не даведаюцца, нават, каб рэзалі на кавалкі!.. Толькі зрабілася прыкра адтаго, што вось зараз будзе ім супраціўляцца. Няўжо адважацца мучыць? Яшчэ зусім нядаўна кожны з гэтых тыпаў дамагаўся яе ўсмешкі, рысаваўся, іграў у высакароднасць і шчыгаляў сваёй эрудыцыяй і ўладай. Зрэшты, яны і цяпер рысаваліся.

— ...Разбамбілі рускі параход на Чорным Моры,— апавядаў сябар Меклембурга.— На ім везлі медсясцёр у Севастопаль. Над вадой — разбітая карма. На карме — медсёстры. Угледзелі нас, абняліся і — у ваду! Абняўшыся і пайшлі на дно вянком. Рускія — не палякі, іх так хутка не пераможаш!

«Палякаў перамог ужо! Ведаеш ты, невук, што нас вы толькі разбілі? Разбіць палякаў можна, перамагчы — ніколі! Уяўляеш сабе, як

1 — Прэч! (ням.).

мы арганізаваны? Ведаеш, што ў падполлі працуюць універсітэт, школы афіцэраў? Мы нават зарплату выплачваем сваім вайсковым».

Зазваніў тэлефон. Меклембург узяў трубку. Чуваць было, што на другім канцы провада нехта аж захлёбваўся. Меклембург зморшчыў лоб, закрычаў у тэлефон:

– Вы ўяўляеце, дарагі штурмбанфюрэр, як аслабла дысцыпліна сярод насельніцтва? Людзі не толькі не вітаюцца часамі са мной і з вамі, а раўнадушна праходзяць міма нашых машын! Сёння шофер грузавіка на Вільгельмштрасэ зачапіў бортам мой «опель»...

Голас у трубцы пачаў апраўдвацца. Меклембург яго абарваў:

– Мой штурмбанфюрэр, лад і парадак мажлівы толькі тады, калі мы расстраляем кожнага, хто нават коса на нас паглядзіць! Мы таму маем столькі ворагаў, што адносімся да людзей залішне мякка, замест таго каб выкінуць з сябе гэтае мяшчанства і ўзяцца за іх сурова!

Меклембург з сілай бразнуў трубкай па апараце. Дануся была ўпэўнена: без яе ён паводзіў бы сябе інакш.

– Эрых Вульф! — паясніў ён сябру.— Яму было загадана сёння да вечара вывезці на Парубанак сотню заложнікаў. У яго ўзводзе новенькія, не прызвычаеныя да расстрэлаў салдаты. Дык просіць адкласці экзекуцыю або аддзяліць ад заложнікаў жанчын і дзяцей.

– Я разумею Эрыха! — праказаў штурмбанфюрэр,— Лягчэй весці роту ў атаку, чым з яе дапамогай канваіраваць на расстрэл агідны патоуп, слухаць плач і выццё баб. А яшчэ рабіць гэта ў спякоту або трыццаціградуспы мароз, як бывае тут на ўсходзе...

Яны хвіліну памаўчалі. Было чуваць, як пад сталом пазяхае аучар, а ў калідоры адрывіста крычыць на арыштаваных салдат: пакоі для допытаў былі ізаляваны, і енкаў сцены не прапускалі.

– Служба войск СС нялёгкая і няўдзячная! — згадзіўся Меклембург.— Але нашы хлопцы павінны сціснуць зубы і рабіць сваю справу. Затое, калі пераадолеем усе цяжкасці, нас ніхто не пераможа. Нардыцкая кроў — найлепшая ў свеце, а Германія — вышэй за ўсё! Шмат трупаў? Чынгіз-хан асудзіў на смерць мільёны жанчын і дзяцей свядома, з вясёлым сэрцам, а гісторыя бачыць у ім толькі вялікага заснавальніка дзяржавы і геніяльнага палкаводца. Хто сёння ўспомніць пра мільёны яго ахвяр?.. А хто ўспомніць горы трупаў, астаўленых Напалеонам? Усе ведаюць геніяльнага палкаводца і кіраўніка дзяржавы, хоць ён апошнюю бітву і прайграў. Зрабілі б яго святым, калі б ён яе выйграў! Святым — за новыя горы трупаў!

Фанатычны гітлеравец гаварыў з пафасам.

— Разам з целамі расстраляных нам трэба закопваць бронзавыя табліцы з надпісамі: «Гэта зрабілі мы, тыя, што знайшлі ў сабе сілу і адвагу давесці цяжкую гістарычную справу да канца!» Літасць да ахвяр — мяшчанства!

Эсэсаўцы спадзяваліся маральна зламаць арыштаваную. Яны хацелі, каб Дануся паверыла, што няма ніякай сілы на свеце, якая б магла яе ўратаваць, і Данусі застаецца толькі адно: здацца на ласку фашыстаў.

Нарэшце Меклембург загадаў ёй падсунуцца з крэслам. Дануся каленьмі ўперлася ў стол. Паміж ёю і эсэсаўцамі была толькі пасудзіна, пакрытая прасцінай.

— Ну, панна Данута, ведаеце, чаго мы вас запрасілі? — спытаўся ён.

— Не...— Голас у яе быў разбіты, чужы, хрыплы. Яна кашлянула, паправілася: — Завошта мяне трымаеце ў гэтай агіднай кануры трэці тыдзень?!

Яна добра ведала гітлераўцаў, але пасля ветлівых слоў Меклембурга закралася надзея, што, можа, выпусцяць.

— Вам тут не падабаецца? — са здзеклівым спачуваннем развеяў ён надзею.

— Прашу з мяне не кпіць! — нібы абурылася яна.

— Мы занадта занятыя людзі, каб займацца кпінамі, — зазлаваў эсэсавец. — Гавары адразу: будзеш апавядаць добраахвотна ці прымушаць цябе?

— Не маю пра што гаварыць...

— Сюды глядзець! — закрычаў ён, чырванеючы ад злосці.— Сюды, не адварочваць галавы!

Паддаючыся яго ўладарнаму голасу, Дануся глядзела як загіпнатызаваная.

Меклембург раптоўна сцягнуў палатніну, І дзяўчына ўбачыла вялікі шкляны слоік з вадкасцю.

У вадкасці плавала... галава Марусі — той, якая калісьці прыходзіла да дэсантнікаў. Рот у дзяўчыны быў залеплены гіпсам. Сіні твар быў страшны, увесь у падцёках і драпінах. Верхняя губа так распухла, што даходзіла да носа, а дзе знаходзіліся вочы, можна было здагадацца толькі па радочках веек.

— Што ты пра яе можаш сказаць? — не даваў апамятацца Меклембург, свідруючы вачамі арыштаваную.— Ты яе ведаеш? Прызнавайся! Будзеш маўчаць, знойдзем банку і на тваю галаву!

— Гавары! — падганяў збоку і штурмбанфюрэр.

— Ах... Ах...— цяжка дыхала Дануся.

Каты на гэты раз недааданілі эфекту на слабы арганізм.

Бедыня Дануся не паспела вымавіць і слова, пачаліся рвоты, разабрала млявасць, закружылася галава. Апошняе, што яна чула,— стук уласнага лба аб падлогу; апошняе, што бачыла,— насцярожаныя вочы аўчара над ёю. Потым наступілі змрок і цішыня.

Апрытомнела ўжо ў сваёй камеры.

7

Супакоіўшыся крыху, узяў я бясцэнную скрыначку і пакрочыў у цётчын дом. «Трэба недзе прыстроіць старую!» — падумаў я і пачаў успамінаць тутэйшых знаёмых партызан. Былы прадстаўнік злучэння, які некалі раздаваў на аэрадроме брызентавыя цюкі, Шымкас, цяпер — важная фігура ў Савеце Міністраў Літвы. Памятае мяне? Успомніць! Літоўцы — народ дружны, дапаможа ўладкаваць старую...

Я адчыніў дзверы ў тую хвіліну, калі цётка Антося ўжо канчала раздаваць катам маю каўбасу. Старая была так занятая справай, што, не заўважаючы мяне, прасіла:

— Ешце, прэндзэй, дзеткі, пакуль ён не прыйшоў!

Мне стала ясна, што ёй ужо нічым не дапаможаш.

— Скажыце, а больш ніхто не чытаў гэтых пісем?

Жанчына аж здрыганулася ўся.

— Ах, бо-о... то ці я дала б?

— І ніхто не прыходзіў па гэтыя паперы?

— Былі калісьці паны ў капелюшах... Надта хацелі пачытаць, прапанавалі і грошы, але ж ці я ім дам?.. Не малая, ведаю, каму гэта...

— А каб я да вас не прыйшоў, паперы загінулі б?

— Як гэта? — старая не дапускала нават такой думкі.

— Цётка Антося,— пачаў я далікатна,— едзем да мяне ў Гродна! Будзеце жыць пры нас... Мая жонка — настаўніца, добрая кабета, яе ўсе хваляць...

У вачах старой з'явіўся такі жах, што я адразу змоўк.

Выходзіў я ад Антосі сам не свой. Раптам штосьці падступіла да горла, і толькі прысутнасць людзей на вуліцы стрымлівала, каб не выбухнуў плачам.

8

Праз увесь Вільнюс, не спяшаючыся, накіраваўся я зноў да генералавага дома. Стараўся не ўспамінаць Дануту. Думаў пра горад.

Штосьці чароўнае ёсць у старажытнай суровасці і прастаце гэтага горада. Колькі праз яго пераваліла народу! Муры дамоў, пабудаваныя з запасам на вечную трываласць, гэтак аблашчылі, здаецца, не дажджы і буры на працягу стагоддзяў, а мільёны вачэй шматлікіх пакаленняў. Як тыя людзі жылі? Калі меркаваць па колькасці цэркваў і касцёлаў, жыхары Вільнюса толькі і рабілі, што маліліся, а вядома, што людзі моляцца не ад добрага жыцця...

Або гэтыя тратуары. Колькі тысяч ног мусіла прайсці па іх, каб сваімі падэшвамі аж выслізгаць у каменных плітах жалабкі?!

Я на хвіліну ўявіў тых, хто тут хадзіў, і якія трагедыі бачылі гэтыя муры.

Захутаныя ў зубровыя шкуры, брылі нехлямяжыя воіны Вітаўта.

Цягнуліся з-пад Масквы галодныя і змерзлыя насмерць гвардзейцы Напалеона.

Магчыма, якраз па гэтым месцы вялі Кастуся Каліноўскага з яго братамі-палякамі на Лукішскі пляц да шыбеніц.

Гэтай дарогай правезлі не адну яўрэйскую прыгажуню ў газкамеру пасля таго, як цэлую ноч з ёю забаўляліся «нардыцкія» вылюдкі.

Мо якраз сюдой раўнадушна вёў Дануту ў турму эсэсавец — тупы выканаўца людаедскай ідэі фюрэра.

Я раптам адчуў у сабе такую пашану і любоў да Вільнюса, якую, відаць, адчувае кожны чалавек, хто хоць трохі пажыў тут. Горад мне здаўся дарагім і да дробязей блізкім!

Вось я асцярожна паставіў нагу на тратуар, памятаючы, што тут павінна быць ямка. Але адчуў гарбячок і аж спыніўся, глянуў сабе пад ногі. Ніякага гарбячка. Проста ямку залілі асфальтам, зараўнялі...

Як я ні стараўся адцягваць думкі ад Данусі, каб не балела душа, але вярнуўся да іх ізноў. Цяпер яна ў маіх вачах узнялася да гераіні, усе нашыя спрэчкі, каханне, падзеі ў вайну здаваліся мне не асабіста перажытымі, а недзе вычытанымі.

## 9

Я зноў падаўся на кватэру, дзе жыла прачка. Сюды заходзіў удзень, гаспадыня мяне ўжо ведала.

– Вельмі спяшаюся, прабачце! — вінавата папрасіла жанчына.— Пазнюся на работу!

– Калі дазволіце, пасяджу на ганку. Да вечара няма куды дзецца.

– Але ж, калі ласка! Прэндзэй ідзіце сюды, у цянёк, пад ясень! І дзеці пры вас пабудуць на панадворку! Міша! — пазвала яна

маленькага хлопчыка, адразу забыўшыся на мяне.— Я табе, сынок, пакладу ў кішэню ключ, а каб не згубіў, прышпілю аграфкай. Прыйдзе тата — аддасі! Захочаш есці, улезеш праз акно, я прыадчыненае пакінула...

– Ну, бывайце! — звярнулася яна да мяне.— Не ўбачымся болей. Прывітанне Гродна! Кажуць, нечым наш Вільнюс напамінае!

– Крыху.

—Не была, не ведаю. Чакайце ў госці, пакуль!

Я ўладкаваўся на ганку. Зірнуў на Данусін панадворак. У мяне, прызнацца, было добра на душы — я заставаўся верны ўвесь час Данусі, не выкідаў яе з сэрца і цяпер з чыстым сумленнем быццам глядзеў ёй у вочы. Пачаў успамінаць усё спачатку.

Успамінаў да той пары, пакуль мая душа не стала як той аркушок паперы, з якога гумкай сцерлі ўсё, што было напісана, і застаўся толькі след ад літар. Я ўжо нічога больш не мог прыпомніць і адвёў вочы ўбок.

Яшчэ да вайны я даведаўся пра семантычнае значэнне імені Данута. Яно ўтварылася ад лацінскага слова «donata». На жаль, у беларускай мове няма яму адпаведнага сіноніма. Са славянскіх моваў, відаць, найбліжэй па значэнню яму можна сказаць рускае «одаренный» або польскае «obdarzony».

Ты адпавядала свайму імені. Эх, Дануська, кім ты, «одаренная», цяпер была б, каб не вайна?..

Помнік трэба паставіць табе, ці што? А дзе твая магіла?.. Буду на Рыжскім узмор'і, знайду якога-небудзь пісьменніка, дам яму ўсе паперы, фатаграфіі і папрашу, каб кніжку пра цябе напісаў, як ты некалі хацела... Фактычна кніжку пра нас, пра эпоху. Атрымаецца цікавая гісторыя пра барацьбу, каханне і геройства...

На двары гулялі дзеці.

Калісьці мяне, юнака, такія малыя вельмі злавалі. Мне здавалася, што яны залішне крычаць, без прычыны б'юцца, усюды лезуць, і гэта ў іх ад распусты. Толькі цяпер, калі сам стаў бацькам, я зразумеў, што яны бегаюць не ад дрэннага выхавання і дрэнных бацькоў, а што гэта форма іхняга быцця. Яны так гуляюць, для іх гэта таксама важна, як для дарослых работа. Цяпер маё бацькоўскае вуха і вока прыемна лашчаць кожнае дзіцячае слова і рух.

Каля ганка стаяў Міша і звычаем, як гэта робяць і мае дзеці, цёр вуха плячом і засяроджана аб нечым думаў.

За плотам на бервяне сядзеў другі малы, трымаў на каленях талерку і мераў канцом лыжкі, колькі засталося супу.

За кустамі бэзу чуліся ўсхваляваныя галасы:

— Віцька-а, ты на гэтым фільме быў?

— А пра што там?

— Я чатыры сеансы праседзеў і яшчэ сёння пайду. Толькі не хапае трох капеек. У цябе няма?

— А дасі каску?

— Дам!

— Чэснае піянерскае?

— Ага!

— І пад салютам!

— На табе салют!

— Бяры капейкі!

Па тратуары ішла пара. Адно пачуццё спляло іхнія рукі, запаліла шчаслівыя іскрынкі ў вачах.

За імі крочыла дзяўчына. Яна гулка стукала абцасамі, а яе сур'ёзныя пухлыя шчокі смешна ўздрыгвалі ў такт крокам.

Скрозь кроны дрэваў ля дарогі жаўцелі сцены нейкага вялізнага будынка без даху. Міма наваленай цэглы і свежаапілаванага дрэва малады рабочы вёз пустую тачку. Таварыш яго ўскочыў у яе і жартам кінуў:

— Но-о, кося, вязі-і! Прэндзэй!

Дама несла поўную сетку пакупак. Шукаючы спачування, яна ўсміхнулася мне, паставіла сетку на тратуар, замахала рукамі і, якраз так, як некалі Дануся на лесвіцы ліцэя, паскардзілася:

— Уф-ф-ф, цяжка!

Далей ішоў юнак, нёс белы батон. Азірнуўшыся сюды-туды, ён — раз! — і ўтапіў зубы ў край яго. Я нават адчуў у сваім роце хруст скарынкі і смак свежай духмянай булкі.

Нейкая дзяўчына схавалася ў вароты колішняга Залкікдавага панадворку і працірала супрацьсонечныя акуляры. Зрабіць гэта проста на тратуары, бачыце, яна не можа: да выхаду на вуліцу рыхтуецца, бы артыстка на сцэну!

Усміхнуўшыся, я зноў глянуў на Данусін дом.

На невысокі дах з пачарнелай бляхі ўзлезлі хлопец і дзяўчына прымацоўваць антэну. Спачатку ўсё ў іх ішло як трэба. Але вось узяліся за адзін канец антэны ўдваіх, іх рукі спляліся і... Я адвярнуўся!

Чэрвеньскае сонца золатам залівала вуліцу, дамы, дахі. Было цёпла, але не горача. Лёталі шпакі. Крычалі галкі.

Мне было сумна і радасна. Сумна таму, што Дануся не можа бачыць гэтага хараства. А радасна ад таго, што я адчуваў яе вось тут, побач, у такім цудоўным і вечным жыцці!

www.kamunikat.org

# Развітанне з ілюзіямі

Аповесць

*«Nie bądz bespieczny, -*
*Poeta pamięta.*
*Możesz go zabic,*
*Narodzi się nowy,*
*Spisane będą czyny*
*I rozmowy».*

**Чэслаў Мілаш, ураджэнец**
**Прынёманскага краю,**
**лаўрэат Нобелеўскай прэміі**

## Частка першая

### Раздзел першы

### Маральны стрыжань

Змалку хлопчыкаў у нас вучылі: калі едзеш на фурманцы ці з гары паражняком, абавязкова аб'язджай таго, хто вязе груз альбо пнецца з пустым возам наверх; калі ўпусціш на зямлю хлеб, пацалуй яго; не плюй у калодзеж і агонь, бо маці памрэ.

Такая самая спаткае бяда, як будзеш мачыцца ў раку. Калі сядаеш на лаўку, садзіся з краю, каб яшчэ мог на яе хто апусціцца. Не выпендрывайся, паважай жанчын.

Калі б я, прыехаўшы дадому на канікулы з віленскай гімназіі, барані Божа, загаварыў па-польску, бацька стукнуў бы мяне па вуху, а маці кінула б:

– Дай, Нічыпар, яму лепш, дальбо, дай! І добра адмер, а то хутка забудзе, як граблі называюцца!

Атрымаў бы ад бацькі і за непашану да старых.

Днямі я назіраў сцэнку на гарадзенскай вуліцы, яна прымусіла задумацца.

Літаральна на маіх вачах нейкі фургон урэзаўся ў «Волгу». Яна машына моцная, нічога з ёю не сталася, толькі мужчына выпусціў руль ды расцягнуўся на сядзенні. Самавіты, пажылы, з нездаровым карычневым тварам спрацаванага чалавека, са шматлікімі ордэнскімі

планкамі на лацкане пінжака, ён выклікаў пашану і спачуванне.

Збегліся людзі і скамянелі ад жаху.

Дзве пяцікласніцы з марозівам у руках зазірнулі ў «Волгу». Убачанае здалося надта смешным. Адна адной кінула:

– Гы, стары хрыч!

І, падскокваючы на адной назе, хіхікаючы, паляцелі далей. Толькі цяпер я раптам разгадаў загадку, чаму перад школьнікамі нашаму брату ўсё цяжэй выступаць. Яны вось гэтаксама бяздумна смяюцца з твайго твора якраз у тым месцы, дзе трэба плакаць ці сумаваць.

Душэўная глухата сучасных вучняў і гэтых дзвюх пестаў – вынік выхавання. Далей я паспрабую паказаць, як да гэтага дайшло. Цяпер толькі сцвярджаю: равесніцы пяцікласніц пяцьдзесят гадоў таму былі куды больш чалавечнымі. Менавіта таму дзесяткі тысяч палонных, акружэнцаў, цывільных, што ў вайну трапілі на Гарадзеншчыне ў бяду, атрымалі падтрымку харчаваннем, лекамі і сямейным цяплом, хоць мясцовым кабетам часта даводзілася за гэта адплочваць жыццём.

Са свайго вопыту ведаю напэўна: такія марожніцы на ахвярнасць не здольныя. Затое пачні апавядаць, як мацяркі калісьці вучылі дзяўчынак жыць, у гэтым творы не хопіць месца.

А ўсе тыя правілы як для хлопчыкаў, так і для дзяўчатак, падмацаваныя прыказкамі, народнымі рамёствамі, нацыянальнай сімволікай, казкамі і легендамі, каламбурамі і жартамі, загадкамі і лічылкамі, маладому парастку давалі стрыжань, нацыянальную ўтульнасць, непаўторны каларыт, душэўную ўпэўненасць, адчуванне чалавечай годнасці ды служылі спрыяльным полем, надзейным гарантам для самасцвярджэння і росту.

Мне ўжо не раз даводзілася сцвярджаць, што беларускія вёскі тагачаснай Польшчы душой былі на Усходзе. У апошнія часы адтуль даходзілі дзікія чуткі пра несправядлівасць, якая пануе ў СССР, пра голад, турмы і лагеры, але ніхто ім не верыў. Лічылася, паны, заразы, фабрыкуюць байкі, бо ім няўсёдка. У нашых людзей панавала непахісная, цвёрдая вера ў СССР: жывуць, бяды не ведаючы... Там малочныя рэчкі плывуць. Чырвоная Армія – самая магутная ў свеце. Дзякуючы такім умовам, савецкі чалавек стаў самы разумны, сумленны ды справядлівы. Вось-вось Сталін успомніць пра нас, пакрыўджаных у Польшчы беларусаў, далучыць Заходнюю Беларусь да Усходняй, тады і мы зажывём шчасліва.

Святое ды наіўнае пакланенне міфам давала людзям моцы цярпець нацыянальны прыгнёт санацыйнай улады, падагравала

надзею ды надавала сілы на змаганне за свае правы.

У глыбокай канспірацыі існавалі Камуністычная партыя і камсамол Заходняй Беларусі. Падпольныя камуністы былі людзьмі гуманнымі (нездарма Сталін потым так іх нішчыў!), яны гэтае змаганне ўзначальвалі, землякам унушалі пашану да іншых нацыяў ды нянавісць да «чумы XX стагоддзя» – фашызму з яго лідэрамі: Гітлерам, Мусаліні, Франко і Салазарам. Як члены гэтай арганізацыі адстойвалі свае ідэалы, я апісаў у «Маёй Джамалунгме», таму размалёўваць яшчэ раз не стану. І вось настаў верасень 1939 года – доўгачаканы дзень «вызвалення». Амаль адразу і ў нас пачалося ламанне хрыбта ўсяму здароваму, назапашанаму чалавецтвам за мінулыя стагоддзі. Пайшло разбурэнне шляхоў натуральнага развіцця народнай культуры. Пачалося разбурэнне сумленнасці і народнай дэмакратыі.

Адным словам, якраз з таго часу пачалося абыдленне майго народа, скуткі якога адчуваем яшчэ і сёння. Гэтая хвароба доўга будзе даваць аб сабе знаць. Як адбыўся той гвалтоўны працэс, мне давялося назіраць вачыма дарослага чалавека, паспытаць усе жахі, горыч, на ўласнай скуры прасачыць яго стадыі.

Апісваць падзеі пачну па парадку.

## І радасць, і недаўменне

Паўтараю, злачынствы на Прынёманшчыне пачаліся адразу пасля "вызвалення", хоць тады гэта мала хто яшчэ і зразумеў. Толькі цяпер, калі думкі і ўспаміны адстояліся, а цэнзура адменена, з вышыні мінулых дзён пра той гвалт над людзьмі магу гаварыць упэўнена.

Як толькі выбухнула германа-польская вайна, прыхільнікі СССР ад здзіўлення раззявілі раты, калі пачулі навіну ад сваіх аўтарытэтаў – былых падпольшчыкаў, што вярнуліся з турмаў Цэнтральнай Польшчы (з Каранова, Вронак). Нядаўнія зняволеныя кэпэзэбоўцы па дарозе дамоў, згодна са сваімі перакананнямі, нават не задумваючыся, кінуліся абараняць Варшаву ад гітлераўцаў і тыдні два прасядзелі ў акопах. Пасля ж падзення польскай сталіцы па дарозе дамоў, у Брэсце, яны назіралі сумесны парад савецкіх ды гітлераўскіх войск з выпадку разгрому польскай арміі.

Не да веры, але ж – рэальны факт!

Хлопцы на ўласныя вочы бачылі, як у цэнтры горада на трыбуне маячылі нямецкія ды савецкія генералы, а перад імі па плошчы валілі танкі ў чарговасці: адзін з крыжам на брані, другі з пяцікутнай

зоркай, адзін з крыжам, другі савецкі. Між іншым, у майго сябра Аляксандра Амільяновіча *(у 2007 годзе асуджаны ў Польшчы на 4 гады за супрацоўніцтва са Службай бяспекі – **рэд**.)* захаваўся нямецкі фотаальбом з таго часу прафесара Гайнрыха Гофмана пад назвай «Ді гросе дойчэ Фэльдцуг геген Полен» («Паход нямецкіх войск супроць Польшчы»). У ім на фотаздымках выразна відаць, як на трыбуне стаіць фельдмаршал Гудэрыян і галаўкам савецкіх войск у Брэсце Баразянскі са світай, а перад імі валяць стальныя армады дзвюх краін. Альбом я ўбачыў шмат-шмат гадоў пасля вайны. Тады ж у доказ праўдзівасці сваіх слоў былыя падпольшчыкі прынеслі ды з недаўменнем паказвалі аднавяскоўцам нашыя ўлёткі, у якіх была змешчана быццам бы радасная для ўсіх савецкіх людзей вестка. У іх паведамлялася, што ад гэтага часу «дружба народаў Германіі і Савецкага Саюза замацавана крывёю, таму мае ўсе падставы быць вечнай і трывалай».

А як жа трупы гішпанскіх барацьбітоў, што не паспелі нават астынуць?

Як жа нямецкія камуністы, якіх Гітлер кінуў у турмы і канцлагеры?!

Як жа з песняй, якую кэпэзэбоўцы нядаўна спявалі?!

Параход наш ідзе міма прыстані,
Будзем рыбу карміць мы фашыстамі.

Гэта было толькі першае дзіва.

Насуперак усялякай логіцы сяброў Камуністычнай партыі і камсамола Заходняй Беларусі, гэтых летуценнікаў і святых рамантыкаў, прадстаўнікі новай улады бязлітасна адхілілі ад палітычнай ды грамадскай дзейнасці. З такой прычыны, напрыклад, у Народны сход трапіў Міхась Машара, але не знайшлося там месца паэту Максіму Танку.

У былых падпольшчыкаў гэта спарадзіла разгубленасць, а ў тых, хто выхавання меў недастаткова, – азлобленасць, адчай і схільнасць да глупстваў. Толькі гэтым я тлумачу, што некалькі нашых кэсээмзэбоўцаў з Гарадка вывелі з кватэр мясцовых настаўнікаў-палякаў (Брыля, Вэбэра, Яворскага, яшчэ двух чалавек) ды на выгане закалолі штыкамі.

Я не бачыў, як гэта адбывалася. Часамі, калі надыдзе на душу, звяртаюся да паралельнага дакумента.

Перада мной фотаздымак з натуры. Чэхаславацкі майстра зняў, як у 1973 годзе рэакцыя чыніла самасуд у Чылі. Аб'ектыў выразна данёс сцэнку, як два маладыя гіцлі штыкамі колюць пяцярых звязаных інтэлігентаў. Каты з паказной бравадай і з натугай садзяць

вастрыё сталі ў жывыя целы, а некалькі ахвяр ужо б'ецца ў перадсмяротных сутаргах на траве.

Мінула ўжо паўстагоддзя, а нявінныя смерці на гарадоцкім выгане ўражваюць бяздушнай жорсткасцю да іх. Выпадак не выходзіць з майго сэрца, а розум падказвае: і там людзей знішчылі ўсяго з-за палітычнай кан'юнктуры.

Тым кэсээмзэбоўцам ніхто з нашай улады за мардэрства не сказаў і кепскага слова. Наадварот, выглядала на тое, што ўчынак такі новай уладзе даспадобы. Але гэта абсалютна нічога не змяніла. З-за прыналежнасці ў мінулым да КСМЗБ і КПЗБ зухаў таго злачынства не ўзялі нават у міліцыю.

Эх, калі б толькі з настаўнікамі быў такі выпадак!

Амаль адначасова злодзей з маёй вёскі Іван Парэмскі забіў паляка, які ўцякаў ад немцаў аж з-пад Варшавы. Іван у ахвяры забраў веласіпед, заплечнік з бедным дарожным пайком. Сцягнуў з няшчаснага нават шкарпэткі, якімі потым хваліўся перад дзяўчатамі.

Падобныя Івану тыпы ў суседняй вёсцы Белявічы застрэлілі Пана – так называлі паляка, які прыстаў да мясцовай дзяўчыны ў прымакі адразу пасля сусветнай вайны.

Не хочацца працягваць ганебны спіс выпадкаў самасуду на класавым, палітычным і нацыянальным грунце, якія адбываліся ў першыя дні гэтак званага вызвалення на тэрыторыі да гэтай пары мірнай Заходняй Беларусі амаль у кожнай вёсцы ці мястэчку. Было такое ўражанне, што новыя ўлады падобныя эксцэсы заахвочваюць. І тым не менш, яны адразу заглухлі на фоне падзей больш значных.

У 1940-1941 гадах нечакана, без суда і следства пачаўся гвалтоўны вываз людзей Гарадзеншчыны ў Сібір і Казахстан. Бралі галоўным чынам палякаў. І многа тады вывезлі. Гвалтам адарваны быў ад жыццёвых каранёў кожны дзесяты жыхар Прынёманскага краю. Паводле падлікаў навукоўцаў, усяго з Заходняй Беларусі загрымела на ўсход 400 тысяч чалавек!

Дзесяткі тысяч беларускіх мужыкоў пад камандай энкэўсаўцаў з панятымі прымусілі кожную сям'ю ладавацца з пажыткамі на асобную фурманку ды валачыся на бліжэйшую станцыю. Фурманкамі правілі мясцовыя беларусы. Нашыя мужыкі, вядома, рабілі гэта не па сваёй волі. Тым не менш, і гэты факт паслужыць потым паміж братнімі народамі для новых крыўд і антаганізмаў.

Страшна дзікія сцэны адбываліся тады на Прынёманшчыне. Стаяў роспачлівы лямант і гвалт. Жанчыны рвалі на сабе валасы, а некаторыя здзяйснялі самагубства.

У Сібір адпраўлялі зусім маленькіх дзяцей і знямоглых старых,

вырваўшы раптам з цёплых гнёздаў.

Усіх павезлі ў таварных вагонах з закратаванымі калючым дротам аконцамі; павезлі ў дождж, снег і мароз – туды, дзе іх ніхто не чакаў.

Толькі бунту ў нас з-за гэтага не здарылася. Нашыя народныя праўдалюбцы і маралісты як бы яшчэ не прачнуліся. Вельмі нечаканым было ўсё тое і недарэчным, каб у яго нават паверыць.

## Разгул НКУС

Адным словам, першы вываз прайшоў у нас не так прыкметна, як таго заслугоўваў. Прычына таму, апрача нечаканасці, – ап'яняючая ўсхваляванасць, першая эйфарыя беларусаў ад уз'яднання, якое раптам звалілася на іхнія галовы, ды водгукі другой сусветнай вайны, што распасцірала ўжо па свеце свае злавесныя крылы.

Яшчэ прычына была тая, што таму, хто хацеў сябе ашукаць, лёгка было знайсці зачэпку для апраўдання, маўляў, перасялялі, галоўным чынам, леснікоў, паштальёнаў, паліцыянтаў, чыноўнікаў, а гэта значыць, людзей у большасці сваёй прыезджых з цэнтральнай Польшчы, якія часта так і не знаходзілі агульнай мовы з мясцовым насельніцтвам. Потым, калі насталі змрочныя дні нямецкай акупацыі, перасяленцам у далёкія краі некаторыя для ачысткі свайго сумлення нават бытта і зайздросцілі.

Вывезеных заадно сем'яў народных умельцаў, кавалёў і стэльмахаў, актывістаў Таварыства беларускай школы (ТБШ) і ўвогуле беларускай інтэлігенцыі ў параўнанні з асаднікамі ды леснікамі было значна менш, а да тэбэшоўцаў сталіністы ў даверлівых людзей паспелі ўжо выклікаць нядобразычлівасць як да нацдэмаў, што азначала – праклятых ворагаў народа. Я і сам, памятаю, не шмат разбіраўся ў беларускіх сацыяльных групах, меў уяўленне аб нацдэмах, як аб нечым агідным ды варожым. Але ўважліваму назіральніку і ў 1940-1941 гадах можна было бачыць няладнае.

Вынеслі бяссудны вырак цэламу пласту народа, выбілі яго з быстрыні нармальнага жыцця, а назаўтра пра гэта – аніякай інфармацыі. Хіба ж так можна?!

У часы Пілсудскага, калі арыштоўвалі людзей, адразу ўсе газеты пісалі пра выпадак: каго ўзялі, за што і на колькі. Яшчэ нават давалі рэпартажы з суда, не абмінаючы вострых ды непрыемных для ўлады момантаў.

У 1936 годзе за спробу забойства правакатара Стральчука ў

Віленскім акруговым судзе польская ўлада прысудзіла Сяргея Прытыцкага да пакарання смерцю. Але зараз жа сотні тысяч мужыкоў і рабочых – беларусаў, палякаў, яўрэяў, немцаў – выйшлі на вуліцу з патрабаваннем адмяніць смяротны прысуд улюбёнцу народа. Урад прэзідэнта Масціцкага мусіў магутнаму пратэсту падпарадкавацца, але ніводзін чалавек за той спантанны выбух эмоцый не быў пакараны.

Цяпер жа страх было і думаць, каб за каго заступіцца: бунтара такога забралі б адразу, не пакінуўшы і следу. Адначасова з леснікамі, кавалямі, стэльмахамі, беларускай інтэлігенцыяй, якая толькі-толькі нараджалася ды была яшчэ нешматлікай, у Сібір загрымелі асобныя сем'і і былых сябраў КСМЗБ і КПЗБ – таксама без усялякага суда, следства і тлумачэння народу, сваякам, знаёмым.

Напрыклад, з маёй вёскі назаўсёды знік без следу сакратар нашай ячэйкі камсамола Сяргей Лебядзінскі, а яго меншых сясцёр ды братоў – сям'я была надта бедная і шматлікая – праз Сібір жыццё потым раскідала па ўсім свеце, і збіраліся Лебядзінскія да купы гадоў з дваццаць.

З майго Страшава вывезлі тады і сям'ю гімназіста Шуркі Антончыка. Шурка не займаўся палітыкай, нікуды не лез, а ўзрадаваны тым, што гміна плаціла яму за гімназію, старанна вучыўся. Шурка загінуў у лагеры разам з Сяргеем. Яго браты і сёстры, на шчасце, выжылі, але так ніколі і не зразумелі, за што перанеслі столькі пакут.

Хапалі і тых, хто па наіўнасці сваёй не разбіраўся ў новай сітуацыі, неасцярожна прамовіў крамольнае слова ці фразу, як, напрыклад, гарадзенскі Каханоўскі.

У дваццатыя гады гэты выкладчык біялогіі ў гімназіі імя Адама Міцкевіча стварыў для горада сапраўдны заапарк, які і зараз з'яўляецца гонарам гарадзенцаў, бо адзіны ў Беларусі. Пасля вызвалення Ян Каханоўскі выкладаў свой прадмет ужо ў сярэдняй школе, а гарана не мог ім нахваліцца і пры новай уладзе. За добрую працу аддзел народнай асветы нават прэміраваў біёлага пуцёўкай у Мічурынск. Меўся педагог паглядзець там сады, вырашчаныя славутым раслінаводам і селекцыянерам.

Лепш бы той прэміі біёлаг не браў!

Вярнуўся Ян з паездкі, зайшоў у настаўніцкую ды са здзіўленнем сябрам прызнаўся:

– А ведаеце, у тым Мічурынску нічога цікавага не ўбачыў! Амаль такія ж сады пры Польшчы былі ў кожнай павятовай сельскагаспадарчай школе!

Гэтага было дастаткова, каб НКУС арыштаваў яго ў першую ж ноч.

Выпадкаў такіх хапала.

## Пакрыўджаныя змагары

Міналі тыдні, месяцы, а кэпэзэбоўцы ўсё больш траплялі пад прэс недаверу і недарэчнай падазронасці. Замест таго, каб даць ім магчымасць наладжваць новае жыццё, аб якім падпольшчыкі так марылі, за што змагаліся і яшчэ не паспелі нават астынуць ад пафасу падпольнай барацьбы, на іх абрынулася абвінавачанне ў скрыўленні лініі партыі, перараджэнні. Новая ўлада, на дзіва, больш слухала тых, хто даносіў на кэпэзэбоўцаў у тайную паліцыю.

І над маёй сям'ёй згусціліся хмары – загаварылі аб нашым вывазе. За лішнюю зямлю. Няважна, што ўлада Пілсудскага цягала мяне за «палітыку» і я спрабаваў уцячы нават у СССР, што бацька за падпольную работу сядзеў тры месяцы ў ваўкавыскай турме. Нас абклалі кулацкім падаткам. Ён быў подлым, бо разлічаны так, каб чалавек ніколі не меў магчымасці яго выплаціць і, такім чынам, даў энкэўсаўцам падставу для абвінавачання ў сабатажы, каб мець зачэпку для высялення ў Сібір як злоснага неплацельшчыка.

Наіўны бацька чуткам такім яшчэ не даваў веры. Думаў, усё ўляжацца і разбяруцца. Таму зацяў зубы ды кідаўся здабываць грошы. Пазычаў, дзе мог, а што меў, прадаваў. Узяўшы мяне з братам, бацька вазіў камяні на новыя аэрадромы ў Свіслачы, Кватарах, Заблудаве, дзе вайсковыя за такі тавар добра плацілі, а камянёў у нас – цэлае поле. З братам Валодзькам ахвотна выбіралі лепшыя кругляшы ды з любоўю абціралі ледзь не кожны каменьчык крысом перад тым, як кінуць на воз. Было такое адчуванне, што сваёй работай мы павялічваем магутнасць СССР і становімся падобнымі да слаўных савецкіх лётчыкаў – статных, жыццярадасных, у сініх мундзірах пад гальштукамі, з новенькімі партупеямі ды малінавымі кубарамі ў пятліцах.

Падатак, нарэшце, бацька гасіў, але яго за кожным разам павялічвалі, і смяротную гульню трэба было пачынаць спачатку.

Змардаваны ўшчэнт, стары летам 1941 года здаўся. Праз месяц-другі мелася адбыцца з ім расправа. Ды тут з бяды выбавіла нашую сям'ю нямецкая акупацыя.

Але вернемся зноў да першых дзён «вызвалення».

## Новая ўлада зблізку

Пацвердзілася тое, што да гэтай пары было толькі чуткамі. Усе, хто да 1939 года ўцёк з-пад панскага ярма ў СССР (уцякалі самыя адчайныя, самыя талковыя і аўтарытэтныя!), – даўно ўжо пілавалі лес у Сібіры.

Да таго, людзі, якія прыйшлі з усходу, аказаліся інтэлектуальна як бы абмежаванымі. Справа ў тым, што ў Заходняй Беларусі пры Польшчы сярэдняя школа давала веды асноў Бібліі, сусветных шэдэўраў літаратуры, валоданне замежнай і лацінскай мовамі гэтак, што выпускнікі свабодна на іх размаўлялі. Побач з матэматыкай, фізікай дасканала вучылі нотнай грамаце, маляванню, розным гуманітарным прадметам. Усё гэта адпаведна фарміравала псіхіку маладога чалавека, ён быў усебакова развіты і меў уласны светапогляд.

У бедных жа савецкіх школах, напрыклад, замежную мову толькі «праходзілі». Да людзей высокаадукаваных выхоўвалася чамусьці знявага, варожая нядобразычлівасць, а слова «інтэлігент» з дабаўленнем «гнілы» служыла лаянкай. Іншых прадметаў там увогуле не ведалі ці выкладалі ўсё наадварот. Адным словам, выпускнікі такіх школ выхаванне атрымлівалі недастатковае і як бы перакошанае, што адразу кідалася ў вочы на прышэльцах.

Вызваліцелі былі лішне недаверлівымі і размаўлялі лозунгамі. У кожным адчувалася пыхлівая самаўпэўненасць у сваёй выключнасці. Яны ўсюды гатовы былі бачыць агентаў замежнай разведкі і на кожным кроку падкрэслівалі, што чалавек савецкі стаіць на галаву вышэй за любога выхадца з буржуазнага грамадства, – гэта ж гаворыць не хто-небудзь, а сам таварыш Сталін, а ён ніколі не памыляецца.

Усё ім не падабалася. І нашая мова. І тое, што бабулі ходзяць да касцёла, царквы, а некаторыя мужчыны, спатыкаючыся, здымаюць адзін перад другім шапкі. І канфігурацыя шапак была не такая. І кепска было, што званы сярод белага дня трызвонілі. Што пасля смерці блізкага чалавека чорную павязку на рукаве носяць цэлы год...

Менавіта непрынянцце тысячы падобных фактаў як бы і давала ім права лічыць сябе на цэлую галаву вышэйшымі за нас.

А ўсе яны былі вялікія мастакі да лаянкі ды ахвотнікі да гарэлкі.

У нашага народа самым ходкім словам, каб выказаць свае адмоўныя адносіны да чаго-небудзь, служыла «халера». Назву гэтай хваробы вар'іравалі на розныя лады. І п'яніцы ў нашых людзей не былі ў пашане. Калі ж выдараўся такі селянін, яго кляймілі ганебным

словам – лайдак, і дзяцей ім палохалі. Землякі мае (а як жа!) выпівалі – на Каляды, Вялікдзень, Сёмуху і Новы год. Выпівалі яшчэ на хрэсьбінах ды вяселлях. І пілі толькі кілішкамі.

Хутчэй можна было спаткаць іншапланецяніна ў жніво, сенакос, чым каго пад чаркай.

Прыезджыя напоўнілі адразу крамы скрынямі з таннай гарэлкай, прывезлі звычку піць шклянкамі ды ў любы дзень, як і ў кожную пару года, а за сталом ў такіх выпадках гучаў мат-перамат, ад якога вушы вянулі.

Армія таксама выклікала здзіўленне. З аднаго боку, вялізныя танкі і трактары, што валаклі гарматы. Поўнае неба самалётаў. Але ж, з другога, чаму савецкія аэрапланы лётаюць аж так памалу? З'явіцца на небе эскадрылля чатырохматорных тупарылых бамбардзіроўшчыкаў, то аж забаліць шыя, пакуль перапаўзуць з канца ў канец па небе. Куды ім па хуткасці да самалётаў нямецкіх!

Мае землякі заклапочана ламалі галовы: чаму ў салдат штыкі прывязаны да ствалоў вяровачкамі, а шынялі непадрублены, ад чаго ў іх целяпаюцца ніткі? Чаму ў байцоў кірзавыя боты – няўклюдныя і непрактычныя? Чаму брызентавыя падсумкі і аж так бедныя сёдлы ў кавалерыстаў?

Калі пахаладала, адно афіцэры апраналі кажухі і ўвогуле адзеннем рэзка вылучаліся. Нават сталаваліся асобна ад байцоў.

Дзе ж ленінская роўнасць?

Людзі бачылі польскую армію. Гітлераўцы, разграміўшы Польшчу, у верасні 1939 года на пару тыдняў акупіравалі Гарадзеншчыну – усе ўволю нагледзеліся і на немцаў. У тых і другіх салдат падсумкі, боты, рамяні і сёдлы – з самай лепшай скуры, яшчэ і палакіраванай. Кацялкі, біклажкі сукном нават абцягнутыя, каб у рукі хлопцам не пякло. Мундзіры падцягнутыя, ад чаго салдаты выглядалі бы лялечкі альбо жаніхі. Мала чым ад салдат адрозніваліся і нямецкія афіцэры.

Чаму савецкіх байцоў экіпіравалі гэтак скупа? Абуць у СССР трэба надта многа салдацкіх ног? Затое і рабочых рук у Саветаў куды болей, чым у Польшчы і Германіі, разам узятых! Так мы развažалі паміж сабой.

Але ж ні аднаму савецкаму афіцэру пра гэта не скажы. А так карцела падказаць. Вядома, ад жадання зрабіць лепш. Ды, пачуўшы заўвагі, яны адразу насцярожваліся і рабіліся як бы ворагамі. Альбо падказвалі энкэўсаўцам, такі праўдзіст адразу некуды знікаў.

Калісьці цэлай вёскай у складчыну выпісвалі адну газету і зачытвалі да дзірак. У гэтым людзі адчувалі смак. Аднак да савецкіх

газет не цягнула. Усе друкавалі адно і тое ж. Бытта яны гэтак дамаўляліся, бытта атрымалі такую каманду. Бытта пісаў, а потым друкаваў іх адзін чалавек.

У артыкулах выказваліся думкі як бы напаказ. Аднойчы трапіў мне на вочы стары нумар «Правды» за 25 кастрычніка 1938 года, а ў ім эканамістка з зямельнага аддзела Тульскай вобласці В. Далгова пісала: «Я горячо поддерживаю ткачиху Глуховской новоткацкой фабрики Софию Жукову, выступившую с предложением сократить декретный отпуск. Я сама только что вернулась с декретного и на собственном опыте знаю, что срок отпуска можно сократить».

Я быў яшчэ замалады, каб разбірацца ў дародавым і пасляродавым адпачынку жанчын, але фальш і штучнасць такога артыкула адчуў сэрцам. Не паленаваўся нават кавалак газеты з артыкулам пакінуць сабе на памяць.

Цяпер, калі, напрыклад, маладыя заканчвалі тэхнікум, то, паводле газет, абавязкова станавіліся «высокай якасці спецыялістамі».

У маёй мясцовасці спатрэбіліся тэрмінова настаўнікі для новых школ, а іх не было адкуль браць. Аб'явілі набор на трохмесячныя курсы ў Гародню пры настаўніцкім інстытуце. На іх прымалі з сямікласнай адукацыяй, а аднаго (я ведаў яго асабіста) прынялі з пяццю класамі...

Прайшоў вызначаны тэрмін. Усім курсантам выдалі адпаведныя дакументы, яшчэ і надрукавалі ў газетах: "Прынёманскі край, дзякуючы бацькоўскім клопатам савецкай улады і мудраму кіраўніцтву таварыша Сталіна, атрымаў 300 чалавек новых высокаадукаваных педагогаў!"

Паводле прэсы, зерне сяляне цяпер сеялі адно «адборнае». Жылі ў гарадах і сёлах цяпер усе «багата» і «шчасліва». І наогул, апошняе слова выпірала з газет аж да агіднасці. У сувязі з прыходам Чырвонай Арміі для пажылых людзей цяпер настала «шчаслівая старасць». Для іншых – «шчаслівая маладосць», «шчаслівае дзяцінства», а для ўсіх астатніх – «шчаслівае і прывольнае жыццё».

Інфармацыі з савецка-фінскай вайны друкаваліся толькі пра гераічныя ўчынкі нашых байцоў, лётчыкаў, камандзіраў. Без канца ішоў пераможны пералік знішчаных дотаў праціўніка, забітых салдат і афіцэраў, а чамусьці фінскія пазіцыі па-ранейшаму заставаліся на тым самым месцы. Чырвоная Армія ўсё тапталася ды тапталася на маленькім Карэльскім перашыйку, хоць і кожнаму школьніку было вядома: у Фінляндыі жыхароў у пяцьдзесят разоў менш, чым у СССР.

Тэксты такія не пераконвалі, а толькі выклікалі падазронасць. Чалавек думаў: эгэ, штосьці тут не так!..

Цяпер ля кіёска можна было назіраць, як дзяўчына з акенца пыталася іншага байца, якую яму даць газету. Той са здзіўленнем адказваў ёй:

– Вядома якую – курыцельную!

Непрыемна гаварыць пра ўсё гэта, але ж – з песні слоў не выкінеш: менавіта з прыходам Чырвонай Арміі да нас, памятаю, людзі Заходняй Беларусі са здзіўленнем даведаліся, што газеты могуць служыць і для такой мэты.

І яшчэ.

На першых старонках у тых газетах абавязкова красаваліся партрэты «Мудрага і Вялікага Правадыра ўсіх народаў». Амаль усе артыкулы заканчваліся яго імем. Якіх толькі эпітэтаў для яго не прыдумвалі газетчыкі: і «вялікі», і «настаўнік», і «кормчы», і «бацька родны ды любімы», і «друг чалавецтва», і «карыфей навукі», і «збаўца чалавецтва»...

Доўга нашыя людзі з гэтага дзівіліся. Нарэшце, знайшлі простае тлумачэнне. Таварыш Сталін – надта заняты чалавек. Ён, вядома, газет не чытае. Ён нават у вочы іх ніколі не бачыць, бо так, бедны, заняты справамі, таму і не ведае, што падхалімы вычаўпляюць. А гэтыя і рады!..

Толькі чаму ў той Маскве, дзе многа, напэўна, разумных людзей, не прабʼецца хто да яго ды не падкажа? Не з'есць жа ЁН чалавека за гэта, а глядзець на такое – брыдка!

Мяне і самога разбірала ахвота – от бы дабрацца як-небудзь да Масквы, прашмыгнуць у Крэмль і падказаць Сталіну! І я ўсё прыдумваў спосабы, як гэта выконваю, як падбіраю словы, якія яму скажу...

Па менскім радыё кожны дзень перадавалася, што сяляне вобласці ўзялі абавязацельствы вырасціць стопудовы ўраджай збожжа з гектара. Дасціпныя мужыкі зараз жа прыкінулі ў галаве, і выйшла – семнаццаць цэнтнераў.

– Як жа так, – здзівіліся, – мы і без ніякіх абавязацельстваў атрымліваем столькі?!

І тым не менш, вера ў міфічную краіну, дзе плывуць малочныя рэчкі, якой кіруе вялікі Чалавек, жаданне хоць ілюзорнага шчасця сабе, дзецям і ўнукам у нашых сялян заглушалі здаровы мужыцкі розум.

Усе сумненні былі кволымі. Людзей агарнуў дзіўны энтузіязм якойсьці паслухмянасці, ён прытупляў у іх нават чалавечнасць. Гіпноз новай улады быў настолькі моцны, што людзі, зведзеныя да нявольнічага падпарадкавання і бяздумнага захаплення, адчувалі

сябе нават і праўда шчаслівымі. У іх усё мацней гаварыла чужое іхняму выхаванню і традыцыям продкаў. Яны і не заўважылі, калі пасталі здольнымі на подласць.

Цяпер бачылі галоўнае: новая ўлада – свая. Калі што і не так, можна пацярпець. Маўляў, усей падаплёкі вывезеных і арыштаваных я не ведаю і не хачу ведаць, толькі – дыму без агню не бывае. Ды і трэскі сапраўды ляцяць, калі лес сякуць. Што зробіш, памылкі заўсёды здараліся, асабліва пры вялікай справе. Усё гэта чалавечае, разбяруцца. Напэўна разбяруцца. Бальшавікі – людзі галавастыя, бачыш, якая ў іх тэхніка? Разбяруцца і з маёй сям'ёй! Зразумеюць, нарэшце, што я не з чужога класа, іўсё ўладкуецца! А пакуль што існаваць можна?

Можна! Ну і жыві!

## Новыя парадкі ва ўсёй краіне

Факты тым часам жыццё падсыпала і падсыпала. Сваякоў, якія засталіся ў грамадзянскую вайну ў Савецкай Расіі, чамусьці паранейшаму не пускалі на радзіму да сваякоў у госці. Калі ж гэта Вызваленне, чаму б не з'ездзіць з беднай і прыгранічнай Заходняй Беларусі ў квітнеючую Усходнюю, чаму не пабачыцца з братам ці сястрой? Але ж – куды там!

Не давалі нават прапускоў, каб з'ездзіць бацьку ці маці да родных дзяцей!

Тым, каму ўдалося вырвацца да бацькоў праз кардон тайна, апавядалі пра жудасныя пакуты, якія перажылі ў СССР сваякі толькі за тое, што ў іх хтосьці жыў у Польшчы, – не браліся пад увагу аніякія тлумачэнні.

Чамусьці чалавек са схільнасцю рабіць даносы асуджаўся толькі ў тым выпадку, калі рабіў гэта пры тагачаснай Польшчы. Калі ж і пры новай уладзе заняўся падобным рамяством, яго прымалі на службу як свайго, даруючы ўсе ранейшыя грахі. Такіх нават у прыклад прыводзілі. Наш малапісьменны сусед Марцін Грушэўскі, які пры Польшчы ў час забастоўкі лесарубаў быў штрэйкбрэхерам, за што падпольшчыкі яго не раз білі, стаў цяпер правай рукой у энкавэдзістаў, а пры сустрэчы з бацькам дэманстраваў сваю перавагу.

І неўзабаве ўсё больш тых, хто даносіў раней, пачалі тое самае рабіць ды цяпер яшчэ і выхваляцца.

У школах развесілі партрэты піянера, які выдаў бацьку. Ад гэтага ўжо жахнуліся старыя людзі. А як жа біблейскі запавет: шануй

бацьку свайго і маці сваю? Так, бацька хлопчыка мог і няправільна штосьці ўчыніць. Але ж не дзіцяці меркаваць аб сваіх бацьках і мацярках. Што яно яшчэ разумее? Дай толькі волю такім, і – свет разваліцца!

Адным словам, новая ўлада здзіўляць людзей не пераставала. Для гэтага жыццё ўсё падкідвала прычыны.

Тыя, хто раней лёгка паддаваўся паланізацыі, цяпер дружна загаварылі па-руску. Не, «дружна» – не тое слова, бо загаварылі наперабой. Новым уладам такія паводзіны надта здагадлівых грамадзян спадабаліся. Усіх, хто гаварыў па-ранейшаму, пачалі кляйміць нацыяналістамі, асколкамі нацдэмаўшчыны, рупарамі ворагаў народа ды чорт ведама чым яшчэ. А слухалі людзі цяпер такое чамусьці раўнадушна.

Забаранілі праводзіць Купалле, калядкі і батлейкі, хадзіць з «зоркай» на Каляды.

Забаранілі спяваць «Ад веку мы спалі», «Люблю я край, старонку гэту». Загадчык навучальнай часткі Наваградскага педвучылішча Кашалеўскі мяне падлавіў на такім занятку ў калідоры і папярэдзіў: пачуе з маіх вуснаў такое яшчэ раз – вылечу з педвучылішча і мной зацікавіцца НКУС.

Хлопцы ў Заходняй Беларусі любілі наогул танцаваць, і я быў заўзятым танцорам. Загадчык навучальнай часткі заадно папярэдзіў: тое самае зробяць са мной, калі на вечары ў педвучылішчы буду танцаваць танга. Падумаўшы, вялікадушна дазволіў факстрот. Але ім таксама не павінен надта захапляцца. Рэкамендавалася танцанаць кракавяк, лявоніху, падыспань і вальс.

Тым не менш, жыццё стала такім насычаным і бурлівым, што ўсе дзівацтвы, забітыя той самай эйфарыяй, мазгі ды псіхіка паступова сталі ўспрымаць нейкім другім, не самым галоўным, паверхам.

Нябачнае да гэтай пары бясплатнае лячэнне і адукацыя. Магчымасць кожнаму працаваць на будоўлях, чыгунцы, здабычы торфу, у лесе і атрымліваць немалыя грошы.

Хутка і ў нас з'явіліся ахвотнікі, каб за капейкі купіць бутэльку-дзве гарэлкі ды ў нядзелю ці будзень адведаць яе заманлівую асалоду (і гэта быў толькі пачатак!)...

З'явілася магчымасць праехацца на спадарожнай машыне ў любую вёску, бо аўтамабілі запрудзілі ўсе дарогі, утварылі на іх шырокія каляіны са следам пратэктара. Толькі падымі руку – кожная палутарка спыніцца.

І ўжо зусім ашаламляла лёгкасць, з якой можна было амаль

задарма набыць білет на цягнік ды, як рабілі калісьці толькі паны з паўпанкамі, адправіцца куды душа жадае (вядома, у межах Заходняй Беларусі).

Напэўна, пералічанага было б недастаткова нармальнаму чалавеку, каб яго душа пры новай уладзе адчула поўны камфорт. Але ж, я паўтараю, у наіўных ды мала праінфармаваных людзей тае пары было столькі веры, надзеі, што яны пастараліся заплюшчыць вочы на вываз людзей, не бачыць, як з імі абыходзіліся.

Энтузіязм тае паслухмянасці быў надта агрэсіўны. Да сённяшняга дня – праз паўстагоддзя! – добра адчуваю, з якой нядобразычлівасцю я ставіўся да тых, хто адважваўся крытыкаваць новыя парадкі, спрабаваў называць белае белым, чорнае чорным, а котку коткай. Нават блізкія людзі выклікалі абурэнне.

Майго роднага дзядзьку Мікалая, былога члена КПЗБ, што з астаткамі польскай арміі ў верасні 1939 года трапіў пад Бродамі да Чырвонай Арміі ў палон, запяклі ў лагер біць камяні для шашы. Калі абжыўся, мамін брат паабяцаў начальніку вядро самагонкі, і той адпусціў яго на пару дзён дамоў.

Дзядзька Мікалай у лагеры прайшоў ужо добрую школу палітычнага «лікбезу» і цяпер пастараўся пляменніку адкрыць на ўсё вочы. Перада мной ён цярпліва разлажыў па палічках крывавыя злачынствы Мудрага Правадыра і Настаўніка. І выходзіла, што Сталін прыслаў да нас войскі зусім не вызваляць Заходнюю Беларусь. Згаварыўшыся з Гітлерам, Заходнюю частку Беларусі акупаваў, а сам ён крывасмок і нікчэмнасць.

Упершыню ад яго я тады пачуў, як энкавэдоўцы ноччу адбіралі па чысціні рук з вялізнага натоўпу польскіх палонных сабе ахвяр ды з наганамі вялі іх у бліжэйшы яр расстрэльваць. Апавядаў дзядзька пра ўсё са злосцю, з горыччу, з абурэннем. Аднак дарэмна сваяк стараўся.

Дзядзькавы словы чамусьці мяне толькі раззлавалі. Я не стараўся зразумець усю праўду, а пашукаў аргументаў, каб сваяка зрэзаць. Потым, вядома, з даносам, як Паўлік Марозаў, у сельсавет не пабег. Але пад уздзеяннем скажоных уяўленняў аб патрыятызме, ад якогасьці халопства, што ішло ад безразважлівай веры ў раз і назаўсёды прынятыя заклікі, ад той самай эйфарыі ды рамантычна-анархічных ідэй, якімі быў нашпігаваны, дзядзьку я страшна ўзненавідзеў.

Мне, вясковаму абмежаванаму абалдую, такое можна было і даравацъ. Бо толькі пачынаў жыць, наіўны быў, як цяля. Але ж як даравацъ бацьку, бываламу зубру, што першую сусветную вайну адбухаў у акопах ад званка да званка, быў неаднойчы паранены і

біты, які за арганізацыю забастоўкі лесарубаў сядзеў у ваўкавыскай турме пры Польшчы, а ў апошні час кулацкім падаткам даведзены да роспачы.

Аднаго разу мы з ім некуды ішлі. На палявой дарозе падышла да бацькі надта знебарачаная маладзіца. Яна адвяла яго ўбок ды з плачам стала штосьці тлумачыць. Бацька лічыўся на вёсцы не толькі добрым гаспадаром, але і мужыком з галавой. Мы даўно прызвычаіліся, што да яго людзі ішлі за парадай. На гэты раз слухаў бацька жанчыну, слухаў, тады яе абарваў:

– Ніхто яму, Зося, не вінаваты! Яго права скончылася – і няхай церпіць!

Жанчыну пакінуў, а мне з абурэннем паскардзіўся:

– Некаторыя думаюць, што і цяпер, як пры Польшчы, сем'ям арыштаваных трэба таксама спачуваць, на адваката ўскладчыну грошы збіраць – бачыш ты іх?!

Неяк бацька вярнуўся змардаваны ўшчэнт з мястэчка, куды вазіў апошняе зерне на продаж, каб заплаціць падатак, ды стаў распрагаць не менш змардаваную кабылу. Бацька замерз да шпіку касцей і ніяк не мог адчапіць гужоў ад аглобляў – не слухаліся згрэблівыя пальцы.

Я падышоў дапамагчы. А ён з-за пазухі надта асцярожна выняў цудоўна вышыты на шоўку партрэт Сталіна і, бытта дорачы мне найвялікшую святыню, з урачыстай замілаванасцю сказаў:

– Трымай, Алёшка. У Свіслачы ў газетнай будцы прадавалі па тры рублі. Файны такі – ды гэтак танна... Лепш не паабедаў у сталоўцы, а яго купіў... Нясі на кухню і прыбі над сталом.

## Раздзел другі

### Чэрвень 1941

Больш-менш значнае, што адклалася ў душу ў другую сусветную вайну, я паспеў ужо выкарыстаць у сваіх кніжках. Засталіся толькі ўрывачныя моманты, галоўным чынам, тыя, якіх з-за цэнзуры друкаваць раней было нельга.

Вайна мяне заспела ў Наваградскім педвучылішчы. У армію ўзяць ваенкамат адмовіў, і я з Наваградка вырашыў ісці дамоў. У той неразбярысе родная хата здалася адзіным месцам, дзе можна было набрацца сілы, каб перажыць трагедыю, знайсці прытулак.

Па дарозе з Наваельні ў Дзятлава я ў хвойнічку спаткаў першых немцаў. Майго ўзросту обер-яфрэйтар паклаў сваё аддзяленне

ўпоперак тракту і чакаў раніцы. Яго сябры ў абдымку з ручнымі кулямётамі і карабінчыкамі на яшчэ не зусім астылым звечара жоўтым пясочку адсыпаліся, а обер-яфрэйтар за ўсіх вартаваў.

Спатканне з першым ворагам абышлося вельмі нетыпова. Сонны і ўшчэнт стомлены, я налез на варожы ланцуг упрытык, і кідацца ў хвойнік ужо не мела сэнсу.

Маё з'яўленне обера не здзівіла. Ён пацікавіўся, што ў мяне ў партфелі. Прыязна распытаў, хто я і куды іду, ды вачыма запрапанаваў каля сябе на пясчанай каляіне адпачыць, што я і зрабіў.

Немец добра гаварыў па-польску. Мы з ім сядзелі, як два браты, ды гутарылі мо з гадзіну – аж узышло ды стала прыпякаць летняе сонца.

Не да веры, але ж факт, юнак у варожым мундзіры мне паскардзіўся: ён Чырвонай Арміяй надта расчараваны. Спадзяваўся: яна дасць такі адпор, што нямецкія войскі разляцяцца ўшчэнт і салдаты праз пару дзён вернуцца дамоў. Гэтым часам часць аж з-пад Любліна тыдзень валачэцца ў трэцім эшалоне і – ніякага супраціўлення не напаткала.

У голасе ворага прагучалі ноткі жалю, што ўся дарога запруджана савецкай тэхнікай – у асноўным цэлай і спраўнай. Прагучаў і папрок, бытта ва ўсім вінаваты я.

Прыбіты, расстроены, больш з упартасці, чым з пераканання, оберу я адказаў:

– Нічога, усё гэта ў нас так ад нечаканасці. Калі сям'я спіць і нападуць бандыты, – што хочуць робяць, покуль не ачомаюцца людзі. Бяда здарылася толькі на гэтым напрамку. Затое на другіх франтах нашы паў-Германіі прайшлі, а з Берліна савецкія самалёты зрабілі гладкі стол!

– Не ведаю, не ведаю… – з недаверам і з ноткамі надзеі пакруціў галавой обер.

Такога нашага сімпатыка ў форме вермахта я потым за вайну не сустракаў. Напэўна, гэта быў мабілізаваны з-пад Познані паляк, але тая сустрэча і размова настроілі мяне адпаведным чынам і не адпускаюць да сённяшняга дня.

Гэта няпраўда, што гітлераўцы паперлі савецкія войскі на ўсход, бо мелі больш тэхнікі і адмабілізаваных салдат. Каб сцвярджаць такую ісціну, мне не трэба капацца ў архівах – я веру сваім вачам.

У радыусе 25 кіламетраў ад майго Страшава на трох вайсковых аэрадромах – на тым самым Свіслацкім, куды мы з братам зносілі камяні, на Кватарскім і Заблудаўскім – нямецкія машыны спалілі нашыя самалёты – усе да аднаго – у першую гадзіну вайны, а на

кожным аэрадроме стаяла па дзевяноста дзве – дзевяноста пяць баявых машын.

Яшчэ адна даведка для нашчадкаў узята са слоў старшыні Гарадзенскага гарвыканкама Ратайкі ў 1941 годзе: «Гародню баранілі нашы 64 зенiткі СПА. Снарадаў ім хапіла толькі на дзве гадзіны. Ужо з 6 гадзін раніцы «месершміты», «штукасы» ды «юнкерсы» беспакарана лёталі над горадам на мінімальнай вышыні, ганяючыся нават за адзінкавымі людзьмі!»

Наш хутар ляжаў недалёка ад аўтастрады Варшава-Беласток-Ваўкавыск-Слонім-Баранавічы-Менск. Савецкія танкі, зробленыя з найлепшай у свеце сталі, пафарбаваныя свежай фарбай, амаль усе цэленькія (!), кінутыя на гэтай шашы, нямецкая трафейная каманда акуратна пранумаравала. У Беластоку на бартах немцы вывелі першыя нумары. А пры ўездзе ў Ваўкавыск – і цяпер з дакладнасцю да аднаго метра магу паказаць тое месца! – стаяла ў адхоне скасабочаная машына з парадкавым нумарам 500.

Гэта была славутая «трыццацьчацвёрка». Такой маркі памятаю пяць машын на нашай шашы. Нутро мелі пакрытае густой белай эмаллю, ад чаго яно здавалася залітымі яечным бялком – цвёрдым, як косць. Уся праводка ў танках была ізалявана сталёвай сетачкай «у елачку», чаго потым не спатыкаў нават на нашых самалётах. Спецыяльныя каманды рабочых тыя шэдэўры танкабудаўнічай савецкай тэхнікі потым, як бручку, аўтагенам парэзалі на роўныя квадраты ды адправілі ў Рур на пераплаў.

Між іншым, доўгі час я намагаўся дабіцца аўтарытэтнага адказу, чаму гэткія практычныя немцы не пастараліся тыя машыны выкарыстаць па прызначэнню, пакуль не вычытаў у замежных крыніцах, што гэтаму перашкодзіла самаўпэўненасць Гітлера і пыха гітлераўцаў. Пад канец 1943 года палітыку сваю немцы пачалі ўжо мяняць, ды было позна.

Адным словам, нашых танкаў было аж паўтысячы. А з Беластока да Ваўкавыска ўсяго 90 кіламетраў. Наўрад ці прайшло па нашай шашы тыды 500 танкаў, нямецкіх, бо Гударыян са сваёй сталёвай армадай валіў на Менск праз Брэст-Баранавічы.

З такім самым недаверам я адбіраю і тлумачэнне, што нашая армія бытта бы адразу аддала пагранічную зону, бо мела там мала войск. Таксама хлусня.

Уздоўж граніцы ўсе нашы палі ды лясы былі запруджаны салдатамі – той самай кадравай арміяй, якой, паводле слоў маршала Жукава, мы ўжо больш ніколі не мелі на працягу ўсёй вайны.

Да крыўды абурала лёгкасць, з якой немцам удавалася граміць

нашы батальёны, палкі, дывізіі ды карпусы, абкружаць ды нішчыць іх, тысячнымі натоўпамі браць у палон байцоў, бытта яны ўсе апынуліся там у нас выпадкова і без камандзіраў, нібы былі не войскам, а якімсьці табуном, толькі абмундзіраваным пад чырвонаармейцаў.

Даўжэзнымі калонамі немцы іх потым перлі за былую савецкую граніцу, на тэрыторыю генерал-губернатарства (так ужо тады называлася Польшча), і заганялі ў лагеры за калючы дрот паміраць ад голаду. Там яны і ляглі ў братнія магілы па 20, 40, 50 і нават па 80 тысяч у адной яме ламанай лініяй (гэтак ішла даваенная граніца) – Сувалкі, Аўгустаў, Асавец, Богушы (куды трапіў Якаў Джугашвілі-Сталін), Граева, Ломжа, Бельск-Падляскі...

Палякі падлічылі, што на іхняй тэрыторыі ўздоўж старой (да 1939 года) савецкай граніцы лягло гэтак у братнія магілы аж 1,5 мільёна чалавек – пераважна людзей, якія трапілі ў палон у першыя дні вайны.

Адлегласць ад Сувалак да Карпат нават меншая, чым трэцяя частка вогненнага вала вайны. Я дакладна не ведаю, як было на астатніх дзвюх трэціх частках, але, як у выпадку з танкамі, наўрад ці на нашым адрэзку фронту на ўсход пераваліла больш войск вермахта, як савецкіх у палон. А яшчэ трэба ўлічыць тых, хто склаў галаву ў пагранічных баях ды на палях ад Слоніма да Менска, каго пахавалі ў брацкія магілы ўздоўж граніцы, хто не ўвайшоў у лік 1,5 мільёна. Такім чынам, па колькасці немцам супрацьстаяла і нашых войск напэўна больш. Такія рэаліі. У гэтай сувязі мне прыгадваецца размова з генерал-палкоўнікам А.Гарбатавым.

Мяне, ветэрана, даўно мучыла адно пытанне, і я ўсё хацеў задаць яго каму-небудзь з вядомых вайсковых аўтарытэтаў. Доўга я насіўся з гэтым пытаннем, пакуль не надарыўся выпадак.

Спрабуючы з Алесем Адамовічам арганізаваць Усесаюзнае таварыства цвярозасці (1962 год), я для гэтага сустрэўся ў Маскве са славутым генералам (Гарбатаў – таксама закаранелы вораг алкаголю, што мы вычыталі з яго кніжкі). Аляксандр Васільевіч прыняў мяне на сваёй кватэры ля Мікіцкіх варот – у вялікай і даволі сціпла абстаўленай залі, уздоўж сцяны якой ляжала радочкам паўтара дзесятка сёдлаў – сувеніраў грамадзянскай вайны. Асвоіўшыся з абстаноўкай, я ў яго пацікавіўся, наколькі хутчэй закончылася б вайна на нашу карысць, калі б Сталін хоць на два дні ці на дзень раней даў загад мабілізаваць войскі.

Аляксандр Васільевіч не падтрымаў майго аптымізму. На маё вялікае здзіўленне, ён сказаў такое, што дайшло да мяне толькі праз

некалькі год.

Паводле меркаванняў славутага палкаводца, пры той неразбярысе, парадках і бяздарных камандзірах мабілізацыя такая толькі дала б немцам магчымасць нарабіць з нашых байцоў яшчэ больш гарматнага мяса ды набраць яшчэ больш палонных. Атрымалася б, як з тымі самалётамі, якіх на пачатак вайны ў нас было ў некалькі разоў болей, чым у праціўніка. Бо справа ў іншым. Маўляў, потым мы не мелі ні такіх войск, ні столькі тэхнікі, ні складаў з харчамі, а немцаў, хоць і з цяжкасцю, праперлі.

Не ведаю, як у каго, а мне часта на памяць прыходзіць верасень 1939 года. Успамінаецца тая легкадумная самаўпэўненасць нашых афіцэраў і напрошваецца выснова: пахвальба і пустата – два бакі аднаго медаля.

Тысячу разоў меў рацыю Гарбатаў. Калі прыпякло і не стала мішуры ўхвалення «правадыра» ды «шчаслівага жыцця», калі да мазгоў касцей пранікся кожны трывогай за лёс сваіх нашчадкаў, то і вынік атрымаўся лепшы.

Потым нават старой канструкцыі танкамі, самалётамі ды не заўсёды большай колькаснай перавагай праціўніка перамагалі. Клаліся касцьмі, але давалі адпор, ішлі наперад. Толькі ўсё тое якім коштам адбывалася! Фактычна, вораг задыхнуўся – мы закідалі яго нашымі трупамі, страціўшы забітымі ў дзесяць разоў больш за праціўніка! І гэта пры тым, што выпусці ў чыстае поле нашага салдата супроць нямецкага, то яшчэ невядома, хто з іх атрымае верх!

Адным словам, бяздарна мы правялі вайну. І ў гэтым вінавата ў першую чаргу савецкае кіраўніцтва.

## Роздум пра часы акупацыі

Нашы сяляне надта сардэчна ставіліся да параненых байцоў ды тых, каму ўдалося ўцячы з нямецкага лагера. Але здараліся выпадкі, калі потым немцы злапанага байца дапытвалі ды збітага вадзілі па вёсках і хутарах. І той выдаваў сваіх збавіцеляў.

Пасля вочнай стаўкі раненага і тых, хто яго лячыў ды карміў, вялі на расстрэл.

Пачуўшы пра новы такі выпадак, бывала, я з горыччу ў душы сабе казаў: і на гэты раз трапіў, мабыць, немцам у лапы нехта з тых, хто ў кіёску прасіў «курыцельную газету» ды страляў у нас па буслах на балоце.

Магчыма, на сотні тысяч палонных такое прадажніцтва здаралася з нямногімі, але, як кажуць, з песні слова не выкінеш –

такое было, могуць нават цяпер пацвердзіць пажылыя людзі. Кожны выпадак непрыемным рэзанансам разыходзіўся па акрузе, зацьмяваючы часам надзвычайнае геройства іншых байцоў.

У лясах Заходняй Беларусі засталося шмат акружэнцаў.

Пасля такога разгрому нямецкай арміяй нашых войск, вядома, на акупаванай тэрыторыі Днём Перамогі яшчэ і не пахла. Як бы цяпер некаторыя ні даводзілі, што ўжо тады бачылі пераможны для нас канец вайны, а летам жудаснага І941года будучыня бачылася, мякка кажучы, змрочнай. Некаторыя акружэнцы стваралі ў лясах узброеныя групы з галоўнай мэтай – захаваць жыццё ці, у скрайнім выпадку, як найдаражэй яго аддаць. І страшныя ў сваім адчаі былі тыя групкі.

Сярод абмундзіраваных лесавікоў былі розныя па званню і адукацыі людзі. Але толькі выхадцы з народа, нядаўна залічаныя Мудрым Правадыром у ворагі народа, толькі былыя кэпэзэбоўцы, што ад гітлераўцаў таксама паўцякалі ў лес, надалі групам акцэнт змагароў з акупантам.

Прынамсі, гэтак было ў Заходняй Беларусі. І доўжылася так да канца 1942 года. Затым з Вялікай зямлі прыбылі прадстаўнікі Штаба партызанскага руху. Яны кэпэзэбоўцам бесцырымонна паказалі ранейшае месца, і тыя сціпла на яго адышлі. Мне даводзілася камандаваць атрадам толькі 100 дзён, і то перад самым прыходам Чырвонай Арміі, але нават я заўважыў розніцу ў паводзінах партызанскіх кіраўнікоў – мясцовых і ўсходніх.

Калі сядзелі мы, здаралася, у засадзе, а на фурманках ехалі карнікі, страляніны не адкрывалі. Карнікаў прапускалі – берaглі мужыкоў, якія правілі коньмі.

І міны пад цягнік закладвалі так, каб не трапіў на іх, барані Божа, пасажырскі, якім мясцовыя цёткі вазілі ў Беласток яйкі ды курэй на продаж.

Дыверсіі на чыгунках рыхтавалі старанна. Рабілі іх мала.

Затое пра кожны выпадак, пра кожны пушчаны такім чынам пад адхон поезд, напэўна ведаю, людзі яшчэ і сёння апавядаюць. Забягаючы наперад, скажу, што ў 1971 годзе, калі выключылі мяне з партыі, адным з аргументаў быў і той, што мой атрад ліпавы. Інструктары, якія рыхтавалі на бюро справу, здзекаваліся:

– Ха-ха! Толькі тры эшалоны пусціў! І гэта – цэлым атрадам! Ну ж і ваяваў! Іншыя партызаны нішчылі іх цэлымі дзесяткамі!

Ведаў і я такіх.

Мы праводзілі сапраўдныя дыверсіі. Кожная прынесла праціўніку вялікія страты ў людзях, у матэрыялах і надоўга абрывала

на каляі рух. Затое каб апісаць, як такі выбух рыхтаваўся, як яго праводзілі, спатрэбілася б сярэдняй велічыні кніжка.

Не памятаю, каб хоць адзін з атрадаў, што арганізаваліся пад Менскам ды перабраліся на Прынёманшчыну, трымаўся нашай тактыкі. Затое і сёння стаіць у вушах іхні дэвіз, які ўражваў сваёй антыгуманнасцю: лепш няхай загіне дзесяць нявінных, чым выпусціць з засады жывым аднаго гітлераўца.

А ўзарваць цягнік для такіх – раз плюнуць. У гэтым таксама была свая тонкасць. Калі хуткасць цягніка адрознівалася ад хуткасці пешахода, выбух вырываў у рэйцы кавалак у 70 сантыметраў даўжынёй (стандарт, правераны не раз на практыцы), і толку – ніякага. Бо машыніст імгненна дасць экстранны тормаз, а інерцыя пры такой хуткасці ў эшалона невялікая, ён адразу і спыніцца. Тады дамкратамі вагон падымуць, рэйку спецыяльная брыгада за гадзіну заменіць ды машыністу пасігналіць – можна далей ехаць.

Цэленькі нямецкі цягнік неўзабаве зноў валачэцца па сваім маршруце. А ў партызанскі штаб тым часам ляціць рэляцыя, што на такім-та адрэзку пуці ў столькі-та гадзін і мінут такім-та атрадам знішчаны нямецкі таварняк, напрыклад, з 47 танкамі. Намеснік камандзіра па камсамолу паралельна сігналізаваў у штаб пра гэты самы выпадак па сваёй лініі…

Ой, сабраць бы ўсе тыя рэляцыі, падсумаваць знішчаныя гэтак армады танкаў, самалётаў, горы вагонаў і цягнікоў праціўніка, то зусім незразумелым будзе, адкуль у гітлераўцаў потым цягнікі браліся, як бедныя немцы не паддаліся Чырвонай Арміі яшчэ ў пачатку вайны.

І камандзіры паводзілі сябе іначай. Тыя, хто да нас прыйшоў, пераважна вылучаліся адвагай, нічога не скажаш. Выдатна разбіраліся ў канструкцыі зброі. Затое такі чалавек з якойсьці лёгкасцю даваў загад, каб расстраляць спатканага ў лесе незнаёмца альбо партызана – бытта парушальніка дысцыпліны, дзе было дастаткова звычайнага спагнання.

Камандзір такі трымаўся ад партызан далёка, лічыў іх за нішто: такія нават асобна харчаваліся. Звычкі гэтыя перанялі, мне здаецца, ад арміі. Асаблівай бяздушнасцю вылучаліся тылавікі. Забягаючы наперад, не магу не ўспомніць непрыемны эпізод з першых дзён "вызвалення".

Беласток нашы занялі26 ліпеня. У часы акупацыі ў ім былі даволі актыўныя антыфашысцкія групы. Адзін вузел такіх падпольшчыкаў узначальвала Ліза Чапнік (падпольная мянушка – Марыся Мразоўская). Яна мела завербаваных відных

адміністрацыйных кіраўнікоў Беластоцкага бецырка, якіх у сваю чаргу ўзначальваў нямецкі інжынер Артур Шадэ.

Убачыўшы першых байцоў Чырвонай Арміі на вуліцах Беластока, Марыся запатрабавала ў камандзіра, каб нямецкіх антыфашыстаў перадаць нашым арганізавана. Неўзабаве з'явіліся прадстаўнікі «СМЕРШа». Выслухаўшы Мразоўскую, першае, што яны зрабілі, – абрабавалі ўшчэнт Артура Шадэ і яго сяброў – інжынераў Отта Бусэ, Бэнэшэка, Боле, адбіраючы ў іх чамаданы. Ды яшчэ на допыце іх да крыві збілі. Гэтак абышліся з нямецкімі патрыётамі, якія ў свой час перадалі партызанам планы апорных пунктаў Беластока, асабовыя справы на здраднікаў, медыкаменты і нават – сувоі сукна і цэнтнеры каўбасы.

Не прыпамінаю такога выпадку, каб камандзір, прымаючы ў свой атрад новага партызана, забраўшы ў яго фотаапарат, пісталет, затым вярнуў. Такі нахабнік адабраў і ў мяне бацькаў «ТТ», і потым у яго я не заўважыў нават намёку на тое, што ён зрабіў кепска і адчувае мукі сумлення.

Другі так прыўлашчыў маю куртку, пакінуўшы мяне – свайго партызана – на зіму амаль голым.

Мясцовыя камандзіры чагосьці такога сабе не дазвалялі. Памятаю, я, напрыклад, не дазволіў сабе ані разу паесці, пакуль мае людзі не былі накормленыя. Спаць клаўся, уважліва паглядзеўшы, ці хлопцам і дзяўчатам выгодна, ці вартаўнікі надзейныя. Калі заданне было надта небяспечнае, выконваў яго сам.

Быў я не выключэннем. Так паводзілі сябе ўсе мясцовыя камандзіры. Бралася ў іх гэта, мабыць, ад народных традыцый, апісаных у пачатку «Хронікі».

Каторы раз вяртаючыся ў думках да ваеннага перыяду, хачу звярнуць увагу на яшчэ адзін факт. У часы акупацыі, як ні дзіва, квіслінгаў ды ахвотнікаў ісці ў паліцыю, каб уволю піць гарэлку ды пастраляць па жывых мішэнях, ва Усходняй Беларусі немцы знаходзілі куды больш, чым у Заходняй. Там падбіралі нават для такой службы паводле ўзросту і года нараджэння, бо мелі выбар і маглі сабе такі капрыз дазволіць. І ведаю свае цэлыя раёны, дзе для такой службы добраахвотнікаў немцы набраць не маглі. У нас часта заганялі ў паліцыю, пагражаючы карай смерці.

## Вайна і Бахус

Адной з прычын, чаму мне ўдалося перанесці цераз усе нягоды сваю галаву больш-менш цэлай, ведаю напэўна, была і тая, што, за

выключэннем выпадку, калі зрабіў я гэта з-за цікавасці, ніколі – ні патаемна, ні яўна, ні пры якіх абставінах – не выпіў і чаркі спірту, гарэлкі, самагонкі, каньяку, вытрымліваючы клятву, дадзеную пры ўступленні яшчэ ў 1934 годзе ў Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі. Хоць трапляў у кур'ёзныя сітуацыі ды небяспечныя моманты, калі безадказныя сарвігаловы і пісталет да скроні прыстаўлялі, а я не меў ніякай гарантыі, што сваю пагрозу не выканаюць.

Ох, і даставалася ж мне з-за гэтага! У іншай кампаніі мяне з-за адносін да алкаголю стараліся зрабіць сектантам, якімсьці гомасексуалістам, але я, сціснуўшы зубы, цярпеў.

Не піў – і ўсё тут!

А па-чалавечы шкадаваў паклоннікаў «свяшчэннай каровы» часта. Асабліва ў ваенныя гады, пра што дагэтуль пісаць не было магчымасці.

Калі вы будзеце чытаць у якім-небудзь ваенным рамане ці аповесці тлумачэнне прарыву нашых пазіцый тым, што бытта бы на пэўны ўчастак вораг кінуў адборныя часці і цалкам п'яных салдат, вы не спяшайцеся даваць гэтаму веры. Гэта прафанацыя падзей! Так пішуць пераважна безадказныя аўтары, якія паразітуюць на балючай для нашага народа тэме. Слова «адборная», заўважце, ужываюць яны аднолькава часта і ў пачатку вайны, і ў канцы, бытта савецкія байцы пад Масквой, Сталінградам і Курскам стралялі не стальнымі кулямі, са сталёвай абалонкай, бытта снарады і бомбы нашыя начынены былі гнілой бульбай, таму немцы нават і страт не мелі.

Асабліва асцярожна трэба падыходзіць да выразу «зусім п'яных салдат».

Немцы, па нашых мерках, п'юць наогул мала. Гітлераўцы і самагонку дазволілі гнаць на акупаванай тэрыторыі выключна там, дзе жылі славянскія народы, бо рабілі гэта з агіднай мэтай – каб славян разлажыць! Але няхай хто-небудзь з іх адважыўся б наладзіць самагонны апарат у «фатэрляндзе» – канцлагера не мінаваў бы!

Да вайны (між іншым, таксама і цяпер) немец, якому ўздумаецца выпіць, замовіць ў рэстаране 25-грамовую чарку шнапсу. Калі ж каторы збіраецца гульнуць, просіць афіцыянта максімум – двайную (допэльшнапс!), і тады ў зале на такога п'янчугу звяртаюць усе ўвагу. Выглядае, вядома, смешна, але гэта не анекдот.

Бітвы, выйграныя гітлераўцамі ў Еўропе ў першай палове вайны, зроблены імі на цвярозую галаву, і мне невядома, каб у франтавое меню нямецкіх салдат уваходзілі 100 грамаў гарэлкі. Масла – так. Менавіта сто грамаў, нават у складаных палявых умовах,

належала кожнаму салдату ў суткі. Для масла ўсе вайскоўцы нават мелі спецыяльную пластмасавую скрыначку, і кожны яе надта сцярог.

Больш за ўсё ў канцы вайны, калі ўжо немцы выдыхаліся, вермахт кідаў у атаку і п'яныя часці. Але з гэтага не было карысці. Нашы салдаты тады нават пацяшаліся – во, маўляў, гэтая самая «сакрэтная зброя» шалёнага Гітлера, а дапаможа яму бы мёртваму прыпаркі.

І стыхійна напіваліся часамі немцы да ўпаду пры адступленні, калі без надзеі на поспех спрабавалі вырвацца з акружэння. Але і тады падобныя выпадкі былі больш сярод тых, хто вырашыў скончыць жыццё самагубствам. Вясной сорак пятага каля Одэра сам смаліў па такой роце з палкавой гарматы прамой наводкай, ды мяне, як і маіх сяброў, надта дзівіла, што акружэнцы нават не азіраліся на тых, хто падаў, бытта былі гэта манекены, а не паплечнікі!

Я лічу, што выдаванне па сто грамаў байцам у другую сусветную вайну – фатальная памылка. Краіна наша вялізная. Людзей многа, яны розныя. Для многіх гэта паслужыла зачэпкай любым коштам здабываць сабе і дзвесце грамаў, і паўлітра.

Сведчу, як на святой споведзі: у тую суворую пару знаходзілася надта многа паклоннікаў «свяшчэннай каровы». Так і маячыць перад вачыма батальён пяхоты пад Берлінам, які літаральна за некалькі месяцаў ці нават тыдняў да канца вайны атруціўся драўняным спіртам. І цяпер выразна бачу дзесяткі нерухомых і тых, якія корчацца ў пакутах, ды ведаю, што гэты малюнак будзе прыгнятаць мяне ўсё жыццё, ад яго нікуды не падзецца.

Іншыя тады лічылі, што ў баі цябе абавязкова выручыць гарэлка. Як толькі надараўся выпадак, напіваліся – і мора было ім на калена, а лужа – па вушы.

Пілі ў халадзіну, каб сагрэцца, але я, лежачы побач на тым самым снезе, выразна бачыў, што ім зусім не горача, таксама, як і мне.

Пілі для адвагі. Але такі зух выбываў са строю ад пасланага выбухам кавалка звычайнай цагліны, які знёс яму патыліцу, бо ўладальнік не вельмі дальнабачнай галавы палічыў каску лішняй абузай.

Пры банальнай сутычцы з немцамі выпівакі хутчэй давалі праціўніку магчымасць застаць сябе знянацку, мелі прытупленую рэакцыю і, вядома ж, часцей цярпелі паражэнне. А калі ты глядзеў на бягучага гітлераўца цераз проразь мушкі ці на крыжавіну гарматнай панарамы лавіў машыну, танк, цябе агортвала атарапеласць ад адной думкі: як здолееш трапіць у гэтае рухомае макавае зернятка, хісткую,

расплыўчатую і зусім малюсенькую смяцінку! Да таго ж, у цябе адубелыя пальцы, злева і справа тварылася ліха ведае што, ды яшчэ аднекуль сек кулямёт, абдаючы тваё шчокі і вочы калючым крошывам каменю, пяску, ільдзінак і тугімі жгутамі паветра. Яшчэ цяжэй было справіцца з баявой задачай адкрытым для ўсёй вайны зверху, знізу і з бакоў лётчыкам, танкістам, якія, акрамя таго, мусілі адчуваць і кожную шрубачку ці заклёпку складанай машыны!

Ды пры такіх абставінах трапіць у праціўніка нават выдатна вытрэніраванаму, цвярозаму байцу, які яшчэ і добра выспаўся, было не вельмі проста, а што казаць пра тых, у каго перад вачыма дваіцца і траіцца!

Адным словам, ад выпівак і на вайне карысці мелі мала. Там часцей з-за гэтага гінулі. Гэта і лагічна – толькі ў матэматыцы мінус на мінус дае плюс, і дзякуючы менавіта такім ісцінам вынайдзена нават ЭВМ. У звыклым жыцці цудаў такіх не бывае. Затое па якіхсьці д'ябальскіх законах адно з другім можа проста перакрыжавацца. Я не раз сабе думаў: калі, не дай Бог, над краінай зноў навісне пагроза вайны, ад байцоў спатрэбіцца такая свежасць успрыняццяў і яснасць думкі, што выпівох да сучаснай зброі, нашпігаванай электронікай, нельга падпусціць і блізка. Тады каму абараняць краіну?

Але вернемся да суровых дзён.

Ох, і многія жонкі, мацяркі і нявесты не дачакаліся мужоў, сыноў і каханых з вайны з-за той жа праклятай гарэлкі. І калі б наша камандаванне мела тады магчымасць дэталёва, як гэта зараз робяць на шашы сяржанты і афіцэры дзяржаўнай аўтаінспекцыі, разбірацца з усімі выпадкамі, змест некаторых пахаронак быў бы цалкам іншым – я ў гэтым упэўнены. І нарэшце, нікуды нам не дзецца ад той горкай праўды, што сярод нашых лясных вояў бяда гэтая назіралася куды часцей, чым у армейцаў. Дысцыпліну трымаць у лесе было значна цяжэй.

Ледзь не кожны былы партызан назаве вам аперацыі (я заяўляю з поўнай адказнасцю!), якія праваліліся з-за самагонкі. А колькі па гэтай самай прычыне загінула груп падрыўнікоў, сувязных і людзей выпадковых. Ды і «бобікаў» у батальёны Рагулі, Камінскага немцы вербавалі, галоўным чынам, з выпівакаў.

Былі яшчэ і такія, што ў самагонным чадзе цалкам перарадзіліся, засталіся «партызаніць» у лясах і пасля вайны. Не хачу гэты тэкст празмерна раздуваць, таму не прыводжу прыкладаў. Хто не паверыць, няхай распытае старых сялян Наваградчыны, былых Воранаўскага, Радунскага і Сапоцкінскага раёнаў.

## Раздзел трэці

## Пачатак мірных дзён

Першыя пасляваенныя гады праходзілі ў нас у атмасферы напружанага будаўніцтва таго, што было разбурана, у яднанні сем'яў, раскіданых вайной па ўсім свеце, якіх усясільны біялагічны магніт сцягваў да сваіх каранёў.

Я, цяжка паранены і недалечаны, знайшоў сабе ў той час ціхі закутак – вучобу на факультэце англійскай мовы Гарадзенскага педінстытута. Зрэшты, па-сапраўднаму ціхім той інстытут, як і горад, назваць нельга.

Парадкі былі ўсюды аднолькавыя.

Ішоў я аднойчы па вуліцы Ажэшка, а насустрач – узвод нямецкіх палонных. Усе такія змораныя, апушчаныя, занядбаныя, шэрыя, згорбленыя, як бы і ростам нават меншыя. Дзіва брала: няўжо перада мной – тыя самыя бравыя ваякі, што нават брамку на падворак да нас адчынялі толькі наском бота? Зусім нядаўна ніхто з іх і не думаў павітацца з мясцовым чалавекам. Нават з тымі, з якімі былі ў цесным кантакце. Называлі нас няйначай як «фэрфлюхтэ русэ», «фэрфлюхтэ полен», «фэрштынктэ швайнэ»!

Душа мая на момант загарэлася адчуваннем задаволенасці ад мсцівай перамогі – во як бывае ў жыцці!

Спаткаўшы тут жа свайго блізкага друга – Лёву Клейна, я кіўнуў на палонных ды жартаўліва кінуў:

– Хайль Гітлер, ха-ха!

Трэба, мабыць, улезці ў маю скуру і маімі вачыма бачыць усё, што гітлераўцы вычаўплялі з яўрэямі, а затым паўзіраецца на апушчаных, вартых жалю немчыкаў, што панура і знебарачана валакліся па бруку старажытнага беларускага горада, каб зразумець, чаму я так сказаў.

Лёва на мяне радасна бліснуў чорнымі вачыма і ва ўсмешцы паказаў свае белыя зубы, сказаўшы таксама нешта адпаведнае. Яшчэ абодва мы бясклопатна парагаталі, але і ўвагі не звярнулі на тое, што нас слухае член студэнцкага прафкама – Зіна П. Праз пару гадзін мяне выклікалі ў НКУС.

На допыце я адразу ўбачыў: маіх тлумачэнняў ніхто тут не зразумее. З тлумачэннямі нават не сунься, а гумар у гэтай установе не ў пашане. Што рабіць, дзе выйсце?

І я дакладна гэтак, як рабіў калісьці ў Польшчы перад дэфензівай, пры арышце гітлераўцамі, прымяніў мужыцкую хітрасць.

– Я-а мог такое сказаць?! – здзівіўся. – Хто-о, я-а?! Тут яшчэ пастукаў сябе кулаком на скроні і драматычна агаліў на спіне свае шрамы і дадаў: – Хайль – па-нямецку – слава. Пасля гэтага, што мне фрыцы зрабілі, яшчэ стану Гітлера славіць? Вы што?!

Энкэўсавец сумеўся. Я наступаў:

– А хто гэта вам сказаў? Хто вам такое мог наплесці? Ад каго вы такое пачулі?

– Маем спосаб, каб ведаць. Мы ўсё ведаем, ты не думай, што не сочым.

– Гэта – не адказ! Не-е, вядзіце мне яго сюды!

– …

– Сюды давайце, няхай у вочы мне тут скажа! Не выйду з пакоя, пакуль не прывядзеце яго!

– …

– Усялякіх брахуноў слухаеце! Што, у вас іншай работы няма, як такой граззю займацца?!

Мяне адразу адпусцілі. Але страху наеўся. Бо ўсім нутром на момант выразна адчуў, як мой лёс вісіць на тоненькайтанюсенькай нітачцы.

Якраз узяліся за наш інстытут.

## Мафія НКУСаўцаў

На кафедры марксізму-ленінізму з'явіўся нечакана лейтэнант Чыркоў. Не памятаю, каб хоць хто раз упамянуў яго імя ці па бацьку, – па прозвішчы чалавека памятаю, як і па яго ўчынках.

Чыркоў за нешта праштрафіўся ў НКУС і да нас трапіў невыпадкова. Хтосьці вырашыў, што ў педінстытуце зарадзіліся нездаровыя імкненні, і паслаў яго да нас на ўмацаванне ідэалагічных кадраў. Жах, які гэта быў чалавек. Абмежаваны. Нахабны. Неахайны ў вопратцы, са стаптанымі абцасамі, у ніколі не чышчаных афіцэрскіх ботах і ў такім жа галіфэ неакрэсленага колеру. Затое самаўпэўнены і настырны.

Ён адразу пачаў цкаваць выкладчыкаў.

Англійскую фанетыку нам выкладала вельмі адукаваная (скончыла ўніверсітэты ў Львове і ў Шанхаі) асоба – Фаіна Квяткоўская. Высокая, танклявая і энергічная. Была яна бяздзетнай і ўсе сілы, як і амаль усю зарплату, аддавала на нас, студэнтаў. Арганізавала на факультэце нават студэнцкі джаз. Каб дамагчыся належнага поспеху пры вывучэнні прадмета, яна ў сваім кабінеце мовы вывесіла на бачным месцы заклік: «Тут гавораць толькі па-

англійску!»

У заходнебеларускай мове надта многа германізмаў. Яна імі аж перасыпана. Напрыклад, наш сусед да бацькі мог звярнуцца з такімі словамі:

– Нічыпар, дай свайго гэбліка. Еду на кірмаш, а дрыль скапуціўся, трэ новы змайстраваць. І цуглі конь дыхт пагрыз, трэ новыя. А Сашка, гіцаль, на ганку шыбу пабіў, трэ ў шклярні яе рыхтык алмазам падшыхаваць. Грошай не маю. Што ў борг вазьму, што на гатоўку, дый фасовачку масла баба нашыхавала на праданне...

Англійская мова, як вядома, належыць да групы моў германскіх. Таму вучыць нямецкую ці англійскую нам значна лягчэй, чым жыхарам, напрыклад, з-пад Казані ці Вяткі. Пры добрых выкладчыках неўзабаве з'явіліся адпаведныя веды і ў нашых студэнтаў. Дый я сам з радасцю выявіў, што ў мяне вымаўленне робіцца бы ў якога лорда. Па-англійску мог неўзабаве бегла выказваць свае думкі на розныя тэмы. Толькі ўлада ў гэтым чамусьці ўгледзела сабе небяспеку.

Убачыў новаўвядзенні «англічанкі» Чыркоў і на першым партсходзе абрынуўся на рэктарат:

– Безадказныя разгільдзяі, куды вы глядзіце? Бачыце, гутарыць па-руску ёй ужо не падабаецца, а па-замежнаму ёй захацелася! І чужы нам па духу джаз завяла! А чаго было чакаць ад недарэзанай эмігранткі? Што сказаў вялікі Сталін аб гэтым выпадку? «Некаторыя разумнікі шукаюць класавага ворага абавязкова з агіднай фізіяноміяй, з вялікімі зубамі, з тоўстай шыяй ды з абрэзам пад палой. Той час даўно мінуў! Цяпер шукайце класавага ворага і замежнага дыверсанта каля сябе! Ён – побач! Ён сціплы і адукаваны, але нам якраз найбольш і шкодны!»

У зашмальцаваным да агіды вайсковым кіцелі са слядамі, дзе былі пагоны, у выцертым галіфэ і ў ніколі не чышчаных ботах з высокімі халявамі ды са скрыўленымі заднікамі, Чыркоў шалёна абвёў сабраных вачыма:

– Вешчыя словы Правадыра!

Тут ён тыцнуў пальцам у абмярцвелага рэктара:

– І ў вас дакладна гэтак атрымалася, як вучыць таварыш Сталін! А чаму? Бо пільнасці ў вас няма! Растапырыліся тут, панімаеш, самі і людзям дазволілі растапырыцца!.. Нічога, неўзабаве давядзём вас да кандыцыі, я за гэта вазьмуся! Развялі тут буржуазную гніль, панімаеш, на кожным кроку! А калі яна агентка ЦРУ і спецыяльна падасланая да нас? Таварыш Сталін нас вучыць, калі буржуі адны да

адных тысячамі шпіёнаў засылаюць, то ў СССР пруць іх сотні тысяч, напэўна! Вось перад вамі адзін такі тып! Ах, прыемная кабета, ах, ах, інтэлігентка! Гэта – гнілая інтэлігенцыя!

Грозна абвёўшы ўсіх вачыма, Чыркоў дадаў:

– Шчэ трэба разабрацца, ці яна адна? Шчэ трэба прыгледзецца да яе абаронцаў! Напэўна, тут гняздо ў іх! А што? Час, каб звіць яго, мелі, варункі адпаведныя!

Сабраныя зніякавелі.

На наступны дзень сумленную Квяткоўскую, а заадно і выкладчыцу тэорыі англійскай мовы Марыю Мінц – таксама выдатнага спецыяліста – паперлі з трэскам з работы, абедзвюм катэгарычна загадалі – знікнуць з прыгранічнага горада на працягу 24 гадзін.

Трафарэты ў кабінеце англійскай мовы пазрывалі ды панішчылі.

Зрэшты, такое вар’яцтва ішло тады не толькі ад прымітыўнага маёра НКУС, які толькі што зняў пагоны.

## Класічны сталініст

Аднойчы мяне, старшыню прафкама, партбюро вырашыла паслухаць па пытанні дасягненняў у спорце. Мэкаў я і бэкаў, бо абсалютна не было чым хваліцца. Частка нашых хлопцаў і дзяўчат былі калекамі вайны. Галоўнае – усе амаль галодныя, ніякі спорт ім у галаву не лез. Але гэтага ніхто не хацеў браць пад увагу.

Асабліва Чыркоў прыдзіраўся. Маўляў, Карпюк паказаў усю сваю класавую абмежаванасць і блізарукасць, не разумеючы стратэгічнага значэння спорту. Маўляў, у ім, у спорце, як вучыць Клім Яфрэмавіч Варашылаў, закладзена абараназдольнасць маладога пакалення і будучыні краіны. Няма чаго есці? Няма! Але ж ці гэта прычына? Хлусня! І галодныя камсамольцы пабудавалі горад на Амуры, калі спатрэбіўся ён для партыі! А ў грамадзянскую вайну? Камсамольцы Паўкі Карчагіна лютай зімой былі разутыя і раздзетыя (не толькі галодныя!) ды яшчэ і сярод бандытаў, а справу сваю як рабілі? Кожнаму піянеру нават, панімаеш, пра гэта цяпер вядома!

Калі бюро скончылася, выйшаў я ў калідор, а сэрца поўнілася горыччу і крыўдай.

Халера на яго, чаго яны так? Усе ж ведаюць, я стараюся – як толькі магу! Нават сам удзельнічаю ў гуртку бокса, валейбола, шахмат! Бегаю на дыстанцыі ды скачу цераз планку, хоць маю дакумент інваліда ВАв ІІ-й групы (тады яшчэ насіў асколкі ў лёгкім). Трымаю гарадское першынство па стральбе, часамі выбіваю яго і па

вобласці, хоць стралянне абрыдла ў вайну!..

І тут да мяне падышоў надта паважаны мной дагэтуль выкладчык марксізму-ленінізму, стары камуніст, член бюро, а, як сам любіў хваліцца, яшчэ і блізкі сябра Марыса Тарэза – Майсей Перэльмутар.

– Перажываеш, малады чалавек?

– А ну яго пад халеру!

– Не трэба так браць да сэрца!

– А як?! – акрысіўся я на старога.

– Ну, ну! Сам ведаеш, наш інстытут на рэспубліканскіх спаборніцтвах заняў ледзь не апошняе месца, ці ж можа з такой ганьбай мірыцца парткам, прафкам, рэктарат, сам падумай?!

Я выбухнуў ледзь не з плачам:

– Што вы гаворыце, Майсей Цалевіч?! У нас жа зусім іншыя, чым у іх, умовы! Пры прыёме там выбіраюць сабе лепшых абітурыентаў Беларусі, бо сталіца, а ў правінцыю да нас трапляюць, хто не здасць экзаменаў у іх, – гэта ж не сакрэт! Вось і вынік, а вы такое мне гаворыце!

– А ты не гарачыся!

– Бо ўсе не хочуць бачыць прычыны!

– Добра, супакойся, усё мы бачым!

– Ага, бачыце! То навошта пілуеце?

– Хочаш, каб па галоўцы гладзілі, так?

– …

– Слухай, я табе падкажу, як іх абагнаць!

– А вы ве-едаеце?! – зарадзілася ўва мне надзея.

– Я многа чаго ведаю, чаго не ведаеш ты. Мы, старыя камуністы, ведаем усё, чаго вам і не снілася нават, хоць вы нас і на грош не цэніце! Але мы ўсё ведаем! І табе можам сказаць. Толькі ўважліва слухай.

Я паўзіраўся на выкладчыка, як на мага:

– Майсей Цалевіч, не магу больш цярпець – кажыце!

– То слухай.

Стары даў мне мажлівасць супакоіцца.

– А ты таварыша Сталіна чытаў?

– Не разумею вас...

– Ён яшчэ і не разумее! Пытаю: добра чытаў творы таварыша Сталіна?

– Па спо-орту? – надта здзівіўся я, прыпамінаючы, дзе і што сказана аб гэтым у кніжках Правадыра народаў і Карыфея ўсіх навук і ў якім відзе спорту праславіўся ЁН сам.

Памяць нічога не падказала. Выкладчык дапамог:

– Не, прамых указанняў у таварыша Сталіна аб спорце не знойдзеш, можаш не шукаць. Але ты пашукай паміж радкоў! Праштудзіруй яго старанна, праштудзіруй і раз, і два, і тры! Ды ведаеш, найлепш калі? Да снядання, на зусім свежую галаву! Я ўпэўнены – тады ў цябе адразу з'явіцца належны вынік! Тады і мінчан лёгка абгоніш, зразумеў? Шчэ і ў Маскву на спаборніцтвы паедзеце!

Выкладчык у салдацкім шынялі пад Сталіна – з гаплічкамі замест гузікаў, так тады апраналіся педагогі інстытутаў, яшчэ хвіліну памеркаваў, якое зрабілі ўражанне яго словы на студэнта, затым здаволена пакрочыў.

Шчыра кажучы, я з добрую хвіліну знаходзіўся пад уплывам яго ўнушальных слоў. Бытта яны ішлі ад самога Марыса Тарэза, а то і вышэй. Нават настрой пачаў як бы мяняцца. Ха, выходзіць, у мяне ёсць яшчэ выйсце, ты бачыш?!

Толькі пасля дайшла ўся недарэчнасць, выказаная старым дагматыкам, сектантам, дэмагогам і тупіцам. А калі, нарэшце, дайшла, адразу апанавала ўсю маю натуру.

Мяне раптоўна разабраў прыступ смеху – гвалтоўны і моцны. Азірнуўшыся, ці няма каго блізка, аж прысядаючы, я зарагатаў на ўвесь калідор.

... Язык свярбіць, так хочацца расказаць і пра іншых падобных «выкладчыкаў». Але ж за мэту ў гэтым творы я паставіў перад сабой іншае. Са шкадаваннем пераходжу да падзей наступных.

## Псаломшчык– велікамучанік

З сяла пачалі даходзіць весткі – начальства загаварыла пра калектывізацыю. Там-сям за яе ўжо нават браліся. Кампанія гэтая, паводле чутак, ішла вельмі марудна. Бо мужыкі нашы за мінулыя гады аж занадта мелі магчымасць пераканацца, што тварылася ў калгасах Усходняй Беларусі, у Расеі і на Украіне. Хадзілі маляўнічыя чуткі, як там на працадні даюць толькі лічаныя грамы збожжа альбо ў ведамасцях ставяць адны «птушачкі». Апавядалі, у некаторыя гады людзі там бытта бы з голаду паміралі.

Слухаючы зноў аб калектывізацыі, іншыя ў нас шчыра дзівіліся: як жа так, сярод партызан, якіх яны ўсю вайну падтрымлівалі харчамі ды зброяй, панавала цвёрдая ўпэўненасць, што калгасы сябе не апраўдалі і Сталін яшчэ ў пачатку вайны іх адмяніў, зямлю мужыкам раздаў зноў ды сказаў: «Жывіце, як сабе хочаце».

Прыйшла восень 1946 года, а з ёй і неўраджай. Сталін з-за

нейкіх амбіцыёзных меркаванняў усё збожжа з Усходняй Беларусі ды Украіны вывез у Заходнюю Еўропу, агаліўшы вёскі падчыстую. Каб ратавацца ад галоднай смерці, і на гэты раз тысячы людзей з мяшкамі, праклінаючы калгасныя парадкі ды правадыра, запрудзілі ўсю Заходнюю Беларусь, дзе жылі яшчэ аднаасобнікі. Такога наплыву няшчасных хутка не забываюць. Адным словам, тэма гэтая ў нашых сялян была непапулярнай. Але, як гаворыцца ў народнай прымаўцы, свая кашуля бліжэй да цела – для мяне было не гэта галоўным.

Мінула пару гадоў вучобы ў педінстытуце, а, насуперак цвярозаму разуменню, нада мной усё вісеў і вісеў той самы «першародны грэх» – бацькава спадчына.

Бацьку рэктара педінстытута Мікалая Уласаўца раскулачылі яшчэ ў 1937 годзе, магчыма таму Уласавец на кожным кроку падкрэсліваў сваю сімпатыю да мяне ды выказваў спачуванне. Затое парторг, рэктарат і асабліва Чыркоў ставіліся да мяне бытта да чалавека другога гатунку, не свайго.

Недаверу не магла змыць нават арганізацыя мной партызанскага атрада, пасля чаго немцы развалаклі наш хутар і бацькі мусілі ратавацца ў партызанах.

Не знялі недаверу мой удзел у дзеючай арміі, раненні ды высокія ўзнагароды.

Я ўсё больш і больш адчуваў, што трапляю ў катэгорыю людзей, якія вызначаліся напалову ганебнай мянушкай «заходнік». Мянушка мела сацыяльны падтэкст. Гэта значыць, што я чалавек не «паўнаварты», які не выклікае даверу, якога не трэба прымаць усур'ёз.

Зрэшты, даводзілася цярпець не мне аднаму. Цяпер на кожным кроку траплялісся «заходнікі», якім было куды горш.

Перад выбарамі ў Вярхоўны Савет я, агітатар, аднойчы хадзіў па кватэрах ды перапісваў выбаршчыкаў. У маленькай каморцы з асобным выхадам па вулачцы Міцкевіча чалавек рамантаваў веласіпед – такі даезджаны, што незразумела было, чаму гаспадар не выкіне яго даўно на сметнік. Разгаварыліся, і незнаёмы супакоіўся. Нечым я ў чалавека выклікаў давер. Ён мне паведаў сваю бяду.

У каморцы жыла яго дачка. Працавала на «хуткай дапамозе» медсястрой. Ён жыў у прыгранічным сяле, служыў псаломшчыкам. Да яе прыязджаў толькі ноччу і так, каб, барані Бог, не бачылі людзі.

Яна ў анкетах не пісала, што мае бацьку, а ён, што – дачку, інакш яе адразу паперлі б з работы. Дзякуй Богу, без перашкод ёй гэтак мала-памалу ўдалося скончыць курсы медыкаў і атрымаць дыплом, а цяпер ужо не страшна. Калі нават усё выкрыецца, з дыпломам работу заўсёды знойдзеш – кожная бальніца яе возьме, на

медсясцёр пануе дэфіцыт. Зараз медычка спакойна сабе працуе ўжо цэлы год. Мо і замуж знойдзе там за каго выйсці, калі не выкрыецца падман, бо інакш хто ж цяпер ажэніцца з псаломшчыкавай дачкой? Хіба што такі самы псаломшчык. Здатная ды прыгожая, як ружа, бо ўся ў маці ўдалася. І людзі яе любяць ды паважаюць за працавітасць і шчырасць. Сёння прывёз ёй кліночак сыру, торбачку груш – усё ж такі наедак, бо палучку медыкі атрымліваюць надта ж мізэрную.

Даўно трэба ад’язджаць. На святло ўакне можа хто заглянуць. Ды халерны ровар зноўразваліся, а рамантаваць гэтага дзеркача можна толькіпры лямпе: шыбы спецыяльна заляпаныя, каб праз іх нельга было нічога ўгледзець, дзённага святла амаль не прапускаюць. Ровар надта стары, куплены яшчэ пры Пілсудскім.

– Кажуць, вось-вось і псаломшчыкаў пачнуць у Сібір вывозіць, хто ёй, беднай, тут тады дапаможа?!

Апавядае ўсё дзядзька, я слухаю ды лапаю сябе на думцы: ну, дакладна, бы ў нямецкім канцлагеры, калі сыходзіліся беларус-селянін, аўстрыяк-шахцёр, чэх-мастак, над якімі вісеў адзін і той жа самы дамоклаў меч, ды дзяліліся сваімі бедамі!

Зрабілася як бы лягчэй. Я чалавеку паспачуваў:

– Затое ноччу бандыты напасці на вас могуць, а днём бяспечныя дарогі!

Пажылы чалавек дапытліва паглядзеў мне ў вочы, разважаючы, ці мае быць перада мной да канца шчыры. Рызыкнуў:

– А я вам скажу, у гэтых яшчэ можаш адпрасіцца! Угаварыць іх можаш! Бо павыганялі іх са сваіх селішч, паламалі ім жыццё... А ў прыродзе так: нават мыш кусаецца, бо і яна мае права абараняцца!..

Бачачы ў маіх вачах здзіўленне, растлумачыў:

– Якія з іх бандыты? Таксама няшчасныя людзі! У чым яны вінаватыя? У тым, што не захацелі, каб, як быдла, і іх павезлі ў Сібір таварнякамі, ды ўцяклі?!

– Вы так думаеце?!

Ход думак чалавека для мяне быў такі нечаканы, што я не знаходзіў, што сказаць больш.

Чалавек загаварыў ужо спакайней:

– Гэта ж – ясна. А з такімі дамовіцца заўсёды можна. Затое з гэтымі абармотамі, камандзір якіх жыве на Лермантава вуліцы, не дагаворышся. Такія ні чалавечай літасці, ні міласэрнасці не ведаюць! У-у, такія маці сваю не пашкадуюць!

Хацеў яшчэ штосьці дадаць, але не дагаварыў. Толькі бліснуў з-пад ілба вачыма. А я падумаў: маеш, чалавеча, рацыю. Сустрэча з гаспадаром старога веласіпеда разварушыла мне душу яшчэ мацней.

## Начны хапун

Да гэтага часу цэрквы, касцёлы, капліцы – будыніны, куды пакаленні продкаў неслі свае беды, надзеі і думы, перадавалі пад склады, жылыя дамы (Ваўкавыск-Цэнтральны), а то і проста: трактары чаплялі гакамі за вуглы святынь ды развалаквалі іх на дровы. З культавых будынкаў для службы пакінулі толькі адзінкі.

Забралі ды пагалоўна вывезлі ў Сібір ксяндзоў, папоў (у тым ліку і тых, хто дапамагаў партызанам) і дабіраліся ўжо да псаломшчыкаў. Бралі нават тых бацюшкаў, псаломшчыкаў, хто быў за партызанства ўзнагароджаны ордэнам.

Адзін з кіраўнікоў нашай партызанскай брыгады, Яўген Дзевалтоўскі, працаваў у Гародне пракурорам. Быў у вялікай пашане і адчуваў сябе ўпэўнена. Аднойчы на вуліцы Ажэшка спаткаў свайго партызанскага сувязнога – святара з прыгараднага прыхода. Мужчыны надта ўзрадаваліся, абняліся. Затым пайшлі ў піўную. Жыва ўспамінаючы, як некалі дурачылі немцаў, распілі па куфлі піва. Назаўтра Дзевалтоўскага выключылі з партыі і знялі з пасады, і ўсе ад яго адвярнуліся. Так і памёр, бедны, з мянушкай – паслугач папа, хоць з партызанства вынес вялікія заслугі.

Пазабіралі тыя рэшткі беларускай інтэлігенцыі, якіх не маглі па той ці іншай прычыне ўзяць у 1940-1941 гадах. А праўду дзядзька казаў: на свеце так вядзецца, што нават казурка спрабуе абараняцца. Некаторыя маладыя з сем'яў якія ладавалі на вазы ці ў машыны, каб перці на чыгунку да эшалона, з-пад канвою ўцякалі ў лес і там аб'ядноўваліся ў групы, як у часы нямецкай акупацыі.

З-за бандаў цяпер страшна было зайсці ў лес. Каб выжыць, яны нападалі на магазіны, рабавалі людзей, зводзілі крывавыя разлікі з тымі, на каго мелі падазронасць, што быў звязаны з НКУС...

Колькі лягло тады міліцыянераў, салдат і актывістаў у барацьбе з такімі “бандытамі”, створанымі, калі разабрацца па справядлівасці, самімі энкэўсаўцамі на чале з іх Вялікім і Мудрым Правадыром, яшчэ і не палічылі.

Часамі, калі агортваў роздум, я прыкідваў: а што было б, калі б летам 1941 года за «кулацтва» паспелі вывезці і нашу сям'ю? Не ведаю, як мой брат, Валодзька, а я, хутчэй за ўсё, таксама паспрабаваў бы ўцячы з-пад аховы, бо мацней за ўсё люблю свабоду. Мажліва, яшчэ тады папоўніў бы шэрагі вось такіх «бандытаў» у лесе. А ўвогуле, ніякія яны не былі бандыты. Сваімі людажэрнымі распараджэннямі «мудры» Правадыр спарадзі у Заходняй Беларусіэлементы грамадзянскай вайны. Для мяне гэта ясна.

Тым часам хваля рэпрэсій набірала размах.

Нават сёння памятаю тую раніцу – жудасна-страшную, калі мы ў інтэрнаце раптам даведаліся, што яшчэ ўчора з пасады рэктара знялі нашага любімага Уласаўца і на яго месца прызначылі п'яніцу і нікчэмнасць. Мала таго, ноччу ў пакоях інтэрната на Савецкай вуліцы зрабіліператрус, пасля чаго арыштавалі студэнтаў – Кісяля, Старадубцава, Барэвіча, Матэчку, Пілецкага.

За імі забралі выпускнікоў – Смоліча, Чурылу, Майсеню і Генаша. Узялі Барэвіча, выкладчыка Гайдучыка ды яшчэ і яшчэ, каго цяпер, на вялікі жаль, ужо і не ўспомню.

Паводле чутак, усіх абвінавацілі ў антыкалгаснай прапагандзе. А Барэвіча з Гайдучыкам – у змове для страшэннага злачынства – забойства першага сакратара Гарадзенскага абкама партыі Сяргея Прытыцкага.

Зрэшты, ці такое абвінавачанне было на самай справе, ці гэта толькі плётка, ніхто толкам сказаць не мог. Адно шмат гадоў пасля рэабілітацыі яны расказалі прычыну мне самі. Для астатніх ахвяр энкэўсаўцы не змаглі прыдумаць і важкіх абвінавачванняў.

Чаго ім толькі не прыпісвалі! Аднаго студэнта ўзялі, бо выключыў у пакоі радыё, калі гралі «Інтэрнацыянал». Другога пасадзілі на дзесяць гадоў у лагер, бо сказаў, што надта ж любіць, калі іграюць замежныя акардэаністы. З суседняга з маім пакоя ўзялі хлопца, бо, збіраючы грыбы, бачыў бандытаў. Студэнт пра іх адразу і заявіў, але гэта было няважна. Маўляў, выйшлі бандыты, бачыце, не да каго іншага, але да яго!

Яшчэ хлопца ўзялі, бо ў час студэнцкага суботніка, падышоўшы да сяброў, калі ўсе курылі, пакпіў:

– Ну ж і працуеце вы, як стаханаўцы!

Дачка дырэктара шклозавода вярнулася з рынку і праспявала фразу, якую пачула ад п'янай бабы:

Ах, калхознічкі, канарэечкі,
Усё ро-обім мы за капе-ечкі!
Сястра паўтарыла другую п'яную:
Шла ў калгас – юбка нова,
Шла з калгаса – попа гола, ух, ух!

Абедзвюх блізнятак ноччу забралі, і больш іх ніхто не бачыў і не чуў.

Неўзабаве яшчэ некалькі дзесяткаў студэнтаў выключылі з інстытута бытта бы за дапамогу акупанту ды за тое, што ўтаілі мінулае, – бачыце, яны былі дзецьмі «ворагаў народа».

Студэнтку Ліду Перагуд прыперлі, бо, выходзячы замуж, шлюб

брала ў царкве. З-за канспірацыі абрад рабіць ездзіла ў Вільню, аднак знайшліся даносчыкі, і хітрасць Лідзе не дапамагла.

У лік выключаных трапілі нават інваліды ВАв (М.Якімовіч ды іншыя), а таксама хлопцы, якія ў вайну маглі быць толькі пастушкамі. Яны вучыліся пры немцах у беларускіх школах, там іх механічна залічылі ў Саюз беларускай моладзі, і энкэўсаўцы завялі на іх справу як на падсобнікаў акупанта.

Кожнага з іх я добра ведаў. Абвінавачанні супраць хлопцаў і дзяўчат былі недарэчнымі. Але ж зноў ніякіх афіцыйных тлумачэнняў – ні рэктарату, ні родным, ні мне, старшыні прафкама.

## Пад уладай чырковых

Усведамленне таго, што ўзятыя і выключаныя з інстытута нічым абсалютна не адрозніваюцца ад астатніх, у тым ліку і ад цябе, што існуе нейкая пачварная, усемагутная сіла, якая творыць беззаконне, чалавека аглушала ды паралізавала. Ты ўвесь час быў наструнены ды чакаў: вось-вось і да цябе, голуба, дабяруцца. Напэўна дабяруцца, як ні круціся. Што ж, па іхніх мерках і ты гэтага варты: жыў не так, як ім хацелася б. Выходзіць, я шкоды нарабіў?

І я зноў перабіраў усе падзеі мінулага да дробязей, так і гэтак смакуючы, ды зноў нічога не знаходзіў. Хоць ты пад зямлю залазь.

На калісьці ціхай, з пышнымі кустамі бэзу вулачцы Лермантава віднеўся масіўны асабняк. У ім цяпер азотна-тукавы камбінат абсталяваў гасцініцу на 35 чалавек. Па горадзе папаўзла раптам вестка, што ў будынку тым пасяліўся начальнік НКУС Гарадзенскай вобласці – грозны Фралоў. Што менавіта ад яго ідуць усе тыя страхі. Таму будынак за бэзам, хто толькі мог, абыходзіў.

І смех цяпер у гэтым прызнацца, але надалей мяне ўвесь час мучыла, тачыла і свідравала непераадольнае жаданне – эх, трапіць у Маскву, дабрацца да таварыша Сталіна ды расказаць ЯМУ пра ўсе-ўсе злачынствы, якія ад яго імя твораць тут розныя самадуры! Хто падкажа, як гэта зрабіць?

Вядома, пасля апошніх «вывазак» знайшліся зноў такія, што не змаглі пераждаць той атмасферы ды ўцяклі ў лес, павялічыўшы банды. Аднак пераважная большасць усё ж цярпела. Бо і дагэтуль людзі перажылі шмат. Народ паступова прызвычаілі існаваць у якімсьці здранцвенні, вечным страху, маўчанні. Разам з усімі маўчаў і я. Тым больш, набліжаліся дзяржаўныя экзамены. Затым меўся адбыцца выпуск, а разам з ім і надта знамянальная для мяне з'ява – атрыманне дыплома, аб якім у маёй вёсцы да вайны гаварылі, як аб нечым

недасяжным і магутным: ён бытта бы ўсюды для цябе адкрывае дарогу. За 25 кіламетраў на захад ад Гародні знаходзіўся раённы цэнтр Сапоцкіна. У ліпені 1949 года мяне накіравалі туды загадчыкам раённага аддзела народнай асветы.

Будучы студэнтам, я ўсё ж такі быў далёкі ад рэальнага жыцця, бо на самай справе яно аказалася куды страшнейшым, чым мне здавалася. З ім давялося сутыкнуцца ўжо пры афармленні на работу ў абласным аддзеле народнай асветы. Выседжваючы ў прыёмнай аблана, пакуль афармлялі мне накіраванне, я стаў сведкам, як загадчык аблана ўгаворваў нейкага чалавека згадзіцца на пасаду дырэктара дзіцячага дома ў Парэччы.

– Майсей Герасімавіч, – адмаўляўся сярэдніх гадоў самавіты мужчына, – на гэтай пасадзе – мізерная зарплата, а ў мяне хворая жонка, куча дзяцей. Як я ўтрымаю іх за такія грошы, што вы мне плаціць будзеце?

Загадчык аблана пачаў яго пераконваць:

– Ты што, здурэў?! Пасада дырэктара дзетдома – цёплая! Вельмі цёпленькая! Яна заўсёды дасць табе магчымасць што-небудзь скамбінаваць! Дурань, гэта – залатая жыла! Харчы будзеш браць з іхняй кухні, апал – таксама дзетдомаўскі, як і транспарт, як многа-многа чаго іншага! Там кожны дзень камбінаваць сабе здолееш, калі лапухом не будзеш!

І гэта рабілася адкрыта, пры сведках. Мяне аж перакасіла ад такога інструктажу, а дыплом здаўся звычайнымі вокладкамі з кардону, абклеенымі чорным дэрманцінам.

Аднак то былі толькі кветачкі.

Менавіта ў Сапоцкіне я зблізку назіраў поўны аб'ём таго катаклізму, які зваліўся на мой край. Менавіта там давялося трапіць пад яго бязлітасныя колы, спаўна сербануць яго горыч.

## Раздзел чацвёрты

### Касмапаліты і мужыкі

Сапоцкінскія вёсачкі былі надта бедныя і знебарачаныя. Што ж, у гэтай мясціне на працягу апошніх дзесяці гадоў пяць разоў змянялася ўлада – польская, нямецкая, савецкая, другі раз нямецкая, а тады – зноў савецкая надоўга. Улады прыходзілі ды адыходзілі з баямі, ахвярамі, арыштамі. За кожным разам пакідалі свае крывавыя сляды, ваенныя папялішчы, растрывожаныя раны.

Тут, мажліва, больш, чым дзе, не згас боль ад перажытага. Людзі

не вылазілі з касцёлаў ды цэркваў. Калі ж іх не стала, не пераставалі кленчыць перад крыжамі на ростанях. А калі народ найбольш моліцца? Як яму баліць невыносна душа, як перажывае вялікае гора. У гэтым я пераканаўся за сваё жыццё цвёрда.

Уздоўж граніцы яшчэ стаялі наглуха замураваныя (каб дзеці не цягалі для забавы снарады, гранаты ды кулямётныя ленты) жалезабетонныя бункеры (доты) самога генерала Карбышава, у якіх не паспелі стлець целы пагранічнікаў. Але да іх тады нікому, абсалютна нікому, не было справы.

Адразу я з галавой пагруз у стварэнні школ раёна. Было гэта складана. Раённы аддзел народнай асветы не меў ні адпаведных будынкаў, ні настаўнікаў, ні падручнікаў, ні пісьмовых прылад. У вёсцы Новікі, напрыклад, над ганачкам вісела фанерная дошка з наклеенай газетай, а на ёй фіялетавым чарнілам было выведзена: «Пачатковая школа».

У канцы лета І949 года і пачатку зімы 1950 дадалася яшчэ кампанія арганізацыі калгасаў. Кампанія тая праходзіла ў атмасферы, як цяпер прынята называць, жорсткага казарменнага падпарадкавання і тэрору. Ані крыху не лепш, чым апісана ў Барыса Мажаева ў яго «Мужыках і бабах».

Ішоў тыдзень за тыднем, а варожыя адносіны людзей да яе не змяняліся: сяляне хаваліся, калі арганізатары ў вёску ехалі, увільвалі, прыкідваліся дурнымі і глухімі. Што ж, нашаму мужыку ўласцівы практычны розум. Калі ён бачыць, што справа вартая, не пашкадуе ні сябе, ні сям'і і не толькі стане ў ёй з запалам дзейнічаць – жылы з сябе ды сваіх дзяцей стане цягнуць. Але калі ўбачыць, што яго водзяць за нос, то прыкінецца глухім, дурным і хворым. Толькі часамі надта злоснай і кароткай рэплікай, затое вельмі трапнай, выкажа свае адносіны. Але зрушыць яго ў такім выпадку з прынятага рашэння амаль немагчыма.

Адным словам, справа ў арганізатараў застапарылася, працэнт абагуленых гаспадарак усё быў невялікі. Сяляне не давалі заяваў, як ні распісвалі для іх, несвядомых, райскае калгаснае жыццё сродкі масавай агітацыі і прапаганды цераз радыё, газеты і лектары з абласнога цэнтру і з Менску. Не дапамаглі ўздзеянні, ні прамыя, ні ўскосныя. Зрэшты, яны былі самыя недарэчныя.

Аднойчы з нашага педінстытута прыехаў чытаць лекцыю на сяле выкладчык Корзін. Мяне паслалі яго суправаджаць, берагчы ад бандытаў ды самому вучыцца ў вопытнага прапагандыста, як гутарыць з народам.

Спачатку госць з трыбуны ў захудалай хаце-чытальні закляйміў

несвядомых пісьменнікаў, якія, замест таго, каб маляваць у сваіх кніжках звеннявых па кок-сагызу, выводзіць цялятніц, старшынь калгасаў альбо гераічных сакратароў райкамаў, усё імкнуцца апісаць жахі вайны – цягнуць у мінулае.

Аблаяў украінскага паэта Сасюру за нацыяналістычны верш «ЛюбіУкраіну». Заадно пакрытыкаваў Максіма Танка, які, бачыце, цягне туды ж. Параўнаў Танка з украінцам – «падсасюрыў», як тады называлася. Аблаяў акадэміка Мара за антысталінскую канцэпцыю паходжання моў. Абліў граззю план Маршала, які на нашых вачах пераўтвараў Заходнюю Еўропу ў амерыканскую калонію, меўся, нягоднік, з еўрапейцаў вось-вось парабіць новых нявольнікаў ды смактаць з іх кроў. Нарэшце, раскрытыкаваў ушчэнт бязродных касмапалітаў, фармалістаў і на гэтым рэгламент вычарпаў.

Лекцыю тады абавязкова трэба было ўвязаць з бягучым момантам, існаваў цэлы такі рытуал, ім шырока карысталіся, інакш – вартасць лекцыі зводзілася да нуля. Толькі лектару брудную работу самому выконваць не хацелася. Корзін даў магчымасць выказацца мужыку-актывісту з тых, якія любяць выступаць пры кожным выпадку, а ў часы выбараў у мясцовы Савет ужо з ночы займалі чаргу перад выбарчым участкам прагаласаваць першымі, каб іх прозвішчы ў наступны дзень красаваліся ў газеце, гучалі па радыё, а самі яны маглі хадзіць гогалем.

У той час наверх вылезла надта многа розных лайдакоў, дэмагогаў, п’яніц і прайдзісветаў, што не любілі працаваць, затое, трымаючы нос па паветры, ведалі, як быць на добрым ліку ў начальства.

Ух, як яны ўмелі гэтым карыстацца!

Танклявы ды самаўпэўнены дзядзька з такой пароды балбатуноў і прайдзісветаў сказаў прыкладна так:

– Мой сусед, Мікодым, касмапаліт таксама.

Корзін яму падыграў:

– Ну-у, што ты кажаш, Франак? Не можа такога быць!

– Касмапаліт, таварыш лектар, і яшчэ які, я добра ведаю, калі гавару!

– А чым ты пацвердзіш?

– Бо касмапаліты жывуць за граніцай, так?

– Ну, так.

– І яны супроць савецкай улады ды калгасаў, так?

– І гэта верна.

– А наш Мікодым заявы ў калгас не падае, хоць жыве тут, бо такі самы касмапаліт і антысаветчык!

У вачах лектара і прадстаўніка райкама, які прыехаў з намі, я заўважыў захапленне і зразумеў, што, паводле іх меркаванняў, дзядзька з «бягучым момантам» «увязаў» здорава – у самую кропку трапіў.

Адным словам, мужыкі ўпарціліся.

Тады надта разумнае наша начальства складаную сацыяльную структуру сапоцкінскай зямлі, народжаную вопытам многіх пакаленняў, правераную не раз жыццём, стала падганяць пад свае бюракратычныя каноны.

На саўпартактыве яно нам аднойчы аб’явіла:

– Нашыя мужыкі занадта добра жывуць, каб ісці ў калгас!

На сваіх хутарах яны – як паны! Не намнога горай жывецца ім і на вёсках! Бо зашмат тут кулакоў розных ды падкулачнікаў, таму і рэзультат нашай кампаніі марны! А хто лясных бандытаў корміць? Таксама яны! Заплываюць самі тлушчам, кароў і свіней кормяць садавінай, а мы з вамі не можам нават яблычка дзецям купіць!

З залы начальству пачалі падтакваць:

– Узяцца за іх трэба як след!

– Распанелі ўсе!

– Прыціснуць трэ іх як належыць!

– Як ва ўсходніх абласцях прыціснулі! Там наваліліся на іх гэтак, што аж запішчалі!

– Во, зробім гэтак, і нашыя ў калгас пабягуць як міленькія!

– Шчэ прасіцца будуць!..

Трэба было бачыць тыя кволыя халупкі з саламянымі стрэхамі, абкружаныя хлеўчыкамі ды гуменцамі, праз гнілыя бярвенні якіх выцякаў не тлушч на падворкі, а гной, тыя няшчасныя нівы, прымітыўную абстаноўку бедных хацінак, каб зразумець бязглуздасць вывадаў бюракратаў.

«Жывуць – як паны!» – падумаць жа такое.

Але дыягназ мясцовымі ўладамі быў пастаўлены. Кропка. Патрэбна было толькі рашэнне самага высокага начальства. А яно пажадала ўсё бачыць уласнымі вачыма.

## Нечаканы візіт

Цёплым вясновым днём 1950 года, калі яшчэ месцамі ў ямах і барознах белягцеў снег, але падагрэтае паветра напаўняў сярэбраны звон жаўрукоў, прыбыло высокае начальства ў спаленую амаль датла немцамі, прытоеную між узгоркаў ля заходняй граніцы мясціну – у гарадскі пасёлак Сапоцкіна. У кабінет першага сакратара райкама

сталі па чарзе выклікаць раённых кіраўнікоў для гутаркі.

Падымаўся я да іх на другі паверх, а сэрца маё было ў пятках. Галоўнай прычыны таго развалу, неразбярыхі і лютай бессардэчнасці, якія нам цяпер аж надта відочныя з апублікаваных матэрыялаў, я тады поўнасцю не разумеў. Многія думкі, якія я зараз выказваю, прыйшлі да мяне значна пазней. Тады ж ува мне сядзеў закаранелы комплекс Сталіна, які, паводле майго глыбокага пераканання, абсалютна не ведаў, што творыцца пад яго іменем.

Цяжка сабе нават і ўявіць, як комплекс той валодаў мною і падпарадкоўваў.

Аднойчы на бюро райкама партыі я адстойваў свае пазіцыі.

Адстойваў горача, упарта і доўга. Калі вычарпаў усе доказы і аргументы, кінуў членам бюро казырнога туза:

– Я глыбока перакананы, калі б тут зараз сярод нас прысутнічаў сам таварыш Сталін ды ўсё слухаў, ЁН бы мяне напэўна падтрымаў!

Жарты, я прыпадобіўся да мудрага Правадыра ўсіх народаў! Як гэта так: «калі б ЁН тут быў»? А чаго таварышу Сталіну тут быць? Калі б і выдарылася такое, ці ж ЯМУ гутарыць ды слухаць гэткага замухрышку, як загадчык Сапоцкінскага аддзела народнай асветы? У таварыша Сталіна мала глабальных клопатаў?..

Але, відаць, у маёй інтанацыі было столькі шчырасці і перакананасці, што мой аргумент у прысутных на секунду выклікаў штосьці падобнае на чалавечую ўсмешку. За сказанае мяне потым нікуды не цягалі і не папракалі нават. Толькі некаторыя паглядзелі на мяне, бытта ўпершыню ўбачыўшы, а ў вачах іхніх чыталася: «Ты глядзі які! Ну, але што ты зробіш – «заходнік».

Неяк у мой кабінет зайшоў муж настаўніцы – афіцэр пагранвойск, грузін. Ён здаўся мне да таго падобным да вядомай АСОБЫ, што, калі яшчэ і загаварыў з такім акцэнтам, ногі мае падкасіліся, і я вымушаны быў сесці. Потым дні тры хадзіў з адчуваннем, бытта мускулы мае праняло токам.

Ці мушу пасля гэтага казаць, што ўсе тыя злачынствы і недарэчнасці, якія не мог не бачыць і я з псіхікай абмежаванага сектанта, не звязваў з асобай Мудрага Правадыра ўсіх народаў і Настаўніка чалавецтва?

Вось у чым была трагедыя таго чалавека!

Праўда, на дне душы штосьці ўжо адкладвалася – ішоў працэс назапашвання матэрыялаў, каб майму светапогляду неўзабаве ўзняцца на новую вышыню ды набыць іншую якасць.

Адным словам, ішоў я па сходах з верай у таварыша Сталіна ды з глыбокай перакананасцю ў слушнасці яго дзеянняў. Па дарозе

спаткаў не менш дзесяці маёраў, падпалкоўнікаў і палкоўнікаў, якія мяне як бы перадавалі з рук у рукі. Усе былі чамусьці замухрышкаватыя, дробныя ростам, з гнуткімі спінамі ды з такімі пажаванымі тварамі, што ў гэтым я ўлавіў для сябе кепскі знак.

Зрабілася яшчэ больш не па сабе. Але выйсця не меў, мусіў ісці.

Тым часам нават дзверы адчыніў мне палкоўнік. Пры гэтым ветліва сказаў:

– Сюды, калі ласка!

Такой пашаны я яшчэ не меў.

## Вырадак

Начальнікаў у кабінеце было трое. Адзін з іх – надта высокі, сялянскага складу мужчына ў вышыванай кашулі і ў новым касцюме, які тапырыўся на ім.

Знаходзіўся там і да смешнага маленькі, але жыватасты генерал-грузін з малінавымі лампасамі.

Трэцім быў старшыня нашага райвыканкама – Аляксандр Вінаградаў.

Калі я пераступіў парог, генерал, пырскаючы слінай, перасыпаючы сваю мову адмысловай мацяршчынай ды з моцным каўказкім акцэнтам, роў на нашага Вінаградава – чалавека сумленнага і ўсімі паважанага:

– Почыму ў тэбэ па раёну выяўлена толкі 37 кулацкіх сэмэйстваў, когда ў Воранаўскім раёне – 100?! Почыму такое безобразые? Отвычай мнэ?

Вінаградаў маўчаў, і ён залямантаваў яшчэ мацней:

–Хто тыбэ давал права скрыват іх ад нашай партыі, отвычай!

–...

–Тэбэ тожы аны купылы?

–...

–Маўчыш? Нычога нэ кажыш? Так я з тыбэ пыл зраблу!

І зноў – мат-перамат. Ды слінай цераз шчыліны ў пярэдніх зубах надта ж лоўка – цырк!

Пузатая качулка шалёна пабегала па кабінеце, пабегала, лаючыся, пагражаючы і гэтак плюючыся, тады шалёна шлёпнула задам на канапу ды імгненна заснула.

Такое дзіва я бачыў першы раз у жыцці.

Выяўляецца, да нас у раён завітаў Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Васіль Казлоў і міністр НКУС Лаўрэнці Цанава – беларускі Берыя.

Пакуль качулка на канапе хвіліны дзве храпла, а Вінаградаў адыходзіў ад агаломшання, Васіль Казлоў цярпліва ды ветліва, што прагучала вялікім кантрастам, пачаў мяне распытваць пра сітуацыю ў раёне. Я, вельмі цяжкі на словы, доўга збіраўся з думкамі, каб пачаць тлумачыць складанасці сапоцкінскай зямлі.

За гэты час генерал, гэтаксама імгненна прачнуўшыся, усхапіўся з канапы і, бытта мы даўно знаёмыя, перасыпаючы ўсю сваю мову матам-пераматам, віртуозна цыркаючы слінай, пачаў ужо раўці на мяне. Ва ўсё горла.

Роў за тое, што мой бацька ўдзельнічаў у імперыялістычнай вайне 1914-1917 г., але не быў у Чырвонай Арміі, што перад другой сусветнай меў многа зямлі.

Што дзед за царом служыў лесніком. Што дзядзька Мікалай знаходзіўся ў польскім войску. Што нават маё знаходжанне ў партызанах нічога не дае, віны не здымае, бо аж такая чорная пляма кладзецца на ўсе пакаленні маіх нашчадкаў. Зыходзячы з усяго гэтага, паводле генерала, я – варожы элемент, які выпадкова апынуўся ў савецкім партыйным актыве, але ён мяне таксама скрышыць у парашок.

Усё гэта гаварыў, а я маўчаў. Упершыню, мабыць, у маёй галаве менавіта ў той вясновы дзень з’явіліся, нарэшце, здаровыя прасветы. Ачуняўшы ад жывёльнага страху, я памалу набываў другое дыханне ды пачынаў штосьці кеміць, аналізаваць, цвяроза разважаць.

Міністр НКУС БССР і далей засынаў[8], уставаў, брызгаў слінай, мацярыўся ды заміраў на канапе на хвіліну–другую. А я, слухаючы яго вульгаршчыну, нават парыруючы асобныя выпады – надта спакойна, разважліва, з годнасцю, – падсвядома ўспамінаў вышэйшых афіцэраў, якія стваралі жывы калідор, што вёў у кабінет другога паверха да гэтай пачвары. Параўноўваў тых бязлікіх маёраў, падпалкоўнікаў ды палкоўнікаў з іхнім шэфам і прыходзіў да цвёрдай высновы: толькі вось такія бесхрыбетныя цэрберы, чалавечае шмаццё, заменкі, як казалі ў гэткіх выпадках у маім Страшаве, вырадкі і могуць служыць гэтай пачвары. Вось і служаць. І ты бачыш, колькі іх прыладзілася ў цёплае месца? Так-то яно так, але ж міністр Л. Цанава на самым версе. Ён ва ўсіх на віду. Яго дакладна і Там бачаць. Прынамсі, не могуць не бачыць! Казлоў вонкава паводзіць сябе прыстойным прастачком, але ж ці не маска ў яго такая? Ён жа і брывом не павёў, каб хам гэты прыкусіў язык!

Не хацелася, а вымушаны быў прыйсці да пераканання, што такога тыпа, як Цанава, трымаць можа толькі той, хто сам не далёка адышоў альбо ў каго злачынныя намеры.

Вінаградава знялі адразу. Праз пару дзён у яго кабінеце з’явіўся магутны целам весяльчак Пазухін – былы кавалерыст, які надта любіў анекдоты.

Цяпер па справе да новага старшыні райвыканкама лепш было не заходзіць. Займацца работай ён не меў калі. У яго пракураным наскрозь кабінеце вечна стаяў жарабцовы рогат. Зубаскал Пазухін шчыра лічыў, што сваімі недарэчнымі жартамі людзей робіць шчаслівымі. І так ён быў у гэтым перакананы, што напомні яму пра тое, што робіцца вакол, ён шчыра дзівіўся: ты пра што, чалавеча?!

Дый анекдоты любіў нясмачныя. Я вытрымліваў толькі адзін-два. Затым зграбаў свае паперы і ад такога кіраўніка даваў без аглядкі драла. Ён жа наўздагон мне крычаў з расчараваннем:

– Карпюк, стой, ты куды-ы?! Паслухай яшчэ, як мы аднойчы ў Венгрыі коней віном напаілі і што з гэтага атрымалася!.

## Новая расправа з вёскай

Пасля таго, як з Сапоцкіна ад’ехаў картэж чорных урадавых «лімузінаў» ды «вілісаў» з энкэўсаўцамі, у раён неўзабаве прыбылі грузавікі. А машыны тыя, бензін, імі патрачаны, так былі патрэбныя ў той час для разбуранай гаспадаркі! Не для дабра машыны з’явіліся.

Спецыяльныя атрады войск МУС – адкормленыя, маладыя бычкі, таксама вартыя прымянення для больш карыснай справы, узяўшы за панятых няшчасных настаўнікаў (многія педагогі, напэўна, да сённяшняга дня бачаць жахлівыя сны ды чуюць той жаночы лямант), прыступілі да злачыннае справы.

Як і па іншых раёнах, так і вакол Сапоцкіна дзесяткі найбольш талковых мужыкоў, а таксама рэшткі млынароў, кавалёў, стэльмахаў і нават краўцоў – усіх, хто не трапіў пад вываз перад вайной, – з малымі дзецьмі ды са знямоглымі бабулямі і старымі адарвалі ад родных каранёў, каб везці на станцыю Ласосна ў Гародне. Па вёсках, як у 1940-1941 гадах, зноў узняўся плач і лямант звар’яцелых мацярок.

На гэты раз выйшаўневялікі канфуз. Селіванаўскія вучні пятых-дзесятых класаў нечакана нарабілі сотні рагатак і давай з-за платоў пуляць па ахове каменьчыкамі. Так падлеткі ўвайшлі ў смак, што ім ніхто не мог даць рады. Змагаліся з хлопчыкамі дзень, два. Нарэшце, каб салдаты не засталіся без вачэй, НКУС даў каманду – далей вывозіць толькі ноччу. А мяне, як загадчыка райана, на бюро райкама партыі аблаялі, што настаўнікі сваіх вучняў не выхоўваюць у духу Паўліка Марозава.

Не ведаю, як хто, а я ў душы хлопчыкамі з рагаткамі ганарыўся. Бяздушныя акупанты адчулі хоць і малы, але ўсё ж такі пратэст.

На ласасянскай станцыі людзей заганялі ў таварныя вагоны з калючым дротам на акенцах – дакладна ў такія вагоны, якімі немцы вазілі нашых палонных, – ды, як і 1940-1941 гадах, усіх адправілі ў тую самую Сібір ды Казахстан.

На гэты раз кампанія вывазу расцягнулася на добры тыдзень. Энкэўсаўцы цяпер не спяшаліся, усё падлічвалі ды прыкідвалі. Каб па колькасці вывезеных не адстаць ад іншых раёнаў, новае сапоцкінскае начальства сем'яўдля вывазу дабавіла. Спехам створаная Пазухіным камісія прайшлася па вёсках яшчэ па некалькі разоў. У каторага дзядзькі выявілі новую шафу альбо пакрытую дахоўкай хату. А яшчэ лепш, калі Пазухін у агародчыку ўбачыў з дзесятак вулляў, іх уладальніка таксама запісваў у кулакі. Дзядзьку тэрмінова ладавалі з манаткамі на грузавічку ды пасылалі наўздагон іншым.

Як гэта, з пункту гледжання сённяшняга дня, выглядае ўсё дзіка і не па-людску! Многія ж у той час, каб супакоіць сваё сумленне, у гэтай дзікай акцыі – фактычна, генацыдзе свайго народа – нават стараліся знайсці нейкі сэнс. І знаходзілі некаторыя таму жаху апраўданне.

## Скуткі візіту Цанавы

Пасля такой «акцыі», якая да твару былі толькі лютаму акупанту, а не тым, хто прынёс вызваленне, на бедных сялян напаў гэткі страх, ад якога нават у генах, відаць, адбываюцца перамены. Хутаране нагвалт разбіралі свае трухлявыя халупкі, гаспадарчыя будынкі ды пераваракалі іх у вёску, а вяскоўцы, хто застаўся нявывезеным, зараз жа паперлі ў калгас заявы. Народ адразу перамяніўся. На сходах цяпер той самы мужык, які яшчэ нядаўна сем разоў падумаў бы перад тым, як выказацца па якім-небудзь пытанні ды прагаласаваць «за», цяпер у любым выпадку цягнуўугару руку. А наогул – стаіўся, маўчаў, упаўшы ў якісьці анабіятычны сон, бы тая кузурка на зіму.

А ўсе газеты, радыё цяпер сталі аж захлынацца ад пераможных рэляцый. Вось дзе ілжывасць была ўзведзеная да нябёс! Газеты і радыё ўсяму свету дружна абвяшчалі аб небывалым росквіце вёсак Прынёманшчыны і росце свядомасці іх сялян. Аб «здзяйсненні волі народа і партыі ў галіне сельскай гаспадаркі». Аб «бязмернай любві народа да Правадыра і Настаўніка за яго мудрую і чалавечную палітыку, накіраваную толькі на шчасце народа». Размалёўвалі ды кляймілі лютых капіталістаў, якія вартуюць днём і ноччу, каб у

савецкага чалавека адабраць шчасце.

Пасада загадчыка райана – малапрыбытковая і не з лёгкіх. Таму, хоць аблана меў катэгарычны загад неадкладна замяніць, як Вінаградава, і сапоцкінскага загадчыка аддзела народнай асветы, задачу выканаць было няпроста: не маглі падабраць іншую кандыдатуру. Справа цягнулася, пакуль я сам сабе не дапамог – выступіў з адчайнай прамовай на партактыве, якую падрабязна апісаў ужо ў «Маёй Джамалунгме».

Знялі мяне з працы аж вясной 1951 года. А пакуль што я з кіем у руцэ (бо тэрор, як вядома, нараджае тэрор, і, асабліва пасля апошняй вывазкі, з-за «бандытаў» ноччу па вёсцы надта проста маглі прыстрэліць «лясныя людзі» як лішняга сведку; таму пасля заходу сонца з Сапоцкіна і нос высунуць было страшна!) крочыў днём па вёсках і з жахам назіраў вынікі кіравання краінай Мудрым Правадыром і яго камандай. Яшчэ ў пачатку трыццатых, падсумаваўшы вынікі калектывізацыі, Сталін самаўпэўнена сцвярджаў, што «...цяпер сяляне патрабуюць клопатаў ды разумнага кіраўніцтва не ад сябе, а – ад старшынь калгасаў».

Які знайшоўся добразычлівец, скажыце, калі ласка! Прафесія селяніна, калі ўвогуле можна назваць яе гэтым казённым словам, не без рызыкі і патрабуе творчага падыходу да жывёлагадоўлі, земляробства. Яна вымагае вопыту пакаленняў і нават не абы-якой інтуіцыі. А ў камандна-адміністрацыйным рэжыме з вынаходніка, эксперыментатара, селянін адразу пераўтвараецца ў паслухмянага папіхайлу.

Наш мужык сам мог не паесці і дзяцей часта трымаў напалову галоднымі, але, напрыклад, конь у яго быў як звер – адкормлены, сыты. Так праяўлялася сялянская душа селекцыянера, паэта, вынаходніка і творцы. Пазбыцца гэтага ён згадзіўся б хіба толькі развітваючыся з жыццём.

Падумайце, раптам знайшоўся мудрэц, які няпрошана ашчаслівіў дзядзьку: усё гэта адняў, а, каб селянін з месца на месца не раязджаў, шукаючы лепшай долі, яшчэ пазбавіў яго нават пашпарта.

Страх, як безадказна сталінскія бюракраты тады сябе паводзілі. Ігнаравалі прасцейшую ісціну: калі і бярэшся за калектывізацыю, ствары хоць сякі-такі фундамент, падрыхтуйся да гэтага.

Без матэрыяльнай і кармавой базы, без кваліфікаваных спецыялістаў для вядзення калектыўнай гаспадаркі абагуленыя свінні, быдла, авечкі ды коні пачалі пагалоўна здыхаць...

Страшная бяда навалілася на Прынёманскі край! Каля Ласосна

аднойчы я назіраў такую кабылку ў адхоне. Яна ляжала трыбухом уверх. Да яе капытоў была прымацавана паперка, вырваная з вучнёўскага сшытка, з надпісам: «Няма фуражу, задрала ногі дый ляжу!»

А тыя кароўкі, што засталіся, ад бяскорміцы не маглі трымацца нават на нагах. Даводзілася іх падвязваць на вяроўках да бэлек, аб чым мясцовыя людзі дагэтуль толькі чулі, але не давалі веры, што бывала так перад вайной на Смаленшчыне, пад Курскам, Разанню і Саратавам.

Не ратавала быдла і салома з дахаў, якія на маёй Гарадзеншчыне для гэтага ўжо не абдзіралі, а хлявы і гумны не вышчараліся гэтак крыкліва аголенымі кроквамі да латамі, прынамсі, з часоў нашэсця шведаў.

Такім чынам, гінулі ў галодных пакутах коні – той самы гонар нашага селяніна. Асабліва пачалі здыхаць, калі з-за антысанітарыі напаў на іх яшчэ і сап.

Не стала раптам гною, і няўгноеная ніва збяднела, стала даваць мізэрны ўраджай.

З рынкаў знік сялянскі гандаль. Цяпер у мястэчках можна было ў магазінах купіць толькі солі, цукерак-падушачак, мыла ды запалак – тое, што прадавалася ў крамах, а рынак знік. Да 1939 года, вёскі нашыя атакавала прага «абноўленых ікон», апісаных мною ў іншых творах. Цяпер, як калісьці іх праваслаўныя аднагодкі, імкнучыся да ілюзорнага цуду, сапоцкінскія полькі то там, то сям абвяшчалі аб абнаўленні Маткі Боскай, святой Барбары, збягаліся да іх, бы на пажар, ды ўсё маліліся, маліліся, маліліся.

Ва ўрадавых колах задумацца над з'явай не было каму. Пакуль энкэўсаўцы цягалі гаспадынь «абноўленых ікон», заводзячы на іх крымінальную справу, сродкі масавай агітацыі ды прапаганды і далей аж захлыналіся ад пераможных рэляцый ды заклікаў цераз розныя пачыны, размаітыя сацспаборніцтвы дамагчыся яшчэ большых поспехаў.

І чым толькі людзям не мыдлілі вачэй!

Апісвалі лесаахоўныя палосы, што стануць для ўраджайных палёў на поўдні надзейнай заслонай ад сухавеяў. Для беларусаў размалёўвалі «аграгарады», якія бытта бы вось-вось вырастуць, замест нашых вёсак, ды таксама пераўтвораць усіх у багацеяў.

Друкаваліся схемы вялізных і даўжэзных каналаў, якія з краю ў край парэжуць чарназёмныя землі СССР, стрымаюць ліўневыя воды і адораць нівы вільгаццю.

Абрабаваным, адарваным ад зямлі і быдла, раптам збяднелым,

пазбаўленым свабоды дзейнасці, напалоханым людзям падрабязна размалёўвалі тэхнічныя дадзеныя экскаватараў грузапад'ёмнасцю на 3, на 5 і нават на 15 кубаметраў пяску і тое, якія каналы яны будуць капаць.

Але ні адзін чалавек тае пісаніны ды выступленняў па радыё ўжо ўсур'ёз не ўспрымаў. Чыталі ў недаўменні, слухалі ды ківалі галовамі, тоячы на ўсё сваю думку.

Аднойчы каля Селіванаўцаў я на ўзгорку ўбачыў засеянае бульбай поле. Яно было надта ж недагледжанае. Я з абурэннем сказаў спадарожніку, пажылому селяніну:

– І навошта было піхаць бульбу тут, у чысты пясок без гною? Ад сонца ён ужо цяпер гарачы, як прысак, і яе папячэ! Тут жа бульбы і на дзесяць цэнтнераў з гектара не збярэш!

Селянін з горкай усмешкай супакоіў:

– Нічога, сынок, радзіво дабавіць!

Калі б цяпер пакапацца ў навуковых працах пасляваенных гадоў, то, я ўпэўнены, без ніякай цяжкасці колькі хочаш знойдзеш такіх, дзе з запалам апісваецца той перыяд як час бурлівага развіцця сельскай гаспадаркі на Прынёманшчыне. Маўляў, стымул такому росквіту дала супольная калектывізацыя ды знішчэнне праклятага ворага сялян – класа кулакоў і падкулачнікаў.

Мабыць, у гісторыі краю не знойдзеш больш падобнага выпадку, каб свая ўлада, бытта бы праяўляючы клопат аб вёсцы, аж так разбурала яе ды рабіла людзей няшчаснымі жабракамі. Гэтак прыкладна выглядаў той катаклізм зблізку, калі апавядаць пра яго збольшага. Не бачыць тае трагедыі мог толькі фанатык-сталініст альбо тып, на якім «крэста нет». Між іншым, апошнія, калі нас потым яшчэ захліснула і «эпоха застою», расквітнелі пышным квеццем.

Але я пачаў ужо не пра тое.

Вось такая была сітуацыя. У маім сапоцкінскім жыцці што мне заставалася рабіць, як ні таіць у душы бунт, так і гэтак разбіраючы тое, што пачуў і ўбачыў. Фактаў для гэтага жыццё падкідвала ўсё больш.

Напрыклад, выклікалі мяне ў райкам, далі тэкст са словамі не каго-небудзь, а самога Леніна, прыкладна такога зместу: «Наша задача цяпер, калі ўладу ўзяў сацыялістычны ўрад, – усюды арганізоўваць сацыялістычнае спаборніцтва».

Мне загадалі цераз настаўнікаў раёна наладзіць гэтае самае спаборніцтва паміж калгасамі. Рабілася смешна, калі падумаў, як да гатага падступіцца. У спаборніцтве – элементы чагосьці нясціплага і паказнога, а нашаму народу гэта зусім чужое.

Хіба ж мог я сабе ўявіць бацьку, які заходзіць да суседа і аб чымсьці такім абʼяўляе ўголас? А калі б наш сусед здурэў і выклікаў бацьку сам на спаборніцтва, то мой стары толькі ўсміхнуўся б сабе ў вусы ды хмыкнуў бы:

– Ну, вядома, ты мяне абгоніш, я ведаю! Э-э, куды мне з табой цягацца!

Затое восенню, атрымаўшы ўраджай куды лепшы, усё гэтаксама маласлоўна і з той жа хітраватай усмешкай апраўдваўся б:

– А ты ведаеш, сам не разумею, як гэта ў мяне атрымалася!

Інакш сябе паводзіць мой бацька, як і кожны наш селянін, быў не здольны – тады ён не быў бы беларусам.

Самае прыкрае, што я, разумеючы ідыятызм гэтай усёй задумы, вымушаны быў загад выконваць. Праз дырэктараў школ абавязаў настаўнікаў спаборніцтвы такія арганізаваць і кожны месяц даваць справаздачы аб іх рэалізацыі. Рабіў усё гэта я, а на душы было пагана.

З гэтай прапагандай заўсёды атрымлівалася не па-людску. Калісьці да нас, членаў камсамола Заходняй Беларусі, прыбывала прапагандысцкая літаратура з СССР. І многа яе прыходзіла. Я быў хлопцам дасціпным, мяне ўсё цікавіла, асабліва – друкаванае слова. А ў сваёй ячэйцы якраз мне і даручылі падпольны друк. Ён выходзіў на мелаванай паперы экстра-класа і меў прыгожы шрыфт. Такія паперкі з літаркамі прыемна было нават браць у рукі. Пакуль такую брашурку аддаць каму, я заўсёды браўся прачытаць яе сам. Але ж тэкст у ёй напісаны быў такой дубовай мовай, што з першай старонкі хіліла на сон.

Памятаю, ніякай сілай волі не мог сябе прымусіць дачытаць такую брашурку да канца – хоць бы адну.

У падполлі практыкаваліся маёўкі. Сыходзілася на іх да паўсотні сялян. На іх вельмі заканспіраваныя асобы чыталі лекцыі. Звычайна гэта адбывалася ноччу ў лесе альбо ля балота ў хмызняку. Твару лектара ніхто не мог разглядзець. Толькі было вядома, што з-за нашай маёўкі ён спецыяльна прыбыў цераз граніцу з СССР. Тэмы лекцый былі розныя, затое адбываліся заўсёды аднолькава.

Вось чалавек пад сасной роўным і гладкім голасам начынае нам выкладаць як па пісаным работу Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Твор яго я потым ледзь змог адолець у інстытуце з дапамогай выкладчыкаў, а што гаварыць пра неадукаваных слухачоў-сялян. Сядзелі яны, не кумекаючы ані слова, і ўпіваліся мудрагелістымі рускімі фразамі. Пакуль заснуць, па-дзіцячы шэптам дзівіліся:

– Ай, смаліць, ты чуеш?

– О-о, яшчэ як! Каб прывёў сюды нават ксяндза, бацюшку ці войта – і яны нічога не зразумелі б!

– У Саветах амаль кожны такі вучаны!..

А выклік тых 50 сялян слухачоў у лес ці на балота з паролямі, з далёкай дарогай спалучаны быў яшчэ са страшэннай небяспекай – кожнаму ўдзельніку таго збору пагражала 5 гадоў. Каб хоць якая карысць была ад такога мітынгу! Ён быў патрэбны, толькі каб той, хто за гэта адказваў у верхніх эшалонах КПЗБ, мог паставіць птушачку, што праведзена яшчэ адно мерапрыемства, як і гэта спаборніцтва паміж калгасамі. Па аналогіі прыпаміналася наша прапаганда сярод варожых войск у другую сусветную вайну.

У 1942 годзе каля Вялікіх Лук для немцаў быў наладжаны гэтак званы Дзямянскі «кацёл». Дзевяць дывізій праціўніка там трапілі да нас у акружэнне. Мне давялося пазнаёміцца з улёткай, якую нашая контрпрапаганда пры дапамозе авіяцыі рассейвала сярод акружаных немцаў.

На сінім лістку маленькімі, як макавыя зернеткі, літаркамі было казённай тарабаршчынай сказана аб неўміручым вучэнні марксізму. Сярод гэтых літарак праз кожныя дзесяць слоў віднеліся надрукаваныя вялізным шрыфтам словы: Маркс – Энгельс – Ленін – Сталін, Маркс – Энгельс, Ленін – Сталін. Наўрад ці хоць аднаму немцу хапіла цярпення дачытаць той шэдэўр савецкай публіцыстыкі да канца!

Аднойчы мне трапіла ў рукі ўлётка, якую вораг рассыпаў з самалётаў на нашыя войскі каля Умані (Украіна). На ёй віднеўся вялізны малюнак разлютаванага Сталіна, які шуфлем бязлітасна кідаў у печ тысячы нашых байцоў, дзе яны гарэлі, як лучына. Печ лічылася сімвалам вайны. На ўсёй паперцы віднеўся толькі адзін надпіс: «Вось што чакае і цябе, Іван! Лепш падумай і з гэтай улёткай– пропускам пераходзь да нас!»

У аднаго калекцыянера я бачыў іншую нямецкую ўлётку.

Вясной 1940 года яе кідалі на пазіцыі французскай арміі. Але тут патрэбна тлумачэнне.

У трэцім эшалоне французскіх войск стаяла на тэрыторыі Францыі вялізная англійская армія генерала Патона. Англічане не прымалі ўдзелу ў баях, толькі ахоўвалі тылы.

На нямецкай улётцы віднеўся адно невялічкі надпіс на французскай мове: «Мусье, паглядзі паперку на святло!» А калі зірнеш праз яе на сонца, убачыш выразна воднымі знакамі выведзеную голую француженку ў ложку, а да яе крочыў, здымаючы на хаду

фрэнч, англійскі вайсковец. Ніжэй кідаўся ў вочы надпіс: «Мусье, не будзь дурнем! Пакуль ты гібееш у акопах, вось што хітры Тоні вычаўпляе ў тваім доме!» Ну, добра, рабіла глупствы наша прапаганда ў вайну, але ж чаму яна нічому не навучылася?!

## Частка другая

## Раздзел першы

### Усёдазволенасць

Калісьці мая дачка-пяцікласніца (цяпер урач) прыйшла надта вясёлая са школы ды пахвалілася:

– Ага, а сёння не трэба зубрыць англійскую! Была камісія, і вучыцелька пыталася ў нас па старым уроку, бытта мы праходзілі яго ўпершыню! Усім пяцёркі паставіла!

Дзяўчынка не вінаватая, што не бачыла ў гэтым выпадку нічога заганнага, а толькі смешнае. Стан маралі таго нашага грамадства быў аднолькавы на ўсіх узроўнях. Для нагляднасці прывяду яшчэ адзін прыклад.

ЦК ВЛКСМ абвесціў конкурс: які раён найбольш адновіць магіл людзей, загінулых у другой сусветнай вайне. З «Комсомольской правды» мне патэлефанавалі каб я тэрмінова пашукаў Быкава і папрасіў напісаць крытычны артыкул. Справа ў тым, што недзе ў Малдавіі райкам камсамола, каб узяць першынство ў конкурсе, нарабіў у лесе дзесяткі ліпавых магіл. У гадавіну вызвалення Кёнігсберга наша група пісьменнікаў-ветэранаў сустракалася з першым сакратаром Калінінградскага абкама Раманавым. Я задаю яму пытанне: «Колькі нашых салдат і афіцэраў загінула пры вызваленні Кёнігсберга ў 1945 годзе?» Раманаў маўчыць – не ведае. Тады адзін яго памагаты з абурэннем нападае на мяне:

– Мы не скажам! А гэта неістотна! Галоўнае, мы ведаем, колькі тысяч байцоў і камандзіраў атрымалі ордэны за гэтае фашысцкае логава.

Раманаў з памочнікамі адказам вельмі задаволены.

Ідзе Пленум Гарадзенскага абкама партыі. Начальнік абласнога аддзела Камітэта дзяржаўнай бяспекі выступае з сенсацыйнай заявай. Расказвае пра выдатныя дасягненні сваіх чэкістаў. Маўляў, усе яны так старанна нясуць службу, што праз граніцу мыш не праскочыць. Заўсёды ім трэба быць насцярожанымі. Напрыклад, нядаўна на кантрольна-прапускным пункце станцыі Гародня яны,

дзякуючы сваёй пільнасці, выявілі значную кантрабанду, якая б прынесла незлічоную шкоду нашай дзяржаве, калі б яны хоць на хвіліну страцілі пільнасць.

Начальнік гаворыць:

– Канадзец, нейкі Чурыла, наведаў свайго брата ў Смаргоні. Многія цяпер прыязджаюць да сваякоў. Але, як выявілася, гэты мярзотнік ехаў да нас са шпіёнскай мэтай – хацеў вывезці ў Канаду нашую зямлю, каб за граніцай змераць у ёй ступень радыяцыі. Вораг з трэскам пагарэў. Нашы чэкісты ў чамадане шпіёна зямлю знішчылі і адабралі. Уявіце сабе, таварышы, на такім вастрыі нажа мусім мы працаваць!

А я слухаў высокапастаўленага махляра, і мяне аж падмывала ад абурэння – людзі, ён брэша! У той час я быў загадчыкам агенцтва «Інтурыст» і якраз прысутнічаў пры рэвізіі чэкістамі таго канадца, які ўвесь час, пакуль яго трэслі, бездапаможна плакаў. Што здарылася? Васьмідзесяцігадовы смаргонец выехаў з бацькамі за граніцу яшчэ да рэвалюцыі. Знаходзячыся ў сваякоў у гасцях, у Смаргоні, ён з магілкі дзеда зачэрпнуў горстку чарназёму і загарнуў яго ў насоўку, каб дзеці, калі старому прыйдзе апошняя гадзіна, паклалі яму ў дамавіну.

Слухачы абураліся нахабствам канадца. Здаволены сказаным начальнік ад трыбуны зноў пайшоў займаць месца ў прэзідыуме, а мне хацелася закрычаць на ўвесь зал: «Народ стварыў байку пра дурня, які спрабаваў сваю карову завалачы на гнілую страху, каб рагуля выскубла там траву! Хіба ж шпіёны так робяць? Для вымярэння радыяцыі існуе прылада ў выглядзе ручкі да пісання, шпіён хутчэй змерае рэнтгены такім апарацікам, чым павязе пясок за граніцу!»

Аднак пустабрэха і я выслухаў ды прамаўчаў. Бо, каб заікнуўся ў абарону дзядзькі Чурылы, на мяне абрынулася б уся зала, да таго была яна абалваненая. Людзі дружна накінуліся б, чаму бяру пад абарону чужога нам па духу эмігранта, а не радуюся прынцыповасці слаўных чэкістаў!

Вось якая была сітуацыя.

Атрымаўшы належны грунт (пакорлівасць, запраграмаванасць на пэўную хвалю і запалоханасць людзей), караючы сталінскі меч бязлітасна сек галовы ўсім, хто спрабаваў выйсці за межы. Раскладанне грамадства ў застойны перыяд пайшло на ўсіх узроўнях. Гібель ды вываз самых лепшых і дастойных прывялі да прытуплення народных традыцый, дэградацыі маралі і нават змены ў генафондзе народа. З таго часу я не прыпамінаю ні аднаго кіраўніка, з якім можна было б, як з роўным, пагутарыць на маральна-этычныя тэмы,

аб літаратуры, гуманізме, – не было такіх там! Да ўлады прарваліся самыя хітрыя, самыя карыслівыя, самыя слізкія, самыя лядашчыя, самыя бессаромныя, якія ў адпаведны час здагадаліся павярнуць нос па ветры, і нармальных людзей у сваю кампанію яны і блізка не прымалі.

У другой палове шасцідзесятых выбухнула навала ўзнагарод. Спачатку ў абласной газеце з'явілася аб'ява аб узнагародзе Вярхоўным Саветам небывалай колькасці людзей ордэнамі. Затым на старонках газеты ўказы пайшлі касякамі. Стваралася ўражанне, бытта ў Маскве назбіралася замнога ордэнаў, і, каб дабро такое не марнавалася, яго жменямі пачалі раздаваць налева і направа, а то і, як жартавалі на вёсцы, раскідвалі з верталётаў.

Да якіх толькі казусаў не даходзіла з узнагародамі!

Напрыклад, наш новы сакратар гаркама партыі Уладзімір Сямёнаў, пераведзены з Менска, не папрацаваў у Гародні на сваёй пасадзе і года, а ўжо атрымаў ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

З Указа (за 1965 год) мы даведаліся, што сакратар абкама партыі па прапагандзе А.Ульяновіч атрымлівае ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга (цытую Указ) за «арганізацыю штучнага апладнення быдла», а першы сакратар абкама партыі У.Міцкевіч – ордэн Айчыннай вайны I ступені «за ўдзел у падпольным руху на Гарадзеншчыне ў часы Вялікай Айчыннай вайны». Між іншым, я набраўся нахабства, зайшоў да высокапастаўленага Уладзіміра Фёдаравіча ды з абурэннем яму заявіў:

– Вашу біяграфію, таварыш Міцкевіч, публікавалі ў газеце перад выбарамі ў Вярхоўны Савет, таму яе ўсе ведаюць. З публікацыі відаць: у часы вайны вы служылі толькі ў войсках аховы аэрадромаў у глыбокім тыле!

Не разумеючы яшчэ, куды я вяду, Міцкевіч ахвотна пацвердзіў:

– Усю вайну.

– О! – падхапіў я. – Дый кожны партызан у нас выдатна ведае, што вы на акупаванай тэрыторыі праціўніка і дня не былі – вобласць невялікая, мы ўсе адзін аднаго ведаем як аблупленага! Цяпер былыя падпольшчыкі прачыталі ў газеце інфармацыю і плююцца! Як вы маглі атрымліваць высокую ўзнагароду за перыяд акупацыі, нават не панюхаўшы партызанскага вогнішча?

Перад гэтым я сабе ўяўляў, як чалавека такімі словамі ашаламляю, як ён пачынае перада мной чырванець ды апраўдвацца тым, што выйшла непаразуменне: падхалімы перастараліся.

Нічога такога я ад Міцкевіча не пачуў.

Даволі спакойна ды гэтак жа ўпэўнена ён мне, несвядомаму,

растлумачыў, што для ваенкамата прыйшла разнарадка на ордэны толькі падпольшчыкам, а перамяніць тэкст Указа ваенкамат, як і газета, не мог, і тэкст мусілі даваць як у арыгінале.

З паводзін Міцкевіча вынікала, што такога тлумачэння павінна было быць дастаткова. Чалавек крыху нават здзівіўся, што я такі тупы і не разумею гэткай простай справы. Між іншым, потым ён мне бязлітасна за гэта адпомсціў. Калі рыхтавалі на мяне матэрыялы для выключэння з партыі, калі выключалі, менавіта Міцкевіч стаяў за кадрам усёй справы і спрытна ёю кіраваў. Рабіць гэта яму было тады зручна, бо ўжо з'яўляўся сакратаром ЦК КПБ і членам бюро ЦК КПБ. Але пад канец жыцця ён здзівіў сваёй запозненай сумленнасцю.

У 1982 годзе ў Вялікім тэатры Масквы адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, і я знаходзіўся ў прэзідыуме. Міцкевіч да таго часу захварэў невылечнай хваробай і проста з крамлёўскай лякарні прыйшоў нас праведаць. Падабраўшы адпаведны момант, ён адвёў мяне за кулісы, абняў за плечы і сказаў:

– Аляксей, даруй мне!

А тады ў кабінеце Міцкевіча дыялог наш станавіўся падобным на гутарку сляпога з глухім, і я яго абарваў.

## «Карыфеі» навук

У канцы шасцідзесятых наша абласное кіраўніцтва ў адзін час пагалоўна загарэлася ідэяй абароны дысертацый. З'ява гэтая набыла буйныя памеры.

Старшыня аблвыканкама М.Малочка, яго намеснік, сакратар абкама А.Ульяновіч ды іншыя, раптам палічылі, што для поўнага камфорту ім не хапае толькі навуковых ступеняў. Інструктараў сваіх вызвалілі ад прамых абавязкаў ды пасадзілі рыхтаваць дысертацыі.

Паручэнцы і не супраціўляліся. Іншыя нават з гонарам яшчэ і хваліліся:

– А што мне? Затое машына ў маім распараджэнні. Куды хачу і на колькі ўздумаю, еду! І сам вырашаю, калі на работу ісці, як адпачынак праводзіць. Пасля завяршэння рукапісу шэф павышэнне абяцае!

Перад абаронай патрабуецца ад прэтэндэнта, як вядома, атэстат за сярэднюю школу, дыплом аб вышэйшай адукацыі ды здача мінімуму, у які ўваходзіць і замежная мова. Атэстаты яны прыдбалі раней, дыпломы – таксама, дружна скончыўшы завочна інстытуты, а мінімум – нічога не папішаш – трэба было цяпер здаваць. А як яго здасць такі Малочка, які скончыў некалькі класаў пачатковай школы

пры Польшчы? Недалёка адышлі і астатнія.

І пры педінстытуце для такіх прарэктар Б. Фіх тэрмінова наладзіў здачу экзаменаў экстэрнам, для чаго рэктар нават вызваліў свой кабінет.

Газеты аб гэтым, як і пра многае іншае, не пісалі, таму надта квітнела вусная інфармацыя. Гараджанам у наступны дзень усё роўна стала вядома, як Малочка на экзаменах даводзіў, што вярблюдаў разводзяць на Таймыры.

Калі старшыня аблвыканкама быў маленькі і непрыкметны, то яго намеснік – буйны рыжаваты мужчына. І вось ён, на здзіўленне экзаменатарам, пры здачы на мінімум не мог наогул нічога адказаць. Сядзеў ды маўчаў. Гэты мажны з выгляду, сыты прэтэндэнт, які вальяжна разваліўся ў крэсле рэктара, на самай справе выявіўся белаavailability ручкай і чыстаплюйчыкам. Станоўчую ацэнку экзаменатары яму вымушаны былі выставіць з вялікай нацяжкай.

Прэтэндэнты паказалі смеху вартыя веды, асабліва па замежнай мове. Як выключэнне, Малочку дазволілі здаваць мову польскую. Астатнім прахадны бал выставілі па нямецкай. Памятаю, як загадчык кафедры замежнай мовы інстытута І.Чартко даравацць не мог сабе потым, што мусіў выставіць чацвёрку тым, хто нават не чуў, што такое артыкль, і ніяк не змог прачытаць адзін з іх іначай, як «дзі». Мы з Чартко якраз спаткалі на вуліцы Фіха ды спыталіся, навошта ён такіх грамацеяў піхае ў навуку. Барыс Маркавіч бойка выпаліў:

– А што? Адным дурнем будзе больш, адным менш, якая розніца? Цяпер у навуцы поўна такіх!

Усе зарагаталі, у тым ліку і я, не ведаючы яшчэ, што дома чакае мяне працяг гэтай самай справы.

Мая жонка працавала настаўніцай у адной з рускіх школ і лічылася добрым спецыялістам. У той самы дзень ёй патэлефанавалі з прыёмнай аднаго з вышэйпамянёных кіраўнікоў, маўляў, сакратарка праз хвіліну прывязе дысертацыю свайго шэфа, падрыхтаваную інструктарам (хто дысертацыю рыхтаваў, называлі тады адкрыта, не тоячыся, у гэтым быў якісьці шык!), і трэба было ў дысертацыі выправіць памылкі.

Доўга жонка мучылася над тым опусам, дзівячыся з узроўню пісьменнасці нашых чыноўнікаў. Давала яго і мне глядзець. Нудная і нікому непатрэбная тарабаршчына. Нарэшце паперы жонка аднесла ў канцылярыю. Але шэф не пажадаў нават выйсці са свайго кабінета ў прыёмную ды хоць пару слоў падзякі сказаць жанчыне.

І вось надышоў час, калі «негры» паклалі на стол шэфам гатовыя рукапісы – кампіляцыі з газет, урыўкі артыкулаў і дакладаў. І

неўзабаве тыя, хто, паводле расказаў літработнікаў абласной газеты, не маглі звязаць на паперы самастойна і двух слоў, прымушаючы самыя простыя газетныя артыкулы пісаць за іх, «абступеніліся». За выключэннем Аляксандра Ульяновіча. Нейкім чынам у апошні момант аб яго намеры даведаўся Пётр Машэраў і дарогу ў навуку бойкаму Аляксандру Восіпавічу закрыў. Яшчэ прэтэндэнта на Рэспубліканскім сходзе Пётр Міронавіч добра высцебаў.

Між іншым, і цяпер падобныя кандыдаты навук, дактары спрабуюць стварыць пагоду. Ані крыху не бянтэжачыся, што тэмы іхніх дысертацый такія, напрыклад, як «Царыца беларускіх палёў – кукуруза», «Прафсаюзы хімічнай прамысловасці БССР у барацьбе за павышэнне вытворчасці працы ў IX-й пяцігодцы», «Перамога развітага сацыялізму ў СССР», «Крызіс капіталізму» і «Нацыянальная палітыка ў СССР – гарант дабрабыту і ладу», яны ахвотна выступаюць з лекцыямі. Мала гэтага. Такія і цяпер кіруюць НДІ, ВНУ, вешаюць ярлыкі пісьменнікам і «расперазаўшымся» журналістам, на кожным кроку бачаць нацыяналістаў. Яны, вядома, на словах таксама прыхільнікі перабудовы. А на самай справе, як вобразна сказаў Алесь Адамовіч, напоўнілі шэрагі беларускай вандэі і дружна стараюцца перабудову прыдушыць. Толькі цягнік іхні ўжо адышоў. Горай тое, што паспелі такім жа шляхам «абступеніць» яшчэ і сваіх дзяцей.

Аднак вернемся да галоўных герояў.

## Баль у высокага чына

Нядаўна ў «Известиях» быў надрукаваны матэрыял аб Старшыні Вярхоўнага Савета Узбекістана Ягдар Насрэддзінавай. У ім гаварылася, з якім марнатраўствам народных сродкаў Ягдар Садыкаўна праводзіла сынава вяселле. Як мы цяпер усе ведаем, такія парадкі нярэдкія. У застойны час перараджэнне чыноўніцкай іерархіі, на жаль, захапіла ўвесь саўапарат, але я Амерыкі не адкрываю – пра гэта ўжо не раз гаварылася ў прэсе.

І нашы гора-кіраўнікі ў той час, па закону злучаных сасудаў, выдатна ведалі, што вычаўпляюць насрэддзінавы, шчолакавы і чурбанавы. Таму смела дзейнічалі па прынцыпу: калі можна тым, чаму нельга мне, тым больш што ў той перыяд на перыферыях яны былі яшчэ больш недасяжнымі для праваахоўных органаў.

Пачыналі яны з раздачы адзін аднаму лепшых кватэр, ордэнаў, арганізацыі сабе і сваім нашчадкам вучоных ступеняў, прэстыжных пасад. Апетыты ў іх раслі і, карыстаючыся службовым становішчам, перайшлі паступова да марнатраўства дзяржаўных сродкаў больш

адкрыта.

Цяпер ні адна сесія ці канферэнцыя не заканчвалася без калектыўнага балю.

Паездкі за граніцу (у ПНР, напрыклад) і прыём замежных гасцей ператварыліся ў суцэльныя п'янкі. Ганебная звычка настолькі ўкаранілася, што, калі я аднойчы на абласным актыве выказаў трывогу з-за гэтага, увесь зал высмеяў мяне як рэтраграда. Да сённяшняга дня памятаю яго ўтробнае іржанне, за якім гучала насмешка такога акцэнту: о, Карпюк так выступае, бо яму, мабыць, мала выпіць дасталося! Страх, якія набыло гэта памеры.

Напрыклад, камсамол для заканчэння канферэнцыі наняў аднойчы цэлы прафілакторый тытуншчыкаў над Нёманам у лесе. П'янка камсамольскага актыву на чале з першым сакратаром ЦК ЛКСМБ Жабіцкім (пасля стаў міністрам унутраных спраў БССР, затым зняты з пасады за злоўжыванні, рэха аб чым пракацілася па ўсім былым Саюзе!) працягвалася да раніцы. Мой знаёмы (М.Цыгельніцкі) адказны быў за мікрафоны, святло і, успамінаючы тую калектыўную распусту, плюецца яшчэ і цяпер.

## Застаў дурня Богу маліцца

Вяртаючыся цяпер у думках да тых абласных кіраўнікоў, спрабую сябе стрымліваць. Ну, праводзілі вяселлі, маючы магчымасць, ну і што? Яны ж не выхадцы з чужога класа, і кожнаму з іх, вядома, даставалася ў пару сталіншчыны, хрушчоўскага валюнтарызму і брэжнеўскага застою таксама пад завязку.

Іх бяда – бедны інтэлектуальны ўзровень. Захапіўшы высокія пасады ды атрымаўшы, як я ўжо сказаў, пераканаўчыя прыклады ад розных чурбанавых, насрэддзінавых, шчолакавых, жабіцкіх, яны таксама займелі замашкі, каб як найбольш хапаць ды жыць па прынцыпу – пасля мяне хоць патоп!

Але ж пры гэтым як яны любілі павучаць! А ўсялякі намёк на інтэлектуальнасць, глыбіню, гуманізм, імкненне дакапацца да ісціны ўспрымалі як бы за асабістую абразу. Такое ў іх спараджала буру абурэння ды абвінавачванняў: ты капаеш пад асновы камуністычнага ладу і хочаш рэстаўрацыі капіталізму. Акрылены новым значком дэпутата Вярхоўнага Савета на лацкане, М. Малочка мне, такому ж выхадцу з заходнебеларускай вёскі, як і сам, і амаль аднагодку, пры спатканні вока на вока «па-сяброўску» падказваў, што знаходжуся не на правільным шляху, не ўмею жыць. Раіў браць прыклад з яго. Я ж прыглядваўся да чалавека і не мог уцяміць: жартуе ці кажа ўсур'ёз.

Зямляк мой вырашыў аднойчы ашчаслівіць аднавяскоўцаў. Родам ён з беднай вёсачкі Плецянічы Зэльвенскага раёна. Мясцовасць, напэўна, названа ад беларускага дзеяслова – плесці. Назва паходзіла хутчэй ад рамяства жыхароў, якім у даўнія часы займаліся, – плялі, мабыць, рыбалавецкія прычындалы і торбы. Але зразумець гэтыя прамудрасці новаспечанаму вучонаму сельскагаспадарчых навук было не пад сілу. Назву палічыў абразлівай. Звязана, маўляў, з праклятай народам «плетью» (а гэта чыста рускае слова, яно ў нас аніяк не магло пусціць такія карані, каб паслужыць для назвы вёскі!), якой шчодра карысталіся паны і памешчыкі. Дык няўжо і цяпер яе славіць?!

Маючы даную яму народам уладу, Малочка рашэннем выканкама назву замяніў на Чырвонае сяло.

Але ўдзячнасці ад землякоў усё роўна не атрымаў. Калі неўзабаве прыехаў на радзіму для сустрэчы з выбаршчыкамі і з трыбуны хваліў савецкую ўладу, што яму, маўляў, з былога батрака і пастуха дала магчымасць вырасці да «чырвонага губернатара» (цытата з яго прамовы ўклубе!), несвядомыя аднавяскоўцы так і не змаглі ацаніць належным чынам яго грамадскі ўчынак і пракалолі высокапастаўленаму земляку ў «Волзе» ўсе чатыры колы.

## Мяняліся людзі на вачах

Найбольш мяне дзівіла метамарфоза з І.Мікуловічам. Гэты вясковай закваскі, бытта бы і просты, без фокусаў чалавек, жанаты на звычайнай медсястры (з трэцяй паліклінікі), якая не пакінула сваёй нялёгкай работы нават тады, калі нечакана для іх абаіх муж стаў абласным начальнікам, дэградзіраваў у мяне ва вачах. Аж шкада было яго, як перараджаўся.

Зрэшты, назаву толькі факты – судзіць аб эвалюцыі І.Ф.Мікуловіча зможа кожны.

Аднойчы на вёсцы я спаткаўся з жахлівым фактам.

У калгасе – самым перадавым у раёне, у які я прыехаў рабіць рэпартаж для газеты, – якраз капалі бульбу. Капачы высыпалі яе ў скрыні, затым селянін браў лейцы ў рукі ды адпраўляўся з возам на станцыю ладаваць бульбу ў вагоны для адпраўкі ў Ленінград. Перад гэтым дырэктар школы абавязкова да кожнага воза прыстаўляла вартаўніком настаўніка, каб дзядзька, барані Бог, не ўздумаў па дарозе бульбы адсыпаць.

Так і валакліся яны па дарозе кіламетраў сем: конь з наладаваным возам, побач дзядзька з лейцамі ў руках, а за імі

педагог, апусціўшы галаву, бо яму было няёмка спатыкацца вачыма з чалавекам, які вучыў у яго сваіх дачок. Затым валокся другі конь, другі дзядзька ды грамадскі міліцыянер...

І сам гэты дзікі факт, і тое, што ні дырэктар, ні настаўнік, ні брыгадзір са старшынёй калгаса не бачылі ў ім нічога заганнага, ды выгляд тых няшчасных настаўніц і настаўнікаў, якія з пакорай ды панылай абыякавасцю тупалі за фурманкамі, мяне моцна ўразілі – аб хвалебным рэпартажы з перадавога калгаса, дзе старшынёй – Герой Сацыялістычнай Працы, не магло быць і гаворкі.

Я адразу кінуўся да сакратара абкама партыі ды з абурэннем яму пра ўсё выклаў.

Іван Фёдаравіч надта шчыра прыняў гэта да сэрца і расказаў пра тое, што аднойчы назіраў сам.

Ехаў Мікуловіч праз вёску каля гумна і пачуў: у ім арфуюць збожжа. Выразна было чуваць, як грукоча агрэгат. Сакратар абкама спыніў машыну, каб зазірнуць у гумно. На сваё здзіўленне, выявіў: на ўсіх дзвярах даўжэзнай будыніны вісяць здаравенныя замкі.

Шафёр праз хвіліну прывёз старшыню калгаса, і тады выявілася, што старшыня перадавога калгаса і таксама Герой Сацыялістычнай Працы, каб не кралі зерне, сваіх калгаснікаў замыкае на цэлы дзень на ключ і толькі вечарам выпускае.

– Як жа яны да ветру ходзяць, як жа ў іх з абедам? – здзівіўся сакратар абкама.

– Чорт іх не возьме, выцерпяць, не вялікія паны, – супакоіў яго мясцовы кіраўнік. Ды ўпэўнена дадаў: – А што загадаеце мне рабіць – чакаць, пакуль усё развалакуць? Ведаю я іх – аж занадта!

Яшчэ Іван Фёдаравіч дадаў, што гэткая практыка ўкаранілася ва ўсіх калгагах і саўгасах. Укаранілася даўно, але ён не ў змозе штонебудзь перайначыць. Бо неяк так склалася, што публічна пра гэта і не скажаш: не зразумее цябе ніхто і не падтрымае. Вось ён якраз сядзіць і над гэтым думае.

Мы вельмі шчыра над з'явай пабедавалі ія з цяжкім сэрцам развітаўся. Праўда, цяжкасць была ўжо не тая – прыемна, калі дзеліць з табой яе яшчэ хто-небудзь.

У 1962 годзе я занёс яму часопіс «Октябрь», у якім пісалася пра вытворчыя брыгады ў Сібіры – першыя ў сёлах Савецкага Саюза, ды пра тое, якіх дасягнулі яны поспехаў, – куды большых, чым у самых лепшых калгасах. Іван Фёдаравіч ідэяй адразу загарэўся. Выклікаў з Масквы нават аўтара артыкула, самога Барыса Мажаева. Распытаў яго падрабязна пра структуру вытворчых брыгад на сяле, пра іх адносіны з мясцовымі ўладамі і парэкамендаваў некаторым калгасам

Гарадзеншчыны наладзіць такое новаўвядзенне ў сябе.

І што вы думаеце? Наладзілі!

Але нядоўга ў нас праіснавалі на сяле тыя вытворчыя брыгады. У той самай Маскве, дзе і «Октябрь» друкаваўся, знайшліся ў ЦК КПСС разумнікі, якія Гарадзенскі абкам партыі абвінавацілі ў падрыве сацыялістычных устояў, а Мікуловіча за гэта ледзь не знялі з пасады сакратара абкама па сельскай гаспадарцы, – такую пасаду ён тады займаў.

Неўзабаве настаў перыяд застою, а з ім разгул дэмагогіі, пустазвонства ды прынцып паводзін: хапай, хто што можа, бо пасля нас – хоць патоп! Вось тады метастазы разгулу дабраліся і да І.Мікуловіча. Да таго часу ён ужо ў нас стаў першым сакратаром абкама.

Аднойчы ехаў я з Менску ў вагоне з нейкай маладзіцай.

Неўзабаве даведаўся: яна – дэпутатка-даярка, вяртаецца з сесіі Вярхоўнага Савета БССР.

Я пацікавіўся:

– І што там было цікавага?

– Апельсіны ў буфеце! – борзда пахвалілася яна ды паказала на аранжавыя кругляшы ў сетцы.

Я сябе супакоіў разважаючы: што ж, відаць, маладая мама. Выпадкам надарылася аказія набыць ласунак дзеткам, і гэта ёй зацьміла ўсё астатняе.

Пачакаўшы хвіліну-другую, я зноў спытаўся:

– А яшчэ што было на сесіі цікавага?

Яна наморшчыла лобік, успамінаючы:

– Яшчэ?.. Яшчэ...

Бачу, успомніць не можа аніяк.

– Вы ж там, нябось, не гадзіну былі! – дапамагаю.

– Аж два дні!

– Ну? – цягнуў я з яе навіну.

– А яшчэ ў ларку давалі кітайскія кофты, але мне ўжо не дасталіся!

– Не хапіла? Што ж так зявалі?

– Так выйшла!.. Стаяла, стаяла ў чарзе, ужо мая калейка падыходзіла і... Эх, як шкада!

– Ах, ах!.. – падыграў я.

– Ледзь не заплакала ад крыўды!

– Та-ак, не пашэнціла вам...

Знайшоўшы ўва мне цярплівага слухача, маладзіца вырашыла быць шчырай да канца:

– І яшчэ трэба было прысутнічаць дзень на сесіі, але я ўжо не вытрывала!

– Так дамоў цягнула?

– Жах! Хутка ж дзецям у школу ісці, сабраць іх трэба! І я мала слоікаў з гароднінай на зіму накруціла, а сезон гуркоў вось-вось скончыцца! Дый у гэтых гасцініцах жыць не люблю – казёншчынай ад іх аддае!..

Мне раптам падумалася: нічога сабе ілюстрацыя да міфа наконт таго, што кожная кухарка зможа кіраваць дзяржавай! Вярнуўшыся дамоў, зайшоў я і да І.Мікуловіча і, як раней, давай яму з гарыччу выкладваць сцэнку ў купэйным вагоне. Маўляў, вось такіх пасланцоў народа выбіраем! А менавіта ад іх залежыць лёс культуры, асветы, здароўя, мова ды быт нашага народа!

Першы сакратар абкама слухаў, слухаў, а затым нечакана абрынуўся на мяне з Быкавым (Васіль Уладзіміравіч жыў тады яшчэ ў Гародні) за тое, што, маўляў, не туды глядзім і бачым не тое. Параіў абодвум добра праштудзіраваць раман У.Кочатава «Чего же ты хочешь?».

–Прачытайце гэтую кніжку абодва, прачытайце! – павучаў, аж чырванеючы ад абурэння. – І там дакладна такія паказаны, што бачаць толькі ўсё змрочным, у багатым савецкім жыцці не знаходзяць станоўчых акцэнтаў! І там такія разумнікі ўсіх крытыкуюць ды вышукваюць чорныя плямы, бытта мала ў нас светлага і добрага!

Дагэтуль мы з Мікуловічам не бачыліся года з паўтара.

Толькі цяпер я на яго твары разгледзеў незвычайную для Івана Фёдаравіча важную самаўпэўненасць, нядобры бляск вачэй і жорсткае раздражненне чалавека, якому наступілі на пальцы. Унь як улада цябе перамяніла!

Пакуль я ад здзіўлення паспеў што-небудзь уставіць, ён напаў на мяне з кпінамі:

– Як вы не адводзіце вачэй ад сваіх твардоўскіх, максімавых, бакланавых, салжаніцыных, гэтак і ў той кніжцы героі ўсё глядзяць і глядзяць на Захад! Глядзяць, не могуць нагледзецца, а сваё ганьбуюць ды бэсцяць! Вы падыгрываеце варожай прапагандзе, льяце на сваё толькі дзёгаць і дапамагаеце ЦРУ! Але ведайце: працоўны народ вас не разумее і зняславіць ганьбай!

Мне было выразна відаць, што чалавек гаворыць не сваё. Як было ў ім усё пераблытана! Нягледзячы на ап'яняючыя поспехі ўасабістай кар'еры, у гэтым прастаку загаварылі раптам тысячы страхаў, бяздумна засвоеных догмаў, лозунгаў і шаблонаў, чым было нашпігавана нашае хворае грамадства.

Не праяўляйце да мяне варожасці сёння, пенсіянер Іван Фёдаравіч, калі трапяць вам на вочы гэтыя радкі, не крыўдуйце і не абвінавачвайце мяне ў няўдзячнасці. Так, вы сімпатызавалі мне і нават шчыра радаваліся маім удалым творам, а па тэлефоне кожны раз не забывалі павіншаваць з Новым годам. Тым не менш, сумныя факты я выношу на грамадскі суд. Раблю гэта не для слоўца і не для таго, каб Вас прынізіць у вачах людзей, а таму толькі, што лінія паводзін людзей, да катэгорыі якіх лёс вызначыў Вам належаць, – дакумент эпохі; дакументы не ўпрыгожваюць, нягледзячы на тое, падабаецца гэта каму-небудзь ці не.

## Наднёманскі Астап Бэндэр

Але найбольш у вобласці травіў інтэлігентаў Ульяновіч. У кабінеце, сцены якога памяталі названага ўжо аднойчы караля Панятоўскага (кожны трэці сейм Польшчы і Літвы на чале з каралём адбываўся ў Гародні), які яшчэ дзвесце гадоў таму назад выпусціў для творчай інтэлігенцыі спецыяльны медаль «Sapere Aude» (таму, хто адважыўся быць мудрым!), Ульяновіч фабрыкаваў ды фабрыкаваў супроць нас абвінавачанні адно страшней за другое. Прыпісваў падрыўную антысавецкую работу, якую мы бытта бы праводзім па прамым указанні ЦРУ ды іншых замежных выведак.

Да ўсяго, Ульяновіч быў ярка выяўлены графаман. Злоўлены на злоўжыванні публікацыяй сваіх вершаў у абласной газеце пад псеўданімам Яновіч, ён да знямогі пачаў мучыць сваіх наведвальнікаў, прымушаючы людзей слухаць прымітыўную бязглуздзіцу.

Злоўжываючы службовым становішчам і адчуваючы сябе абсалютна беспакарана, Ульяновіч апускаўся нават да подласці.

Кіраўнік літаратурнага клуба ў Беластоку мне, сакратару аддзялення СП БССР, аднойчы паскардзіўся. Колькі ён з польскімі сябрамі, прыбыўшы ў Гародню па пагранічным абмене, ні спрабаваў дамагчыся сустрэчы з Данутай Бічэль-Загнетавай і Васілём Быкавым, мэты ані разу не дасягнуў. Заўсёды госць вымушаны быў цэлымі гадзінамі выслухоўваць у кабінеце сакратара абкама па прапагандзе яго ўласнае рыфмаплёцтва. Тады модна нас было крытыкаваць. Мяне, напрыклад, кляймілі на ўсіх абласных, раённых сходах і нават у кожнай партыйнай арганізацыі за выданне «Маёй Джамалунгмы», за выступы на з'ездах іпленумах СП БССР. Крытыкавалінават за альбом «Гродна», у якім я – страх сказаць! – дадумаўся сказаць, што ў нашай вобласці пяць гарадоў (Гародня, Наваградак, Ваўкавыск, Слонім,

Ліда) старэйшых за Маскву, што ўмудрыўся аж на 93 здымках з 300 паказаць у абласным цэнтры цэрквы і касцёлы, а не новабудоўлі (хацеў бы я бачыць фатографа, які, робячы ў Гародні здымкі, не зачапіў бы кадрам і культавага будынка!). А ўжо Быкава не абмінала з крытыкай ні адна газета – ні маскоўская, ні менская – і кожны дзень. Ульяновіч жа з-за нас на пленумах, сходах і нарадах аж са скуры вылазіў. Вось словы гэтага без пяці мінут кандыдата філалагічных навук, выказаныя ім у канцы шасцідзесятых гадоў на сходзе абласнога партактыву перад аўдыторыяй у 800 чалавек. “Пытаецеся, што робіць цяпер Карпюк? У містыку ўпаў. Абклаўся бібліямі, царкоўнымі фаліянтамі і сачыняе нешта рэлігійнае (я ў той час працаваў над раманам-быллю «Вершалінскі рай», які да сённяшняга дня вытрымаў ужо шэсць публікацый!). А Быкаў? Той па-ранейшаму пра вайну піша. Вядома, трэба камусьці і пра вайну пісаць, але як? Вось у «Альпійскай баладзе» савецкага афіцэра ён здае да немцаў у палон. Ну, што зробіш, часамі здаралася – у палон траплялі асобныя нашы афіцэры, бо гэта была вайна. Але ж як камандзір Чырвонай Арміі там сябе паводзіць? Мо ён падполле там арганізоўвае? Дзе там! Афіцэр разводзіць шашні з пекнай італьяначкай, а потым усё думае і думае пра яе. І гэта – наш, савецкі, афіцэр! Усё з-за яе сохне і сохне – вось такога вывеў нашага камандзіра!»

Смешна цяпер цытаваць выказванні прымітыўнага дылетанта аб адным з лепшых твораў беларускай прозы. Але нашпігаваная рознымі глупствамі, запраграмаваная падобнымі лектарамі, наіўная правінцыйная аўдыторыя нашага Дома палітасветы толькі ахнула ад абурэння зладзюгам-аўтарам. І столькі ў ёй было лютай злосці! Нават страх браў, калі падумаеш, што гэты натоўп можа з табой учыніць, калі падкруціць яшчэ крыху!

Неўзабаве Васілю пабілі вокны. Да маёй жонкі сталі прыдзірацца на рабоце. Старэйшую дачку абвінавацілі, бытта яна наведвае нейкі непрыстойны клуб...

Гэта быў толькі пачатак.

## Раздзел другі

## Расправа і яе вынікі

Быў канец шасцідзесятых. У асяроддзі літаратараў сталіністы бралі верх і паступова выгрызалі ўсё перадавое, што ўзрадзілі XX, XXII з'езды партыі.

Наспявалі падзеі ў Чэхаславакіі. Я з сябрамі не таіў сваіх

сімпатый да «Пражскай вясны», і начальства не ведала, як яму быць. Каб нейтралізаваць хоць мяне, нечакана прыслалі позву і, як афіцэра запасу (тады яшчэ я ім быў!), узялі да войска бытта бы на перападрыхтоўку.

22 жніўня 1968 года нашу дывізію раптоўна за ноч абмундзіравалі ва ўсё новае ды накіравалі ў Прагу для абароны чэхаславацкага народа ад «происков империалистов». Дывізія па дарозе Гародня – Беласток зрабіла ўжо 15 кіламетраў і даходзіла да польскай граніцы. Каля Брузгоў нечакана мяне выклікалі з даўзёрнай калоны. Падпалкоўнік з палітчасці Георгі Глонці прывёз са штаба новы загад: у Чэхаславакію ні ў якім выпадку мяне не пускаць, з арміі зараз жа звольніць. Мой добры знаёмы Георгій Уладзіміравіч пры гэтым шапнуў, што ён падслухаў размову начальства, якое вырашыла, што на «гражданцы» шкоды цяпер я зраблю менш.

Быкава і яму падобных па-ранейшаму штодзённа малацілі ды ганьбілі менскія і маскоўскія газеты. Па бібліятэках знялі некаторыя яго творы, а з вайсковых – усе да аднаго.

Паводле разумення нашых партыйных бюракратаў, Быкаў не мог ад сябе так пісаць – ён бытта бы рабіў гэта пад уплывам шкоднай кампаніі. У Гародні пачалася бязлітасная расправа з яго сябрамі.

Першага пакаралі, пазбавіўшы звання дацэнта, Барыса Клейна. Аўтара папулярных кніжак, лектара таварыства «Веды» звольнілі з працы ў медінстытуце і адправілі юрысконсультам на базу гароднiны.

З-за дрымучай сваёй абмежаванасці мясцовыя кіраўнікі палічылі Клейна ідэйным натхняльнікам ды галоўным вінавайцам таго, што Быкаў у творах такі рэзкі. Клейну прышылі антысаветызм. Падлавілі на фразах тыпу «кансерватыўныя і няздольныя ўжо да нічога крамлёўскія кіраўнікі», «мацёрыя сталіністы», якімі ён карыстаўся на лекцыях перад студэнтамі, таму яшчэ і выключылі з партыі. Член бюро гаркама Генадзь А., зняважліва празваны ў горадзе мянушкай «Генка», адбіраючы білет, зазірнуў туды, дзе адзначаюць суму партыйных унёскаў, і са зларадным здавальненнем абвесціў Клейну:

– Го-о, і яму ўсё яшчэ было кепска! Ну, цяпер ты, голубе, атрымліваць столькі не будзеш, мы ж ужо аб гэтым паклапоцімся, будзь пэўны!

А са мной падзеі разгортваліся гэтак.

Спачатку паклікаў мяне сакратар абкама партыі па прапагандзе Аляксандр Ульяновіч ды паставіў пытанне рубам: я, камуніст, думаю крытыкаваць «распоясавшегося» Быкава за ачарненне савецкай рэчаіснасці ці не думаю? Абавязак гэта сакратара аддзялення СП

БССР – у першую чаргу, ці ён за так грошы дзяржаўныя атрымлівае?

Пачаў я даводзіць, што Васіль ачарняць нікога і не думае. Ён сваіх герояў выводзіць аголенымі жыламі і не патрабуе аніякіх падказчыкаў. Што ў быкаўскіх аповесцях не антысаветызм, а суворая праўда жыцця ў спалучэнні з любоўю да чалавека ды болем за Радзіму. Што Быкаў сам, хоць і беспартыйны, піша з чысцейшых партыйных пазіцый. Што за ім будучыня, таму аўтара такога не крытыкаваць трэба, а вылучаць на Дзяржаўную прэмію ды яшчэ яму лепшую кватэру даць!

Сакратар абкама доўга да мяне прыглядаўся і аб нечым так глыбакадумна сам з сабой разважаў, бытта ўвесь да краёў быў нашпігаваны не абы-якімі весткамі. Нарэшце сказаў:

– Яшчэ і прэмію яму, ха! А за што? Бо піша? Пішам мы ўсе – у тым ліку і я! А наконт партыйнасці мы разбіраемся, напэўна, лепш! І з кватэрай у яго – нічога страшнага! У камуналцы жыве? Ну і што? Многія жывуць так!..

Яшчэ хвіліну падумаў:

– Значыць, удзельнічаць у перавыхаванні Быкава адмаўляецеся. Што ж, цяпер наракайце на сябе. І з вамі зробім тое самае, што з Клейнам. Аддзелім вас ад яго! Адлучым ад яго вас абодвух, пазбавім вашага ўплыву – адумаецца і ён!

І праўда, неўзабаве навіна: КДБ вядзе допыт знаёмых, капаецца ў маёй біяграфіі.

Зноў пачалі прыдзірацца да жонкі на рабоце, а дачку папракаць на нарадах за ўдзел у ідэйна шкодным клубе, хоць яна дарогу ведала толькі са школы – дамоў.

Папярэдзілі Максіма Танка, каб запатрабаваў ад мяне заяву аб звальненні з пасады сакратара аддзялення СП у Гародні. Апрача «Нового мира», усе рэдакцыіВярнулімне рукапісы.

Паперы ў Маскве няхай паляжаць, а заявы такой ад мяне не дачакаецеся – дудкі! Вытрывае і жонка, а перад дачкою яшчэ ўсё жыццё наперадзе!

Адным словам, я яшчэ думаў, як бывала ў жыцці не адзін раз, – праняссе. Наконт сваёй пасады быў пэўны. Маё ж аддзяленне – лепшае ў рэспубліцы, кіраўніцтва не нахваліцца. А пэўнасць мая была пустой.

### У пастцы

Нечакана склікалі сакратарыят СП БССР, і той, бытта бы за развал работы, мяне з пасады звольніў. Усе шэсць сакратароў, за выключэннем сёмага – Янкі Брыля, якія дагэтуль увесь час ставіліся

да мяне так прыязна, раптам напалі гэтак люта, бытта я ў іх адняў жонак, забраў апошні кавалак хлеба, падпаліў хату ці пакалечыў унукаў.

А падзеі яшчэ толькі набіралі разгон.

Аднаго дня нейкі камандзірскі бас надтрэснутым голасам па тэлефоне загадаў:

– Карпюк? Ты мне как раз нужен! Слушай! Спрячь самиздат! Спрячь немедленно и надежно! Вынеси из дому к чёртовай матери, сейчас же!

І кінуў трубку.

А гэта яшчэ што такое?! Правакатар за дурня мяне прымае? А магчыма, добразычлівец?

Невядома, хто гэта быў, а спытацца не меў у каго. Але ледзь дачакаўся вечара. Як крыху прыцямнела, я хутчэй тоўстыя папкі з рукапісамі Гінзбурга, Бека, Салжаніцына, лісты з выступамі Сахарава, Некрыча запакаваў у мяшок, вывалак з дому і ўтапіў у Гараднічанцы.

Тым часам пайшлі тыдні, месяцы – цягучыя, без працы, без мажлівасці друкавацца. Нарастала трывога. Тут яшчэ першы сакратар гаркама партыі Магільніцкі шапнуў: знайшлі кампрамат на мяне і ўжо даведку пішуць для выключэння з партыі.

Наіўныя людзі ўсёй падаплёкі не ведалі, і народ пачаў усё тлумачыць па-свойму. Тлумачылі чамусьці гэтак, што ўсе мы выглядалі пачварамі.

Раптам папаўзла пагалоска, што Быкаў за сваю творчасць атрымлівае ад амерыканскіх рэзідэнтаў даляры. На Барыса Клейна сказалі, бытта ён у Віцебску раскапаў бацькава золата, захаванае яшчэ ў часы, калі той служыў у Дзянікіна афіцэрам, перавёў у Гародню, дзе Барыса бытта бы і падлавілі на махінацыях. Маўляў, пакуль што вылецеў з партыі, а неўзабаве стане перад судом.

Аднак найбольш фантастычныя байкі пачалі гуляць пра мяне. Дапамог тагачасны сакратар гаркама партыі А.Магільніцкі. У дакладах з трыбуны ён пачаў апавядаць такое, пра што пішуць толькі ў прыгодніцкіх раманах.

Пры сустрэчах з гараджанамі Магільніцкі, які дагэтуль нібыта сябраваў са мной, вёў вольналюбівую гутарку, даваў нават не раз службовую машыну з’ездзіць у аэрапорт па пісьменнікаў, у Друскенікі іх завезці, раптам абвесціў, што я сын мацёрага кулака і здраднік Радзімы. Нібыта ў вайну пры немцах вучыўся ў берлінскай школе дыверсантаў. Затым бытта бы немцы заслалі мяне ў партызаны, дзе я выдаў карнікам атрад.

Пасля вызвалення, бытта бы для маскіроўкі, ажаніўся з дачкой віднага рэвалюцыянера (мой цесць – Альшэўскі, расстраляны сталіністамі ў 1937 годзе, і праўда, быў калісьці сакратаром ЦК КСМБ, у гонар яго ў Менску нават вуліца названа!), а па камандзе ЦРУ я нядаўна вынырнуў з падполля ды пачаў савецкай уладзе шкодзіць.

Такая нагонка неўзабаве дала вынікі. Быкаву зноў пабілі вокны. Ад Клейна і мяне знаёмыя людзі па вуліцы кідаліся ў бакі, бытта бы ад пракажоных. Ніхто больш мне не тэлефанаваў, не дасылаў лістоў, а школы, тэхнікумы ды рабочыя інтэрнаты перасталі раптам запрашаць на выступленні.

У педінстытуце арыштавалі студэнтаў – Раманава Аляксандра, Каленчанку Сяргея і іншых. Іх падлавілі, калі хлопцы на партрэце Леніна намалявалі сімвал «Пражскай вясны», і на допытах пастараліся, каб студэнты прызналіся, што ўсё рабілі пад уплывам выступленняў Карпюка і Быкава.

Цяпер кожны раз на вуліцы я пачаў заўважаць за сабой хвост. Заўсёды паспяваў адзначыць, што высочвалі нашы органы куды прымітыўней, чым рабілі гэта шпікі польскай дэфензівы, а ў часы нямецкай акупацыі – «гегаймсполіцай» (тайная паліцыя). Карцела спаткацца з начальнікам КДБ ды яму сказаць:

– Не так гэта робяць! Больш тонка трэба!.. Эх, за што вам грошы ладныя плоцяць?!.

Крадучыся, спаткалі мяне Валянцін Чэкін, затым Алег Малашанка і расказалі, як іх, гэтых пачаткоўцаў, работнікі КДБ завалаклі на патаемную кватэру горада і дамагаліся, каб абодва мужчыны дакладвалі пра кожны мой і Быкава крок. А Малашанку абавязалі яшчэ падпісаць заяву, што ў творчасці ён таму такі рэзкі, бо начытаўся майго выступлення на V з'ездзе пісьменнікаў БССР...

Адным словам, зажылі мы, бы тыя ізгоі. Часамі, як змоўшчыкі, спатыкаліся дзе-небудзь далей ад людзей ды меркавалі, што ж нам цяпер рабіць.

Нарэшце, ноччу выклікалі мяне на допыт у КДБ...

Следчы Фамін пацікавіўся, якая з маіх кніжак найбольш біяграфічная. І колькі сапраўды было ў бацькі кароў – 2 ці 3, зямлі 18 га ці 32.

Што ў маіх мастацкіх творах насіла характар аўтабіяграфічны, што не, я адразу не так лёгка мог адказаць – на маім месцы заблытаўся б, мабыць, і Шолахаў.

Не лепш было і з другім пытаннем.

У бацькі быў хутар. Сельская гаспадарка – жывы арганізм. Яна ніколі не стаіць на адным узроўні. Усё залежала ад наяўнасці корму,

мажлівасці сям'і і кан'юнктуры на рынку. Таму, напрыклад, кароў бацька то прадаваў, то заводзіў больш, чым коней. А пры савецкай уладзе колькасць іх мела прынцыповае значэнне. Па гэтай прычыне, пішучы сваю аўтабіяграфію, я выбіраў наяўнасць кароў з такой лічбай, якая мне не зашкодзіла б, зусім нікога не ашукваючы, калі падыходзіць да справы па закону. Зрэшты, Божа мой, з пункту гледжання глабальнага гуманізму, якая розніца – 2 рагулі ў сям'іці на адну больш? Але ж толькіцяпер я з жахам уяві . сабе, як з такой драбязы, здабытай вось такім функцыянерам, розныя чыноўнікі раздуюць вялікую палітыку, каб мяне дабіць дарэшты.

Я козыр даў ім у рукі сам – трапіў, нічога не скажаш.

Зноў успомніліся часы падполля пры Польшчы ды нямецкай акупацыі. Следчы абудзіў якіясьці старыя душэўныя раны. Страх некуды без следу падзеўся, я нават адчуў асалоду вадзіць яго за нос.

Аднак хітрыкі мае, падобныя таму, што, маўляў, зямлі і праўда было толькі 18 гектараў з гакам, астатняе – балота, неўраджайнае тарфяніска, не дапамаглі. Пра тое, што прыдумаў апраўданне не я, што яшчэ ў 1947 годзе, прымаючы мяне ў партыю, падвучыў мяне ўпісаць зямлю без балота былы партызанскі камандзір і сакратар гаркама партыі Лазебны, я ўжо функцыянеру апавядаць не стаў.

Не абышлося і без подлых прыёмчыкаў.

У 1943 годзе, вясной, за сувязь з партызанамі я з братам трапіў у лагер смерці Штутгоф «бай Данцыг». Як іва ўсіх канцлагерах на тэрыторыі карэннай Германіі, так і ў Штутгофе кожнаму арыштанту можна было атрымліваць з дому пасылкі з харчамі і нават грошы. Маркі на рукі не выдавалі, запісвалі іх на асабовы рахунак арыштанта, а харчы мне і брату здорава дапамаглі: менавіта дзякуючы ім я і брат уцяклі.

Падпалкоўнік Фамін з КДБ заехаў у Штутгоф ды прывёз адтуль фотакопію ведамасці, згодна з якой у канцылярыі я атрымліваў тры разы па дваццаць марак.

– Карпюк у лагеры на службе быў! – зрабіў з гэтага заключэнне ды пачаў супроць мяне заводзіць крымінальную справу.

Як вядома, няўдачы на людзей валяцца цэлымі касякамі.

Менавіта ў той час – не раней і не пазней! – прыйшло пісьмо ў КДБ ад Марціна Грушэўскага.

Калісьці яго хутар быў побач з нашым. Бацька з Марцінам разам нават служылі ў царскім войску, але мой стары ім заўсёды абураўся за тое, што сусед любіў лёгкае жыццё. Палеткі яго былі зарослыя пырнікам, камяні з іх гаспадар збіраць і не думаў, на балоце ленаваўся касіць атаву. Яшчэ бацька яго крытыкаваў, бо Марцін быў

з нямногіх страшаўцаў, якіх цягнула да выпіўкі. Сабутэльнікамі яго былі легіянер-ляснік, паліцыянты – тыя, у каго вадзіліся грошы. Тым не менш, бацька ўгаварыў суседа ўступіць у кампартыю, і той два гады з'яўляўся яе членам, пакуль сяброў не прадаў.

У 1933 годзе кампартыя ў нас арганізавала забастоўку лесарубаў і возчыкаў лесу. Бацьку і яшчэ аднаго страшаўца, Васіля Лебядзінскага, за арганізацыю забастоўкі пасадзілі на тры месяцы ў ваўкавыскую турму, але мужыкі былі цвёрдымі – вазіць з лесу сосны так і не ехалі.

Нарэшце, з усіх сялян, хто спакусіўся на панскія грошы (штрэйкбрэхеру плацілі ў дзесяць разоў болей!), стаў Марцін Грушэўскі. У той час, калі яго сусед сядзеў за гэта ў турме, дзядзька з пасынкам паехалі ў лес, кінуўшы гэтым выклік – вёсцы, падпольшчыкам, суседу.

Паўтараю, нормы маралі на вёсцы сталыя. Грушэўскі аўтаматычна перастаў быць членам падпольнай кампартыі.

Людзі пачалі яго ганьбаваць і надта баяцца. А я праз год, стаўшы членам падпольнага камсамола, ноччу з сябрамі падвартаваў яго ля вясковых могілак і некалькі разоў пабіў.

Адным словам, Марцін некалі ў нас атрымаў сталую клічку «штрэйкбрэхер», і я ўзненавідзеў яго з юнацкім максімалізмам. Яшчэ больш Марцін стаў непрыемны, калі з прыходам уз'яднання ў 1939-м стаў сваім чалавекам у энкэвэдоўцаў і дапамог з бацькі рабіць кулака; я ўжо гаварыў, што такія людзі тады неспадзявана зрабілі кар'еру.

З першых дзён акупацыі Марцін стаў старастам (солтысам) вёскі, што яшчэ больш абурыла некаторых людзей, і мяне ў тым ліку.

Адразу пасля 1942 года мяне немцы за сувязь з партызанамі раптам арыштавалі, завезлі ў беластоцкую турму, але ўзялі і Марціна Грушэўскага ды пасадзілі ў адной камеры. Тое, што яго праз пару дзён выпусцілі, мяне пераканала яшчэ больш, што ён цяпер стаў нямецкім паслугачом, фашысты арыштоўвалі яго для блізіру – у камеры быў нямецкай падсадной качкай.

Калі потым быў партызанам, затым камандзірам атрада, я меў яшчэ клопат – берагчыся, каб не ўбачыў мяне, маіх хлопцаў сусед Грушэўскі, каб немцы за мяне не помсцілі бацькам – старыя яшчэ ў партызаны не ішлі, а жылі на хутары.

Вельмі абмяжоўваў Грушэўскі і маіх партызан, калі яны ішлі на сувязь да бацькі. Хлопцы нават палявалі на Марціна, але ён быў прадбачлівы – начаваць ездзіў з дому ў Гарадок, і гэты факт яшчэ больш нас пераконваў у слушнасці нашай падазронасці.

Летам 1944 года, у першы дзень прыходу ў нашу вёску

Чырвонай Арміі, Марціна Грушэўскага, як старасту, арыштаваў СМЕРШ. Ноччу паднялі з ложка і мяне на допыт. Я, вядома, пад гарачую руку нічога добрага сказаць пра суседа не мог. Калі і было якое сумненне, то падумалася: Грушэўскага чакае суд, ён высветліць усё дакладна, калі я ў чым-кольвек памыляюся, скажу толькі, што ведаю. У выніку дзядзьку Марціну далі ўсяго 5 гадоў пасялення і выслалі ў Краснаярск.

Акурат ў той момант, калі вырашалася мая справа ў Гародні, з Краснаярска ў КДБ прыйшло пісьмо. У ім дзядзька Марцін абліваў мяне граззю і патрабаваў сабе рэабілітацыі на той падставе, што ён некалі быў таксама членам КПЗБ. З яго пункту гледжання, крок такі лагічны: тое, што быў пры немцах старастам, даўно ўжо не каралася, заставаліся толькі мае абвінавачанні і яшчэ двух страшаўцаў, якіх у КДБ не бралі пад увагу. Я ж праз 25 гадоў на тыя падзеі глядзеў цяпер зусім інакш.

Мацёрым шкоднікам тае справы, за якую змагаўся, назваць Грушэўскага цяпер не мог аніяк. Ну, выпіваў з легіянерамі, паліцыянтамі – пасля ўз'яднання ў 1939 годзе ды ў часы застою пілі яшчэ і не так. Аднойчы здурэў, паквапіўся на добры заробак, паехаў з пасынкам у лес штрэйкбрэхерам. Баляваў і з немцамі, як і многія іншыя. Але ж фактаў, каб гаварыць пра яго як злачынца і прадажніка, я не меў. За гэты час дасканала даведаўся: у турму, затым у канцлагер да немцаў пасадзіў мяне за сувязь з партызанамі не Марцін, пра што я паспеў ужо надрукаваць не ў адным сваім творы.

Да такой я прыходзіў высновы на допыце ў Фаміна. Але ж скажы гэтак следчаму, і справу сваю з-за Марціна ўскладню яшчэ больш. Фамін прамаўчыць, што дзядзька быў штрэйкбрэхерам, што яго падпольшчыкі, у тым ліку і я, за гэта білі, што потым за немцамі стаў старастам (солтысам), што на гэтым грунце паміж намі ўзнік антаганізм, і з майго боку небеспадстаўны. І атрымаецца: ён сумленны чалавек, няшчасная ахвяра Карпюка-кар'ерыста, які цяпер валіць на сталіністаў, а сам унь як паддаваў людзей!

Што мне рабіць? Ці не пацвердзіць лепш сваё ранейшае сведчанне, каб ліквідаваць яшчэ адну небяспеку для сябе – для гэтага трэба так мала!

А пацвердзіць – узяць на душу грэх.

Адным словам, дзеля часовай выгоды я не мог зрабіць адной і той жа памылкі двойчы. Што ўжо будзе. Выдатна ведаючы, што гэтага мне ніколі не даруюць10, свае паказанні летняй ноччу 1944 года для СМЕРШа я ўзяў назад, чым вельмі ўзрадаваў свайго ворага-

следчага. Ад здавальнення ён, не тоячыся перада мной, аж рукі пацёр.

У яго яшчэ быў галоўны козыр – штутгофская грашовая ведамасць.

Тым часам завесці крымінальную справу з-за тае ведамасці следчаму, як ён ні стараўся, не ўдалося. Задума ў яго не атрымалася! З-за міжнароднай салідарнасці літаратараў. Даведаўся пра ўсе мае мітрэнгі даўні друг з ПНР, былы савецкі разведчык і аўтар шматлікіх кніжак Аляксандр Амільяновіч. Ён тэрмінова з'ездзіў у той самы Штутгоф на сваёй машыне (з Беластока гэта – 500 кіламетраў). У лагерным музеі раздабыў тлумачэнне, што ў лагер можна было грошы прысылаць па пошце. Праз іншых польскіх пісьменнікаў, захоўваючы ўсе прыёмы канспірацыі, паперку зараз жа пераправіў мне праз граніцу, і Фамін застаўся з носам: галоўны козыр з яго рук выбілі.

Нічога ў іх не атрымалася і з арыштаванымі студэнтамі, якія на партрэце Леніна намалявалі сімвалы «Пражскай вясны». Ні Раманаў, ні Каленчанка, ні іншыя хлопцы сувязі са мной не пацвердзілі. Першы з іх атрымаў 4 гады, другі – 3, на гэтым справу іхнюю закрылі.

Такім чынам, на мяне крымінальная справа адпала.

Але з партыі мяне з трэскам выперлі. Пры разборы асабовай справы члены бюро дазволілі сабе паздзекавацца з ахвяры. З усяго перажытага, я лічу, найбольш ад мяне патрабавалі сілы, адвагі, рашучасці, умення ўцёкі з канцлагера Штутгоф (я ж там пакінуў роднага брата, каб фашысты за мяне яму помсцілі!). І ўвогуле, як свет светам, тыя, каму пашэнціла ўцячы з палону, каб зноў удзельнічаць у барацьбе з ворагам, былі заўсёды ў пашане. Такім давалі тытулы шляхціца, графа. Такім выдзялялі зямельныя ўчасткі, выдавалі ім ордэны. На мяне ж прысутныя на бюро дружна навaліліся:

– Як гэта ўцёк адтуль? З лагера нікому ўцячы не ўдалося, а толькі аднаму Карпюку? Хіба такое бывае? Тут штосьці не тое!

– Ясна...

– Немцы выпусцілі з заданнем!

Калі дакладчык ўпамянуў мой ордэн Чырвонага Сцяга Айчыннай вайны ды самую высокую ўзнагароду ПНР – залаты крыж Virtuti Militari, заявілі:

–Во, во! Яшчэ і такія ўзнагароды! Хто яму паверыць?!

–Купіў сабе на чорным рынку!

–Пасля вайны гэта зрабіць было проста!

Той самы «Генка», а цяпер ужо мэр горада і вядомы ўсім хабарнік, лавелас ды п'янчуга, разглядаючы мае дакументы на інваліднасць (ім я быў з 1945 года, а старое пасведчанне інваліда

прывалок на бюро ў наіўнай веры, што мне дапаможа), франтавыя даведкі аб лёгкім і цяжкім раненні, гідліва кінуў:

– Сфабрыкаваныя!

Фраза гэтая мне здалася найбольш абуральнай. Ох, як хацелася ўляпіць па маладой фізіяноміі хударлявага, са старанна залізанымі назад валасамі і напамаджанага франта ў фінскім гарнітуры – цёмным з белай палосачкай.

## У Маскве

Аднойчы выклікаў мяне Быкаў і шапнуў:

– Аляксей, у «Новом мире» чакаюць, каб ты забраў свае рукапісы! Пошце не давяраюць!

–А мне яны навошта?

–Забяры, яшчэ могуць калі-небудзь прыдацца!

Васіль прапанаваў дабірацца туды разам, бо меў таксама справу, і папрасіў дапамагчы яму з начлегам. Я два гады вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах, ведаў у Маскве ўсе хады і выхады.

Вось мы і ў сталіцы. У інтэрнаце на Дабралюбава без клопатаў атрымалі на двух пакойчык. Патэлефанавалі адразу Барысу Мажаеву, які калісьці вучыўся на курсах сцэнарыстаў ды жыў са мной у гэтым будынку таксама, а прыязджаючы ў Гародню з-за свайго нарыса аб вытворчых брыгадах у калгасах Сібіры, надрукаваным у «Октябре», пазнаёміўся і з Быкавым.

Мажаева я даўно не бачыў. Барыс з'явіўся ўжо з раскошнай рыжай барадой ды аж свяціўся бадзёрасцю і аптымізмам. На маю бяду, прывалок каньяк. Югаслаўскі п'янлівы прадукт са стракатымі наклейкамі быў у такім адмысловым і элегантным упакаванні, што аж дзіва брала, – кніжкі б так выдавалі! Сябры адразу ажывіліся. Адкаркавалі бутэльку ды сабраліся правесці цікава рэшту часу, а мне, абсалютна непітушчаму, стала з імі сумна.

Я крыху яшчэ пасядзеў. Калі ж абодва пачалі паўтарацца ды казаць тое, што дыктавала ім віно, паваloкся ў калідор. Там адразу наляцеў на Валодзю Сапожнікава – былога курсанта. Адно ў эпоху галоснасці з «Литературки» я даведаўся, што за кулацтва ён перажыў усе стадыі ізгоя і сям'я яго адведала поўны набор сталінскіх жахаў, якія нам, выхадцам з Заходняй Беларусі, і не сніліся. Але ў канцы шасцідзесятых пра гэта яшчэ я не ведаў, бо нашыя курсанты біяграфіі свае тады старанна ўтойвалі.

Хоць былі мала знаёмыя, цяпер калідорнай сустрэчы ўзрадаваліся.

Не ведаю, пра што тады казаў я. Сапожнікаў жа адразу пачаў апісваць, як на яго радзіме адстаўнікі павыбівалі ўшчэнт качак ды лебедзяў, што для «Октября» ён падрыхтаваў пра гэта вялізны матэрыял. Круглатвары, з чорнымі, як смоль, валасамі пісьменнік гаварыў пра гэта падрабязна ды са смакам – пяць, дзесяць, дваццаць хвілін. Я слухаў аднакурсніка, а перажываў сваё.

Былая падпольшчыца з Беластока Ліза Чапнік (Марыся Мразоўская) цяпер працавала ў Разанскім педінстытуце. Працавала разам з жонкай Салжаніцына – Наталляй Рашатоўскай. Муж Лізы, Юлек, меў гараж побач з гаражом Аляксандра Ісаевіча. Беластоцкія сябры завочна і пазнаёмілі мяне з гэтым рускім пісьменнікам. Неўзабаве ён мне прыслаў, каб перадаць Макаёнку, сваю п'есу для друку.

Прачытаўшы, адважны Андрэй Ягоравіч узяўся яе друкаваць у сваім часопісе «Нёман». П'есу ў апошнюю хвіліну давялося здымаць: пастараліся беларускія даносчыкі, якіх тады было ў кожнай рэдакцыі поўна (!). Цяпер я рукапіс прывёз у Маскву, каб вярнуць аўтару.

Мне пашанцавала. У «Новом мире» я сустрэў самога Салжаніцына і рукапіс з каментарыямі перадаў. Разгаварыліся. Мяне вельмі здзівіла, што адмова ў друкаванні п'есы абсалютна аўтара не кранула. Ён гэтак быў упэўнены у сваёй праваце, што са смакам пачаў расказваць пра сябе анекдоты, якія хадзілі па Маскве.

Чаму такім не быць, калі на тваім баку цэлы свет? Крыўдна, хоць ты плач. Як не крыўдаваць, скажыце?

За фанернымі дзвярыма інтэрната гучала ажыўленая гаворка дваіх. А гэтым што? Аднаго абараняе Твардоўскі з усімі «навамірцамі». Другі ў тэатры на Таганцы з самім Любімавым рыхтуе да пастаноўкі «Живого», а кожны масквіч у яго сябар, для форсу чалавек нават бараду адпусціў.

І Сапожнікаў чакае карэктуру. А ў мяне?

Днём Сац з «Нового мира» са шкадаваннем і просьбай прабачыць вярнуў аповесць «За цветком папоротника». Аляксей Кандратовіч з кампліментамі за выступленне на V з'ездзе пісьменнікаў БССР, якое ў рэдакцыю трапіла нават без майго ведама, вярнуў усё, падрыхтаванае да друку. Аднак перад Кандратовічам я не падаў і выгляду. Што мне з іхніх кампліментаў ды спачуванняў? Работы не маю. З партыі выключылі. Сям'я па вушы залезла ў пазыкі. Як вяртацца дамоў з пустымі рукамі? Яшчэ не ўпэўнены, ці там адразу не пасадзяць альбо не выкінуць за мяжу, як іншых: куды мне ад сям'і ехаць? І каб хоць малюсенькая доля праўды была ў тым, што мне інкрымінуюць розныя ульяновічы, фаміны!

Сапожнікаў-дзівак, атрымаўшы цярплівага слухача, усё маляваў злачынствы браканьераў, абзываючы іх «варашылаўскімі стралкамі», а мяне ад адзіноты агарнула такая самота і неспакой, што хоць ты воўкам завый.

Мабыць, вось у такія моманты людзі і накладваюць на сябе рукі. Але мне чамусьці не хацелася рабіць нават гэтага. З пакоя раптам выглянуў Быкаў і загадаў далёка не аддаляцца, бо пойдзем у госці, дзе мяне чакае сюрпрыз.

**Прапанова**

Неўзабаве рускі барадач, поўны якойсьці здаровай ды ўпэўненай бесклапотнасці, як і яго «Живой», пайшоў, а мяне, ужо надта зацікаўленага, Васіль павёў да свайго сябра – паэта Грышы Куранёва. Там за часопісным столікам з кубачкам кавы ў руцэ чакаў нас галоўны ўрач псіхіятрычкі.

Нас пазнаёмілі.

Тут і высветлілася: сябры для мяне падрыхтавалі ратунак. Думалі, думалі ды прыдумалі. Цяпер – справа за мной. Ратунак быў вельмі просты. Гэты ўрач (на вялікі жаль, прозвішча ў памяці не захавалася!) браўся выдаць даведку, дзе чорным на беламу будзе стаяць, што я псіхічна ненармальны. Не так, каб быў зусім вар'ятам, а – неўраўнаважаны і не адказваю за свае ўчынкі. Маўляў, тады адразу ад мяне адчэпяцца і па партыйнай лініі, і па судовай, і КДБ, бо, паводле нашай Канстытуцыі, на такіх людзей справы заводзіць ніхто не мае права. І паперкі такой няма чаго баяцца перад знаёмымі, бо ў ёй усё будзе напісана на латыні і зразумець зможа толькі спецыяліст.

Васіль пачаў угаворваць:

– Аляксей, згаджайся! Першы раз выключылі з партыі – ты адбіўся. Другі раз – даканалі! Цяпер чакай, рана ці позна – пасадзяць, сцэнар вядомы! Сядзеў у польскай турме, сядзеў у нямецкай, запякуць яшчэ і ў нашу. Яны ўсё могуць! Але навошта табе гэта пад старасць? А Іна, твая жонка, з дзецьмі што рабіць будзе? Аблажылі цябе, як таго ваўка, з усіх бакоў, і другога выйсця не маеш!

Куранёў дадаў:

– У Маскве так ратуюцца некаторыя – ходзяць з такімі білетамі ў кішэні, і ніхто пальцам іх не кранае! А там, магчыма, усё пераменіцца і паперку выкінеш. Альбо пакінеш яе ў сваім архіве, каб калісьці хваліцца перад унукамі!

Жонка яго, Галя, адразу пачала загінаць пальцы, пералічваючы прозвішчы маскоўскіх літаратараў, якім ужо гэтак дапамаглі. На яе

думку, мецъ загадзя такую даведку куды лепш, чым чакаць, каб яны самі за паводзіны пасадзілі ў псіхіятрычку, як генерала Пятра Грыгарэнку, вучонага Жарэза Мядзведзева.

– Во, чуў, што Грыша са сваёй Галяй кажуць! – падсумаваў Быкаў.

Вядома, прапанова сяброў ішла ад спагады ды чыстага сэрца. Але я ведаў адразу: на такое ніколі не згаджуся. Складаная натура чалавек. Здавалася б, вазьмі такую даведку, вяртайся дамоў ды рабі кпіны са сваіх ворагаў: і з таго самага Ульяновіча, і з Фаміна, і з Магільніцкага, і іншых. Але ж з усіх прыкрасцей найбольш я не люблю адчуваць сябе абсмяяным. Горш за смерць гэтага баюся! Што, потым хадзі з кляймом дыпламаванага прыдурка ў кішэні? А як глядзець у вочы дзецям, жонцы, сваякам, знаёмым?!

Толькі катэгарычнага адказу сябрам пакуль што не даваў. Не дабіўшыся адразу ад мяне згоды, сябры для вырашэння сакраментальнага пытання далі мне тэрмін – суткі. Прымусілі запісаць тэлефон галоўнага ўрача ды завялі свецкую гамонку.

## Апавяданне ўрача

Высокі, хударлявы мужчына ў росквіце сіл, які быў медык, з-за часопіснага століка паведаў, колькі зараз у псіхіятрычках сядзіць людзей па палітычнай прычыне альбо з-за таго, што не паладзілі з начальствам. Гэта, як і ўпершыню пачутая з Галіных вуснаў вестка пра генерала Грыгарэнку і вучонага Мядзведзева, мяне вельмі ўразіла. Сёе-тое даходзіла да мяне з перадач радыё «Свабода», але ж, вядома, не верыў ніводнаму замежнаму слову – аж такі быў шчыры патрыёт. Вось табе і маеш!

Далей даўганосы расказваў:

– Ведаеце, у адной з маіх палат сядзіць кат. Самы сапраўдны. Сімулянт, вядома, але я трымаю яго з-за цікавасці, хачу ў яго пра ўсё выпытаць, а ён на гэта паддаецца. Васіль Уладзіміравіч, ці не зацікавіцеся і вы ім? Хадзем заўтра, пакажу вам таго, хто пры Сталіне людзей расстрэльваў. Паўстане перад вамі жывы! Скажу вам, персанаж варты Чэхава альбо і Дастаеўскага.

Усе насцярожыліся. Натапырыў вушы і я.

Галоўны ўрач адставіў пусты кубачак з-пад кавы, працягнуў:

– Я дапытаў яго падрабязна. Як я сказаў, апавядае ахвотна пра ўсе свае справы. Шылаў яго прозвішча, а завуць Мікалаем. Перад вайной скончыў педвучылішча. Там здаў нарматыў на «Варашылаўскага стралка». Паступіў на працу ў вясковую школу.

Працаваў ад душы, і, мажліва, з яго атрымаўся б яшчэ адзін пасрэдны педагог, ды на сваю галаву арганізаваў добры стралковы гурток. Вучні яго так выдатна стралялі, што ўсе як адзін здалі нарматыў, атрымалі таксама значкі імя легендарнага наркама – нікеліраваныя, з бліскучай чырвонай эмаллю. А ўвесну 1937 года за гэта цэлым класам трапілі ў Маскву на спаборніцтвы. І што вы думаеце? Занялі там прызавое месца. Школьнікаў адпусцілі дамоў, а настаўніка затрымалі. Да яго звярнуўся прадстаўнік НКУС, у чыім ведамстве тады былі стралкі:

– Малайчына, метка стралялі твае гаўрыкі, але найлепш, вядома, ты!

– Бо я «Варашылаўскі стралок» ужо тры гады, –пачырванеў Мікалай.

– Выда-атна! Ну, а калі б прыйшлося табе гэтак страляць у ворагаў Радзімы, рука ўздрыгнула б?.

Юнак адказаў без вагання:

–Не!.

– Тады заставайся ў Маскве – мы табе такую магчымасць арганізуем.

– Заставацца адразу?

– Так. Пацаны твае самі дамоў дабяруцца, мы паклапоцімся. А ты тут пажыві, потым пагаворым...

Мікалай Шылаў размясціўся ў гасцініцы НКУС, дзе цяпер узвышаецца шматпавярховы атэль «Пекін». Жыве цэлы тыдзень. Жыве і другі тыдзень. Да яго ніхто не падыходзіць. Калі ж нагадаў пра сябе, пачуў:

–Табе што-небудзь не падабаецца?

І зноў выдалі талоны на сняданак, абед і вячэру ды грошы на дробныя выдаткі. А неўзабаве паслалі яшчэ нават на Чорнае мора ў санаторый. З грашыма.

Затым сказалі:

– У Варонежы бандыты забілі дзяўчыну. Адзіная дачка была ў бацькоў – і забілі. За гэта атрымалі «вышку». Трэба выканаць прысуд.

Убачылі ў юнака на твары трывогу, супакоілі:

– Не бойся, страляць ты не будзеш – толькі каманду дасі, а страляць знойдзецца каму!

Бандытаў тых чамусьці аказалася аж пяць. Яны выкрыквалі нейкія патрыятычныя лозунгі, упарціліся ісці. Ад відовішча акрываўленых целаў потым яго званітавала. Але Шылаў пастараўся сябе ўзяць у рукі, бо новыя сябры пачалі здзекавацца:

– Э-эх, хлюпік, а яшчэ «Варашылаўскі стралок»! Ды мы такіх,

герой, ведаеш, як шчоўкаем? Бы семкі!

Мінула пару дзён, і ўвесь час ён адчуваў сябе пагана. На ноч прынеслі прачытаць асабовую справу з суда. Далі распісацца ў атрыманні, сказалі:

– Табе, «Варашылаўскі стралок». Пазнаёмся, над кім заўтра давядзецца працаваць. Бо без гэтага, бачым, у цябе нервы слабыя, інакш ты не зможаш. Нябось чытаеш газеты, слухаеш радыё і ведаеш, што ў краіне робіцца! Табе пара быць сапраўдным патрыётам, як вучыць нас таварыш Сталін, ды паказаць, што недарма хлеб ясі!.

У тоўстай папцы была стэнаграма з допыту «ворагаў народа». Нейкі інжынер Захарчанка там на многіх старонках прызнаваўся, як на шахце ў Туле арганізаваў трацкісцка-зіноўеўскую групу, як рабілі аблавы, труцілі ваду шахцёрам, а потым у Маскве каля маўзалея Леніна з рук англійскіх рэзідэнтаў атрымліваў валюту. Такое дакладна гаварылі і іншыя падсудныя. Пад канец у дакументах стаяў прысуд – усім расстрэл.

Цяпер Шылаў не мог дачакацца наступнага дня, каб папрасіцца караць паганых здраднікаў савецкай краіны самому.

Яго заяву прынялі без здзіўлення: – Мы, Шылаў, такое ад цябе даўно чакалі, бо ведалі, ты сапраўдны «Варашылаўскі стралок».

Смяротнікаў было дваццаць сем. Прывялі іх у падвал дома, дзе апошні час Мікалай жыў. Людзьмі набілі маленькія каморкі. Адтуль вывалаквалі па тры чалавекі, вязалі назад рукі ды вялі ў бліндаж. Шылаў ім загадваў класціся на зямлю тварам уніз. Адчуваючы лютае абурэнне ад таго, што вычытаў у асабовай справе, з помслівым задавальненнем ён па парадку страляў кожнаму ў патыліцу з нагана. Пасля сямі стрэлаў шомпалікам выбіваў з барабана гільзы, запіхваў новыя набоі і зноў страляў...

Ад пачутага ўсе мы анямелі. А доктар хвіліну пакурыў, нервова змяў у попельцы недапалак ды працягваў сваю страшную гісторыю:

– Цікавыя разважанні ў гэтага тыпа аб сваёй прафесіі ды тых смяротніках. Аднойчы Шылаў мяне пераконваў: «Думаеце, такое бывала кожную ноч? Дзе там! Пра іншых не скажу, а мяне клікалі ў падвал толькі два-тры разы на тыдзень. Ха, як і першыя варонежцы, і далей некаторыя падлы перад смерцю яшчэ крычалі: «Да здравствует товарищ Сталин!» А чаму? Бо думалі: смалім па іх халастымі і гэта ім потым залічыцца. Але мяне на такіх прыёмчыках нельга было купіць, справу сваю я ведаў, і рука мая не дрыжэла!» Цяпер гэты тып у мяне на лячэнні! Здаровы, як бугай. Сімулюе, бытта ноччу спаць не можа – бачыць кашмары. Вядома, выспаўшыся ўдзень, ноччу і не спіцца! Але ахвотна расказвае кожную дробязь са сваёй прафесіі з таго часу. Я

выпісваць не спяшаюся, хоць ён мне не так самому патрэбны, як хочацца такую асобу паказаць каму-небудзь яшчэ з нашых. Не вазьмецеся за яго, Васіль Уладзіміравіч? Я вам ствару ўмовы: і жыллё, і харчаванне. От матэрыял для пісьменніка! Дзівак Васіль у бальніцу пайсці чамусьці адмовіўся – толькі скептычна ўсміхнуўся.

Напрасіўся туды схадзіць я.

## Спатканне з «варашылаўскім стралком»

І вось мы пераступаем парог «псіхіятрычкі» – адзін, другі і трэці. Усе трое дзвярэй старанна замыкаюцца на ключ. Нават у калідоры адчувалася: установа строга закрытага тыпу, бо служба ўся звінела ключамі, як у турме, а перад вокнамі памяшчалася густая металічная сетка, ад чаго ў іх і днём гарэла святло. Не надта яркае, бо ўсе лямпачкі былі бытта малаком аблітыя і таксама ўзятыя ў сеткі.

У ардынатарскай мы заспелі сястру – маладое і прыгожае дзяўчо з ямачкамі на ружовенькіх шчочках. Урач не без сымпатыі ў голасе да яе загаварыў:

– Ну, Марыя Васільеўна, дакладвайце, як прайшла ноч?

– Цудоўна, Максім Валяр'янавіч!

– Не можа быць!

– Уявіце сабе!

– А Напалеон?

– Толькі крыху падурыў мне галаву сваімі пражэктамі ды адстаў. Далей было спакойна, як ніколі. Я нават і падрамаць умудрылася.

– Злаўлю, Марыя, і быць табе без прэміі!

– Так вам і папалася!

– Пабачым, пабачым!

– Слабо? Злавіце раней!

Было відаць, паміж персаналам галоўны ўрач стварыў людскую атмасферу даверу і шчырасці.

Адзначыў я педагагічную здольнасць лекара, між іншым, бо ад спаткання, якое чакалася, мяне пачалі разбіраць ужо дрыжыкі. І не дзіўна: я ўбачу зараз чалавека, які столькі зрабіў людзям гора і цяпер перажывае!

Выдалі халат, і мы з галоўным пакрочылі ў палату.

У пакойчыку – тыповым для ўсіх бальніц – сядзеў на ложку замухрышкаваты лысы чалавек. Твар зморшчаны, вочы напалоханыя, а сам рухавы, як малпа.

Хворы адразу да ўрача:

– Добры дзень, таварыш доктар!

– Дзень добры!
– Нізкае вам ушанаванне!
– Кланяюся і я і вітаю.
– Дзякуй, доктар!
– Ну, як правялі ноч, Мікалай Іванавіч?
– Кашмар, доктар! І галава...
– А што такое?
Але хворы на пытанне далей не адказваў. Толькі пакасіўся на мяне ды як бы ўспомніў:
– Доктар, а сястрычка ноччу спала!
– Хто, Марыся?
– Яна!
– Не можа такога быць!
– Спала! Застукаў я яе!
Мы з доктарам пераглянуліся.
– Мікалай Іванавіч, штосьці вы блытаеце! Каб наша Марыся, якой я нядаўна прэмію выпісаў, выдатніца медыцынскай службы, чый партрэт вісіць на Дошцы гонару, – спала? Не паверу! Быць такога не магло – вам здалося!
– Сам бачыў, слова гонару! Некалькі разоў падыходзіў нават правяраць. Схавалася ў куток за вазоны, звалакла туды крэслы і сабе дрыхла.
– Не можа быць!
– Та-ак!
– Зрэшты, ноччу спаць усім хочацца, асабліва маладыя гэта любяць.
– Спала яна, на ўласныя вочы бачыў, законна кажу!
– Гм! Ну, я ж ёй!..
– Коўдрай нават накрылася! Бальнічнай, прапаленай у адным месцы жалязкам!
– Гм!.. Гм!.. Мо яшчэ ў яе хто і пад коўдрай быў, вы не паглядзелі?
– Праверыў дакладна. Адна спала, законна кажу.
– Памыліцца не маглі?
– Ні ў якім выпадку!
– Гм, а ты, выяўляецца, яшчэ і «сексот»?
Шылаў, не задумваючыся:
– Так точна! Падпісаў абавязацельства сакрэтнага супрацоўніка яшчэ ў 1937 годзе!
– Яно і відаць.
– Я вас не разумею.

– Затое я цябе – добра!

– Зноў вас не разумею.

– Слухай, Шылаў, а табе якая бяда?

У вачах чалавека перапалох ад таго, што нечым начальству не дагадзіў:

– Мне-е?!

– Табе, табе!

– Я – нічога... Я сам разумею, што ноччу спаць усім хочацца...

Але падумаў: вам карысна пра гэта будзе даведацца...

– Чаму?

– Бо дысцыпліна ў бальніцы патрэбна! Як кожны пачне спаць, калі ўздумаецца...

– Наконт дысцыпліны – маеш рацыю. Але пачуць пра гэта ад цябе мне зараз непрыемна.

– Я вас не зразумеў.

– Паўтараю – непрыемна!

– Чаму?

– Бо яна толькі што сказала мне сама. Сама прызналася, разумееш цяпер? Павінную галаву не сякуць!

– Прызна-алася?

– Вось і таварыш старонні нават чуў.

Зноў спіна ў яго забегала, як у малпы:

– А што я такое сказаў?.. Я, доктар, нічога такога і не кажу... Я толькі, доктар, думаў...

– Кепска вы думалі, Шылаў.

– Я стараўся...

– Не патрэбна мне такое старанне! А каб больш не сунулі нос не ў свае справы, з бальніцы заўтра вас выпісваю!

Чалавека бытта раптам укалолі:

– Як гэта – «выпісваю»?!

– Звычайна.

– Не маеце права! Я паскарджуся на вас, грамадзянін доктар. Я правы савецкага хворага ведаю выдатна.

– Давайце, грамадзянін Шылаў, скардзіцеся. Хоць зараз бяжыце. Вы – зможаце гэта зрабіць. Але ў мяне – усё! Так што на заўтра рыхтуйцеся.

Успомнілася, як доктар учора вечарам казаў: «варты Чэхава, Дастаеўскага». Няпраўда. І пры Сталіне катамі, мабыць, былі толькі нікчэмныя душы і ўбогія інтэлекты.

Цяпер зразумела, чаму Быкаў не пайшоў з намі. Гутарыць з такой гнідай ды адначасова сабе ўяўляць, якіх самародкаў вось гэтыя

паганыя рукі адправілі на той свет, – толькі сэрца трывожыць.

Адным словам, з тыпам мне расхацелася ўжо не толькі гутарыць – на яго больш глядзець не мог.

І яшчэ.

На дзіва, сустрэча дала мне такі стрэс, што нават беды мае як бы паменшалі. Ужо хацелася бегчы на вакзал па білет, бо дома мяне чакалі пільныя справы.

## Раздзел трэці

### Першая спроба абароны

Пасля выключэння мяне з партыі ў гаркаме я падаў апеляцыю ў абкам. З Масквы вярнуўся ў ваяўнічым настроі ды пачаў чакаць вынікаў заявы.

Прайшоў адпаведны тэрмін, і для разбору справы мяне выклікалі зноў на парткамісію абкама, дзе я яшчэ раз пераканаўся, што гэта ўстанова (парткамісія) – марыянетка сакратароў і нічога абсалютна самастойна не вырашае.

Тады паклікалі мяне на бюро абкама.

Перад тым як туды пайсці, каб чаго лішняга не нагаварыў, не зрабіў сабе горш, устрывожаная жонка амаль сілком сунула мне ў рот тры нейкія жоўценькія пілюлькі ды ўзяла абяцанне: праглыну пару штук яшчэ і перад тым, як браць слова. Да гэтага дня штосьці не заўважаў, каб хоць якія лекі мелі на мяне ўплыў, але сваёй кабеце падпарадкаваўся. Тым больш, што трывога яе была зразумелай. Сям'я вялікая. Колькі часу хаджу без працы якімсьці ізгоем. Нідзе мяне не друкуюць, друкаваць і не збіраюцца, як і не запрашаюць выступаць, праз гэта ад Бюро прапаганды мастацкай літаратуры перасталі ісці пераводы – абарвалася апошняя крыніца даходаў. Грошай цяпер не атрымліваю ніадкуль – усё трымаецца ў сям'і на жонцы. Добра, што ёй дырэктар трапіла людскі. Каб жонка мела лішнюю капейку, дырэктар Смольская ўсе прыдзіркі вышэйшых чыноўнікаў ад яе адмятала і выдзеліла жонцы аж дзве з паловай стаўкі – 39 гадзін на тыдзень. Настаўнікі ведаюць, што гэта за нагрузка.

Бюро вёў Мікуловіч. На станоўчы вынік у гэтай інстанцыі надзеі было мала, але ў запасе я меў яшчэ Бюро ЦК КПБ. На пасяджэнні Мікуловічу, Малочку ды Ульяновічу я збіраўся выказаць усё, што пра іх думаю. Даў сабе слова: я ж ім урэжу, яны мяне запомняць! Напэўна, прысутнічаць будуць многія карэспандэнты і так, старонняя публіка. Усе яны пабачаць, чаго я варты, і на гэтым скончацца ўсе

мае мітрэнгі! Ды пілюлі, заразы, як на тое, менавіта на гэты раз зрабілі сваю чорную справу.

Калі старшыня парткамісіі Хамянюк размалёўваў усе мае злачынствы, у якія наўрад ці сам верыў, я слухаў яго надзіва абыякава, бытта гаварылі зусім-зусім пра іншага чалавека і мяне гэта не датычыла.

І вось далі мне слова. Узняўся я з крэсла ды раптам адчуў, што нібы знаходжуся ў якімсьці тумане. Мяне абсалютна нічога не цікавіць. Было ўсё роўна, што пра мяне гавораць і хто што пра мяне думае. Не хацелася ні абараняцца, ні наступаць, ні рэзаць «праўду матку», воля мая цалкам растварылася некуды без следу, а я страціў адчуванне, дзе знаходжуся.

Пастаяў я, пастаяў перад народам, выстаўлены, бы на расстрэл, у тым самым круглым зале абкама партыі, дзе дзвесце гадоў таму кароль з вяльможамі праводзіў пасяджэнні, ды сеў, не зусім нават упэўнены, што ўсё адбываецца не ў сне.

Прачнуўся я ад таго дурману назаўтра, ды было позна. А тут і на Васіля звалілася бяда ды выбіла з-пад мяне апошнюю апору.

Ужо выслалі за граніцу Салжаніцына. У газетах ішлі калектыўныя пісьмы ў падтрымку «своечасовага і правільнага» рашэння. Пад адным з іх быў і подпіс Быкава, што выклікала ў пэўных колах сенсацыю.

Васіль таго подлага пісьма не бачыў і ў вочы – сведчу перад судом вечнасці. Яго сфабрыкавалі якраз, калі Быкаў на доўгі час выехаў на Магілёўшчыну ў камандзіроўку з Генадзем Бураўкіным ды іншымі. Але ж цяпер мільёнам сваіх чытачоў Васіль гэта растлумачыць не мог, як і сказаць пра тое, што яго пратэст не надрукуе ў СССР ні адзін орган.

Яшчэ больш Васіля пакрыўдзіла салжаніцынская фраза з таго выпадку, сказаная па радыё «Свабода». Бытта Аляксандр Ісаевіч не ведаў, у якіх Васіль умовах, што ён можа зрабіць, а чаго – не. Тлумачэнне гэтаму было адно: сказана Салжаніцыным пад гарачую руку.

Адным словам, страшна было глядзець, да чаго давялі тады наш нацыянальны гонар розныя палітыканы, кар'ерысты і маніпулятары. Васіль і так не вылучаўся добрым здароўем, а тут раптам счарнеў, зрабіўся худы, хілы, а яго голас – нейкі танклявы. І, вядома, дапамогі мне хоць бы маральнай даць не мог. Давялося бяду сваю насіць у сэрцы самому.

Гэта было дно маіх няўдач.

## Другая спроба абароны

Наступная мая апеляцыя трапіла да інструктара парткамісіі ЦК КПБ Івана Баранава.

Я ўжо зблізку бачыў парткамісіі гаркама, абкама і ведаў, якія яны подлыя. Ад трэцяй нічога добрага не спадзяваўся, таму што справа ўскладнялася для мяне яшчэ больш, бо Баранаў працаваў калісьці першым сакратаром Гарадзенскага гаркама партыі і шляхі нашыя ўжо перасякаліся.

У 1955 годзе я, старшыня мясцовага літаб'яднання, хадзіў да яго па дазвол, каб надрукаваць у абласной газеце артыкул пра Міхася Васілька з нагоды 50-годдзя паэта. Баранаў ужо аднекуль ведаў, пра што буду яго прасіць, і да размовы быў падрыхтаваны. Адразу мяне аблаяў за дапамогу мацёраму буржуазнаму нацыяналісту – Васільку, які ў часы акупацыі бытта бы «якшаўся» з Беларускім камітэтам у Беластоку.

З камітэтам Міхась уступіў у кантакт па заданні партызанскай брыгады, камісарам якой быў тагачасны сакратар Гарадзенскага райкама партыі Дайнека, чаго Баранаў не ведаць не мог. Каб патрапіць пад шумную кампанію барацьбы з нацыяналізмам, якая тады грымела, адказную і небяспечную місію Васілька Баранаў браць пад увагу не хацеў: яна яму была невыгоднай.

Адным словам, чыноўнік тады мяне аблаяў. У адказ я штосьці рэзкае кінуў, а Баранаў павысіў голас яшчэ мацней. І скончылася наша дуэль тым, што Баранаў папёр мяне з кабінета ды патэлефанаваў сакратару партарганізацыі рэдакцыі Тропіну, каб той зараз жа выключыў Карпюка з партыі за пасобніцтва мацёраму нацыяналісту.

Справу маю тады ўладзіў Максім Танк. Аднак зуб на мяне Баранаў займеў. І цяпер – на табе, маеш! – праз колькі гадоў сустракаюся з тым самым Баранавым у Менску ў ролі прасіцеля.

Прымаючы з маіх рук апеляцыю, Іван Аляксеевіч адкрыта з мяне пакпіў:

– Навошта табе марнаваць час і паперу? ЦК КПБ цябе ўсё роўна не адновіць! Хопіць таго, што мы на рэспубліканскай парткамісіі пацвердзім рашэнне гарадзенскага бюро!

Я агрызнуўся:

– Справа ваша – матэрыял прыняць, зарэгістраваць і даць яму ход.

І праўда, парткамісія пры ЦК на сваім пасяджэнні неўзабаве справу без мяне разгледзела і, вядома, пакінула без змены. Далей мае

паперы Баранаў накіроўваць не спяшаўся, як я ні бамбіў ЦК пісьмамі і тэлефоннымі званкамі.

А час ішоў. Ад радні і нешматлікіх знаёмых, што яшчэ мяне не абміналі, я даведаўся, як пастарэў, згорбіўся і счарнеў з твару. Ды і сам адчуваў, як слабну з кожным днём, як падаю духам, раблюся панылым, змрочным, хоць у размове з блізкімі стругаю з сябе героя. Некуды падзеўся мой сон, таму днём і ноччу лазіў я, бы лунацік, па пустых гарадзенскіх вуліцах і па лесе. Тады сябе пачаў угаворваць: трэба ратавацца, бо інакш затопчуць. Ратавацца мушу. Няўжо дапушчу, каб узялі нада мной верх розныя бюракраты-авантурысты? Не прапускаюць справы на бюро? А я ўсё зраблю, каб яе прабіць?

Адным словам, я не пераставаў верыць, што недзе існуе справядлівасць, што ёсць людзі, якія напэўна ва ўсім гэтым разбяруцца і мяне абароняць.

І вось на ўрачыстым юбілеі нейкага нашага класіка, карыстаючыся запрашальным білетам ад Саюза пісьменнікаў БССР (з членаў СП СССР мяне яшчэ не паспелі выключыць), у оперным тэатры я нахабна прарваўся цераз ахову да Пятра Машэрава ды заявіў, што лічу сябе ні ў чым не вінаватым, сумленне перад партыяй і людзьмі маю чыстае, але мяне нядобразычліўцы здорава пакрыўдзілі. Папрасіў яго асабіста пацікавіцца маёй справай, а маю апеляцыю вынесці на абмеркаванне Бюро ЦК КПБ. На маё здзіўленне, Машэраў з прыязнай ветлівасцю мяне выслухаў і просьбу паабяцаў уважыць.

Дзякуй Богу, слова сваё гэты чалавек стрымаў.

## У прыёмным пакоі

Тая падзея адбылася памятным для мяне днём – 2 снежня 1972 года – і ўражанне зрабіла магутнае. Тое, што я там бачыў і чуў, было надта маляўнічым ды характэрным для сваёй эпохі. Такога не вычытаеш ні ў адной кніжцы, ні ў адным газетным артыкуле, таму лічу сваім абавязкам яго абнародаваць, пакуль памяць яшчэ трымае ў галаве ўсе дэталі, а сэрца захавала выразныя сляды таго хвалявання.

Нас, выключаных з партыі, у прыёмным пакоі на пятым паверсе ўсім вядомага будынка ў цэнтры Менска сабралася шэсць чалавек. Мужчыны нервова хадзілі па пакоі ды са злосцю касіліся на чорную скрыначку радыё, з якога расфуфыраная сакратарка ад няма чаго рабіць бесклапотна слухала якуюсьці цягучую музыку. Мяне ж разабрала дзіўная абыякавасць – на гэты раз ужо без ніякіх пігулак. Пра тое, што чакала, я абсалютна не думаў, толькі глядзеў ва ўсе вочы

ды прыслухоўваўся, ходзячы па паркеце разам з калегамі па няшчасцю.

Было надта ж цікава.

Адзін штрафнік з планкамі баявых ордэноў на грудзях стараўся давесці суседу, што ў партыі яго абавязкова адновяць, бо сам Машэраў не раз бываў на яго лесаўчастку, бачыў, які там парадак, нават хваліў за гэта. І быць таго не можа, каб Пётр Міронавіч гэтага не запамятаў.

Другі мужчына гаварыў, што ён старшыня калгаса, калісьці не хацеў заараць траву пад кукурузу, хоць атрымліваў вымову за вымовай. Пётр Міронавіч той яго ўчынак, напэўна, цяпер успомніць ды ацэніць – іначай быць не можа!

А нейкі высокі, сухі ды панылы, як сыч, стары прафесар пераходзіў ад адной пары да другой і шаптаў:

– Товарищи, но ведь Машеров матерый националист, вы не находите? Послушайте, товарищ, но ведь...

Нарэшце, пачалі выклікаць па адным на расправу. На дзіва, людзей затрымлівалі за дзвярыма чамусьці ўсяго хвілін пяць. Мужчыны выскоквалі праз вялізныя дзверы з прысудам, як ашалелыя, нічога не чуючы, не бачачы і нічога не гаворачы. Дый было такое ўражанне, што яны раптам страцілі здольнасць гаварыць! Дзяўчына цяпер выступала ўжо ў ролі нейкай сястры міласэрнасці і кожнаму цярпліва паказвала, як выйсці, а мужчыну з планкамі ўзяла нават пад локаць і правяла ў калідор.

«Што яны робяць?! – закіпеў у маёй душы бунт. – Напрыклад, у мяне гэтак усё заблытана, хіба ж за такі кароткі тэрмін можна разабрацца ў справе?!»

Але вось пераступіць запаветны парог дайшла чарга і да мяне. Нарэшце!

## На бюро ЦК КПБ

Зрабіў я некалькі крокаў, і перада мной адкрыўся зеў велізарнага, як футбольнае поле, кабінета першага сакратара ЦК КПБ. З левага боку пад сцяной выцягнуліся адзін за адным чатыры ці пяць сталоў, а яшчэ два сталы ў процілеглым ад мяне канцы, у самым яго тарцы, стаялі ўпоперак, утвараючы з мэблі такім чынам літару «Т». Уздоўж тае перакладзіны, як апосталы на малюнку «Тайная вячэра», расселіся важна члены бюро ЦК, а пасярэдзіне – сам Машэраў. Мяне пасадзілі ад сябе надта далёка, у канцы ножкі «Т», пад мікрафон.

І пачалася мая справа.

Баранаў спачатку выклаў, як я ўтаіў ад партыі колькасць бацькавых кароў – упісаў у аўтабіяграфію на адну рагулю менш. Утаіў аднаго каня, а зямлі – аж на трынаццаць гектараў! Як падрабіў даведкі для асабістай справы. І што з партыі ўжо выключаўся неаднойчы.

У самым разгары баранаўскага даклада нейкі нецярплівы вайсковец з ліку «апосталаў» паспрабаваў дапамагчы Івану Аляксеевічу:

– Ён яшчэ і ў нямецкім лагеры сядзеў!

– Ён з лагера нават уцё-ок!..

Са словаў другога падказчыка выходзіла, што знаходжанне ў нямецкім лагеры і асабліва ўцёкі з яго – немаведама якая загана.

Бліжэйшы да мяне з членаў бюро сядзеў сакратар ЦК КПБ па сельскай гаспадарцы І.Міцкевіч – той, якога я некалі папракаў за чужы ордэн, які ўсяго праз 10 гадоў у Маскве ў Вялікім тэатры оперы і балета папрасіць у мяне прабачэння. Цяпер ён не вытрываў, падаў рэпліку таксама:

– Мы з ім разбіраліся не раз, калі яшчэ працаваў я ў Гародні. Чатыры з палавінай гадзіны аднойчы гутарыў з ім, а пераканаць так і не змог. Закаранелы! Што ж, бацька яго – мацёры кулак, а сам ён – сын кулака! Праўда, у яго цешча залаты чалавек – Фаіна Абрамаўна Цыгельніцкая. Старая рэвалюцыянерка і сяброўка па падпольнай барацьбе Прытыцкага. Сам жа ён адкрыты вораг і антысаветчык!

Гэтага яму здалося мала. Міцкевіч падумаў, што б дабавіць яшчэ, і кінуў:

– А сябруе, ведаеце, з кім?

Тут абвёў вачыма сяброў і вытрымаў паўзу, каб прысутных уразіць яшчэ больш:

– З Алесем Адамовічам!

Ну, заахвочаны такімі рэплікамі, Баранаў пасыпаў зноў факты. Маўляў, невядома, дзе я правёў у вайну цэлы год – няма даведак. Як гэта я з лагера ўцёк, калі адтуль не мог уцячы ніхто! Яго бацька перад вайной кулацкім падаткам абкладаўся, і таму можна зразумець, чаму ў сына такія паводзіны. Адным словам, паводзіны яго – акурат шкоднага ворага і антысаветчыка!

А далей дакладчык пачаў паўтарацца ды нешта блытаць. Машэраў свайго інструктара слухаў, слухаў, нарэшце нецярпліва абарваў:

– Ты, Баранаў, нам тут пачаў нейкія байкі залівацць! Гэтак і на мяне можаш накалупаць матэрыялу!

Збіты з панталыку, дакладчык замоўк, на яго твары з’явілася

дурнаватая ўсмешка.

Машэраў нядобра на яго паўзіраўся, працягнуў:

– Адназначна можаш! Якую табе даведку трэба на ўцёкі з лагера? Хто табе яе выдасць? Немец? А дзе ты фрыца таго, што праваронiў на пасту таварыша Карпюка, цяпер возьмеш?

За сталом некалькі галасоў хіхікнула.

Машэраў далей гаварыў:

– Што ён уцёк з лагера? За гэта малайчына! А ўцёкшы, не кудынебудзь пабег, не да мамкі на печку, толькі – у партызаны, каб з немцамі ваяваць!

Тут раптам той самы нецярплівы вайсковец ужо зусім у іншай танальнасці Машэраву падказаў:

– А ён яшчэ на фронце нават паранены! І два разы паранены, адзін – вельмі цяжка!

Машэраў на падказку падхаліма нават вухам не павёў:

– З гэтага боку таварыш Карпюк – чалавек чысты. А кулацкі сын? На Беласточчыне польскія таварышы вазілі мяне на яго хутар, і я бачыў, якія гэта кулакі: лапцем шчы хлябалі. Таксама і бацька яго быў у партызанах, нават і маці. Карпюкі ваявалі, больш бы ў нас было такіх патрыётаў у вайну! Мы не за гэта Аляксея Нічыпаравіча цяпер разбіраем.

Я сваім вушам не верыў. Бо ўсяго спадзяваўся, але каб аж так павярнуліся мае справы?!

Тым часам Машэраў, устаючы з-за стала, – высачэзны, даўгі, – спакойна і ўпэўнена гаварыў далей:

– Мы разбіраем яго справу за выступленні на з’ездах і пленумах СП БССР. Вы, таварыш Карпюк, калі і бачылі што-небудзь заганнае, то, як сапраўдны камуніст, павінны былі ў першую чаргу сюды прыйсці ды выкладваць, што маеце, а вы як рабілі? Вылезеце на трыбуну ды галосіце на ўсю рэспубліку. Я, бывала, прывязу з Масквы гасцей у Саюз пісьменнікаў Беларусі, а яны з Быкавым, Адамовічам павылазяць на трыбуну ды на гасцей валяць, а мне – хоць скрозь зямлю праваліся! Вось за што мы вас цяпер разбіраем. Думаю, варта тут паслухаць камуніста Карпюка, чаму ён так сябе паводзіць. Няхай нам тут скажа, што ён аб гэтым думае. Пярэчанняў няма? Не чуваць. Тады – слухаем!

А я ўсё не веры́ў сваім вушам. І «таварыш Карпюк», і «камуніст Карпюк», і «Аляксей Нічыпаравіч». І чаму перад выступленнямі не заходзіў да яго (бытта мяне пусцілі б у гэты самы кабінет на пятым паверсе!). І тое, што Машэраў на ўласныя вочы агледаў на Беласточчыне наш хутар...

Раптам я адчуў, як устрапянулася мая душа. Як кожная клетачка мая напаўняецца сілай. Як вырастаюць ў мяне крылы!

Гэта была за шмат-шмат гадоў, за тысячагоддзі мая першая перамога над хлуснёй!

Гэта быў мой даўночаканы трыумф!

А сказаць мне было што. Я пра гэта думаў і передумаў усе апошнія месяцы, тыдні, дні, гадзіны, а яны цягнуліся надта марудна. Таму цяпер, не чуючы пад сабой ног, я ўсхапіўся ды пачаў больш-менш спакойна і ўпэўнена гаварыць:

– Га, чаму сябе так паводзіў? Бо іншыя, Пётр Міронавіч, любяць за вугламі брахаць, а калі выйдуць на трыбуну, то гавораць ужо зусім-зусім іншае. Гэта, па-вашаму, правільна? Так сябе павінны сапраўдныя людзі паводзіць? Па-мойму, калі ты маеш што, то з гэтым і на народ выходзь ды гавары, а не брашы за вугламі. Я сябе паводзіў паводле такой менавіта этыкі. Што, мажліва, памыляўся часамі? Мабыць, і вельмі памыляўся. Аднак я Вас, Пётр Міронавіч, і вас, шаноўныя члены Бюро ЦК КПБ, тут спытаюся: які грамадзянін, камуніст і чалавек лепшы: ці той, хто да ісціны даходзіць цераз пошукі ды памылкі, ці той, хто ўспрымае яе, гэту ісціну – адзіную і непаўторную, – як завучаны ўрок?

Сказаў я гэта, бы адрэзаў, і сеў. Ды сам нават здзівіўся, што бразнуў такой удалай думкай.

Выпаліў проста і хітра!

Але ж і ўдалося мне! Ні «апостал» вайсковец, ні Міцкевіч, ні Баранаў, вядома, для мяне не «шаноўныя», але чорт іх бяры, хай абліжуцца!

Толькі, Божа мой, што пачалося пасля мной сказанага!

– А-а, то вы так ісціну шукалі?! – па-маладому зноў ускочыў на ногі Машэраў ды не без сімпатыі пачаў мяне касціць. – Перад кім вы яе шукалі, перад абывацелямі? А ці ведаеце, людзі гэтыя вам апладзіруюць, падхіхікваюць, а затым сюды прыходзяць, сядаюць во на гэтае крэсла ды рознае свінства на вас валяць! Так, так, не здзіўляйцеся, я вам праўду гавару, – валяць! А вы – зноў усё сваё! Так камуністы сябе паводзяць?

Машэраў, як вядома, звычкі лезці па словы ў кішэні не меў. Яны і на гэты раз ліліся з яго патокам. Касціў мяне гэтак мінут з трыццаць, успамінаючы факты з маёй біяграфіі, са спатканняў, з чаго я зрабіў сабе выснову: служба даносаў у беларускім ЦК партыі стаіць на вышыні.

За першым сакратаром ЦК узялі слова Кузьмін, Аксёнаў, але і ў іх адчуваліся тыя самыя добразычлівыя ноткі.

Адным словам, пытанне маё на Бюро ЦК КПБ разбіралася амаль тры гадзіны, а час праляцеў, як адно імгненне. Выходзіў я з кабінета, бы на крылах.

У прыёмнай перадавалася ўсё тая ж класічная музыка, і ўпершыню ў жыцці я адчуў яе магутнае хараство.

З апарата плылі не гукі, а нейкія гаючыя лекі, якія хтосьці далікатна ліў на маю збалелую душу, і яна на вачах набірала сілы і спакою.

І дарогі мне паказваць не трэба было. Але я выходзіць не спяшаўся, бо надта цёпла і прыемна ззяла электрычнасць, весела і прыязна свяціўся жоўты лак мэблі, стралялі радасныя прамені ад крышталю на стале ды кінулася мне ў вочы надзвычай густоўная прычоска з каштанавых валасоў дзяўчыны, якую, мабыць, выбіралі на рэспубліканскім конкурсе прыгажунь – аж вачэй нельга было ад яе адвесці!

Нарэшце, выйшаў я ў калідор і свабодна пакрочыў, а грудзі мае поўніліся ўсё тым самым пачуццём перамогі.

Эх, як прыемна было адчуваць такое!

Як прыемна было жыць!

Людзі, я вас усіх люблю і зноў усіх вітаю!

... Між іншым, вярнуўшыся дамоў, у наступны дзень я ў добрым настроі зайшоў ва універмаг. Зайшоў проста так, як ходзяць у лес, каб пабыць аднаму. Стаю перад прылаўкам. Гляджу на тавар і зусім яго не бачу, а проста бытую сам з сабой ды ўсё перажываю ўчарашняе здарэнне ў Менску на пятым паверсе галоўнага партыйнага дома, захапляючыся такім дасціпным сваім адказам. Заадно дзіўлюся: як сумясціць Машэрава, з яго ўзроўнем мыслення, з узроўнем і норавамі яго паплечнікаў, якія падпявалі яму на бюро, бы флюгеры. Успомнілася: у жыцці падобную з’яву я ўжо назіраў і гэтаксама тады дзівіўся сумяшчэнню Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Васіля Казлова і міністра НКУС Лаўрэнція Цанавы. Ад таго, што абодва –Машэраў і Казлоў – працавалі з такімі нікчэмнасцямі і не толькі іх цярпелі, а, найхутчэй, лічылі сваімі паплечнікамі, вобразы аднаго і другога блеклі.

Раптам чую, мяне нехта далікатна бярэ ззаду за локці, па-сяброўску іх націскае, а знаёмы голас на вуха кажа:

– Ну і малайчына, што адбіўся! Віншую! Я за цябе ад душы рады! Так і далей трымаць!

Я азірнуўся, ды чалавек пайшоў ужо.

Па фінскім цёмным касцюме ў белую палоску я пазнаў самага заядлага свайго ворага, арганізатара свінства на мяне, Быкава і

Клейна. Яго жэст надта азадачыў: як гэта разумець? І што цяпер: радавацца мне яшчэ больш ці насцярожыцца? ... Праз пару тыдняў пасля таго, як вярнуўся я з Менску, паклікалі мяне ў гаркам і далі пачытаць рашэнне Бюро ЦК. На дзіва, там зноў былі пералічаны ўсе мае ўяўныя злачынствы, а пад канец стаяла: ЦК пакідае мяне ў партыі, але не таму, што не было за што выключыць, а з-за майго шчырага раскаяння ды прызнання памылак. Захацелася зараўці: дзе ж тыя памылкі?! На бюро зусім інакш ставілася пытанне!

«Баранаў – ах, штукар! – адыграўся на мне, – хапіла мяне здагадка. – Ведае, паганец, што я зноў да Машэрава не пабягу!»

Узнімаць бунт і бегчы ў тую кантору другі раз мне ўжо расхацелася. Такі ўзялі нада мной бюракраты верх.

## Раздзел чацвёрты

### Вяртанне да нормы

Літаральна праз нейкі час усё пачало ў нас мяняцца, бы ў той байцы. Напэўна, у многім спрычыніўся да гэтага Машэраў, які ўсё больш уваходзіў у справы рэспублікі.

Мне і Клейну вярнулі партбілеты.

Быкаў не толькі стаў лаўрэатам, але і газеты ўсё часцей пачыналі яго хваліць.

У вобласці стала больш парадку.

Адзін за адным абармоты паляцелі з пасад. Зрэшты, некаторыя да таго сябе скампраментавалі, што органам кантролю аблегчылі іх звальненне.

«Генка» папаўся на непрыстойных махінацыях. З «мэра» горада перавялі яго дырэктарам камбіната. Бачачы, што ўсё гэта толькі пачатак, аднойчы напіўся ды з дубальтоўкі стрэліў сабе ў рот.

Магільніцкі выбіўся ўжо ў пракуроры рэспублікі. Вельмі пышна сябра пахаваў. Яшчэ дапамог яго судовую справу ануляваць, але пагарэў неўзабаве і сам на вядомай у рэспубліцы авантуры, пасля чаго яго звольнілі з пасады ды выключылі з партыі.

Затым наш абласны цэнтр патрэсла справа высокапастаўленых паляўнічых.

Згаданы ўжо сакратар абкама партыі Аляксандр Ульяновіч з начальнікам КДБ Кузняцовым і намеснікам старшыні аблвыканкама Пронькам былі да ўсяго заўзятымі браканьерамі. Гэтыя зухі пад Новы год заехалі ў дзяржаўны Белавежскі заказнік, каб разжыцца на свята дзічынай. Панапіваліся, кажуць людзі, да таго, што ў вачах ім стала

дваіцца ды траіцца. У выніку чаго адзін, страляючы бытта бы па кабану, загнаў жакан Ульяновічу ў жывот.

Пасля гэтага выпадку не толькі пастралялі васьмярых ганчакоў высокапастаўленых паляўнічых. Усіх «варашылаўскіх стралкоў» Машэраў зараз жа звольніў з працы.

ЦК КПБ у пакаранне з абкамаўскай пасады зняў і Ульяновіча. Але, як трапна сказаў наш мудры Кандрат Крапіва, бюракраты паасобку не жывуць, існуюць толькі клубамі. Вось і гэты чалавек, маючы за сабой шмат сяброў, надта ж хутка дамогся памілавання і стаў намеснікам міністра культуры. Калі выйшаў на пенсію, узначаліў у Менску музей ВАв.

Здавалася б, падзеі павінны ўжо былі навучыць няўрымслівага Аляксандра Восіпавіча. Ды натура браканьера не дае чалавеку спакою і цяпер. Зноў смаліць па пісьменніках – на гэты раз ужо ад менскай вандэі.

Чацвёртага ліпеня 1987 года рэспубліканская газета «Звязда» на ўсю Беларусь абрынула рэзкі артыкул, падпісаны таксама і Ульяновічам (усяго аўтараў – шэсць), у якім крытыкавала В. Кандрацьева, Д. Граніна, А. Адамовіча, Ю. Балашова за «...актыўную прапаганду тэзіса аб агульначалавечым гуманізме, у аснове якога ляжыць біблейскі запавет «не забі», за прыдуманую асобнымі літаратарамі «акопную праўду»... Што знаходзяцца яшчэ і цяпер такія аўтары, не дзіва. Іншаму цемрашалу хоць кол на галаве чашы, а ён будзе плявузгаць сваё, бо і праўду людзі кажуць: на свеце бывае ўсё, акрамя слупоў, каб падпіраць неба, акрамя паясоў, каб падпяразаць горы, акрамя мяжы глупству.

Успамінаю тут Ульяновіча між іншым. Хачу праблему ўзняць глыбей.

Адразу пасля землятрусу ў Ленінакане мой сын, які прымаў удзел у ратавальных работах ад Сухумскага фізіка-тэхнічнага інстытута, мне паскардзіўся:

– Разумееш, тату, у сапраўдны бетон бухнеш кувалдай, і яна са звонам адскочыць. А там удар у любое месца па панелі – і кувалда праваліцца па ручку, як у труху! Бо цэмент пайшоў налева! Арматура не зварана, прэнцікі кожны па сабе. З-за вечнага разгільдзяйства дзевяціпавярхоўкі развальваліся лёгка, бы картачныя домікі, і процьму народу прыдушылі!

Калі гаварыць паралелямі, у часы застою і нашая мараль будавалася на каркасе, зробленым вось такім цяп-ляпам. А мы дзівімся, адкуль бяздушныя бюракраты, адкуль такія сакратары райкамаў, што не маюць павагі ні ў дарослых, ні ў моладзі. Не дай Бог

цяпер землятруса, што перажылі мы ў 1941-1945 гадах!

Аднак мне, мужыцкаму сыну, які душой навекі зросся з зямлёй, на заканчэнне «Хронікі» хочацца спусціцца з інтэлігентных праблем і зноў пагаварыць пра сяло.

## Разважанні пра мінулае

Пасля 1954 года хрушчоўскія рэформы адкрылі калгасам другое дыханне.

Дазволілі тады вярнуцца ў сёлы і выселеным ды вывезеным. Напалоханыя да смерці аднойчы, тысячы няшчасных мужыкоў – грамадзян СССР, карыстаючыся тым, што да 1939 года яны мелі польскае грамадзянства, з месца ссылкі адправіліся прамым ходам у ПНР: не захацелі паспытаць лёс яшчэ раз.

Акурат у той самы час у Маскве пабываў Конрад Адэнаўэр. Нямецкі канцлер да смерці сварыўся з Хрушчовым за кожнага немца, які яшчэ заставаўся ў СССР у лагеры, сварыўся гэтак, каб з Крамля яго чуў увесь свет. Нашых жа грамадзян у той час ад'ехала ўПольшчу дзесяткітысяч –палякаў яўрэяў, але нікога абсалютна гэта не хвалявала. Выязджалі, каб пры перамене ўлады ў СССР зноў не трапіць у ранейшую сітуацыю і не скончыць жыццё ў ссылцы. Аднак ніхто не спрабаваў іх адгаварыць, супакоіць, стрымаць. Толькі большасць высланых усё ж такі вярнулася да родных пенатаў. Зноў жа ніхто ў іх не папрасіў прабачэння. Аб іх невінаватасці не было абвешчана ўсенародна, не гаворачы аб афіцыйнай рэабілітацыі, – сарамліва выпускалі, і справе канец, чым далі падставу для розных правакацыйных меркаванняў. Паўтараю, цяпер нам вядома, што ў 1940-1941 гадах з Заходняй Беларусі вывезлі ў Сібір 400 000 чалавек, гэта значыць 10 працэнтаў усяго насельніцтва Заходняй Беларусі. А вывезеных пасля вайны ніхто не лічыў і лічыць, здаецца, не збіраецца. Хоць зрабіць гэта вельмі ж лёгка. У кожным сельсавеце Гарадзеншчыны ляжаць асабовыя справы сялян, на якіх накладзены рэзалюцыі энкэвэдэшнікаў: «семья кулака, подлежит ликвидации хозяйство, а члены семьи – к высылке». Толькі прайдзіся па сельсаветах, палічы...

Адным словам, цяпер не скажаш, колькі іх было, наднёманцаў, тады на высылцы і колькі ў лагерах – 10 тысяч, сто, паўмільёна, а колькі памерла ў халоднай тундры, стэпах Казахстана і дзе іхнія магілы.

Ніхто не вярнуў ім і адабраных гаспадарак, дамоў, млыноў ды кузняў з варштатамі. Прыбітыя, прыніжаныя і напалоханыя, яны

яшчэ доўга прыходзілі ў сябе, ціхенька седзечы, як мышы пад венікам. Мінула пару гадоў, як людзі пачалі адкрыта гаварыць аб той несправядлівасці, але большасць так і закончыла сваё жыццё, не дачакаўшыся хоць якой маральнай рэабілітацыі.

Адным словам, пад канец пяцідзесятых і ў першай палове шасцідзесятых, покуль у верхніх эшалонах здзекаваліся з творчай інтэлігенцыі, жылі сабе прывольна і ў вус не дзьмулі, абзаводзячыся шыкоўнымі кватэрамі, ордэнамі, вучонымі званнямі, выдаючы замуж дачок, гэтак жа выгодна жэнячы сыноў, у вёскі Гарадзеншчыны разам з выселенымі вярнулася любоў да працы, народная добрасумленнасць, якая з гадамі пачала прабівацца наверх скрозь іржу крыўд і дзікага адміністравання.

Неўзабаве і сярод вясковага начальства, аб чым я ўжо гаварыў, навялі збольшага парадак. У нас гэтыя зрухі, дзякуючы сумленнаму і аўтарытэтнаму нават у прывольным Крамлі Пятру Машэраву, пачаліся значна раней, чым па краіне Саветаў (толькі гэтым я тлумачу, што на Беларусі ў часы застою амаль не арыштоўвалі, не высылалі за граніцу, не садзілі ў «псіхічку» дысідэнтаў).

Услед за Ульяновічам з Гародні зніклі Малочка і Мікуловіч. Першым сакратаром абкама стаў Леанід Кляцкоў – чалавек ураўнаважаны, мудры, багаты душой і справядлівы. Ён адразу змікіціў, што ў дзяржаўных інтарэсах трэба вярнуць чалавеку Гарадзеншчыны веру ў здаровы розум і ў глыбокія маральныя вытокі нашай справы.

Не памятаю выпадку, каб Кляцкоў хоць адзін раз каго-небудзь з літаратараў не прыняў, не выслухаў, не дапамог, не вырашыў пытання паводле сваёй любімай прымаўкі: няма праблемы!

Толькі з’явіўшыся на пасадзе першага сакратара абкама, Кляцкоў адразу захацеў пазнаёміцца і са сваімі літаратарамі.

Пры сустрэчы з Быкавым яму сказаў:

– Добра пішаце, Васіль Уладзіміравіч! Аб ваенных асабістах, я лічу, пішаце замякка! Трэба пра іх больш сурова пісаць! Я сам на фронце бачыў, колькі шкоды прынесла гэтае племя!.

Забягаючы наперад, успамінаю выпадак, калі я з гісторыкам Міхасём Ткачовым зайшоў да яго напрыканцы 1987 года і пацікавіўся: дык што ж адбылося ў Маскве на пленуме ЦК КПСС, што там такое Ельцын сказаў, чаму яго адразу пазбавілі ўсіх пасад?!

Удзельніка таго пленума Кляцкова нібы ўкалолі. Стары з болем у душы прастагнаў:

– Ой, як кепска атрымалася! Не трэба было, ні ў якім выпадку нельга было так з ім распраўляцца! – І з глыбіні душы вырваўся крык

адчаю: – Навошта яны гэта зрабілі?! Адным словам, пры Кляцкове мы пачалі выпроставаць плечы.

Тыя самыя калгасы, саўгасы нават без падрадаў і арэндаў, дзякуючы дастатковай колькасці людзей на вёсцы і мурашынай іхняй руплівасці ды сціпласці, памалу пераўтварыліся ў мала дзе практыкуемыя ў Саюзе аб'яднанні творча працуючых калгаснікаў, аграномаў ды сельскіх інжынераў з іншымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі (я не спецыяліст, вызначыць форму дакладна не бяруся!), на чале з чалавечнымі і мудрымі новымі старшынямі. Яны разам стварылі тое, аб чым сталі ўсюды гаварыць. Мяркуйце самі.

Згодна з паказчыкамі 1987-1989 гадоў па вытворчасці збожжа (каля 40 цэнтнераў з гектара!), мяса і малака на душу насельніцтва наша вобласць наблізілася да ўзроўню Заходняй Еўропы, значна абышоўшы астатнія рэгіёны краіны. У параўнанні з іншымі рэспублікамі, зараз тая самая Беларусь, дзе так многа пясчаных земляў11, камяніцы, – рэспубліка перадавая. Толькі поспехі яе ідуць, галоўным чынам, за кошт высокіх паказчыкаў у вёсках, далучаных да СССР у 1939 годзе. Дастаткова глянуць на зводкі па ўраджайнасці і дасягненні жывёлагадоўлі, каб пераканацца, што ўсходнія вобласці даюць на адну чацвёртую, па асобных паказчыках – на адну трэцюю частку менш. Але, беручы агулам, заходнія вобласці (Гарадзенская і Брэсцкая) усю рэспубліку выводзяць у перадавыя. (Напрыклад, за 1989 год па ўраджаі збожжа Гарадзенская вобласць Заходняй Беларусі дала 39,5 цэнтнера з гектара, Віцебская вобласць усходняй Беларусі – 24,5 цэнтнера, Магілёўская – 28,5 і г. д.).

Такія рэаліі.

Адным словам, на агульнарэспубліканскія паказчыкі ў першую чаргу ўплываюць дасягненні Прынёманшчыны. Прычына «гарадзенскага феномену» аж просіцца, каб аб ёй заявіць на ўвесь свет.

Па-першае, прымусовая і бязглуздая калектывізацыя, вываз творчай інтэлігенцыі ды лепшых сялян разам з выдатнымі вясковымі спецыялістамі – млынарамі, кавалямі, стэльмахамі ды іншымі майстрамі – у Сібір, Казахстан у нас адбылася, дзякуй Богу, на 20 гадоў пазней глыбінных рэгіёнаў СССР – пазней на цэлае пакаленне! Працягвалася не так доўга і крывава, а праз чатыры-шэсць гадоў людзі вярнуліся да сваіх гнёздаў. Па-другое, высланы ў 50-х гадах трапляў ледзь не ў райскія ўмовы ў параўнанні з тым, што перажылі вывезеныя ў канцы 20-х, у пачатку 30-х. Таму цалкам разбурыць творчую атмасферу ў нас, зусім разваліць мацерыковую народную культуру Правадыр і Настаўнік усіх народаў не змог.

Менавіта таму нашы вёскі амаль не ведаюць дэфіцыту рабочай

сілы: з іх у горад не надта і выязджаюць, чаго не скажаш пра іншыя вобласці.

Вядома, і ў нас зніклі населеныя пункты з карт, але ж паўнакроўных вёсак не стала толькі дзвюх – Вялікай ды Малой Капліцы. Іх спляжыў хімкамбінат «Азот», пашыраючы свае цэхі А здарылася злачынства таму, што ўтой час, калібульдозеры руйнавалімураванкіабедзвюх Капліц, яшчэ не саспела грамадская свядомасць. Сёння, напэўна, адна «Паходня» гэтыя старажытныя вёскі, памянутыя ў дакументах XVI і XVII стагоддзяў, лёгка адстаяла б і знявечыць напэўна не дала б. Прыезджыя дзівяцца нашым поспехам. Не толькі сельска-гаспадарчым.

Будуюць у нас не так, як у Ленінакане.

На будаўнічых пляцоўках у нас наогул пануе лад, там нічога не марнуецца, усё ляжыць на сваім месцы.

Нават п’яніц у нас менш.

Пераважна ахайныя дамы ў вёсках і пасёлках.

Паміж сёламі, вёсачкамі заасфальтаваныя дарогі.

Захаваліся помнікі культуры, культавыя будынкі, як іх ні нявечыла вульгарная сталіншчына пры дапамозе сваіх апрычнікаў. І цяпер, напрыклад, калі ў Гародні ўдараць на Дабравешчанне званы ўсіх пяці храмаў, то цяплее на сэрцы, хочацца быць чысцейшым і дабрэйшым. І гэта – мне, атэісту са стажам, якому, здавалася б, не павінна было б быць ніякай справы да культавых атрыбутаў.

Наша моладзь не ведае нават, што такое талоны на малако, масла і мяса.

Ніхто не цкуе ўжо і нашых пісьменнікаў, усе мы з кватэрамі, тэлефонамі. Агорнуты гэтымі ілюзорнымі паказчыкамі, я не раз унушаў знаёмым і незнаёмым:

– Эх, хіба так наша рэчаіснасць выглядала б, калі б і прынёманскага краю не крануў катаклізм эпохі «Вялікага і Мудрага Правадыра ўсіх народаў ды Карыфея навук»?! На жаль, скуткі яго ўлады адчуваць будуць яшчэ і праўнукі.

## Непрадбачаны кульбіт

Хацелася скончыць «Хроніку» на аптымістычнай ноце, ды не атрымліваецца.

Нядаўна ў нас змянілася абласное кіраўніцтва. Мудры і справядлівы Леанід Кляцкоў, які сваіх літаратараў апекаваў і ўсяляк ім дапамагаў, а на зграю сталіністаў адзеў наморднік, нечакана для ўсіх пайшоў на пенсію. Тыя, каго я калі-небудзь крытыкаваў, хто

затаіў да мяне антыпатыю, адразу пачалі дзейнічаць. Як па камандзе!

У канцы лістапада 1989 года праходзіў пленум Гарадзенскага гаркама партыі па нацыянальным пытанні. Я – аўтар некалькіх дзесяткаў беларускіх кніжак з рознай тэматыкай, перакладзеных на розныя мовы, выдадзеных накладам больш за мільён. У іх мной апісаны кожны куточак горада і ўсе жыццёвыя яго перыпетыі. Як-ніяк, а ў афіцыйным бібліяграфічным даведніку для аднаго пераліку маіх твораў ды артыкулаў пра мяне вылучана цэлых трынаццаць старонак! Такім чынам, хочацца каму ці не, а я – менавіта той, хто ўнёс пэўны ўклад у галіну нацыянальнай культуры свайго рэгіёна. Таму, здавалася б, я павінен быць удзельнікам гэтага пленума ці, прынамсі, мяне павінны былі заклікаць да распрацоўкі яго рашэнняў. Але – дзе там!

Як бы радуючыся, што вярнулася магчымасць зноў ва ўсіх грахах абвінавачваць творчую інтэлігенцыю, першы сакратар гаркама А.Алёшын у сваім устаноўчым дакладзе з якойсьці бяздумнай лёгкасцю абвесціў, што сакратар аддзялення СП БССР у Гародні Карпюк са сваімі літаратарамі «спрабуе пазбавіць беларускі народ яго гістарычнага мінулага, пры кожным выпадку ўбівае клін паміж працоўнымі і прадстаўнікамі савецкай улады» (чытай: паміж працоўнымі і – Малочкам, Ульяновічам, Міцкевічам, «Генкам», Алёшыным!), чым, як сцвярджае дакладчык, «Карпюк наносіць шкоду жыхарам горада і ўсяму беларускаму народу».

За Алёшыным выступаючыя пачалі гаварыць у такім жа духу. Для мяне гэта было так нечакана, што я ўстаў, плюнуў і дэманстратыўна з пленума пайшоў.

Амаль адначасова орган абкама партыі газета «Гродзенская праўда» выступіла супраць мяне з падборкай тэндэнцыйных артыкулаў з-за таго, што летам я надрукаваў урывак з гэтай самай «Хронікі» пад назвай «Печальные были».

Першым на старонках абласной газеты абрынуўся на мяне ветэран вайны і працы, былы палітработнік МТС і райкамавец А. Талкачоў. Заўважыўшы, што я выхадзец з сям'і «кулака» (і не абрыдне ім без канца паўтараць гэты жупел!), ён абвясціў, што перад вайной я вучыўся ў Віленскай гімназіі, калі, маўляў, народ у Польшчы жыў так цяжка, што толькі ў Навагрудскім раёне не магло вучыцца столькі-та тысяч дзяцей. «Свой матэрыял, надрукаваны ў двух нумарах газеты, – сцвярджаў гэты былы палітработнік МТС, – Карпюк пачаў з моднай сёння тэмы – крытыкі Сталіна і перыяду рэпрэсій (для А.Талкачова, бачыце, усё гэта толькі мода!). Але калі ўчытаешся, становіцца зразумелым, што гэта толькі шырма, за якой А.Карпюк імкнецца

развянчаць усё добрае, што было дасягнута народам, ачарніць яго гістарычнае слаўнае 70-годдзе…»

З асабістых уражанняў пасля вызваленчага паходу ў Малдавію А.Талкачоў апісаў, як там спатыкалі нашы войскі са шклянымі пасудзінамі віна ў руках, як сяляне з радасцю і наперабой імкнуліся запісацца ў калгас.

Бытта і не было ачышчальнай дакументальнай аповесці такога самага ўдзельніка тых падзей Восіпа Герасімава «Стук у дзверы», якая паказала і жудасныя сцэны вывазу ў Сібір малдаван у той час, калі Талкачова частавалі віном. Але сумленне яго не мучыць нават цяпер, калі ўсё гэта абнародавана! Далей у артыкуле ён абураецца, што я ў непрывабным выглядзе паказаў работнікаў органаў, саратнікаў крывавага ката беларускага народа Л. Цанавы, якія, маўляў, у мірны час не ведалі спакою (чытай: пры арганізацыі рэпрэсій і ў вайне з уласным народам!). А яшчэ заклікаў чэкістаў не маўчаць.

Скончыў артыкул былы палітработнік МТС так: «Што тычыцца 10 ці100 тысяч вывезеных, рэпрэсаваных па нашай вобласціўчасы калектывізацыі, то гэта падобна на трызненне, калі не сумесны пасквіль».

Бытта і не публікавалася шмат адпаведных стотысячных даведак у сувязі з 50-годдзем уз'яднання Беларусі. Старшыня Савета ветэранаў органаў унутраных спраў вобласці падпалкоўнік у адстаўцы Н. Атаманаў услед за Талкачовым у другім артыкуле сказаў: «Так, прывабнай вонкавасцю тыя супрацоўнікі праваахоўных органаў не вылучаліся: не да таго было. Не вылучаліся і асаблівай інтэлігентнасцю ў тыя вогненныя мірныя гады, калі асабовы склад знаходзіўся ўвесь час у гатоўнасці нумар адзін (чытай: для барацьбы са сваім народам). І асаблівай вучонасці яны не выказвалі. Рэдка ў каго з іх была сямігадовая адукацыя, а пераважна – пачатковая школа».

Тут Н. Атаманаў Амерыкі не адкрывае. Ва ўсе часы ведаў і розуму ад цэрбераў не патрабавалася, людзі для гэтай службы падбіраліся не лепшага гатунку!

Ветэран вайны і працы Г.Шоўга ў трэцім артыкуле дадае: «Гаворачы аб стварэнні калгасаў у Сапоцкінскім раёне, аўтар груба, як невук, адгукаецца аб органах савецкай улады і аховы правапарадку ў той час, апраўдваючы асоб, якія аказвалі лютае супраціўленне органам і агітацыйна-прапагандысцкаму актыву».

І нарэшце, 23 снежня 1989 года з'явіўся матэрыял ледзь не на цэлую газетную паласу пад грыфам: «У БЮРО АБКАМА КПБ Аб звароце ў лістах ветэранаў вайны і працы ў абкам партыі з прычыны

публікацыі «Печальные были» А. Карпюка ў газеце «Гродненская правда».

Ніжэй сказана, што ў Гарадзенскі абкам КПБ звярнуліся ветэраны вайны і працы домакіраўніцтва № 8, члены Савета ветэранаў вайны і працы (галоўным чынам, былыя работнікі МУС, якія ўсе тыя эксцэсы тварылі! – **тлумачэнне маё, А. К.**) з просьбай разабрацца з беспрынцыповай пазіцыяй рэдакцыі «Гродненская правда», якая «дапусціла публікацыю на сваіх старонках артыкулаў А. Карпюка, – яны ачарнілі гісторыю вобласці і яе людзей, сказілі ісціну».

Затым быў апублікаваны матэрыял спецыяльнай камісіі, якая разбіралася па гэтай справе.

Камісія прыйшла да высновы, што А. Карпюк суб'ектыўна і аднабакова адносіцца да вызваленчай місіі, вызваленчага паходу ў верасні 1939 года Чырвонай Арміі, бо ўдзельнік яго Г.Маскаленка якраз з захапленнем апавядае, як з хлебам-соллю, з незвычайнай радасцю (бытта і я не гаварыў аб той эйфарыі, якая агарнула просты народ, які яшчэ не ведаў усяго, што яго чакае неўзабаве!) сустракалі чырвонаармейцаў, стараючыся іх пачаставаць крынічнай вадой, свежым малачком і г. д.

Ніжэй у рэдакцыйным артыкуле зноў гаварылася аб падазронай ведамасці ў канцлагеры Штутгоф з маім подпісам на атрыманне тры разы па дваццаць марак, аб уцёках з яго і паклёпе на Грушэўскага.

У канцы абкамаўскага матэрыялу ў газеце сцвярджалася, што Бюро ЦК КПБ за грубыя палітычныя памылкі (за мае выступленні на форумах СП БССР, якія зараз публікуюцца ў кніжках, бо думкі, закладзеныя ў іх, супалі з тымі, што ляглі ў аснову нашай перабудовы) дало А.Карпюку суровую вымову з занясеннем ва ўліковую картку.

Выходзіць, усё паўтарылася з часоў пачатку 70-х гадоў. А калі быць дакладным, то штосьці падобнае ўжо было ў рэспубліканскім маштабе.

Гэта ж ужо ў разгар эпохі галоснасці Ульяновіч з сабе падобнымі сябрамі ў органе ЦК КПБ газеце «Звязда» ўдарыў па Граніну, Адамовічу, Бакланаву, Кандрацьеву і Балашову, крытыкуючы іх за «агульначалавечы гуманізм» у творах, за «акопную праўду», як ударылі і па мне праз «Гродненскую правду» ды бюро абкама партыібылыя супрацоўнікі органаў НКУС і МУС.

Як бы мне ні было непрыемна, але ў гэтым не знаходжу нічога ненатуральнага. Людзям гэтым зусім незнаёмы мукі пошуку ісціны, хвалявання, якія ідуць ад розуму і сэрца. Яны і цяпер здольны ўспрымаць толькі тое, што ім прадыктуюць старыя шаблоны.

У сваім артыкуле ў «Гродненской правде» А.Талкачоў высмейвае

мае меркаванні, што ў сельскай гаспадарцы ў нас наступіў пералом толькі ў 1954 годзе ў сувязі з рэформамі Хрушчова і вяртаннем высланых у родныя мясціны, а Н.Атаманаў не прымае маёй думкі, што бандытызму ў нас садзейнічалі рэпрэсіі, што тэрор заўсёды спараджае тэрор. Але ж гэтыя ісціны банальныя, іх ніхто ўсур'ёз не можа аспрэчваць!

Уся бяда ў тым, што мае апаненты зусім няздольныя аналізаваць падзеі, удзельнікамі якіх былі. У эйфарыі перамогі ім было не да плачу невінаватых жанчын і дзяцей, не да выгляду тых аблезлых каровак і дохлых коней, разбураных хутароў і сяліб.

Яны ні ў чым не раскайваюцца, не грызе іх сумленне, і спяць яны спакойна.

Я не раз думаю: хоць бы кожны з гэтых ветэранаў праваахоўных органаў пацярпеў з месяц тое, што перажылі мільёны! Ды лёс іх ашчаджаў. Жылі бесклапотна на ўсім гатовым. Ад шматгадовага безагляднага падпарадкавання мазгі ў гэтай катэгорыі людзей пераўтварыліся ў свайго роду торф, які не здольны ўжо радзіць нічога жывога.

Ветэраны гэтыя, як бы ні было каму іх шкада, зацыкліліся на ўзроўні саракавых гадоў.

Прыгледзьцеся, як яны праводзяць вольны час. Якія між сабой вядуць размовы. Усё ў іх старое!

Яны нічога не чытаюць, ні пра што іншае не хочуць ведаць – усё ніяк не развітаюцца з эпохай, калі вырашалі лёсы людзей, калі мелі неабмежаваную ўладу, трафеі, выпіўку і, прыкрываючыся званнямі, пасадамі, высакапарнымі лозунгамі, рабілі, што хацелі.

Над імі ўсё носіцца дух Мудрага Настаўніка і Друга, без якога не ўяўляюць сабе жыцця. Калі загаварыць з каторым-небудзь з іх адзін на адзін аб рэпрэсіях, ён з упэўненасцю адкажа:

– Таму цяпер і кепска, што Сталін не ўсіх вывез, не пераастраляў, не перадушыў! Быў бы ЁН цяпер – адразу навёў бы парадак!

Горш за ўсё, што між імі існуе моцная спайка і закаранелае пачуццё роднасці душ. Адчуўшы выпад супроць сябе ў выглядзе крытыкі таго, чаму аддалі лепшыя гады жыцця, паглядзіце, як гэтыя людзі аб'ядналіся! Як салідарны з ім гаркам, абкам, парткамісія гарадская, абласная і орган партыі «Гродненская правда»!

Нічога не зробіш, іх яшчэ многа надта, і яны дужыя, асабліва ў нас, на перыферыі, недарма ў народзе іх называюць вандэяй. Але справа не ў іх. Кожная палітыка збірае пад сваё крыло адпаведных людзей для здзяйснення сваёй мэты. За паслухмянай нашай вандэяй трэба бачыць цэлы пласт бюракратаў, якія ну ніяк не развітаюцца з

уладай!

Дык што, паўтарыўся пачатак 70-х гадоў? Як бы не так! Змянілася штосьці грунтоўна і ў нас. Цяпер ніхто ад мяне на вуліцы не шарахаецца, хоць аж так ачарнілі. Наадварот! Паскудныя публікацыі выклікалі шквал пратэстаў. Не прайсці спакойна па вуліцы! Знаёмыя і незнаёмыя спыняюцца і ўсяляк выказваюць сімпатыю ды сваё тлумачэнне апублікаванага. Бесперапынна гавораць мне аб гэтым па тэлефоне.

Адным словам, разбуджаны ў народзе такія сілы, якія цяпер ужо ніякім ульяновічам, талкачовым, маскаленкам, алёшыным не ўтрымаць.

Усё гэта так.

Толькі ж ці мне з імі па дарозе? Я не з пакорных, я – з абалваненых. Усё жыццё не там шукаў ідэал. Я глыбока верыў у камунізм. Я нават верыў, што Сталін ні аб чым не ведае, і марыў, як да яго дабіраюся ў Крэмль ды раскрываю на ўсё яму вочы. Прачнуўся, дзякуй Богу, і зразумеў, што я аб'ект непрыстойнай гульні ў руках людзей, якія вадзілі мяне дзесяцігоддзямі за нос і спекулявалі на маёй наіўнай веры, як і веры мільёнаў такіх самых.

Хопіць кіснуць у якойсьці калдобіне!

КПСС – носьбіт чужой мне маралі, якая ўсю гэту хеўру банкротаў і сектантаў тыпу ульяновічаў, магільніцкіх, талкачовых, атаманавых, маскаленкаў, шоўдаў пры дапамозе сваіх магутных сродкаў прапаганды ды шматлікіх чыноўнікаў з высокімі зарплатамі абагравала і абагравае, сілкавала і сілкуе ды цкуе. Усё гэта ўвайшло ў непрымірымы канфлікт з мараллю, закладзенай ува мне.

Так і павінна было здарыцца.

Скажыце, што агульнага мае агульначалавечая мараль страшаўскіх бабак, дзядоў, якія мяне выхоўвалі, з той уломнай і аднабаковай мараллю, каторая хоць і навуковым камунізмам народжана, але ўзнікла ў галовах дагматыкаў, у сэрцах з халодным разлікам, у людзей часта карыслівых, аднабокіх і шкодных палітыканаў ды верхаглядаў?

Вы – як сабе хочаце, а я больш не хачу да гэтай партыі належаць! Упэўнены, каб жыў бацька, то і ён мне сказаў бы: «Правільна, сынок, робіш, мы абодва здорава памыліліся! Хутчэй скідвай з сябе чужую, цесную кашулю, выбірайся з глухой калдобіны, якую гісторыя падсунула людзям на іх шляху, і вяртайся да сваіх каранёў».

## КАНЕЦ СВЕТУ

*ПА МАТЫВАХ РАМАНА «ВЕРШАЛІНСКІРАЙ»*

СЯЛЯНСКАЯ ДРАМА

АСОБЫ

Альяш — Ілья Лаўрэнц'евіч Клімовіч, прарок, барадаты дзед.
Тэкля — прыгожая маладзіца, потым — жонка Альяша.
Вольга — дачка прарока.
Волесь — зяць.
Банадык — селянін сярэдніх год.
Майсак Пётр — галоўны апостал.
Аўхімюк Васіль — стары селянін.
Фэлюсь Станкевіч — вартаўнік царквы.
Антанюк Іван — галоўны багамол з-пад Бельска.
Жонка Антанюка.
Нюрка з Забагоннікаў — дзеўка, 23 гады.
Хімка — жана-міраносіца сярэдніх год, сястра Банадыка.
Данілюк.
Пііпіха — жана-міраносіца старая.
Баец — малады хлапец.
Палося — бабка.
Макарыха — бабка.
Божы жаніх — малады і здарозы.
Вар'ят — юнак, 17 гадоў.
Маці вар'ята.
Бацька вар'ята.
Сляпы.
Пісар.
Нямецкі афіцэр.
Два манахі. Яны ж — два нямецкія салдаты, два апрычніка Альяша. Жабрак.
Два падпольшчыкі-камсамольцы.

Героі гутараць на мясцовым дыялекце: «наеўсо», «напіўсо», «файно», «егдзіць», «ніц», «дзісь», «вельмі»...

## ЧАСТКА ПЕРШАЯ

### КАРЦІНА ПЕРШАЯ

Вясковая вуліца. Чуваць пераборы малаткоў у кузні. Уздоўж плота брыдзе А л ь я ш. Насустрач старому кідаецца дачка В о л ь г а.

В о л ь г а. Тату, як жывеце? Ой, якая ў вас чорная кашуля!.. Не могуць багамолкі пасціраць?!. Ну, забягу як-небудзь, пасціраю!.. *(Сцішае голас.)* Тату, мужыка завезла ў бальніцу — сляпую кішку выразаць. Дайце грошай.. Дахтары патрабуюць дзвесце злотых за аперацыю ды гавораць, калі не заплачу напярод, да Волеся нават не падступяцца. А дзе ж мне ўзяць такі маёнтак, гэта ж — дзве каровы! Богам малю, тату, дайце! Дахтарам — што? Памятаеце Балейку з Гарадка? Не заплаціў, так жонка і памерла ў калідоры бальніцы! Загіне Волесь, застануцца сіроты, што ж я з імі рабі-іціму, угу-гу-у!.. *(Плача.)* Вы мяне замуж выпіхнулі без пасагу, пашкадуйце хоць зара! Што для вас значаць дзве сотні?!

А л ь я ш. Званіцу трэ будаваць... *(Уздыхае.)* Дасць Бог — чалавек твой пе памрэ, не раві. Адзін Гасподзь уладыка жывата і смерці — влас не спадзе з галавы нашай без волі яго.

В о л ь г а *(ашамела).* А-а, то вы ўсё такія самыя?! З-за сваёй царквы зусім з глузду з'ехалі!

А л ь я ш. Як са мной гаворыш?

В о л ь г а. Праз яе вы і маму ў магілу загналі! Нават Толік праз яе на вайну пайшоў! З-за яе і я пачынаю ў Бога не верыць, бо калі б ён быў там дзе-небудзь на небе, хоць бы самы дурны, то даўно паслаў бы пяруны на вашу паршыву царкву!

А л ь я ш. Шчэ і багахуліш? Як з родным бацькам гаворыш, заменак?!

В о л ь г а. Які вы мне бацько?! Ці вы мне, як была малой, казку расказалі, па галаве пагладзілі, булку якую купілі?

А л ь я ш. Ў, разбэсцілі вас гарады і вы сатане прадаліса! Ты павінна свайму бацьку рукі-ногі цалаваць, што на свет цябе пусціў! Мало цябе, заменак ты, я малую крапівой сёк, толькі цяпер бачу!

В о л ь г а. Ат, і праўду людзі кажуць — з якой лысінай жарабя родзіцца, з такой і здохне! Пагу-утарыла з родным таткам, фа-айно пагаварыла!.. Адно памятайце, тату: і ўнукам закажу, каб нават не глядзелі ў ваш бок! Заставайцеса тут са сваімі прыдуркамі, іграйце ў святых апосталаў! Цьфу на вас за Волеся, Толіка, за няшчасную маму, і будзьце вы праклятыя! *(Выбягае.)*

З матыкамі з'яўляецца п'янаваты А ў х і м ю к.

А л ь я ш. Паглядзі, Базыль, як маладыя абыходзяцца з бацькам — ніякай пашаны! Вольга мая, сука, прыбегла, каб я... Што, я — працэнтнік?! Не-е, канец свету і праўда настае!

А ў х і м ю к *(ікае).* За што некаторых шанаваць? Ты ж нават надзел бацькаў на цэркву прадаў, а дзяцей — з хаты прапёр! На свет мы іх пусцілі? І сабакі пацекаюць ды раджаюць, затое шчаняты, як падрастуць, бацькоў цураюццо! На! *(Вымае самагонку.)* А, ты — праведнік, не п'еш! *(Хлябае з бутэлькі сам.)*

А л ь я ш. Прадаў, бо так трэ. Я веру ў бога, а іншыя — у мяне.

А ў х і м ю к. Верадь, бы — муле?!. Няшчасныя, затузаныя людзі цягаюццо па белым свеце, праўды шукаюць, не ведаючы куды туліцца, а ты ім манну нябесную абяцаеш. Мулай стаць лёгка, цяжэй — чалавекам.

А л ь я ш. І мне жыць так, бы ты — абы дзе выпіць?

А ў х і м ю к *(ікае).* Ілья, з агнём іграеш! Загубіць цябе твая палітыка, памянеш маё слова! Чым мазгі ім засіраеш? Халера, які з цябе прарок?! Цяпер вучаным трэ быць на гэто, мы ж з табой толькі распісацца і можам! Ха, шчэ Біблію пра сябе загадаў сачыняць!.. Ой, насмяшыш вёску толькі!.. *(Траціць раўнавагу, падае.)*

А л ь я ш. А ты хочаш, каб я з вамі піў ды зубаскаліў? Ляжы — свінні цябе зара абліжуць тут! *(Збіраецца ісці.)*

А ў х і м ю к. Кажаш — любі бліжняго, а роднаго зяця не ратуеш!

А л ь я ш *(крочыць далей).* Затое ўсіх людзей шчаслівымі зраблю!

## КАРЦІНА ДРУГАЯ

Падзея адбываецца ці то на цвінтары, ці то ў царкве. На прыступках храма

Б а н а д ы к з Ф э л ю с е м гуляюць у самаробныя шахматы. Вісіць іржавы лемех. Багамолы і прыёмшчык падарункаў. Людзі ў бочкі кладуць сушоныя грыбы, сыры, а побач — сувоі кужалю, ручнікі і дываны; перад іконы ў торбачкі — грошы.

К а м с а м о л е ц п е р ш ы. «Святы Альяш з хмары зваліўсо, упаў у Грыбоўшчыну ля нас! І чаго, каб хто спытаўсо, злез стуль боскі свінапас!..»

П і л і п і х а. Яко ізчэзне дым, яко тае воск ад ліца агня, тако да пагібнуць бесы ад ліца любяшчаго бога! Фу, фу, фу, сатана, згінь!

А н т а н ю к *(прыёмшчыку).* Карову прароку прывёў — унь прывязана да плота. Пабегала на вялікі пост. Баба падаіла, да вечара пацерпіць. Я — Аптанюк Іван з вёскі Ракітніца.

М а й с а к *(запісвае).* Рука даюшчая да не аскуднее. Храні цябе госпадзь, Іване, і тваю сям'ю, амін.

Ж а б р а к. Падайце, Хрыста радзі, інваліду з Брусілаўскага прарыву, не забывайце сына ацечаства, воіна шматпакутнага! *(Звоніць цвіком у гільзу ад снарада.)*

К а м с а м о л е ц д р у г і. Прасіце ў тых дзяўчат, дзеду, яны багатыя, а мы свае грошы прапілі!

Ж а б р а к. Калі быў молад, то і на дзевак я меў голад, а пры старасці такой не грэбую ніякой! *(Шэпча хлопцу на вуха, рогат.)*

К а м с а м о л е ц п е р ш ы. Дзеду, а праўда — жонка войта дала вам булку, а вы каменем шыбу войту пабілі?

Ж а б р а к. Не булкай!.. Ой, дзетачкі, ідзеце сабе, бо нічога не зараблю і старая з хаты папрэ! Сястрыцы міласэрныя, ньюць мае раны вецерану з-пад Мукдэна, гвардзейцу яго ампіратарскага высочаства, кавалеру георгіяўскіх крыжоў! Пад Сучапам я тры варожыя ланцугі адолеў: адзін рашпілем распілаваў, пад другі падлез, а трэці ланцуг пераскочыў!

Н ю р к а *(падлятае).* Майсак, з-пад Бельска акаваную Біблію прывалаклі — вялізную, бы пячная засланка!

М а й с а к. На цвінтар выстаў, хай людзі падзівяцца!

К а м с а м о л е ц д р у г і. Дзядзьку Пятрук, ахвота вам такім глупствам людзям мазгі забіваць?

М а й с а к. Біблію, сынок, пісалі вучаныя людзі. Думаеш, зра час трацілі, паперу марнавалі? Ведаю, што табе трэ. Ты знайшоў сваю праўду і гаворыш — Бога няма. Адкуль табе ведаць, што бог е, калі не пераажыў яго? Е ў цябе свая праўда? То нясі яе высоко, дастойно, як нёс Хрыстос, а я буду сваю несці і не мяшаймо адзін аднаму!

К а м с а м о л е ц д р у г і. У вашай Бібліі гаворыцца, што першымі людзьмі былі Адам і Ева. Адамавы хлопцы пажаніліса і пабудавалі гарады?

М а й с а к. Ну, гаворыцца.

К а м с а м о л е ц д р у г і. Дзе ж яны набралі жонак і народу ў свае гарады, калі і людзей шчэ не было? Чаму такая брахня ў вашай Бібліі, якую выстаўляеце на цвінтар?

М а й с а к. Калі я ем панцаковую кашу і на зубы трапіць асцюк, то я ж не вывальваю цэлую міску ў цабэрак: выкідваю толькі асцюк. У святым пісанні сказано так і недаступнае нам не зразумець.

К а м с а м о л е ц   п е р ш ы. А, няма чым крыць, пра кашу загаварылі?! Успомніце, дзядзьку, шчэ пра соль і перац!

М а й с а к. Ат, палітыкуй тут з вамі!.. Міраносіца Нюрка, праз Плянты валяць новыя багамолы, падушацца тут! Ляці і затрымай іх на выгане, покуль з гэтымі справімса! Прарок вось-вось прыйдзе!

Н ю р к а *(какетліва).* Зноў мне, эх!.. *(Знікае.)*

М а й с а к (бярэ ад пілігрымаў грошы, выдае паперку). Вам — квіт на тысячу злотых для апраўдання перад вобчаствам. Сам Гасподзь да прасвяціць вашы вумы і сэрцы ачысціць любоўю, амін!

Б а г а м о л ы. Амін! *(Валяцца на траву, б'юць яйкі, вымаюць бутэлькі малака, закусваюць, паказваючы адно аднаму ікону божай маці.)*

Ж о н к а А н т а н ю к а. О, яна аб'явіласа Альяшу ва сне, загадала, што і як рабіць!.. Хутко ежмо, бо зара і *сам* тут будзе!..

П і л і п і х а *(лямантуе).* Бадзюку сабе развялі тутака?! Прысмакі выядаць у святым месцы?! Цыбулькі, рэдзькі з хлебам не хочаце? *(Людзі ежу вінавата хаваюць.)* Во — так!.. Цяпер слухайце! Ісцяны Бог, чула, як Альяш ноччу гутарыў з Госпадам і дамаўляўсо, каб дождж выпаў! Раненько ўстаю, усё змочано, расце файно — аж буіць! Спатыкаю яго на вуліцы й кажу: «Ілья, я падслухала, падглядзела, усенько ведаю!» А ён хітра: «Хай людзі сабе добры ўраджай маюць!»

Б а н а д ы к *(ківае галавой).* Альяш пра людзей падумае? Калі спаткаю яго, заўша хачу сказаць добры вечар, бо ў вачах цямнее!

П і л і п і х а. І арэ, і косіць, і тое саме есць, што мы, адно мяса ў рот не бярэ — бы святыя старцы! Усё моліцца за народ!

К а м с а м о л е ц   п е р ш ы . «Святы Альяш з гары зваліўсо, упаў у Грыбоўшчыну ля нас! І чаго, каб хто спытаўсо!..»

Д а н і л ю к. Зноў смяецеса, збыткуеце з альяшоўцаў? Разумныя надто! Шчэ й кажаце — зямля вакол сонца бегае!

К а м с а м о л е ц   д р у г і . Верціцца, дзядзьку!

Д а н і л ю к. Калі ты такі вумны, то скажы — а на чым яна падвешана?

К а м с а м о л ь ц ы *(хорам).* Як гэто — падвешана?!

Д а н і л ю к. На чым вісіць на небе — на вяроўках ці на які гак жалезны пачэплена?

К а м с а м о л е ц   п е р ш ы. Нават канапляная вяроўка такі цяжар не вытрывае!

Д а н і л ю к. Тады — на чым? І ад чаго ўсё расце — збажына, ліпы унь? Пухне яно ці знізу яго так што прэ? *(Глядзіць, бытта пайшоў шы з казырнога туза.)* А, не ведаеце таксамо!

К а м с а м о л е ц  п е р ш ы  *(ледзь не плача).* Цемра!..

М а й с а к. Куды нам да вас, вучаных!.. Паглядзіце, колькі ў гарадскіх цэрквах моліцца і багатых, і адукаваных! Што, яны не ведаюць — сонцо вакол зямлі бегае ці — наадварот? Праўда стаіць у Бібліі, ці — не?.. Людзі заўша да цэрквы валілі і будуць валіць, бо ў іх патрэба такая! Людзі так свае душы ратуюць! А куды ты, разумнік, хацеў бы, каб гэтыя цяткі ды дзядзькі пайшлі — на папскія штыкі? Цяткі крыві баяцца! Чуў пад Кракавам колькі мужыкоў скасілі з кулямётаў?

Н а т о ў п. Прэч цацалістаў гэтых! У зубы ім!

Хлопцаў выштурхваюць за сцэну і людзей агортвае здавальненне ад перамогі. На хвіліну ўсе забываюць, чаго сюды прыйшлі.

Б а н а д ы к *(толькі цяпер бачыць сястру).* Хімка?! Што чуваць?

Х і м к а. Дзеці пісьмо з Расеі прыслалі. Маня доктарам у Ленінградзе, а Яшка — лётчыкам у Казані.

Б а н а д ы к. Ха! А ты — Альяшу молішса!.. *(Ківае галавой.)*

С т а н к е в і ч. Гэтых фанатыкаў хібо перагаворыш? Лепш хадзі! *(Іграюць.)*

М а к а р ы х а. А і праўда, бабы, — Хімка... Твой агарод нашы абматыкавалі!.. Як табе тут, сяброўка?

Х і м к а. Ліхо бяры той агарод!.. Тут — бліжэй Бога. Во так між людзей лётаю і думаю: ці не баліць там маёй Мані галава ад лякарстваў, каб хоць Яшка не лётаў на сваім вераплане надто высоко, не выхіляўсо праз акно над Казанню! А хор запяе — бы Яшкаў самалёт гудзе ў высі!.. Малюсо за дзетак, плачу салёнымі слязамі, а на душы робіцца добра-добра!

М а к а р ы х а. А мой Юляк колькі часу валяецца на цыменце ў Ваўкавыскай турме. Хаджу, хаджу ў Ваўкавыск — ногі да кален стаптала. Учора камендант: «Матко, ён горшы за бандыта. Той чалавека зарэжа, а твой сынок хоча кавалак Польшчы аддаць бальшавікам!» Білі яго і пальцы прышчамлялі ў дзверы... *(Плача.)* Кожную жылачку выпарала б з сябе, каб толькі яму палегчала, але што цёмная баба можа? Ноччу сон не бярэ — хоць плач. Кажуць, прарок бяссоніцу здымае...

Х і м к а. О, наш Ілья столькі людзям дабра робіць, дапаможа і табе! *(Уздыхае.)* Доля мацярынская, не дай Бог!

Д а н і л ю к. У адным царстве пасадзілі ў цямніцу хлапца. Маці пайшла таксамо па начальству, а самы галоўны ёй: «Не дуры, бабо, галавы, ніц не дапаможа. Выйшаў царскі ўказ. Заўтра ў дванаццаць

ударыць звон і сына тваго на пляцу казняць!» Маці плакала, ноччу галавы да падушкі не прытуліла, а тады думае — хоць пару хвілін сыну дарую. Узабраласа на званіцу, чакае. Калі кат занёс сякеру над галавой асуджанаго і званар тузануў вяроўку, каб падаць сігнал, яна падставіларукі пад язык. Жалезны шворан ударыў у мяккое і звон не прагучэў. Так маці і трымала рукі, покуль не адбіло.

М а к а р ы х а. Дзіво — рукі падставіла. Тваё дзіця здаволенае, яму добро, то і ўсе мацярынскія радасці!

М а й с ю к. І таму зара звернемса да чалавека божаго Альяша, які нас усцешыць і сагрэе ўсіх!.. А покуль што памолімса багародзіцы, покуль з'явіцца прарок, адудзячым словамі малітвы міласць яе!

Х і м к а *(у неба).* Ах, пакутніца ты нашая, Багародзіца дзева Марыя, падзякуй Богаві за любоў святую да нас за сына адзінароднаго, пасланаго на збавенне грахоў нашых!.. Спасіцелька кажа, — уладу Бог даручае тут Альяшу — Лаўрэнаваму сыну! Наказувае, каб Альяша слухаліса, бо гэты чалавек перад канцом свету прывядзе нас да царства нябеснаго!.. Ах, будземо слухаць, царыца нябесная! Скажы Госпаду і яго сынаві — не пашкадуем ні сябе, ні вала, ні асла, ні дзетак, ні мужыкоў, каб...

Ж а н о ч ы в і с к. О-ой, сам ідзе-е!!!

С т а н к е в і ч. Прэцца ўжэ, старое падло!.. *(Хапае прэнт, лупіць па лемеху: дзэнь! дзэнь! дзэнь!)*

З'яўляецца А л ь я ш. Народ бухае на калені. Мужчыны зрываюць шапкі. Станкевіч запіхвае прэут у дзірку лемеха, бярэ шахматную дошку і з сябрам знікае. Альяш з сумам азірае натоўп. У напружанай цішыні чуваць звон жаўрукоў, клёкат бусла, пераборы малаткоў у кузні.

А л ь я ш. Я не ўладыка! Надзеньце шапкі, бо прыпякае!

А н т а н ю к. Нічого, пабудзем і так! Бог, Альяш, нават травы ці жыта не зраўнаў, а ты — на прыкмеце ў Госпада!

П а л о с я *(з перавязаным вокам).* Правазнёс цябе Гасподзь над другімі, а такім заўша пашана! Прабач, што турбуем!

Н а т о ў п. Уваж, столькі мы валакліса, пабудзь з намі!

А л ь я ш. Ат, такая там турбота. Ранак правазіўсо са званарамі. Трэ замест біла бомы файныя павесіць, каб у абедню нават у Крынках было чуваць. Майстры за галоўны шэсць тысяч злотых запрасілі. Гарадскія жулікі — нашаго мужыка разумеюць? Дураць мяне, бытто рысуначкі на званах намалююць. Хто іхнія малюнкі разглядацьме? Трэ каб добро званілі.

М а к а р ы х а . А ты, Альяш, не шкадуй грошай на такое дзело, каб адію файныя былі! На ўсіх рысуначкі е! Не скупіса, дай у лапу!

А л ь я ш *(чухае патыліцу). Я* што думаю? Давядзецца махлярам плаціць — не кляпаць жа цёнгле ў біло!.. Ну, так чаго вы сюды прывалакліса, што хочаце сказаць?

П а л о с я *(з перавязаным вокам).* Долі няма, Альяшку!

Ж о н к а А п т а н ю к а. Гора такое, што не зальеш і золатам! Мелі адну дачку — бы сонцо, і... *(Рыдае.)*

А н т а н ю к. Дачку павёз хаваць. Бацюшко за тры злотых не захацеў ісці на могілкі. Няма ўправы на іх. Труну не паспееш у яму апусціць, а поп — мах-мах крапілам, прабумболіць і — дахаты! Толькі грошы злупіць!

М а к а р ы х а. Жызні і ад паноў няма! Апісалі за падаткі ўсенько ды пакінулі нас голымі: ні свіначкі, ні курачкі! Было пару вулляў і тыя на воз пакідалі, гы-гы-гы-ы!.. *(Плача.)*

П а л о с я. У пас пропаведзі чыталі па-польску. Хто патрабаваў ад бацюшкі чытаць па-руску, паліцыя забрала таго ў халодную, сядзіць!

Б а ц ь к а в а р'я т а. А я на чыгунцы кастылі забіваў! Загадалі мне католікам стаць. «Хіба, — кажу, — веру, бы кашулю можна мяняць?» А яны — з работы прaперлі! Ужэ пад татарынам лягчэй было — той хоць веры не чапаў!

Г а л а с ы. Цяжко, Ілья!!! *(Бабкі рыдаюць.)*

А л ь я ш *(думае, цяжка ўздыхае).* Мае вы бабы, мужчынкі, чадо мае! Туліцеса, бы бяздомныя авечкі, не ведаеце, якого Бога шукаці! Папы, кудлы, адно грошы з вас дзяруць! Няма ў іх ніякай веры — прапілі яе, прабалявалі! Аднаму мне верце! Я запалю кожнаму звязду ў сэрцы і агонь напоўніць вашыя душы! Я вас вывяду на дарогу, мяне ніхто не ўстрымае! Кіем удару па моры, вада расступіцца, і вы ўсе пройдзеце за мной па сухім!

Г а л а с ы. Вядзі нас, Ілья, у зямлю абетаваную! Столькі да цябе ішлі, не адганяй нас! Бяры душу і рабі з ёй, што хочаш! *(Бабкі ў істэрыцы.)*

П і с а р *(падлятае да прарока).* Айцец Ілья! Айцу Мікалаю для Бібліі пра вас ваша слово патрэбно! Вы ж абяцалі, я за вамі бегаю каторы дзень!..

А л ь я ш. Не перашкаджай, лодыр!.. *(Ботам пісара адпіхвае.)* Ну, хто чаго хоча ад мяне? *(На каленях паўзе Макарыха.)* Што табе, бабо, баліць?

М а к а р ы х а. Галава, Лаўренц'явіч! Як узялі майго Юлька — не засну!.. Усіх пеўняў на вёсцы галасы вывучыла! Памаліса за мяне, грэшную, твая малітва даходлівая да неба!

А л ь я ш *(цісне цётцы скроні).* Мусі, паганая кроў застыла пад чэрапам. О, тут, на макаўцы. Ідзі, выздараўлівай ды маліса Богаві. І я буду маліцца за цябе.

М а к ар ы х а. Ы-ы-ых, адразу палегчало!.. Як мне цяпер файно!.. Каб Гасподзь даў табе сілу і здароўе! Усім людзям раскажу! Дай залаценькую ручаньку, я яе — м-м!.. *(Хоча пацалаваць.)*

І л ь я ш *(вырывае далонь).* Як смала прыклеілаcа!.. Хто яшчэ?

П а л о с я. Ілья, то ж падумай, сыноў я так гадавала, начэй не дасыпаючы, а яны — пабілі нас з мужыком! Каб так грызлі родныя дзеці, дзе калі хто чуў?

А л ь я ш. Зямлі не апісала ім, таму і грызуцца.

П а л о с я. Так жа мы з бацькам шчэ жывыя! Як памрэм, завалакуць нас у яму, хай тады...

А л ь я ш. Не выкручувайса!.. А дачцы прыданагo не даеш? На голую костку і сабака не брэша!

Л ю д з і *(хорам).* Вядомо, не брэша!!!

А л ь я ш. Няма чаго тут плакацца, Макаліха, не дуры мне галаву — унь людзей колькі чакае! Ну, цяпер хто?

Натоўп дзівіцца, які Альяш мудры. Паміж пацыентаў хвіліну ідзе зацятая спрэчка за чаргу.

С л я п ы. Язэп-грэшны! Невідомы я! *(Кладзе галаву праpоку на жывот.)* Яві цуд, святы старчэ, вылечы — табе слово такое дано!

А л ь я ш *(Хімка падае паднос, прарок плюе ў яго ды макае пальцы, каб лячыць сляпога, але спахопліваецца).* Э, у цябе, бачу, усё зарасло, я тут ужо не дапамагу! Замного ты грашыў, Язэпе!

С л я п ы *(у жахлівай паніцы).* Ілья, пачакай, я ж буду маліцца за цябе, усе ночы на каленях выстаю!

А л ь я ш. Я не Хрыстос. Толькі ён мог і такое вылечваць.

С л я п ы. Ой, людзі, я — бачу!.. Не... *(Плача.)*

А л ь я ш. Нічого ты ўжэ не ўбачыш, не трэ было грашыць.

Н а т о ў п. Ілью не правядзе-еш!!!

Трымаючы сына за рукі, бацька з маці вядуць юнака. Хлапец упіраецца ды смяецца, бытта яго ззаду казычуць.

М а ц і в а р'я т а. Не брыкайса, Пятрук, дзядзько добры, цукерак дасць!

В а р'я т. А от не пайду-у, ха-ха-ха-ха!..

Маці вар'ята. Ідзі, ідзі, слухайса гэтаго дзядзьку!..

Альяш *(хапае з падноса медны крыж).* Ва айца, і сына, і духа святаго, амін! Сатана, зыдзі, дай месца чыстаму духаві! *(З сілай апускае плашмя цяжкі крыж на галаву хворага. Вар'ят тузаецца, стары апускае крыж зноў.)* Сатана, у яму ідзі, там тваё месцо!

Вар'ят. Ха!.. Ха!.. *(Ловіць паветра, бытта кінулі яго ў вар.)*

Альяш *(людзям).* А вы не ў ціятры папрыходзілі на туманныя карцінкі! І не дрыжыце так! Лепш сцісніце моцно рукі і ногі, каб нячысты і ў вас не залез, і дапамагайце! Паўтарайце за мной! Ну, — сатана, выйдзі!

Натоўп *(ацапянелымі вуснамі).* Выйдзі...

Альяш. Смялей!.. Ну — сатана, выйдзі!

Натоўп *(ужо мацней).* Сатана, выйдзі!..

Вар'ят *(перасохлым горлам).* А куд... Куд-дой?!

Альяш *(з пагрозай).* Якое мне дзело? Кудой зайшоў!

Вар'ят *(плаксіва).* Не вылезу тудой, дзядзьку!

Натоўп *(зларадна).* Выйдзі!

Вар'ят. Іэ!.. Іэ!.. Я праз галаву залез!

Альяш *(замахваецца крыжам).* Цацкацца з табой буду?

Вар'ят *(вішчыць).* Не-е, дзядзечку, не-е! Я выйшаў ужэ увесь, болей мяне не трэ! *(Ужо рахманы піхае галаву ў мацерыну кофту.)*

Маці вар'ята. Ты — цаца, Пятручок, сціхні, родненькі!

Людзі з палёгкай уздыхаюць ды з падзівам глядзяць на прарока.

Галасы. А дым з вушэй як паваліў у дурного, бачылі? Клубамі! І серай засмярдзело! Шчэ і загрымело штось, заляскатало! І ў маёй галаве звон стаяў! А я нічого не бачыла і не чула! Бо калі сказаў так зрабіць, то я з усяе сілы сціснула рукі і ногі, каб нічого ў мяне не ўлезло, так і прастаяла!

Сляпы. І на гэты раз сатана яго паслухаў!.. *(У роспачы.)* Альяш, ты толькі прыбядняешса, што не ўсё можаш! Сілу маеш велькую, памалі-іса за мяне!..

Маці вар'ята. Ой, дзякуй табе, святы айцец, за выздараўленне сына! Ён жа адзіны ў нас, так было цяжко!..

Альяш. Богаві дзякуй.

Маці вар'ята. Як табе з мужыком каня пакінем за гэто!..

Вар'ята выводзяць. Да прарока паўзе з сарамлівай усмешкай маладзіца ў расхлыстанай кофце.

Альяш. Ну, а табе чаго?

www.kamunikat.org

Т э к л я. Адпусці мне, грэшнуй, віны!.. Закінь слоўцо перад Богам за распусніцу, божы чалавек, пашкадуй!

А л ь я ш *(хапае яе за нос і водзіць).* Прыперласа, шлюха, хвастом круціць і тут? Марш з маёй цэрквы! Няма табе дарогі да Госпада, праклятая ты ім!

Т э к л я *(да распяцця).* Госпадзі, не слухай яго!..

А л ь я ш. Ну, пачакай жа, сука!.. *(Выбягае.)*

Т э к л я *(вые на каленях).* Я нікуды адгэтуль не пайду-у! Чарвяком буду поўзаць, як сабака рукі-ногі яму лізаць, а за віны ачышчэнне склапачу-у!

Х і м к а. Склапочаш, Тэклечка, не адступай, Бог літасцівы!

А л ь я ш *(улятае з вяроўкай).* Цыцкі свае выставіла і думае — купіла мяне?!. У горадзе цябе саўрацілі?

Т э к л я *(бухае на калені).* У Гродне! У грэх увялі, бы чатырмя коламі пераехалі!

А л ь я ш. Афіцэры?

Т э к л я. Жорж Дэлясі з Фолюша! *(Нагінаецца да ступакоў прарока, водзіць галавой.)* На-бі мя-не, свя-ты стар-ча, як пар-шы-ву са-ба-ку! На-бі, мне ляг-чэй бу-дзе!

А л ь я ш *(не сваім голасам).* І раздзявацца прымушалі, на стол танцаваць паднімалі?

Т э к л я. Было-о!

Н а т о ў п. Ах-х!..

А л ь я ш *(з нездаровай цікаўнасцю).* Пакажы пароду зара, як гэто было!

Уносяць стол, засцілаюць сурвэтай. Тэкля ўзбіраецца на яго.

А л ь я ш. Ну, ну, шлюха, паказвай! *(Бярэ вяроўку ямчэй.)*

Т э к л я. Грошы во сюды, на сурвэту клалі, а я во так па іх хадзіла, скідвала і гэтак танцавала... *(Паказвае.)* Жорж грошы сабе забіраў. *(Зыркае з-пад ілба на прарока.)*

А л ь я ш. Аднак — грашыла з ім?

Т э к л я *(падае на стол, закрывае вочы, з надрывам).* Ой, грашы-ыла!.. Ну, лупі, чаго стаіш?! Толькі не шкадуй, з усяе моцы, як гето ты ўме-еш, каб балело!

А л ь я ш *(са свістам апускае на плечы маладзіцы лейцы).* Гах!

Т э к л я *(нецерпяліва, адымаючы ад вачэй рукі).* Не чуго, мацней! *(Са страшным крыкам.)* Хлопчык у мяне нарадзіўсо!

А л ь я ш *(лупцуе).* Гах-х!

Т э к л я. Ох, запякло, запякло! *(Зларадна.)* Ох, так табе, нягодніца, і трэ!.. Здаровенькі малы!..

А л ь я ш. Га-ах!.. *(Лупцуе раз за разам.)*

Х і м к а. Ну і разышоўсо наш гаспадар! Калі я расказала пра свой грэх, Альяш і мяне бэсціў! Ой жа і бэсціў, хай Бог крые-ратуе! Затое пасля так мне стало до-обро!

Н ю р к а. А я прасіла, каб пабіў за блуд! То як пачаў мяне свянціць *(з вясёлым захапленнем)* — аж пераняло і зайшласа слязамі! Адразу забыла пра мінулае, толькі пісягі доўго залечувала!..

Х і м к а *(слухае)*. Маладая, слёз много! Гето добро, калі выцячэ з цябе ўвесь урэдны сок, хай выплачацца, Нюрка!

Т э к л я. Жорж малое ў мяна забраў! О, забалело, забалело!.. У Нёмане ўтапіў, бы кацяня!

А л ь я ш. Га-ах!

Т э к л я. Ох, дальбух, вартая, добро мне так!.. *(Прарок вяроўку кідае.)* Прыйшоў вучастковы, пытае — твой? Я ад роднаго дзіцяці адракласа! Ну, лупі, каб я выянчыла сваё гора! Бі мяне, святы айцец! *(Стукае то ілбом, то кулаком у стол, плача.)* І ты не жадаеш пэцкаць аб мяне рукі, гы-гы-гы!

Нікім не заўважапыя з'яўляюцца д в а м а н а х і. Яны паблажліва азіраюць натоўп, мераюць храм, мяркуюць.

Т э к л я. Ратуй мяне малітвай! Ты слово ведаеш, табе яно богам дано! О, недарэзаная я ракіта, вішня з падсечанымі карэнцамі, як цяпер мне жы-ыць! *(З плачам валіцца на падлогу.)*

А л ь я ш. Сука, дзіця загубіла? Закінуць табе на шыю пастронак — і то мало! *(Штурхае яе нагой.)* Цэлую ноч будзеш маліцца на маіх вачах, а жыці будзеш на кухні ў мяне ля цабэрка!..

Т э к л я. Хоць — у сабачай будзе!..

М а н а х  п е р ш ы *(да прарока)*. Фіні ля комэді! Клімовіч, рашэннем гродзенскай кансісторыі ў царкве адкрываецца манастыр! Архірэй вызначыў мяне за начальніка! *(Мёртвая цішыня.)* Цябе, Клімовіч, пастрыгаем у манахі! Прымерай падраснік, бо праз тры дні пастрыжэнне! *(Падае скрутак вопраткі.)* Сам уладыка для гэтага прыедзе! *(Людзям.)* А вы — прачніцеся, хопіць тут забабоны разводзіць! *(Верціць пальцам каля скроні.)*

Народ ацапянела маўчыць. Бы не сваімі рукамі прарок спрабуе напяліць падраснік і клабук. Манахі па-ранейшаму бесцырымонна азіраюць куткі царквы.

М а н а х  п е р ш ы. Тут паставім металёвыя скарбонкі на грошы! Сюды пасадзім паслужнікаў свечкі прадаваць!.. *(Альяшу*

*паказвае самую маленькую горбачку грошай.)* Адгэтуль зможаш, Клімовіч, браць сабе на расходы!

М а н а х д р у г і. Трэ перапісаць усе падарункі, якімі цвінтар завалены: зерне, кароў, курэй, сыры, дываны і сёння ж фурманкай адправіць у кансісторыю, брат Серафім! *(Бачыць, што ў прарока нічога не выходзіць з адзяваннем.)* Не туды грэбзы свае садзіш, недалэнга!.. *(Дапамагае.)* А смярдзіць!.. *(Моршчыць нос.)*

Г а л а с ы. Вось і скончыласа наша радасць! Ого, паны з папамі дазволяць табе пацешыцца!

М а н а х п е р ш ы (ногцем спрабуе іканастас). Шашаль паеў! Новы з Гродна прывязём! І клірасы перафарбуем!.. *(Моршчыцца.)* Безгустоўнасць!..

Т э к л я. Альяшку ты наш лю-убы, галубок ненагля-адны, чаму ж ты паддаешса іхняй ула-адзе?! Якую на цябе чорную адзяжыну архірэі напя-алілі, бы таму Самсону ручанькі-ножанькі павяза-алі!

Як па камандзе, бабы пачынаюць выць і скрозь енк чуваць голас маладзіцы.

А л ь я ш *(бытта прасыпаецца).* Што, апранулі, падлы, мяне ў лахманы і думаюць — купілі? У сваёй царкве я ўжэ не гаспадар? *(Манаху.)* Іканастас табе, шмэндрык, не падабаецца? А ты ведаеш, гіцлю, што я ўсю бульбу з хаты павазіў на яго ў Гродно?! Дзе вы былі, калі я ўсё гэто сваім гарбом будаваў? У Гродне чаі з коржыкамі распівалі! *(Зрывае вопратку з сябе.)* Бярэце гэтыя лахманы ды перадайце свайму архірэю, што мяне сам Іаан Кранштацкі вучыў, як не паддавацца вам!

Н а т о ў п. Прагані іх! *(Абкружаныя варожасцю манахі бездапаможна топчуцца.)*

А л ь я ш. Я ж вас зара!.. *(Шукае вяроўку.)* П'янкі, гіцлі, блуд тут хочаце развесці, як у Гродне? *(Лупцуе манахаў.)* Са сваім архірэем прадалі веру і мяне падбіваеце? Скажыце пузатаму ўладыку — няма тут дурняў, забабонам яго патураць не буду!

М а н а х п е р ш ы *(пакорна).* Скажам, дзядзьку Альяш...

А л ь я ш. І лахманы гэтыя валачэце!

М а н а х д р у г і *(ловіць адзенне).* Аддамо, пане Клі-мовіч!..

А л ь я ш *(лупцуе іх вяроўкай).* Вон, гунцвоты! Цуцыкі архірэявыя! Зляцеліса сюды, як вераб'і на свежыя конскія яблыкі!.. Вон!

Народ выштурхвае прадстаўнікоў манастыра, з захапленнем узіраецца на прарока.

А л ь я ш. Адныне аб'яўляю новую веру — ільінцаў! О на чым яна будзе трымацца! Для кантакту чалавечай душы з Госпадам мітрапаліты, архірэі і папы — лішнія дармаеды! *(Народ падтаквае, Альяш распаляецца.)* У Біблії гаворыцца аб стварэнні Богам чэлавека па вобразу і падобію свайму! Гасподзь змяшчаецца ў кожным чалавеку, таму нам не трэ пасрэднікаў! Мужыкі і самі могуць сабе даць рады ў храме!

Н а т о ў п. Могуць!!!

А л ь я ш. Кансісторыяў ды прыходаў не ведалі за Ісусам Хрыстом, дармаеды потым узлезлі народу на шыі! Мужыкі бедныя? Затое праведныя, бо не жывуць чужым коштам, не ведаюць распусты, таму вышэйшыя над панамі ды бацюшкамі, бо пакланяюцца Госпаду духам, а не багацтвам!

Н а т о ў п. Ой, добра!

А л ь я ш. Каму дзіця хрысціць — прынось! Багач награшыць, добро заплаціць, абедню купіць і — без граха пойдзе чысценькі, а бядак? Спавядаць будзем кагалам, як рабіў Іаан Кранштацкі! Паставім людзей на калені, а Гасподзь разбярэ сам, каму даравапь віны! А то гавары аднаму папу на вухо пра грэх: што, ён — Бог?! Гэтыя кудлы, духоўныя дзікуны, прыдумалі так зумысно, каб грошы ў людзей выдзіраць! За споведзі, мярліны — ніякай платы, хіба сам чалавек пакладзе на храм, — яго дзело!

М а й с а к. Правільно наш прарок прапёр манахаў! Як дом стары патрабуе адновы, так і вера наша за дзве тысячы гадоў састарылася! У цэрквах загняздзіліса клубы змеяў, усю кроў з яе высмакталі! Наш айцец, усемагутны Ілья, з простаго народу! Брацця і сёстры, радуйцеса — наша вера ўваскрасае!

А н т а н ю к. Выкурым ладанам царкву, каб у ёй і духу папоўскага не стало! Віншуем цябе, сястрыца! *(Чмоканне пацалункаў.)* Хрыстос уваскрэс!

Х і м к а. Ваісціну ўваскрэс! Кланяймосо Альяшу!

Людзі выконваюць загад.

М і р а н о с і ц ы *(з радасцю спяваюць).*

Быў у Кранштаце добры пастыр,
Праўду людзям гаварыў
І на подзвіг твой вялікі
Ён цябе благаславіў!
Ты лішыўсо ўсяго крова,
Цэркву божую-саздаў
І што маеш дарагого

На алтар святы аддаў!
Людзі зблізку і здалёку
К табе йдуць, і йдуць, і йдуць.
Няма таго чалавека,
Які б не быў ужэ тут!
Твая цэрква — незямная,
Ў ёй кіруе херувім,
Твая цэрква — залатая,
Гэта наш — Ерусалім!!!

## КАРЦІНА ТРЭЦЯЯ

Пад цэрквай самотныя гандляркі вяжуць ля палатак панчохі. Жабрак на прыступках выпрастоўвае каменем мядзяк. За сталом — Альяшоў сінедрыён. Вісяць партрэты прарока з надпісамі: «Айцец Альяш», «Пасланец божы Альяш і яго Ерусалім», «Прарок Ілья». Партрэты ў запусценні, месцамі іх паабрываў вецер, размачыў дождж. Людзі не ў настроі. Сядзяць і тыя самыя [...].

А н т а н ю к. Паўпуда царскага золата ўкрасць! Не трэ было Яноху, Ілья Лаўрэнц'явіч, давяраць такое багацтво!

М а й с а к. І Хрыстос пе прадбачыў, што сярод апосталаў Іюда знойдзецца! Гіцлю Яноху — анафема!

Х і м к а. Каб ён у сваім доме, на падворку і ў полі быў пракляты! Каб у яго ад макаўкі да пят ні адной здаровай костачкі не стало! Каб яго вымазалі з кніжкі жывата і ён зажыў з чарвякамі!

Х о р а м. Анафема! *(Цяжка ўздыхаюць.)*

А н т а н ю к. Перастаў да нас народ ісці, усё пайшло сікось-накось! У горадзе чуў— пад Кракавам мужыкі баставалі і паліцыя іх расстраляла зноў з кулямётаў. У Гішпаніі брат ваюе з братам — рэкі крыві пацяклі! Немец туды сваіх салдат папёр, самалёты, а Саветы — танкі! На Усходзе японецу Кітай лезе! У газетах здымкі — шабля ў японца, бы цясак, ля ног галовы навалак — бы качаны капусты. Бо няма такого Саламона, каб сказаў народу — людзі, якого ражна хочаце?

Х і м к а. Жах! Калісь Майсею Гасподзь даў дзесяць запавядзей, і з таго часу хоць бы на адну паменшало? Той самы разбой, войны, п'янкі, ашуканство, грахі ды распуста! А камуністам ужэ мало запавядзей!

А л ь я ш. Зноў настае Садом і Гамора ды канец свету!

М а й с а к. А папы разводы ўжэ пачалі раздаваць за грошы! Бацюшкі залатыя зубы паўстаўлялі! Грамаадводы проці неба ўкапалі, радзівы пакуплялі і слухаюць тое, што адно Госпаду дазволено!

Х і м к а. Знойдуцца рызыканты — паспрабуюць гаварыць шчэ з небам, думаеш — не?

А л ь я ш. Кара страшная чакае людзей за гардыню. У святым пісанні так і сказано: перад канцом свету брат пойдзе на брата, дачка — проці маці, і тады жоўтая чума свет залье, зямля разверзнецца, а на тым месцы застанудца чорная ноч і сем слупоў дыму!

М а й с а к. У календары пісано пра зацьменне месяца і я сабе падумаў — дай праверу. Прыйшоў вызначаны дзень — точно! Ведалі, што і ў святое пісанне ўпісаць!

Х і м к а. Пятрук, як ты можаш спакойна гаварыць пра гэто — канец жа свету ідзе! Белыя пальчаткі папоўны панадзявалі, капялюшы і так пруццо да цэрквы! Дзеўкі ды маладзіцы ліфчыкі панашывалі! У гарадах замест дзяцей багачкі сабачак заводзяць і цванцыкуюць з імі па тратуарах! Іншая адкрыто жыве з палюбоўнікам, а мужык маўчыць! У горадзе ніхто не паважае бабу без каханка!

М а й с а к. Паступово, памаленьку і агорне людзей бяда, факт!

Х і м к а. А не шкада табе? Карова здохне і то жаласць бярэ, а тут — свет ідзе прахам!

А н т а н ю к. І звяры выміраюць! Шчэ з бежанства вярнуліса— ласі бегалі, а зара і зайца дзецям не пакажаш! А дрэвы цяпер якія? Рэчкі высыхаюць, то і лясы гінуць! А маладыя якія цяпер? Нос усюды сунуць, рагочуць — бо чортавай пячаткай кляймёныя!

А л ь я ш. Канец усяму ідзе. Я меў відзенне. Ноччу бачу: выскачыў на белым кані архангел Гаўрыіл, затрубіў, небо адразу і распаўзлосо, а людзі, хаты, каровы — зніклі. Застаўсо толькі Вершалін — горад такі, пабудаваны мной на пагорку пад Лешчынай.

Цяжкое маўчанне. Чуваць шахматыстаў.

С т а н к е в і ч. От напалохаў! А гэто — што? *(Совае фігуру)*

Б а н а д ы к. Ха!.. Хоць ты шышка важная — царкоўны сторож, а мы твайму слану — сякір-башка!.. Ага, язык у цябе адразу дратвай перавязалі? Пагарэў, бы Заблоцкі на мыле!

Х і м к а. Ілья, ратуй нас! Ты і відзенне ўжэ меў! Думаеш, Бог зра намякаў? Дальбо, настаў момант, каб ты зноў сваю моц праявіў! Пра цябе ж айцец Рэгіс Мікалай Біблію друкуе, усе моляцца на твае іконы, а па вёсках імя тваё гэтак славяць!

Г а л а с ы. Даўно чакаем святы знак!

А л ь я ш *(уздыхае).* Сам чую гэто. Намякало даўно... Цяпер, калі людзі сталі рэдко сюды прыходзіць, пачало намякаць часто.

Х і м к а. То чаго марудзіш, покуль д'ябельская сіла пачне намі правіць? Толькі страшнае знаменне пакажы!

А л ь я ш. Найперш трэ радзіць Хрыста. Мусім знайсці дзеўчыну на мацер божую...

Х і м к а. А — Нюрка з Забагоннікаў, дзеўка — бы ружа!

А л ь я ш. І трэ знайсці мужыка, ад каго яна паняce. *(Думае, уздыхае.)* Для гэтаго я — застары ўжэ.

Г а л а с ы. Не-е, шчэ не стары-ы, змо-ожаш і гэта... Паспрабуй і пабачыш, што змо-ожаш!..

## КАРЦІНА ЧАЦВЁРТАЯ

Злева — домік Альяша, справа — Хімчын. Далей — царква са званіцай. Вакол домікаў бушуюць бабы. Хімка рыхтуе маці божую да святога зачацця. Стыне ў балейцы вада. На лаве — Нюрчына вопратка. Божая маці нацягвае гарадскі ліфчык, шаўковую кашулю з мярэжкамі. Кашулька ўвыдатняе поўныя, бы палавінкі футбольнага мяча, грудзі, такія ж габарытныя бёдры ды крутыя плечы.

Б а б ы *(пяюць «Вершалінскі гімн»).*

Наша цэрква — незямная!
Тут ўпраўляе херувім!
Гэта цэрква — залатая!
Гэта наш — Ерусалім!..

Г а л а с ы. То дзе яны там, чаму не ідуць, хопіць прыхарашувацца! Няхай, няхай! Прыйшлі, то пачакаем!

Н ю р к а. Слізкая, як вужака! А халодная, бы бляшаная! *(З трывожнай радасцю.)* Як дурныя жанкі паноў такую бялізну носяць?!

Х і м к а. І я лічу — самая лепшая льняная: у гарачыню не парыць, зімой лепш грэе. Але ніц не зробіш, цяпер мода на шоўк! *(Падае сукенку з малінавага аксаміту.)* Нацягвай!.. *(З-за Нюрчынага жывата ў сукенцы перад карацейшы, жанчына хвіліну мяркуе: счапіць на жывую нітку і падкараціць зад, адрэзаць лішняе?)* Ат, не будзем псаваць, Нюрка, файны матарыял!

Н ю р к а. Такого нават і ў паноў не бачыла!

Х і м к а. Дарагі! Калі будзеш, Нюрачка, ісці, то не надто напінайся, тады краі вісецімуць роўно!

Н ю р к а. Каб не забыць адно!

Х і м к а. Толькі той бяды, як і забудзеш!

Н ю р к а. Ой, выпало чысто з галавы, што ў мяне там! *(Вымае з пліты шчыпцы, слінявіць палец і правярае гарачыню жалеза. Падвівае перад люстэркам валасы і суне прыладу ў агонь назад.)* Стынуць падто хутко. Перад адыходам шчэ папраўлю! *(Спрабуе нацягнуць панчохі на тоўстую лытку.)*

Х і м к а. Абыдзешса без панчох, цалейшыя будуць!

Н ю р к а. Летам пават і паненкі так ходзяць па гарадах, сама ў Гродне бачыла, калі з татам бульбу вазілі!

Х і м к а. Толькі ног не мачы, бо набрыняюць і туфель не нацягнеш. Вытры насухо, калі ўжэ ўсадзіла, на! *(Кідае анучу.)*

Н ю р к а *(не слухае).* Цётко, а ён, кажуць, надто велькі, праўда?.. Каб не задушыў шчэ, чаго добраго, мяне!..

Х і м к а. Мой быў таксамо мажны мужчына, царство яму нябеснае. *(Хрысціцца.)* І мне здалосо — такі здаравяка ўзлезе на цябе ў ложку ды яшчэ задушыць. Ажно ён надто лёгкі аказаўсо, ой, лёгкі, бы хлопчык!

Н ю р к а *(праз хвіліну).* Гадко ўсё гэто, праўда?

Х і м к а. Мо першы раз толькі. А потым, бывало, пасля работы дзеці ноччу пазасынаюць, надыдзе той час, і ўжэ не можаш аніяк без гэтаго... Ай, то калі мужык з жонкай жывуць, а ў цябе ж — іншае, грэх пра гэто і думаць нам!

Н ю р к а *(паслухаўшы, як на двары збягаюцца жанчыны).* Уй, што скажуць бабы з Забагоннікаў, калі даведаюццо, што мама скажуць, сёстры што пачнуць гаварыць?!. Я то, дурная, хоць і згадзіласа на гэто, але ж не знаю, не ведаю, цётачку, што шчэ будзе!

Х і м к а. Маліцімосо за цябе, от што! Жартанькі, столькі дасі людзям, — боскае дзіця прывядзеш! Пра такое адно ў бібліях ды святых евангеллях пішуць, з паперці бацюшкі расказваюць!

Н ю р к а *(уздыхае).* Шчэ я так козыткі баюсо — не дакраніса! Як яно ссаці ў мяне будзе?!

Х і м к а. Так бывае, калі цябе казыча хто другі. Як сваё дзіця — не пачуеш!

Н ю р к а *(недаверліва).* Вы думаеце?!

Х і м к а. Вядомо! Тваё цело, твая крывінка дзіця — сама ж ты сябе не баішса, казычы, не казычы!

Н ю р к а. Дальбо, мусіць, праўда!.. *(З Хімкай апускаюцца на калені, моляцца.)*

Х і м к а *(устае).* Амант! То пойдземо! Як ужэ яно будзе, Нюрачко! Чакаюць, мусі, яны з Альяшом нас...

Н ю р к а *(у паніцы).* О, што ж гэто я нарабіла, дурная, не пайду, цётачку, хібо я здурэла?!

Х і м к а. Будзе табе, не маленькая! Вытрыса, на!

Н ю р к а. Я баюсо вельмі! *(Уся калоціцца.)* Я — грэшніца! Хібо мне радзіць божаго сына?

Х і м к а. Бог безупынно ўвасабляецца ў народ, таму і Хрысты, Нюрачко, могуць раджацца ў многіх бабаў!

Н ю р к а *(ад стрэсу зявае).* Ы-ы-ыэах!.. Вы так думаеце?

Х і м к а. Пра што тут думаць? Паглядзі, колькі Багародзіц ведаем: і Казанская, і Журовіцкая, і Чанстахоўская, і ў яўрэяў, мусіць, свая!.. Шчэ Яшка, бывало, пытаўсо: «Мам, колькі Багародзіц, столькі і Хрыстоў было?»

Н ю р к а. Страшно як!.. Ай, куды мне, цётачку, учыніць такое, грэшнуй?! Ой, цёточко, сутарга рукі-ногі зводзіць, баюсо!.. Што мне рабі-іць, мамо-о, падскажэце?!.

У істэрыцы падае на падлогу. Хімка б'е яе па твары і вядзе на двор. Натоўп бабаў неахвотна расступаецца. Зайздросныя жанчыны бесцырымонна разглядаюць яе, каб да чаго-небудзь прычапіцца. Нюрка ідзе, бы па дроце.

Г а л а с ы. Замаладая! Дзева Марыя павінна быць файная баба ды высокая, а гэта— як пянёк! — У самы раз. Дваццаць тры ёй! — Кажуць, ніхто не згаджаўсо! — Было ахвотніц шмат, Альяшоў крыж на гэту паказваў! — Адзначана святым духам! І пасціласа, і моліцца, як трэ, яе бацькі таксамо бедныя! — Гляньце, сукенка тапыршчыцца! Шчэ і ніткі тырчаць якіясь!.. — І лякеркі абула, бы на вялікдзень! — Не чапляймосо, бабы, ёй і так страшно, спатнела ўся, бач! — Каб толькі ўсё добро было! — Паслухае нас Гасподзь! Аднаго Альяша слово што значыць! — Грэх языкі распускаць! Не кудзелю папрыходзілі прасці! — Дзе той хлопец, чаму не ідзе ўжэ! — Унь, а малыя, а малыя, — як плот абляпілі! Шчэ і на ліпу ўзлезлі! Дзеці, марш дахаты! Ну, што сказано? — Ага, так яны цябе і паслухаліса — не тыя цяпер дзеці! Сабак каб нацкаваў, хібо!..

Хімка з Нюркай знікаюць у доміку. З'яўляецца прарок з божым жаніхом. Апонші — з кепкай набакір і цыгарэтай, якую перакатвае паміж вуснаў. Ён дзёрзка азірае бабаў. Жанчын раптам бытта падмяніў хто. Прысмірнелыя, глядзяць з захапленнем і звычайнай бабскай цікаўнасцю.

Г а л а с ы. Вядуць! — Гэ-эны, дачака-аліса! — Мой мужык шчэ ўчора паказваў мне на вёсцы, я пазнаю! — Бач, і папяроску курыць!

— Казалі ўсе, што файны, аж ён такі і е! — Ах, як валасы кучаравяцца! — А стройны — бы таполь! — І дужы надто, кажуць! Мажны мужчына! — А вачыма, а вачыма — так і стрыжэ!

*Альяш вядзе малойца па калідоры, утвораным бабамі. Са звар'яцелымі вачыма ад прыступу ўзбуджанасці некалькі бабак рынуліся да божага жаніха, пачынаюць хапаць яго.*

Г а л а с ы. Ой, пусціце мяне гэтыя святыя ножанькі пацалаваць! Дайце мне святыя ру-учанькі!..

Б о ж ы ж а н і х *(выплёўваючы цыгарку і з усмешкай, бытта ад козыткі).* На, дурная, патрымайса, думаеш, пашкадую такой крале?!

*Жанчыны змаўкаюць. Альяш з хлапцом заходзяць у дом, куды зайшла божая нявеста. Станкевіч-званар наматаў вяроўкі на руку, чакае сігналу. Напруджаная цішыня.*

П і л і п і х а. З Госпадам яны там якраз дамаўляюццо!

*Выходзіць Альяш з Хімкай, спыняюцца на ганку. Хімка трымае запаленую свечку. На твары старога — усмешка дабрадзея.*

А л ь я ш. Браты і сёстры! То пастаньмо на калені, памолімсо Богаві, хай Гасподзь праявіць міласць і сатварыць сваё таінство!

*Усе бухаюць каленьмі ў пясок, шэпчуць малітвы. Затым цягнуць да неба рукі, лямантуюць.*

Г а л а с ы. Ісусе Хрысце, сыдзі ў Нюрку Сабэсючку! — Спашлі сваё знаменне, выслухай лішне смелыя малітвы сірот сваіх, унемлі просьбам нашым, Госпадзі! — Дай сілу Адама, спашлі яму цярпенне, каб ён мог зрабіць сваё, Госпадзі! — Усемагутны пане неба, які ўтварыў цуд і даў магчымасць нарадзіць дзіця Саары, калі ёй было сто гадоў, уваж і нашы малітвы, пашлі цуд на зямлю шчэ раз! — Дай ім лёгкае зачацце, госпадзі, явісь благадаць божая! — Блаславі святое чэрава, у якім будзе другі сын твой расці!

Х і м к а. Блаславі і сасцы дараженькія, што势 стануць яго карміці! Блаславі і вусны анёльскія, вочы серафімскія, што яго песціць будуць! Блаславі і рукі, якія насіць яго будуць! Блаславі голас яе чысты, што лашчыць дзіця стане! Блаславі рабыню божую Нюрку Сабасючку з Забагоннікаў— новую мацер божую!

*Людзей разбірае дрыготка. Яны агорнуты гэткай жа ўзнёслай радасцю ды адчуваюць сябе часткай маці-прыроды, бы далёкія нашыя продкі ў «ночы кахання» на Купалу.*

Ж а н о ч ы  в і с к ( з *хаціны).* А-а!..

З грудзей у баб вырываецца ўздых палёгкі. Б'е звон.

Б а б ы *(крычаць яму ўрытм).* Госпадзі, дзякуй табе, што нас уважыў!

Бом!

Хвала табе, Госпадзі!

Бом!..

Звон змаўкае. Альяш узнімаецца з кален, ідзе ў домік, за ім, прыкрываючы ад ветру свечку, тэпае Хімка. Бабы шчыльным натоўпам ціснуцца да ганка, на тварах — цікаўнасць і бессаромныя ўхмылкі.

Б а н а д ы к. Ото ж смеху будзе, калі Нюрка дзеўку родзіць, куды Альяш яе дзене? Пагарыць, бы Заблоцкі на мыле!

С т а н к е в і ч . Ужэ не раз гарэў — жывучы, зараза!

Б а н а д ы к *(рагоча).* А то шчэ тройню родзіць!

С т а н к е в і ч . Жарты — жарабец такі!..

Б а н а д ы к. Ну, родзіцца малое і які ж з яго Хрыстос, з малога?

С т а н к е в і ч . Стары дурань сам не разумее, куды яго заносіць, хочаш зразумець ты? Пайшлі іграць!... *(Абодва знікаюць.)*

Ж о н к а  А н т а н ю к а . Куды маладыя падзяваліся?!

П а л о с я. Канчалі б мілавацца, выходзілі б!

П і л і п і х а. Не для распусты пайшлі якой!..

М а й с а к. Ха, іншым толькі дай волю!..

У дзвярах — хлапец без шапкі.

М а й с а к. О, жаніх паказаўсо, глядзіце!

Ж о н к а А н т а н ю к а. Чаму адзін?! Трэ і яе вывесці!

А л ь я ш. Нюрка хай ачуняе. А вы, брацця і сёстры, цяпер слухайце, што вам скажу. Аб'яўляю вам найдрошчую ва ўсім свеце весць! Бо дрошчай весці за гэту быць не можа! Аб'яўляю ўсімі народам другое прышэсце Госпада і канец свету! *(Бярэ тоўсты фаліянт, водзіць пальцам па пергаменце, чытае.)* «..Калі паўстане царство на царство, настануць глады і землетрасенні! Палі і лясы ўсцелюць трупы, збяруцца арлы і глытаць іх стануць! Звёзды з небі спадуць, сілы нябесныя пакалеблюцца, зямля расколецца, як арбуз, дымы і агні з яе паваляць, а ўсё жывое праваліцца ў агонь, згарыць! *(Жах. Енк. Крык. Плач. Завыванні.)* Але раней на ўзгорку пад Ляшчыной я пабудую горад Вершалін. Хто верыць у мяне, пасля туды пераселіцца, бо гасподзь бог Вершалін не кране, а заменіць яго ў рай!

І будзем, брацця і сёстры, жыць у Вершалінскім раі ва векі вякоў, амін!

Н а т о ў п *(хорам).* Амін!

Г а л а с ы *(скрозь плач і завыванні).* Ратуй нас, Ільля! — Вядзі ў зямлю абетаваную! — Бяры нашыя душы, бяры сэрцы, грошы бяры, кароў і коней ды гаспадаркі забірай, адно ратуй нас, Альяш! — Не аддавай нас арлам! Не хачу ў аго-онь!!!

## ЧАСТКА ДРУГАЯ

## КАРЦІНА ПЕРШАЯ

*Хата Альяша. Стол, пад лавай кошык з бульбай. На сцяне рэшаты, хамут, збруя. Над сталом іконы, каляровыя партрэты «Айца Альяша», лампады. У кутку — жабрак з Хімкай — поўныя набожнай пашаны да свайго ідала. Прарок з пугай за халявай кленчыць перад іконамі. Ля стала пісар з тоўстым блакнотам збіраецца абмакнуць пяро ў чарнільніцу. Ля ног прарока — конская торба, з якой вылазяць камы грошай.*

А л ь я ш *(б'е паклоны).* Ангел божы, храніцель святы, жывот мой саблюдзі ва страсе Хрыста, разум зацвярдзі ва ісціным пуці...

П і с а р. Айцу Мікалаю Рагісу для новай Бібліі пра вас патрэбно слово ваша! Усё абяцаеце, а не кажаце яго! Бо хоць і канец свету настае, але ж Біблія і тады, мусіць, патребна будзе!...

А л ь я ш. Шчэ і ты са сваім!.. Біблія, вядомо, патрэбна, заўша. Ладно, пытайса, пра што хочаш ведаць.

П і с а р. Хто, па-вашаму, дастойны ў Бога?

А л ь я ш *(шкрэбае пад пахай).* Ва сне ікона мне казала: той дастойны Усявышняго, хто зніме шапку перад крыжам.

П і с а р. Так і пісаць? *(Макае пяро.)* А яшчэ — на пропаведзях вы гаворыце заўша, што пасля смерці людзі ў сабак пераходзяць. Як гэто разумець?

А л ь я ш. Не датумкаеш? Шчэ і вучаны! Што такое, па-твойму, сабака? Цело чалавека пасля канчыны ў магіле на пыл рассыпаецца, вадой сцякае, а душа на сёмым небе чакае страшнага суда. Гэто ў такіх, бы мы з табой, у каго іскра божая. А грэшнікі — тыя без іскры, таму бобікамі робяцца. Потым лётаюць па вёсцы ды золато за хлявамі збіраюць, покуль да пекла! *(Пісар з недаверам ківае галавой.)* А як ты хочаш? За добро было б ім інакш!.. А машкары, гусеніц розных,

лярваў чаму так развялосо? Таксамо з-за грахоў! Сяджу раз пад хатай на прызьбе, а Гасподзь мне шэпча: «Альяш, хай людзі сэрцы свае аслабаняць ад грахоў, то свет ад паскудства я ачышчу!»

Х і м к а. Не любіць Альяш гаварыць, надто не любіць. Калі ж пачне — бы вузялкі вяжа!

Ж а б р а к. І міністар другі такое не прыдумаў бы!

А л ь я ш. Ат, вазіса тут з вамі! Трэ Вершалін канчаць, — канец усяму хутко і тады ўсе з мёртвых паўстануць страшнаго суда чакаць!.. *(Збіраецца ісці.)*

Уваходзіць Данілюк.

Д а н і л ю к. Пачакай, Ілья! Рабіць штось трэбо з *(паказвае на пісара)* яго Рэгісам! Айцец Мікалай так напіваецца, што без нагавіц па вуліцы лётае!

А л ь я ш. Бо ён — бас, а такія мусяць піць! Думаеш, адкуль голас бярэцца? Ад гарэлкі. Усе басы п'юць! Ат, мало нам тут засталосо, на тым свеце рассудзяць нас усіх!..

П і л і п і х а *(улятае).* Ілья, ты тут таўчэшса, а там унь — Хрыстос ходзіць па полі! Пастухі бачылі, як раненько апускаўсо па воздусі з хмары на зямлю! Дарожкай сабе гэтак ідзе ды жытам кланяецца, птушачак бласлаўляе!..

Д а н і л ю к. Цьфу, дурная баба — ёй толькі адны забабоны! Гэта — Іван Мурашка з Валыні.

А л ь я ш. Чаго той мурашцы тут трэ?

Д а н і л ю к. Адзінаверцаў пад Сарнамі сабраў ён шчэ больш, чым ты! Ды абшчына яго ўзняла бунт і распаласа, а самому прароку бабы морду расцарапалі — у струпах увесь. Іван ходзіць па тваім Вершаліне, на ветракі дзівіцца, у ставы тычку садзіць, глыбіню вымярае.

П і л і п і х а. Зайздросцяць цяпер табе яны, Альяш!.. Бо надто ж ладныя дамы атрымаліса, з ганачкамі, у ставах чырвоная дахоўка файно так глядзіцца — вачэй не адарваць!..

А л ь я ш. Буду яднацца з хахлом — от шчэ!.. Усе выйшлі на работу з раніцы?

Д а н і л ю к. Каменшчыкаў з Крэва — трыццаць шэсць. Пільшчыкаў з Ліды — восемдзесят чатыры. Шаснаццаць сталяроў і цесляроў з-пад Слоніма. Дваццаць два бляхары і восем шкляроў з Беластоку.

А л ь я ш *(паказвае торбу).* У Крынках палічу грошы і ў Гродна скокну. У заапарку куплю лебедзяў, а тады ў Бярозаўцы — каляровае шкло на ганкі". Да канца свету пяць тыдняў, зашкліць паспеем.

П і л і п і х а. І станем мы жыць у Вершаліне, бы птушкі нябесныя, што не сеюць, не жнуць, а ўсё маюць!..

Ж а б р а к *(не адводзіць вачэй ад торбы з грашыма).* А лічыць возіць іх рэстаранщчыку ў Крынкі, сваім не давярае!.. О-о, нашым толькі такое давер — так і аббяруць цябе!

Х і м к а. Ілья надто гаспадарлівы!

А л ь я ш *(ідзе па хамут, але спахопліваецца).* Ха!.. У беластоцкіх шкляроў дзісь палучка!.. Сколькі ім плаціць?.. Трэ падлічыць... Восем чалавек та-ак!.. *(Бярэ восем бульбін і выкладвае іх на лаву.)* За днёўку кожнаму — два злотых. *(Каля кожнай бульбіны кладзе па дзве залатоўкі.)* А за тыдзень — па шэсць разоў яшчэ... *(Грошы раскладвае, як карты пры раздачы.)* Ра-аз, два-а, тры-ы, чаты-ыры, пя-аць, ше-эсць, хопіць!.. *(Бульбіны кідае ў кошык, адлічаныя купюры згортвае ў кулак, глядзіць на пісара.)* Паслаць цябе, каб ты ім раздаў палучку?.. *(Хвіліну думае.)* Шчэ ўцячэш з капіталам, бы Янох, я вас ведаю, лепш аддам сам! *(Бярэ хамут, збрую і торбу з грашыма.)* Ну, так я паехаў!

## КАРЦІНА ДРУГАЯ

Вісяць аб'явы. На плакаце — вялізнае факсіміле ад «Зварота Прарока Альяша да Народаў з выпадку Канца Свету». На царкве — жахлівы малюнак: у смале кіпяць грэшнікі, ля іх чэрці з віламі. Перад царквой сцякаюцца на канец свету «альяшоўцы». Людзі здаюць прыёмшчыку грошы. Пераапранаюцца ў свежыя кашулі і сукенкі, кідаюць на траву торбы, лахманы. Да «канца свету» рыхтуюцца грунтоўна, без спешкі, бытта да касьбы ці жніва. Ля іх — камсамольцы. Відны новыя будынкі Вершаліна.

К а м с а м о л е ц п е р ш ы . Цётку, так вы — на небо збіраецеса?

П і л і п і х а. Пасмейса, пасмейса!

К а м с а м о л е ц д р у г і . Уваскрэснуць умерлыя, то куды змесцяцца — іх столькі жыло да нас?! Навыцяжку хібо пастануць, упрытык!

Ж о н к а А н т а н ю к а . Бог ім адкрые новыя міры! Зрабіў гэты свет, наробіць шчэ, бо гэто ў яго моцы!

К а м с а м о л е ц п е р ш ы . Царква ваша ўзнімецца на неба са званамі, а Вершалін — з каровамі, сабачымі будамі, нужнікамі?

А н т а н ю к. Нехрысці, ваду муціце? Цэнцну зара па тваіх акулярах!.. *(Актывістаў выштурхваюць.)*

Х і м к а *(з-пад далоні выглядае людзей).* Няўжо з намі болей ніхто не пойдзе? Шкадаваць потым будзеце — позна будзе!

Д а н і л ю к. Перад усямірным патопам людзі елі, пілі ды весяліліса, высмейвалі старого Ноя, калі каўчэг збіраў!..

К а м с а м о л е ц п е р ш ы *(на авансцэне).* Жывыя персанажы з біблейскага патопу! Раскажы каму ў горадзе — не паверацць!

К а м с а м о л е ц д р у г і . Цішэй, шчэ раздзяруць тут нас!.. *(Хаваюцца.)*

Разадзетыя багамолы ўрачыста кіруюць да Альяшовай святыні. Адпетыя фанатыкі перад храмам кладуцца ніцма на траву, чакаюць ракавой хвіліны.

А н т а н ю к. Глядзі, Соня, дзіця, каб не надто перапалохаласо, калі грымець пачне і зямля валіцца! І сама не бойса! Распачнецца ўся неразбярыха, то стань і — ні з месца! Народу будзе прорва, але нас Бог не кране! А цяпер давай будзем развітвацца! Жылі мы з табой душа ў душу дваццаць гадоў, цяпер давай, бабо... *(Цалуе.)* Хто ведае, ці ўбачымса на тым свеце?

Ж о н к а А н т а н ю к а. У цябе е грэх які, што ў пекло рыхтуешса? Бо я перад Госпадам чыстая, як слязінка! Так што ў цябе за душой, ну?

М а й с а к *(Антанюку).* Во, маеш!.. Скажу табе, Іване, калі гэтых бабаў там не аддзеляць ад мужыкоў, то і рай будзе не рай!

А н т а н ю к *(жонцы).* А гэто, Соня, што ў цябе?

Ж о н к а А н т а н ю к а. Маткі. Буду сабе вязаць там.

А н т а н ю к. У раі вяза-аць?! Здурнела!

Ж о н к а А н т а н ю к а. Воўна з нашых марыносых авечак, надто файная і фарба добро ўзяласа — паглядзі сам!

А н т а н ю к. Не смяшы людзей!

Ж о н к а А н т а н ю к а . А я з пруткамі схаваюсо дзе-небудзь за смакоўніцу тую ці пальму і буду панчохі рабіць альбо світар! Бо сумно стане без дзела, Іван! Ну, дзень-два пасплю, а потым?

А н т а н ю к. Ы-ы-ых, што ты выдумала! Нагараваласа за жызню, мы з табой варты лепшаго! Выкінь зараз жа гэту дрэнь!

Х і м к а. Іване, дай пацешыцца ёй крыху, яна потым сама выкіне!

Г о л а с. Ой, няўжэ я сваю маму пабачу? Якія яны цяпер? Мама памерлі, а мне было пяць годзікаў— цяпер мае дзеці старэйшыя?

Ж а б р а к. Людзі на небе не мяняюццо. А я ўсё думаю пра бацькаваго дзеда. Шчэ з турэцкай вайны прывёз, кажуць, сярабра збанок і закапаў перад тым, як самого мядзведзь задраў. Я перааpаў

усё поле!.. Але стары здорава грашыў, зара не спытаеш, бо напэўна — у пекле на самым дне будзе.

Ж о н к а А н т а н ю к а . Думаеце, адтуль нельга і да сваякоў выйсці? На мінутку хоць, калі папрасіць добра апостала Пятра, столькі ж не бачыліса!..

Ж а б р а к. Калі ўжэ трапіў туды хто — капут. Ат, цяпер і карысць малая, каб дзед і сказаў! Цікава проста!..

Ж о н к а А н т а н ю к а *(да мужа).* А як жа я буду жыць на тым свеце: там з'явіцца і твая першая жонка?! Гандзя маладзейшая і ты мяне адразу кінеш! Кінеш, бессаромныя твае вочы! А-а, дак во што ў цябе за душой!..

А н т а н ю к. Пабойса ж Бога, Сонька, што мелеш?!

М а й с а к. Не спрачайцеса! У Евангеллі ад Мацея гаворыцца, што на небе не любяць па-зямному, а прабываюць, як анёлы божыя!

П а л о с я. А мяне разбірае страх, калі падумаю, што трэ ляцець на небо кудысь! Я ж па драбінцы за бялізнай на гару баюсо лезці, а то — над хмары, звёзды і месяц!

М а й с а к. Будзеш, як усе, адна ты такая?

П і л і п і х а. Мілая сястрыца, архангелы возьмуць цябе ў белыя рукі і панясуць, панясуць у нябесныя высі, бы тую каралеву!..

Ж о н к а Антанюка. А ўсё ж такі жуткавата! Чалавек сабе жыў-жыў і тут раптам — у раі! У Гродна ехаць і то страшно!.. Волесь, унь і Палося Канцавая! І гэтая рэзгіня прыперласа, каб спазнаць царства нябеснае!

М а й с а к. Кацёл з гаршчка смяецца, а чорныя абодва.

А н т а н ю к . А ты, Соня, выкінь з сябе гардыню! Хрыстос умеў дараваць віны нават ворагам! Глядзі, бабо, дзіця унь улезло ў штось!

Ж о н к а А н т а н ю к а *(спахопліваецца).* Яначка, на каго ты падобны?! Ці табе не гаварыла — не пэцкай касцюмчыка, не лезь нікуды? Дзе мне памыць цябе на небе? Там і карыта не знойдзеш!

А н т а н ю к. Ладно, не карай. Не можа таго быць, каб на небе не знайшлосо ў што малых пераапрануць. У кутку цвінтара — сасновыя плашкі. *(Падпальвае іх.)*

«Бом» — гучыць галоўны згон. «Цялям-цялям», — уторацъ меншыя.

У с е *(падаюць на калені, горача моляцца).* Госпадзі, памілуй! Госпадзі, памілуй!

Бом!.. Цялям-цялям!..

Госпадзі, памілуй! Госпадзі, памілуй!

*Смольныя плошкі з трэскам шугаюць у неба полымя, асвятляюць заклапочаныя твары, кідаюць хісткія цені. Званы і енк напаўняюць паветра. З царквы, як з-пад вады, далятаюць галасы капэлы і ўплятаюцца гарманічна ў вэрхал, дадаюць журботы і суму.*

Х о р: Отве-ерзи, господи, врата в облака-а, вусти в блаженно Араратское цар-ство-о!..

Х і м к а *(сама сябеўгаворвае).* Нічого, цялесную муку цярпець — імгненне. Анёлы і маю душу, бы павуцінку бабінаго лета, панясуць да самого Хрыста!.. Як мае дзеці спаткаюць мяне? Не праклянуць, што я, нягодніца, пакінула іх у бежанстве на чужбіне ў голад і разруху? Якія яны цяпер? Калі ж яны і праўда мечаныя той страшнай пячаткай ды пойдуць у пекло? Тады ўзбярусо аж на сёмае небо, кінусо Госпаду ў ногі, стану яму цалаваць сандалі і маліць, каб пусціў і мяне туды, прыму за Яшку і Маню страшныя мукі!

*На хвіліну з'яўляецца заклапочаны Альяш.*

А н т а н ю к. Ілья, а калі пачнецца канец свету — у поўнач, раніцой, у абед?

А л ь я ш *(мармыча малітву).* Адчапіса, шчэ і ты тут!.. *(Выбягае.)*

П і л і п і х а. Ходзіць далей ад народу, з Усявышнім гаворыць! На свае вочы бачыла: стаіць за клірасам каля анёла ды шэпча яму на вухо штось! Хацела падслухаць, але ён міргае— не падыходзь!

Х і м к а. Фігу што і зразумела б! Шаптаў слово, вядомае адно нябёсам! Клопату цяпер у яго бы ў генерала — такое дзело!

М а й с а к. Дзяды і прадзеды дарэмно чакалі!

Х о р а м. Такія мы шчаслі-івыя!!!

*Па авансцэне брыдуць вясковыя актывісты.*

К а м с а м о л е ц п е р ш ы . Ну, дзісь свінні мелі чым пажывіцца на выгане — столькі хлеба, сыраў, яек, крупы багамольцы выкінулі на траву!.. Наша цялушка ледзь не падавіласа — хустку засмактала!..

К а м с а м о л е ц д р у г і . Гэта ж трэба — папрадавалі крамы, млыны, гаспадаркі і — папрыляталі!.. *(Слухае званы.)* А яны ўсё малоцяць!

К а м с а м о л е ц п е р ш ы . Це-емра! Паляшуцкія дзеўкі шчэ нават майтак не носяць!.. Я чуў пра гэта, але — не верыў. А ўчора з хлопцамі пару падлавілі і праверылі — без дна ходзяць, жах! А як яны зімой?!.

К а м с а м о л е ц д р у г і . Палешукі — ладна, але ж і нашых тут багата!.. Эх, на жаль, ніякага канца не будзе, зноў брыдзі да халернага торфу заўтра! Вада хало-одная, аж ногі ломіць!

К а м с а м о л е ц п е р ш ы *(паныла спявае).*

Хто супроць нас — прэч з дарогі,
Бачыш гэну грамаду-у!
А мы і чорту скруцім рогі,
Богу вы-ырвем бараду-у!..

Хлопцы разыходзяцца. Цямнее. На цвінтары ўсё моляцца. — Бом!.. Цялям-цялям!.. —гудуць званы.

— Госпадзі, памілуй і прыдзі! — лямантуюць людзі.

— Бом!.. Цялям-цялям!..

— Госпадзі, памілуй! Госпадзі, памілуй! Госпадзі, памілуй!

М а й с а к *(ускідвае рукі, крычыць).* Сыдзі да нас, Гос-падзі!

— Бом!.. Цялям-цялям!..

У с е *(пад звон спяваюць).*

Ужэ к нам прыблізілась
Міра канчына,
Й ты к нам, прарочача,
На землю прыйшоў!..
Пакайцесь, людзі, пакайцесь,
Зірніце навокал нас!
Ўсім сэрцам да бога ўздыхніце,
Апошні настаў ужэ час!..
Куды не паглядзіш на землю,
Забойствы й нянавісць адна:
Народы так дышуць злабою, —
Прыйшла ўжэ апошня пара!
Пакайцесь, людзі, пакайцесь!..

Паступова людзі астываюць ды з недаўменнем азіраюцца. Развіднела.

Г а л а с ы *(яшчэ нясмелыя).* Што, маму так я і не пабачу? — Хопіць, нацешылася!

Ж о н к а А н т а н ю к а. А ты нездаволены, што са сваёй Гандзяй не спаткаешса?!. А шчэ гаварыў: «Калі пачнецца неразбярыха, то стань і — ні з места!..» І з гэтай выдрай, Канцавой, нічога не здарыцца?!

А н т а н ю к. На якую табе халеру, бабо, здаласа тая Канцавая? Пра сябе думай!

М а ц і  в а р 'я т а. Трэ спытацца Альяша, як быць! Хай хоць нашы грошы верне за праданыя гаспадаркі!

Ж о н к а  А н т а н ю к а. А мы на канец свету — нават зімнюю вопратку прадалі, засталіса адно унь гэтыя маточкі воўны з марыносаў!

М а й с а к. Я шчэ тады казаў, — канец свету будзеісці паступово, а вы паверылі, што зара гром смальне ды зямля расколецца!

А л ь я ш *(аднекуль вынырвае).* Дарагія брацця і сёстры! Гасподзь хоча, каб да канца свету больш людзей пакаяласо! У сваёй бязмернай дабраце павёў падлік існавання зямлі не з дня нараджэння сына ў Вефліеме, а з яго Галгофы і дазволіў яшчэ трыццаць тры гады насіць нам цяжкі крыж, каб мы маглі паказаць госпаду нашу любоў і адданасць! За тое, што Усявышні явіў новае знаменне, пастанемо на калені і скажамо: «Верую ва адзінаго Бога айца...»

Цяжкое маўчанне. Спалоханы Альяш бяжыць хавацца. Тэкля яго даганяе.

Т э к л я. Што ты, падло, натварыў, уяўляеш сабе, у якую трату людзей увёў? Цябе ж зара яны разарвуць!

А л ь я ш. Яны ж самі на гэто мяне падбівалі!... Самі ж пачыналі ўсё, ты ж ведаеш!.. А гэты Майсак, што цяпер брэша?!. Успомні, што яны ўсе раней казалі?!. Хай я памру, але ж яны...

Х і м к а. Гэто Гасгюдзь Бог яго рукамі нас так правяраў! Ратуймо Ілью хутчэй, покуль людзі не разлютавалі. Потым сабе аблаеш ды малітвай адмолішса!..

Г а л а с ы. Дзе той ашуканец, дзе Альяш?!. Дзе той сраны прарок?! Кішкі яму зара выпусцім!..

## КАРЦІНА ТРЭЦЯЯ

Зноў хата Альяша (дэкарацыя з пятай карціны). Гэтаксама з пугай за халявай Альяш кленчыць перад іконамі, ля стала — пісар. Зводдаль стаяць Хімка, Нюрка, жабрак ды з пашанай глядзяць на свайго ідала. У куточку моліцца Піліпіха — яна з'ехала з глузду.

А л ь я ш. «...І к любві горнай уязві душу маю, палучы ад Хрыста ёелюю міласць...»

П і с а р. Айцец Ілья! Рэгіс ад мяне патрабуе запісанаго пра вас у Біблію, а ў мяне няма чаго даваць ім!

А л ь я ш {*уздыхаючы, устае).* Ну, хутчэй пытайса! Мне трэ ў Крынкі ехаць!

П і с а р. Не выйшло з канцом свету, то калі чакаць яго цяпер?

А л ь я ш *(як уджалены).* Ха, не выйшло, бытта я вінаваты! Бо не было яўлення! Гэтая *(пінае Нюрку ботам)* — аказалася ялавіцай!..

Н ю р ка *(з енкам падае на падлогу).* Ой, я няго-одніца, ой, не жада-аная госпаду!.. Памалі-іса за мяне, святы айцец!..

А л ь я ш. Пустое тваё чэраво — няўгоднае Богу! Што толку з малення?!. Нічого, я ўжэ выглядзеў новую дзеўчыну на мацер божую, а для святого зачацця падабраў галоўнаго каменяцёса з Крэва! Таго, «Архіпатрыцыя», што прыняў веру «ільінцаў»!.. Ад такого дзеўчына панясе-е!

Ж а б р а к і Хімка*(разам).* Ад «Архіпатрыцыя» напэўно родзіць!

П і с а р *(запісвае).* Ад «Архіпатрыцыя»?!.

А л ь я ш. Зачыню іх зноў у хаце, народ вакол на калені пастаўлю — як пачнем усе прасіць Бога!.. Мама казалі, як калісь не было дажджу, то красны ход прыходзіў на Вершалінскі пагорак і тыдзень-два людзі енчылі, але ж Гасподзь такі слухаўсо, пасылаў дажджавыя хмары. Мы ж склічам бабаў з усіх вёсак, — разоў у дзесяць болей за мінулы раз! Як станем усе малізцца ды шчэ ў тры званы як ударым — быць таго не можа!..

П і с а р. Тры званы?!.

А л ь я ш. Усе тры! Выенчым на гэты раз! Сам буду глядзець, каб смешачак ніхто не строіў!..

Х і м к а. А нячыстых бабаў, Альяш, у той дзень да ўзгорка і блізко не падпускай, бо мінулы раз яны табе і нашкодзілі!..

Ж а б р а к. Каменяцёс спра-авіцца, ад такого панясе напэўно! Шчэ з войска ведаю! Бывало, пойдзем на ўвальніцельную да дзевак, такі бугай каторую як прыцісне і — гатова!..

Н ю р к а *(выцірае слёзы).* Ой, якая я шчаслівая, што служу такому чалавеку! *(У істэрыцы хапае Альяша за ногі.)*

Улятае дачка з мужам і старым Аўхімюком.

В о л е с ь. Дзядзьку Альяш! Вы думалі, усё скончыласо з-за вашаго дурного «канца свету»? З-пад Бельска прывалілі суд чыніць над вамі! Спілавалі дуб, змайстравалі крыж, павесілі ільняны фартушок ды на гарбах сюды прыперлі! Правярац вас збіраюццо! А прывёў іх былы ваш памагатар — Антанюк!

В о л ь г а. Во-ой, татачку, што цяпер будзе?!

А л ь я ш *(мітусіцца).* Вы — што, дзеці?!.

А ў х і м ю к. Ці я табе не гаварыў — не дуры людзей, не траві душы, які з цябе прарок, старое падло!

В о л ь г а. Во-ой, тату, поўны падворак іх там!..

В о л е с ь. Я ў і х пытаюся: «Куды вы пад халеру гэткі цяжар прэце?» Знаёмы шэпча: «Альяша на крыж цвікамі прыбіваць будзем». Другі паказвае венчык з калючага дроту і завостраную на шыла піку!

Н ю р к а. А я цэлу раніцу гадаю — чаму мне сырое мясо сніласо? *(Схопліваецца з зямлі.)*

Х і м к а. О, кожны табе дурань скажа, — убачыш яго ва сне, — чакай бяды!

А ў х і м ю к. Ці не папярэджваў я цябе, халера, што дажывеш, калі галаву табе скруцяць за твае выдумкі?! Ці не цвярдзіў табе — не палітыкуй, не сялі ў люд пустую надзею — гэтым не іграюцца!

А л ь я ш *(якзагнаны кот).* Ой, Базыльку, казаў!.. За сцяной бушуюць людзі.

Г а л а с ы. Што цяпер з намі будзе?! — Памочнікі Альяша ўсенька ў нас забралі і кінулі па сканание. — Згінем, бы рудыя мышы цяпер! Ён — ніякі не прарок! — Мацер божая, апусці свой караючы меч на яго! — Укрыжуем, каб здох, як сабака!

А л ь я ш *(трымае дзверы).* Не пускайце!..

Г о л а с. Ведаем, дзе ты, ашуканец!..

В о л ь г а. Тату, лезце сюды! *(Адчыняе пячную засланку.)*

Урываюцца разлютаваныя фанатыкі з дручкамі. Хапаюць прарока, усімі кіруе Антанюк. Пісар дае драла.

А л ь я ш *(дзівіцца).* Іване, і ты з імі? Іюда Іскарыёцкі!

А н т а н ю к *(вінавата).* Слухай, Альяш. Столькі людзі патраціліса! Валачылі табе пасцілкі, кужаль, авечак. Гаспадаркі распрадалі, млыны, крамы ды пааддавалі тваім памочнікам грошы, а нічого не споўніласо! Народ бунтуе! Кажуць, Альяш Клімовіч — ніякі не прарок, а — пераапрануты афіцэр Булак Балаховіча!

Г а л а с ы. Прыкідваўсо праведнікам, а ў самого — мяшкі золата і брыльянтаў закопаны ў агародчыку! — Ты выстаўляўсо, што не п'еш, а самаму аж з Варшавы віны ды лікёры прывозілі! Толькі цяпер мы даведаліса!

А л ь я ш. Плёткі!

Б а ц ь к а в а р 'я т а. А што Тэклю купіў... тваю маць, за золато ў Жоржа Делясі, таксама плётка?!

А н т а н ю к *(смялей).* Чуў?! І мы хочам праверыць цябе — распнём на крыжы. Калі ты святы, то нічога з табой не станецца — на трэці дзень уваскрэснеш! Калі ж афіцэр, тады...

Мужыкі паказваюць піку і венчык з калючага дроту.

Г а л а с ы. Бы сабака на ім здохнеш! — Тры дні нікога не падпусцім! *(Паказваюць дручкі.)* — Ні войта, ні паліцыянтаў! Нават сам Пілсудскі, калі сунецца са сваім войскам, — ніц не даб'ецца, бо нас на двары многа!

А н т а н ю к *(паказвае малаток, конскія ўхналі).* Надто не бойся, я табе *гэто* ўмомант зраблю, не паспее і забалець!

А ў х і м ю к. Ты іх спарадзіў, яны цябе і вырашаць — во!!!

В о л ь г а *(абнімае бацьку).* Во-ой, татачку, не маўчыце, вас жа на крыж будуць распінаць!..

В о л е с ь. А ці падумалі вы, што паліцыя ўсіх вас да козы пазабірае і потым судзіць будуць? Угалоўшчыну прышыюць — ахвота вам па турмах кукаваць?

А н т а н ю к. А навошта ён байкі баяў і людзей дурыў? Мы за справядлівасць! За гэто можно не толькі да козы і ты нас не палохай! Не штука стаяць за праўду — ты за праўду пасядзі!

В о л е с ь. Хто застаўляў цябе верыць? Унь з дзядзькам Аўхімюком мы абодва з гэтай вёскі. Запытай нас, ці што-небудзь з Альяшовага трызнення мы прымалі ўсур'ёз? І бабам сваім не давалі мардавацца! Вам жа ўсё гэто падабаласо, то і маеце! Пазашываліся ў сваю пушчу і думаеце не тым месцам. *(Запускае пальцы мужыку ў бараду.)* О, ён ад каляд не мыўсо нават — гаспадарлівы надто, эканоміць на мыле! На табе недзе вошай, бы на паршывай сучцы блох!

К р ы к *(з-за дзвярэй).* Не слухайце яго, гэто — гарадскія агітатары! Падаслалі нам цацалістаў балахоўца ратаваць!

А н т а н ю к *(катэгарычна).* А ну, Ілья, на крыж!

В о л ь г а. Во-ой, татачку!..

А л ь я ш. Можно і на крыж, думаеш — збаюсо? Хрыстос явіў прыклад, каб мы ішлі яго следам. Для мяне — найвялікшае шчасце прайсці па цярністым ЯГО шляху і быць за народ укрыжаваным. Але ж я — толькі што з поля вярнуўсо! Хацеў адразу ў Крынкі... Во, і рукі ў зямлі нават... Акучваў цэлы ранак бульбу, не маю ў сабе святасці. Дайце памаліцца гадзіну, сілу святую ўвабраць, тады рабеце са мной, што хочаце — на ўсё воля боская, бо я, людзі, —нявінны. *(Бухае на*

*калені перад лампадай.)* Ойтчэ наш, іжэ ясі на небясі, да свяціцца... імя тваё, да прыдзе...

Мужыкі заклапочана чэшуць патыліцу.

Г а л а с ы. Мо і праўду чалавек кажа?! Калі захочаш, тады і святым становішса, нават не памыўшыса? — Шчэ і з гноем на ботах, вярнуўшыса з хлява? *(Мужык кірцюром грэбае па Альяшовай падэшве, нюхае палец, моршчыцца.)* Тады кожны святым стаў бы! — Мо хай, хлопцы, памоліцца? — А як уцячэ? Балахоўскія афіцэры, ведаеш, якія вёрткія? Бы вужы! Адзін у тую вайну, разумееш, зайшоў да мяне, папрасіў...

А н т а н ю к. Ша! Мы не бусурмане якія — хай чалавек моліцца! Нас тут пяць соцен, ад такой грамады нікуды не дзенецца! Выстаўляем варту, астатнім на мурог — спаць! Зробім *гэто,* калі сонцо ўзыйдзе, шчэ будзе і лепш! Айда ўсім на двор!

З грукатам мужыкі выходзяць. Зяць кідаецца да акна і спрабуе адчыніць. Вольга дапамагае.

А ў х і м ю к. Папаўсо, рызыкант?! Дзе твае апосталы, дзе твае тыя жулікі — Рогусь твой, Данілюк, святыя дзевы? Пацалуй іх у сраку! Пакінулі цябе аднаго з ашалелымі сектантамі і паўцякалі! Ты іх спарадзіў, яны цябе і рашаць! Не ўратуе нават матка боска і грошы! *(Б'е нагой па торбе, з яе вывальваюцца жмуты купюр.)*

А л ь я ш. Верую ва ядзінаго Бога айца, уседзержацеля тварца... Дальбо, праўда, Базыльку! Гэтым людзям я ўсю душу, усяго сябе, а яны... Для іх найлепшыя званы раздабыў, толькі ў Кракаве такія ў касцёлах — на пяць тысяч адваліў! Хай, думаю, маюць файныя, з малінавым звонам, з рысуначкамі!.. Не, самі яны ніколі на такое не пайшлі б! То папы іх падаслалі! Ненаедныя кудлы ўсё могуць! І цацалісты ваду муцілі, бо я ім папярок горла стаў! Брата маго спляжылі, потым Распуціна забілі і пад мяне даўно падкопваліса!.. Але чаму, скажы, народ паддаўсо на чужую дудку.

А ў х і м ю к. Ы-ых, ты — зноў за сваё?! Сівая барада, а ёлуп ёлупнем, нічого цябе ўжэ не пераменіць, капут!

А л ь я ш. Ёлуп, Базыль, шчэ й які! Падумай сам: я ж для іх Вершалін будаваў, стараўсо, на тваіх вачах усё было, скажы? І на высокім падмурку зрубы клаў, і на вапне, як у пана Гурскаго, з ганачкамі і горкамі! Майстроў самых лепшых ім раздабыў, нават каляровае шкло аж з Бярозаўскай гуты прывёз за сем тысяч, карпаў у

ставы пусціў, лебедзяў прывалок з Гродзенскага заапарка, а яны — ненаеднаму архірэю, цацалістам прадаліса, на іхнюю руку пайшлі!

Т э к л я *(улятае разлютаваная).* Ці я табе не казала — не начуй у сваёй хаце, не заходзь у яе нават?!

А л ь я ш. З поля зайшоу торбу ўзяць!.. Гэто іх гродзенскі архірэй падбухторыў! Я ж да яго, кудлатаго, дабярусо!

Т э к л я. Ці не прасіла цябе шчэ ўчора — выедзем адгэтуль, бо павар'яцелыя сектанты ўсяроўно жыць не дадуць! Ці дваццаць, тысячу разоў не маліла?

А л ь я ш. Хто гэто думаў, каб прыбіваць мяне да дзерава ўхналямі?! Я ж іхняго грошыка сабе не ўзяў, ні разу не выпіў, не з'еў лішняго — ты ж, Тэклечка, ведаеш, а яны мяне — на крыж!

Т э к л я. А варто было б, каб павісеў крыху — разумнейшым стаў бы мо! Старое ты падло — табе свет вучыць, як жыць?

В о л е с ь *(адчыніўшы акно).* Дзядзьку Альяш, лезце сюды — на падворку вяскоўцы нашыя вартаўнікам зубы якраз загаворваюць!

А л ь я ш. Ха! *(Усхопліваецца.)* От, добро!.. Ну, я ж ім, гнідам, цяпер пакажу!!!

А ў х і м ю к. Паўзі, паўзі праз акно з уласнай хаты, бы злодзей які! Ото ж нарагочуццо заўтра людзі, калі бабы разнясуць па вёсцы, як ты ратаваўсо ад сваіх багамолаў! Сам пастараюсо размаляваць! Артыст з пагарэлаго ціятра! *(З Тэкляй выпіхваюць прарока праз акно. Відаць, як кабета пачынае нявенчанага мужа лупцаваць.)* На і свой капітал! *(Шпурляе торбу.)* О, усып яму, Тэклечка, каб людзей больш не баламуціў, надзяры добро вушы лайдаку!

У хату ўрываюцца разлютаваныя мужыкі і бабы.

Ж о н к а А н т а н ю к а . Пустая?! Так ён нас і чакаў тут!

М а ц і в а р'я т а. Няўжэ — уцёк?! Мы ж засталіса галюткімі, бы рудыя мышы!.. А, забяру хоць гэто! *(Зрывае са сцяны рэшата.)*

Людзі ўмомант расхапалі ўсе рэчы. Выдзіраюць адны ў адных кошыкі, коціцца па падлозе бульба.

Г о л а с. Гаўнаедка з Палеся! Гэто маё-о! Я хапіла раней!

А н т а н ю к. Людзі, адумайцеса, трэ гэтага [...] знаісці! Нікуды не падзенецца, калі дружно ўзяцца!

Ж о н к а А н т а н ю к а. Праўду мой Іван кажа — Альяш недзе шчэ блізко, нас гэткі кагал, бяжэм!

Умомант памяшканне пусцее. Яно выглядае, як пасля пагрому. Перакулены стол, лавы, парваны блакнот, рассыпана бульба. У кутку ўсё таксама моліцца Піліпіха.

Ж а б р а к. От, скажы, як Альяш у Госпада на прыкмеце: зноў уратавала боская моц! *(Паднімае блакнот, здувае смяцінкі, з любоў прыціскае да грудзей.)* Дачакаўсо, праведнік, пра сябе Біблію нават! Сшытак яму перадам, то мо і за мяне слоўцо перад Госпадам закіне! Паміраць скора, а я — грашыў, ой, грашыў!

На двары страляніна. З крыкам і енкам урываюцца ў памяшканне людзі Антанюка. Некаторыя параненыя. Паранены і сам Антанюк, ён хаваецца за спіны. Спрэчка.

Г а л а с ы. Ты ж вартаваў, дзе твае вочы былі?! — Дак яны з агародаў зайшлі! Як жарнулі з дубальтовак!.. *(Хапаецца за ягадзіцу.)* Шрацін, заразы, наўганялі!..— А ў мяне— соль?! *(Ліжа палец.)* Але, соллю стралялі!..

З лёскатам адчыняюцца дзверы зноў. На чале двух апрычнікаў са стрэльбамі ўрываецца прарок з кіёчкам у руках ды дзіка азіраецца. На грудзях у Альяша — польскія ордэны. Апрычнікамі кіруе Станкевіч.

А л ь я ш. А-а, вы тут, шыбздзікі?!. Што, у сраку мяне пацалавалі? Дзе ваш завадатар, Антанюк? Застрэлю, хай толькі спаткаю!.. Усіх пастраляю, бы сабок паршывых, хто пачне да мяне лезці — паліцыя дала мне такое права!..

Г о л а с. А мы — што, айцец Альяш, мы — нічо-ого!..

А л ь я ш. Цэркву перадаю крынкаўскаму ксяндзу пад касцёл, каб другі раз ведалі!.. Фэлюсь, нанімай людзей, здымі званы ды ў сажалку пакідай! *(Жэст кійком.)*

С т а н к е в і ч. Будзе зроблена, айцец Ілья!

А л ь я ш *(Піліпісе)*. А, гніда, ты шчэ тут?! *(Выштурхвае яе з памяшкання ботам.)* Прэч, забабонійца! *(Праз акно нешта бачыць.)* Фэлюсь, а ну, смальні шчэ і па тым шыбздзікам! *(Паказвае.)*

С т а н к е в і ч *(нацягвае чорныя пальчаткі)*. Рыхтуйсь! *(Ствалы дубальтовак выстаўляюцца ў акно.)* Слухай маю каманду! *(Узмах пальчаткай.)* Плі!

Залп. Чуваць, як на дворы енчаць параненыя. З памяшкання вышмыгваюць мужыкі з Антанюком. Аслупянелы жабрак прыціскае да грудзей блакнот.

А л ь я ш. Атрымалі?! Цяпер будзеце айца Альяша прызнаваць і вы?! Сабакамі шчэ пацкую! Ніхто цяпер мяне не кране і пальцам, во што я маю!.. *(Паказвае ордэны.)* А ты *(да жабрака)* аб'яві ўсім: застрэлю кожнаго, хто да мяне палезе! *(Тыкае дзеду кіёк пад нос.)*

Ж а б р а к. Скажу, айцец Ілья...

А л ь я ш. Паліцыя дала мне такое права! Напомні — аднаго субчыка, які лез, я укакошыў!

Ж а б р а к. Перадам, пане Клімовіч!..

А л ь я ш. Шчэ накажы ў Крынкі задрыпаным агітатарам, што і да іх дабярусо! Папішчаць у мяне і за брата Максіма, і за Распуціна, і за іншых — мяне шчэ сам Іаан Кранштацкі навучыў!

Ж а б р а к. Скажу, айцец Ілья, Крынкам, і Распуціну перадам...

А л ь я ш. Усіх парашу! Вымыю рукі іх акаяннай крывёю! Перапластаю, бы прарок ваалахавых жрацоў!

У акно заглядаюць Тэкля з Хімкай.

Х і м к а. Што з чалавекам зрабілаоо, да чаго людзі давялі!

Т э к л я. Падступіцца б мне толькі да яго!

А л ь я ш. Ідзі! *(Піхае жабрака кіем.)* Фэлюсь, бяры малойцаў — знойдзем Антанюка і прычэшам яму кудры!.. *(Вывальваюцца.)*

## КАРЦІНА ЧАЦВЁРТАЯ

Першыя дні акупацыі. Па вёсцы шнырас нямецкі афіцэр з двумя салдатамі. На прызьбе Тэклінай хаты босы Альяш рамантуе граблі. Перепалоханыя бабы цікуюць за немцамі. За тычковай фасоляй — баец з падвязанай рукой.

А л ь я ш *(палохаецца)*. А ты чаго?!

Б а е ц. Папаша, я ўцёк з калоны палонных! Гналі нас па шашы ў Ваўкавыск і во — стрэліў фрыц уздагон! Куля дагнала ў кустах!.. Не падто баліць і косць не пашкоджана!.. Перавязаць бы, бо свярбіць, зараза! *(Даверліва ідзе на падворак.)*

А л ь я ш *(з лёгкасцю хапае грабліска, лупцуе хлапца)*. Папашу сабе знайшоў? Воўк табе папаша, цацаліст ты!

Б а е ц *(прыкрываючы рану, адступае ў фасоль)*. Пастой, дзядуля, я ж — рускі, ты аслеп? Будзь чалавекам!

А л ь я ш. А ты — чалавек?! Бальшавік, агітатар! У цябе замест душы, — пара адна! Ідзі ў Маскву да свайго Сталіна, хай цябе ратуе! Галадранец! Цацалісты паршывыя! Думалі — вам тут Амэрыка з

даларамі! Цара скінулі і ўжэ лічылі, што вам пройдзе ўсё? Немец хутко паставіць вас на пуць ісціны, іхні Гітлер Богам на вас пасланы!

Б а е ц. Но-но, дзед, ты — што?

А л ь я ш. Звязду пачапіў?! У немцаў на пражцы выбіто «З намі Бог!» Яны вам пакажуць, дзе ракі зімуюць!.. Жалезнай мяцёлкай адгэтуль вымятуць!

М а к а р ы х а *(падляцеўшы).* Ах, сыночак, ах, золатца, і на каго ж цябе лёс накіраваў, да каго ты прыстаеш?! *(Засланяе хлапца.)* У яго і снегу зімой не выпрасіш! Ён роднаго сына на смерць паслаў!

Б а е ц. Я ж не ведаў, мамаша... Бачу, з барадой...

М а к а р ы х а. Ідзі, сынок, у той будынак з новай страхой, а я вады прывалаку і бінту якого! Пакармлю і адзенне цывільнае ад сваго Юлька табе пашукаю!.. Пасілкуешся, сынок, ды адправішся да сваіх, як сцямнее! А ты, дурань, прэч адгэтуль! Шчэ і Тэклі пра ўсё раскажу, грабліско гэто яна па табе паламае, бо я і рук паганіць не стану, цьфу! Развярнуцца табе не дамо! У-у, жыў-жыў, і нічому не навучыўсо, дурным і здохнеш! *(Адводзіць байца.)*

З'яўляюца немцы.

А ф і ц э р *(да цёткі цераз плот).* Як вернецца твой пан, каб эта фура нах Свіслач фарэн, фэрштэен?

М а к а р ы х а (*хаваючы байца*). Скажу яму, паночку, павязе!.. Каб ты здох і тваю магілу свінні разрылі!..

А ф і ц э р. Кто знает камуністэн унд юдэн?

М а к а р ы х а. Так і чакай, каб я табе сказала!.. Э-э, паночку, адкуль яны ў нас могуць быць?! Усенькія камуністы пахаваліса ў сваю Маскву, там іх шукайце! А юдаў у нас з роду не было — па гарадах яны ўсё больш труцца!

А ф і ц э р *(са шкадаваннем).* Ша-адэ!..

М а к а р ы х а. Пашкадуй, пашкадуй!..

А ф і ц э р. Млеко? Маслё? Яйкі?..

Каб адвязацца ад ворагаў, цёткі нясуць ім бутэлькі малака, яйкі. Немцы пакуюць усё ў сумкі, збіраюцца ісці.

П і л і п і х а *(бяззубым ротам).* Пане, вы пыталіша пра камуніштаў! Але пашлухайце, што я вам шкажу! Жатое ў нас антыхрышт е! Дальбо, каб я ж гэтаго мешта не ўштала — чачалішт, фэрштэй?

П а л о с я *(пасля хвіліны недаўмення).* І праўда! Той, каторы здрадзіў сваёй веры! У гэтай хаце жыве! Уцёк і тут хаваецца!

М а ц і  в а р 'я т а . А што яму рабіць засталосо, калі гэтак усенькі народ ашукваў?

М а к а р ы х а. Маўчыце, бабы, што мелеце языкамі?! Не слухайце дурных, пане, яны нічого не фэрштэюць! От, жыве сабе тут адзін чмут!

П і л і п і х а. Чачалішт ён, хрыштапрадавеч! Каб ён у тым пэкле, каторым нас палохаў, на самым дне шмажыўшо! Чэрці даўно па ім шумуюць! Мне, пане, верце, я — найштарэйшая, лгаць не стану!

П а л о с я. То колькі маўчаць? Мала і я слёз выплакала, молячыса, каб нявесткі мяне не елі?! Аж тры авечкі і карову заперла! А кужалю, а дываноў колькі, грошай убухала і для чаго? Каб прапілі яго апосталы з Рогусем!

П і л і п і х а. Ох і пілі-і-балява-алі, а людцэ ж вы мае!.. Папілі!..

П а л о с я. Тыднямі не цверазелі, з дзеўкамі пазакрываўшыся, у тым Вершаліне, а мы папрыходзімо ды валяемсо пад цэрквай, як тое быдло! І лебедзікаў сабе развялі, карасікаў, цьфу! Тады шчэ — канец свету прыдумалі, каб абабраць нас ушчэнт!

М а ц і  в а р'я т а. Ад дзяцей, ад сябе аднімалі і яму зносілі, а яны — збыткі з народа чынілі! Столькі людзей падбухторыў ды задурыў усім галаву!

П і л і п і х а. А чаркву потым палякам пад касцёл аддаў, званы ў ваду ўтапіў. Бярыце яго, пане, ён — антыхрышт, ішчаны Бог, шватым крыжам пабажушо, во! *(Урачыста хрысціцца.)* Бальшавікі яго пашкадавалі ў трыччаць дзявятым, то вы забірайце ў сваю воласць і ўшыпце халеры бізуноў па шамыя годзі, хай адрыгнечча штарому д'яблу наша дабро і шлёжы!

А ф і ц э р *(стараецца зразумець бабак).* Антыхрыст, зо?!.

П і л і п і х а. Во, на тым падворку! Хапайце гіцля, покуль не ўцёк!

П а л о с я. А ён можа, бо прыткі шчэ на ногі!

М а ц і  в а р'я т а. Чаму не быць пыткім? Хібо спрацаваўсо дзе, як твой мужык? Усю жызну толькі людзей ашукваў!

А ф і ц э р *(бачыць старога).* Ком гір!

Альяш і далей маздыгуе граблі, не ўзнімаючы галавы.

П а л о с я. Во, бытто хтось і паверыць яму, што не чуе!

М а ц і  в а р'я т а. Не можа пагадзіцца, што скончыласо яго панавапне!

А ф і ц э р. Ком, ком, антыхрышт! *(Маніць пальцам.)* Ком тутай, абэр — шнэль, прэндко!

Макарыха *(цераз плот да хлопчыка).* Мішанька, ляці ў пушчу, там Тэкля з бацькам ля кароў! Хай цётка Тэкля сюды бяжыць!

Прарок садзіць лязо нажа ў шчыліну, адстаўляе граблі, падыходзіць.

Афіцэр. На, что делять? *(З нядобрай усмешкай.)* Казаць, лёс!

Пilіпіха. То гавары, Ілья, калі пан начальнік цябе пытае, чаго набычыўсо ды маўчыш?

Альяш. Нічого такого... Яна пашала раніцой кароў, а я ля хаты цэлы дзень таўкусо... Гуркі паліваў, капусту. За граблі ўзяўсо. Тады з фасолі вылез гэты... я прапёр яго. Ён сабе думаў, што паспрыяю, але я гіцля — кіем! *(Бачыць суровы позірк тоўстай цёткі і прыкусвае язык.)*

Піліпіха. Падзівіцеша, як прыдурваечча, шваю морду верне!

Бабы *(хорам).* Бы глухі, дурны!

Мацівар'ята. Пане, але каб вы бачылі, які ён быў раней! Ці так гаварыў з народам тады? Я да яго з хворым сынам паўзу, а ён Пятрука сваім крыжам так і ўдарыў па галаве! Во, сюды!.. *(Зняўшы хусцінку, торапка паказвае пальцам.)* Жалезным, гы-гы-гы-ы!.. *(Плача.)*

Палося. Ох, якія з нас збыткі строіў!

Мацівар'ята. Нам казаў маліцца, а сам са сваімі ашуканцамі апосталамі — ні ў Бога, ні ў чорта не верыў!

Піліпіха. Па людзях штраляў! Шротам штраляў і кроў лілаша!..

Макарыха. От, шчаміло, ніяк не адстане ад старого!

Палося. Тэклінаго мужа забіў, у яму заваліў, і паны нічого нягодніку не зрабілі! Во трымаў панскую руку! Веру прадаў — яму паны за гэто і ордэны далі!

Піліпіха. Антыхрышт! Вы, пане, немцы, людзі справядлівыя, не даруйце яму такое!

Афіцэр *(пальцам з залатым пярсцёнкам заве салдат).* Вір коммэп! Зофорт эрледыгеп!

Унтэрафіцэр *(стукае абцасам).* Цу бэфэль, гэр комендант!

Афіцэр. Альзо, лёс! Абер — шнэль!

Маладыя немцы з ахвотай вядуць старога за хату, ставяць у лебяду, рыхтуюць зброю. Не разумеючы, што яго чакае, прарок стаіць пакорна, бы перад фатографамі.

Уптэрафіцэ. Айнс, цвай, драй — фоер!

Гучыць аўтаматная чарга. Стары падае ў лебяду. Бабы з віскам разлятаюцца. Немцы адыходзяць. Са схованак вылазяць мужыкі і крадуцца за хату, спыняюцца над целам. Асцярожна падыходзяць бабы.

А н т а н ю к. І трэба ж было чортавай Піліпісе свой паганы язык усадзіць!

Б а ц ь к а в а р ' я т а. Думала — напалохаюць толькі старога! Ну і немцы! Пасадзі ты чалавека ў халодную, калі вінен, пашлі на работу, шчэ як пакарай, а то — бабах і годзе!

Б а н а д ы к. Фашысты! Пісалі ж пра іх, як у Іспаніі людзей нішчылі, — не надто верыласо!

П а л о с я. Жыў, нечаго дабіваўсо, людзям дабра хацеў ды няма ўжэ!

Х і м к а. От чалавек быў — ні табе з'еў смачнае, ні роскаш якую адведаў! Ні сябе, ні дзяцей не шкадаваў, ні жонкі — для народа ўсё стараўсо! Н і дня ні ночы не меў спакою, на нагах ды на нагах, вечна ў руху, бы тая мурашка, ды шчэ подбегам! Альбо на возіку з дзеравяннымі васямі! То ж каб хацеў — залатой карэтай ездзіў бы!

М а ц і в а р'я т а. Загінуў святы праведнік! Для народа стараўсо, а народ яго і прадаў! От і праўду кажуць — як ты людзям не спрыяй, усё адно кепско!

Х і м к а. Бы Хрыстос на Галгофе! Тыя, што крычалі на яго «спасіцель», потым пачалі раўсці — «Распні!» Нават выгляд у яго святога! Ні табе крывінка пацякла, ні табе скрывіўсо — бы ўздрамнуць Альяш прылёг у сваёй Грыбоўшчыне!

П а л о с я. А мо святы і е? *(З жахам.)* Ой, Госпадзі! Ва ймя айца і сына і духа!.. *(Падае на калені.)*

Б а н а д ы к. Цьфу... Вашу маць, спасіцеля святого сабе знайшлі! Не хапае залатого венчыка над галавой! Што трэплеце языкамі?! Каб ён быў такі добры, нашто паддавалі б яго немцам?

Б а ц ь к а в а р ' я т а. Мало ён вас памэнчыў? Ме-енцяць, ліхо на іх сваімі языкамі!.. Чулі, як ваш спасіцель ды праведнік байца раненаго лупцаваў? Макарыху унь спытайце! Шчасце, немцу не сказаў, а то не адзін з нас у бадылях тут валяўсо б!..

П а л о с я. Н е дай Бог, які ўрэдны быў стары!

М а ц і в а р'я т а. Ніколі не засмяяўсо, бы чалавек, не загаварыў, не дапамог каму, не пашкадаваў!.. Адна Тэкля і ладзіла з ім!

Х і м к а *(уздыхае).* Такі там лад. Цацкаласа, бы з калекам. Дзяцей не мела, то завяла сабе забаўку, а потым і кідаць няёмко з-за людзей. Як звыкле мы, бабы, гэто робім...

Т э к л я (улятае, цяжка дыхаючы). Дзе ён?!. *(Бачыць цела і бытта спатыкаецца на роўным месцы.)*

П а л о с я. Тэклечко, гэто — дурная Піліпіха! Мы стаялі здалёк і, дальбо, ніц не казалі, а яна, зараза, усё афіцэра падгаворувала, падгаворувала! Як пачала!.. А цяпер моліцца на яго ікону дома!..

Б а б ы *(хорам).* Мы адно слу-ухалі!..

Т э к л я *(сурова).* Сціхніце!.. *(Да мужыкоў).* Трэ пахаваць, дапамажэце. Завалачэм дахаты і я збяру яго, покуль не застыў, — труну рабеце. Дошкі ляжаць у бацькі на вышках, гэблік — у сенцах!

А н т а н ю к. Зробім усё, як трэ, Тэкля!.. *(Ківае галавой, думае.)*

А ў х і м ю к *(з 'яўляецца з кошычкам).* Што?!. *(Бачыць цела.)* Усё ж такі — скруціў сабе галаву!.. Хто яго, немцы?

А н т а н ю к. Яны, дзядзьку Базыль. З аўтаматаў.

А ў х і м ю к. Гэтыя на расправу хуткія! *(Паказвае ў кошычку пустыя гаршкі.)* У ельнічку нашыя раненыя ляжаць, насіў ім паесці. У тую вайну раненых лячылі — аднолькаво туркаў, немцаў, рускіх, а цяпер фрыцы страляюць іх адразу!..

Б а н а д ы к. За адно унь і Альяша прыхлопнулі!.. Але гэтаго не надто і шкада!.. Ліхо яго ведае, чаму такім абармотам, якіх і да хаты страшно ўпускаць, людзі часамі верацъ?! Успомніце, як за ім шалелі?!. Ці таму, што дурняў на свеце много?!.

А н т а н ю к. Бы хвароба часамі нападае на людзей, як тая кароста! Я і сам быў ёй паддаўсо, ха!.. *(Круціць галавой.)*

Цяжка думаючы, мужчыны закурваюць.

З а с л о н а

*Гродна, 1981 г.*

# ПУБЛІЦЫСТЫКА, ЛІСТЫ

www.kamunikat.org

## ВЫСТУПЛЕННЕ НА V З'ЕЗДЗЕ ПІСЬМЕННІКАУ БССР У МІНСКУ 13 мая 1966 года

Хутка святкавацімем 50-годдзе пашай улады. Хачу напомніць Леніна, калі ён заклікаў на юбілёях быць дзелавымі, менш ужываць парадпай траскатні, менш кічыцца тым, што дасягнулі, больш гаварыць пра педаробленае. Перамогі і святы людзі выкрасаюць з сэрцаў у цяжкой барацьбе.

Зроблена многа. У нядзелю нават у нашым Гродне кожны трэці юнак фланіруе па вуліцы з транзістарам. Амаль у кожнай кватэры — тэлевізар, ён прымае на чатырох каналах: з Масквы, з Мінска, з Вільноса і Варшавы. Да Ташкента ў мінулым годзе я дабіраўся за шэсць гадзін... Аднак і сёння яшчэ часам каб пражыць чэсна і сумленна адзін дзень і гаварыць усім толькі праўду, то душэўных сілаў дабыць трэба з сябе куды болей, чым касманаўту злётаць у космас.

Пісьменніку, мабыць, дастаецца найбольш.

Калі фізік ці хімік зрабіў адкрыццё, то ўсе яго калегі Савецкага Саюза адразу бяруць ноўшаства на ўзбраенне, і наступная думка ўжо развіваецца з уліку гэтага дасягнення. Калі ж пісьменнік напісаў рэч, якую дагэтуль яшчэ не пісалі, то покуль дойдзе яна да народа, аўтару трэба часамі патраціць куды болей сілы, чым для напісання.

Нікому не прыйдзе і ў галаву збіраць хворых і дазволіць ім вырашаць, як урачам лячыць. Возьмем інжынераў-электрыкаў: не збіраюць жа жыхароў камунальных кватэр, каб тыя вырашалі, якой канструкцыі і з якога матэрыялу мае быць кацёл электрастанцыі. У адносінах да пісьменніка такія выпадкі — нармальныя.

(Для смеху. Адзін архітэктар сказаў: гэ, чае ты ныеш? Каб пакрытыкаваць пісьменніка, трэба, прынамсі, прачытаць кніжку. Мяне ж можна разбіць, глянуўшы на пабудову нават праз акно машыны!)

Калі памёр Леў Мікалаевіч, сталічныя газеты змясцілі артыкул: «Падумаеш, Талстой! Пакладзі ў лінію яго кніжкі, яны дасягнуць адно Масквы. А пакладзі ў радочак усе тамы мадам Вярбіцкай, то лінія пойдзе ад Пецярбурга да Уладзівастока і назад да Масквы!..»

Пры ўсім нашым прагрэсе, на жаль, і цяпер можна назіраць такія погляды на дасягненні таго ці іншага літаратара.

Вакол зямлі паляцяць два сабачкі, то некалькі дзён пра іх будуць пісаць усе газеты СССР (хоць праз два тыдні пра выпадак грунтоўна забудуць), а калі б у нас з'явіліся новыя «Людзі на балоце», то ў «ЛіМе» змясцілі б невялічкую рэцэнзію, і толькі. Я не супроць сабачак. Я за

тое, каб ажыятаж вакол іх не рабіўся за кошт дасягненняў сумлення і душы народа.

Ствараецца ненармальнае палажэнне на нашым фронце. Мабыць, рэдка калі аж так праяўлялася адміністрыраванне літаратарамі і літаратурай. Часамі адмаўляецца аўтару права на паказ заганных бакоў нашага жыцця.

Калі радар вядзе самалёт праціўніка, у яго апаратуры ўлічваецца тэмпература паветра, хуткасць самалёта, паталок і яшчэ сотня дадзеных, інакш убачаны вораг візуальна не перакрыецца ў прыцэле зеніткі з ценню на экране і са стрэлу атрымаецца фіга з макам. Калі ты, апісваючы героя, не возьмеш пад увагу ўсе моманты з жыцця народа, дык герой твой не перакрыецца ў сэрцы чытача.

Толькі раўнадушны чалавек, якому не дарагія нашы заваяванні, што дасталіся такім дарагім коштам, можа праходзіць міма адмоўных бакоў нашага жыцця, не ўзнімаць іх у творах.

Ці ж у нашай краіне так усё ўжо гладка?

На Гродзеншчыне цяпер усё ў квіценні яблынь, груш і сліваў. Ці магу я памірыцца з тым, што восенню мы будзем фруктамі карміць зноў жывёлу, а пасля Новага года — слівы і памідоры есці балгарскія?

За апошнія гады ўпаў у цане наш рубель. Ці магу я памірыцца, што даём мы яму падаць, што ніхто не гаворыць пра гэта?

Крытыкуючы паасобныя творы, чаму мы не асуджаем і тыя ўмовы, якія даводзяць аўтараў да крайнасці?

«Хлусня — рэлігія слабых!» — сказаў Горкі. Пра гэта ведалі і раней (між іншым, яшчэ 100 гадоў таму назад Мікалай I, пабыўшы на прэм'еры «Рэвізора», сабраў назаўтра чыноўнікаў і загадаў: усім паглядзець абавязкова спектакль!). Памятаючы гэта, глянем і мы праўдзе ў вочы.

Мабыць, даўно ў нас не было такога становішча, каб рэдакцыі вярталі аўтарам столькі раманаў, аповесцей, апавяданняў, п'ес, вершаў і паэм.

Яшчэ некалькі гадоў таму мы перажывалі буйную хвалю анекдотаў. Армянскіх. Маскоўскіх. Разанскіх. Ішло як бы спаборніцтва паміж гарадамі, рэспублікамі. Па гэтым пытанні былі нават рашэнні партыйных органаў, але гэта толькі выклікала новыя іх хвалі.

Анекдоты адпалі самі па сабе, калі не стала прычын, якія іх спараджалі.

Цяпер якраз перажываем хвалю так званага самвыдата. Ад Гродна да Уладзівастока, ад Архангельска да Сухумі ходзяць па краіне рукапісы аўтараў. Людзі іх зачытваюць да дзірак, не лічачыся з

часам, перапісваюць нанова і перадаюць далей. Пераважная большасць гэтага самвыдата — таленавітыя творы нашых вядомых пісьменнікаў, і праз год-два бачыш іх нават у друку.

Ці да твару нам гэтая з'ява? І ніякімі забаронамі яе не спыніш, калі не зменіш атмасферу ў рэдакцыях, якая з'яву спараджае.

Ой, яшчэ ў нас не ўсё гладка!

Нядаўна я прачытаў у польскай газеце такую сабе бяскрыўдную інфармацыю. На мітынгу ў нейкім горадзе ў Егіпце выступаў Насэр. Як бацька, як звычайны чалавек, ён паскардзіўся 40-тысячнаму натоўпу, што яго дачка правaліла ўступныя экзамены ў Каірскі універсітэт. Я ведаю добры дзесятак дачок і сыноў некаторых адказных работнікаў, якія ў школе вучыліся на троечкі, калі ж дайшло да экзаменаў у гродзенскія ВНУ, пры страшэнным конкурсе яны раптам дружна ўсе атрымалі пяцёркі. А гэта адбываецца на вачах у народа. Зусім тут не хачу выстаўляць у дрэнным святле нашых кіраўнікоў. Мне, як савецкаму патрыёту, вельмі ж крыўдна: будуем Асуан, а ў нечым прынцыповым варта і самім павучыцца ў арабаў.

Мне моладзь падабаецца. Нават з яе танцамі, прычоскамі і модамі. Шкадую, што не магу такіх і я насіць. Пры сустрэчах з моладдзю надта хутка знаходжу агульную мову. Я, у мінулым заядлы камсамолец-падпольшчык, радуюся, што і ў сённяшнім камсамольскім племені жывы інстынкт да дзеяння. Камсамольцы робяць шмат для краіны і нашай ідэі. З-за вялікай любві да іх не магу мірыцца са з'явамі, якія часамі дапускаем сярод нашых дзяцей.

Ці не ў камсамоле побач з героямі нараджаюцца і асобы без сваёй думкі, угоднікі, кар'ерысты, падхалімы ды людзі — чего изволите? Могуць мне сказаць, што такіх мала. Гэта не апраўданне. Прырода кар'ерыста такая, што ён адзін можа знявечыць намаганні тысяч герояў. На жаль, вопыт — не залаты гадзіннік, які ад бацькі пераходзіць да сына. І недастаткова яшчэ ўсвоіць лозунгі і вывады камуністычнай навукі, іх трэба прапусціць праз свае жылы, мазгі і кроў.

Чаму ж часамі ствараем для моладзі інкубатары, а не ўмовы, дзе б яны вучыліся здабываць вялікую праўду жыцця ў мазалях, барацьбе, як здабывалі яе мы самі?!

У нас чамусьці не прынята выступаць супроць такой катэгорыі тыпаў, як кар'ерыст, дагоднік. Кажуць, тлумачэння слова даносчык няма нават у слоўніках. А даносчыкі існуюць у нас не толькі ў выдавецтве «Беларусь». Між іншым, аднаго там я назваў гэтым ганебным тэрмінам. Назваў спецыяльна пры сведках, каб ён меў магчымасць падаць на мяне ў суд ці на партбюро. Дудкі, нікуды не

падаў. І не выклікаў мяне на дуэль. Ён нават шчасліва ўсміхнуўся, бытта яму паказыталі за вушкам.

Чамусьці прытупіліся, ой, прытупіліся ў нас крытэрыі сумлення, гонару, прыстойнасці. Да таго часамі назіраецца падзенне маральных крытэрыяў, што месцамі бярэ верх мяшчанскае разважанне, якое нічога агульнага не мае з марксізмам. Іншы табе будзе хоць цэлы дзень слухаць яўнага балбатуна, які на трыбуне таўчэ ваду ў ступе, і з дзіўным стараннем абзаве таго чалавека наіўным, хто кажа ўсё, што думае.

Пералічваючы балячкі нашыя, мы не можам бачыць, як некаторых людзей пакалечыў культ. Ад таго, што чалавек такі век свой адно ведаў падпарадкоўвацца загадам зверху, у яго, беднага, атрафіравалася здольнасць самастойнага мыслення, знікла прыродная чалавечая рыса не ісці наперакор свайму сумленню. Загадаюць яму сеяць кукурузу на нашых пясках замест лубіну — прымусіць сваіх падуладных яе сеяць. Скажуць заараць лугі, канюшыну,— заарэ і іх. Прагаласаваць за два аблвыканкомы? Калі ласка! Яшчэ выступіць у газеце і ўяўныя поспехі новага парадку падмацуе кашчунна цытатамі з Леніна. Праз два гады выканкомы і абкомы аб'яднаюць, ён напіша другое і зноў падмацуе свой артыкул Ленінам. І не пачырванее перад людзьмі, якіх дурыў, з дзіўнай бяспечнасцю ў апраўданне скажа:

— Партыя тады ставіла адны задачы, цяпер — другія!

А тое, што партыя яму нагадвала яшчэ і думаць ды не губляць сумлення, да яго бытта не адносіцца.

Аднойчы я назіраў такога чалавека, калі ён даваў загад свайму інструктару напісаць даклад. Не саромеючыся мяне, ён яшчэ дадаў:

— Кіркевіч, ты толькі добра яго папішы, бо з дрэнным прымушу выступаць самога!

Хіба можна сабе ўявіць Леніна, каб яму хтосьці пісаў даклады?

Разумею, з таго часу краіна вырасла. Сакратару ЦК для даклада, мабыць, трэба выкарыстаць паслугу і не аднаго інструктара. Але ж чаму мода гэтая практыкуецца зверху да раённага цэнтра? Гэтак і там часамі выступаюць з разносамі пісьменніка, не прачытаўшы ніводнага яго твора.

Гэтак «пішуць» артыкулы ў газеты. Здараецца, нават — дысертацыі. Не дзіва, што людзям такія артыкулы і дакладчыкі набілі аскоміну, аўтарытэт кіраўніка ўпаў. А з чаго яму быць, з адной цікавасці да футбола? Не можа яго быць у такога кіраўніка, нават калі цікавасць гэтая шчырая і разбіраецца ён у ігры футбольных каманд выдатна.

На долю такіх людзей выпаў пялёгкі час. Па-чалавечы можна іх і пашкадаваць. Толькі ж яны маюць уплыў на наша жыццё, а сумленны пісьменнік, якому дарагія дасягненні краіны, праходзіць міма такой з'явы не можа.

«Творчасць — не юбілейныя рэчы, яна трудная, як акт нараджэння дзіцяці» (Кайсын Куліеў). Не лёгка быць пісьменнікам? Што ж, як сказаў мой зямляк Адам Міцкевіч: «Паэт не мае права быць шчаслівейшым за свой народ!» У нас яшчэ не камунізм.

Асабліва дастаецца нашаму брату на перыферыі. Вядома, чым начальства ніжэй па сваёй адміністрацыйнай лесвіцы, тым яно... А сярод мастакоў якраз наадварот — Рэпіны прыходзяць з Чугуева.

Кажуць, у вайну адзін генерал напісаў сыну-лейтэнанту на фронт пісьмо:

«Шура, помни,— ты являешься командиром доблестной Красной Армии и должен с честью и гордостью нести знамя, овеянное Октябрем, сквозь бури, лишения, невзгоды и свято хранить да умножать наши завоевания ибо...»

Сын адпісаў:

«Папа, листовку твою получил. Спаснбо. Напиши, наконец, родила ли Наташа и здорова ли мама».

На перыферыі некаторыя кіраўнікі хочуць звесці мастацтва да ўзроўню пісьма такога генерала. Калі ж ты спрабуеш растлумачыць, што гэта прымітыў, на цябе нападаюць са ўсёй сілай улады і адміністрацыйнага аўтарытэта:

— Што-о? А чаму табе не падабаецца пісьмо генерала? І-іш ты яго!..

І такія людзі перакананню не паддаюцца, іх можна толькі паканаць.

Цяжка, вельмі цяжка жыць пісьменнікам на перыферыі.

Я, камуніст, не хацеў бы выступаць супроць крытыкі ў партыйным друку. Аднак быў бы дрэнным я марксістам, калі б бачыў непарадак у нашай прапагандзе і з-за пакорнасці і бяздумнага падпарадкавання прамаўчаў бы, не падказаў бы партыйным органам на недахоп, не паспрабаваў прадухіліць недарэчнасць: у гэтым бачу свой абавязак савецкага грамадзяніна.

Эх, каб усе артыкулы пра Быкава мелі адно тыя скуткі, што людзі па бібліятэках рынуліся чытаць яшчэ раз нашага і так шырокавядомага і таленавітага гродзенца. Бяда ў тым, што сігналы зверху, покуль дойдуць данізу, у нас часамі становяцца вульгаршчынай.

Па гродзенскіх школах работнікі КДБ адразу пачалі чытаць лекцыі пра пільнасць, прыводзіць прыклады, што побач з Сіняўскім, Даніэлем і наш Быкаў, бачыце, пісаў творы, якія накіраваны на падрыў Савецкай улады і разлагаюць моладзь. Уявіце сабе, як было слухаць такую лекцыю дзецям-школьнікам і яго жонцы-настаўніцы!

На партактыве першы сакратар абкома таварыш Міцкевіч І. Ф. аб'явіў усім, што Быкава ўжо апрацоўваюць італьянскія фашысты, а нейкая фашысцкая газета ўзяла яго на ўзбраенне. Дзіва, і як той Быкаў, халера, пасля ўсяго таго зачасаўся ў прэзідыум V з'езда беларускіх пісьменнікаў і сядзіць побач вунь з першым сакратаром ЦК КПБ т. Машэравым? Глядзіце, ці не з якой мэтай!..

У Слоніме жыве паэт Заходняй Беларусі Анатоль Іверс (Іван Міско). Гэтага чалавека спаткала страшэнная несправядлівасць. Усе 20 гадоў пасля вайны ён патраціў на тое, каб давесці, што ён у перыяд акупацыі ў якасці кіраўніка міжраённага антыфашысцкага камітэта зрабіў што мог для Радзімы, што бацьку яго і жонку забілі немцы. Яго вінавацілі ў супрацоўнінтве з немцамі, не друкавалі. Яшчэ два гады таму ў Слоніме, калі чыталі лекцыі пра «бдительность», Івана Міско абзывалі нямецкім паслужнікам. Адно ў канцы 1964 паклёпы адпалі, Іверс атрымаў партызанскія дакументы, урадавую ўзнагароду, выйшла яго кніжка з творамі, а зараз аўтар прысутнічае нават на з'ездзе. Хоць бы папрасіў у яго хто прабачэння з тых людзей, якія яго тапталі. Дык не, яны робяць выгляд, што нічога не здарылася.

Чатыры гады я працаваў загадчыкам агенцтва «Інтурыст». Калі ж у мюнхенскай «Бацькаўшчыне» з'явілася хвалебная рэцэнзія на маю аўтабіяграфію з «Маладосці», сакратар нашага абкома партыі т. Міцкевіч даў загад: мяне з «Інтурыста» прагнаць па прынцыпе — калі вораг хваліць, значыць, я кепскі. Прынцыпам такім кіравацца цяпер трэба асцярожна. Бо пасля Ташкенцкай канферэнцыі ў «Нью-Йорк геральд трібун» я сам чытаў хвалебны артыкул на т. Касыгіна! Так можна і ўсю «Звязду» разагнаць. «Бацькаўшчына» ўмудраецца на матэрыялах перадавых са «Звязды» даводзіць, што ў Беларусі развальваецца Савецкая ўлада!..

Па рабоце я не меў ніводнай нават заўвагі. Дык што вы думаеце? Зрабілі так, бытта я даў амерыканскаму турысту недазволенае пісьмо, і на аснове фальшывага абвінення бюро гаркома выканала загад — зняло мяне з работы.

Душой «Бацькаўшчыны» з'яўляецца Станіслаў Станкевіч, бурмістр Барысава. Гэта яму партызаны паслалі смяротны прыгавор з подпісамі яго былых вучняў, у тым ліку і з маім прозвішчам. Такія

рэчы Стась не мог забыць. Цяпер, бачыце, ён мяне хваліць. Правакацыя! Чаму мы верым такім Станкевічам? .

Т. Міцкевіч, прачытаўшы «Бацькаўшчыну», не выклікаў мяне, не сказаў: ану, выступі ў друку, дай мярзотніку, заткні яму глотку, я дамовіўся ўжо з газетай! Не. Ён, фактычна, рубануў па сваім пісьменніку, пайшоў у ворага на паваду! Чаму, чаму, чаму мы так лёгка аддаём ворагу пазіцыі?!

Потым на працягу месяца дабіваўся я прыёму ў т. Міцкевіча. Нарэшце, ён зрабіў ласку мяне прыняць. Размова ў нас адбывалася 4,5 гадзіны, і ўвесь гэты час ён крытыкаваў «Маю Джамалунгму», надрукаваную ў «Маладосці» і адзначаную «Бацькаўшчынай». Толькі заўважыў, што сказаў бы больш, але яшчэ яе не прачытаў. Не «Бацькаўшчыну» не прачытаў, а «Маю Джамалунгму». Крытыка яго была плыткай, я яе лёгка адвёў.

Цяпер на сходах і ў прыватнай гутарцы з камуністамі т. Міцкевіч абураецца: во, які Карпюк закаранелы ў сваіх памылках — за чатыры з палавінай гадзіны не мог яго пераканаць нават сакратар абкома! Як жа можна пераканаць мяне, ведаючы віну толькі па чутцы? Звычайна размовы з вока на вока не выносяць на народ, але т. Міцкевіч парушыў этыку першы, таму - не маўчу і я.

І вось сёння на V з'ездзе ў дакладах мае творы нават хваляць, а ў пашым Гродне недзе і сёння выступае на сходах нейкі адказны кіраўнік, абзывае мяне і маю творчасць ганебнымі словамі ды трасе з трыбуны ўсё той жа «Бацькаўшчынай». І не набрыдне ім. Прадаўжаецца гэта ўжо амаль два гады.

На хвіліну вярнуся ў Мінск. Прабачце, буду зноў аб сабе, але ж гэта, мабыць, не толькі мая асабістая справа. Бо пісьменнікам, мне здаецца, апрача таго, што трэба добра пісаць, праўду пісаць, яшчэ абавязкова трэба быць дружнымі і салідарнымі. Я хачу ўступіць у палеміку з адным вельмі паважаным у нашай краіне чалавекам. Яго тут няма на з'ездзе, але яму пра маё выступленне скажуць, і ён прачытае стэнаграму.

Другім правадыром «Бацькаўшчыны» з'яўляецца Якуб Стральчук. Мінчане, запомніце гэтае прозвішча! Я. Стральчук з 1906 г. нараджэння. З вёскі Крывой, з-пад Бельска. У 1923 уступіў у падпольны камсамол (у Польшчы), потым стаў сакратаром райкома і адначасова завербаваўся на работу ў дэфензіву (так называлася ў Польшчы тайпая паліцыя). З гэтага часу працуе на два франты. Польскага шпіка, як актыўнага камсамольскага дзеяча, у 1931 годзе кампартыя накіроўвае сюды да вас, у Мінск на вучобу. Тут ён

«вучыцца», фактычна разведвае і вынюхвае, а праз год вяртаецца назад у Заходнюю Беларусь. Цяпер ён «працуе» інструктарам ЦК.

За некалькі год нягоднік пабываў у кожнай ячэйцы Кампартыі і камсамола Заходняй Беларусі. На аснове яго дадзеных дэфа ледзь не ў адзін дзень арыштавала ўсіх камуністаў і камсамольцаў Заходняй Беларусі. Стральчук стаў выступаць, як сведка, на працэсах камуністаў.

У студзені 1936 года Стральчуку спрабаваў заткнуць горла Сяргей Прытыцкі — стрэліў у правакатара на судзе ў час працэсу, калі той сведчыў на камуністаў. Стральчука тады ўратаваў панцыр пад пінжаком, і Прытыцкі яго толькі параніў.

Дэфа правакатара прывезла ў Навагрудскую бальніцу, вылечыла, а тады паслала на работу ў Познань. Там, выкрываючы польскіх камуністаў, ён сышоўся з нямецкай контрразведкай і перайшоў на службу да яе.

У 1941 годзе, калі Гродзеншчыну занялі немцы, Стральчук стаў дарадцай шэфа Беластоцкага гестапа Герберта Цымермана ўжо пад клічкай «СС-ман» Заўэр (кіслы) 1141». У іх з Цымерманам на сумленні 150 000 маіх землякоў. Стральчук пават паддаў на расстрэл хлопчыкаў са сваёй вёскі, якія ў яго бацькі рвалі яблыкі.

У Беластоку ў Вялікую Айчынную вайну на Стральчука палявалі нашыя разведчыкі, але зноў толькі паранілі. Ён вылечыўся другі раз і пераехаў на «работу» сюды да вас, у Мінск. Тут паддаў на расстрэл тых, хто ў 1931-1932 гг. давалі яму хлеб-соль. Пасля вайны апынуўся на службе ў амерыканскай контрразведкі. Сям'я яго жыве ў Чыкага, а рабочая пляцоўка Стральчука — Мюнхен. Адна з яго «работ» — выданне «Бацькаўшчыны».

Стральчук пераходзіць мне дарогу трэці раз. У 1935 па яго спіску мяне з бацькам арыштавалі і давалі ў косці за падпольны камсамол ды партыю польскія дэфензіўшчыкі. У вайну па яго спіску мяне з бацькам і братам арыштавалі немцы, я апыпуўся ў лагеры смерці Штутгоф, з якога ўдалося потым цудам уцячы. Цяпер, выходзіць, ён ударыў мяне яшчэ раз. Тонка, балюча, абдумана, ведаючы як.

Днямі ў Мінскім політэхнічным інстытуце сакратар ЦК КПБ Сяргей Восіпавіч Прытыцкі заявіў студэнтам, што ў нас адкрытых Сіняўскіх і Даніэляў няма, у нас яны скрытыя, як Карпюк, якога пахваліла «Бацькаўшчына». Дарагі Сяргей Восіпавіч, я схіляю галаў перад вашым гераічным учынкам у 1936 годзе! На вашым вобразе я выхоўваўся. Але чаму вы даеце веры мацёраму правакатару, з якім вы самі змагаліся, чаму прынімаеце ўсур'ёз тое, што піша

«Бацькаўшчына» Станкевіча і Стральчука, чаму ён з такой лёгкасцю і цяпер смаліць па савецкіх пісьменніках ужо вашай рукой, якая некалі страляла ў яго?

Няхай будуць праклятыя тыя мацяркі, што пад сэрцам насілі такіх вырадкаў, як Стральчук і Станкевіч. Толькі ж яны яшчэ дужыя. У аднаго з іх стралялі два разы, а ён, мярзотнік, жыве. Ці не пара нам лепш аб'яднацца супроць мацёрых ворагаў Радзімы і пальнуць па іх дружным залпам? Бо толькі тады мы зможам заткнуць ім паршывыя горлы.

Памыляюцца, вядома, і кіраўнікі, бо яны людзі. Толькі ж памылка кіраўніка надта дорага каштуе. Асабліва калі з-за чэсці мундзіра потым не хочуць яе прызнаваць. Тады яна ўжо робіць цэлы шэраг новых памылак.

Прашу прабачэння, што затрымаў вашу ўвагу і на асабістай справе, але што мне было рабіць? Звярнуўся б да кіраўніцтва СП БССР, яно са званнямі, уладай, аўтарытэтам — павінна было б абараніць, заступіцца за літаратара, адстаяць яго. На жаль, яно ў нас не такое. От, пазычыла б тры рублі, калі б не хапала на цягнік у Гродна, магчыма, дало б нават машыну пад'ехаць на вакзал, калі б машына была свабодная. Нават маглі б выратаваць мяне, калі б я трапіў у выцвярэзнік. Але ж да такой справы яны не спрабавалі б нават падступіцца. Вось чаму ў нас розныя сходы, пленумы, нарады часамі насілі фармальны характар, набывалі форму нейкага рытуалу, параднасці.

Слухаючы ўчора выступленне Андрэя Макаёнка, я захапляўся ім і думаў: божа, няўжо наш урад і ЦК не бачаць, што ў нашым кіраўніцтве СП БССР даўно трэба памяняць таго-сяго месцамі,— гэта ж і вам самім, таварышы кіраўнікі, будзе лепш! Хацелася б, каб на V з'ездзе мы абралі сабе такое кіраўніцтва, якое было б прынцыповым памочнікам партыі і нават падказалі б, дзе трэба нам, мякка кажучы, халастыя стрэлы, а не чакалі б толькі, што зверху загадаюць рабіць. Але я ўжо адхіляюся ад тэмы, я забег наперад, прабачце, вяртаюся назад.

Дык я намаляваў, як цяжка жыць пісьменніку на перыферыі. Хоць ты ўнясі прапанову V з'езду зацвердзіць для такіх людзей медаль, як за цаліну: пражыве літаратар год у раёне ці вобласці і чапляй яму кругленькую цацку на грудзі. А літфонд няхай яшчэ кожнаму такому члену СП БССР, як у гарачым цэху, выдае па бутэльцы малака.

Як бачыце, вытрываў Анатоль Іверс. Не слабак і Васіль, вытрывае таксама. Вытрываю і я, нават сябе цешу, што ў мяне цяпер

ёсць новы матэрыял «Маёй Джамалунгмы». Атрымаецца ледзь не так, як у таварыша Кажэўнікава («Щит и меч»): з сышчыкамі, шыфрамі, разведкай і контрразведкай. Толькі на мяне потым накінуцца крытыкі ды закрычаць: адкуль аўтар узяў такіх тыпаў?! Аднак і гэта я вытрываю. Разглядваючы намаляваныя тры выпадкі, як адну балячку, каб сказаць — ну, дакуль у нас будуць цягнуцца рэцыдывы мінулага ды практыкавацца звычай: раней збэсціць чалавека, затаптаць, а потым ужо разбірацца — вінаваты ён ці не.

Дарэчы, успамінаецца мне выпадак з даваеннага жыцця.

У маёй вёсцы жыў панскі даносчык Ёзік Госцік. Пасля 17 верасня 1939 года машынай КДБ прыехалі яго арыштоўваць. Спыталі ў цёткі, якая капала бульбу, дзе такі жыве. А ў нас было два Ёзікі Госцікі. Цётка не ведала, якога трэба, паказала іншага.

Так і забралі невінаватага чалавека ў ваўкавыскую турму.

Ну, здаецца, памыліліся, папрасі прабачэння ды выпусці чалавека. Дык не. Праз нейкі час забралі і другога. Абодва і прасядзелі да вайны, калі турма распалася. Між іншым, правакатар з польскіх часоў потым пачаў і немцам служыць...

У сярэднявечча жанчыну, падазраваную ў вядзьмарстве, спачатку кідалі ў рэчку. Выплыве, значыць, ведзьма, зараза,— палілі на вогнішчы. Калі ж нешчаслівая ахвяра патанула, значыць, пакойніца невінавата — выбачайце, калі ласка! Я тут не раблю абагульненняў, не прыводжу паралеляў, толькі ўспамінаю гістарычныя і бытавыя факты. А нам не шкодзіла б, ой, як не шкодзіла б часцей звяртацца да гісторыі. Бо яшчэ вельмі нядаўна бралі людзей па прынцыпе — быў бы чалавек, а справа для яго знойдзецца. Панавала не марксісцкая логіка — лепш сто невінаватых няхай загіне, чым адзін вінаваты застанецца. Ці не пара нам стаць мудрымі?

Нашыя балячкі можна пералічваць без канца. Але я не ўпаўнаважаны тут ускрываць усе нашыя недахопы. Толькі на паасобных прыкладах хачу давесці, што, на жаль, побач з дасягненнямі яшчэ недахопаў шмат. Не ведаю, як хто, а я часамі лаўлю сябе на думцы, што падобнае нешта ўжо перажываў.

Перад вайной шчырыя савецкія патрыёты, якім не засціла вочы, бачылі, што ў нас і тое адстае, і гэта робіцца не па-гаспадарску, і іншае не па-ленінску, спрабавалі падказаць каму трэба, каб справу выправіць. Тады на іх наляталі ў брызентавых ботах і ў гімнасцёрках пад Сталіна крыкуны:

— Ты што ўздумаў гаварыць? У нас рай, мы шчасліва жывём, ворага шапкамі закідаем, маўчаць!

І пачыналі пытацца ў суседзяў, колькі ў цябе гектараў, хто твае бабуля, дзед. Калі ж немцы адно стрэлілі, такія гарлахвацкія першыя далі драла, пакінуўшы сумленных людзей расхлёбваць кашу.

Цяпер не 1941-шы, мы ўжо не тыя, і свет даўно іншы. Але ж трапляецца, што і цяпер, калі скажаш праўду, на цябе накінецца іншы крыкун. Гэты ўжо нават у капронавым гальштуку і вузкіх нагавіцах. І энергічны. Адно не той, якому дарагая ісціна. У сваім чыноўнічым іпвенні ён гатовы перавыканаць любы загад зверху.

Няўжо вопыт для нас нічога не значыць? Ён жа дастаўся нам такім коштам.

Танечка памалявала на паперы Бармалея і ўстрывожана закрычала:

— О-ей, я яго баюся, мама!

Гэтак і мы часамі па камандзе зверху нешта арганізуем, а потым і самі пачынаем верыць у створанае. Даволі ў нас было непаразуменняў у галіне сельскай гаспадаркі, калі ўсю краіну ператварылі ў эксперыментальнае поле, замест таго каб выдзеліць на доследы сто гектараў. Да чаго такі парадак прывёў, ведаем добра. Даядаліся, і сакратары ЦК перад святамі атрымліваюць па 2 кг мукі (будучы ў Эстоніі ў ЦК, сам бачыў!).

Выступаю я не за мяжой, дзе трэба было б дыпламатнічаць і гаварыць не тое, што думаеш, што ведаеш. Мы сабраліся на свой форум і калі ўжо і тут, паддаўшыся ачараванню юпітэраў, вазонам з кветачкамі, плюшавым занавесачкам, аксаміту мяккіх крэслаў, не будзем казаць сабе праўду, то як глянем сваім дзецям у вочы, вярнуўшыся дадому. На лакіроўцы не паедзеш — нават і сучасным класікам не ўдаюцца раманы пра камуністычныя брыгады.

У нас таму няма «Рэвізораў», бо і Шолахаў выступае адно супроць міністра рыбнай прамысловасці, нібы студэнт на КВН, а пры яўных недахопах чаго большага, і ён тлумачыўся толькі ў «мужской любви». І гэта не яго віна, а бяда.

Рана, ой, рана выдаюць нам на пёры гумовыя наканечнікі!

Ужо настаў момант, каб ад асобных думак у літаратуры, ад смелых выступленняў на сходах мы пераходзілі да разважлівага і сумленнага разбору і праз творчасць таго, што старэйшае пакаленне перажыло. Пасля XX, XXII з'ездаў, дзякуючы клопатам партыі, у апошнія часы ідзе якаясьці гіганцкая мазгавая работа ў галовах нашых людзей, яны раптам як бы прачнуліся ды зірнулі на свой жыццёвы шлях па-новаму. Калі ты сумленны літаратар і працуеш не толькі для начальства і ганарару — прачынайся, бо толькі тады зможаш паказаць сучаснасць.

Партыя ад нас патрабуе быць прынцыповымі, не абмяшчаньвацца і быць шукальнікамі ісціны. Баязлівае маўчанне пра адмоўнае — шкоднае. Гэта брахня, што крытыкаваць лягчэй. Кранаць балячкі не лёгка і не беспакаральна. Адвечная барацьба дабра са злом патрабуе сілы і адвагі, як слушна сказаў дэлегат XXIII з'езда КПСС Міхаіл Дудзін. Калі мы кажам, што літаратура вучыць людзей, то вучыць павінна мужнасці. Эстафета мужнасці — бесканечная. Мы, будаўнікі новага грамадства, павінны вытрымаць і несці яе, як у муках яе няслі пакаленні папярэднікаў.

Дык няхай нас не асляпляюць дасягненні тэхнічныя: машыны — не літаратура і душы чалавечай не ўзнімаюць. Ведаю выпадак, калі на суд мешчанін прывалок магнітафон з запісанай на плёнцы бруднай лаянкай суседкі па кухні. Але ж завідкі бяруць, гледзячы на дасягненні нашай касманаўтыкі, хіміі, фізікі, якія выходзяць на першыя месцы ў свеце. Некалі рускі вынаходнік паравую машыну выдумаў першы, але паравоз людзям даў Стэфенсан, бо развіццё Захаду да таго часу дасягнула такога ўзроўню, калі вынаходніцтва Стэфенсана магло быць рэалізавана. Памятаючы гэта, гледзячы на дасягненні нашых вучоных, тэхнікаў, хочацца звярнуцца да некага з пераканаўчай просьбай:

Давайце кіраваць літаратурай больш стрымана, абгрунтавана і пераканаўча ў духу XXIII з'езда з улікам псіхічнага стану пісьменніка, каб крытыка дапамагала, а не траўміравала яго. Калі літаратар і сарвецца, то разглядайце яго промах з сяброўскай спагадай ды спачуваннем — не ўяўляю сабе сучаснага беларускага пісьменніка, які б тварыў нешта з мэтай нашкодзіць Радзіме.

Дарагія таварышы, мазгі — не каробка скарасцей, пад стандарт іх не падгоніш. Ніякімі аргументамі, нават — рашэннямі ЦК. Напрыклад, я і цяпер лічу, што «Мёртвым не баліць» з паасобнымі недахопамі — выдатны твор беларускай літаратуры і дай бог кожнаму напісаць такі, як напісаў наш таленавіты гродненец. Мажліва, ва мне гаворыць мясцовы патрыятызм, мажліва, што іншае, але — біце мяне, рэжце, мучце, на дыбе распінайце — што з таго, калі гэта мая асабістая думка, маё сумленне?!

Па-мойму, часова ўзяла верх думка Гарбацюкоў і Сахно. Не? Пераканайце мяне. Я яшчэ не надта стары, не дзеравяны, чалавек, які шукае, і нават папрашу ў вас прабачэння, калі пераканаеце. І наіўны будзе, дурнем будзе чалавек, які падумае, што я горшы камуніст, грамадзянін і патрыёт за таго, хто, прачытаўшы аповесць, віншаваў аўтара, на канферэнцыі чытачоў хваліў «Мёртвым не баліць», а прачытаўшы неабгрунтаваны, аднабаковы, ачарніцельны

артыкул у «Савецкай Беларусі» на гэтую кніжку Быкава, адразу стаў думаць інакш. Такія — флюгеры!

Выступленні прэсы не прыносяць карысці, калі яны ніжэй сярэдняга ўзроўню літаратурнай свядомасці чытачоў, таму людзі такую крытыку ўспрымаюць, як праявы мінулага. Крытыка будзе тая эфектыўная, калі пісьменнік убачыць, што навокал сябры, а не ідэйныя праціўнікі ці звычайныя зайздроснікі. І пара нам, беларусам, падыходзіць ужо да сябе з сусветных крытэрыяў — мастацтва не прызнае граніц, а мы выраслі з пялюшак.

Давайце будзем заўсёды памятаць, што пісьменнік — звычайны чалавек, таму і мае права на памылку. Асабліва калі бачыць да сябе нядобразычлівасць. Я тут мушу прызнацца і ў сваіх грахах. Часамі хачу сказаць адно, атрымліваецца ж другое. Асабліва калі выступаю без тэксту. На жаль, некаторыя ў нас акцэнціруюць не тое, што скажаш разумнае ў выступленні, а хапаюцца за твае прамашкі і самі ўпадабняюцца да аўтараў, якіх крытыкуюць, што бачаць адныя адмоўныя бакі. Такія — нібы цвікі, толькі зазявайся, сядзь!

Давайце ствараць адпаведную атмасферу і пісьменнікам. Не тузайма літаратараў. Не арганізоўвайма калектыўных лінчаванняў, не вешайма на іх ярлыкоў. Калі каму няма чаго сказаць, то ў творах, напісаных агаленымі жыламі і нервамі пісьменніка з-за вялікай любові да Радзімы, або ў такіх жа выступленнях не шукайце элементаў варожай прапаганды. Тады ў нашай краіне з'явіцца літаратура, якая авалодае душамі людзей зямнога шара.

Мае словы, магчыма, будуць камусьці не даспадобы. Што ж, мне нічога не трэба. Як гаворыцца ў песні: «Жила бы страна родная, и нету других забот!» Я стаю на сваёй зямлі, ды яшчэ каб не гаварыў на ёй таго, што думаў? Навошта тады жыць?!

Я нікога не збіраўся тут павучаць, бо яшчэ сам надта ж мала ведаю. Проста хачу, каб і мае думкі ўліліся ў паток усхваляваных думак народа і паслужылі справе.

Выступленне маё не для газет, бо яны ідуць за мяжу, хоць мне не зусім зразумела такое тлумачэнне. Ленін у пісьме да т. Варгі, гаворачы аб прэсе, сказаў: «Нам патрэбна поўная і праўдзівая інфармацыя. А праўда не павінна залежаць ад таго, каму яна павінна служыць» (т. 54, с. 446, рус. выд.). Толькі прашу рэдактараў: пашкадуйце мяне, не прыпісвайце майму выступленню таго, чаго не было.

Напярэдадні 50-годдзя, калі мы сапраўдныя ленінцы, то мусім сказаць аб недаробленым. Пра многае ўжо гаворым, і гэта вельмі добра. Бо згодна з марксісцкім вучэннем аб грамадскім жыцці, зло

абнародаванае — напалавіну пакананае. Гэта і ў мяне ўсяляе веру і дадае сілы для аптымізму.

О-о, быць таго не можа, усё роўна «наша возьме»!

Дзякуй за ўвагу.

www.kamunikat.org

www.kamunikat.org

# ПЕРЫПЕТЫІ ПОШУКАЎ

1

Восенню 1953 года перасяліўся я ў Гродна і паступіў на працу лабарантам кафедры педагогікі. Паўгода таму назад у часопісе «Полымя» надрукаваў я першую сваю аповесць «У адным інстытуце», і многім з правінцыяльнага гарадка гэта дало падставу вітаць мяне як пісьменніка.

Мяне запрашалі на канферэнцыі чытачоў і сустрэчы са школьнікамі. Я адчуў павышаную цікаўнасць да маёй асобы. Вучні пільна прыглядаліся да маёй вопраткі, твару, вывучалі лоб, шукаючы нейкага таямнічага сэнсу. Настаўнікі заводзілі гутарку пра якіх-небудзь сюррэалістаў ці эпоху Адраджэння. Іншыя расказвалі мне анекдот пра класікаў ці пікантныя факты з біяграфіі таго ці іншага пісьменніка,— каб я ведаў, што і яны докі ў літаратурных справах. Мне перад імі было страшэнна няёмка.

Лічачы як бы сваім абавязкам памагаць новаму аўтару, невядомая мне дагэтуль студэнтка другога курса прынесла аднойчы мяшок з дзённікам і пачкамі пісем сваёй сястры Шуры і яе мужа. Матэрыялы прачытаў я залпам, і мяне адразу паланіў вобраз маладой пары. Тут прыйшло на памяць: стоп, я ж іх аднойчы на ўласныя вочы бачыў!

Калі ў вёсцы Біскупцы мы праводзілі кампанію па пазыцы, ад хаты да хаты разам з намі хадзіла і гэтая самая пара — Шура з вайскоўцам. Мы, сельскі актыў, заклапочана звяралі спісы, падбівалі лічбы, прыдумвалі карацейшую дарогу ў бліжэйшыя вёскі, а закаханыя, прысланыя з Ваўкавыска на падмогу, былі заняты толькі сабой — іх так і цягнула ў цёмны кут, каб пацалавацца. Ён — высокі лейтэнант са скрыпучымі рамянямі, што ладна абхоплівалі яго стройную фігуру, а яна — на цэлую галаву ніжэйшая, але зграбная, загарэлая, з тых, пра каго кажуць — кроў з малаком...

У дзённіку, у пісьмах гэтай самай Шуры і яе суджанага было поўна дэталяў і трапных думак, яны аж прасіліся ў твор,— адно не пазянуйся, прывядзі матэрыял у адпаведную сістэму. Чаму мне не пасядзець над ім?

І раптам я адчуў у сабе сілу для такой работы. Ну, дакладна, як, прабуючы закінуць на плечы мяшэчак бульбы, ты бачыш,— не толькі справішся з цяжарам, але можаш падняць яго нават яшчэ і з фокусам — пакруціць над галавой ці перакінуць з пляча на плячо. Угледзеў аповесць я ўжо гатовай, і мяне нібы токам ударыла.

Выходзіць, я — аўтар не аднаго твора?

Здагадка так ашаламіла, што я адразу пазакрываў свае кніжныя шафы, датэрмінова замкнуў кабінет і пайшоў на выхад.

Неўзабаве я ўжо быў за горадам. Куды ісці?

Наогул я люблю віхуры, завеі, вятры, навальніцы, грамы, а тут, як па заказу, дзьмуў рэзкі сівер, жорсткая крупа секла неміласэрна па вачах, сцябала па твары. Я, сагнуўшыся, упарта сунуў па бруку, палявымі дарогамі, па шпалах. У галаве ўкладваліся дэталь за дэталлю новага твора, а на душы ва унісон віхуры гучала: «Выходзіць, я цяпер буду пісаць і пісаць? І гэтага ніхто ўжо не адменіць?! Ух, як здорава! Такі занятак — самы прыемны з усіх, што я паспытаў! Людзі, я знайшоў шчасце, я ведаю, як мне жыць!!!»

Да канца дня і за ноч дашпарыў я аж да Мастоў і толькі там адчуў стому. Ніколі не спадзяваўся, што мае ногі яшчэ здольны на такі марафон (з Гродна да Мастоў — 63 км!). Світала, а да Ваўкавыска заставалася яшчэ 33 км; у абед трэба з'явіцца на кафедры. Побач чыгуначны вакзал, ды я больш не здольны быў зрабіць і кроку.

У гасцініцы знайшлося месца. Я ўпаў на ложак і заснуў як камень.

2

І праўда, «Дзяўчына з Ваўкавыска» пісалася лёгка і за два тыдні была гатова. Падобныя тэмы ў той час лічыліся надта моднымі,— упершыню ў нас в'явілася многа неўладкаванай моладзі пасля сярэдніх школ. Аповесць ахвотна надрукавалі б, а мяне ўжо агарнуў адчай.

Пра што яна? Пра тое, як ваўкавыская школьніца паехала ў Мінскі «пед» здаваць экзамены, як не прайшла па конкурсу, як, едучы дамоў, пазнаёмілася з афіцэрам ды выйшла за яго замуж. Банальна. Бы ў легкадумных фільмах, дзе з першых кадраў ужо ведаеш, чым ён скончыцца, тады пачынаеш пляваецца ды злавацца: чаму ў такіх выпадках нельга падысці да касы і забраць назад свае грошы,— тавар жа ў магазіне прымаюць, абы квіток быў.

Паўгода я пакутаваў, бытта мне вельмі балелі зубы, покуль мяне не асяніла, як скончыць аповесць.

Пасля надрукавання твора тая самая студэнтка выказала аўтару такую заўвагу:

— Штосьці ў вашай аповесці свайго таты і мамы я не пазнаю. Не пыталася ў Шуры, бо яна з мужам жыве цяпер у Адэсе, але і сястра, напэўна, Вам сказала б, што старыя з вашых старонак

падобныя на кагосьці другога.

Давай я цярпліва тлумачыць дзяўчыне, што бацькі ёсць і ў мяне, і, па незалежнаму ад нас закону, у в'етнамскіх, напрыклад, мастакоў Ленін падобны на в'етнамца, а ў японскіх — на японца, і нічога ўжо не перайначыш.

Дзяўчына змірылася.

Затое з «Данутай» справа была больш складаная.

3

Восенню 1938 года адправіўся я ў Вільню паступаць у вячэрнюю школу. Вучоба ў буржуазнай Польшчы каштавала не абы-якіх грошай, а я яшчэ быў пераростак, таму мой учынак выглядаў авантурай. Мае бацькі менш думалі пра сынаў дыплом, яны мяне выпхнулі з хаты, каб я хоць пацёрся па свеце ды сёе-тое пабачыў.

У вялізным і чужым горадзе, на вуліцы Паплаўскай пад нумарам «31-б» жонка краўца прапанавала мне пакойчык за тое, што буду насіць ёй ваду з яра. Каб яшчэ не плаціць і за навуку, наняўся я ў ліцэй пасыльным.

Уся наша вуліца ганарылася, што на ёй жыве сам генерал. Але дом яго знаходзіўся бліжэй да цэнтра, куды даходзіла сістэма гарадской каналізацыі і водаправода. Дачка генерала, з якой я потым выпадкова пазнаёміўся, была непрыгожая — хударлявая і сухая. Мяне якраз схіляла ў другі бок.

Па суседству з домікам краўца выцягнуўся асабняк багатага пана Пішчыка — начальніка пошты. Пішчык меў дзве дачкі, і маладзейшая, панна Ядзя, пацягнула з мяне гэтыя самыя залатыя нітачкі. Пацягнула паненка іх з першага дня — ды так, што не толькі вучоба не палезла ў галаву, я сабе ўжо не знаходзіў месца.

Я вартаваў паненку ў горадзе і ў ліцэі. Не зводзіў вачэй з яе вокан і нават выбіўся са сну. Калі ўжо з-за сімпатычнай суседкі я забыўся пра цэлы свет, мяне агарнула авантурыстычная ідэя — прабрацца да сваёй «багіні» ў палац, а там — што ўжо будзе.

І вось я адправіўся ў дом пана Пішчыка.

З таго моманту мінула роўна сорак гадоў. На маіх , вачах пяць разоў мянялася ўлада і з-за перажытых падзей памяць мая блытае элементарныя факты. Аднак таго моманту не змагло нічога сцерці. Вось ён.

Сваю «багіню» з маці я застаў у сенцах каля палічак са шклянымі слоікамі. Быў верасень — пара нарыхтовак салёных гуркоў, грыбоў, і Пішчыкі, выходзіць, да зімы рыхтаваліся грунтоўна. Шкляных

пасудзін на паліцах стаяла некалькі соцень — такую прорву слоікаў яшчэ я ніколі не бачыў. Жанчыны былі ў халатах у чырвоную гарошыну, а на галовах мелі касынкі з такой самай матэрыі. Абедзве ўзіраліся на мяне, як на прывід, і стараліся прыкрыць грудзі. Фея мая, пра якую я так мроіў, на каго маліўся,— божа мілы! — трымала ў руцэ слоік і збіралася з яго якраз высыпаць у вядро... здохлых мух.

Убачыў я гэты малюнак — і вобраз багіні адразу растаў, расплыўся, некуды знік ды застаўся там, на вуліцы, у змрочных закутках ліцэя, у марах бяссонных начэй. Я ўжо надта пашкадаваў, чаго ішоў да Пішчыкаў.

Не магло потым нічога змяніць і наша знаёмства з паннай Ядзяй.

## 4

Ішлі гады, мільгалі падзеі, і я пачаў заўважаць, што з віленскіх часоў сядзіць ува мне якісьці душэўны мазоль — упарты, цвёрды і сталы. Мазоль гэты заўсёды пра сябе напамінаў, мяне непакоіў, я нікуды ад яго не мог падзецца. Расказаць бы пра той выпадак, каму, добра выспаведацца, але хто цябе будзе слухаць?

К таму часу свой душэўны настрой я ўжо прызвычаіўся выкладваць на паперу, таму аднойчы задумаўся — а ці не вылажыць на паперу і ўсё тое, што ўва мне накапілася за год жыцця ў Вільні? Не абавязкова для друку, а — каб паспытаць асалоду ад новага кантакту з вобразамі мінулага. І не прытрымлівацца дакументальнай праўды, а зірнуць цяпер на падзеі крытычна, з гумарам, падысці да іх з вышыні сённяшніх ведаў і вопыту. Павінен быць страшэнна прыемны занятак.

Неўзабаве і настаў той дзень, калі я, каб не насіць у сабе непасільны цяжар, узяўся за работу.

Я меўся перадаць толькі дух пэўнага часу, і сапраўднае прозвішча не падыходзіла аніяк. Свайму герою адразу знайшоў прозвішча — Барташэвіч Янка і адчуў — гэтаму сялянскаму хлапцу матэрыялу ў тайніках маёй душы хоць адбаўляй. Гераіню з дома начальніка пошты для кантрасту перанёс у дом генерала, падабраў і ёй прозвішча — Янкоўская Крыся. Тут спахапіўся — мала ведаю быт людзей з такога асяроддзя, у генеральскім доме на Паплаўскай быў толькі ў адным пакойчыку і чамусьці нічога характэрнага ад тых візітаў у галаве не засталося...

На падмогу прыйшло нахабства.

За адзін вечар я абышоў кватэры ўсіх генералаў, якія тады жылі

ў Гродне. Здзіўленыя гаспадыні ахвотна мне паказвалі сваё багацце, нават запрашалі прыходзіць зноў.

Адным словам, сеў я за стол. Восем месяцаў работы над аповесцю праляцелі як адзін дзень. Я надта люблю перыяды, калі пішацца,— іх можна параўнаць толькі са станам, калі ты закаханы. Зноў я перастаў заўважаць надзеі, надвор'е і нават тое, што рабілася ў сям'і (мабыць, таму празаікі не ідэальныя бацькі і мужы!).

Між іншым, тады і заўважыў я ўпершыню дзіўную з'язу. Справа ў тым, што празаіку даводзіцца многа сядзець над рукапісам ды шмат разоў яго перарабляць і перапісваць. Потым я падлічыў: «Дануту» перапісваў 32 разы (да чэшскага выдання)! Перапісванне — не механічная работа. Кожную фразу зноў як бы прапускаеш праз агаленыя жылы ды ўсё мацней сябе ўзвінчваеш. Дык вось, у тыя дні, калі заканчваў перапісваць новы варыянт аповесці, кожны раз пачынала ў мяне ўзнімацца і тэмпература. Будучы на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве, я зайшоў са скаргай у літфондаўскую паліклініку. Нічуць не здзівіўшыся, мажны сталічны доктар мяне супакоіў:

— Так памёр Блок.

У Гродне сябравалі мы сем'ямі з Мікалаем Іванавічам Арынчыным. Яго сардэчная жонка Таіса Васільеўна — загадчыца кафедры медінстытута — зацікавілася маім станам ды намерылася прыставіць да мяне групу студэнтаў, каб вывучыць дзіва бліжэй. На жаль, акадэміка Арынчына неўзабаве перавялі ў Мінск, а я так і застаўся ў няведанні — праўду гаварыў маскоўскі самавіты доктар ці загаворваў зубы. Але ўсё гэта было потым.

Перарабляючы і перапісваючы рукапіс, я нарэшце сваёй гераіні выбраў і канчатковае імя — Данута. Мне яно спадабалася свежасцю, хоць на Гродзеншчыне тады называлі так амаль кожную трэцюю дзяўчыну.

К таму часу мне ўжо вядомы былі і элементарныя законы мастацтва. Напрыклад, я ўжо разумеў, што, каб ажаніў Леў Мікалаевіч свайго Вронскага з Аннай Карэнінай, каб паслаў гэтую пару на цёплыя воды ў Неапаль, каб скончыў на гэтым раман,— твор людзі забылі б яшчэ ў мінулым стагоддзі. І каб Шолахаў выдаў Аксінню замуж за Грышку Мелехава, зрабіў яе старшынёй сельсавета, а яе казака — кіраўніком Вёшанскага валвыканкома і гэтым скончыў твор,— не было б «Ціхага Дона».,.

Я ўжо цвёрда засвоіў — літаратура павінна браць чытача за душу, таму канец у аповесці вырашыў даць суровы. Пры гэтым не парушалася і жыццёвая праўда. Колькі ведаю харошых дзяўчат, якія

таксама, як і мая гераіня, склалі свае светлыя галовы за вялікую справу.

5

І вось аповесць у асноўным скончыў. Для пэўнасці яшчэ раз і два начыста перапісаў, покуль мне твор не спадабаўся цалкам. Хацелася перад кімсьці пахваліцца, але перад кім? Якраз атрымаў з часопіса запрашэнне на сюжэтную рэч і ў адказ, не надта верачы ў поспех, адправіў свежы рукапіс.

Праз пару тыдняў заехаў чагосьці ў Мінск ды зайшоў у рэдакцыю «на разведку». Мой твор прачытаў ужо намеснік галоўнага рэдактара. Ён з таямніча-строгім выразам на твары павёў мяне ў калідор, пасадзіў на канапу.

— Аляксей, што ты нарабіў? — раптам з абураным шкадаваннем напаўён на мяне.

— ???

— Ці ты здурэў, ці якое ліха табе?! Ай-яй-яй, аж так не ведаць задач літаратуры!

— А ў чым справа? — Я ўсё нічога не разумеў.

— Узяў ты харошага нашага хлапца, ды ў каго ж ты яго ўлюбіў? У дачку рэакцыйнага генерала-легіянера! Што, дзяўчыны сваёй яму не мог ты падабраць, ці якая халера?! Разумееш, куды павяла цябе твая наіўная блізарукасць? На трыста старонак з гакам адбухаў цагліну, столькі ўбіў у яе часу, перавёў паперы, і ўсё дарма, ай-яй-яй-й!..

Я тады адчуваў сябе яшчэ правінцыялам. Рэцэнзент пачынаў здавацца мне ледзь не абсалютным знаўцам літаратуры, яго імя трапіла нават у школьныя падручнікі, і душа мая ад жаху аж у пяткі ўвайшла. Пачаў я сябе касціць прыкладна так:

«На самай справе, што стрэліла мне ў галаву такое пісаць — пра буржуя-генерала, яго жонку і ад'ютанта, пра охі і ахі?! Ага, пісаў жа для сябе, пра друкаванне нават і не думаў. Тады — на якога д'ябла паслаў у такі адказны орган? Прыемна было сядзець над рукапісам, цешыцца даўняй атмасферай,— ну і цешыўся б сам, размочваў бы свой «мазоль». Ім патрэбны матэрыялы з вялікай палітыкай, на якіх самавітыя рэцэнзенты выводзяць цэлыя тэорыі ды замацоўваюць іх потым у хрэстаматыях. Пры чым тут нейкая генеральская дачка-фіфачка, пры чым ні рыба ні мяса яе Барташэвіч?!»

Адчытваў я сябе так у душы і адначасова слухаў сталічнага крытыка. А намеснік рэдактара ўсё чытаў і чытаў мне натацыі. Затым стаў апавядаць пра свой выпадак.

Выяўляецца, і ён некалі без памяці кахаў адну фею, якая паўтара гады дарыла яго платанічнай ласкай. Потым ён з жахам даведаўся што ўвесь час, покуль ён марыў аб ёй ды ўздыхаў, а яна строіла яму вочкі, нягодніца жыла з абармотам-капітанам рачнога парахода. Толькі ж каму гэта цікава ды якую з гэтага факта выведзеш ідэю?..

А скончыў суровы крытык маналог так:

— На, Аляксей, свой опус і нікому больш не паказвай. Адпраўляйся ў сваё Гродна ды паспрабуй зрабіць нам нешта на тэму надзённую — бясспрэчна, пісаць ты, старык (гэтае слоўца тады якраз уваходзіла ў моду), можаш!

Між іншым, калі потым «Дануту» адзначылі ў друку і пачалі аповесць перавыдаваць, рэцэнзент, хоць і з неахвотай, аднак прызнаў, што ў творы тады не разабраўся. Затое цяпер, калі займеў ён шмат тытулаў, на поўным сур'ёзе пры мне заявіў, што ўдачу аўтара ён заўважыў тады самы першы. Але няхай гэта будзе на яго сумленні.

6

Такім чынам, у першай рэдакцыі аповесць маю раскрытыкавалі. На ватных нагах паваloкся я на вакзал і некалькі тыдняў у Гродне не знаходзіў сабе месца. Героі з «Дануты» ў сне мне жаліліся. Ідучы куды-небудзь, як з жывымі, я гутарыў з імі і бытта бы суцяшаў іх. Бачыў кожнага выразна і не мог ад іх адмовіцца аніяк. Найбольш — ад Дануты.

«Ну і што, калі яна дачка буржуазнага генерала— паненка ж загінула за вялікую справу! А Барташэвіч які файны хлапец?!. Рэцэнзент сам цагляны опус!..»

Дарэчы, галоўны герой аповесці б'ецца з эндэкамі, калі ў зале Снядэцкіх выступае Максім Танк. Раздзелы гэтыя не выдуманыя. Мне самому дасталося тады «на арэхі». Потым на вёску прыслалі бацьку ад хірурга рахунак на 15 злотых — недзе і цяпер яшчэ ляжыць у мяне квіток аб уплаце. Давай пашлю рукапіс Танку, няўжо не крануць яго тыя родныя яму мясціны? »

Другі раз запакаваў я твор ды адправіўся на пошту.

Дакладна праз тры дні ад Танка прыйшла паштоўка. Яўген Іванавіч не толькі віншаваў мяне з удачай — «Полымя» бралася аповесць друкаваць.

Далей не ўсё пайшло так гладка.

Перад самай здачай у набор пачалося ў аддзеле. Рэдактар, бачыце, сам пісаў раманы са станоўчымі героямі, з надзёнными тэмамі, і

ніхто гэтага подзвігу чамусьці не заўважае, а тут нейкі аўтар з правінцыі намаляваў буржуазную фіфачку, хлапца ні тое ні сёе, і яму такая ўвага! Дзе ж справядлівасць?!.

Дзякуй богу, усё абышлося. Са скрыпам, з вялікай неахвотай, аднак рукапіс у друк ён здаў.

7

Калі «Данута» ўжо выйшла і па-руску, я адразу паехаў у Вільнюс, каб сваю кніжку падараваць прататыпу. Шчыра кажучы, ішоў я па знаёмых мясцінах і хваляваўся, як малы. Мяне нават разбіралі дрыготкі. Адначасна было і цікава — якая цяпер Ядзя?..

У Вільнюсе мяне напаткала вялікае расчараванне. Адразу пасля вайны Пішчыкі пераехалі жыць у Польшчу. Дзе цяпер жыла пані Ядзя, ніхто сказаць не мог.

Да сённяшняга дня «Данута» мела каля дзесяці публікацый, аповесць перакладзена на іншыя мовы, выдавалася і за мяжой. Многа чытачоў прыслала свае водгукі. Пісьмы былі двух гатункаў. У адных — людзі звярталіся да аўтара і выказвалі свае адносіны да твора.

Іншыя ж на канвертах пісалі так:

«г. Гродна, аблана. Інспектару Янку Барташэвічу (свайго героя пад канец аповесці я «змясціў» на працу інспектарам)».

Інспектар па кадрах М. П. Кузняцова пісьмы такія збірала ў пакеты ды адпраўляла мне на кватэру — маўляў, разбірайся з імі сам, бо інспектара такога ў нас няма.

Чаго толькі не было ў тых пісьмах! Нейкая кабета з-пад Кобрына пісала:

«Дарагі тав. Барташэвіч! Вы столькі перажылі, і хоць маеце жонку, а засталіся адны. Сумую вельмі адна і я, хоць і замужам. Давайце пачнем перапісвацца...»

Другая пісала:

«Калі ласка, прышліце, дарагі Янка Барташэвіч (даруйце, не ведаю, як Вас па бацьку!), мне фота сваёй Дануты. Я павешу яго над ложкам і буду заўсёды глядзець на яе вобраз — устаючы і кладучыся...»

А настаўніцы са Смаргоншчыны катэгарычна патрабавалі:

«Вырашылі мы зрабіць экскурсію ў Вільнюс ды пакласці на Дануціну магілку кветкі. Выязджаем сваім аўтобусам 5 ліпеня ў 6 гадзін раніцы. Просім Вас, дарагі тав. Барташэвіч, к нам далучыцца. Калі ўжо не зможаце з намі паехаць, то тэрмінова напішыце нам, прынамсі, дзе яе магіла...»

У Маскве на ВЛК ад выкладчыкаў я пачуў, што ў Англіі ёсць

горад, у якім каля старэнькага тэатра стаяць унікальныя два помнікі. Ім па трыста гадоў, да іх водзяць турыстаў (шкада, не запісаў назвы горада!). У XVII стагоддзі для мясцовага гарнізона ставілі там Шэкспіра. Калі на сцэне Атэла пачаў душыць Дэздэмону, адзін салдат закрычаў, каб раўнівец адстаў ад жанчыны. Гэта, вядома, не памагала. Тады абураны салдат ускінуў лук, нацягнуў цеціву ды прашыў артысту сэрца стралой. Салдата пакаралі. Аднак помнік паставілі і яму — як ідэальнаму гледачу.

Я не Шэкспір, ды крыху падобны чытач знайшоўся і ў мяне.

Аднойчы шаноўная Маргарыта Пятроўна прыслала мне з аблана новую пачку пісем. Сярод іншых адна чытачка пісала:

«Бартошевич!

Я очень довольна, что ты в живых и тебе можно влепить в лоб все то впечатление, что произвело на меня после прочтения книги «Данута». Кончив чнитать, я вслух кричала: Сволочь! Сволочь! Идиот! Хуже того Рыжего, что лупил тебя на сцене! Мало он тебя лупил! Ведь ты коварнее его! Любил ты Дануту, когда она тебе была недоступна, когда же она тебе стала доступной — ты стрелял ее! За что, фриц ты?! (Тут ідзе фраза не да друку, я вымушаны яе апусціць...) А Дануту, свою любовь, не удалось самому удушить, и ты оставил ее на растерзание немцам, зверюга ты!

Мои пожелания тебе: пусть светлая и чистая любовь Дануты живет в твоем сердце, как червь, до глубокой старости твоей, а когда придет к тебе твоя смерть, чтобы она была похожа на смерть Дануты! С такими же пытками и ты был таким бессильным и беззащитным, какой ты оставил ее —

Придурок ты!

Ольга Т».

Калі наша задача ў тым, каб узяць чытача за сэрца, то лёгка сабе ўявіць маю радасць пасля прачытання гэтага «крыку» душы. Во ўзяў за жывое! Каб гэтая самая «Вольга Т.» жыла ў Гродне, а ў нашым аблана і праўда працаваў такі Янка Барташэвіч, то, мабыць, яна знайшла б яго і, прынамсі, вочы яму выдрала б.

Такое было маё першае ўражанне.

Потым стала сумна. Усё ж такі мы жывём не ў XVII стагоддзі і ўспрымаць кніжку мастацкай літаратуры як нейкі дакумент — трохі наіўна.

## І. ІНЕ КАРПЮК

Здравствуй, жена!

Я благополучно доставил себя в Минск, что и свидетельствую.

Не особенно приветливо меня здесь встретили. С помещением для ночлега еле устроился, счастье у меня здесь столько друзей и знакомых, что могу взять с тобой развод, прожить до очередной мировой войны, бывая только по одной ночи у каждого из них.

На курсах моих, представь себе, главными предметами преподавания — марксизм (краткий курс), психологня ну и остальное более связано с работой заврono. Ты понимаешь, что в виду такого подбора уроков (часть из них я смогу смело пропускать), я не зеваю, а провожу день по своему усмотрению. Первый день навестил партизан-друзей, а вечером был на «Черевички(!)», что мне очень понравилось (за 7 рублей). Второй день был у очень интересного писателя Брыля, очень талантливого, оригинального моего земляка. У него провел ровно полсуток, можешь себе представить, насколько это было мне интересно, коли я 12 часов нашел, о чем с ним говорнть. Сегодня третий день моих курсов, думаю высидеть до конца, несколько часов нам читает Саевич (занятия у нас с 3 часов до 11 часов вечера).

Как ты смотришь на это, жена? Меня здесь никто ни разу нигде и ни при каком обстоятельстве не назвал Алексей Никифорович, я затерялся в табуне минчан и все. Ведь это большое безобразие! га?

В общем, Инночка, знаешь что, я пока купаюсь в новых впечатлениях, новой обстановке, честное слово, жалею, что тебя здесь нет, здесь, где я бывал, иногда очень чертовски интересно, ну и ты еще это могла б все закусывать халвой, а так пусть тебе потекут слюнки (я было хотел за тебя покушать халвы, взял 100 г, пока я разобрал, что за вкус, она во рту растаяла и все). Эх! знаешь, как хочется тебя к себе прижать!..

Был в гостях у Валеры, он все сидит, чертит и занимается. Видел, случайно встретил Маю, не скажу, чтобы я совсем равнодушно с ней говорил. Встречаю много гродненских и все [...]...

Пиши мне на г. Минск, Главпочтамт. До востребования. А пока бывай. Целую крепко, до самых костей.

*Твой законный муж Алексей.*

## 2. ЯНКУ БРЫЛЮ

*2 студзеня 1957 г.*

Іван Антонавіч!

Думаю, пакуль дойдзе пісьмо, ты ўжо будзеш здаровы, з чым я цябе і віншую. Буду гаварыць адразу аб справе.

Я толькі што гаварыў з Нінай па тэлефону пасля таго мне здалося, што толкам усяго не расказаў. Паясняю ў чым справа. Нашая «Гродзенская праўда» вырашыла даць матэрыял аб рэвалюцыянерах-земляках. Цыкл гэтых матэрыялаў для моладзі хочам адкрыць Жалязняковічам. На Гродзеншчыне ён-такі першы з шэрагу гэтых людзей. Між іншым, аб ім мала хто ў нас і ведае. Хіба толькі на Навагрудчыне. Ды вось бяда: Ж. не даецца пісаць нашым работнікам. Тады я ўспомніў пра твой нарыс. Там жа можна выкраіць некалькі мясцінак на два падвалы аб яго рэвалюцыйным мінулым і для нашай газеты. Дарэчы, ты і сам з Гродзеншчыны, а ў сваёй газеце не надрукаваў ні радка. Я сказаў пра гэта свайму начальству, і яно загарэлася гэтай ідэяй. Мне даручылі табе пазваніць. Словам, вельмі цябе просім: вышлі нам такі матэрыял на бел. або рус. мовах, якая ў цябе ёсць пад рукамі. Думаю, што будзе яшчэ табе званіць нашае начальства.

Шчырае прывітанне тваёй гаспадыні Ніне!

Да пабачэння.

*Аляксей.*

## 3. МАКСІМУ ТАНКУ

*9 красавіка 1958 г.*

Яўген Іванавіч! Я быў у Зэльве. Справа выглядае так.

У пачатку дваццатых гадоў Іван Генюш з Зэльвы не змог паступіць у Віленскі універсітэт, бо не прынімаў удзелу ў вайне з бальшавікамі. Каб атрымаць в. асвету, паехаў у Прагу. Скончыў школу, пачаў там працаваць. Аднаго разу прыехаў на радзіму і жаніўся на Ларысе.

Ларыса Антонаўна паходзіць з Волпы. Яе бацькі мелі фальварачак. У 1928 г. скончыла Ваўкавыскую гімназію. У 1935 г. вышла замуж за Генюша і выехала ў Чэхаславакію. Там з мужам жыла да 1948 г. За гэты час бацьку яе раскулачылі, выслалі і там ён загінуў. У 1936 г. нарадзіла сына. Калі ў 1948 г. яе арыштавалі, сына ўзяла на

выхаванне сястра з Беластока, ён жыве там да сённяшняга дня і вучыцца ў Медычнай акадэміі.

Ларыса пісала і друкавалася ў Чэхаславакіі. За гэта атрымала 25 гадоў. Восенню 1956 г. яе выпусцілі і не далі ніякага заключэння. Даведкі аб рэабілітацыі не мае. Ларыса давала мне слова, што не пісала антысавецкіх вершаў, не пісала вершаў і пранямецкіх.

У Зэльве засталася палова хаты бацькі мужа Ларысы. У ёй Геніюшы і жывуць. Ён працуе ў бальніцы тэрапеўтам, яго начальства хваліць. Яна хатняя гаспадыня. Жывуць не вельмі багата, але ж адзін пакой застаўлены сцелажамі, запоўненымі новымі кніжкамі на 5 мовах. Геніюшы атрымліваюць чэскія часопісы і газеты.

Агульнае ўражанне аб Ларысе.

Уразілі мяне некаторыя дзівацтвы. У гэты дзень, калі я быў, я заўважыў, што Ларыса... посціць. Усё, што адбываецца за сцянамі яе дома, падыходзіць пад слова «яны»... Не аддавалі ім хату і Ларыса звярнулася з заявай да пракурора БССР. Заяву скончыла такой фразай «...Калі атрымаю кватэру, абяцаю ніколі ні аднаго радка не пісаць пра Беларусь!..» да ўсяго страшэнна запалоханая.

Але здзівіла мяне ў ёй і другое.

З першых слоў Ларысы кідаецца ў вочы вялікая начытанасць, багацтва розуму, сардэчнасць і тая культура, якую я бачыў толькі ў інтэлігентных чэхаў, калі быў разам у лагеры. Гутарыць вельмі прыгожай і багатай беларускай мовай. Сказаць, што любіць беларускую літаратуру, мала. Яна ведае яе цалкам, ёю жыве.

На вонкавы выгляд Ларыса — магутная жанчына, энергічная, гаваркая, ветлівая, гадоў на пятнаццаць маладзейшая, чым на самай справе.

Мой вывад.

Некаторыя дзівацтвы і накіп крыўды ў Ларысы нішто ў параўнанні з яе эрудыцыяй, маладосцю душы. Мне здаецца, што Вам, Яўген Іванавіч, штосьці трэба зрабіць, каб вярнуць яе ў літаратуру.

Развітваючыся, я запрапанаваў Ларысе перакласці што-небудзь з чэскага і прыслаць Вам у «Полымя». Думаю, што не пакрыўдзіцеся за лішнюю маю ініцыятыву

З прывітаннем

*А. Карпюк.*

Яе адрас: Гродзенская вобласць, г. Зэльва, вул. Савецкая, 7, Ларыса Антонаўна Геніюш.

## 4. АЛЕНЕ КАРПЮК

*29 верасня 1959 г.*

Здравствуй, Лена!

Когда-то цари разговаривали с народом так: «Здравствуйте, ребята. Я ваш царь. Рад вас видеть. Ну, будьте здоровы!..» Так коротко писала мне и ты. Но сегодня получил письмо длиннее. Передайте с Ваней привет от меня удаву! Я горжусь, что дочь моя попала в школе в командиры. Как же тебя сейчас будут приветствовать товарищи? Небось, нос задрала уже выше, чем Танька Крицкая во время свадьбы!

Ты пишешь: «аж кажется: что б быть птицей, так бы и улетела...» Это уже по-писательску. Гляди, ты еще меня переплюнешь и станешь большим писателем... что ж, вызывай папку на соревнование, как Хрущев Америку вызвал!..

А теперь насчет Ванькиного письма. Передай маме, что она не понимает того, что там нарисовано. Понимаю только я один, потому что был на американской выставке и там такие рисунки были. Они называются абстрактные и их не каждый может понять.

А сейчас о себе. Сегодня целый день писал. Потом наклеивал на стену ваши фото. По несколько. Повезло больше всего Ваньке. Он у меня на 4 карточках, Ленка на 3, а бабушка, дедушка, дядя Валера только по разу. Один раз и мамка у меня на стене, только ты, Лена, ей не говори, а то разозлится и не станет высылать мне денег, тогда мне капут, как фрицам под Сталинградом!

А еще потом ходил лечил зуб. А потом ездил в магазин искал тебе книг, которые ты просила, не нашел, купил вам этикеток и переводных картинок. Потом по дороге купил булку хлеба. Очень интересная булка — 60 сантиметров в длину и 6 сантиметров в ширину. Попроси у Вани, то он возьмет из ящика железный метр и покажет, какая длинная булка. И еще много чего накупил, а лифт был испорчен, пришлось тащиться на 6 этаж ногами. На один этаж 20 ступенек в нашем обшежитии, то сколько я сделал ступенек до 6 этажа, а?

А если тебя интересует, зачем я так много всего купил, так я признаюсь. Завтра приезжает ко мне мой брат, а твой дядя из Челябннска. Мы будем с ним угощаться тем, что я накупил.

После всего я спать не хотел и решил съездить в город. Я каждый раз перед сном езжу. Что я там делаю? А вот что. Слажу у Кремля, похожу по Красной площади, погляжу, как у Мавзолея

меняется караул, послушаю бой часов курантов, подумаю, что я в таком месте, о котором думает весь мир, и иду назад к автобусу. Так сделал и сегодня. Приехал, а там пустота на всей площади. Только венки у Мавзолея да 2 часовых. За стеной Кремля на четвертом этаже светилось окошко. Это, видимо, Никита Сергеевич, который только что вернулся из Америки, раздавал заморские подарки своим внукам. Ну, подумал так, походил еше по тротуару, поплевал на него, поглядел, как милиционеры регулируют уличное движение. Ну и достается им, бедным! В одном месте на перекрестке стоит их сразу пять человек, машут своими дубинками да свистят свистками, прямо, не знаю как!

Вернулся домой, решил тебе ответить на пнсьмо. Вот и пишу. Вот и написал.

Будь здорова. Целуй от меня маму, Ваню, привет Данусе передай. А я пойду ложиться. Дядя Валера завтра приезжает в 6 утра. Бессовестный, мог бы и попозже! Учи Ваню, чтобы тебя, когда вырастет, так рано не беспокоил, а приезжал в гости не раньше так часов десяти, а то будешь всю ночь дрожать, чтобы не проспать.

Целую.

*Твой папка.*

## 6. ЯНКУ БРЫЛЮ

*30 верасня 1960 г.*

Здравствуй, Ваня!

Сёння Гарбачоў сказаў што ты моцна хворы. Дазволь цябе пахарошаму пашкадаваць і ад шчырага сэрца пажадаць табе хутчэй стаць на ногі. Мабыць, у цябе ўсяго толькі грып? Сэрца ж ты залячыў раней?! Адным словам, выздараўлівай!

На днях прачытаў Адамовічаў раман пра партызан. Ён на мяне такое пакінуў уражанне, што адразу адхацелася пісаць сваіх партызан і я яму пазайздросціў.

Культурная, таленавітая і цікавая рэч.

Вельмі шкада, што яна адразу выйшла ў Маскве. Тут гэты раман зойме пачэснае месца сярод другіх добрых. Іх (добрых) у СССР, дзякуй, богу, шмат, таму, магчыма, могуць нейкі час Адамовічаў і не заўважыць. Але ў Беларусі гэтая рэч, калі б выйшла, прагучэла б інакш, бо гэта самы лепшы твор пра партызан (якімі ж вартымі жалю становяцца «Мінскія напрамкі» і др.), наогул раман гэты ставіць аўтара адразу побач Брыля і Шамякіна. Што за псіхалогія, навізна

пункту гледжання, а дэталі! Прачытаўшы, мне вельмі захацелася напісаць Адамовічу пісьмо, але не дазволіла самалюбства: знаёмства то ў нас сапраўднага няма (хоць ты нас не адзін раз зводзіў, рэкламаваў аднаго другому, ды не аднойчы мы разам ехалі ў тваёй «Волзе». Відаць, гэтага для знаёмства мала). Між іншым, уся яго крытыка — гэта не больш і не менш, на маю думку, як сумленныя і смелыя выказванні, якія ён гаворыць услых, асабліва на фоне Баразніных і Герцовічаў, робіць яго прыкметным. На самой справе не ў гэтым сіла Адамовіча. Ён — пісьменнік і не абы які!

У гэтым годзе мне крыху весялей: Вольскі і Макаёнак тут! Дарэчы, аб іх. Гэта не проста спалучэнне дваіх чалавек адным інтарэсам — пісаннем п'есаў. У іх вельмі дзіўнае сяброўства. Нейкае нават нібы святое! Паназіраеш на іх збоку, дык залюбуешся. Зранку да ночы яны спрачаюцца, дзеляцца ўражаннямі і пры гэтым усё ідзе такім ладам, ды так прыгожа, разумна, што я задумаўся не адзін раз: чаму ў нас гэтага не заўважаюць? Гэта ж яны ўжо варты паважання толькі з-за гэтай дружбы!

Вось табе ўсе мае навіны. Выздараўлівай!

Чысла 26, відаць, буду ў Мінску, бо паеду дахаты. Прывітанне тваёй сям'і!

Будзь здароў!

## 7. МІХАСЮ ЗАБЭЙДУ-СУМІЦКАМУ

*14 снежня.1963 г., г. Гродна*

Дарагі Міхась Іванавіч!

З вялікай прыемнасцю я атрымаў ад Вас ліст. Адказваю Вам са спазненнем, бо быў у Мінску.

У Гродне мы з Вамі бачыліся нахаду —у гасцініцы «Нёман». Вы ішлі па калідоры з Шыдлоўскім і др., а я — насустрач з пісьменнікамі з Далёкага Усходу і перадаў Вам прывітанне ад Геніюшаў.

Вельмі мне прыемна, што мая «Данута» прыпала Вам да густу. Вы просіце прыслаць яшчэ што свае. У мяне яшчэ ёсць кніжкі «Мая Гродзеншчына» і «Дзве сасны», але яны слабейшыя і сорамна іх Вам даваць. Праз пару месяцаў выйдзе з друку мая «Пушчанская адысея» асобным выданнем, вось яе я адразу Вам і вышлю.

А наогул я Вам магу з гонарам сказаць, што беларуская проза выйшла на першае месца ў СССР, хаця пра гэта пакуль што афіцыйна ніхто не гаворыць. Я Вам вельмі раю пачытаць нашых І. Мележа «Людзі на балоце», А. Адамовіча «Вайна пад крышамі» і

«Сыновья уходят в бой», В. Быкава «Трэцяя ракета», Б. Сачанкі «Кароткія апавяданні», а таксама В. Адамчыка, Чыгрынава, Стральцова, В. Караткевіча, не гаворачы пра такіх буйных пісьменнікаў, як Я. Брыль. Адным словам, сэрца радуецца, гледзячы на нашых творцаў. Зрэшты, тэма гэтая не для пісьма. Я ўпэўнены, што калі-небудзь я ўсё Вам раскажу асабіста. Між іншым у Гродне нас траіх: вельмі таленавіты празаік Васіль Быкаў і таксама вельмі здольная маладая паэтэса Данута Бічэль. Усе мы Вас вельмі добра ведаем завочна, але неапісальнае ўражанне Вы на нас зрабілі сваім канцэртам. Каб мы мелі ўладу, то зрабілі б так, каб Вы не выязджалі з Радзімы, а неслі народу да сэрцаў сваю Песню.

Крыху пра сябе.

Ад вайны жыву пераважна ў Гродне. Маю сына (10 г.) і 2 дачкі (13 і 2 г.). Жонка — настаўніца (таксама была на Вашым канцэрце і не можа яго забыць). Сам я працую ў «Інтурысце».

Пісаць час маю. Вось і цяпер начаў новую рэч, што атрымаецца, — пабачым.

Калі будзеце ў Мінску, дайце знаць, я падскочу да Вас на сустрэчу.

Ад шчырага сэрца, дарагі Міхась Іванавіч, жадаю Вам многа здароўя, творчых поспехаў і яшчэ неаднаразовага прабывання на Радзіме.

*Ваш А. Карпюк.*

## 8. ВАЛЯНЦІНЕ КАРПЮК

*27 лютага 1965 г.*

Здравствуй, дочка!

Я сегодня получил 2 письма. Одно от тебя, за что большое спасибо. Другое — от одного литовского дяди, писателя из Вильно. Дядя писатель мне прислал свои стишки, чтобы я их перевел на белорусский язык. Ну, что в твоем письме было, ты сама знаешь. Я в магазинах видел много больших интересных картинок, но не обращал внимания. Сейчас специально похожу, погляжу и если еще только есть — обязательно куплю, пришлю.

Сегодня у нас выборы и я ходил голосовать. Потом мой директор мне сказал сходить в зоологический сад. Я туда пошел. А там здорово, интересно. Понимаешь, две медведицы Танка и Звездочка родили

детей. Одна — одного ребеночка, другая — двое сразу. Детки такие маленькие, слабенькие. Ихние мамы залезли в буды, в берлоги, сидят, даже кушать не вылазят. Когда кто-то идет, они как зарычат и никого не подпускают, а только до деток что-то по-медвежьи мурлычут и их полизывают. А понимаешь, ихний папка, старый медведь Гришка, только издали на это все глядит. Его не подпускают к медвежатам, а то папы медведи кушают своих детенышей, такие они нехорошие, видишь. Поэтому директор зоопарка запер его в клетку. А когда детки подрастут, Гришку выпустит и медведи снова будут все вместе.

Потом я пошел к обезьянам. А там обезьянка Ика тоже родила сыночка. Только неживого. Одна тетенька хотела неживого сыночка забрать и схоронить в ямку на зверушечье кладбище, так Ика не отдала. Она как закричит, прижала его к груди и забралась на самый потолок клетки. И вот уже несколько дней Ика не отдает своего сыночка, а все прижимает его к себе, разговаривает с ним, целует его мертвого, ложит спать рядом с собой, дает ему кушать, смеется до него, как человек, и никак не поймет, что он помер и не живет, от беда!

А еще есть там попугай Костя. Директор зоопарка начал его гладить и я захотел погладить. А Костя меня клювом за палец — раз! — и укусил до крови, ну его! Я тогда собрался и пошел домой!

Ну, вот и все у меня новости.

Картинки, что я тебе присылаю, дай поглядеть ребятам, Ване, а тогда складывай в альбом. И письма мои тоже. Я твои складываю. Хорошо?

Ну, будь здорова.

Привет всем детям, Любови Павловне, дедушке, Ваньке, маме.

## 9. ПЯТРУ МАШЭРАВУ

*18 студзеня 1966 г.*

Первому секретарю ЦК КПБ товарищу Машерову П. М.

Дорогой Петр Мироновнч!

В прошлую пятницу в Гродно имело место такое событие. В областную библиотеку им. Карского зашел [...][1] N, срочно созвал сотрудниц и обьявил:

---

[1] Пасада і прозвішча не друкуюцца

— Немедленно соберите мне компрометирующий материал на Карпюка!

Встревоженные женщины через несколько часов принесли ему все рецензии на мои произведения, все заметки из газет и журналов, где упоминалось мое имя и в недоумении заметили:

— N, но тут везде его хвалят?!

— Ка-ак? — очень удивился т. N. — Не может этого быть!

— А вы читали его «Дануту», «На лесных стежках»?.. Выяснилось, что т. N ни одного моего произведення не читал.

Тогда раздраженно он им заявил опять:

— Вы обязательно должны на него что-то мне дать! Нашему Мицкевичу поручено на сьезде КПБ выступнть по вопросам искусства, я ему готовлю доклад!

Город наш относнтельно небольшой, тихий. В Гродно писателей несколько и все они на виду. Событие в библиотеке стало немедленно сенсацией определенных кругов города. Назавтра десятки людей начали мне звонить по телефону, искать со мной встречи, сочувствовать, спрашивать, что случилось.

Я в недоумении, что, казалось бы, опытный партийный работник т. Мицкевнч В. Ф. доверил такой важный вопрос людям, превратившим это в очередную кампанию. И, честно говоря, роль какого-то великомученика мне не по душе.

В последнее время на совещаниях и собраниях слишком часто склоняется мое имя. Мне думается, что некоторые товарищи используют для этого неправильно истолкованные мои фразы или оговорки.

На последнем пленуме Союза писателей БССР я допустнл несколько ляпсусов. Например, собирался поругать т. Пашкевнча как редактора, хотел напомнить ему о ленинском руководстве, а сказал, что якобы у нас не чувствуется ленинского руководства литературой вообще. Сам не понимаю, как я сделал нетактичный выпад против присутствующей на пленуме русской писательницы т. Воронковой и пр.

Дело в том, что я могу выступать только по готовому тексту. В данном случае этим я пренебрег, отсюда и мои ошибки. Я очень переживаю за них, и стараюсь на ошибках учиться.

Я не хочу уйти от ответственности за неправильные слова, заслуженно принимаю наказания. Но, ей богу, наказаний этих замного.

Год тому назад в «Маладосці» была напечатана моя автобиография. Ее вряд ли можно назвать законченным литературным

произведением. Это пока фрагменты. Над вещью этой я работаю и думаю, со временем получится нз нее неплохая книга. Но мне кажется, что вокруг этих фрагментов слишком много создали шума. Вместо того, чтобы автору указать на недостатки в них, началась расправа.

Вскоре после напечатания моей биографии были наказаны тт. Панченко и Асипенко (я перед ними очень виноват). Затем меня из-за этого произведения уволили из «Интуриста» (некоторые товарищи для этого подделали так, будто я дал... американцу документ!). Вычеркивают все время мои книги из списков издательств (днями т. Коновалов опять вычеркнул меня из очередного списка). Страдают из-за меня даже родные и посторонние люди. Недавно кандидат фил[ологнческих] наук т. Козлов принес в «Гродненскую правду» рецензию на мою книгу, ему ее вернули заявив:

— Карпюк в опале, разве вы не знаете?!

Днректор 12 СШ, где работает моя жена учительницей, завел в горкоме партии разговор о поощреннн педагога И. Карпюк, но получнл за это взбучку...

И т. д. И т. п. Всей этой ерунды не хочется описывать.

Если меня выгонять с работы, не печатать тех книг, которые уже приняты читателем, преследовать даже членов семьи и посторонних лнц, так это уже будет называться не работа с автором, сделавшим промахи в произведении, а — местью. Я понимаю, что все это как-то получается само собой, ведь никто не заинтересован мне мстить, поэтому стараюсь разъяснить положение дел.

Создалась какая-то нездоровая атмосфера вокруг моего имени. По значению моих произведений, по способностям, я не стою того, что бы обо мне было столько разговоров. Наша белорусская проза в последнее время заметно шагнула вперед и, мне кажется, надо больше говорить о ее достижениях, а не сосредотачивать внимание на отдельных недостатках и невольных промахах ее литераторов.

Попутно хочу заявить еше об одном.

Со стороны некоторых местных товарищей наблюдается неправильное отношенне и ко второму гродненскому прозаику — Василию Быкову. Не знаю такого областного или городского совещания или пленума, где бы не говорилось о крупных идейных промахах прозаика Быкова.

Быков тоже может что-то сказать опрометчиво, но разве можно вокруг этого поднимать такую шумиху? Не лучше было бы кому-то его вызвать, да лично высказать претензии к нему? Василий Быков

беспартийный, все разговоры потом до него доходят в разных интерпретациях, он человек издерганный жизнью и израненный на фронтах, очень болезненно их воспринимает. Я знаю случай, когда у него из-за этого был сердечный припадок.

Василий Быков гордость всей белорусской литературы. Его первая книга вышла совсем недавно, но в настоящее время тираж его произведений (советских и иностранных) дошел уже до 6 миллнонов экземпляров! Нельзя так относиться к народному самородку.

На бумаге всего не опишешь. Я прошу Вас принять меня — я бы рассказал подробнее. С уважением

*А. Карпюк,*

*член КПСС с 1947 г., секретарь Гродненского областного отделения Союза писателей БССР* г. Гродно, ул. Ожешко, 49, кв. 46.

Карпюк Алексей Никифорович

*Рэзалюцыя:* т. Пилотовичу С. Прошу принять его и информировать о результатах беседы в ближайшие дни. П. Машеров. 21.2.1966 г.

*Паліета:* Беседа состоялась 11 марта. Пилотович.

## 10. МІХАСЮ ЗАБЭЙДУ-СУМІЦКАМУ

*9 жнiўня 1967 г.* Дарагі і паважаны Міхась Іванавіч!

Чамусьці толькі ўчора прышла Ваша адкрытка, хоць яе Вы выслалі два тыдні таму назад.

З 25.V па 6.УШ я быў на Поўначы (у Петразаводску), Вашу цудоўную пласцінку атрымалі мае хатнія. Вялікае Вам дзякуй. Дай Вам бог яшчэ многа іх выпусціць. Ведаю, М. Танк і іншыя стараліся арганізаваць закуп Вашых пласцінак, як справа заавансавана — не чуў.

У нас шмат чаго цікавага, многа ёсць пра што Вам расказаць, на жаль, у пісьме гэтага не ахопіш.

Васіль Быкаў пасылае Вам шчырае прывітанне і пажаданне здароўя і поспехаў у нясенні нацыянальнай песні.

Ларыса Генiюш выдае зборнік. Ён вось-вось выйдзе з друку. Апошнія часы ад яе так і чуеш вельмі добрую мелодыю і, думаю, мы адкрылі яшчэ аднаго выдатнага паэта, такога ж як Танк. Чыталі яе падборку ў другім нумары «Полымя» за гэты год? Пачытайце, калі ласка, гэта была ў нас сенсацыя.

У Гродне маем дзве добрыя паэтэсы Данута Бічэль-Загнетава выдае зараз пятую кніжку (хаця ёй толькі 29 гадоў), калі выйдзе, пастараюся выслаць. Дарэчы, у Дануты вершы ёсць такія, што

просяцца па музыку.. З'явілася яшчэ маладая зусім (Оля Іпатава), таксама вельмі таленавітая.

Адным словам, на Гродзеншчыне ёсць літаратура і вельмі мне прыемна ад сведамасці такой. Горш іншае.

Дзе Вы праводзілі лета? Як ваша здароўе?

З прывітаннем ад мяне і ўсёй маёй сямейкі.

*Ваш А. Карпюк.*

## 11. ВАСІЛЮ БЫКАВУ

*17 чэрвеня 1974 г., г. Гродна*

Дарагі Васіль!!! Вялікая моц таіцца ў растворы, які сцыментаваў цагліны гэтага будынка. Але ж якімі, скажы, якімі маштабамі змерыць тую магутную сілу Тваіх твораў, што паланілі мільёны душ рознага ўзросту і нацыянальнасцей, прымушаюць біцца ў рытме Твайго шчодрага сэрца, лунаць сярод Тваіх вобразаў ды жыць сярод Тваіх герояў? Вось чаму мы Цябе любім, шануем, паважаем і Табою ганарымся!

Ты — яркая ўспышка на шляху развіцця нашай нацыянальнай культуры і Табе, упартаму Зубру Гродзеншчыны, які піша так шчыра, хвалююча, аголенымі жыламі, — усенародная чэсць і пашана!

У дзень Твайго паўвяковага Юбілею мы ўсе, тут сабраныя, перадаем вялікае дзякуй тым настаўнікам, што Цябе калісьці вучылі!

Нізкі паклон Тваім бацькам — цётцы Ганне і дзядзьку Уладзіміру з далёкай вёскі Бычкі з-пад Ушачы, якія цябе нам далі такога!

Удзячнасць і прызнанне перадаем Твайму вернаму другу — жонцы, харошай і добрай Надзі, якая чвэрць стагоддзя дзеліць Твае радасці і нягоды, бо так ужо вядзецца, што дарога сапраўднага таленту ўсыпана не аднымі ружамі ды пракладзена не толькі сярод фанфар і юбілеяў!

Сынам Тваім жадаем быць вартымі свайго Бацькі!

А Табе, Васіль, жадаем захаваць сілы, бадзёрасць і на бліжэйшага паўвека ды ўвесь час даваць нам прыемнасць ганарыцца Табою — так жа сей каштоўныя зёрны ды збірай буйныя плёны на ніве дасканалення душы савецкага чалавека, прынось славу нашаму гораду,

Прынёманшчыне! Краіне!

*Карпюк і Твае сябры.*

## 12. МІХАІЛУ СЯРГЕЕВІЧУ ГАРБАЧОВУ

*29 красавіка 1987 г., г. Гродно,*

Генеральному секретарю ЦК КПСС тов. М. С. Горбачеву! Прошло уже столько дней с тех пор, как Гродно с официальным визитом посетил посол ПНР В. Наторф, консул в Минске М. Обединский, как в Кремле побывал В. Ярузельский, а мне все не дает покоя неприятная мысль. Терпеть больше не могу, беспокойством спешу поделиться с Вами.

То, что до 1939 г. я жил в буржуазной Польше (на тер. бывшей Западной Белоруссии), учился там в школах, приобщался к польской культуре и истории, то, что потом в концлагере Штутгоф с поляками терпел иго фашизма, затем вместе сражался против немцев (за организацию партиз. отряда на территории ПНР получил от Завадского высшую награду — золотой крест ордена «Virtuti military»), бесследно не прошло. Так меня жизнь сформировала, что поляки пе имеют от меня тайн и часто сердца наши бьются в одном ритме. Если приезжаю в ПНР, окунаюсь в круг искренних друзей, которые в настоящее время на разных общественных уровнях — от милиционера до министра и работника ЦК ПОРП. С одними когда-то пас коров, ходил в школу и на вечеринки, с другими в подпольном комсомоле давал клятву «как Ленин, не пить и не курить», с третьими сражались вместе против немцев и банд. Обо всем этом заявляю не для бахвальства, а чтобы подчеркнуть, что при такой ситуации, когда мы встречаемся, светских разговоров, конечно же, не ведем. Тогда у нас, как подобает между проверенными жизненными невзгодами друзьями, разговор идет на волнующую тему и без тайн. Говорим один одному все, что лежит на душе.

Так вот, об этой болячке поляков, устранение которой для нас имеет государственное значение, я наслышался столько, что как коммунист, терпеть дальше не имею права. Берусь изложить ее для принятия мер.

На территории Гродненской области по официальной статистике проживает 26,7% поляков (на 1,1 млн. населения), а во всей Белоруссии — больше 400 000 человек. Если в восточных воеводствах ПНР в данный момент на 180 000 белорусов имеются национальные школы, лицеи, в Варшавском университете существует белорусская кафедра, в Ольштыне — издательство, в Белостоке на белорусском языке издается еженедельник «Ніва», существуют белорусские ансамбли и белорусскне фольклорные группы, то наши поляки (в

Белоруссии) ничего этого не имеют. После войны в Гродненской области существовали польские школы, но теперь даже надписи под экспонатами писательницы Элизы Ожешко (домик ее с маленькой экспозицией украшает центр Гродно) звучат только на русском и белорусском языках, а сделать их еше и на польском нам не разрешили.

И вообще, эта тема в Белоруссии до сих пор считается «табу». В то же время рядом — в Литовской ССР, где поляков проживает куда меньше, польские школы существуют, имеются там соответствующие кафедры, на подмостках звучат польский хор и танцевальные коллективы. Конечно, литовскому советско-партийному активу при такой ситуации приходится «крутиться» куда больше, но советская власть от этого не страдает ничуть, ибо по Ленину, интернациональность не означает безнациональность.

До войны в нашем Минске имелись не только польские учебные заведения, библиотеки, но и польский театр. В связи с этим вспоминается неприятный факт. За десять последних лет в Минске генеральные консулы сменились уже четвертый раз, но как и первый Древняк, второй — Розняк, так и третий — Рачковский безуспешно пытались через Министерство культуры БССР организовать выступление в Минске польской оперы «Галька» (автор Манюшко, который родом из-под Минска и свое выдающееся произведение написал по мотивам фольклора белорусов).

Невнимание наших властей к значительному количеству поляков в БССР, упорное неучитывание их национальных интересов в наш коммуникабельный век непростительно. Это является жаркой темой споров при каждой нашей частной встрече с представителями ПНР — писателями, учеными и партийными работниками, но аргументов для оправданий мы имеем все меньше (не будешь же вечно ссылаться на послевоенные трудности!). Если при встречах с Вами Войцех Ярузельский об этом молчит, то делает это лишь из такта, а в душе, как и недавно побывавшие в Гродно посол и консул ПНР, об этом, конечно же, подумал.

Так зачем этн недомолвки между друзьями?

Что стоит нашей могучей державе в центрах проживания поляков в Белоруссии по образу национальных школ для белорусов в ПНР открыть с десяток школ польских, в Гродненском университете организовать соответствующую кафедру, а при одном из Дворцов культуры создать польский ансамбль? Это сразу удалило бы еше одно ненужное нам нравственное напряжение в важном регноне. Да и

Ярузельскому было бы легче отбиваться от нападок оппозиции, которая хитро и коварно использует наши просчеты.

С таким посланием не обращаюсь к нашим руководителям лишь потому, что мы все-таки провинция, а симптомы той Грандиозной Перестройки, которая разворачивается в стране, чувствуются здесь еще слабо. По крайней мере, в области духовной. Такое впечатление, что у наших отдельных, но влиятельных руководителей преобладает все тот же принцип — держать, не пускать, не разрешать. Подозревать и ничего не менять. Наглядным примером служит письмо ведущих писателей и деятелей культуры БССР, посланное Вам в конце прошлого года, в котором характеризовалось состояние белорусского языка в республике. Наболевший вопрос наше начальство, ничего по существу не меняя, постаралось спустить на тормозах. Но белорусы — народ упрямый, да и существуют какие-то высшие законы, управляющие людьми, из которых следует, что такого под сукно не запрячешь. Рано или поздно, а проблема вылезет наверх опять, и придется все-таки ее решать. Но там речь шла о делах как бы внутрисемейных, сугубо наших. Польский же вопрос, мне кажется, выходит за рамки государственных границ и его надо решать немедля.

Коммунист с 1947 г., засл. работник культуры БССР, лауреат литературной премии имени Ивана Мележа — А. Карпюк

Карпюк Алексей Никифорович, 230029, БССР, Гродно, ул. Калиновского, 3 «а», кв. 2, тел. квартирный 4-08-52, служ. 4-83-75.

## 13. АЛЯКСАНДРУ АМІЛЬЯНОВІЧУ

*18 чэрвеня 1991 г., г. Гродно*

Олек, честь!

Вчера прочел Твою повесть. Проглотил ее на одном дыхании. Она содержит очень много фактического материала, написана мастерски. Я пророчу Тебе успех. Дай Тебе Боже, дорогой Друг!

Между прочим, повесть наводит на мысль, что все это ннтересует только наше поколение. Молодым все это — до лампочки, вот трагедия! Между прочим, я тоже из такого рода литераторов, и я пишу то, что молодым чуждо.

Привет пани Мире

*Твой А. Карпюк.*

# ДАДАТАК

## УСПАМІНЫ ПРА АЛЯКСЕЯ КАРПЮКА

*Васіль БЫКАЎ*

### ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ *(Фрагменты)*

[...] Стаўшы сакратаром абласнога аддзялення СП, Аляксей Карпюк імкнуўся актывізаваць працу гродзенскіх пісьменнікаў, арганізоўваў усялякія вечары і сустрэчы — у школах, на прадпрыемствах, часам з выездамі ў раёны. Звычайна для таго запрашаў Дануту Бічэль, Вольгу Іпатаву, якая са школьных урокаў прыбягала куды-небудзь — у педінстытут ці ў рэдакцыю і бойка чытала вершы. Карпюк звычайна ганарыўся маладымі і недалюбліваў старых — некалькіх дужа актыўных пенсіянераў-адстаўнікоў. [...]

Як я з часам пераканаўся, жыццё ў правінцыі мае хіба ўяўную перавагу перад сталічным жыццём, дзе ў сучаснага чалавека сапраўды ёсць магчымасць схавацца ў мурашніку шматлюддзя. Насуперак пашыранаму меркаванню, у правінцыі тое немагчыма. Па-першае, тут ён пад няспынным наглядам начальства, суседзяў, органаў, якія заўсёды імкнуцца ўсё і пра ўсіх ведаць. Зноў жа — візіты. У Горадні, дзе мы шмат год жылі з Карпюком, не мінала тыдня, каб хто не прыехаў да нас — з Менску, Масквы ці з Польшчы. Вядома ж, прыязджалі сябры, харошыя людзі, журналісты, якім мы былі рады. Звычайна пасля такіх знаёмстваў завязвалася сяброўства, якое часам доўжылася гадамі. [...]

На дзень ці два мы з Карпюком мелі прыемнасць сустракаць у Горадні ўжо тады слыннага пісьменніка з Беластоку, апальнага Сакрата Яновіча. У часе прагулянак па гарадзенскіх ваколіцах ён распавядаў пра свой перасвед ад польскіх уладаў, а мы распавядалі яму пра свой. Тым і паразумеліся. Як паказаў час, — назаўжды.

Асаблівую прыязнасць госці праяўлялі да Карпюка, тым болей, што ён быў заўсёды даступны, днямі сядзеў у сваім офісе, стукаў на друкарцы. Неяк зачасціў у Горадню журналіст і пісьменнік Олек Амельяновіч, таксама з Беластоку. Карпюк звычайна не любіў пачостак і ў пэўных выпадках запрашаў мяне або прыводзіў каго да мяне на

кватэру. Амельяновіч быў просты, таварыскі хлопец, ахвотна піў і шмат распавядаў пра свае экзатычныя вандроўкі на поўдзень, у Лацінскую Амерыку. Але аднойчы, перад тым, як ён меўся прыехаць, у Карпюковым офісе раздаўся ананімны званок, і хтось папярэдзіў, каб Олека не прымалі. Мы апынуліся ў разгубленасці — чый гэта званок, з якога боку? Памятаю, тады ўтрох — я, Карпюк і Клейн, — адышоўшыся ў парк ля Каложы, абмяркоўвалі тое здарэнне. Што гэты званок — з бяспекі, не выклікала сумневу, але з якой? Карпюк кажа: а раптам то з іхняй? Разумны Клейн адказвае: і з нашай не лепш. Так мы нічога і не вырашылі. Але, здаецца, пасля гэтага Амельяновіч не прыехаў зусім. Затое, калі неўзабаве ў Карпюка з'явілася патрэба звярнуцца да яго ў Беластоку, той яго выручыў, як не мог выручыць ніхто ў Беларусі.

Запомніўся прыезд з Ленінграду інжынера Вайцяхоўскага, былога партызанскага камбрыга. Памятаю, тады было добрае надвор'е, мы ўзялі колькі бутэлек і паехалі на прыроду ў Пышкі. Як выпілі, камбрыг і яго колішні падначалены, якога ён прызначыў камандзірам атраду, пачалі ўспамінаць шмат якія эпізоды свайго сумеснага партызанства. Вайцяхоўскі тады вельмі добра выказваўся пра Карпюка-камандзіра, яны ўспаміналі шматлікіх агульных сяброў-партызан. Называлі імёны — тых, хто загінуў, хто і дзе жыве, якую кар'еру зрабіў па вайне. Вайцяхоўскі дакараў, але і хваліў Карпюка, што той не застаўся пасля вызвалення ў 44-м мацаваць савецкую ўладу на Гродзеншчыне, як гэта рабілі ці не ўсе партызанскія камандзіры, а падаўся на фронт, дзе яго пакалечыла. [...]

У мяне быў транзістарны радыёпрыёмнік з кароткімі хвалямі — японскі «Панасонік», які я ці не кожную ноч настройваў —лавіў «Свабоду», Бі-Бі-Сі, «Голас Амерыкі». З усіх, аднак, аддаваў перавагу «Свабодзе». Добра пачуць яе рэдка ўдавалася — глушылі заўжды і шчыльна. Некаторыя раілі шукаць здатнае мейсца ў кватэры, каля водаправодных трубаў, паспрабаваць настройваць за горадам. Я спрабаваў і так, і гэтак — часцей заўсё нічога не атрымлівалася. Перадатчыкі былі за тысячы кіламетраў, а глушылкі — во яны, побач, на ўскраіне горада. Няўдалымі былі ўсе мае спробы і ў тую ноч. А менавіта тады хацелася дазнацца пра падзеі, што выспявалі ў адносінах да Чэхаславаччыны, на якую нацэліўся «крыважэрны блок НАТА». Міралюбны Варшаўскі блок рыхтаваўся яе ратаваць.

Раніцай, як заўжды, скіраваў у рэдакцыю і на пешаходным мастку цераз чыгунку спаткаў Клейна. Барыс здаўся нязвыкла

маўклівы, на чымсь засяроджаны і толькі буркнуў: «Ну, чуў? Яны ўвялі. Танкі ў Празе...»

Тое, вядома, ашаламляла. Я тады зразумеў вэрхал, што ноччу не даваў спаць — на вуліцах штось адбывалася, ішлі калоны машынаў, даносіліся чыесь галасы, у пад'ездах грукалі дзверы і бегалі нейкія людзі. Аказваецца, ішла мабілізацыя, як на вайну. У дапамогу перадавым часцям, што ўвайшлі ў Чэхаславаччыну, на базе Гарадзеншчыны разгортвалася рэзервовая армія. Хапалі запаснікоў, мабілізоўвалі транспарт, на ўскраінах у вайсковых гарадках фармавалі каманды. Як пасля выявілася, тэлефоны гарадской сеткі ў тую ноч былі адключаны. Мы з Клейнам выправіліся да Карпюка.

Яшчэ на падыходзе да Дому Ажэшкі, дзе звычайна працаваў Карпюк, пачулі, як на ўсю вуліцу гучэла перадача Б-Бі-Сі, распавядала, што савецкія войскі акупуюць Прагу. На вуліцы было нямала прахожых, некаторыя спыняліся, слухалі, а бальшыня хуценька кудысьці бегла. Мы тузанулі дзверы Карпюковага офісу, тыя былі не замкнёныя, а ў пакоі на канапе ляжаў Карпюк. Ён быў у поўнай вайсковай форме, побач на стале ляжала яго партупея і кірзовая палявая сумка. Карпюк хутка ўскочыў, працёр вочы. Мы выключылі транзыстар. «Во, халера, праспаў», — мовіў змабілізаваны ваяка. Аказалася, што ён усю ноч прабыў у Фолюшы на фармоўцы, раніцай прыехаў сюды і заснуў. Цяпер хутка адпраўка на вызвольны паход у Чэхаславаччыну. «І ты пойдзеш?» — папытаўся Клейн. — «Абавязкова. Ужо я там напішу», — быў яго выразны адказ.

Карпюк хутка паехаў на зборны пункт, і што з ім было далей, стала вядома праз некалькі дзён.

Вялізную мехкалону з мабілізаванымі выцягнулі на шашы ў напрамку польскай мяжы. Прыехала начальства з акругі, пачалі правяраць. Хадзілі адны, другія, трэція. Карпюк цярпліва сядзеў у кузаве МАЗа. І раптам паявіўся начальнік палітаддзелу акругі генерал Дэбалюк. «А гэты нашто? — кіўнуў ён на Карпюка. Нейкі палкоўнік пачаў штосьці тлумачыць, але генерал не даслухаў: — Зняць! Ён не паедзе». Давялося Аляксею злазіць з высокага кузава, на спадарожных машынах дабірацца да Горадні. Калона пайшла да Чэхаславаччыны без Карпюка.

Карпюк, безумоўна, быў чалавек сумленны і, магчыма, нават хацеў быць сумленным камуністам. Але не ведаў, як ім можна быць. І наогул, што гэта такое — сумленны савецкі чалавек? Што пэўна, ён не любіў хлусні і не цярпеў непарадку — хоць у літаратуры, хоць у войску таксама. Таму, здаўшы ў Фолюшы сваю амуніцыю, пайшоў уздоўж калючага дроту агароджы паглядзець, ці не засталося што забытае

ягонымі папярэднікамі. І — во дзіва! Убачыў у траве тры пакінутыя карабіны. Адчуваючы з вайны каштоўнасць зброі, ён узваліў карабіны на плечы і панёс да капцёркі. Але тая аказалася ўжо зачыненай — усе пайшлі на фронт. Каб не кідаць карабіны ў лесе, давялося іх везці ў горад, у штаб арміі. Там, аднак, карабіны ўзяць адмовіліся — не нашай часці. А ўжо настала ноч, і ён змушаны быў несці карабіны дамоў. Адтуль патэлефанаваў мне: во халера, што мне рабіць? Кажу: там за тваім домам цячэ Ванючка, бухні туды твае карабіны, і справе канец. Ён мяне аблаяў: ты быццам у войску не служыў, не ведаеш, што такое аружжа. — Я, кажу, ведаю. Гэтым аружжам загаўняны ўвесь свет. Тваіх трох там не хапае... Не паразумеліся тады мы з Карпюком, ледзь не пасварыліся. Назаўтра ён пачаў хадзіць з тымі карабінамі зноў, аж покуль у яго не запатрабавалі пісьмовага тлумачэнпя: дзе і з якой мэтай узяў і г. д. Ледзьве ён выбавіўся з таго канфлікту, які сам сабе і стварыў. [...]

Седзячы ў Доме Ажэшкі, Карпюк прачытаў у «Новом мире» ўспаміны генерала Гарбатава, дзе ягоную ўвагу прыцягнуў не расповед генерала пра сваю кар'еру і франтавыя подзвігі, а скупое паведамленне пра тое, што генерал не п'е. І ніколі не піў. Уражаны такім дзівам, Карпюк сунуў часопіс у кішэню і пабег па вакзал. Там, не паспеўшы сказаць пават жонцы, сеў у маскоўскі цягнік і ранкам быў ужо ў Маскве. Пасля працяглых перамоваў з палкоўнікамі Генеральнага штабу раздабыў адрас Гарбатава, які жыў каля Нікіцкіх варот. Карпюк пазваніў у дзверы, і папярэджаны з генштабу генерал яго ўпусціў. Карпюк ветліва прадставіўся — беларускі пісьменнік, ветэран вайны. Генерал пасадзіў госця за маленькі столік, дастаў з шафы гранёны графінчык. Карпюк хацеў абразіцца і заўважыў, што ў часопісе генерал напісаў, быццам не п'е. Аказалася, сапраўды не п'е, а графінчык— для госця. Тады Карпюк горача пацісну̂ў генеральскую руку, радасна паведаміўшы, што таксама не п'е. І выклаў яму патрэбу, з якой прыехаў у Маскву. Ва ўсіх краінах евету ёсць таварыствы цвярозых, а ў нас няма. А між тым шкода ад п'янства... І г. д. Таму трэба звярнуцца да грамадскасці з лістом, падпісаным аўтарытэтнымі людзьмі, вось як вы і я, і стварыць таварыства. Тэкст ліста ўжо гатовы, вось пачытайце...

Трохі збянтэжаны генерал прачытаў тэкст і цяжка ўздыхнуў. Справа добрая, сказаў ён. Але хто падпіша? Сярод яго знаёмых цвярозага генерала яму не знайсці. Можа, сярод пісьменнікаў?..

Карпюк задумаўся. Канешне, ён разумеў, што двух подпісаў было замала для такога ліста, патрэбны быў трэці. Ды знайсці яго сярод пісьменнікаў таксама праблема. І раптам ён успомніў пра

Адамовіча, які тады быў у Маскве на нейкіх курсах. (Стаўшы ўжо доктарам навук, той усё вучыўся.) Карпюк пабег па Маскве шукаць Адамовіча. Ён шукаў яго цэлы дзень да вечару, аб'ехаў усе вядомыя рэдакцыі, абзваніў знаёмых. І высветліў, што Адамовіч сёння едзе ў Менск. Тады Карпюк купіў білет на вечаровы цягнік і, як той рушыў з Беларускага вакзалу, пачаў абход вагонаў. Ён іх абышоў усе, зазіраў у кожнае купэ і каля Смаленску сапраўды знайшоў соннага Адамовіча. Той выслухаў яго прапанову і сказаў: «Я гатовы ўступіць. Але толькі з умовай разваліць яго знутры». І лёг спаць. Карпюк аблаяў Алеся і выйшаў з цягніка. Раніцай прыехаў да Нікіцкіх варот і аб'явіў генералу, што трэцяга цвярозага чалавека ў Расеі не знайшоў. Так высакароднае таварыства не было створана. Ні тады і ніколі болей.

Карпюк, як ён пасля распавядаў, дарма звязаўся з вайскоўцамі, хоць бы і з генераламі. У сваім жыцці ён пераканаўся, што з гэтым народам лепей справы не мець. У вайну Карпюк камандаваў партызанскім атрадам, пасля ваяваў на фронце, быў двойчы цяжка паранены, а афіцэрскага звання так і не выслужыў. У той жа час хлопчыкі, што прыходзілі з універсітэту, так бы мовіць, авансам былі лейтэнанты. А некаторыя і пры ўзнагародах, заслужаных і не надта. Карпюку ж не далі сабраць нават заслужаныя ім на вайне медалі.

Займеўшы аднойчы вольны час, ён узяўся напісаць лісты. Адзін быў міністру абароны наконт таго, каб яму выдалі заслужаны ім медаль за ўзяцце Берліну, другі — дзядзьку на Урал. Дзядзька пісаў даўно ўжо, што жыве кепска, з прадуктамі трудна, прасіў дапамогі. Дык пляменнік яму напісаў: кінь ты гэта расейскае жыццё, прыязджай у Беларусь, тут бульбачкі хопіць. Той жа дзень аднёс лісты на пошту.

І вось праз нейкі час прыбягае з ваенкамату пасыльны, прыносіць позву. Карпюк парадаваўся — ці не прыйшоў ад міністра медаль? Прыйшоў да палкоўніка-ваенкама. Той чамусьці глядзіць ваўком, а потым падае аркуш паперы і кажа: «На чытай». Карпюк моўчкі чытае. «Не, ты гучна чытай»,— кажа ваенкам. А там на бланку Міністра абароны Саюза ССР напісана: «Загадваю. Параграф першы. Выклікаць і растлумачыць грамадзяніну Карпюку А. Н. што я ў сваяцтве з ім не знаходжуся і дзядзькам яму не з'яўляюся. Параграф другі. Гродзенскаму аблваенкаму палкоўніку такому-та за нізкі ўзровень палітмасавай работы з асабовым складам аб'яўляю вымову. Міністр абароны маршал Савецкага Саюза Г. Жукаў». — «Ты зразумеў? — пытаецца ваенкам. — Мне праз паўгода на пенсію, хто

мне цяпер гэтую вымову зніме? Ці мне без пенсіі ў адстаўку ісці? Во што ты нарабіў, разгільдзяй!»

Прыгнечапы, з сапсутым пастроем Аляксей вярнуўся дадому, дзе яго чакаў ліст ад дзядзькі. Той пісаў хімічным алоўкам на школьнай старонцы: «Дарагі пляменнік, ці ты там з глузду з'ехаў у сваёй Горадні, — які я табе маршал і дзе я табе вазьму гэны медаль? Я і ў войску ні дня не служыў...» З дзядзькам, канешне, адносіны ўлагодзіліся, а прадстаўленне на афіцэрскае званне ў Карпюка ляснула. Карпюк быў у недаўменні: падумаеш, папісаў! Я ж маршала не аблаяў. Дык праз тое да пяцідзесяці год хадзіць радавым? А гэтыя, што ў вайну ні разу па жывым немцу не стрэлілі, ужо маёры запасу. Вунь як той Гаўрушка, што самагон на хутары для камбрыга гнаў. Цяпер ён член бюро гаркама, — абураўся Карпюк. Тады ён яшчэ не прадбачыў, што прыйдзе час, і гэты брыгадны самагоншчык дасца Карпюку ў знакі... [...]

На партыйных і гаспадарчых мерапрыемствах у вобласці з зайздросным увагай і смакам абмяркоўваліся «ідэалагічныя дыверсіі» гродзенскіх літаратараў. Нават патрабавалі адказу ў сакратара абкама па ідэалогіі А. Ульяновіча, які не ведаў, як апраўдацца, але абяцаў «спусціць штаны» з Карпюка і Быкава. Адна надта кіраўнічая дама, мусіць, хацела апраўдаць Быкава гэткім аргументам: чаго ж вы хочаце ад чалавека, які нават не скончыў ВПШ, бо не член партыі? Да таго ж п'е. На тое ёй пярэчылі: але ж Карпюк скончыў інстытут, нават Вышэйшыя літкурсы і не п'е. Дык куды ж глядзіць абкам КПБ?

Што да выпівання, дык тая дама мела некаторую рацыю — за мной быў такі грэх. Асабліва падчас паездак на розныя пісьменніцкія мерапрыемствы. Аднойчы, памятаю, на пленуме ў Маскве праседзелі з адным маім сябрам увесь дзень у буфеце, дзе, вядома ж, пілі. Але не толькі пілі, а і вельмі актыўна дыскутавалі з двума ўкраінскімі артадоксамі з поваду праследу Віктара Някрасава.

Спрэчка перайшла ў злосную сварку, і мы сварыліся (і пілі) аж да сканчэння мерапрыемства. Так і не зайшоўшы ў залю.

Тое ж не раз здаралася ў Менску, і Карпюк нават ездзіў да маіх сяброў сварыцца, што яны спойваюць Быкава. З мяне памалу ствараўся вобраз пуставатага абібока і п'янтоса. Я не бурыў той вобраз, я яго падтрымліваў у якасці пэўнай абароны ад таго, што магло спасцігнуць адказнага, разважлівага і цвярозага. І спасцігла не аднаго. У цэнтральных газетах паявіўся артыкул (ці прамова) начальніка Главпура Савецкай Арміі генерала арміі Епішава, у якім ён сярод іншых расійскіх аўтараў (Еўтушэнка, Вазнясенскі, Аксёнаў)

бэсціў і Быкава. На чарговым партыйным мерапрыемстве ў Доме афіцэраў, куды запрасілі Карпюка, той сказаў са злосцю: «Калі Епішаў — генерал, дык хай камандуе войскам, а не лезе ў літаратуру». Тая ягоная рэпліка выклікала паніку сярод партыйнага кіраўніцтва Горадні. Як Аляксей у чарговы раз пайшоў у абкам, яго туды не пусцілі. Наспявала штось не зусім звычайнае.

У гэткай атмасферы надышоў 100-гадовы юбілей Леніна, да якога рыхтаваліся, бы да аканчальнай перамогі камунізму. Па гарадах і вёсках ішлі сходы, пленумы, ленінскія сімпозіумы. У Саюзе пісьменнікаў з гэтай нагоды наладзілі ўрачысты пленум, прыехалі і мы з Карпюком. Я пасядзеў крыху і пайшоў — беспартыйныя сябры запрашалі на пачостку. Карпюк запісаўся ў выступоўцы. Толькі што перад тым па краіне прайшоў ленінскі суботнік, рэпартажы з якога друкаваліся ва ўсіх газетах, і Карпюк зрабіў тое тэмай свайго выступлення. У канцы ён сказаў: «Мы ведаем, як у суботніку ўдзельнічаў Уладзімір Ільіч, з кім ён насіў бярвенне. Але з кім насіў бярвенне Леанід Ільіч, таго нам «Праўда» не паведаміла. Ці, можа, Брэжнеў не ўдзельнічаў у ленінскім суботніку, — хай нам адкажуць». Марцалеў, які сядзеў у прэзідыуме, аж скалануўся ад тых слоў і ў канцы пленума сказаў, нібы між іншым: «Што да выступлення таварыша Карпюка, дык гэты чалавек пачынае хадзіць па галовах».

Праз нейкі час той жа Марцалеў і ягоны памочнік Гніламёдаў прыехалі ў Горадню наводзіць парадак у мясцовым аддзяленні пісьменнікаў. Пасля грунтоўнай гутаркі ў абкаме пачалі па адным выклікаць нас у Дом Ажэшкі. Першай паклікалі Дануту, якая не хутка выйшла адтуль з заплаканым тварам. Нават не схацела гаварыць, што ў яе пыталіся. Наступным быў я. Размова была звычайная — пыталіся пра прычыны канфлікту з мясцовымі ўладамі і чыталі мараль. Як я распавёў пра прошукі КДБ, Марцалеў аж спалохаўся: «А вы ўжо ўсім расказалі?» Не ўсім, кажу, але некаторым расказаў. У тым ліку і карэспандэнтам з Масквы і Варшавы. У Карпюка дапытваліся пра прычыны ягоных адносінаў з абкамам, на што Аляксей сказаў: «Як яны да нас, так і мы да іх. Юбілейным ленінскім медалём за штучнае асемяненне кароў Ульяновіча ўзнагародзілі, а нас з Быкавым за вайну — і не падумалі».

*Барыс КЛЕЙН*

## НЕДОСКАЗАННОЕ

*(Главы нз воспоминаний)*

С Алексеем Карпюком я повстречался впервые в Гродно сразу после войны, когда он учился в Пединституте вместе с моим братом Львом[1] (впоследствии профессором Санкт-Петербургского и Венского университетов). В нашей квартире на улице Энгельса Карпюк делился своими заботами, а когда добился первых литературных успехов, он шел сюда, чтобы сообща им порадоваться. В один из ранних своих очерков[2] он вставил монолог хирурга Аси Моисеевны — моей матери. Настало время, когда сблизились и наши жены — моя, Фрида, и его, Инга. Настоящую популярность принесла ему повесть «Данута», окрашенная тем целомудрием довоенного любовного влечения, которое еще не стало тогда старомодным. [...]

В центре старого города все было на виду. Не могло оставаться незамеченным, что по вечерним улицам Гродно систематически ходят вместе Карпюк и Клейн, о чем-то все спорят, а может и сговариваются. Когда же нас стало трое, включая теперь и Быкова, а уличные прогулки дополнились и взаимопосещениями квартир, наши маршруты стали все более явно отслеживаться. Впрочем, неудивиельно, что наблюдали за автором произведений, получивших международную известность, — но отнюдь не такую, какая устроила бы власть. Надо думать, после выхода в «Новом мире» повести Быкова «Мертвым не больно» возникшие ранее у влиятельных лиц подозрения переросли в уверенность, что в пограничном белорусском городе формируется идейно чуждая и политически враждебная группа интеллигенции.

Однажды летним днем 1965 г. я изучал документы Гродненского областного архива. Неожиданно начальник архива сказал мне, что кое-кто во дворе хочет со мной переговорить. Там гражданин без особых примет предъявил удостоверение КГБ. Любопытно, чем мотивировалось обращение органов именно ко мне с предложением

---

1 Клейн Лев Самуилович (р. 1927) — археолог, доктор исторических наук, брат автора воспоминаний. Живет в Санкт-Петербурге. (*Тут і далей каментар аўтара ўспамнаў.)*

2 Очерк Карпюка «У хирурга».

стать секретным сотрудником. Во-первых, в пользу этого говорила успешная защита мною кандидатской диссертации. Далее, имелись рекомендации компетентных людей, что на меня можно положиться, как на человека с кругозором и ответственного. Такому, мол, и можно доверить изучение изнутри настроений интеллигенции в обстановке, когда враг не дремлет... — и т п. Выгоды же от сотрудничества для меня очевидны, — подчеркнул он. Для начала будет работа на месте, затем командировки по стране, а там, глядишь и за границу. Пойдет неплохо и научная карьера, с гарантией продвижения.

Тут считаю нужным сделать оговорку, что к работе органов безопасности я относился с пониманием. И вербовщика заверил, что если натолкнусь когда-нибудь на шпиона, то приду и выдам его. Но сверх того ничем полезен быть не смогу, ввиду полной профессиональной непригодности для подобных занятий. Он не пытался меня разубеждать и корректно распрощался, взяв однако обещание, что наша беседа разглашаться не будет. О подобного рода ситуациях, как известно, нередко рассказывается в воспоминаниях из тех лет. Но правду ли говорят мемуаристы, остается па их совести. Мне тоже не на что сослаться в подтверждение, кроме как на свою уверенность: не отыщутся в органах мои расписки или какие-либо иные обязательства, поскольку я их никому там не давал.

11о поведение мое все же было небезупречным, ибо в тот же вечер я пришел домой к Быкову и рассказал, что произошло. Василь заметил, что это вторая известная ему попытка организовать за ним слежку. Не знаю, он ли интересовал их, или Карпюк, или кто другой: мне объект наблюдения был назван обобщенно, — интеллигенция. Вот в ком нашли противника, это точно. Им, конечно, было виднее. [...]

Конечно, правда доходила и до нас, пусть с опозданием. Нельзя было отрицать, что в начале 1920-х эксперимент со введением коммунизма провалился, а советское общество распалось до такой степени, что люди начали есть людей. Ленинское окружение уже не стало выдумывать новые утопии, а во главе с вождем, ради спасения обратилось к проверенному веками способу: ввело свободу торговли. Отчего же, рассуждали мы, не вспомнить этот собственный, преподнесенный историей урок свободы? Если невозможно всем сразу, пусть начнут коренные реформы самые развитые. Конкретно шла речь о Чехословакии1, занимавшей перед войной одно из первых мест в Европе по производительности труда и уровню жизни.

1 В 1967 в чехословацкой компартии взяли верх сторонники «социализма с человеческим лицом», начавшие демонтаж советской модели общественно-

Но не буду скрывать, это был для нас с Алексеем только исходный пункт втом духовном процессе, который в обвинительных материалах назовут «идейным перерождением». Процесс был долгим и упрощать случившееся не стоит. Почему не осваивать западный опыт? Но никто ие проявлял желания что-то менять. Стена молчания... Это потом стало очевидно, что страстные дискуссии о будущем страны ведутся попусту. Бдительно охраняемая от идейных противников, на деле партийная идеология отмирала. Как в Москве, так и в республиках СССР задавали тон беспринципные чинуши, —та самая каста, которая пустила на ветер плоды военной победы народа. Это ей достались, в основном, трофеи, жизненные блага и привилегии. Пытаюсь вызвать из памяти вереницу сменявших друг друга послевоенных «хозяев» Гродненской области, — региона с более чем миллионным населением. Не лица, — безжизненные маски. Соответственно подбиралась и их челядь. [...]

Мы жадно следили за событиями в «соцлагере» и замечали, что центр событий как бы смещается к западу. Сторонники смены политического курса явно перехватывали инициативу. Правда, нажим из Москвы усиливался, но неясно было, решатся ли в Кремле на применение силы. А словам пражские «реформисты» не поддавались. Вот мы и внушали себе, что смелость, мол, города берет, и тем смельчакам в Праге, может, что-то и впредь позволят ...

Этот настрой будоражил, сводил вместе людей в неожиданных сочетаниях. Остался у меня в памяти скромный «пикник» на неманском берегу с участием Быкова, Каршока, московского критика В. Оскоцкого, поэта Н. Гилевича. Говорили много о чем, спорили, но без раздражения, старались нащупать общее. Встречались тогда в разном составе, и бывали с нами литераторы — поляки, иногда даже появлялись румыны, чехи.

20 июня 1969 г. Председатель КГБ СССР Ю. Андропов направил в ЦК КПСС письмо, с содержанием которого я познакомился много лет спустя, по опубликованным в российской прессе фрагментам1. Вот один из них: «Комитет государственной безопасности Белоруссии располагает данными о политически нездоровых настроениях белорусских писателей — члена КПСС Карпюка и Быкова». Второй фрагмент: «Каршок нелегально распространяет среди своих знакомых различные пасквили в виде книги Гинзбург-Аксеновой «Крутой мар-

---

политического устройства.

1 «Комсомольская правда», 16.02.1993 г. — Д. Бабич. Как «жучки» точили книги Быкова.

шрут» и другие. Отрицательно воздействует на молодежь...» Третий фрагмент: «В настоящее время к Быкову проявляют повышенный интерес идеологические центры противника...» Окончание андроповского письма было таким: «Комитетом госбезопасности Белоруссии с санкции ЦК Компартии республики готовятся мероприятия, направленные на разоблачение возможных враждебных акций со стороны названных лиц».

Этими «названными лицами» являлись Карпюк, Быков и автор этих строк, в то время доцент, Б. Клейн, упоминавшийся в том же письме в качестве «отъявленного антисоветчика и сиониста».

Выходит, наша участь, о чем мы еще не знали, а только догадывались, — с того момента была предрешенной. Но по-моему, «конструкция» заведенного дела выглядела не очень солидно. Относительно проще было изобличать меня как еврея, так как антисемитская кампания в стране велась довольно интенсивно. Но как объяснить общественности крамольные поступки известных белорусских писателей-фронтовиков, а уж тем более их переход на чуждые политические позиции? В Беларуси, считавшейся идеологически «здоровой» советской республикой, требовались какие-то веские доводы для обоснования репрессий против таких людей. Эти доводы искали в биографиях...

Я не занимался сбором о Карпюке «оправдательных» документов, просто знал в течение многих лет, как и чем он живет. Мне есть что сказать об этом действительно незаурядном, разносторонне одаренном человеке, который был моим другом. Его образ мне не нужно вызывать в памяти, он является, как будто мы расстались вчера. Такой же улыбчивый, доверчивый до наивности, импульсивный, — «большое дитя», — говорили о нем и так. Все это бросалось в глаза, но глубоко сидела в нем забота.

Действовала, если так можно ее назвать, «компонента» сознания, двигавшая Карпюка навстречу ситуациям, опасным и для него самого, и для близких. Я бы не стал причислять Алексея к разряду симпатичных, но взбалмошных борцов против «зла». Он знал, против чего восставал.

Но не думаю, что он был враждебен ко всему советскому. Сам от природы добрый, он хотел верить, что новая власть установлена была для блага его земляков. Радовался переменам, сулившим хорошее. Помнил, что воссоединение белорусов произошло в составе СССР.

Важно иметь в виду другое: он вошел в советскую действительность, зная по личному опыту и иной образ жизни. Не вина Алексея, если сравнение одних порядков с другими не раз приводило его к

горьким мыслям. А заморочить ему голову лозунгами было невозможно. Он не раз говорил о своей родне — православных крестьянах, белорусах не по одному лишь факгу рождения, а по осознанному культурному выбору.

Для него «западники» — это были те, кого не подкосила коллективизация 1930-х, кто сохранили участки собственной земли (отца Карпюка даже причислили за это к кулакам). Ущемленные во многом на отсталых «всходних кресах» Польши, они все-таки выбирали в Сейм собственных белорусских депутатов.1 Читатели свободной прессы, забастовщики, ставившие условия хозяевам предприятий, батраки, получавшие в сто раз больше тогдашних советских колхозников, верующие, у которых все же не отнимали пастырей, — могли ли они смириться с потерей элементарных жизненных благ в обмен на обещания, цена которых была крайне низка?

Алексей к тому же учился в Виленской гимназии, он провел юность в центре культурно-национальной жизни и общественных движений четырехмиллионного региона. Мы много говорили с ним на эти темы, и я твердо знаю, что он не был апологетом межвоенных польских порядков. Нов отличие от других, умалчивавших об этом, он не скрывал, что терпеть не мог тоталитарного строя. Ни в каких проявлениях и обличьях. То была в его глазах противоестественная система.

А как же с его принадлежностью к подполью Компартии Западной Беларуси?2 Это очень непростой вопрос. Подобно многим белорусам и многим евреям, Алексей примкнул к подполью, когда была запрещена стотысячная Громада3, когда на польских «кресах» резко сузились возможности легальной оппозиции реакционному, а отчасти профашистскому курсу правительства. Показателем перехода к этому курсу было и создание в 1934 г. возле Березы Картузской, — впервые в Польше,— концентрационного лагеря4, комендант которого обучен был в нацистской Германии. Я знал многих, кто там сидели, и изучил весь архив концлагеря, через который власти

1 На выборах 1922 и 1928 гг. в польский сейм был избран ряд депутатов, представлявших национальные интересы белорусов в Польше.

2 КПЗБ все время (1925-1938 гг.) действовала в Польше нелегально.

3 Белорусская крестьянско-рабочая Громада — массовая национально-освободительная организация, связанная с КПЗБ. В январе 1927 г. была распущена властями Польши, а ее руководители и многие члены были арестованы.

4 На 1 сентября 1939 г. в концлагере содержалось около 10 тысяч заключенных. Первый комендант лагеря Греффнер совершил поездку в Германию, чтобы перенять опыт гитлеровских концлагерей.

«прогоняли» актив левых партий и профсоюзов. Тогда нарастало ощущение, что страну зажимают в «клещи» между нацизмом и большевизмом, и все труднее было понять, где выход. Это одно, но важно и другое — какой была в действительности атмосфера того подполья.

Конечно, из СССР вместе с деньгами и инструкторами поступали в КПЗБ и обязательные идеологические догмы. Но они вряд ли уничтожили там полностью вольномыслие. С конца 1950-х, когда приоткрылись засекреченные архивы, через мои руки как исследователя прошли тысячи судебно-следственных дел польских властей против сторонников КПЗБ. В их числе и дела Карпюков, — отца[1] и сына, Алексея, который мог тогда и не дождаться своего пропуска в литературу. Как мог не стать народным поэтом Евгений Скурко, осужденный в Вильно в начале 1930-х к тюремному заключению по приговору, копию которого я ему передал в Минске тридцать лет спустя. А он, Максим Танк, потом подарил мне сборник своих стихов «Прайсці праз вернасць». Книга сейчас стоит у меня в США на полке, и в ней я читаю: «Пайсці мо ў краму і цвікі купіць, пілу з сякерай, ды перарабіць жыццё, каб зноў было магчыма жыць...»

А когда реабилитировать пожелали сталинизм, напоминаний о его преступлениях и жертвах рекомендовали не делать. О многом сокрытом от непосвященных я узнавал при встречах в Минске с Николаем Семеновичем Орехво[2], человеком необычайных способностей и трагических предчувствий, которые он имел и в отношении меня, когда я работал над кандидатской диссертацией. Во многом благодаря ему я смог разобраться в лабиринте подпольных входов и выходов, где неосторожных подстерегала дефензива, а с ней соревновалась агентура НКВД.

Как на первом этапе исследования, так и на втором, подготавливая докторскую диссертацию, я стремился к главному: увидеть в истинном свете и понять реальных людей, поставленных перед выбором: свобода или тюрьма, а порою и хуже того, — жизнь или смерть. Я подсчитал, что в межвоенном периоде в Западной Белоруссии по политическим мотивам было арестовано более 30 тысяч. Составленная мною уникальная картотека была основана на материалах 456 политических процессов, включая многотомные дела

---

1 Никифор Карпюк был арестован польскими властями вместе с сыном за «подрывную деятельность».

2 Орехво Николай Семенович (1902-1980) — один из создателей КПЗБ, историк и археограф.

Белорусской Громады, Змагання[1], ТБШ[2]. Возникал как бы социальный портрет политически активной части населения. Около 75 процентов обвиняемых составляли белорусы, примерно 20 процентов были евреями. Иногда попадались поляки, литовцы. Надо сказать, что судили не за идеологию «коммуны», а за принадлежность к организациям, считавшимся «подрывными», поскольку они добивались воссоединения Западной Белоруссии с БССР. Это все тоже наша история, которую никуда не денешь. Хорошо, что уходим от прежних критериев и оценок, но событий никому не дано изменить.

Считаю, что хоть отчасти выполнил свой моральный долг перед многими, обманутыми в лучших побуждениях, подставленными под удары и «чужих», и «своих». *Я* различал имена, но видел за архивными документами целые поколения, поднимавшиеся на этой прекрасной земле к достойной жизни. Вместо нее они обречены были провалиться в небытие. Насколько мог, я стремился показать прошлое, каким его видели уцелевшие, вышедшие из подполья, из тех или других тюрем. Мне удалось подготовить к печати сборник их воспоминаний. Вряд ли это получится еще раз, ведь почти никого из них уже нет на свете. *Я* познакомился в Слониме с одним из героев политических баталий конца 1920-х Павлом Крыньчиком[3], о судьбе которого знал по материалам дефензивы и судов. Последний оставшийся живым белорусский депутат сейма, он был настолько истощен физически и морально придавлен, что, по моему впечатлению, немного тронулся. Ни о чем толком не вспоминал, только невнятно бормотал: беда, мол, откуда столько шпионов? А те из бывших подпольщиков, кто не были посажены ни «первыми», ни «вторыми» Советами, кого и немецкие метлы не замели, даже напоминать о себе побаивались.

И вот с этой, близкой ему, но весьма подозрительной для власти средой Карпюк не только не порвал, но он даже с ней породнился. Его женой стала Инга Ольшевская, дочь одного из лидеров КПЗБ и Фейги

---

1 «Змаганне» — организация, созданная в 1928 г. группой белорусских депутатов польского сейма, близких к КПЗБ. Ее создатели были арестованы и осуждены.

2 ТБШ — Товарищество белорусской школы — белорусская культурно-просветительная организация, образовавшаяся в Польше в 1921 г. Впоследствии часть ее членов сблизилась с КПЗБ, за что подверглась преследованиям со стороны властей.

3 Крыньчык Павел — депутат польского сейма, один из руководителей «Змагання», осужденный на политическом процессе в Польше, а впоследствии,оказавшись в СССР, репрессированный как «враг народа».

Цигельницкой, видной подпольщицы еше реабилитированной тогда партии. 1

Не замечал, чтобы Алексея «груз прошлого» как-то тяготил или удерживал от «резких движений». Он вел себя по-хозяйски, а если кого критиковал, то не взирая на лица и чины. Шумную известность, даже за пределами СССР принесла Каршоку его обличительная речь на съезде белорусских писателей 1966 г. Этой речи ему не простили никогда, ее поставили в один ряд с «подрывной пропагандой» пражских интеллектуалов. Но нападки только подстегивали его, усиливали энергию творчества.

[...]

Мы сблизились, продолжая оставаться разными, и каждый вел свой образ жизни. Ничего нет обидного, если Быкова »уподоблю трудолюбивому кроту. Он не просто уходил, а исчезал, чтобы на много часов или даже дней осесть в своем домашнем укрытии, — какое тогда имел. Лишь бы было тихо, лишь бы никто не мешал сочинять. Не припомню, чтобы он показал свои черновики, вообще рукописи.

Карпюк предпочитал заниматься в Доме Элизы Ожешко, где отвели комнату для Гродненского отделения Союза писателей. Тут он печатал на машинке, раскладывая готовые страницы на столах. Отсюда мы отправлялись в «походы» по городским улицам. Алексей знал каждый закоулок. Таким его запомнили и полюбили многие: добрым странником, как будто подводившим итоги каждого дня.

А меня тянуло в окрестности. *Я* жил с ощущением, что чем больше вижу, тем меньше понимаю, что происходит вокруг. Конечно, я с волнением следил, как поднимается волнами, прибывает на смену уходящим новая, молодая жизнь. *Я* радовался ощутимому прогрессу, — кстати, неизбежному при каждом строе, желающем уцелеть.

Но ужасала психология советской элиты. Она вела себя так, как будто с нее началась история края. Она считала, что ничего не обязана восстанавливать и беречь, и избавлялась от наследия, как от брошенного, ненужного «чужого добра». [...]

Не было мира ни хижинам, ни дворцам. В начале шестидесятых не довелось нам с Каршоком отстоять бесценный заповедник, — часть улицы Ожешко, застроенную домами ремесленников, мастеров XVIII века. Тщетно мы протестовали, просили. Председатель Гродненского горисполкома Охрименко ответил командой: «Ускорить снос!» Один

1 В своей речи Карпюк резко критиковал поворот к сталинизму и затхлую атмосферу в духовной жизни страны.

домик, правда, временно оставили. Он и пережил самого Охрименко, который так запутался в каких-то махинациях, что застрелился. [...]

После попытки исключить Карпюка из партии (редакционный коллектив «Гродненской правды» не проголосовал за эту меру), его сняли с должности секретаря областного отделения Союза писателей. Положение Алексея ухудшилось настолько, что ему буквально не на что было жить. Мы с Быковым его поддерживали, как могли.

23 октября 1970 г. я обратился с письмом в его защиту к Союзу писателей Беларуси, на имя М. Танка, В письме было сказано, что Алексей Карпюк уже много месяцев бедствует, почти без средств к существованию, а ведь он — глава семьи, с тремя детьми и больной женой. Подходящей работы ему не дают. «Обстановка вынуждает, — говорилось далее, — покинуть Гродненщину, к которой он прирос корнями и вдали от которой вряд ли сможет сохранить творческую активность».

В моем архиве сохранился ответ, написанный собственноручно М. Танком 30 октября того же года. «Паважаны Барыс Самуілавіч! — писал Евгений Иванович. — Я доўгі час быў у камандзіроўцы і таму не змог прасачыць, як абстаіць справа з Карпюком. Перад гэтым Міку- ловіч 1 (тогда первый секретарь Гродненского обкома партии. — *Б. К.)* запэўніў мяне, што Абком падшукае для яго работу... Хаця зазначыў, што каля дваццаці пасад прапанавалі Карпюку, і ён ад іх адмовіўся... Па лініі Саюза пісьменнікаў усе сродкі дапамогі матэрыяльнай мы выкарысталі... Насчет «20 пасадаў», якобы подобранных в Гродно для Карпюка — выдумка, ничего подходящего они для него не искали, не к тому шло дело.

По телефону нам делались анонимные предупреждения: «уничтожайте самиздат!» На всякий случай Карпюк «утопил» некоторые рукописи, а я избавился от статей из чехословацкой прессы. Быков же мрачно шутил: «Не беспокойтесь понапрасну, если они придут, то все принесут с собой».

6 мая 1971 г. Бюро Гродненского горкома, как говорится, «поставило на мне крест». Обвинения предъявлены были мне достаточно тяжкие, как следует из постановления Бюро: «Он (Клейн) подчеркивал необходимость борьбы против «сталинистов», против правящей группировки, которая как будто стремится возвратить старые сталинские методы, утверждал, что якобы в партии

1 Микулович Иван Федорович, возглавляя Гродненский обком КПБ, санкционировал в это время подготовку дела по исключению Карпюка из партии и привлечению его к уголовной ответственности.

образовались два крыла: «сталинистов-догматиков» и демократическое крыло творческой интеллигенции».

Действительно, с последним и отождествляли себя мы с Карпюком, то есть поступали так, как будто уже выделилось социал-демократичес- кое течение, и нам дозволено было безнаказанно к нему принадлежать. Нечто подобное происходило тогда в Польше и Чехословакии, где оппозиционные силы прирастали «снизу», спонтанно увеличиваясь за счет примыкавших к ним групп. Но это не у нас.

Так думали мы с Карпюком, но Быков, надо заметить, не верил ни в какие «крылья» партии, говорил, что все одним миром мазаны, а если можно иметь дело, то лишь с отдельными людьми.

Позже оба, Василь и Алексей, написали в воспоминаниях, что мы искали общую линию поведения и пытались построить какую-то самозащиту. Верно, мы пытались, только возможностей отпора у нас почти не было.

Хуже того,— помнится, осенью 1971 г. Василь, до этого часто навещавший меня дома, поделился невеселой новостью: из КГБ ему конфиденциально посоветовали не поддерживать контакта с Клейном. Иначе, мол, того, совместно с Карпюком, подведут под статью о групповой антисоветчине. А наказание за это положено более суровое. Я ответил, что понимаю его положение: ничего иного и не остается. Мы простились с тяжелым чувством и разошлись в разные стороны. С этого момента наши встречи стали как бы случайными, разговаривать на людях мы избегали. Только и выпадало мне, что отвести душу с Алексеем, пока его самого не приперли к стене.

После увольнения с преподавательской работы я долго ходил без места. Потом меня «направили» на городскую овощную базу, предупредив, что никуда больше в городе не возьмут. Редакциям как будто не отдавали формального приказа меня не печатать — они сами знали, как поступать в этих ситуациях. Случайно я узнал, как в журнале «Полымя» обсуждали участь одной моей небольшой статьи. Сотрудники редакции приготовились было изъять ее из набора. Дело дошло до Максима Танка, и тот, якобы, с сарказмом отозвался: «Ен жа яшчэ не арыштаваны, а вы ўжо ... у штаны». Материал опубликовали, — хоть какая-то радость, но было видно, что ничего к лучшему не изменилось, скорее, наоборот.

Мы с Алексеем рассуждали примерно так. Исключать или не исключать кого-то из партии или из другой организации — это их дело. А вот лишение ученой степени и звания за неугодные кому-то взгляды — это вообще выходит за рамки цивилизованности. В каком-

то смысле это даже подлее, чем бросить в концлагерь, потому что ученому как бы оставляют свободу, только духовно кастрируют. И я сказал, что на рожон не полезу, но никогда в своей жизни не смирюсь с таким наглым варварством. Для меня теперь главное — заставить их вернуть отобранное.

Так оно и вышло, им пришлось вернуть мне все: через восемь лет. [...]

— Зачем вы вмешиваетесь? — спросил я у секретаря Гродненского обкома КПСС Григория Фомичева, — ведь я не лишен свободы, даже не давал подписки о невыезде. А поскольку все у меня уже отняли, значит, я вам здесь больше не нужен.

— Нет, вы нужны, — возразил тот, и я навсегда запомнил его слова. — Вы будете маячить на гродненских улицах, как тень. Чтобы все видели, какая судьба ожидает того, кто пойдет против нас.

А время работало против нас. Снова взялись за Алексея, — «план мероприятий» осуществлялся поэтапно. В июне 1972 г. Карпюк был решением бюро Гродненского горкома тоже исключен из партии, — но что примечательно, по обвинениям, совершенно не совпадавшим с предъявленными мне и непохожим на те, которыми шельмовали Быкова в печати. Против Карпюка же создали целое дело, распухшее от бумаг, якобы доказывавших, что в годы войны он не руководил партизанским отрядом, а его завербовали немцы, и он по их заданиям шпионил, внедрил в советскую разведгруппу агента гестапо и т. п.

Когда мы узнали про эти обвинения, то, как верно пишет Василь, версию о предательстве нашего друга не приняли. Сомнительными выглядели улики против него, и понятно было, что многое он без особого труда опровергнет. Кроме одного. Ему предъявили фотокопию страницы из немецкой финансовой ведомости концлагеря Штутгоф. И выходило по ней, что заключенный А. Карпюк трижды получал в лагере по 20 немецких марок, и каждый раз ставил в ведомости свою подпись. Алексей не оспаривал, подпись, похоже, была его, но только он не мог объяснить, откуда она там взялась. Этим то дело и осложнялось.

Когда Быков попытался замолвить слово в его защиту Кузьмину, то секретарь ЦК ответил: «Главное, там роспись за марки. А уж немцы зря денег не платили».

Я знал основных действующих лиц этой постановки, приближавшейся как будто к своему финалу. И прокурора Гродненской области Волоха, порядочного человека, который, изучив поступившие на Карпюка материалы, увидел, что тому грозит не

менее 15 лет тюрьмы, и, по слухам, выразил обкому партии сомнение в обоснованности некоторых улик. И первого секретаря обкома Микуловича, причинившего нам столько зла, сколько обязан был и мог по своей должности, но будто бы распорядившегося отправить дело Карпюка на «доследование». По крайней мере, в этом он много позднее уверял людей «за чаркой», хотя Василь отнесся к его признаниям скептически.

Знал я и польского журналиста Олека Омильяновича[1], относительно которого мы по телефону получали анонимные предупреждения, что этот человек «подослан» спецслужбой, только не уточняли, какой: нашей или польской. Но именно он проник в Польше в архив бывшего концлагеря Штутгоф, и там нашел подлинник той злосчастной немецкой ведомости, — оказывается, реестра денежных переводов заключенным от их родственников. Эту-то специфику документа намеренно утаил дознаватель, изготовивший фотокопию без заголовка, чтобы создать видимость, будто немцы платили Карпюку за тайное пособничество.

Но на эти розыски уходило много времени, а Карпюка в любой день могли забрать. Был момент, когда Быков поверил, что Алексея наверняка посадят. И, по словам последнего, вывел такой итог: «Сидел ты в польской тюрьме, в немецкой, теперь упекут тебя в нашу. Обложили тебя со всех сторон». Даже договаривался Василь с московскими друзьями-писателями, чтобы спрятать Карпюка на время в психбольницу и хотя бы таким способом, через знакомых врачей, раздобыть ему «охранную грамоту». На это, правда, Каршок не пошел, хотя, по его же воспоминаниям, был близок к самоубийству. Это довольно необычный вариант «игры с психушкой», потому что па практике опасность оказаться гам исходила от властей, и мне самому доводилось взвешивать такую вероятность.

Знали высокие начальники, что затея с немецкой ведомостью подстроена, или не знали — или, хотя и знали, но делали вид, что Карпюк виновен полностью, —до сих пор неясно. Так или иначе, подана была установка на полную дезинформацию общественного мнения. Без публикаций в печати, силами спецдокладчиков, лекторов и агитаторов населению давали понять, что замаскированная шайка раскрыта, а ее преступная деятельность пресечена. В передаче тех, кто лично слышали официальные разъяснения, суть дела преподносилась так. Изменник Родины Карпюк и сионист Клейн

---

1 Омильянович Олек жил в Белостоке. В годы войны он партизанил вместе с А. Карпюком.

сумели обработать примкнувшего к ним Быкова, использовали его известность, чтобы очернять нашу армию и советскую действительность. Им платили за это деньгами ЦРУ (иногда фигурировали иные, экзотические источники финансирования группы, например, тайно «раскопанное» Клейном золото его отца). Так что юмор в этом деле тоже присутствовал. Но не преобладал.

Не вижу нужды доказывать, что именно Быков являлся лидером нашей группы. А те, кто игнорировали этот факт, притворялись. На деле они знали, кто есть кто. Не то лишь значимо, что ему поступала из Москвы почти вся литература «самиздата», которую затем распределял Карпюк, а собрав ее у пользователей, возвращал рукописи Василю. Иногда, правда, Алексей и сам кое-что добывал из Польши. Главное, почему мы убереглись от распада. Мы ощущали авторитет Быкова как писателя и испытывали влияние его мощной, доминирующей над обстоятельствами натуры. И не нужно забывать о главных его качествах, подменяя их правильным, но в сущности вторичным перечислением его добродетелей: терпимости, такта, уважения к чужому мнению и проч.

В апреле 1973 дело Карпюка рассматривалось на Бюро ЦК КПБ, и там долгое обсуждение завершилось не совсем банальным голосованием: двое были за исключение[1], двое — против (Кузьмин и Аксенов), а П.М. Машеров воздержался, вследствие чего решение и состоялось в пользу Карпюка (ограничились строгим выговором). Не составляет труда увидеть логику противоборства и оценить значение его исхода. Ведь при тех условиях оставить в партии значило и сохранить человеку свободу. Ибо не мог же коммунист одновременно числиться и в «гитлеровских прислужниках». Но если так поступили с одним из нас, то, выходит, в положении других тоже не предвиделось ухудшения.

За неимением достоверных сведений, не берусь судить, как и почему там, наверху подыскали адекватную форму разрешения весьма щекотливого дела. С таким расчетом, чтобы не угробить Карпюка, но вместе с тем, и не создать представления, что он получил «отпущение грехов». Конечно, не получил, — но все же ему дали передышку. Или он ее себе взял. Но не затем, чтобы «перестроиться» и порвать с прежним. Он был человеком упорным и верил, что еще дождется своего времени.

Мы все не теряли этой надежды.

---

1 Члены Бюро ЦК КПБ В. Ф. Мицкевич и А. В. Дебалюк.

Что скрывать, мы с Карпюком приняли перестройку хорошо и даже пытались соучаствовать в ней. Да и Быкову, перебравшемуся в Минск, вроде бы нравились некоторые горбачевские инициативы. Вдруг что- нибудь из них получится, — чем черт не шутит?

И черт пошутил.

Если память не изменяет, в 1987 г. нам с Алексеем пришло в голову нанести официальный визит недавно поставленному во главе Гродненского горкома партии секретарю-«перестройщику» Алешину (где его подобрали на эту роль, не знаю). Словно и не было прежде грозных вызовов в это самое учреждение, многочасовых кабинетных дознаний, беспощадных «оргвыводов»... Великое дело: вера. Или, скорее, доверчивость.

Приняли нас радушно: не как злодеев, «отмотавших» свои сроки, а как равноправных партнеров по общему делу. Будем, — говорил Алешин, — вместе вытаскивать страну из застойного болота. Такая увертюра обнадеживала, и мы достали свои бумажки. Алексей немало потрудился над писательскими предложениями. Мне же, теперь доценту университета, выпала честь говорить как бы от имени ученых. Итак, одни излагали, другие записывали.

Карпюк начал дипломатично: бесспорно, в системе народного образования наломано немало дров, но есть и успехи. Только положение с белорусским языком дальше терпеть невозможно. Приезжие люди вообще не разбираются, какая это республика. Если белорусская, то почему почти нет школ на родном языке, надписей, документов, как будто его запретили. Кому этот язык мешает жить?

Встреча имела продолжение. Атмосфера вроде не ухудшилась, но настораживало, что хозяева только и делали, что записывали за нами. Своего мнения не высказывали. Карпюк, улучив момент, шепнул мне: «Понесут все наверх».

Как бы для разрядки, я попросил объяснить один парадокс в общественном питании. На Советской улице была неплохая государственная столовая. Ее преобразовали в кооперативную, после чего обслуживание не стало лучше, зато цены подскочили в несколько раз. У людей возникает вопрос: есть ли смысл плодить кооперативы, которые не расширяют, а сужают и удорожают услуги? Кому это нужно, и к чему приведет?

Но церемонность наскучила Карпюку, и он обострил ситуацию.

Зачем, спросил Алексей, у вас на стене в Горкоме висит все тот же иконостас с портретами старых коммунистов? Эти ветераны сталинщины выедали нам печенки на парткомиссиях. Пора уже снять

их и повесить что-нибудь другое, тогда поверят, что и у вас пошла перестройка.

На этом терпение начальства лопнуло. Поднявшийся из-за стола Алешин дал понять, что все ясно.

Недели через две я позвонил, чтобы узнать, какой все-таки итог. Некий инструктор объяснил, что изучать общественное мнение в горкоме намерены, но заниматься этим будут люди под руководством секретаря по идеологии. Они проконсультируются у меня, — в случае надобности.

Портреты заслуженных членов парткомиссий остались висеть на прежних местах. Для Алексея это был урок: перестройку всерьез не берут. Все делается с расчетом па проволочки. Только проболтают, ничего не меняя, пока в Кремле не угомонятся и не дадут команды: пошли назад. Этот довод звучал убедительно. Провал антиалкогольной кампании говорил за себя, ее просто высмеяли.

Мне не хотелось бы создавать впечатление, что мы там, в гродненской провинции, были проницательнее других. Нам тоже не удавалось понять, что же происходит. А будущее Беларуси окутано было более плотным туманом, местами и ядовитым.

К тому же группа наша с отъездом Быкова была уже не той. Но и тут все не просто. Василь живет в Минске, занят своими разнообразными делами, — но в какой-то момент, когда требуется его соучастие, защита от напасти, он с нами. Звонит, передает что-нибудь через людей, поддерживает через печать... Тому подтверждение — статья на целую полосу в «Литературной газете» по поводу новых гонений на Карпюка, начатых в 1989 г. На этот раз он вызвал их своими правдивыми воспоминаниям о коллективизации в Западной Беларуси. В ответ минский журнал «Политический собеседник» вытащил и пустил против Алексея те самые, давние обвинения.

«Создается вполне обоснованное впечатление, — говорилось в статье Быкова, — что собранный когда-то «компромат» вне зависимости от его достоверности тщательно приберегается «про запас», чтобы в нужный момент запустить его в дело. Как это явствует из истории с Карпюком, момент этот определяется не КГБ и не правоохранительными органами... Горком, обком, ЦК партии включают условный сигнал расправы, который тут же принимается к исполнению карательными органами».

В статье подробно рассказывалось о деле, созданном против нашей группы в начале семидесятых, когда молчал «задавленный страхом город», и неоткуда было ждать защиты ни Карпюку, ни

Клейну. Может, и не стоило бы ворошить малорадостное прошлое. Но под бурные дебаты о перестройке и плюрализме мнений, не утихающие в столицах, провинция продолжает жить однажды и давно заведенным образом. Все это, предупреждал автор, чревато многими последствиями даже для нашего перестроечного времени. Пророческие слова.

«Конечно, — писал Быков в заключительной части своей статьи, — мы слышим с детства, что сила добра одолевает злобные силы и правда в конце концов торжествует. К сожалению, человеческая жизнь не беспредельна, и как быть, если самая большая ее часть, самая активная и трудоспособная часть отравлена злом и несправедливостью? В апреле Алексею Никифоровичу Карпюку исполняется семьдесят лет...»

У Алексея была природная особенность: он, если так можно определить, любил национальность в человеке. Естественно, всех ближе, роднес для него был настоящий, «шчыры» белорус. Но он, как я не раз видел, радовался, если мог сказать о собеседнике: «Oto prawdziwy Polak» («Вот настоящий поляк»). Беседу с интеллигентным евреем он ценил, но, говоря откровенно, больше его привлекала какая-нибудь местечковая личность: с характерной еврейской внешностью, с явным акцептом. Карпюку отвечали взаимной симпатией: с ним не нужно было притворяться.

Отсюда и его мечта, чтобы люди не стеснялись говорить па своих языках. Он не верил, что это поведет к разобщенности, — напротив, считал он, чем больше свободы слова, тем меньше причин для конфликтов. В общем, не зная этого термина, он придерживался американской концепции «diversity» («разнообразия»). Но здесь, в США, столько перекосов в этой сфере, что былой увлеченности идеей не ощущается.

По поводу очередных выборов, не помню, в какой орган, у нас с Алексеем зашла речь, что вроде бы в стране стало посвободнее, чем прежде. А наши люди сторонятся политики, по усвоенному с незапамятных времен, горькому опыту: свяжешься — не расплатишься. Мода на партии сюда еще не дошла, но, размышлял Карпюк, может пора создавать национальные объединения, их как будто терпят. Зачем? А затем, что когда-то надо же возвращаться в цивилизованную жизнь. Тут было много организаций, групп, различных движений, их запретили, разогнали, — от этого стало лучше? Попробуем начать с поляков.

Как историк, я отчетливо представлял себе глубину польской национальной традиции. Ведь больше ста пятидесяти лет они держались без собственного государства, под чужеземным гнетом, на этих своих чувствах, религии. Но то в Польше, а какая здесь обстановка? Католичество под подозрением. Старой польской интеллигенции нет, а новая еще формируется. Не забыты и сталинские депортации.

— Польша своим поможет, — говорил Карпюк, — само собой. А если у них выйдет, то и для белорусов будет лучше. Им нужен пример, чтобы зашевелиться.

Надеюсь, меня поймут правильно. *Я* не ручаюсь за точность каждого слова, однако смысл той нашей беседы и последующих на эту тему был именно таков. Что же до попыток представить дело иначе, то они были, и возможно, еще будут, но от этого реальность не станет иной. А она ведь не сводилась к планам. Совершались действия, которые имели последствия.

29 апреля 1987 г. Карпюк направил письмо М. С. Горбачеву, тогда генсеку КПСС, о дискриминации поляков в Беларуси (его фрагменты привожу в обратном переводе с имеющегося у меня польского текста). Мой друг писал: «Жизнь так меня сформировала, что поляки не имеют от меня секретов, что часто наши сердца бьются в унисон». В Беларуси, — напоминал он, — живет свыше 400 тысяч поляков. Они не имеют ничего из тех возможностей, которые предоставлены 180 тысячам белорусов в Польше: национальные школы, лицеи, кафедра в университете, издательства, газеты, фольклорные коллективы и т. п. Запрещена даже польская вывеска (есть лишь на белорусском и русском языках) на Доме-музее Элизы Ожешко в центре Гродно. ... Вообще эту тему у нас до сих пор считают «табу».То, что наши власти не замечают значительного числа поляков в БССР, упорный отказ от разрешения их национальных проблем — в наше время непростительно... Свое обращение я не адресую нашему руководству только потому, что мы, как бы там ни было, в провинции, а результаты перестройки, происходящей в стране, тут ощущаются еще слабо. По крайней мере, в духовной области. У меня такое впечатление, что у наших отдельных влиятельных особ еще доминирует принцип — держать, не пускать, не разрешать, подозревать и ничего не менять».

По истечении некоторого срока ему позвонил работник Гродненского обкома партии и сообщил, что проблему, поднятую им в письме М. Горбачеву, тщательно изучили в обкоме. Ее не существует, поскольку наши поляки никуда не обращались с просьбами обучать их детей на польском языке.

Этот ответ Алексей процитировал во втором письме М. Горбачеву, присовокупив такие комментарии. Корабль «Адмирал Нахимов» затонул не только из-за халатности капитанов, которых теперь судят. Он пошел ко дну также вследствие того, что полностью устарел и прогнил. Но на суде представители «Морского регистра СССР» оправдывались ссылкой: «Мы не имеем с этим ничего общего, ведь команда корабля не предъявляла никаких жалоб».

Затем автор письма генсеку пересказал анекдот, популярный в межвоенной Польше. Нерадивая служанка готовилась купать панских детей, но измеряла температуру воды не с помощью термометра, а следующим способом: просто ставила ребенка в ванну. Если он визжал, это означало, что вода слишком горячая. Тогда служанка доливала воды похолодней.

Письмо Карпюка, хотя и выглядело местами забавным, имело серьезный смысл и подтекст. Оно предупреждало Кремль, что нельзя доводить дело до появления новой «горячей точки» на карте все новых этнических конфликтов, а Беларусь, где национальной розни пока нет, необходимо оберегать от нее. Но нетрудно было догадаться, что второе обращение, скорее всего, постигнет участь первого. Поэтому я не удивился, когда Алексей, с присущей ему категоричностью, отдал неожиданное распоряжение:

— Собирайся, едем в Сапоцкино.

Поездка намечалась в близлежащий районный центр, где компактно проживали поляки. Дорога заняла минут сорок, на окраине местечка друг попросил меня остановить машину и определил диспозицию:

— Значит, так. Ты, как еврей, в дом ксендза ходить не должен — оставайся здесь. А я, как белорусский писатель, могу встречаться с каждым.

Вернувшись часа через два, Алексей поведал, что договоренность с ксендзом достигнута. Тот обойдет верующих и даст им понять, что бояться не нужно. Пусть посылают в Гродно и в Минск письма с просьбами открыть обучение детей на польском языке.

Аналогичные письма поступили «наверх» и из ряда других районов. Это обнадежило группу активистов польского просвещения, принявших свои меры. В 1988 г. возникло Культурно-просветительное общество имени А. Мицкевича, на основе которого в 1990 г. был создай Союз поляков Беларуси.

В Гродно до этого, с 1986 г. существовал культурно-исторический клуб «Паходня», ставший трибуной главным образом белорусской интеллигенции. Начал этот клуб с небольшого ядра, а

приток членов его совпал с ростом польского объединения, и постепенно к ним присоединялась масса сторонников. Не припомню, чтобы между «Паходней» и Союзом поляков были какие-нибудь трения, тогда казалось, что места хватит всем, а дело общее. Не знаю, как это выглядит сейчас. Мы с Алексеем помогали тем и другим.

Ключевую роль сыграл Карпюк и в образовании в 1988 году Гродненского еврейского культурно-просветительного общества. Он был почетным гостем на организационном собрании этого Общества, членов которого ему пришлось немало уговаривать: собирайтесь вместе, вас никто не обидит. Ему-то люди поверили. Но исподволь многие тогда готовились к эмиграции: не видели впереди просвета и сомневались в будущем для своих детей, когда все ближе подступал общественный развал.

[...]

28 февраля 1989 г. в Народный суд Ленинского района г. Гродно было подано коллективное заявление с просьбой привлечь к уголовной ответственности за клевету гр-на Мендарева П. А. Парадокс в том, что Петр Андреевич еще недавно был первым секретарем Гродненского горкома партии.

Поводом к судебному разбирательству стала полученная мной информация. Вот ее текст, сохранившийся у меня: «16 февраля 1989 г. в Доме Политпросвещения на курсах повышения квалификации партийных, советских и идеологических работников Гродненского обкома КПБ выступил с лекцией «Партийная принципиальность, критика и самокритика, чувство ответственности» председатель комиссии партийного контроля при обкоме КПБ П. А. Мендарев. На втором часу лекции он заявил, что в руководстве культурно-исторического клуба «Паходня» имеются изменники Родины. Последовал вопрос лектору (П. А. Мендареву) от слушателя курсов Н. Н. Маркевича[1]: «Назовите конкретно, кого Вы имеете в виду»? П. А. Мендарев назвал фамилию: «Вот, пожалуйста Вам, Карпюк». А дальше были названы фамилии Б. С. Клейна и М. А. Ткачева[2].

Таков был документ, переданный нам и удостоверенный подписями пятерых слушателей тех самых курсов. Судьбы поставивших свои подписи молодых людей мне теперь неизвестны, —

---

1 Маркевич Николай Николаевич, в ту пору корреспондент газеты «Гродненская правда».

2 Ткачев Михаил Александрович — белорусский общественный деятель и ученый. Доктор исторических наук, профессор, преподавал в ГрГУ, затем работал зав. редакцией в «Энциклопедии истории Беларуси».

кроме одной. Ее знают и за пределами Беларуси — судьба Николая Маркевича.

Возвращаясь к событиям 1989 года, я должен сказать, что наше обращение к правосудию не было продиктовано мелочной обидчивостью. Мало ли что говорят за спиной? Но тут другое: нас открыто подводили под тюрьму. Отсюда и решимость не прощать обиды, общая для Карпюка, Ткачева и меня.

Заявление в суд было нами написано по всей форме: «Гр-н Мендарев вкладывал в свои высказывания политическое содержание, стремясь опорочить наше гражданское достоинство... Не остается сомнений, что Мендарев публично оклеветал нас». Со ссылкой на статью Уголовного кодекса БССР, мы просили привлечь его к уголовной ответственности.

16 марта 1989 г. судья Ленинского района города Гродно Л. К. Карих вынесла «определение», копии которого были вручены каждому из нас троих. В судебном документе говорилось, что в данном случае надлежит применить не часть 1, а часть 111 статьи 128 кодекса, поскольку гр-н Мендарев не просто оклеветал заявителей, он обвинил их в совершении особо опасного государственного преступления (измена Родине). А по делам о такого рода клевете должно обязательно производиться расследование прокуратуры. Посему, руководствуясь статьей такой-то, судья направила дело в прокуратуру Ленинского района. Вместо нее отозвалась областная прокуратура, куда мы, — Карпюк, я и Ткачев, — были вызваны на собеседование. Проводил его, —не знаю, где он теперь, — зам. прокурора Гродненской области А. И. Абрамович. Рассуждения его клонились к тому, что наши обвинения голословны.

— А как насчет письменного подтверждения пяти журналистов? — возражал Карпюк. — Разве этого недостаточно для возбуждения дела?

Прокурор парировал:

— Допустим, за вас выступят те газетчики. А другая сторона выставит вдвое больше: десять секретарей парторганизаций уже поручились за Мендарева, что он ничего подобного не говорил. Кому верить?

— Тому кто свой, — сказал Алексей.

Я попросил хозяина кабинета:

— Вы все-таки дайте письменный ответ.

И он дал, но почему-то мне одному, как будто догадываясь, что у меня бумага не пропадет. Мне кажется нелишним процитировать резюме из нее: «Ввиду того, что Мендаревым П. А. не было распростра-

нено в отношении Вас заведомо ложных измышлений, соединенных с обвинением в совершении особо опасных государственных преступлений, оснований к привлечению его к уголовной ответственности не имеется».

Ткачев высказал мнение, что мы не имеем права промолчать, — хотя бы из уважения к тем ребятам, которые инициировали дело против клеветника. Они пошли на риск.

Московская «Неделя» опубликовала мою статью «Группа», перепечатанную затем в Минске газетой «Знамя юности». В этой статье я рассказал и о «предыстории», — событиях конца шестидесятых, с последующим продолжением, — и о новых нападках республиканской печати на Быкова и Карпюка, об угрожающих попытках состряпать в Гродно уголовное дело против творческой интеллигенции, при полной беспринципности правосудия. Там у них, выходит, нет разницы во времени. «Вот о чем стоит подумать тем, кто «устал» от уроков прошлого».

Мы и сами ощущали усталость. Сколько можно было жить, таясь по углам, остерегаясь доносчиков, подвергаясь нападкам касты, цеплявшейся за власть и привилегии, и всех тех, кто делали ставку на ее монополию? У нас, наконец, появилась возможность протестовать в печати. Не считаю нужным следовать примеру тех, кто благодарит за эту возможность кого-то. Стоит ли бить поклоны? Мы получили жалкие крохи того, что причиталось народам, «умытым кровью»

Парадокс и трагизм истории в том, что независимость раздали, как векселя после полного банкротства, не обеспеченные ничем. Провозгласили то, за что еще требовалось бороться годами, и даже отдавать жизни, а иначе вообще не устоит независимое государство белорусов и тех, кто вместе с ними.

Может ли быть большая радость для некогда «запрещенного человека», чем хоть раз увидеть осуществление, — пусть отчасти, своих заветных замыслов? Мне дано было дождаться такого момента, — счастливого мгновения, сказал бы старинный поэт.

*Вольга ІПАТАВА*

## У СПАМІНЫ ПРА АЛЯКСЕЯ КАРПЮКА

Аляксей Карпюк — чалавек, які адыграў вялікую ролю ў маім жыцці... З чаго пачынаць успаміны пра яго? Канешне, з тага часу, калі ён, прачытаўшы мае першыя спробы пяра ў «Гродненской правде», прынесеныя Міхасю Васільку, выклікаў мяне на вуліцу

Ажэшкі, дзе месцілася абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Ісці давялося зусім недалёка: каб гіатрапіць да пісьменнікаў, трэба было толькі перайсці мост, бо дзіцячы дом № 1, дзе я тады жыла, зна- ходзіўся якраз пасупраць дому Элізы Ажэшкі — так што ўзімку можна было проста скаціцца з гары і, пераскочыўшы праз раку Гараднічанку, якую дзетдомаўцы называлі Вашочкай, ускараскацца якраз да аддзялення, якое дзялілася гэтым пісьменніцкім дамком яшчэ і з бібліятэкай.

Нядаўна ў нас адабралі гэтыя два пакоі — і неверагодным здаецца пе сам факт вытурвання пісьменнікаў з дома, дзе яны некалькі дзеся- цігоддзяў запар ладзілі розныя сустрэчы, імпрэзы, дзе пачувалі сябе часам лепей, чыму сваім жытле... Неверагодным мне здаецца тое, што ТАМ ужо няма таго духу вольнасці, роўнасці, разняволення, якое дало мне сілы выкараскацца з савецкага духу рабства і які цяпер усе часцей называюць аўрай. А можа, варта было б застацца адной ў тых пакоях, і я зноў адчула б яе, тую непаўторную аўру, якую ствараў менавіта ён, Аляксей Пічыпаравіч?!

Я памятаю сваё першае ўражанне ад яго магутнай посгаці, ад тых камандзірскіх інтанацый, з якімі ён адразу ж пачаў гаварыць з пягнац- цацігадовай дзяўчынкай, быццам убіваючы мне ў галаву:

— Пішаш нядрэнна, Оля. Але каб стаць пісьменніцай, трэба многа, вельмі многа працаваць!

Божа мой, якой там піеьменніцай! Я накрэмзала колькі там вершы- каў, слепа падпарадкоўваючыся уладнай сіле творчасці, але крэмзала іх хутчэй бяздумна, і тым болей не будавала ніякіх там планаў на будучае!

— Мы табе дапаможам. Ці ўмееш ты выступаць?

Я збянтэжана прачытала вершык.

— Добра! Інтанацый у цябе не хапае, але гэта можна паправіць. Значыць, я пагавару наконт цябе «наверсе». Ідзі! Не, пачакай!

Ён затрымаў мяне, каб уціснуць у далонь колькі шакаладных цукерак. Я слаба паспрабавала пярэчыць — але хто мог запярэчыць Карпюку!

У чым заключалася таямнічае абяцанне «пагаварыць наверсе», я зразумела праз які тыдзень, калі пакутліва сядзела на ўроку алгебры і спрабавала зразумець нейкае ўраўненне. Шырока расчыніліся дзве- ры, Карпюк узнік на парозе і, паклікаўшы настаўніцу, нешта коратка растлумачыў ёй, а пасля скамандаваў:

— Оля, на выхад!

Выхад» той быў паездкай у Сапоцкіна, у школу, на выступленне. У «газіку» ехалі Васіль Быкаў і Данута Бічэль. Я прачытала ў школе свае вершыкі, і назад мы ехалі ўжо як бы «камандай». Мяне нават падвезлі да самага дзетдому, дзе ніхто не зрабіў мне аніякай заўвагі за доўгую адсутнасць.

Колькі такіх паездак было пасля! Карпюк умеў і любіў іх арганізоўваць. І самымі яркімі старонкамі маіх школьных успамінаў застануцца якраз тыя хвіліны, калі на сумным уроку расчыняліся дзверы, і Карпюк дзелавіта, амаль адразу павярнуўшыся назад і спяшаючыся, камандаваў:

— Оля, на выхад!

А я амаль бегла за ім і радавалася, што не буду ісці ў сталовую пад піянерскія спевы і «речёвку», што змагу пасля прыезду не адразу кіравацца ў дзетдом, а трохі пастаяць пад ліпамі ля Гараднічанкі, пагля- дзець, як ліхтары адбіваюцца ў чорнай вільгаці маленькай рэчкі і ад- чуць, як салодка пахне ладанам з адкрытых дзвярэй царквы, якая была у двух кроках ад доміка Ажэшкі і педінстытута імя Янкі Купалы.

Пасля выгіускнога вечара Карпюк званком зноў выклікаў мяне ў аддзяленне.

— Куды збіраешся паступаць? — запы гаўся коратка.

— У тэатральны.

— У тэатральны. Значыць, хочаш быць актрысай?

— Хачу! — сказала я горда.

Ён прайшоўся па пакойчыку. Засмяяўся:

— Хочаш нябось іграць Джульет і «Бяспрыданніц»?

— А што тут такога?!

— А будзеш іграць чарапашак Тарціл! Ды ты паглядзі на сябе. Ты ж маленькая, трапіш пасля толькі ў Тэатр юнага гледача! А ты пішаш вершы! Вершы!

Я назаўсёды ўдзячная Аляксею Нічыпаравічу, што ён выбіў з маёй галавы гэтую мару ўсіх правінцыйных Папялушак — быць актрысай. Пісьменнік сам стварае свой свет, і ён у ім уладар. А ў тэатры ўла- дар — рэжысёр. Ды і здольнасці мае да тэатру нават у самым звычай- ным жыцці, як я не раз пераконвалася — надта ж пасрэдныя...

У тым жа 1961 годзе я паступіла на рускае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага універсітэту. Мне было шаснаццаць гадоў, і разам з Рыгорам Семашкевічам мы былі самымі маладымі студэнтамі БДУ.

На дзённым аддзяленні я вытрымала толькі два з паловай курсы. Было надта цяжка без аніякай дапамогі, я два разы губляла прытом- насць, калі збірала грошы з маленькай сваёй стыпендыі на жаданыя пантофлікі, якія, зрэшты, так і не купіла. Таму ў 1963 годзе я перайшла на завочнае аддзяленне і пераехала ў Віцебск, да цёткі Зіны. Як ні ха- целася мне ў Гродна, але ж там не было дзе нават спыніцца. Дзетдом назад не прымаў, тым болей што яго расфарміравалі ў школу-інтэрнат і перавялі за Неман, а ў нашым былым будынку размясцілі турысцкі клуб.

З Карпюком я пабачылася голькі ў 1965 годзе, калі ён наведаў Віцебск.

— Дурніца, што не напісала мне! Я б нешта прыдумаў! — былі ледзь не першыя ягоныя еловы.

— А што вы можаце прыдумаць? Я і ў Віцебеку ледзь прапісалася...

— О-о-о, ды ты стала песімісткай! Калі хочаш у Гродна, кажы!

— Канешне, хачу!

— То чакай!

Я загарэлася надзеяй. Ужо ведала — Карпюк проста так не кідае абяцанкаў. І праўда—месяцы праз тры ён мне патэлефанаваў:

— На лета я знайшоў табе працу ў лагеры, будзеш піянерважатай, а восенню пойдзеш гірацаваць у школу.

І я пераехала ў горад свайго дзяцінства

Гэта таксама вялікая паласа майго жыцця: першая кватэра, шлюб, нараджэнне сына... Але гаворкатут — пра Аляксея Нічыпаравіча.

Першае, з чаго ён пачаў у Гродне, было:

— Ты сабрала кніжку вершаў?

Я і не думала пакуль пра кніжку. Хаця на першай жа сустрэчы студэнтаў ва універсітэце больш вопытны і сталы Эдуард Зубрыцкі запытаўся ў нас з Рыгорам Семашкевічам: «А ці гатовая кніжка?» У мяне да таго часу назбіралася, можа, пяцьдзесят больш-менш вартых вершаў. А трэба было нашмат болей.

— Дык садзіся і друкуй усё, што ёсць, а там паглядзім! — тут жа вызначыў маю праграму на бліжэйшы час Карпюк.

Тады я так і не села збіраць свае вершы. Паехала адразу ж у піянер- скі лагер, дзе мяне ( я ўжо мела чатыры курсы філфака БДУ) прызначылі старшай піянерважатай. З дзецьмі я заўсёды ўмела ладзіць — праводзіла там розныя літаратурныя фэсты, водныя заплывы.

Плаваць я любіла і ўмела. Яшчэ ў дзетдоме мы спаборнічалі — хто больш разоў пераплыве Нёман, не кранаючыся дна? І тут у лагеры, дзе густы сасновы пах бору над Нёманам, здаецца, цёк па жылах, я пражыла паўтара месяца.

Мне было добра тут, ля горада майго дзяцінства, куды я на выхадныя прыязджала, каб пахадзіць па вуліцы Замкавай, паглядзець на старадаўнія кляштары і пасядзець на лавачцы ў парку.

Лета яшчэ было ў самым разгары, калі Аляксей Нічыпаравіч сам прыехаў у лагер:

— Я знайшоў табе іншую працу. Будзеш працаваць не ў школе.

— А дзе ж?

Ён зрабіў эфектную паўзу:

— У гаркаме камсамола.

І, не слухаючы ніякіх пярэчанняў, цвёрда заявіў:

— Там табе і кватэру хутка дадуць, і палітграмаце навучышся. Я ўжо гаварыў з Нінай Нерат. Яна харошая дзеўка, не дасць цябе ў крыўду.

Маё зацвярджэнне ішло нялёгка, але «ціск» Карпюка быў вялікі, абласное кіраўніцтва часам ішло яму на розныя саступкі, і ў рэшце рэшт 1 чэрвеня 1965 году мяне залічылі ў камсамольскі штат гораду.

Гаркам месціўся ў самым маляўнічым месцы гораду— Новым замку, які гіраз мостзлучаўся са старым, пабудаваным яшчэ Сцягіанам Батурам.

Зноў жа скажу — гэтая праца дала мне многае. Перш за ўсё, яна прывучыла да нунктуальнасці: я і дасюль амаль ніколі пе спазняюся на прызначаныя сустрэчы ці мерапрыемствы. Па-другое, я адразу ж паспытала той улады (хаця япа была нікчэмнай у параўнанні з больш высокімі прыступкамі), якая кружыць нязлічаныя галопы чалавецтва. Са мной, простым інструктарам гаркама камсамола, пачціва гаварылі і нават у нечым апраўдваліся дырэктары фабрык (напрыклад, чаму на табачнай ў камсамол уступіла не столькі, колькі там было запланава- на), чаму ў іх нсйкі гам камсамолец учыніў злачынства і г. д. Ва ўсе пазнейшыя часы, калі я ўжо зрабіла свой выбар, кар'ерная прыступка для мяне заўсёды была толькі магчымасцю служыць беларускай справе і нешта рабіць для Радзімы — той, якую я спазнавала менавіта ў тыя юныя гады...

Я рабіла ўсё даручанае з вялікай сур'ёзнасцю, так што мяне неўзабаве «павысілі»: я стала працаваць у абкаме камсамола загадчыцай секгару культурна-масавай работы, а значыць, больш ездзіць па каман- дзіроўках і знаёміцца з вобласцю. Гэта было надзвычай цікава

яшчэ і тым, што ў камсамоле ў гыя часы працавала шмат разумных, тале- навітых людзей. У самім абкаме разам са мной працаваў, напрыклад, Павел Шаўчук, які пасля напісаў паэму «Як мяне адваджвалі адталакі» (праўда, пад псеўдапімам).

А тым часам літаратурнае жыццё ў Гродне віравала: праводзіліся літаратурныя аб'яднанні пры газеце «Гродненская правда», дзе праца- ваў малады літкансультант Васіль Быкаў, да якога вялікая літаратурная слава прыйшла з надрукаваннсм ў Маскве яго «Трэцяй ракеты». У Гродне да гэтагаяшчэ толькі гірызвычайваліся, як прызвычайваліся і да тага, што ў Зэльве «праявілася» сваімі вершамі, якія стала магчымым друкаваць, Ларыса Геніюш.

Не буду сцвярджаць, што менавіта Карпюк дабіўся ейнага дру кавання — я ўсё ж была занадта маладая ў гэтай гаспюдзе і многага проста не ведала. Але менавіта ён упершыню павёз нас, гродзенцаў, да Ларысы Антонаўны, і гэтае знаёмства канчаткова перакуліла той свет, да якога я начала пільна прыглядацца яшчэ з часоў XX з'езда КПСС. Тады ж я даведалася пра БНР і ролю ў ей Геніюш. Узаемаадносіны Ларысы Антонаўны і Аляксея Нічыпаравічаў розныя гады складваліся парознаму, што можна прасачыць па ейных лістах featured рознага часу. Але я думаю, што А. Карпюк рабіў усё магчымае, што можна было зрабіць для яе ў тых хамскіх, бязбожных варунках, якія склаліся вакол Л. А. у Зэльве і вышэй.

Адразу скокну да 1982 году, калі ў ноч перад пахаваннем гэтай вялікай дачкі беларускага пароду мы з Адамам Мальдзісам, якія прыехалі ў Зэльву ад Саюзу пісьменнікаў, гутарылі там з Карпюком. Мы ехалі туды з Міпску ... праз Гродна (дзе ў абкаме партыі нам за- гадал! не дагіусціць пахавання Геніюш па царкоўным абрадзе, чаго мы, канешне, і не думалі выконваць), вяргаліся ў машыне, дзе сядзелі ўсе разам, у тым ліку і з Юркам Геніюшам і ягонай жонкай ). Юрка гаварыў з Карпюком груба, адразу пасля вітання заявіўшы, што вось нам з Мальдзісам ён давярае, бо маці заўсёды казала пра нас добра, а іншым (гэта быў ківок у бок Каршока) тут знаходзіцца не варта...Гэта доўжылася ўсю дарогу, пасля яшчэ і яшчэ, і ўрэшце Карпюк не вьгг рымаў. Мне было невыказна шкада яго, калі ён спачатку яшчэ браўся даказваць Юрку, што нічога не мог зрабіць з зэльвспскімі барбосамі, якія на гародчыку паэткі, дзе заўсёды цвілі вяргіні, паставілі гарадскую прыбіральыпо (перад тым адабраўшы ад яе палоску зямлі. Там, дарэчы, і сёлета сцяной стаіць бур'ян). Мы спрабавалі ўціхамірыць Юрку, але дарэмна... I цяпер стаіць у вачах твар Карпюка, на якім ці не ўпершыню я пабачыла нсшта падобнае да слёз...

Але вярнуся ў 19661973 гады. Мы паранейшаму шмат ездзілі на выступленні. Самае, бадай, запамінальнае — паездка ў Брэст, дзе мы выступалі ў педінстытуце і дзе я наноў пазнаёмілася з Уладзімірам Калеснікам. Кажу «наноў», таму што ён разам з маімі бацькамі быў у адным партызанскім атрадзе, і, як жартаваў на сустрэчы, «бачыў Олю Іпатаву яшчэ да нараджэння», г. зн. калі мая маці была цяжарнай.

Неўзабаве і другі раз, на больш сур'ёзным узроўні, узнікла думка пра маю першую кнігу. Я ўжо добра разумела, што яе трэба нарэшце скласці.

Друкаркі ў мяне, канешне, усё яшчэ не было. Пазычыла яе Данута Бічэль, якая з маіх дзетдомаўскіх гадоў добра мною апекавалася. На ейнай друкарцы спачатку адным пальцам, а потым усё хутчэй стала я друкаваць свае вершы. Данута мне дапамагала, рэдагуючы і пад казваючы, як і куды лепей паставіць слова, і нават дапісала канцоўку верша «На Нарачы»:

Цікуюць сосны, стаўшы на дыбкі, Як плешчуцца ў хвалях чырвоныя рыбкі...

Рукапіс гэтай кніжкі, названай мною «Раніца» (пазней мне прыпі салі атаясамленне яе з назван газеты, якая выдавалася ў часы вайны) Карпюк сам павёз у выдавецтва і паказаў Петрусю Броўку. Броўка прыслаў мне ліст з прапановай дапоўніць кніжку вершамі, бо іх сап раўды было малавата. Пасля працы я хадзіла між замкамі — Старым і Новым — і радкі самі сабой нараджаліся — пра вуліцу Замкавую, пра Каложу...

Карпюк час ад часу забягаў да мяне на працу: «Як жывсш, што патрэбна?» — і тым як бы падсцёбваў мяне. Я разумела — ён столькі ўжо апякуецца мною, гэтая кніжка патрэбная і яму як сакратару Гро дзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў. Адчувала сябе яму моцна абавязанай: ён так шчасліва вырашыў мае жыццёвыя праблемы — я мела працу і ўсё болыи блізкую надзею на кватэру ў самой Гародні!

Кватэру я сапраўды атрымала — ужо ў 1968 годзе, перад самым на раджэннем сына. Да таго часу я стала разумець, што доўга ў камсамоле не пратрымаюся: усё там, як у складніку савецкай сістэмы, пярэчыла маім уяўленням пра праўду і справядлівасць, хаця, паўтаруся, самі па сабе людзі там былі мне пераважна прыемныя і яны таксама ставіліся да мяне няблага.

Аляксей Нічынаравіч асцерагаўся гэтай установы. Цяпер я магу зразумець тое, што мяне тады часам страшна раздражняла: не каб спа койна прыйсці, сесці на крэсла і пераказаць што трэба! Заместгэтага ён, на імгненне зазірнуўшы ў кабінет і жэстам

паказаўшы, каб я выйшла, спыняўся за вуглом Старога замка і таямніча паведамляў:

— Заўтра ў аддзяленне прыйдзе сакратар абкама! Каб была, глядзі!

Звычайна за тым вуглом свісцеў вецер — вышыня, рака ўнізе. І я казала:

— Ну і што гэта за сакрэт? Нашто было сюды ісці?

— Нічога ты не разумеет! Зялёная яшчэ!

І гэтак жа таямніча знікаў, а я ішла назад, ужо смеючыся — надта ж забаўнай здавалася гэтая гульня ў канспірацыю!

Аднак ён ведаў больш, а менавіга: што ўсе мы былі пад пільным кантролем адпаведных органаў, і чым менш яны ведаюць, тым лепей. Да таго ж, было што і хаваць: мснавіта Каргпок даваў мне чытаць замежныя выданні, Салжаніцыпа, эміграицкі друк — усё тое, за што можна было і «схлопотать».

Дарэчы, якраз у гэтыя гады было адно здарэнне, якое таксама ака залаўплыў на мае жыццё. Нас, пісьменнікаў Гродзеншчыны, запрасілі ў Вільню. Ехалі В. Быкаў, А. Карпюк, Данута Бічэль, здаецца, Валянцін Чэкін і я. За тыдзень да той паездкі да мяне зазірнуў нейкі чалавек. Ён паказаў пэўнае гіасведчанне, доўга расказваў мне, якую адказнасць як паэт я нясу перад народам, а пасля як бы між іншым нагадаў:

— Вы собираетесь в Вильнюс. Так вот, вы как комсомолка должны нам помочь: постарайтесь запомнить, о чем будут говорить с литовцами Василий Владимирович и Алексей Никифорович...

*Я* разгубілася. Адмаўляцца было немагчыма. Але ў той жа вечар, узяўшы з Карпюка слова, што ён захавае гэта ў сакрэце, я расказала яму пра нечаканае «даручэнне», а па вяртанні адгаварылася тым, што ні аб чым «такім» иашыя пісьменнікі з літоўцамі не гаварылі.

І трэба ж было, каб праз дватры месяцы, выступаючы на адкрыггым партыйным сходзе, Аляксей Нічыпаравіч закончыў сваё выступление тым, што публічна абвінаваціў адпаведныя органы ў назіранні за творцам! і скончыў словамі (як мне пасля перадалі):

— Вы ўжо і маладых паэтак, як вось Олю, прымушаеце станавіцца такімі, як вы! Наіто з самага пачатку псуяце ім жыццё ?

І за гэта я ўдзячная Аляксею Нічыпаравічу — больш да мяне ніхто і ніколі не падыходзіў, так што не давялося мне пасля, як А. Емялья наву ці С. Адамовічу, публічна вінаваціцца ў тым, што не змаглі, не выстаялі...

А вось пра іншую сітуацыю ён апавядаў мне сам, прычым ў гумарыстычнай форме пасля гэтага іншым расказваў пра яе Васіль Быкаў.

Было гэта ў час рэспубліканскага семінару творчай моладзі восенню 1970 г. Я нажыла сабе вялікую непрыемнасць: адмовілася ад Ганаровай граматы ЦК ВЛКСМ, якую мне павінны былі ўручыць у канцы гэтага семінару. Было нас гіяцёра маладых, хто ведаў аб будучых узнагародах, і мы вырашылі абставіць гэтую адмову гучна: заявіць тым пратэст еупраць русіфікацыі і супраць рэпрэсій ў БДУ (тады якраз выключылі з універсітэту А. Разанава і В. Яраца). Так сталася, шго першаю выклікалі мяне, і я зрабіла так, як мы дамаўляліся. Але іншыя —• спалохаліся. Быў вялікі скандал, калі сакратар ЦК ЛКСМБ Анціпаў пакінуў нават традыцыйны банкет, бо мяне не выгналі, як ён, відаць, спадзяваўся, ні з Дому творчасці, ні з Саюзу пісьменнікаў.

Карпюк, які гэтай ноччу ехаў у цягніку на сустрэчу з загадчыкам аддзела прапаганды С. Паўлавым, нічога пра гэта не ведаў. І таму, калі Паўлаў адразу накінуўся на яго за ідэалагічныя хібы гродзенскіх пісьменнікаў і пры гэтым закончыў: «А тут яшчэ гэтая Вашая Іпатава!», Аляксей Нічыпаравіч бадзёра адрапартаваў:

— А што Іпатава? Маладая паэтка, цалкам знаходзіцца пад маім уплывам!

— Яно і бачна! — закрычаў ідэолаг, і перцу, якім ён пасля доўга пасыпаў беднага А. Н., мабыць, хапіла б на ўсе сталоўкі не толькі Гародні, але й Мінску...

Калі ж па гэтай справе ў Гродна была адпраўлена адмысловая камісія Саюза пісьменнікаў, ён, як не раз расказваў В. Быкаў, сустрэў старшыню камісіі А. Алешку такімі словамі:

— Як ты згадзіўся паласкаць гродзенскіх пісьменнікаў, то руку я табе не падам — бо не паважаю.

— Але як старшага ад Саюза пісьменнікаў, па службовай неабход насці я павінен цябе суетрэць — то давай павітаемся!

Разам з ім мы пасля пісалі ТЛУМАЧЭННЕ, якое Алешка і камісія гіавезлі назад у Мінск. Там гэтую справу хутка «патушылі» М. Танк і 1. Шамякін. Аднак у Гародні мяне паспрабавалі выключыць з камса мола, што аўтаматычна пазбаўляла мяне працы на тэлебачанні, дзе я ўжо працавала.

Дарэчы, пераход на іншую працу ці, дакладней, мае ўцёкі з абкама камсамола Аляксей Нічыпаравіч разумеў. «Не магу!» — казала я яму. «Мяне нядаўна паслалі на сход у аблпраект, дзе камсамольцы

павінны выключыць з камсамолу дзяўчыну затое, шго яна... жылаз французам! Я не магу ўдзельнічаць у гэтым!»

Ён разумеў. Але на сваю другую гірацу ў Гродна я ўладкоўвалася ўжо сама — займсла немалы аўтарытэт як аўтарка зборніка вершаў, і таму на тэлебачанне мяне ўзялі ахвотна.

Калі мяне адпусцілі з абкама з фармулёўкай «Зволыііць у сувязі з нараджэннсм дзіцяці», я была проста шчаслівай. Новая творчая праца, знаёмствы, спаталенне прагі болей ведаць пра гісторыю Гродзеншчы ны, пра яе барацьбу за беларускасць і за свабоду...

Гэтаму не перашкаджала і нараджэппе сына. Дарэчы, мне дапама галі ўсім аддзяленнем: Данута Бічэль аддала каляску свайго Валеркі, Аляксей Карпюк і Васіль Быкаў прыйшлі ў адведзіны і прынеслі грошай.

Памятаю, як яны рапгоўна, без званка, пастукаліся ў дзверы. У ква тэры быў страшэнны беспарадак: сын у мяне нарадзіўся з вывіхам тазасцегнавых суставаў, я амаль не спала па начах, а муж быў на працы. Было няёмка, але абое яны мяне суцешылі і падбадзёрылі. Патрымалі адзін за адным на руках Руслана, пажадалі яму быць добрым беларусам (пра гое, як ён спяваў два гады беларускія пссснькі, узгадвае ў адным з лістоў Ларыса Геніюш). І вось дзіва: сын, які да таго крычаў беспе растанку, раптам супакоіўся, сцішыўся і адразу заснуў. Я прапанавала гарбаткі, але яны, мабыць, пашкадавалі маіх высілкаў і хутка пайшлі, а я, ледзь толькі за імі зачыніліся дзверы, адразу ўслед за сыпам пра вапілася ў сои і спала разам з ім амаль да вечара.

Шмат можна ўзгадваць розных выпадкаў, звязаных з нашым аддзяленнем і асобай А. Карпюка. Аб тым,.як нам тады жылося, на пісалі вершпародыю маладыя і гарэзныя А. Вярцінскі і П. Макаль. Я прыводзіла яго ў сваіх «Мемуарах» на «Свабодзе», але тады не ведала, хто аўтары, хаця і памятала тыя радкі напамяць. Высветліла ж аўтарства зусім нядаўна, калі разам з А. Вярцінскім ехала з Зэльвы, дзе пад дажджом (не знайшлося памяшкання!) мы святкавалі 95годцзе Ларысы Геніюш.

Тут штодзень дыміць азотнатукавы, Копаць індустрыі несучы. Тут штодзённа Быкава застуквалі Абласнога рангу стукачы. Тут Бічэль з Іпатавай сварыліся, І такія словы гаварыліся: «Не хадзі да Карпюка, Іпатава, Не адна ты ў яго сімпатыя!» Тут за праўду на агонь пякельны, Быццам трапяткога шчупака, Цягнуць на гарачую патэльню, Смажаць Аляксея Карпюка.

Нядаўна ў лістах Ларысы Антонаўны я прачытала, што Данута была страшэнна абураная тымі чатырма радкамі пра нашыя нібыта сваркі зза Карпюка. Не было ніякіх сварак — гэта, канешне, хлопцы дадалі, як гаворыцца, дзеля каларыту. Я ўвогуле і не магла абурацца: Аляксей Нічыпаравіч быў заўеёды для мяне як бацька, а Данута — як старэйшая сястра, і я ўсіх іх, уключаючы Васіля Уладзіміравіча, страшэнна любіла, захаплялася імі. Я ў свой час успрыняла тую страфу як прызнанне сваей нейкай даросласці, нібы я раблюся хоць крыху роўнай ім —хаця б у гэтых жартоўных радках....

Дарэчы, хацела б я узнавіць у памяці і верш, які Данута Бічэль чытала на 60годдзі А. Карпюка і які заканчваўся выдатным, як на мой погляд, азначэннем яго асобы:

Карпюк магутны, нібы зубр,

Які пасецца ў заапарку.

Заапаркам для гэтага магутнага зубра была ўся нашая рэчаіснасць. З аднаго боку — ў савецкай улады было як бы прызнанне аўтарытэту пісьменнікаў. І з нашым абласным аддзяленнем лічыліся: пісьменнікаў заўссды запрашалі на розныя гарадскія і абласныя ўрачыстасці, ім у абыход чаргі давалі кватэры. З другога боку, існаваў заўсёдны нагляд, рэгулёўка дзейнасці і імкненне абмежаваць творчасць жорсткімі рам камі дазволенага. Вось на гэтым і палягаў асноўны канфлікт Карпюка з уладамі — ён рэзаў «праўдуматку» у вочы, а гэта не падабалася.

Яго цкавалі ў Гродне, можа, не так жорстка, як Ларысу Геніюш у Зэльве: усёткі быў ён кавалер ордэна «Віртуці мілітары», заслужаны партызан, аўтар многіх славутых на Гродзеншчыне кніг, такіх, як «Данута» і «Вершалінскі рай». Адпак хто можа штосьці параўноў ваць у такой справе, як цкаванне? Тым болей такое, якое абрынулася на яго — выключэнне з партыі, абвінавачванне ў супрацоўніцтве з немцамі — з пачатка да канца сфабрыкаванае, пасля скінутае з яго, як быццам нічога і не было.

Але было, было! Быў сжаўцелы ягоны твар, калі ён прыязджаў у Мінск, хадзіў па інстанцыях, нешта даказваў. Аднойчы не вытрымаў, сарваў свой настрой пры нашай сустрэчы ў Доме літаратара: «Па выязджалі ў Мінск, кар'еру робіце, і пляваць вам на Гродна!» Мне было балюча, бо Гродна я змушана была пакінуць — пасля гісторыі з адвергнутай граматай ЦК на Гродзенскім тэлебачанні, дзе я працавала, да мяне чапляліся з бесперапыннымі прыдзіркамі, аднак я разумела ягоны стан. Ды і хіба можна было на яго крыўдзіцца ў такі

горкі час? Памятаю, што кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў спрабавала неяк палеп шыць сітуацыю, але ўдалося гэта не хутка.

Думаю, што і без мяне нехта абавязкова апіша, узгадваючы Аляк сея Нічыпаравіча як мужнага барацьбіта, той уплыў і аўтарытэт, які ён меў у пісьменніцкім асяроддзі. Сапраўды — у час самых сумных пленумаў і сходаў, варта было толькі аб'явіць, што выступае Карпюк, як іранічныя пісьменнікі, што дымілі ў калідорах і з'едліва камента валі прамоўца, адразу ж падаваліся ў залю. І не шкадавалі — прамовы нашага гродзенца былі заўсёды самымі яркімі і жывымі, бо казаў ён тое, на што аемельваўея далека не кожны.

Я шчаслівая, што ён быў у маім жыцці. Яго заўсёды абкружала аўра нейкай асаблівай чысціні, якая часта здавалася ледзь не наіўнай у нашым досыць складаным побыце. Ці змагаўся ён супраць п'янства (хадзілі цэлыя серыі анекдотаў «Як Карпюк даваў п'янству бой»), ці угаворваў гродзенцаў не рабіць з вуліц сметнік, ці грукаў на начальства кулаком— быў заўсёды гранічна шчыры. Шчыра асуджаў разводы і абараняў, як цяпер кажуць, сямейныя каштоўнасці. У кароткіх яго рэпліках пра ўласную сям'ю (калі пры нас даводзілася гаварыць па тэлефону з жонкай Інай Анатольеўнай ці з дзецьмі) адчувалася любасць да іх і гонар, асабліва што тычыла жонкі.

Шмат, шмат засталося ў маім жыцці ад Аляксея Карпюка! Вось ад зін толькі штрых: неяк прыбеглая ў адцзяленне ўся такая расфранчаная, на вялікіх абцасах, задаволеная сабою і светам. Аляксей Нічыпаравіч жорсткаю рукой падводзіць да люстра: «Оля, свецкія дамы ніколі не фарбаваліся. У ранейшыя часы вочы падводзілі і вусны мазалі толькі ведаеш хго? Не кажы гэтае слова, бо дзяўчатам яго вымаўляць не прыстойна. А я табе скажу: прастытуткі!»

Вядома, я абурылася, я даказвала права сучасных дзяўчат на тое, што зараз назвала б «баявой размалёўкай канадскіх індзейцаў»... Ды з самага таго часу ўсё ж не карыстаюся ані пудрай, ані рознымі жаночымі прыладамі для прыгажосці. Не бяруся лічыць, колькі грошай зэканомілі мне тыя каргіюкоўскія словы, а вось што да часу — так, шмат. Бо часу пісьменніку заўсёды бракуе. Асабліва калі ён піша гістарычныя раманы і вымушаны гадзінамі крукам сядзець над летапісамі і фаліянтамі.

Гэта — жыццёвыя аскабалкі з тых незабыўных гадоў маладосці. А была і сур'ёзная, удумлівая вучоба — у сталага пісьменніка, які пражыў яркае, поўнае прыгод і нягод жыццё і перадаў гэта праз мас тацкія вобразы і ідэю гвораў. У іх жыве, пераліваецца моўнымі фарбамі сакавітая беларуская мова — негіаўторнагродзенская, дынамічная, свежая, як раса.

Зараз мы ўсе перажываем час, калі ў шалёным віры падзей нібы пераціраюцца і канаюць усе ранейшыя культурніцкія і духоўныя каштоўнасці. Але мне верыцца — у беларускай літаратуры назаўжды застанецца лепшае са створанага гродзенскім рамантыкам Аляксеем Карпюком...

*Верасень 2005 г.*

*Ніна ЛЯШЧОНАК,*
*навуковы супрацоўнік*
*Гродзенскага дзяржаўнага музея*
*гісторыі рэлігіі*

## ЗАЎТРА ЗАЎСЁДЫ ПОЗНА

Аляксей Нічыпаравіч Карпюк! Гэта асаблівая старонка ў гісторыі музея.

Ён быў нашым першым дырэктарам у Горадні, нашым бацькам, сябрам, паплечнікам.

Ён навучыў нас шырыні мыслення, самастойнасці і незалежнасці, чаго потым нам не маглі даравацъ.

Ён навучыў нас не баяцца міністраў і чыноўнікаў. Ён навучыў нас збірацца ў камандзіроўку за хвіліны, у экспедыцыю — за некалькі гадзін.

Ён быў для нас эталонам учынкаў і паводзінаў. Ён ніколі не патрабаваў вынікаў працы, ён давяраў нам і верыў у нас.

Ён навучыў нас глядзець, бачыць, думаць і аналізаваць, навучыў любіць нашу справу. Ён не цярпеў маруднасці, тугадумства, быў як маланка, здавалася, ён не хадзіў, а лятаў. Неаднойчы камунебудзь казаў: «Харошая вы жанчына, вось толькі павольна ідзяце».

Ён усё рабіў імкліва, хутка і адразу. Ніколі не адкладваў на потым, на дзень апошні. Ён быў шчыры і просты. Ён умеў дарыць радасць. Ён ніколі не быў стомленым, старым, хворым. Здаецца, аднойчы ўцёк з бальніцы праз адчыненае вакно.

Яго кнігамі мы зачытваліся і неаднойчы пыталіся: гэта вы пра сябе? Аляксей Нічыпаравіч нічога не адказваў, толькі загадкава ўсміхаўся.

А як ён размаўляў! Якая бліскучая, высакародная мова.

А як ён умеў жартаваць! Як мог смяяцца!

Усе святы ў музеі мы святкавалі разам з нашым дырэктарам. Ён апекаваў нас, клапаціўся, знаёміў з пісьменнікамі і мастакамі, з ціка вымі людзьмі. Гэта Аляксей Нічыпаравіч нас пазнаёміў з Уладзімірам

Караткевічам, які падчас сустрэчы сказаў: «Гадоў 15 назад паганяў бы я вас па Наваградчыне, вы б у мяне як міленькая ведалі беларускую мову». Чалавек неардынарны, ён апярэдзіў свой час.

Нам проста пашанцавала ў жыцці, таму што лес даў нам такога дырэктара. Але лес яго і забраў. Назаўсёды. Аляксей Нічыпаравіч пай шоў ад нас, а мы мусілі працаваць далей, ствараць экспазіцыю, але на працягу некалькіх гадоў мы адчувалі яго маральную падтрымку.

## ЛІСТ ВАСІЛЯ БЫКАВА ДА ІНЫ КАРПЮК

*6 студзеня 1993 г.*

Дарагая Іна Анатольеўна, атрымаў Ваша маларадаснае пісьмо, якое навеяла і на мяне разам з успамінамі вялікі сум. Канешне, Аляксей і ягоны лес — цяжкі, драматычны лес беларускага пісьменніка, надзеленага чуйным сэрнам. Аляксей меў усе магчымасці, каб добра ўладкавацца ў жыцці, жыць бязбедна, зрабіць кар'еру. І калі ён не зрабіў таго, дык па прычыне свайго сумленнага сэрца, якое балела не толькі за сябе ці за сваё. А яшчэ і за людское, за народнае. З тае прычыны і ўсе ягоныя беды, якія (я ўпэўнены ў гэтым) нарэшце і звялі яго ў магілу. [...]

Вельмі шкадую, што мне не ўдалося прыехаць на пахаванне — на пярэдадні ноччу мяне дапякла арытмія, і я раніцай нерашыўся пускацца ў дарогу, — М. Ткачоў паехаў без мяне. Увосень быў у Гародні, з'ездзіў на могілкі... Не спадабалася мне месца Аляксеевай магілкі — увогуле месца добрае, але ззаду за начальствам, як у прэзідыуме ў другім радзе, для другарадных начальнікаў. А так на пагорачку, гэта добра. Хаця, канешне, трэба б далей ад тых, з кім Аляксей ваяваў усё жыццё і якія яго ненавідзелі. Хіба што, як вядома, смерць ураўнівае. Але ж...

Цяпер такая справа, Іна Анатольеўна. Пасля Аляксея, канешне, засталося шмат напер — запісаў, чарнавікоў і г. д. Трэба іх большмеиш разабраць і здаць у літаратурны архіў у Мінску, яны там прывядуць усё ў надежны стан, і тое будзе захоўвацца для будучых даеледчыкаў. І для гісторыі. Гэта ўвогуле важна. Цікавасць і ўвага да А. Карпюка будзе з часам расці, гэта пэўна. Як яна ўспыхнула да Л. Геніюш, што пры жыцці піхто не хацеў заўважаць. [...]

Я вельмі жадаю Вам, дарагая Іна, трымацца якнебудзь. І прыві танне Вашым рабятам. З павагай і шчырасцю

*Васіль.*

# КАМЕНТАР

Творчасць Аляксея Нічыпаравіча Карпюка была прызнана чытачамі сучаснікамі, аднак дагэтуль не стала прадметам сур'ёзнага навуковага асэнсавання. (Выключэннем з'яўляюцца глыбока змястоўныя крытычныя артыкулы і мемуарныя нарысы пра пісьменніка сябра яго юнацтва, вядомага літаратуразнаўцы Уладзіміра Калесніка.) Адсутнічае поўная бібліяграфія выданняў пісьменніка і публікацый пра яго жыццё і творчасць; прысвечаны А. Н. Карпюку раздзел у трэцім томе вядомага шматтомнага даведніка «Беларускія пісьменнікі» ўжо састарэлы (выйшаў у 1994 г, быў падрыхтавапы значна раней, прычым утрымлівае сур'ёзныя прабелы). Не напісана і поўная біяграфія пісьменніка. Вядома, што матэрыялы да яе збіраў вядомы гродзенскі журналіст і грамадскі дзеяч Валерый Задаля (1953-2007), аднак ён не скончыў сваёй працы.

Гэтая кніга «Выбраных твораў» Аляксея Карпюка павінна паказаць сучаснаму чытачу яго як мастака і чалавека. Менавіта таму яго мастацкая проза прадстаўлена ў дадзеным томе вяршынным творам — аповесцю «Данута», якая лічыцца адной з лепшых аповесцяў пра каханне, напісаных на беларускай мове.

Перад укладальнікам стаяла задача: «Выбраныя творы» былі б няпоўнымі, калі б у кнізе не быў змешчаны раман «Вершалінскі рай», найбольш спелы з раманаў Карпюка, што паказвае яго як гістарычнага пісьменніка і сацыяльнага мысляра. Але тады аб'ём тома перавысіў бы дапушчальны стандарт. У выніку кансультацый з рэдакцыйнай радай серыі «Беларускі кнігазбор» і з сям'ёй пісьменніка было вырашана апублікаваць п'есу «Канец свету», напісаную А. Н. Карпюком паводле рамана для народнага тэатра, аднак так і не пастаўленую ў тэатры і не надрукаваную пры жыцці аўтара. Такім чынам, чытач мае магчымасць пазнаёміцца і з сюжэтам «Вершалінскага раю», і з майстэрствам Карпюка-драматурга.

Мемуарная проза А. Н. Карпюка прадстаўлена яго ўспамінамі «Збавенне ад ілюзій» — пранізлівым дакументам, які ўзрушвае сваёй шчырасцю і суровай самаацэнкай. Верагодна, адзіным адпаведным па сіле ўздзеяння мемуарным тэкстам у беларускай літаратуры XX стагоддзя з'яўляецца «Споведзь» Ларысы Геніюш. Твор «Збавенне ад ілюзій» друкаваўся пры жыцці аўтара на рускай мове ў скарочаным варыянце ў часопісе «Нёман». А. Н. Карпюк планаваў апублікаваць свае ўспаміны і на беларускай мове, на якой яны былі напісаны. Кніга рыхтавалася да выхаду ў адным з дзяржаўных выдавецтваў. Аднак пасля смерці Аляксея Нічыпаравіча набор быў знішчаны, а адзіны асобнік вёрсткі быў перададзены сям'і пісьменніка. Па гэтым асобніку, ласкава прадстаўленым у наша распараджэнне І. А. Карпюк, удавой А. Н. Карпюка, мы і ўзнавілі тэкст успамінаў.

Такім чынам, з двума творамі, якія ўвайшлі ў гэтую кнігу, чытач пазнаёміцца фактычна ўпершыню.

Упершыню публікуюцца і лісты А. Н. Карпюка. Усе яны захоўваюцца ў фондах БДАМЛіМ. Мы былі змушаныя абмежавацца толькі невялікай іх колькасцю ў сувязі з немагчымасцю пашырэння аб'ёму выдання. Разам з тым

адзначым, што рыхтуецца да друку двухбаковая перапіска А. Н. Карпюка і М. І. Забэйды-Суміцкага, якая таксама будзе апублікаваная ў найбліжэйшы час.

У дадатку публікуюцца ўспаміны пісьменніцы і грамадскага дзеяча Вольгі Іпатавай, напісаныя адмыслова для гэтага выдання, і фрагменты мемуараў вядомага гісторыка Барыса Клейна, сябра А. Н. Карпюка і В. У. Быкава, штуршком да стварэння якіх таксама з'явілася наша прапанова напісаць нарыс у гэты том. Аднак успаміны Б. З. Клейна, які цяпер пражывае ў ЗША, ператварыліся ў вялікі тэкст, варты асобнага выдання (якое сёння таксама рыхтуецца), і мы дзякуем яму за магчымасць публікацыі фрагментаў, прысвечаных А. Н. Карпюку.

Публікуем таксама ліст В. У. Быкава да І. А. Карпюк, напісаны пасля смерці Аляксея Нічыпаравіча. Ён сведчыць аб сяброўстве двух выбітных майстроў слова.

Укладальнік выказвае падзяку Іне Анатольеўне Карпюк, удаве пісьменніка, якая дала свайму вучню магчымасць падрыхтаваць да выдання гэтую кнігу, дапамагаючы матэрыяламі і парадамі; Алене Аляксееўне Сіваковай, дачцы Аляксея Карпюка, якая выступала ў якасці кансультанта пры падрыхтоўцы гэтага выдання і фактычна стала яго раўнапраўным укладальнікам; Віталю Уладзіміравічу Скалабану, які падрыхтаваў да друку і пракаментаваў ліст А. Н. Карпюка П. М. Машэраву і кансультаваў укладальніка пры падрыхтоўцы каментароў да ўспамінаў пісьменніка; Сяргею Васілевічу Харэўскаму, прызнанаму знаўцу старой Вільні, без дапамогі якога каментар да аповесці «Данута» быў бы немагчымы; супрацоўнікам БДАМЛіМ і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якія аказалі максімальна магчымае садзейнічанне ў працы над гэтай кнігай.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год
© ePUB: Камунікат.org, 2011 год

# ЗМЕСТ


У змаганні за Праўду. *Аляксандр Фядута*

## ПРОЗА

Данута: *Аповесць*
Частка першая
Частка другая
Частка трэцяя
Развітанне з ілюзіямі: *Аповесць*
Частка першая
Частка другая

## ДРАМАТУРГІЯ

Канец свету: *Сялянская драма*

## ПУБЛІЦЫСТЫКА, ЛІСТЫ

### Публіцыстыка

Выступленне на V з'ездзе пісьменнікаў БССР у Мінску.
Перыпетыі пошукаў

### Лісты

1. Іне Карпюк
2. Янку Брылю
3. Максіму Танку
4. Алене Карпюк
6. Янку Брылю
7. Міхасю Забэйду-Суміцкаму
8. Валянцінс Карпюк
9. Пятру Машэраву
10. Міхасю Забэйду-Суміцкаму
11. Васілю Быкаву
12. Міхаілу Сяргеевічу Гарбачову
13. Аляксандру Амільяновічу

## ДАДАТАК

### Успаміны пра Аляксея Карпюка

*Васіль Быкаў*. Доўгая дарога дадому: *фрагменты*


www.kamunikat.org

*Борыс Клейн.* Недосказанное: *главы из воспоминаний*
*Вольга Іпатава.* Успаміны пра Аляксея Карпюка
*Ніна Ляшчонак.* Заўтра заўсёды позна
Ліст Васіля Быкава да Іны Карпюк

Каментар

Карпюк, А.
Выбраныя творы / Аляксей Карпюк; Уклад., прадм., камент А. Фядута. — Мінск: Кнігазбор, 2007. — 600 с. [8] с: іл. — («Беларускі кнігазбор»: Серыя 1. Мастацкая літаратура).
ISBN 978-985-6852-15-5.
У кнігу ўвайшлі самыя значныя творы выдатнага беларускага пісьменніка Аляксея Карпюка (1920-1992), бясстрашнага змагара за праўду і справядлівасць.
Сорак першы том кніжнага праекта «Беларускі кнігазбор».

**УДК 821.161.33 ББК 84 (4 Бен)**

www.kamunikat.org